ARCHE Зьмест № 2'05

1. Зьмест / Уводзіны
2. Выбары палітычнага выбару
3. Чатыры кулі для прэзыдэнта
4. Двухсэнсоўнасці русіфікацыі
5. Паміж імпэрыяй і нацыяй
6. Вайна для народу
7. Культура вайны
8. Беларусь, убачаная арыенталістам
9. Тупікі і выйсці грамадазнаўцаў
10. Дрот у дрэве
11. Мой спосаб чытаньня
12. Мой кумір Джордж Гарысан
13. «Цяпер мне падабаецца толькі опэра»
14. «Сённяшняй уладзе выгадна, каб беларушчына драбілася...»
15. Сны дзяцей
16. Беларусь на мяжы цывілізацый
17. Ален Бэзансон. Межы Эўропы
18. Забыты Рэнэсанс
19. Стагодзьдзе спрэчак: Да сістэмнасці ў беларускім правапісе
20. Пра «светлае заўтра каталіцкай філасофіі»
21. Аднарог і кола
22. Заўвагі інтэлектуалам, апытаным «Arche».
23. Шаноўны пане рэдактару,
24. Лісты Гэніка Лойкі
25. Гоман і ятра
26. Леанард Коэн
27. Сяргей Астравец. Як мы збудавалі Бабілёнскую вежу.
28. Пэтэр Слотэрдайк. Прыйсьці на сьвет - прыйсьці да мовы.
29. Кастусь Лашкевіч. Мікробы гісторыі.
30. Генадзь Семянчук. Беларускі катэхізм XVI ст.

Мінарыя (9’2000)

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 2 (36) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

2[image]-[image]2005

ада Зьместу

ўдалітыка • эсэістыка • крытыка • літаратура • палеміка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

[image]

З ь м е с т

C o n t e n t s

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Выбары палітычнага выбару

КРЫТЫКА

ПЁТРА РУДКОЎСКІ Чатыры кулі для прэзыдэнта
АНДРЭАС КАПЭЛЕР Двухсэнсоўнасьці русіфікацыі
АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ Паміж імпэрыяй і нацыяй
ЮРЫ ЧАВУСАЎ Вайна для народу
ВІКТАР КОРБУТ Культура вайны
СЯРГЕЙ БОГДАН Беларусь, убачаная арыенталістам
ВОЛЬФ РУБІНЧЫК Тупікі і выйсьці грамадазнаўцаў

ЭСЭІСТЫКА

МІКОЛА КРЫВАЛЬЦЭВІЧ Дрот у дрэве
ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Мой спосаб чытаньня
ВІНЦЭСЬ МУДРОЎ Мой кумір Джордж Гарысан
«Цяпер мне падабаецца толькі опэра». Гутарка з **АЛЕГАМ ЛАТЫШОНКАМ**
«Сёньняшняй уладзе выгадна, каб беларушчына драбілася...». Гутарка зь **ЛЕАНІДАМ ГАЛУБОВІЧАМ**
АРЦЁМ АРАШОНАК Сны дзяцей
УЛАДЗМЕР КОНАН Беларусь на мяжы цывілізацыяў

АНАЛІТЫКА

АЛЕН БЭЗАНСОН Межы Эўропы
УЛАДЗМЕР КАЛУПАЕЎ Забыты Рэнэсанс

ПАЛЕМІКА

ДЗЬМІТРЫ ШЫРОКІ СтагодЗЬдзе спрэчак: да сыстэмнасьці ў беларускім правапісе; «Праграма хабітуальнай дыскрымінацыі», або Понт Беларускі
ПЁТРА РУДКОЎСКІ Пра «сьветлае заўтра каталіцкай філязофіі»
ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Аднарог і кола; Няведамыя землі
ІГАР ХАМЕНКА Заўвагі інтэлектуалам, апытаным «ARCHE»
МІКОЛА БУСЕЛ Рэпліка
ГЭНІК ЛОЙКА Лісты для спадароў Сямёна Букчына і Данілы Жукоўскага

ЛІТАРАТУРА

УІЛЬЯМ ФОЛКНЭР Гоман і ятра
ЛЕАНАРД КОЭН Лірыка
СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ Як мы збудавалі Бабілёнскую вежу
ПЭТЭР СЛОТЭРДАЙК Прыйсьці на сьвет - прыйсьці да мовы

РЭЦЭНЗІІ

КАСТУСЬ ЛАШКЕВІЧ Мікробы гісторыі
ГЕНАДЗЬ СЕМЯНЧУК Беларускі катэхізм XVI ст.

[image]
[image]

№ 2 (36) - 2005

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/01/11
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

2[image]-[image]2005

"да Зміласту"

падземіка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

палітычны аглядальнік часопісу «ARCHE».

Віталь Сіліцкі Выбары палітычнага выбару

За апошнія чатыры гады ўкраінская Памаранчавая рэвалюцыя стала трэцім паспяховым прарывам да дэмакратыі на посткамуністычнай прасторы, здзейсненым пры дапамозе выбараў. Беручы пад увагу агульны заняпад дэмакратыі

ў
постсавецкіх
краінах,
тэндэнцыя
ўражвае і
натхняе.
Можа
падацца,
што мы
бачым той
самы
спектакль,
адно з
рознымі
касцюмамі і
акцёрамі.
Слабадан
Мілошавіч
робіцца
Эдуардам
Шэварднадзе,
затым
Леанідам
Кучмам ці
Віктарам
Януковічам.
Ваіслаў
Каштуніца
пераўвасабляецца
ў Міхаіла
Саакашвілі,
які, у сваю
чаргу,
становіцца
Віктарам
Юшчанкам.
Юлія
Цімашэнка
выклікае ў
памяці

вобраз
Зорана
Джынджыча;
моладзевы
рух Сербіі
«Отпор» у
Грузіі
выглядае як
«Хмара», а
ва Украіне
як «Пора».

Аднак народы заўсёды граюць самі сябе. Найбольш яскравым у гісторыі ўсіх трох рэвалюцый сталася нараджэнне праўдзівага духу дэмакратыі ў грамадствах, якія назіральнікі (у тым ліку і ўнутраныя) апісвалі як пасіўныя, абыякавыя, падпарадкаваныя і ад прыроды сваёй няздатныя да дэмакратыі. І раптам сербы, грузіны і ўкраінцы здабылі надзею, адкінулі страх, прадэманстраваўшы прыроджаную рашучасць, і павялі сябе так, што скептыкі мусілі задумацца, ці іх уласная прага да дэмакратыі роўная той, якую прадэманстравалі натоўпы ў Бялградзе, Тбілісі, Кіеве ды многіх меншых гарадах і селішчах. Народы Сербіі, Грузіі, Украіны выявілі цудоўны сплаў самаарганізацыі, гатовасці да самаахвяравання і абачлівасці (усе тры рэвалюцыі абышліся без чалавечых ахвяр, за выняткам адной смерці ў дарожным здарэнні ў Бялградзе). Дэмакратычныя лідэры рэвалюцый адмовіліся ад уласных амбіцый дзеля пошуку супольнай карысці. Грамадзянскія супольнасці трох краін напоўніцу давялі сваю сілу і самаадданасць.

Кожная падобная падзея дае спадзевы на далейшае распаўсюджанне дэмакратычных ідэй, на тое, што электаральная рэвалюцыя будзе шырыцца. Аднак энтузіязм і ўздым, спароджаныя Памаранчавай рэвалюцыяй, былі беспрэцэдэнтнымі. Украіна перадусім – вялікая, важная краіна, заўважная для тых краін рэгіёну, дзе стрэлкі гадзінніка пайшлі назад, у напрамку, адваротным дэмакратыі. Дух, прадэманстраваны на кіеўскім Майдане Незалежнасці, выйшаў далёка за межы Украіны: раптам выявілася, што ў Польшчы немагчыма купіць нічога аранжавага, і нават за акіянам дзе-

нідзе цяжкавата было знайсці аранжавыя рэчы (аўтару гэтых радкоў давялося паблукаць па крамах, перш чым ён знайшоў у Бостане аранжавую майку). Размовы пра вірус дэмакратыі ўвайшлі ў лексікон навукоўцаў, журналістаў і палітыкаў. Сёй-той са спадзевам, сёй-той са страхам, нават з істэрыяй задае адно і тое ж пытанне: хто наступны?

Але ў гэтым пытанні цвярозы аналіз павінен дамінаваць над энтузіязмам і радасным трымценнем. Як здзяйсняюцца электаральныя рэвалюцыі і ці можна чакаць іх у краінах былога Савецкага Саюза, якімі кіруюць дыктатары? Якой рэакцыі варта чакаць ад іх? Ці не абяруць яны яшчэ горшай стратэгіі паводзін, чым цяперашняя? І што трэба рабіць, каб гэтага пазбегнуць?

ЯК ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА ЭЛЕКТАРАЛЬНЫЯ РЭВАЛЮЦЫІ?

Калі зірнуць на кантэкст трох электаральных прарываў да дэмакратыі, можа падацца, што аўтарытарныя кіраўнікі проста самі капалі сабе яму. Сербы і грузіны былі па горла сытыя вайной, галечай і карупцыяй, што разбуралі іх жыцці і руйнавалі іх

грамадствы. У параўнанні з Сербіяй і Грузіяй, Украіна выглядала лепей. Прынамсі, у яе нядаўняй гісторыі не здаралася катастрафічных войнаў і калапсу сацыяльнай сістэмы. Але беднасці, сацыяльнай несправядлівасці, карупцыі і цынізму ўлады было зашмат, каб забыцца на іх нават пасля пары гадоў эканамічнага росту.

Народная незадаволенасць няздарнай і карумпаванай уладай была далёка не адзіным чыннікам рэвалюцыі. Насамрэч адбыўся не бунт падданых супраць «кепскага цара», а шырокі ўздым грамадзян, гатовых бараніць свой свядомы выбар – выбар дэмакратычнага шляху.

Моцная, рашучая, з'яднаная і добра арганізаваная апазіцыя ёсць неабходнай перадумовай электаральнай рэвалюцыі. Такога стану апазіцыі лягчэй дасягнуць, калі рэжым слабы і калі выбары яшчэ маюць нейкае значэнне. Але гэта не робіць

змену ўлады аўтаматычнай. У найноўшай гісторыі дэмакраты ў нашым рэгіёне – з трыма названымі краінамі ўключна – найчасцей набывалі сумную вядомасць сваімі расколамі, унутранай грызнёй і неўтаймаванымі асабістымі амбіцыямі. Калі амбіцыі ўтаймаваныя, а расколы пераадоленыя, перамога становіцца больш верагоднай. Яе лягчэй здабыць, калі з шэрагаў апазіцыі вылучаюцца харызматычныя лідэры. Якраз гэта адбылося ў Грузіі з Саакашвілі і ва Украіне з дуэтам Юшчанкі і Цімашэнкі. Менавіта лідэры аб'ядналі апазіцыю ў абедзвюх краінах (цікава адзначыць, што і Саакашвілі, і Юшчанка паявіліся на палітычнай сцэне і прыцягнулі шырокую ўвагу як вышэйшыя ўрадоўцы тых рэжымаў, якія яны ўрэшце зрынулі). Інакш разгарнуліся падзеі ў Сербіі: там апазіцыя спачатку аб'ядналася, а потым дамовілася аб супольнай працы з кандыдатам, які мог перамагчы Мілошавіча. Хаця Ваіслава Каштуніцу цяжка назваць харызматыкам, стаўка на яго выявілася шмат з якіх прычын дужа ўдалай.

У цэлым, хоць электаральныя рэвалюцыі вымагаюць супадзення вялікай колькасці разнастайных фактараў, моцны лідэр здаецца менавіта той велічынёй, што звязвае іх у адзіны вузел. Мілошавіч мог пазбыцца ўлады і да 2000 г., але ніхто, акрамя Каштуніцы, не здолеў яго скінуць. Кучма абрыдзеў украінцам, якіх ён нацкоўваў міжсобку (усходнікаў на заходнікаў і наадварот), але без Юшчанкі наўрад ці нават распачалася б Памаранчавая рэвалюцыя супраць пераемніка, выбранага Кучмам. На шчасце, Мілошавіч недаацаніў Каштуніцы, а Юшчанка выжыў пасля атручэння. Аднак шмат дзе дэмакратам гэтак не шчасціць. Забойства, выкраданне, зняволенне альбо крывавая расправа з папулярным лідэрам апазіцыі можа адкласці перамены на гады або нават дзесяцігоддзі. Многія аўтарытарныя кіраўнікі на ўсім свеце захавалі ўладу і аднаасобна лідзіравалі ў рэйтынгах папулярнасці менавіта таму, што наўкола не было нікога, хто наэлектрызаваў бы грамадства, кінуўшы сур'ёзны выклік рэжыму.

РЭВАЛЮЦЫЯ
ПАВОДЛЕ
ПРАВІЛАЎ
Каб
зразумець

логіку электаральных рэвалюцый, трэба згадаць яшчэ адну важную дэталь: строгае захаванне іх лідэрамі права. Хаця яны маняцца парваць з мінулым і не саромеюцца, калі гэта неабходна, ужываць ціск (не абавязкова гвалт), яны стараюцца легітымізаваць сябе, гуляючы па правілах, усталяваных інстытутамі і лідэрамі, супраць якіх змагаюцца. Для Каштуніцы было важна атрымаць перамогу, прызнаную судом, а не

толькі
натоўпам,
які сабраўся
ў яго
падтрымку.
У грузінскім
выпадку
легітымнасць
перамогі
апазіцыі і
фармальная
пераемнасць
былі набыты
праз
дасягненне
кантролю
над
парламентам.
Ва Украіне
зарукай
набыцця
легітымацыі
ў рамках
існуючай
сістэмы былі
вялікая
прысутнасць
апазіцыі ў
парламенце
і здольнасць
Вярхоўнага
суда
прымаць
самастойныя
рашэнні.

Чаму захоўваць права так важна? Калі рэвалюцыя не выходзіць за межы юрыдычнага поля, зрынутыя кіраўнікі робяцца ізгоямі ў сістэме, правілы якой яны ўсталявалі. Чыноўнікі і сілавікі могуць знайсці прычыны, каб ухіліцца ад выканання

незаконных загадаў: калі ж яны не ўхіляцца, то рызыкуюць трапіць пад суд. Больш за тое, калі рэвалюцыя не выходзіць за межы права, дэмакраты-пераможцы адразу ж здабываюць сабе міжнародную легітымнасць, што ўзмацняе новую ўладу. І, нарэшце, калі рэвалюцыя выконвае літару закону, аспрэчыць новую палітычную рэчаіснасць блізу немагчыма. І наадварот, як сказаў актывіст украінскіх пратэстных акцый, «уладу, захопленую на вуліцах, згубіць гэтаксама лёгка, як набыць». Але каб рэвалюцыя адбылася ў межах права, трэба, каб у старой сістэме быў пэўны ўзровень плюралізму, дастатковы для паспяховай абароны выніку выбараў у парламенце, судах і выбарчых камісіях. Таму, бадай, электаральныя рэвалюцыі ёсць шляхам да дэмакратыі збольшага ва ўмовах некансалідаваных недэмакратычных (або напаўдэмакратычных) рэжымаў, дзе дэмакратыя застаецца фасадам, але фасадам занадта вышуканым і важным, каб яго разбурыць. Украінскія выбары, як шмат у чым і выбары ў Сербіі і Грузіі, паказваюць, наколькі істотна адрозніваецца палітычная рэальнасць у грамадствах, якім уласцівы і аўтарытарызм і плюралізм («канкурэнтны аўтарытарызм», калі ўжываць паліталагічную тэрміналогію), і ў грамадствах, у якіх праводзіцца больш жорсткая аўтакратычная лінія. Адрозненне палягае ў тым, што пры канкурэнтным аўтарытарызме галасаванне яшчэ мае значэнне, і як правіла, сапраўды падлічваюцца галасы выбарцаў.

Вядома, на агаворку «як правіла» варта звярнуць увагу: у такіх краінах здараюцца фальсіфікацыі выбараў. Таму дэмакраты маюць патрэбу ў галасах, якія кампенсавалі б патэнцыйна скрадзеныя. Ім таксама трэба ўмець вывесці людзей на вуліцу: самачынна сфальсіфікаваныя вынікі выбараў ніхто не абскардзіць і не адменіць. Колькасць людзей, выведзеных на вуліцы, павінна быць такой, каб паліцыя не здолела іх нейтралізаваць.

Узровень электаральнай падтрымкі апазіцыі, які дазваляе ёй распачаць рэвалюцыю, у розных краінах розны. У Грузіі, напрыклад, ён быў вельмі нізкі. Нават паводле незалежных экзіт-полаў, Нацыянальны рух Міхаіла Саакашвілі набраў усяго 26% галасоў на першых, сфальсіфікаваных выбарах. Эдуард Шэварднадзе фактычна ўжо страціў краіну нават напярэдадні выбараў, згубіўшы кантроль над сіламі бяспекі і збольшага над дзяржаўным апаратам. Узровень падтрымкі быў значна

вышэйшым у Сербіі, дзе Каштуніца адолеў Мілошавіча на выбарах 2000 г. Хоць Мілошавіч быў гатовы пазмагацца і пастраляць, масы, мабілізаваныя апазіцыяй, вельмі хутка спынілі сваволю паліцыі.
Украіна знаходзілася дзесьці пасярэдзіне. Рэжым быў гатовы на многае, хоць, мабыць, не на праліццё крыві (Януковіч нібыта патрабаваў ад Кучмы ўжыць сілу, але і для яго атрымаць уладу, запэцкаўшы рукі ў крыві, было дужа праблематычна). Юшчанкава электаральная перамога не была пераканаўчай, нават калі экзіт-полы паказалі, што ў другім туры выбараў яго рэальная перавага вымяралася 4–10 % галасоў. І дарма што здольнасць лідэраў Памаранчавай рэвалюцыі мабілізаваць сваіх прыхільнікаў здзівіла свет, ім як найхутчэй патрабавалася юрыдычная легітымацыя – хутчэй, чым, напрыклад, сербскай або грузінскай апазіцыі. Таму ва ўкраінскай сітуацыі ваганні былі даўжэйшыя і ўсё скончылася кампрамісам бакоў – унясеннем змен у Канстытуцыю.
У сістэмах канкурэнтнага аўтарытарызму легальнасць важная не толькі для апазіцыі, а і для служак рэжыму. Яны не саромеюцца парушаць правілы і красці галасы, аднак імкнуцца давесці, што іх улада была падтрымана народам на больш ці менш сумленных выбарах (іншымі словамі, калі б галасы не былі скрадзеныя, рэжым бы ўсё адно перамог). Яны маюць патрэбу ў пэўным дэмакратычным фасадзе і легітымацыі. Як вынік, яны стараюцца гуляць з дэмакратычнымі працэдурамі часцей, чым іх больш просталінейныя калегі-дыктатары, а калі апазіцыя выкрывае махлярствы, яны напачатку больш клапоцяцца, каб іх прыхаваць, чым здушыць пратэсты. Больш за тое, у такіх краінах кіраўнікі недаацэньваюць апазіцыю – яны ж ужо паспяхова і без вялікай напругі стрымлівалі акцыі пратэсту! Таму, калі сіла ціску апазіцыі на іх уладу павялічваецца, рэпрэсіўны апарат аказваецца папросту не гатовым дзейнічаць хутка, эфектыўна, і, што самае важнае, не здольны гуляць на апярэджанне.

ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ

У кожнай з названых электаральных рэвалюцый

поспех
дэмакратычнай
апазіцыі
залежаў ад
дапамогі,
аказанай ёй
грамадзянскай
супольнасцю,
прычым
роля і
важнасць
апошняй
былі
выключнымі.
Рэвалюцыі
прадэманстравалі
моцныя бакі
грамадзянскай
супольнасці,
і гэта
павінна
паменшыць
шырока
распаўсюджаны
скепсіс што
да
эфектыўнасці
праграм
развіцця
дэмакратыі
ў нашым
рэгіёне.
Крытыкі
лічылі, што
гэтыя
праграмы
маюць
вынікам
адно
«бездапаможны

плюралізм» і
ствараюць
самадастатковы
пласт
гарадскіх
інтэлектуалаў,
залежных ад
замежнай
дапамогі.
Няўрадавы
сектар, з
гледзішча
заходніх
стандартаў,
тут
сапраўды
невялікі і ў
значнай
ступені
палітызаваны.
Але
менавіта
такая
апазіцыйна
настроеная
грамадзянская
супольнасць
і патрэбная
для поспеху
электаральных
рэвалюцый.
У кожным
выпадку,
можна
сцвярджаць,
што ў
грамадствах
такога тыпу
няўрадавыя
арганізацыі

павінны
быць
перадусім
палітычнымі:
спрабуючы
ўзмацніць
грамадзянаў,
яны
змушаны
аслабляць
рэпрэсіўную
магутнасць
дзяржавы,
прынамсі,
пры
аўтарытарных
рэжымах.

Мабілізацыйныя здольнасці групаў накшталт «Отпору» і «Хмары» былі падмацаваны гатоўнасцю іх членаў шмат працаваць і рызыкаваць. Прафесійныя, падрыхтаваныя пры дапамозе заходніх методык кіраўнікі, PR-адмыслоўцы і назіральнікі за выбарамі ўтварылі «фабрыкі думак», аб'ядналі свае інтэлектуальныя сілы, каб адказаць на ўсе хітрыкі, што загатавалі ўлады (заўважце, да прыкладу, як выкарыстанне простых мадэляў з падручніка матэматыкі дазволіла ім лёгка давесці, што выбары былі сфальсіфікаваныя). І калі НДА выступілі за яднанне дэмакратычнай апазіцыі замест таго, каб загрузнуць у партыйных спрэчках, яны рабілі найлепшую паслугу для збліжэння апазіцыі з грамадствам. Сваю малалікасць НДА кампенсавалі рашучасцю, інтэлектуальным рэсурсам і здаровым сэнсам.
Безумоўна, такая грамадзянская супольнасць вырастае гадамі, і яе развіццё магчымае толькі ў больш ці менш ліберальным палітычным і сацыяльным асяроддзі. Да таго ж, рэвалюцыянеры былі здольныя хутка інфармаваць грамадства аб рэальным ходзе выбараў таму, што ва Украіне, нягледзячы на націск з боку ўладаў і алігархаў, яшчэ захоўваліся свабодныя СМІ.
Іншай істотнай перадумовай электаральных рэвалюцый ёсць

слабасць «мяккага» аўтарытарнага рэжыму. Напрыклад, масавы пераход у апазіцыю знакамітых дзеячаў культуры і спартовых «зорак», як у Сербіі, Грузіі і ва Украіне, наўрад ці б адбыўся пры больш скансалідаваных дыктатурах. Калі б паліцыю і службы бяспекі цягам доўгага часу навучалі падпарадкоўвацца толькі загадам, а не закону, сілавікі не чакалі б юрыдычнай легітымацыі сілавых акцый. У грамадствах, дзе аўтарытарызм мацнейшы, сябры выбарчых камісій больш баяцца не пераследу за выбарчыя фальсіфікацыі, задакументаваныя назіральнікамі, а страты працы праз незабеспячэнне выніку, патрэбнага іх кіраўніцтву.

НЕКАНСАЛІДАВАНАЯ ЎЛАДА

Адсутнасць усёахопнага аўтарытарнага кантролю над дзяржаўнымі інстытутамі (і вертыкальнага, і гарызантальнага) робіць электаральныя рэвалюцыі больш верагоднымі. Памяркоўна-ліберальнае палітычнае жыццё дазваляе апазіцыі трапіць у парламент і вольна дзейнічаць у перыяд

паміж
выбарамі.
Істотная
дэцэнтралізацыя
ўлады
азначае, што
цэнтральны
ўрад будзе
няздольны
трымаць
нездаволеных
пад
кантролем у
маштабе
краіны
нават пры
дапамозе
ўжывання
сілы. Калі
мясцовыя
ўлады на
адным баку
з апазіцыяй і
далучаюцца
да
пратэстаў,
вельмі лёгка
сабраць
калоны
бульдазераў,
машын і
аўтобусаў
для паходу
на ключавыя
гарады.
Шанцы на
абарону
перамогі на
выбарах, на
паспяховы

супраціў фальсіфікацыям узрастаюць, калі такія сегменты цэнтральнай улады, як парламент і суды, дзейнічаюць згодна з правам, а не пад уплывам страху ці меркаванняў лаяльнасці.

Дэцэнтралізацыя нефармальнай улады і ўплыву, здзейсненая эканамічнымі сродкамі, таксама мае ключавое значэнне. Ва ўсіх трох краінах (хаця і ў рознай ступені) алігархічны капіталізм паўставаў адначасна з некансалідаванымі канкурэнтнымі аўтакратыямі. Дэцэнтралізацыя фінансаў была лагічным дадаткам да дэцэнтралізацыі ўлады. У выніку ўзнікла палітычна і эканамічна выбухованебяспечная сумесь. Як толькі былыя ўрадоўцы перайшлі ў стан апазіцыі і забралі з сабою грошы, што ляжалі на банкаўскіх рахунках у афшорах, фінансавыя справы апазіцыі палепшыліся, што пазбавіла яе залежнасці ад замежнай дапамогі (якая заўсёды недастатковая, каб прафінансаваць скіданне кіраўнічага рэжыму). Карумпаваны капіталізм можа, такім чынам, дапамагчы разбурыць тую самую палітычную сістэму, якая яго спарадзіла. Апошняе лікам, але не значэннем: істотнай прычынай поспеху ўсіх трох рэвалюцый была самазадаволенасць уладаў. Мілошавіч шчыра верыў, што ён набярэ 70% галасоў на выбарах, якія прывялі яго на лаву падсудных у Гаагу. Шэварднадзе, магчыма, страціў пачуццё рэчаіснасці яшчэ ў большай ступені, чым Мілошавіч. Кучма і Януковіч, наадварот, унікалі рызыкі. Але і яны не ўлічылі ўсяго: паводле іх логікі, высокі працэнт выбарцаў, што падтрымлівалі дзеючага прэм'ер-міністра на ўсходзе і неабмежаваны адміністрацыйны кантроль

у заходніх абласцях мусілі, у выпадку неабходнасці, зрабіць крадзеж галасоў простым і адносна абмежаваным. Аднак гэтая логіка выявілася фатальнай. Януковіч мог бы падманам дамагчыся прэзідэнцкага крэсла, калі б фальсіфікаванне адбывалася на працягу кароткага часу ў дробных раёнах па ўсёй краіне. Замест гэтага яму давялося зрабіць стаўку на доўгатэрміновую фальсіфікацыю ў невялікай колькасці абласцей. Паколькі яго апорай былі Данецк і Луганск, махлярствы сталі кідацца ў вочы як украінскім выбарцам, так і апазіцыі ды міжнародным назіральнікам.
Аднак слабую кансалідаванасць старых рэжымаў нельга тлумачыць адно самазадаволенасцю іх вышэйшага кіраўніцтва. Палітолагі (Люкан Вэй і інш.) уважаюць, што такія рэжымы «плюралістычныя па змаўчанні»; размаітасць сацыяльных, культурных, эканамічных і палітычных падзелаў фрагментуе палітыку і расцярушвае ўладныя рэсурсы ўжо таму, што ніводная палітычная сіла ці індывід не здольныя захапіць усёй улады. У апісаных грамадствах няма ні гамагеннасці патрыярхальных супольнасцяў, якая дазволіла б умацаванне прымітыўнага «султанісцкага» ладу, ні ўсёахопнай дэмакратычнай палітычнай культуры кансэнсусу і кампрамісу. Да пэўнага часу граць на падзелах выгадна кіраўнічаму рэжыму: такая палітыка дае яму гатовую сацыяльную базу і гатовую задачу – «абараніць» сваіх лаяльных прыхільнікаў ад небяспечных «ворагаў», ці то празаходніх лібералаў, ці то нацыяналістаў, ці то тых і другіх адначасова. Але яна таксама дазваляе апазіцыі мабілізаваць тых, хто выціснуты рэжымам на перыферыю грамадства.
Вядома, многім цвердалобым аўтакратам удаецца дамінаваць і над падзеленымі грамадствамі, што можна патлумачыць менавіта іх гатоўнасцю да ўжывання сілы дзеля дасягнення гамагеннасці: яны ператасоўваюць рэгіянальныя эліты, знішчаюць незалежныя крыніцы даходаў і пільна кантралююць або цалкам падпарадкоўваюць сабе сродкі масавай інфармацыі. Усё гэта было пры Кучму і Шэварднадзе. Горш гэтая мадэль пасуе да Сербіі. Жадаючы мець рэпутацыю лідэра, які гуляе паводле правіл, Мілошавіч захоўваў напаўпрэзідэнцкую форму кіравання, дазваляў выбары мясцовых адміністрацый і пакідаў значную прастору для апазіцыі і інстытутаў грамадзянскай супольнасці. Правілы гульні значна змяніліся напярэдадні

калапсу рэжыму, але ўзмацненне жорсткасці аўтакратычнага рэжыму Мілошавіча адбылося ўжо пасля таго, як электаральная перавага апазіцыі стала яўнай. Супрацоўнікі «National Endowment for Democracy», дзе цяпер працуе аўтар гэтых радкоў, прыгадваюць пачатак 1990-х, калі іх крытыкавалі за «падтрымку груповак, што процістаяць дэмакратычна абранаму прэзідэнту Мілошавічу». Выбар на карысць гульні ў дэмакратыю, нават у яе найбольш вылегчанай форме, які зрабілі памянёныя лідэры, адно ўзмацніў тыя асаблівасці палітычнага і грамадскага жыцця, якія ўскладнілі знішчэнне плюралізму. Яны, такім чынам, адкрылі дзверцы для дэмакратыі, даўшы магчымасць дэмакратам набраць даволі сілаў, каб заваяваць уладу.

ЧАМУ
БУДЗЕ
ЦЯЖКА
ЎЧЫНІЦЬ
НОВУЮ
РЭВАЛЮЦЫЮ

На жаль,
вірус
дэмакратыі
пашыраецца
далёка не
паўсюль, і
новыя
прарывы да
дэмакратыі
на
постсавецкай
прасторы
ўчыніць
будзе значна
цяжэй. Як ні
дзіўна,
менавіта
дэмакратычныя
рэвалюцыі
апошніх
гадоў

ускладняць
(а не
спросцяць)
іх
ажыццяўленне.

Для пачатку адзначым, што многія з астатніх дзяржаў, якія калісьці ўваходзілі ў Савецкі Саюз, папросту не маюць адзнакаў канкурэнтных аўтарытарных сістэм. Улада сканцэнтравана ў руках прэзідэнтаў, а прадстаўнічыя інстытуцыі выконваюць дэкаратыўныя функцыі. Кантроль за эканамічнымі рэсурсамі яшчэ больш канцэнтраваны, часткова дзякуючы наяўнасці лёгка кантраляваных прыродных рэсурсаў. Пра незалежных алігархаў альбо нічога не чутно, альбо яны былі планамерна знішчаны, альбо знаходзяцца ў стадыі знішчэння. Кантроль за фінансавымі рэсурсамі часта дапамагае падтрымліваць высокую ступень грамадскай згуртаванасці, паколькі спрашчае размеркаванне грошай (Шэварднадзе доўга не плаціў заробкаў сваёй службе бяспекі, але азербайджанскі прэзідэнт Гейдар Аліеў і беларускі Аляксандр Лукашэнка такой памылкі ніколі не рабілі). Эліты былі старанна вычышчаныя і ператасаваныя з мэтай прадухіліць узнікненне ўнутранай апазіцыі, а іншадумства строга караецца. Грамадзянская супольнасць і палітычная апазіцыя слабыя (калі яны ўвогуле існуюць); калі ж ім удаецца набыць пэўны ўплыў, іх адразу імкнуцца знішчыць і дыскрэдытаваць. Найбольш уплывовых і харызматычных лідэраў апазіцыі садзяць у турму па сфабрыкаваных абвінавачаннях, мяшаюць з брудам у падкантрольных рэжыму СМІ альбо робяць з імі штось яшчэ горшае (успомнім, напрыклад, пра «знікненні» беларускіх апазіцыйных палітыкаў). Рэшта апазіцыі застаецца напалоханай альбо няздольнай для змагання.
Так, больш кансалідаваныя аўтарытарныя рэжымы яшчэ праводзяць выбары, але робяць стаўку не так на падтасоўку галасоў і паслявыбарныя рэпрэсіі (як у мякчэйшых версіях недэмакратычных сістэм), як на знішчэнне сваіх апанентаў, падрываючы такім чынам веру ў саму магчымасць палітычных зменаў шляхам выбараў. Яны старанна песцяць міф, што лідэру такой палітычнай сістэмы няма альтэрнатывы, а ў шырэйшым сэнсе – што няма альтэрнатывы і самой такой палітычнай

сістэме. Яны праводзяць выбары, толькі калі ведаюць, што кандыдат ад сістэмы ўжо перамог. Рэпрэсіі ў такіх сістэмах – не сродак самазахавання, а лад жыцця.
Безумоўна, Расія і Арменія ў параўнанні з дэспатыямі Цэнтральнай Азіі яшчэ выглядаюць астоямі лібералізму, але нават «мякчэйшыя» аўтакраты хутка цямяць, што «слабым» рэжымам не працягнуць доўга. Яны робяць выснову: трэба гуляць на апярэджанне.

БЕЛАРУСКІ ПРЫКЛАД

Эвалюцыя ці, больш дакладна, дэградацыя Беларусі цягам апошніх некалькіх гадоў навочна дэманструе, якія формы можа набыць такая гульня на апярэджанне. Пабачыўшы на ўласныя вочы крах Мілошавіча ў 2000 г., Лукашэнка публічна абвясціў, што галоўны ўрок, які ён атрымаў з гэтага падзення –

«уладу трэба
бараніць».
Ад таго часу
Беларусь,
якую доўга
ўважалі за
мяккую
дыктатуру,
паколькі ў
ёй
заставалася
значнае
месца для
незалежных
арганізацый
і
інтэлектуальнага
жыцця, калі
не для
палітычнага
плюралізму,
пачала
хуткімі
тэмпамі
ператварацца
ў жорсткую
дыктатуру. І
яна
становіцца
ўсё больш
жорсткай.
Літаральна
за некалькі
тыдняў да
Памаранчавай
рэвалюцыі
Лукашэнка
прапіхнуў у
канстытуцыю
папраўку,

якая
адкрыла яму
шлях да
пажыццёвага
прэзідэнцтва.

Незалежныя сацыёлагі даводзяць, што Лукашэнка ўпершыню мог бы прайграць на апошнім рэферэндуме, калі б падлік галасоў быў сумленным. Але няма ніякай гарантыі, што ён бясконца будзе здавальняцца адно падтасоўкамі галасоў і застанецца «больш ці менш» законна абраным прэзідэнтам. Прызначэнне Віктара Шэймана на пасаду кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі гаворыць само за сябе: Шэймана падазраюць ва ўдзеле ў выкраданні палітычных апанентаў Лукашэнкі ў 1999 і 2000 гг. Да таго ж Лукашэнка і сам выказаўся шчыра: «Падзеі ва Украіне паказалі, што сучасныя палітычныя тэхналогіі ва ўмовах слабага кіравання краінай могуць мець сур'ёзныя наступствы». Таму, працягваў ён, яго ўладу трэба ўзмацніць. Прасцей кажучы, ліквідацыя партый і НДА будзе працягвацца, незалежным СМІ будуць затыкаць рот, апазіцыйных актывістаў будуць звальняць з дзяржаўнай працы, а заходніх назіральнікаў, журналістаў, грамадскіх актывістаў і праваабаронцаў выдаляць з краіны напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2006 г. (не факт, што апазіцыі ўвогуле дазволяць браць у іх удзел). Што да бліжэйшай перспектывы: разглядаецца законапраект аб экстрэмізме (чытай: любой дэмакратычнай актыўнасці).
Гульня на апярэджанне стала таксама першачарговым клопатам расійскага прэзідэнта Уладзіміра Пуціна, які, карыстаючыся завоблачным рэйтынгам, зліквідаваў у Расіі за апошнія некалькі гадоў амаль усё, што рабіла яе падобнай да Украіны: пад яго кантроль трапіла большая частка калісьці незалежных фінансавых патокаў, прэса і палітычныя партыі. Цяпер ён узяўся за НДА. Цэнтральнаазіяцкія лідэры таксама не сядзяць склаўшы рукі. Папераджальныя ўдары пакінуць пустэльны ландшафт там, дзе калісьці была апазіцыя (калі яна ўвогуле была). Стане больш небяспечна кандыдаваць на выбарах, займацца перадвыбарнай працай, галасаваць за апазіцыю і асабліва прызнаваць гэта публічна, выходзячы на вуліцы і баронячы свой выбар.

Аўтакраты, што перажылі гэтыя электаральныя рэвалюцыі, магчыма, нават прыйдуць да высновы, што найлепшы сродак унікнуць іх – проста пазбягаць канкурэнтных выбараў, калі не *de jure*, то *de facto*. Альбо іншы варыянт: можна да выбараў пасадзіць у турму ўсіх буйных апазіцыянераў, а не забараняць апазіцыю ўвогуле.

Але ўявім на хвіліну, што апазіцыі ўсё-такі дазволяць спаборнічаць з уладай на выбарах, бо ёй карціць дэкларацца, што рэжым застаецца дэмакратычным. Механізмы маніпуляцый становяцца ўсё больш адладжанымі і дасканалымі. Хто зможа сказаць, што галасы сапраўды падлічвалі, і што вынікі выбараў не зацвердзілі загадзя? У такіх абставінах дэмакратычныя апазіцыянеры, нават заваяваўшы розумы і сэрцы грамадзян, могуць не здолець здзейсніць таго, што ўдалося іх калегам з «мяккіх» аўтакратый, – даказаць сваё права на ўладу, не парушаючы законаў, напісаных папярэдняй уладай. Калі бюлетэні не даступны для пераліку, пратаколы не выдаюцца і не падпісваюцца, ніхто з членаў камісіі не гатовы публічна прызнацца ў махлярстве, ніводны суд не асмельваецца прыняць справу да разгляду, то ў апазіцыі мала шанцаў абвергнуць афіцыйныя лічбы. Можна ладзіць экзіт-полы, але іх лёгка сарваць (альбо заглушыць «афіцыйнымі» апытаннямі, якія дэманструюць амаль аднагалосную падтрымку прадстаўнікоў улады).

У такіх абставінах шляхі да палітычных перамен пралягаюць не цераз выбарчыя ўчасткі, і якімі б ні былі гэтыя альтэрнатыўныя шляхі, яны могуць стаць дужа доўгімі. Чакаць на постсавецкай прасторы ў бліжэйшы час смерці якогасьці прэзідэнта, дзяржаўнага пераварота альбо народнага паўстання было б нерэалістычна.

ЭКСПАРТ
АЎТАКРАТЫІ
Падобна
Лукашэнку,
аўтакратычныя
лідэры –
кіраўнікі
іншых краін
СНД будуць
бараніць

сваю ўладу.
Але
ўкраінская
рэвалюцыя
вельмі ясна
давяла ім:
яны павінны
бараніць
таксама
адзін
аднаго.
Гэтую
самаабарону
можна
назіраць у
паводзінах
назіральнікаў
на выбарах
ад СНД, якія
прызнаюць
любыя
выбары ў
рэгіёне
свабоднымі і
дэмакратычнымі.
Расія
крытыкавала
АБСЕ яшчэ
задоўга да
таго, як
Пуцін зрабіў
жорсткія
каментары
аб
«умяшальніцтве»
АБСЕ ў
выбары ва
Украіне.
Расійскі
лідэр даўно

не хаваў
свайго
жадання
выдаліць
пытанні
дэмакратызацыі
з парадку
дня АБСЕ, і
дзеля гэтага
Расія нават
спрабуе
адмовіцца
выплачваць
ёй
сяброўскія
складкі.

Аднак на ўкраінскіх выбарах мы ўбачылі нешта горшае. Крэмль пабіў рэкорды паводле падтрымкі аўтакратычных кіраўнікоў, але звычайна ён падстаўляе плячо тым, чыя палітычная будучыня забяспечана і без вонкавай падтрымкі (напрыклад, Лукашэнку і Аліеву). Насамрэч Крэмль не спрабаваў абараніць лідэраў накшталт Мілошавіча і Шэварднадзе, чый крах здаваўся непазбежным. Ніколі ў найноўшай гісторыі Расіі Крэмль не мяшаўся так недарэчна, як ва Украіне, у справы іншай краіны, спрабуючы навязаць не проста прарасійскага лідэра, а і сістэму адносін паміж уладай і грамадствам, падобную да расійскай. Яна была больш закрытая і аўтарытарная, чым тая, што існавала ва Украіне ў часе кіравання Кучмы.
Не будзе перабольшваннем назваць гэтае ўмяшанне спробай экспарту аўтакратыі.
На шчасце, Крэмль (на цяперашні момант) прайграў дзякуючы памылковаму разліку і фанабэрыі – і не толькі сваёй. Гэтыя выбары рэкламаваліся як бітва паміж Усходам і Захадам, бо сёй-той верыў, што такі падыход прынясе лёгкую перамогу Януковічу. Фактычна ідэя «выціснуць» Юшчанку на захад была запушчана штабам Януковіча, хаця працавала над ёй армія крамлёўскіх прыдворных аналітыкаў і іміджмэйкераў (такіх як Глеб Паўлоўскі, Сяргей Маркаў, Вячаслаў Ніканаў і Марат

Гельман). Паводле словаў Міхаіла Лявонцьева, кансерватыўнага тэлеаглядальніка першага расійскага канала, «Юшчанку бракуе галасоў, і, у прынцыпе, у нармальных умовах ён не можа іх заваяваць, таму што ва Украіне нацыянальна свядомы празаходні электарат складае жалю годную меншасць».

Крэмль і спансараваныя ім агітатары і прапагандысты дагэтуль не ў стане ўцяміць, што Украіна – не Расія. Адрозненні ў палітычнай культуры двух народаў такія, што ўкраінцы значна цяжэй паддаюцца прамыванню мазгоў з дапамогай лозунгаў і сімвалаў, ужываных для легітымізацыі ўлады Крамля. Значэнне падзелу паміж усходняй і заходняй часткамі краіны таксама перабольшана. Урэшце, памкненне ўкраінцаў да дэмакратыі мае грунт не толькі ў традыцыях захаду – Магдэбургскім праве, якое надавала адмысловыя правы Кіеву ў Вялікім Княстве Літоўскім, але і ўсходу – у традыцыі казацкай рэспублікі, Запарожскай Сечы, якая нават пад расійскай уладай захоўвала значную аўтаномію. За выключэннем пары рэгіёнаў, украінцы авалодалі ва ўсёй краіне пачуццем калектыўнай ідэнтычнасці і салідарнасці, дарма што адна палавіна іх гаворыць па-ўкраінску, а другая – па-расійску. Умела спалучыўшы нацыяналізм з дэмакратычнымі ідэямі, Юшчанка пераадолеў культурныя бар'еры і амаль гэтак жа эфектыўна заваяваў душы вялікай колькасці праваслаўных і расійскамоўных насельнікаў украінскага ўсходу, як і жыхароў захаду краіны. Тым самым расійская прапаганда дапамагла Юшчанку з'яднаць Украіну, паспрыяўшы палітычнаму і дыпламатычнаму правалу Крамля. Між тым, гэты пралік выявіў сумную рэальнасць: Расія недалёка адышла ад свайго ранейшага ладу мыслення і паводзін. Ва ўкраінскім выпадку расійская эліта – і, верагодна, сам Пуцін – прыйшла да высновы, што дэмакратызацыя Украіны будзе пагражаць Расіі і таму мусіць быць прадухілена любым коштам. «Калі мы згубім Украіну, – сказаў Вячаслаў Ніканаў, адзін з сумнавядомых іміджмэйкераў Януковіча, – Захад будзе ставіцца да нас, як да бананавай рэспублікі». Іншыя заявы папросту межавалі з істэрыкай. «Чаму мы прайграем аксамітныя рэвалюцыі?» – пыталася, напрыклад, «Комсомольская правда» (гэтае пытанне выявілася нечакана глыбокім: па логіцы выходзіць, што Расія «прайграла» ўласную аксамітную рэвалюцыю ў жніўні 1991 г.).

Горш за тое, гэтыя старамодныя паводзіны Крамля заспелі знянацку шмат каго на Захадзе, бо з 11 верасня 2001 г. Расія лічылася хаўруснікам дэмакратычнага свету. Насамрэч жа Расія пагадзілася на новае партнёрства шмат у чым для ажыццяўлення новага падзелу зонаў геапалітычнага ўплыву. Прызнанне Амерыкай Пуціна як хаўрусніка і партнёра было прадыктавана, напэўна, цынічным ладам мыслення, запазычаным у «рэалістычнай» школы міжнародных адносін: маўляў, не важна, якая ўнутраная палітыка дзяржавы, калі яна праводзіць правільны замежны курс. У крамлёўскім істэблішменце хутка павялі рэй «ястрабы з ястрабаў». Сапраўды, унутры Расіі ўяўленне пра сябе як пра крэпасць, абложаную вераломным і гегеманічным Захадам, не аспрэчвалася нават тады, калі на сусветнай арэне Пуцін гуляў у пай-хлопчыка з Бушам і, калі гэта было неабходна, з еўрапейскімі лідэрамі. (Антызаходняя, аўтарытарная рыторыка дасягнула новага піку пасля тэракту ў Беслане: калі Пуціну давялося растлумачыць поўны правал уласнай «вертыкалі ўлады», ён спіхнуў усё на развал Савецкага Саюза і заявіў аб змове супраць Расіі.)

Ігнараванне праблем з дэмакратыяй у Расіі і, у шырэйшым сэнсе, на ўсёй постсавецкай прасторы магло прывесці да паразы ўкраінскай рэвалюцыі. Калі б гэта здарылася, віну трэба было б ускласці пароўну на ЗША – з прычын, пералічаных вышэй – і на тых адказных асоб Еўрапейскага Саюза, чыя ўпартая адмова разгледзець саму магчымасць уваходжання ў еўрапейскую супольнасць усходніх суседзяў ЕС павышала папулярнасць антыдэмакратычных элементаў ва Украіне і павялічвала ўпэўненасць Расіі, што заходняя частка былога Савецкага Саюза застаецца «ейнай» зонай уплыву. Заўважым, што заходняя дыпламатыя ўратавала сваё аблічча ва Украіне дзякуючы найперш намаганням новых сяброў ЕС, такіх, як Польшча і Літва, чыя ўласная барацьба за дэмакратыю завяршылася не так даўно і чые ўспаміны пра маскоўскую «зону ўплыву» застаюцца жывымі.

Найлягчэйшая задача Пуціна цяпер – наладзіць адносіны з Украінай. Крыху цяжэй будзе яму аднавіць давер у ягоных гешэфтах з Захадам. Аднак найважнейшы і найвялікшы выклік Пуціну знаходзіцца ўнутры самой Расіі. Зрабіўшы стаўкі на ўкраінскіх выбарах, Пуцін можа аказацца ў вачах расійцаў

«прэзідэнтам, які страціў Украіну». Каб гэтага пазбегнуць, яму давялося б прызнаць, што Крэмль, падкантрольныя яму СМІ і большая частка расійскай эліты бессаромна хлусілі расійскаму грамадству, распальваючы нянавісць да «братняй нацыі» і пагражаючы, між іншага, ейнай тэрытарыяльнай цэласнасці. Але ці не страцяць тады расійцы давер да ўсяго, што ім даводзілася чуць пра Чачню, Беслан, апазіцыю, алігархаў, праваабаронцаў, асабліва з улікам таго, што цягам апошніх двух гадоў прапаганда на гэтыя тэмы вядзецца тымі ж людзьмі, што штурхнулі Пуціна да ўкраінскай катастрофы? Безумоўна, страцяць. Таму трэба чакаць новых высілкаў для «захавання твару» і далейшага разбурэння элементаў канкурэнцыі і плюралізму ў расійскім палітычным ладзе.
Але ёсць і лепшыя навіны. Памаранчавая рэвалюцыя прытупіла асноўныя віды палітычнай зброі Расіі, якой тая карысталася ў краінах «блізкага замежжа». Украінцы давялі, што можна паспяхова супраціўляцца палітычнаму шантажу: адначасова падупалі і шанцы Расіі на выкарыстанне «мякчэйшых» тэхнік захавання яе кантролю. Адным з такіх сродкаў была расійская мова, нават важнейшая для падтрымання палітычнага ўплыву на захадзе СНД (з Малдовай уключна), чым нафта і газ. У перыяд украінскай кампаніі Расія пераацаніла значэнне мовы як палітычнага інструмента: у выніку значная частка расійскамоўных рэгіёнаў у цэнтральнай і нават усходняй Украіне не збаялася казак аб дзікіх нацыяналістах і падтрымала Юшчанку. Факт, што расійскія СМІ карыстаюцца папулярнасцю ў гэтых рэгіёнах, толькі яшчэ раз паказаў украінцам, наколькі іх краіна адрозніваецца ад Расіі. Сапраўды, украінская мова адыграла ключавую ролю як чыннік мабілізацыі нацыяналістычных элементаў апазіцыі. Але расійская мова не мела аналагічнага мабілізацыйнага ўплыву на прарасійскіх выбарцаў. Такім чынам, супярэчнасці паміж расійскамоўнасцю і антырасійскасцю ва Украіне ўжо няма. Другім інструментам «мяккай» улады, чый уплыў яўна зменшыўся, была праваслаўная царква. Між тым, ён не вычэрпваецца шырокамаштабным выступленнем маскоўскага патрыярхату на баку Януковіча і нагнятаннем жарсцяў сярод прыхаджанаў РПЦ. Калі пераходны перыяд ва Украіне пройдзе паспяхова, то на першы погляд неаспрэчны тэзіс Сэмюэля Гантынгтана: маўляў, паміж усходнім праваслаўем і

дэмакратыяй ляжыць непераадольная бездань, будзе канчаткова выкінуты на сметнік гісторыі. Нішто не абвяргае гэты тэзіс лепей, чым той факт, што ўсе тры апошнія электаральныя рэвалюцыі (у Сербіі, Грузіі і Украіне) былі здзейсненыя ў праваслаўных краінах. Апрача таго, дэмакратыя відавочна набірае сілу на Балканах (яшчэ адзін дэмакратычны прарыў адбыўся ў патрыярхальнай Румыніі ў снежні 2004, краіне, у якой пераважае ўсходняе праваслаўе). Гэтыя падзеі не толькі пакідаюць Расію ў ізаляцыі сярод яе «братоў па веры» (за выняткам бацькі Лукашэнкі, які наўрад ці ёй дапаможа), але і даюць падставу крытыкаваць гантынгтанаўскія візіі там, дзе іх яшчэ прапагандуюць.

ХТО
НАСТУПНЫ?
Пасля
кожнай
новай
дэмакратычнай
рэвалюцыі
ўзнікае
спакуса
будаваць
тэорыі на
тэму: чаму
народы, якія
не ўзнялі
такога
паўстання,
аказаліся
неўспрымальныя
да
дэмакратыі.
Усяго колькі
гадоў таму
многія
даследчыкі
проста
скідвалі з
рахункаў
сербаў і

ўкраінцаў.
Напэўна,
неўзабаве
з’явіцца
тэорыі, якія
патлумачаць,
чаму
беларусы,
армяне ды
расійцы
непадобныя
да сербаў і
ўкраінцаў.
Аднак
уважаць,
што ў
грамадствах,
запалоханых
рэпрэсіямі,
няма
сапраўднага
попыту на
дэмакратычныя
змены, было
б
найвялікшым
самападманам.

Гэта якраз тое, у чым назіральнікаў пераконваюць аўтарытарныя рэжымы, чые служкі не стамляюцца паўтараць, што рэальнай альтэрнатывы іх кіраванню няма. Варта толькі нагадаць здзіўленне італьянскага журналіста, якому выпала паназіраць за вулічнымі пратэстамі ў Бялградзе: «Дзе ж раней увесь час хавалася гэтая прыгожая, духоўная і натхняючая нацыя?» – недаверліва выгукнуў ён. Эпізоды Памаранчавай рэвалюцыі агаломшылі назіральнікаў яшчэ больш: хто мог падумаць, што Еўропа не заканчваецца на мяжы былога Савецкага Саюза (вядома, за выняткам балтыйскіх краін)? Аднак жа некаторыя ведалі і працавалі дзеля таго, каб ізноў прабіла гадзіна дэмакратыі. Аранжавы колер раптам

пашырыўся не толькі ў Польшчы і іншых краінах, дзе ўкраінскія эмігранты ладзілі пратэсты, але, што асабліва важна, на вуліцах Менску і нават Масквы. Калі дэмакратычная Украіна і не забяспечыць імклівага пераходу да дэмакратыі на постсавецкай прасторы, яе здабыткі не пойдуць на глум: магчыма, дэмакратыі пашырыць не ўдасца, але яны могуць дапамагчы выстаяць пры найгоршых прэвентыўных рэпрэсіях. Па-першае, прасоўванне дэмакратыі вымагае большай палітычнай падтрымкі з боку Захаду. Такая падтрымка, без сумневу, – справа больш законная і маральна апраўданая, чым палітычныя рэпрэсіі ў імя нацыянальнага суверэнітэту або экспарт аўтакратыі. Ясная рэч, прасоўванне дэмакратыі будзе азначаць розныя захады для Беларусі, Расіі і Казахстану і няхутка прынясе плён. Але ад яго нельга адмаўляцца: урэшце яно акупіцца. Больш за тое, трэба, наколькі магчыма, процідзеяць рэпрэсіям і маніпуляцыям: калі не ўдаецца прасоўваць дэмакратыю, нельга дапускаць пагаршэння сітуацыі ў грамадствах. Так, сведчанні аб выбарчых фальсіфікацыях павінны будзіць не проста сумневы ў дэмакратычным характары ўлады, які дазваляе несумленныя выбары, а ўздымаць пытанне пра легітымнасць рэжыму як такую. Там, дзе ёсць шанец дэмаскаваць і выкрыць фальсіфікацыі, палітычныя і дыпламатычныя захады павінны быць хуткімі і паслядоўнымі. Па-другое, украінскія выбары – ці, больш дакладна, няўдалая спроба сфальсіфікаваць іх вынікі – пацвердзілі шматлікія падазрэнні, што галасы выбарцаў выкрадаліся і ў іншых кутках былога Савецкага Саюза. Механізмы маніпуляцый і фальсіфікацый паўсюль падобныя, і дэмакраты мусяць шукаць шляхоў для выкрыцця падобных злоўжыванняў, дзе б яны ні здарыліся. Міжнародныя групы назіральнікаў на выбарах мусяць быць узмоцнены і навучаны выяўляць факты выбарчых фальсіфікацый і рэагаваць на іх як мага раней. Наведванне выбарчых участкаў, калі галасаванне ўжо пачалося, дапамагае прадухіліць найбольш відавочныя факты махлярства, але не больш за тое. Перад прыездам у краіну міжнародныя назіральнікі павінны даведацца ўсё пра прыёмы маніпуляцый, найбольш распаўсюджаныя ў ёй (падкіданне бюлетэняў у скрыні перад падлікам галасоў, унясенне хлуслівых звестак у пратакол пасля падліку і г. д.) і старацца прысутнічаць там, калі гэтыя прыёмы апрабоўваюцца.

Арганізацыі, што займаюцца падтрымкай дэмакратыі, таксама павінны перагледзець задачы сваёй працы на месцах. Выбары ўсё больш страчваюць сэнс на постсавецкай прасторы, але дэмакратычныя апаненты ўлады часам усё-такі маюць патрэбу браць у іх удзел – хаця б таму, што іначай ім цяжка знаходзіць шляхі для кантактаў з грамадзянамі. Таму актывістам мала толькі прышчапіць базавыя навыкі назірання за выбарамі і правядзення выбарчых кампаній. Ім трэба ведаць, як даносіць да грамадзтва свае лозунгі і працягваць сваю работу пры пастаянным пагаршэнні яе ўмоваў. Апрача таго, ім патрэбны новыя ідэі наконт таго, як выкрываць махлярствы пры галасаванні тады, калі фактычна адсутнічаюць базавыя ўмовы для назірання за выбарамі. Каб дэмакраты апыналіся на крок наперад за аўтакратаў, адгадваючы іх задумы, мала проста шчодрай падтрымкі дэмакратыі; трэба, каб яна была дальнабачнай і ўключала значныя інтэлектуальныя напрацоўкі.
Па-трэцяе, суседнія дэмакратыі не павінны кідаць на сваволю лёсу краіны, што нядаўна перайшлі да дэмакратыі, бо рэвалюцыйныя змены трэба ўмацоўваць, а станоўчы досвед развіцця гэтых краін можа натхніць іншыя. У прыватнасці, украінцы заслугоўваюць таго, каб скарыстацца выгадамі, якія дае ім блізіня да Еўрапейскага Саюза, у выглядзе павелічэння гандлю, паляпшэння візавага рэжыму і нават перспектывы палітычнай інтэграцыі, нават калі ў бліжэйшай будучыні яна не азначае сяброўства ў ЕС.
Па-чацвёртае, апошнім часам напоўніцу выявіліся жудасныя наступствы ігнаравання таго факту, што Расія спаўзла ў аўтарытарызм. Пытанне вяртання Расіі да дэмакратычных стандартаў становіцца пытаннем нумар адзін у адносінах Захаду з гэтай краінай, дзеля карысці суседніх дзяржаў і самой Расіі. Каб у будучыні пазбегнуць цяжэйшых інцыдэнтаў, трэба недвухсэнсоўна патлумачыць Крамлю, што выгады ад кааперацыі з Захадам прадугледжваюць пэўныя захады ад самой Расіі, а менавіта большага ўзроўню палітычнай свабоды ўнутры краіны і адмовы любой цаной падтрымліваць аўтарытарныя рэжымы на постсавецкай прасторы. Магчыма, Пуцін і не падобны да Мілошавіча (хаця яго ўяўленне пра Украіну як пра «цалкам расійскамоўную краіну» прымусіла многіх узняць бровы ад здзіўлення), але гэта не азначае, што ягоная роля «еўразійскага Мэтэрніха» адпавядае інтарэсам

Захаду, постсавецкіх краін і самой Расіі.
[image]
[image]

№ 2 (36) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/8
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

[image]

2[image]2005
"да Зьместу"

крытыка

паэмыка • эналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Пётра Рудкоўскі ОП Чатыры кулі для прэзыдэнта Каханьне і сьмерць у беларускай палітыцы

ПЁТРА РУДКОЎСКІ выбітны беларускі мысьляр.

Уладзімір Падгол. Куля для прэзыдэнта. - Санкт-Пецярбург: Карпон, 2004.

Для таго, каб збунтавацца супраць такой рэчаіснасьці, не патрэбна ідэалёгія. Фізіялёгіі дастаткова.

Зоэ Вальдэс[1]

Культура сьмяецца з палітыкі. Так было і так будзе заўсёды тады, калі

[1]Кубінская пісьменьніца-

палітыка ня хоча быць культурнай. Заўсёды будуць існаваць такія «маргіналы», якія нават у турме і ў труне будуць рагатаць з дыктатараў і волатаў, якія наіўна паверылі ўва ўласную ўсёмагутнасьць.

дысыдэнтка.

ПЕРШАЕ ЧЫТАНЬНЕ

«Крык дзіцяці кроіў паветра, быццам гіганцкая цыркулятарка», - гэтак Падгол распачынае свой «крымінальны» твор. Загадкавае дзіця зьявіцца таксама на самым канцы

раману з
інтрыгоўным
зваротам да
Прэзыдэнта
пазазямной
цывілізацыі:
«Я прыляцеў
за табой!
Пара
вяртацца
дамоў. Нам
не хапае
сапраўдных
беларусаў.
Такія, як ты,
мусяць
адрадзіць
беларусам
чалавечую
душу!
Ляцім?»

Безыменнае дзіця, можна сказаць, адкрывае і закрывае раман, але яно ня ўдзельнічае ў самой драматыцы, якая раскручваецца ў творы. Героямі ж, вакол якіх раскручваецца драматыка, зьяўляюцца: Сьмерць - таямнічая істота, зьняволеная дзьвюма сіламі: каханьнем і нянавісьцю, эратычнаю жарсьцю і прагай улады; Лявон Выліваха, старажытны беларус, які гуляе са Сьмерцю ў своеасаблівую гульню, дзе стаўкай ёсьць лёс беларусаў і лёс яго самога; Шклоўскі Ідал, Найлепшы і Лукапшык, «сьмяротная трыяда», над якой узносіцца Дух Першага Прэзыдэнта. Усе яны - «гадаванцы Сьмерці», якія гуляюць у яе камандзе і імкнуцца выбіць у Вылівахі ягоныя козыры; Настачка-Ластаўка - каханая Лявона і яго хаўрусьніца, менавіта яна ўручае яму таемную прыладу - «сканэр», пры дапамозе якога можна чытаць у мазгах ідалаў.
А ці сапраўды дзіця зьнікае са сцэны ўжо на самым пачатку? Ніяк не. Нованароджанае дзіця ў радзільным доме - гэта чытач. Так, менавіта чытач, узяўшы ў рукі «Кулю», перажывае той жудасны шок, які можна параўнаць толькі да шоку,

пераживанага дзіцем, якое пакідае бясьпечнае ўлоньне маці і трапляе ў супярэчлівы і халодны сьвет, сьвет, які экзыстэнцыялісты акрэсьлілі наймем «absurdum». Гэта чытач, трапіўшы ў Падголаў сьвет, пачынае крыкма крычаць, махаць рукамі й брыкаць нагамі, і ўсім сваім нутром працівіцца абсурду, які пануе ў гэтым сьвеце. А Падгол - гэта акушэр, які стаіць побач з чытачом-дзіцем і не дазваляе яму (і сабе) лезьці назад ува ўлоньне маткі, ён прымушае перажыць гэты вусьцішны шок. *Увесь раман - гэта рэчаіснасьць, незалежная ад Аўтара.*

Можна арыштоўваць Падгола і можна кідаць на яго праклёны і анатэмы, але рэчаіснасьць, адлюстраваная ў яго рамане, ня зьменіцца ад гэтага. Гэта ўжо наша праблема - ці залезем назад у бясьпечнае ўлоньне маткі й ператворымся ў сонны эмбрыён-зыготу, ці перажывём гэты шок, выкрыкнем яго зь сябе і пяройдзем на новы ўзровень сьвядомасьці.

«Крык» можна лічыць таксама фармальным акрэсьленьнем Падголавага твору. Бо першае, што прыходзіць на думку падчас чытаньня: гэта - літаратурны экспрэсіянізм. «Куля» - гэта глябальны, а нават касьмічны крык: неба, і зямля, і падземнае, здаецца, злучыліся ў «Кулі» ў адно ў нямым крыку над няшчасьцем Беларусі.

«Куля» - гэта таксама сюррэалістычны твор. Згадаць хаця б крыжаваньне Вылівахі ў «дзермакрэсьце» альбо фармаваньне зь беларускіх душаў гладзюсенькай кулі, па якой 40 дыктатараў зьяжджаюць голымі сракамі.

Падголаў твор можна таксама акрэсьліць наймем Дэлёзавага *rhisoma* (блытанае карэньне). Няма ў «Кулі» лінейнага часу і няма трохмернай прасторы, нарацыя пазбаўлена ўстойлівага цэнтру і арганізуючай ідэі. Адзінае, што, здавалася б, арганізуе ўвесь раман - гэта каханьне. Але каханьне знаходзіцца ў небясьпечна блізкай сутычнасьці са Сьмерцю, а тая ўвесь час дэзарганізуе і дэфармуе каханьне. Нічога дзіўнага, што каханьне ў творы амаль пазбаўлена рамантызму, а праяўляецца пераважна ў вульгарных, нават жывёльных формах. Ня можа быць цэнтрам і закаханы Выліваха, бо ў працэсе разьвіцьця падзеяў высьвятляецца, што ён заангажаваны ў будаваньне сьвету Шклоўскага Ідала, Найлепшага і Лукапшыка. Ён жа аказваецца другім Я мужа-садыста, які гвалціў Ластаўку. Ён таксама тоесны з Радзівілам «Пане Каханку», адным з сарака

дыктатараў, якія прасавалі беларускія душы! Усякая ідэя і ўсякі герой у рамане падлягае «дэцэнтралізацыі».
Дэцэнтралізацыі падлягае і сам панятак «куля». Пад канец раману іншаплянэтнікі спрачаюцца між сабой, як трэба правільна інтэрпрэтаваць выраз «Куля для прэзыдэнта». «Куля» можа мець, прынамсі, чатыры значэньні: 1) куля - зямны шар; 2) куля - пратэза; 3) куля - кулявая салома, якая сымбалізуе спрасаваныя «саламяныя» беларускія душы; 4) куля - снарад. Не да канца вядома - адзначаюць іншаплянэтнікі - як інтэрпрэтаваць прыназоўнік «для». Увесь выраз зусім ня мусіць значыць «забіць прэзыдэнта» (гэтая інтэрпрэтацыя была адкінута іншаплянэтнымі экспэртамі). Магчымыя інтэрпрэтацыі такія: «зямны шар - для прэзыдэнта», «пратэза - для прэзыдэнта», «беларускія душы - для прэзыдэнта». Невядома таксама, які прэзыдэнт маецца на ўвазе.
Твор Падгола - гэта прыклад «адкрытага мастацтва» ў Экавым разуменьні. Гэта крык, надрэчаіснасьць і дэканструкцыя адначасова. Тут цяжка сказаць, ці маем справу з дасканалым *мімэзісам*, адлюстраваньнем рэчаіснасьці, ці з суцэльным экспэрымэнтам. А калі гэта - мімэзіс, то мімэзіс *чаго*: сучаснай Беларусі, Аляксандра Лукашэнкі ці, можа, беларускай псыхікі ў яе калектыўным і індывідуальным аспэкце? Падчас «другога чытаньня» паспрабуем правесьці інтэрпрэтацыю твору, беручы яго як *адлюстраваньне беларускай псыхікі.*
Але нельга проста так абмінуць пытаньне пра маштабы Падголавага экспэрымэнту. Прынамсі, некаторыя асаблівасьці гэтага экспэрымэнту трэба назваць.
1. *Інтэртэкстуальнасьць.* У рамане маем справу зь некалькімі тэкстамі, дакладней, некалькімі відамі тэкстаў: ёсьць уласна Падголавы тэксты, Лукашэнкавы, Караткевічавы і біблійныя плюс шматлікія эпізадычныя. У рамане суіснуюць таксама розныя дыскурсы: беларускі нацыяналістычны, савецка-беларускі, лібэртынісцкі, хрысьціянскі, паганскі і інш. Тэксты і дыскурсы пераплятаюцца адзін з адным, але не выцясьняюць адзін аднаго. Лукашэнка нароўні з Падголам і Караткевічам інтэрпрэтуе беларускія рэаліі, а носьбіты розных дыскурсаў утвараюць адну і тую ж рэчаіснасьць - кулю спрасаваных беларускіх душаў.
2. *Дэфармацыя часу і прасторы.* Амаль немагчыма лякалізаваць падзеі, што апісваюцца ў рамане, у часе і прасторы. Некаторыя

падзеі адбываюцца ў шляхецкай хаце XVII ст., некаторыя - у бібліятэцы ці ў псыхіятрычным шпіталі XX-XXI стст. (і тады можам яшчэ неяк распазнаць часа-прасторавыя каардынаты), але найчасьцей падзеі разгортваюцца ў кнізе, у сьне, ува ўяўленьні, у віртуальнай рэчаіснасьці, у космасе...

3. *Дэмістыфікацыя сьмерці.* Сьмерць функцыянуе ў рамане як аўтаномная істота, пэрсаніфікаваная ў вобразе шкілета жанчыны - Кашчавой. Сьмерць у рамане, без сумневу, - страшная і магутная, але перад абліччам каханьня (свайго і чужога) губляе сваю моц і тоеснасьць, становіцца дурной, наіўнай і камічнай істотай.

4. *Дэсакралізацыя Бога.* Для веруючых людзей гэта можа быць сур'ёзным выпрабаваньнем. У рамане Бог наскрозь «тутэйшы», пазбаўлены трансцэндэнцыі і таямнічасьці. Ён нічым ня розьніцца ад беларускіх багоў-аўтахтонаў. Няма таксама мяжы паміж *sacrum* і *profanum.* «Той сьвет» і «гэты сьвет» зьмяшаліся і ўтвараюць адзін і той жа гарызонт беларускай драмы.

Але гэтая дэсакралізацыя мае сэнс, і то не адзін. Па-першае, Падгол гэткім чынам выдатна адлюстраваў атмасфэру бязбожжа і маральнай анархіі, якая пануе ўва ўладных структурах. На месца Бога-любові, якога знаходзім у Біблііі (Першае пасланьне Яна Багаслова 4:8), прыходзіць божышча страху - прынцып запалохваньня і падпарадкоўваньня. Па-другое, Падгол выказаў меркаваньне, што Бога мы можам сустрэць у «прафаннай» сфэры, у пагарджаных формах чалавечага быцьця. А гэта якраз тое, на што ўказвае хрысьціянская таямніца Ўцелаўленьня: *Слова сталася целам.* Па-трэцяе, дэсакралізацыя Бога прымушае нас усьвядоміць, што Бог-у-тэксьце ня тоесны з Богам-у-сабе.

5. *Дэструкцыя Беларусі.* Зь Беларусьсю Падгол робіць найбольш жахлівыя экспэрымэнты - заганяе яе ў ЧаС (Чарнобыльскі Саркафаг), там ператварае ў «кулю з душаў», якую «Найлепшы працяў жардзінай да чарапной падлогі». Аўтар увесь час мардуе чытача вусьцішнымі вобразамі: «Калі ж да Кулі наблізілася ДуППа, бакі Кулі расквеціліся ўсьмешкамі вуснаў, расьцягнутымі да вушэй», «...а прэзыдэнцкія спэцслужбы кінуліся граблямі апрацоўваць бакі Кулі, згінаючы простых, вычэсваючы нягнуткіх». У якасьці камэнтару да гэтага экспэрымэнту Падгол вуснамі Найлепшага вымаўляе словы, якія здаюцца рэхам белдзяржідэалёгіі: «Эта невіданы сімвал

сплачонасьці народа, его пабеды над сваім індзівідуалізмам! Куля з душ - Богападобная зьява...»
Асобна трэба згадаць і пра *vis cognitiva*, пазнавальны аспэкт гэтага раману. «Куля для прэзыдэнта» - гэта добрая крыніца для *лукашэнказнаўства*. Калі б на гэтым сьвеце панавала справядлівасьць, то Ўладзімер Падгол павінен быць не пакараны «за абразу прэзыдэнта», а шчодра ўзнагароджаны за... абарону прэзыдэнта! Бо на працягу ўсяго раману Падгол шчыра спрабуе ўратаваць Лявона Выліваху, а *Выліваха - гэта частка Лукашэнкавай асобы*. Выліваха - гэта цень беларускага прэзыдэнта, яго другое Я. Лукашэнка рэпрэсуе гэтую частку сваёй асабовасьці, заганяе яе ў несьвядомае, захоўваючы на паверхні толькі *пэрсону дыктатара*. Падгол дае нам зразумець, што першай ахвярай Лукашэнкавай дыктатуры зьяўляецца сам Лукашэнка.
Варта ўсё ж выказаць шкадаваньне, што *мастацтва перайманьня* ў пэўныя моманты ператварылася ў *мастацтва перадражніваньня* і непатрэбнае множаньне «луконімаў». Мастацтва мае большую вартасьць, калі мастак апэруе *намёкам*, а канкрэтызацыю пакідае чытачам, а Падгол, бывае, навязьліва «пальцам паказвае» кірунак канкрэтызацыі. Гэтая акалічнасьць крыху аслабляе тэрапэўтычны эфэкт таго шоку, які паўстае ад адкрыцьця, што носьбіт каханьня (Выліваха) і носьбіт страху (Найлепшы) знаходзяцца ў інтрыгоўнай блізкасьці.
Але гэта не зьмяняе факту, што згодна з законам «Аб абразе прэзыдэнта» менавіта Лукашэнка павінен быць у першую чаргу пакараны. Пакараны за тое, што безупынна прыніжае самога сябе, абражае сваю годнасьць і зьнішчае «вобраз і падабенства Бога», упісаны ў ягоную душу...
«Куля для прэзыдэнта» - гэта таксама крыніца для *беларусазнаўства*. І над гэтым засяродзімся больш падрабязна.

ДРУГОЕ
ЧЫТАНЬНЕ

Рэканструкцыю
беларускай
псыхікі
паспрабуем
правесьці
пры

дапамозе
псыхааналізу
Зыгмунда
Фройда,
аналітычнай
псыхалёгіі
Карла Юнга
і
нэапсыхааналізу
Эрыха
Фрома.
EROS &
THANATOS.
КАХАНЬНЕ І
СЬМЕРЦЬ
Культура
ўзьдзейнічае
дзякуючы
сіле Лёгаса,
а *натура*
захапляе
дзякуючы
сіле Эрасу.
Эрас - у
адрозьненьне
ад Лёгаса -
ня мае сваёй
мовы. Ён
гаворыць на
вульгарным
дыялекце,
гаворыць
хутка,
эмацыйна і
супярэчліва,
а часам
увогуле не
гаворыць, а
толькі
стогне й

вые. Таму
некаторыя
адмаўлялі
Эрасу ў
месцы ў
культуры.

Існуе, аднак, супольны вораг Эрасу й Лёгасу - *Танатас* (сьмерць).
А Лявон мясцовую прыгажуню пакахаў. Забрала Сьмерць Лявонаву любую. Адпомсьціла ёй за Лявонава каханьне. Забрала да сябе і служыць загадала. Пасылала былую прыгажуню да хлопцаў. Тыя жахаліся, пужаліся, прыгажуня-спачвараная пакутавала, а Кашчавая выскалялася.
Паводле раньняга Фройда, Эрас і Танатас (каханьне і сьмерць) - гэта два інстынкты, упісаныя ў чалавечую сутнасьць. Эрых Фром жа ўвёў паняткі «біяфілія» (жыцьцялюбства) і «нэкрафілія» (сьмерцялюбства) для апісаньня дзьвюх магчымых установак чалавека - устаноўкі на будаваньне, канструктыўную творчасьць, любоў і каханьне і ўстаноўкі на зьнішчэньне, дэструктыўную творчасьць. Розьніца паміж Фройдам і Фромам палягае ў тым, што першы лякалізаваў гэтыя два пачаткі ў сфэры інстынктаў (такім чынам, іх наяўнасьць не залежыць ад волі чалавека), а другі лякалізаваў у сфэры волі й пачуцьцяў. Для Фрома жыцьцялюбства ці сьмерцялюбства мае *набыты* характар, а для Фройда Эрас і Танатас - *прыродны*.
Псыхааналіз дае нам магчымасьць глянуць на вышэй «апісаную» Падголам драму як на сытуацыю *ўнутры* чалавека. *Унутры Лявона* змагаюцца два пачаткі: каханьне і сьмерць. Сьмерць - гэта ня вонкавая істота, яна ёсьць часткай Лявонавага быцьця і часткай быцьця кожнага з нас, *сьмяротнікаў*. Быцьцё чалавека - гэта *Sein-zum-Tode*, быцьцё-да-сьмерці. «Забрала Сьмерць Лявонаву любую» - гэта апісаньне не чаго іншага, як сытуацыі, калі чалавек губляе веру ў каханьне і адмаўляецца ад стваральнай дзейнасьці, апісаньне эфэмэрнай перамогі Сьмерці, якая на нейкі час дамаглася свайго - «забрала любую» і ператварыла яе на свой вобраз і падабенства.
У іншым месцы зьяўляецца і больш мэтафізычная рэфлексія:
- А дзе гуляць будзем?

- Там, дзе спыняць Час!
- Як гэта? Хто спыніць?
- Тыя, хто паскарае Час і тыя, хто марудзіць яго хаду, вяртаючы Час назад. Калі іх сілы зраўняюцца, прастора разломіцца і ўтворыць пастку. І ў яе трапіць Час і спыніцца.
- Дык гэта ж сьмерць! - жахнуўся Лявон. - Гэта час твайго панаваньня!
- Памыляешся... - задуменна сказала Кашчавая. - Раней і я так думала... А цяпер... Спынены Час - гэта каханьне...
Сьмерць выступае тутака ў ролі прарока-інтэрпрэтатара. Яна - аказваецца - тоіць у сабе немалую веду пра каханьне... Часам паўстае ўражаньне, што яна, Сьмерць, зьяўляецца «каханьнем навыварат». І гэта пацьвярджаецца практыкай - некаторыя закаханыя прагнуць *авалодаць* аб'ектам каханьня, прыватызаваць, «зжэрці», зрабіць часткай самога сябе, пазбавіць аўтаноміі і *асобнасьці.* Эрых Фром называе такога тыпу арыентацыі «непладаноснымі» і згубнымі для абаіх. Такое «каханьне» тоіць у сабе небясьпечную амбіваленцыю: пазбавіўшы іншую асобу аўтаномнасьці і асобнасьці, я пачынаю падсьвядома яе ненавідзець і пагарджаць ёю, яе «рабская душа», суаўтарам якой я сам часта зьяўляюся, пачынае выклікаць ува мне натуральную агіду. Сьмерцяносная нянавісьць і агіда да «рабыні» паволі прарывае бар'еры падсьвядомасьці і вырываецца на паверхню. Учарашняя фэя-прыгажуня сёньня бачыцца ведзьмай-страшыдлам.
Падгол увесь час змагаецца за сапраўднае каханьне. Калі Кашчавая паслала «прыгажуню-спачвараную» да Лявона, той «адчуў цягу неадольную, і выйшаў, і міжволі ўкленчыў». Распазнаньне каханай у ведзьме-страшыдліску - гэта не штодзённае здарэньне, але яно магчымае. (Нават пасьля дзесяцігодзьдзяў сужэнскага «пекла» ён і яна маюць магчымасьць ізноў закахацца адно ў аднаго.) «Цуд! Родная і пачварная! Любая і недасягальная! Харошая мая! - мовіў Лявон». А зьвяртаючыся да Сьмерці, Лявон пытае:
- І не абрыдла табе, здыхляціна, зьдзекавацца? Нават калі возьмеш мяне, ведай, што душы табе не аддам.
Гэта - акт аўтарэфлексіі Лявона. Сьмерць - як мы ўжо адзначылі - гэта частка Лявонавай псыхікі, праява непладаноснай тэндэнцыі зьнявольваць аб'ект каханьня. Лявон уваходзіць у канфлікт з гэтай тэндэнцыяй і адкрывае сапраўднае аблічча

сваёй каханай, пазнае ў ёй *асобу* і пачынае захапляцца яе *іншасьцю*: «Душа ейная кветкай чароўнаю сьвеціцца, пялёсткамі прыгажосьць праменіць!» Вонкавасьць ужо адыходзіць на другі плян, яго цікавіць, перш за ўсё, яе асоба: «Любую, нават калі б спаралізаваная была ды ў страхалюдзіну ператвораная, усё роўна за жонку пабраў бы, толькі б дыхала. Карміў бы яе, казкі распавядаў ды цалаваў, бо душа яе дабрынёю ўсё жывое прыцягвае».

Падгол адлюстраваў працэс пераадольваньня мужчынскага эгаізму. Агрэсіўны нарцыстычны мача (Лявон) усьведамляе, што зьнішчыў сваю каханую і ператварыў яе ў аб'ект пагарды і агіды. Ставаньне Лявона на калені перад гэтай «прыгажуняй-спачваранай» мае сымбалічнае значэньне. Яго дагэтулешняе быцьцё-для-сябе становіцца быцьцём-для-іншых, і менавіта каханая спрычыняецца да гэтага ўнутранага пераваротy. *Яна* адкрывае яго на патрэбы, боль і пакуты іншых людзей. Самец становіцца сапраўдным мужчынам, здольным *кахаць і несьці свабоду*. У Падголавай філязофіі каханьня повязь між *каханьнем, жыцьцём* і *свабодай* выражаная ў ляпідарным сьцьверджаньні: «Няволя - гэта сьмерць для каханьня». Прыгажуня-спачвараная - гэта таксама Беларусь. Беларусь - гэта ўнікальны прыклад спалучэньня супярэчнасьцяў, своеасаблівай *coincidentia oppositorum*. Эрас і Танатас, каханьне і сьмерць, жыцьцялюбства і сьмерцялюбства, здавалася б, счапіліся тут і зь пенай на вуснах спрабуюць адужаць адно аднаго. Такія працэсы адбываюцца ў псыхіцы людзей-беларусаў, «сьвядомых» і «сонных».

У рамане Падгола існуе пэўная пераходнасьць паміж Настачкай, Ластаўкай і Куляй (беларускіх душаў). Настачка і Ластаўка - гэта гістарычная і сучасная Беларусь, а Беларусь (учорашняя і сёньняшняя) - гэта Куля спрасаваных саламяных душаў. Усе гэтыя тры вобразы знаходзяцца ў вельмі падобнай сытуацыі: Настачка зьняволеная Сьмерцю (ператвораная ў шкілет-пачвару), Ластаўка зьняволеная мужам-дэспатам, Куля - сарака дыктатарамі ды... сама сабою. Усе гэтыя тры вобразы знаходзяцца ў патаемнай сувязі з папараць-кветкай, а кветка ёсьць інтэгральнай часткай «Зорнага Чарнабыльніку». А Чарнабыльнік - гэта саюз закаханых душаў, ахвяраў Чарнобыльскай аварыі, непадуладных ні Сьмерці, ні сарака дыктатарам. *Закаханыя душы даюць пачатак новай, свабоднай і*

жывой Беларусі.
Эрас, такім чынам, выконвае функцыю плятонаўскага даймона, «пасярэдніка між багамі й чалавекам». Ён ёсьць «злучальнай тканкай», *якая злучае супрацьлегласьці безь зьнішчэньня іх*, пачынаючы ад злучэньня мужчынскага й жаночага пачатку, цераз злучэньне элітарнага і эгалітарнага, гожага й брыдкага аж да злучэньня Бога й чалавека, Неба і зямлі. Эрас выконвае таксама *трансфармацыйную функцыю*. Як ужо мы адзначылі, дзякуючы каханьню мужчына-самец вызваляецца ад свайго эгаізму і нарцысізму і становіцца абаронцам і вызваліцелем усяго таго, што стогне пад жалезнай уладай Сьмерці і яе гадаванцаў. Трансфармацыі падлягае таксама беларуская Куля. Эрас, увасоблены ў рамане ў жаночым вобразе Князёўны Папараць-кветкі, адраджае беларускія душы, спрыяе вяртаньню ў іх духу свабоды, жыцьця і каханьня. Ён - свайго роду *lapis philosophorum*, магічны «філязафічны камень», здольны ператвараць ня толькі жалеза ў золата, але таксама бязвольныя саломіны - у вольныя асобы.
Падгол, такім чынам, паставіў пад сумнеў наяўнасьць «жалезнай заслоны» паміж Эрасам і Лёгасам.

«ВЯЛІКАЯ
МАТКА» І
«ВЯЛІКІ
БАЦЬКА»
Выліваха
апынуўся ў
бібліятэцы,
«д'яблавай
майстроўні».
Там чытае
гістарычныя
раманы і
эратычныя
часопісы,
якія ажно
«сьверб
нагналі».
Урэшце на
сон
пацягнула

Кніга - гэта сымбаль несьвядомага, а сон - натуральны стан, у якім праяўляецца несьвядомае. Бібліятэка ёсьць сапраўды *д'яблавай майстроўняй*, бо тоіць у сабе процьму невядомага патэнцыялу. Нічога дзіўнага, што сустрэча са зьместам несьвядомага адбываецца ў бібліятэцы. Сну (=кантакту зь несьвядомым) папярэднічае *актывізацыя лібіда* (кантакт з эратычнымі часопісамі і нагнаны «сьверб»). Трэба выдзеліць два разуменьні лібіда: лібіда як жарсьць, поцяг, *сэксуальная энэргія* і лібіда як *псыхічная энэргія*, дзе сэксуальная жарсьць зьяўляецца толькі адным зь відаў лібіда. Першае разуменьне было ўласьціва Фройду, а другое - Юнгу. (У артыкуле будзем карыстацца тэрмінам «лібіда» пераважна ў юнгаўскім значэньні, а калі гаворка будзе ісьці пра лібіда ў вузкім, фройдаўскім разуменьні, будуць адпаведныя ўдакладненьні, напрыклад, «сэксуальнае лібіда».) У абодвух выпадках лібіда - гэта сіла, якой уласьціва *стыхійнасьць, жывёльнасьць* і *непадкантрольнасьць*. Падчас сну Выліваха пазнае, што значная порцыя лібіда схавана (зьняволена) у несьвядомым...

...Людзі перасталі працаваць і паляваць, а толькі мітусіліся каля каменнага стода, натхняючы адзін аднаго як мага мацней любіць ідала. І енчылі каля балвана, і кленчылі, і ахвяры яму прыносілі, і ў каменныя вусны цалавалі, а некаторыя жанчыны спрабавалі, абняўшы таго шклоўскага ідала, зацяжарыць і нарадзіць волата!

Выліваха падчас сну сыходзіць ажно на ўзровень першабытнай племянной сьвядомасьці. У цэнтры гэтай прымітыўнай сьвядомасьці - каменны ідал, гаспадар людзкіх сэрцаў і розумаў. На гэтым узроўні Лявон сустракае колькі жаночых вобразаў. Нічога дзіўнага: лібіда, якое актывізавалася пры праглядзе эратычных часопісаў, шукае свайго *дапаўненьня*. Лібіда ня можа існаваць, сканцэнтраванае толькі ў мужчынскай душы, яно стыхійна й настойліва шукае процілегласьці - жаночага элемэнту, які Юнг назваў *anima*. Спрацоўвае тут прынцып *amor est diffusivus sui* - «каханьне разьлівацца хоча». Вось жа Выліваха сустракае *аніму* ў несьвядомым і заўважае, што *яна зьняволеная ідалам* і што зьняволеная «добраахвотна»! Бясплодная і пакутная прастытуцыя-мастурбацыя аб тырчак каменнага стода паказвае ступень зьняволенасьці і

зачараванасьці якімісь ірацыянальнымі вераваньнямі і спадзяваньнямі. Гэта той этап, калі існаваньне жаночага элемэнту выцясьняецца мужчынам у несьвядомае, а жаночае лібіда скоўваецца нейкім жудасным племянным этасам. На гэтым узроўні *садызм* і *мазахізм* разьмяркоўваюцца строга паводле падзелу на *мужчынскае* і *жаночае*. Нямы, халодны і цьвёрды стод з каменным тырчаком - гэта дасканалае ўвасабленьне мужчынскага садызму, які можна спаткаць у большасьці прымітыўных племянных супольнасьцяў.
Варта зьвярнуць увагу, што Выліваха таксама пражыў стан зьняволеньня мужчынскага лібіда. Гэта адбылося падчас першага яго спатканьня са Сьмерцю (Сьмерць - таксама сымбаль несьвядомага). Вось тады яму давялося ўбачыць Сьмерцеву вагіну, «чорную дзірку-няўтульніцу, зь якой цягнула сьцюдзёным скразьняком».
Ён скамянеў, уявіўшы, як прыйдзецца яму ўсё сваё ў будучым бясконцае жыцьцё шаравацца аб гэтую костку і націраць крывавыя мазалі аб касьцякі сьвідравіны, што даўно пазбавілася жаноцкага цяпла. І яшчэ невядома, ці будзе Сьмерці асалода з таго. ...Калі Сьмерць з жудасным стогнам «Ещё! Ещё!» схопіць у сваю Кашчавую пяцярню яго зьнясіленую і спустошаную плоць, якую пакінулі семя і кроў, зацісьне яе ў халодных, як лёд, фалянгах і пачне шморгаць туды-сюды, як пустую казіную цыцку, каб дамагчыся пругкасьці...
Уяўлены сэкс са Сьмерцю можна інтэрпрэтаваць як праяўленьне *комплексу Эдыпа*. У пэўны момант асабоваснага разьвіцьця сэксуальнае лібіда «прарываецца» на паверхню і пачынае ўсьведамляцца *эгам*. Згодна з Фройдам, першым аб'ектам сэксуальнай жадобы зьяўляецца маці. Фройдаву канцэпцыю комплексу Эдыпа трэба дапоўніць Юнгавай канцэпцыяй архетыпаў. Адным з архетыпаў, зь якім мусіць сутыкнуцца *эга* на пачатковых стадыях разьвіцьця, ёсьць *архетып Маткі*. «Magna Mater» - гэта амбівалентны комплекс, які звычайна праектуецца на вобраз зямлі, *радзімы, нацыі, племя*. Нярэдка й канкрэтныя асобы могуць стацца аб'ектам праекцыі гэтага архетыпу, напрыклад, уласная маці, цешча, жанчына-дырэктарка. Бывае, што і да старшыні-мужчыны прычапляецца мянушка «мама».
Ірацыянальны страх мужчынаў перад дапусканьнем жанчын да кіраўнічых пасадаў, наяўны ў нашай культуры, ёсьць адным з

сымптомаў неперажытага комплексу Эдыпа. Недаразьвітыя ў псыхічным пляне мужчыны падсьвядома атаясамліваюць жанчыну-кіраўніцу зь Вялікай Маткай, якая пазбавіць іх аўтаноміі, а можа, нават і лібіда (страх перад кастрацыяй). Пад маскай агрэсіўнага й самаўпэўненага мача, які пільнуе, каб «кабета знала сваё месца», зазвычай хаваецца *puer aeternus*, «вечны хлопец-дзіця» (юнгаўскі тэрмін), што не стварыў у сваёй душы месца для *анімы*: каханай і аўтаномнай (!) асобы. *Puer aeternus* - гэта мужчына, які затрымаўся ў псыхалягічным разьвіцьці на ўзроўні 9-11 гадоў. Блякада мужчынамі-парлямэнтарамі законапраекту Надзеі Цыркун (які прадугледжваў абарону жанчын ад мужоў-алькаголікаў і псыхапатаў) у беларускім парлямэнце папярэдняга скліканьня найпраўдападобней ёсьць прыкладам гэтага ж сындрому: страху мужчынаў перад якой-кольвечы эмансыпацыяй жанчын ці то ў сям'і, ці то ў грамадзтве. Мужчынская праекцыя архетыпу Вялікай Маткі спараджае эфэкт «зваротнага спражэньня»: вельмі часта маці, цешча і жанчына-кіраўніца несьвядома прымаюць гэтую праекцыю і пачынаюць яе рэалізаваць, выконваць праектаваную мужчынамі ролю дэманічнай Вялікай Маткі. У выніку паўстаюць своеасаблівыя *мэханізмы сэлекцыі* ў культуры: мужчыны, баючыся жаночага вобразу, спалучанага з кіраўнічай пасадай, стараюцца альбо не прапускаць жанчын на гэтыя пасады, альбо *прапускаць толькі маскулізаваных*, упадобненых да сябе (прынамсі, псыхічна ўпадобненых).

Існуе тут яшчэ адна культурная і культуралягічная праблема: успрыманьне фэномэну ўлады. Беларускае грамадзтва, на жаль, не прысвоіла яшчэ разуменьня *ўлады як арганізуючага чыньніку*, улада бытуе ў сьвядомасьці многіх як неабмежаванае права падпарадкоўваць і выкарыстоўваць іншых у сваіх інтарэсах. Гэтае прымітыўнае ўспрыманьне ўлады яскрава праяўляецца ў супярэчлівых сацыяльных вучэньнях у Расеі: *абагаўленьне ўлады* і *анархізм* вельмі часта там суіснуюць у нейкім пачварным саюзе. Такім чынам, страх перад жанчынай-кіраўніком, якая натуральным чынам асацыюецца з маці, яшчэ больш узмацняецца. Страх, як кажуць, мае вялікія вочы, таму мужчыны-дзеці паўсюль, дзе сустракаюць жанчыну, бачаць гэтую сьмяротную «дзірку-няўтульніцу». Адсюль іх агрэсія і імкненьне падпарадкаваць жанчыну.

Зямля - гэта сымбаль, які найлепей дазваляе зразумець, у чым заключаецца амбіваленцыя архетыпу Вялікай Маткі. Зямля дае жыццё (параўнайце, «зямля-радзіцелька», «зямля-карміцелька», «род-ная зямля»), але яна зьяўляецца таксама «чэравам сьмерці» - паглынае ўсё жывое, асымілюе й ператварае ў сябе. Нагадаем, што *адхлань, пекла, Валадарства Сьмерці, Царства Аіда*, а ў Падгола - *месца прабываньня Шклоўскага Ідала* - усё гэта знаходзіцца ўнутры Маткі-Зямлі! Аналягічным чынам вобраз *Радзімы, Нацыі й Племя* хавае ў сабе гэту вусьцішную супярэчнасьць. Радзіма, нацыя ці племя - гэта *асяродзьдзі жыцьця*, у якіх індывід атрымлівае пачуцьцё ўкарэненасьці й бясьпекі, але яны адначасова абмяжоўваюць яго волю, патрабуюць ахвяраваць сваёй свабодай, а нават жыцьцём. Зямля, Радзіма, Нацыя, Племя, Маці, Цешча - усё гэта вобразы дэманічнай *Magna Mater*, яны - натуральныя канкурэнткі *ўзьлюбленай*, таму імкнуцца авалодаць той часткай мужчынскай псыхікі, якая ў юнгізьме завецца *анімай*. Вялікая Матка імкнецца альбо абмежаваць, альбо зьнішчыць аўтаномію *анімы* і застацца адзінай гаспадыняй мужчынскай псыхікі. Згодна зь Юнгам, жаночаму вобразу *Magna Mater* адпавядае мужчынскі вобраз *Magnus Pater* («Вялікі Бацька»). Ідал у рамане Падгола - гэта мужчынскае ўвасабленьне адной і той жа дэструктыўнай сілы - Сьмерці. Сьмерць і Ідал - гэта нэгатыўныя аспэкты архетыпаў Маткі і Бацькі. Сэкс жанчыны з каменным Ідалам (перажыты ў сьне) і сэкс мужчыны са Сьмерцю (перажыты ўва ўяўленьні) - гэта дзьве вэрсіі (жаночая й мужчынская) нэкрафіліі. У сьне і ўва ўяўленьні аслабляюцца бар'еры, якія стрымліваюць «нашэсьце» несьвядомай псыхікі і дзякуючы гэтаму *пачынаецца працэс ўсьведамленьня наяўнасьці дэструктыўных сілаў, што дрэмлюць у нетрах асабовага й зборнага несьвядомага*. «Чорная дзірка-няўтульніца, зь якой цягне сьцюдзёным скразьняком» - гэта *«дзірка» ўнутры псыхікі*. Уладзімер Падгол, такім чынам, дае нам магчымасьць назіраць (і перажыць!) працэс абуджэньня «ўнутранага дэмана», цмока, які дрэмле ў глыбінях нашай душы. Але на гэтым ня ўсё. Трэба заняцца цяпер зьвяржэньнем Ідала і вызваленьнем *эга* ад Сьмерці.

ЗЬВЯРЖЭНЬНЕ ІДАЛА І ЭМАНСЫПАЦЫЯ

ЭГА

Адна з жанчын адважылася адбіць Ідалу каменны тырчак. Эфэкт быў імгненны: «Усчаўся лямант. (...) Вакол вогнішча пасела веча. Жанчыну выцягнулі да агню». Побач з жанчынай-бунтаўніцай і абураным вечам Лявон бачыць... самога сябе. Ён знаходзіць самога сябе ў сфэры несьвядомага. Акурат у гісторыі і далёкай мінуўшчыне карэняцца пачаткі асабовага і калектыўнага *эга*. Жанчына-бунтаўніца,

пакуль што
для Лявона
як быццам і
чужая,
насамрэч
зьяўляецца
часткай яго
ўласнай
псыхікі,
анімай. Ён
сустракае
Яе. Гэтак
паўстае
сызыгія,
архетыпічная
пара, Ён і
Яна, Анімус
і Аніма,
неабходная
ўмова
пладаноснай
цыркуляцыі
лібіда.

Лявон абхапіў Ідала за тулава й сьпіхнуў з абрыву ў рэчку. Жудасны вокліч паляцеў усьлед, заглушыўшы ўдар каменя аб ваду. (...) Навалілася на Лявона некалькі супляменьнікаў... Доўга не сьціхалі лямант і спрэчкі. Урэшце веча вынесла прысуд: «Абаіх аддаць ідалу...»

Спатканьне са зьместам несьвядомага - гэта небясьпечны працэс. Лявон, які тут сымбалізуе *эга*, пастаўлены перад выбарам: альбо стаць на баку жанчыны-бунтаўніцы, альбо стацца адным з абаронцаў ідала. Можна застацца на бясьпечным вечы і надалей жыць у салодкай няволі Маткі-Племені, аддаць сябе бяз рэшты сілам несьвядомага, якія ў прымітыўнай культуры ажыцьцяўляюць сваю ўладу празь непарушныя *табу* і сумеснае пакланеньне Ідалу. А калі так, то *трэба зьнішчыць аніму*, выціснуць у несьвядомае ўсякія сумненьні і парасткі бунту проці сьвятога парадку, гарантам якога быў, ёсьць і будзе Ідал. Магчымы і іншы выбар - выйсьці насустрач аніме. Гэта будзе азначаць пачатак дыфэрэнцыяцыі

сьвядомасьці і пераход на вышэйшую ступень разьвіцьця. Але тады трэба лічыцца з трагічнымі наступствамі: «Абаіх аддаць Ідалу».
У справу ўмяшаўся *Князь*: «Ён - найлепшы ваяр! А яна - таксама ў целе, калі можа нарадзіць ваяроў! Дык навошта нам шкоду рабіць?! Давайце пачакаем, пасадзім у яму і паглядзім». *Князь прымае рашэньне пакараць Лявона і жанчыну, але забараняе зьнішчаць іх*. Пакараньне (кіданьне абаіх у яму) мае сутнасны сэнс для далейшага разьвіцьця эга. Яма сымбалізуе матчына ўлоньне, а прабываньне ў яме - працэс адраджэньня і канчатковае замацаваньне свайго выбару. Менавіта ў яме Ён і Яна ўсьведамляюць, што «адзін без другога ня могуць». *Эга* перастае быць *эга*істычным, паколькі становіцца здольным выходзіць насустрач і суадчуваць з *alter-ego*, іншым Я. Фармуецца пачуцьце *альтруізму* - неабходная ўмова асабоваснага разьвіцьця і паўнавартаснага жыцьця ўнутры чалавечага соцыюму.
Калі ўзьніклі два аўтаномныя элемэнты (*анімус* і *аніма*), павінен зьявіцца таксама трэці аўтаномны элемэнт, неабходны для каардынацыі сызыгіі. Зьяўленьне Князя азначае, што вылучыўся яшчэ адзін псыхічны элемэнт, а сам Князь сымбалізуе *рацыянальную функцыю*.
Маем трыяду:

Князь
[image]
Ёна

Кожнаму з гэтых элемэнтаў адпавядае псыхічная функцыя: Князю адпавядае *рацыянальная*, Ёй - *пачуцьцёвая*, Яму - *валявая*. Згодна зь Юнгам, трыяда - гэта ўсё ж недасканалая структура, яна ня можа стацца *структурай самасьці*. Актывізацыі трох элемэнтаў недастаткова, каб праходзіў *працэс індывідуацыі*, працэс поўнай псыхічнай інтэграцыі і паўстаньня гарманійнай цэльнасьці, унутры якой энэргія лібіда можа свабодна і плённа цыркуляваць. «Сымбалем самасьці ёсьць *чацьвёрца*, а ня *тройца*» - настойліва паўтарае бацька аналітычнай псыхалёгіі. Інакш кажучы, у нашай структуры бракуе «ніжняга» элемэнту, які б раўнаважыў «верхні элемэнт», рацыянальную функцыю. Што гэта за элемэнт? Хто чацьвёрты?
У апісванай Падголам сытуацыі *чацьвёрты элемэнт*

недыфэрэнцыяваны, ён яшчэ ня выдзеліўся з племянной і вечавай масы, застаецца ўсьцяж у недрах несьвядомага. У выпадку кожнай канкрэтнай асобы чацьвёрты элемэнт зазвычай зьяўляецца часткаю *ценю*, ён схаваны ў сукупнасьці непрывабных і заганных рысаў пад маскай пэрсоны і выцесьнены ў падсьвядомае. (Напрыклад, пачуцьцё літасьці - неабходная рыса сьпелай і разьвітай асобы - нярэдка ў патрыярхальным грамадзтве выцясьняецца як заганная, як прыкмета слабасьці.) У сфэры культуры й палітыкі чацьвёрты элемэнт - гэта пераважна ўсё тое, што асацыюецца з *маргінальным, лякальным, прафанным, вульгарным*, якое ня ўпісваецца ў рамкі дасягнутай цэльнасьці. Цікава, што *клясыка* зазвычай арганізуецца вакол лічбы «тры»: тры патрыярхі ў Старым запавеце (Аўраам-Ісаак-Якуб), тры клясычныя грэцкія філёзафы (Сакрат-Плятон-Арыстотэль), тры касты ў плятонаўскай «Палітэі», тры часткі «Тэалягічнае сумы» сьвятога Тамаша Аквінскага, тры станы ў сярэднявечным грамадзтве, тры прынцыпы мысьленьня ў філязофіі Гегеля, тры заснавальнікі камунізму (Маркс-Энгельс-Ленін), траяўладзьдзе ў клясычнай канцэпцыі дэмакратычнай дзяржавы, ну і, нарэшце, у нашым геапалітычным абшары - «трыадзіны рускі народ». (Нельга тут абмінуць пытаньня пра *Сьвятую Тройцу* ў хрысьціянскай дагматыцы. Варта тут зьвярнуць увагу, што *таямніца Тройцы* цесна зьвязана з *таямніцай Уцелаўленьня*, «учалавечаньнем» другой Божай Асобы бяз страты сваёй боскай сутнасьці. Такім чынам, *унутры Сьвятой Тройцы свабодна быту е чацьвёрты элемэнт* - чалавечая натура, якая, дзякуючы ўчалавечаньню Хрыста, сталася паўнавартаснай удзельніцай жыцьця Сьвятой Тройцы.)

Чацьвёрты элемэнт, вельмі неабходны для псыхічнай інтэграцыі і здабыцьця асабоваснай поўні (*самасьці*), трэба шукаць у сфэры прафаннай, маргінальнай, пагарджанай, рэпрэсаванай, «неклясычнай». Карл Юнг заўважае, што гермафрадыт Мэркуры (сымбаль псыхічнай лучнасьці) і філязафічны камень (сымбаль *самасьці*) *in sterquiliniis invenitur* - «у гаўне былі знойдзены». У Пралёгу ж Яна Багаслова чытаем, што Лёгас (сымбаль *самасьці*) стаўся *σαρξ* (саркс). А *σαρξ* - гэта ня столькі «цела», як гэта, з-за адсутнасьці лепшага слова, перакладаецца, колькі *пагарджаная форма жывой матэрыі*.

ХТО

ЧАЦЬВЁРТЫ?
Карл Юнг
раіць нам
шукаць
чацьвёрты
элемэнт
шляхам
пастаноўкі
пытаньня
пра вобраз,
які будзе
дапаўненьнем
«верхняга
элемэнту».
Лібіда - гэта
рух, які
характарызуецца
энантыядроміяй
(ад грэцкага
словазлучэньня,
ужытага
Гераклітам,
«ευ αυτιω
δρομοσ»,
якое можна
патройна
інтэрпрэтаваць:
«бег
насустрач
процілегласьці»,
«бег у нутро
процілегласьці»
і «бег
унутры
процілегласьці»).
Калі наверсе
- Князь, то
ўнізе можа
быць халоп,
мужык,

нявольнік,
калі там -
рацыянальная
функцыя, то
тут яна
мусіць быць
раўнаважана
якой-
небудзь
ірацыянальнай,
калі там -
прадстаўнік
Божага
Гораду
(*Civitas Dei*),
то тут -
прадстаўнік
цёмнай,
праклятай
масы (*masa
damnata*).
Князю-
Розуму
павінен
адпавядаць
«Мужык-
Вар'ят».

І праўда: неўзабаве ў рамане Падгола зьяўляецца вобраз *вар'ята*. Прыгледзьмася ўсёй сытуацыі.
Пасьля «дамовы» са Сьмерцю (згуляць у «расейскую рулетку», дзе стаўкай будзе лёс Беларусі і лёс яго самога), Лявон вырашыў «зладзіць вячэру, запрасіць сяброў ды параіцца». *Да сябе ў родавы замак у Жэбянцяі запрасіў усіх, каго добра ведаў. Нават аднаго* старога, *якога ўсе мелі за* вар'ята, *бо ён увесь час плёў нешта няўцямнае, а калі зь яго сьмяяліся, не крыўдаваў. Празвалі яго* Сакратам. *Стары калісьці* сябраваў з бацькам, *загадваў бацькавай бібліятэкай і сам нешта пісаў*.
Падкрэсьленыя характарыстыкі гэтага старога варта трымаць у памяці. Перад тым як высьветлім, *што* гэта за чацьвёрты

элемэнт і якую функцыю ўвасабляе Сакрат-вар'ят, зьвернем увагу на наступныя немалаважныя нюансы.
Падгол вельмі ўважліва й сур'ёзна трактуе такі элемэнт урачыстай вячэры, як «чаркаваньне». «Колькі гімнаў сьпета чаркаваньню! Колькі словаў перабрана і адкінута дзеля апісаньня гэтай слаўнай працы, сапраўднага мастацтва чалавечых зносінаў! Ня дзеля п'янства ліхога, а дзеля ўзьнёсласьці душэўнай і ўрачыстасьці цялеснай бяруцца сапраўдныя мужыкі за чаркі...» *Лёгкае ап'яненьне, перажываньне «ўрачыстасьці цялеснай» - гэта адна з умоваў індывідуацыі.* «Ап'яненьне» ня трэба тут разумець літаральна, такога тыпу стан можа дасягацца таксама падчас эстэтычнага ўзрушэньня, закаханасьці, рэлігійных і містычных перажываньняў. (П'янства, алькагалізм - гэта ўжо роспачная і безнадзейная *спроба кампэнсаваць* няпройдзены этап разьвіцьцёвага «ап'яненьня».) Уся справа ў тым, што «ап'яненьне» - гэта *стан, у якім аслабляецца рацыянальная функцыя*, а якраз гэтая функцыя наймацней блякуе несьвядомае. Розум - гэта аўтар унутраных санкцыяў, і пакуль ён уладарыць у душы «цьвёрдай рукой», чацьвёртая функцыя застаецца ў несьвядомым. У рэальным жыцьці нярэдка можна спаткаць запраграмаваных пачціўцаў, пэдантаў і вырафінаваных буржуяў, людзей, зьняволеных нейкім штыўным канонам паводзінаў і жэстаў, пераважна нязносных для членаў сям'і і калег па працы. А гэта з-за таго, што празьмерная ўлада Розуму вядзе да атрафіі нават «стандартных» функцыяў: пачуцьцяў і волі. Такім чынам, «ап'яненьне» і аслабленьне рацыянальнай функцыі спрыяе дыфэрэнцыяцыі сьвядомасьці і вызваленьню новых абшараў псыхікі.
Чарговы важны момант у апісванай Падголам сцэне - гэта «стары сябра габрэй Пэйцах насупраць Лявона», безь якога «страўнік на ежу і не адгукаецца». «Сапраўдны беларус без сапраўднага габрэя - што бульба бяз солі». «Габрэй» - гэта ўстойлівы культурны й псыхалягічны вобраз *іншага*, які жыве *побач*. Габрэй зьяўляецца элемэнтам, які парушае племянную аднароднасьць і прымушае ўсьведамляць, што наша асяродзьдзе (і наша псыхіка!) *неаднароднае*. Габрэй стварае магчымасьць пераадолець асабовы й групавы эгаізм і адкрыцца на *alter-ego*. Гарманійнае жыцьцё і дружба Вылівахі і Пэйцаха паказвае, што псыхічнае разьвіцьцё і працэс індывідуацыі ідзе

наперад.
Зьвернем цяпер увагу на ролю «Сымонкі-музыкі», які «на куце мосьціцца» і ня ведае, «пад якую паху скрыпачку прыладзіць». Паколькі ў апісванай сцэне адсутнічае вобраз аўтаномнай *анімы*, якраз Сымонка-музыка ўвасабляе пачуцьцёвую функцыю. Ён зьяўляецца тым, каторы ўзмацняе эфэкт *ebrietas*, «ап'яненьня», ролю якога мы ўжо растлумачылі. «На гэта й гарэлкі ня трэба, музыкай зачараваны ды іншых раўнадушнымі не пакіне, - каторы ўжо раз зьдзівіўся Выліваха». Натхнёны чымсь надпрыродным, Сымонка-музыка пачынае выконваць фукцыю *анімы*: «Чаруе. Нават калі гук аціх, чаруе душу». Зьявіўся на вячэру таксама «Ваяр Война. Чорны, няголены, нахабны. (...) Адзін супраць дзясятка і толькі іскрынка вар'яцкай весялосьці ў вачах. А на сьцягу слова бліскавіцай: Воля!» Тут ужо і тлумачэньні непатрэбны, адразу ясна, што ён сымбалізуе валявую функцыю.
Урачыстая пачостка цягнецца да позьняй ночы, але вось надыходзіць момант разьвітаньня з гасьцямі-прыяцелямі. Страх, жуда і самота, спароджаныя ўсьведамленьнем пэрспэктывы паядынку са Сьмерцю, навальваюцца на душу Вылівахі. Лявон прадчувае, што мусіць адбыцца своеасаблівы «сыход у пекла», у валадарства Сьмерці, Ідала і Страху. Адному яму гэта не пад сілу. Сьмяротная трывога паралізуе розум, волю й пачуцьці...
І ў гэты момант (іншага не прыгадаць было) падышоў да Лявона Сакрат. Супакоіў паглядам, рукой падхапіў і загаварыў, вачэй не адводзячы:
- Што здарылася, сынку?
Тут неабходна растлумачыць, чаму гэты Сакрат - *вар'ят* і чаму ён *стары*. Як ужо было адзначана, чацьвёртая функцыя, якой бракуе да псыхічнай цэльнасьці, тоіцца ў сфэры «ценю» і «несьвядомага». Такім чынам, сымбалем чацьвёртай функцыі можа быць толькі *асоба, непрыкметная ў грамадзтве*, або, яшчэ лепш, *ідыёт*, цалкам асацыяльная, дзікая, бескультурная, непаўнавартасная і шалёная асоба. (Згадайма пра ролю «ідыёта», «нэўротыка-эпілептыка», «прастытуткі» і «адчужанага падпольшчыка» ў творах Дастаеўскага, які апантана шукаў таго збаўленнага *чацьвёртага элемэнту*, які паклаў бы канец тагачасным жудасным паталёгіям «расейскай душы»: «смуте», «расколу» і «беспочвенности».)

Сакрат - *стары*, таму што ён злучае цяперашняе зь мінулым, сьвядомае зь несьвядомым:
- *Дык вось, твая прапрабабка аднойчы ідалу тырчак адбіла, а прапрадзед таго ідала ў рэчку скінуў.*
- Чуў пра гэта, як і аб тым, што яны ў яме пазнаёміліся, а калі іх выпусьцілі, ажаніліся. Але ня верыў - думаў, што гэта міт.
- Не! Тады ўсе чакалі ідалавай помсты. Вельмі доўга яны пражылі, а калі памерлі, чараўніца патлумачыла, што ідал іх не чапаў, бо баяўся. Лютым быў твой продак: калі б што з жонкай здарылася, тады ён бы ідала з рэчкі дастаў і на дробненькія кавалачкі раструшчэліў. А калі б мужа крануў, тады б жонка ідала ў пясок сьцерла. Чараўніца казала, што з-за гэтага ідал іх нават ахоўваў. Ненавідзеў, а бараніў.
Стары дбае пра зьдзяйсьненьне міту. Міт - гэта тэкст, у якім зашыфравана інфармацыя пра неўсьвядомлены патэнцыял. Сакрат зьяўляецца таксама колішнім «сябрам бацькі», г. зн. нясе адказнасьць за інтэграцыю аднаго з найбольш супярэчлівых архетыпаў: архетыпу Бацькі. Ён дапамагае адрозьніць Бацьку ад Ідала і Матку ад Сьмерці. Адрозьненьне пазытыўнага аспэкту Вялікай Маткі ад яе нэгатыўнага аспэкту - гэта канчатковае пераадоленьне комплексу Эдыпа, якое робіць магчымым вызваленьне чарговай порцыі псыхічнай энэргіі. Сакрат таксама замацоўвае ў душы Вылівахі сызыгію, усьведамляе яму, што *альтруістычная лучнасьць Анімуса і Анімы, Яго і Яе здольная ня толькі нэўтралізаваць Ідала, а нават эксплюатаваць ягоную энэргію*! («Ненавідзеў, а бараніў».)
Сакрат - гэта мудрэц-вар'ят-чараўнік, які зьяўляецца *інтэгруючым элемэнтам*, што завяршае працэс індывідуацыі. «Завяршае» - трэба разумець умоўна, бо зьяўленьне чацьвёртага элемэнту азначае насамрэч толькі заканчэньне аднаго этапу і пачатак наступнага. Карл Юнг сьцьвярджае, што *самасьць* - гэта рэчаіснасьць дынамічная, і ёй уласьціва эвалюцыя і трансфармацыя. Мудрэц-вар'ят дапамагае здабыць адно толькі *часовую* цэльнасьць і дазваляе бясьпечна «сысьці ў Валадарства Сьмерці», дзе зьявяцца новыя, больш сур'ёзныя выпрабаваньні. Там зноў трэ' будзе пагрузіцца ў недыфэрэнцыяваную магму несьвядомага і шукаць самога сябе (*эга*), сваю *аніму*, і два арганізуючыя («верхні» і «ніжні») элемэнты.
Перад тым як зыдэнтыфікуем інфэрнальныя, «адхланныя» структуры *самасьці* ў Падголавым рамане, прапаную прасачыць

працэс адраджэньня.

АДРАДЖЭНЬНЕ

...Пайшлі яны ў бібліятэку, і стары пачаў расказваць, і на вачах у Лявона ён паступова ператвараўся ў мудрага чараўніка з казкі. (...) Усю ноч гаманілі Лявон і стары. Раз-пораз выходзілі да гасьцей. Лявон за ноч пражыў новае жыцьцё - столькі даведаўся. А ўвесь наступны дзень яго сусед Князь Пятро паліў лазьню. Да сонца Вылівaха мусіў парыцца. Сакрат чакаў таго моманту,

калі можна
будзе пачаць
старадаўні
рытуал.

Падобны матыў можам знайсьці і ў іншым выбітным «беларусазнаўчым» творы, у іншага Ўладзімера: «Каласах пад сярпом тваім» Караткевіча. Там таксама сустракаем рытуал *купаньня*, якое завяршае пэрыяд «дзядзькаваньня» Алеся Загорскага і распачынае *працэс злучэньня* ў душы двух аспэктаў беларускасьці: «мужыцкасьці» і «панскасьці», тутэйшасьці-эгалітарнасьці і элітарнасьці. Алесь Загорскі ў Караткевіча выконвае тую ж функцыю, што і Лявон Вылівaха ў Падгола - функцыю *эга*, якое рызыкнула сысьці ў адхлань несьвядомага. У абодвух аўтараў вельмі моцна падкрэсьлена архетыпічная пара, сызыгія, саюз Яго і Яе (у Падгола - Лявон і Настачка, у Караткевіча - Алесь і Майка), зьяўляецца таксама вобраз старца (у Падгола - Сакрат, у Караткевіча - стары Вежа), які выпрабоўвае эга і стымулюе працэс індывідуацыі. *Абодва - Караткевіч і Падгол - востра адчуваюць патрэбу аб'яднаньня дзьвюх Беларусяў - «сьвятой» Беларусі і «праклятай» Беларусі*. Лазьня, купаньне - гэта ўнівэрсальны сымбаль *адраджэньня* і *ачышчэньня*. Эфэкт адраджэньня ўзмацняецца яшчэ дадаткова матывам параньня:

Мудрэц сказаў:

- Глядзі. Усе камяні чырвоныя, як сонейка ... Камяні назапасілі гойны жар агню, які можа ацаляць і гартаваць...

Яны селі на паліцу, быццам у печ: гарэла ўсё цела, пякло ў роце і носе...

- Гэтую лазьню я рабіў разам з тваім бацькам. Хто папарыцца ў ёй - лучыцца з багамі старажытнымі...

- Дык тады, можа, і ў багоў ператворымся? - спытаў Лявон.

Стары не адказаў, лінуў на камяні настой з траў.

Параўнаньне «быццам у печ» тут вельмі дарэчы: лазьня-парыльня нагадвае *vulva*, матчына ўлоньне. «Жар агню» дапаўняе тайну купаньня, гэтаксама як канфірмацыя дапаўняе хрышчэньне ў хрысьціянстве. (Параўнайце словы Яна Хрысьціцеля: «Я хрышчу вас вадою, а Ён хрысьціць вас будзе Духам Сьвятым і агнём» - Мц 3:11.) «Старажытныя багі», зь якімі завязваецца лучнасьць у выніку параньня ў лазьні, - гэта істоты, якія жывуць у несьвядомасьці, хаўрусьнікі *эга*.

Маўчаньне старога ў адказ на пытаньне Лявона «Можа, і ў багоў ператворымся?» трэба інтэрпрэтаваць, хутчэй за ўсё, як *silentium reverentiae*, маўчаньне, функцыя якога ёсьць ушанаваць глыбокую таямніцу. (Параўнайце цытаваныя Хрыстом словы з кнігі Псальмаў: «Кажу вам: багамі зьяўляецеся» - Псальма 82:6, а таксама сьцьверджаньне: «Божае Царства - унутры вас» - Лк 17:21.)

- Забудзь пра сябе - трэба злучыцца з духам, аддаць сябе, душу сілам зямлі і нябёсаў, паветра і вады. (...) Зёлкі гэтыя, сабраныя кожная ў свой дзень ці ноч, калі яны квітнелі, каб палюбіць... Кветкі зьбіралі і ў самы доўгі дзень году, таму яны назапасілі ўсю гойную моц Перуна-бацькі і Зямлі-матухны.

«Забудзь пра сябе» сугучна з Хрыстовым: «Хто хоча ўратаваць сваё жыцьцё, згубіў яго, а хто згубіць сваё жыцьцё дзеля Мяне, знойдзе яго» - Мц 10:39, а таксама Юнгавым вучэньнем пра «страту душы» як неадлучны момант адраджэньня і індывідуацыі. Пярун-бацька і Зямля-матухна - гэта мужчынскі й жаночы архетыпы, якія цяпер ужо цалкам пазбаўлены сваіх амбівалентна-дэструктыўных формаў, бо ўзьдзейнічаюць яны на *эга* не непасрэдна, а толькі праз «кветкі» і «зёлкі». Кветкі і зёлкі, гэтыя кволыя істоты, пазбаўленыя той *уладнасьці*, якая ўласьціва Матцы і Бацьку.

«Ты цяпер не пра сябе думай, - цягне далей мудрэц-чараўнік, - слухай, што кажуць камяні... І душу расхіні, бо яна лучыцца з магутнымі душамі. Яны ўжо шэпчуць пра нешта. Ціха! Чуеш што яны гавораць...»

Вось і адказ на зададзенае Вылівахам хвіліну раней пытаньне: «Можа, і мы ператворымся ў багоў?» Так, багі жывуць унутры нас, тоячца ў несьвядомым. (Параўнайце прыпавесьць Хрыста «Пра скарб, схаваны ў глебе».) Памятаць усё ж трэба, што «вызваленьне багоў» - гэта небясьпечны працэс, бо *разам з багамі могуць (а нават мусяць!) павылазіць і чэрці*.

«А ці ёсьць сярод гэтых кветак папараць?» - пытаецца Вылівaха, і гэтае пытаньне тут надзвычай істотнае і патрэбнае. *Вылівaха адчувае, што яшчэ не адбылося поўнага злучэньня з* анімай. Старац адказвае, як і належыць, загадкава:

- Можа, і ёсьць. Можа, нават Князёўна папараці цяпер свае чароўныя сілы нам аддае.

- Як гэта? Што за Князёўна?

- Князёўна папараці, кветка, мае сакрэт, якога людзі ня

ведаюць, а Сьмерць яго каму і адкрые, дык тут жа да сябе таго чалавека і возьме. Хавае Кашчавая сакрэт кветкі-чараўніцы. Адбываецца тое, аб чым ужо была гаворка: *пачынае фармавацца новая структура* самасьці: новае, адроджанае *эга*, новая Пара (Анімус і Аніма) і новая Чацьвёрка. Старац ёсьць *чацьвёртым*, «ніжнім» элемэнтам папярэдняга этапу індывідуацыі і адначасна *першым*, «верхнім» элемэнтам новага этапу. У новай псыхалягічнай сытуацыі Лявон пачынае шукаць жаночую частку сваёй душы, зноў Ён шукае Яе, зноў фармуецца новая сызыгія: *Animus Renatus* і *Anima Renata* - «адроджаны дух» і «адроджаная душа».

І зноў паўстае трывожнае пытаньне: *а хто чацьвёрты*?

На гэты раз адказ намнога больш страшны і дзіўны: *чацьвёртым элемэнтам зьяўляецца Ідал, а на больш глыбокім узроўні - Сьмерць*. Нельга да канца адрадзіць сваю *аніму* без спатканьня са Сьмерцю. Але і без *адроджанай анімы* нельга перамагчы Сьмерць і вызваліцца ад Ідала! Вось што кажуць мудрэц-чараўнік і чырвоныя камяні:

- Беларус, які перад тварам Сьмерці ня толькі не палохаўся, а, наадварот, закахаўся ў дзяўчыну ці ў жанчыну, - атрымліваў Князёўну папараці - ад Бога. Тады Кветка-чараўніца надзяляла абранца незвычайным зрокам. Мог ён разгледзець у душы любога чалавека зародак каханьня і прывід сьмерці.

Стары лінуў на камяні, яны запыхкалі, зашапацелі. Старац казаў, а Лявону падалося, што камяні шэпчуць: «Такх-так-х... кахханьне... ч-шаканьне... Стары адкінуў галаву, заплюшчыў вочы і прамаўляў ужо аднекуль зь іншага сьвету:

- Князёўна дае ўладальніку разумець мову ідалаў. І галоўнае - Князёўна папараці робіць Боскага абраньніка ўладаром Кулі. «Кветка-чараўніца надзяляла абранца незвычайным зрокам». Зрок - гэта сымбаль інтэлекту, то бок, *рацыянальнай функцыі*. Сапраўднае каханьне - насуперак распаўсюджанаму меркаваньню *amantes amentes* («хто кахае - пазбаўлены розуму») - насамрэч узмацняе розум і завастрае зрок (параўнайце ў Плятона: «эрос - філософос»). Яшчэ больш важнай функцыяй кветкі-чараўніцы (якая тут, нагадаю, сымбалізуе *аніму*) ёсьць даваньне здольнасьці «разумець мову ідалаў», гэта значыць *магчымасьць асвоіць і інтэграваць ідалаў у псыхічную цэльнасьць*. Падкрэсьліць трэба, што мы ня ведаем, якую насамрэч сілу тояць у сабе Ідал і Сьмерць і што будзе, калі і

яны будуць паддадзены трансфармацыі, адраджэньню. (У Дабравесьці Госпада-Хрыста *сьмерць* непарыўна зьвязана з *уваскрасеньнем*).

Куля - гэта апошні (у рамане Падгола) этап індывідуацыі. Але паміж Старцам і Куляй бытуе амбівалентная псыхалягічная «прастора» - *Беларусь*.

БЕЛАРУСЬ-NATURA І БЕЛАРУСЬ-CULTURA

Беларусь - гэта ня толькі геапалітычная рэчаіснасьць, яна ў першую чаргу ёсьць *псыхалягічнай рэчаіснасьцю*. Гэта складаны і неадназначны псыхалягічны комплекс, той «чацьвёрты элемэнт», адкрыцьцё якога важна для псыхічнага разьвіцьця *людзей на пэўным геаграфічным абшары* (на іншых абшарах абавязваюць

іншыя інтэгруючыя сымбалі). На першых этапах свайго праяўленьня Беларусь явіцца як «Санта-балота» (адзін з назоваў Падголавага раману) - «сьвятое балота», нейкая дзікая і таямнічая прастора.

«Natura» і «cultura» тут трэба разумець у першапачатковым, этымалягічным значэньні. «Natura» - гэта апрадмечаны дзеепрыметнік будучага часу (*participium futuri*), які паходзіць ад дзеяслова «nascor, natus sum» - нараджацца. Слова «natura» можна інтэрпрэтаваць і як дзейсны (актыўны) дзеепрыметнік, і як прымальны (пасіўны), і як зваротны (*modus medius*) (усе гэтыя тры інтэрпрэтацыі магчымы, дарма што канчатак «-ura» ёсьць рысай дзейснага стану, паколькі сам дзеяслоў «nascor» ёсьць няпоўным дзеясловам (*verbum deponens*), ня мае ўласнай актыўнай формы). Вылучым такім чынам тры базавыя значэньні слова «natura»: «тое, што будзе (мае намер) нараджаць», «тое, што будзе (павінна быць) народжана» і «тое, што будзе (мае намер) нараджацца». *Natura - гэта матка і дзіця адначасова*. Можна казаць пра тры спосабы псыхалягічнага існаваньня Беларусі: *Беларусь-innata, Беларусь-nata* і *Беларусь-renata*: «ненароджаная», «народжаная» і «адроджаная». Апрадмечаны дзеепрыметнік «cultura» паходзіць ад дзеяслова «colo, colui, cultum» і значыць «урабляць, апрацоўваць». Ізноў

прымем дзьве інтэрпрэтацыі: актыўную і пасіўную. *Cultura* - гэта *творчая сіла, якая трансфармуе нейкі матэрыял, грунт,* а таксама *глеба-якая-павінна-быць-уроблена*. Такім чынам, культура знаходзіцца ў цеснай сувязі з натурай: культура паклікана ахоўваць «матку» і «дзіця», родзячае і роджанае. Гэта якраз тое самае, да чаго прыйшоў Марцін Гайдэгер у «Асноўных панятках мэтафізыкі» шляхам гермэнэўтыкі грэцкага «φυσισ» (этымалягічны эквівалент лацінскага «natura»): мысьляр і пясьняр (*Denker* und *Dichter*) - найбольш тыповыя прадстаўнікі культуры! - пакліканыя *казаць*, вы-*казваць*, па-*казваць* і такім чынам *ахоўваць* быццё (*Sein*). А некаторым дзеячам культуры «культура», мусіць, асацыюецца з «кансэрвацыяй», і яны сваю місію бачаць ня ў тым, каб ахоўваць тое-што-родзіцца, а каб кансэрваваць родную глебу! Інакш кажучы, замест таго, каб з матычкай або з плугам урабляць глебу, яны пачынаюць яе бэтанаваць, цэмэнтаваць і асфальтаваць, каб - барані Бог - нічога новага не прарасло... Вось недарэчнасьць!

Прасочым цяпер працэс *нараджэньня* і *адраджэньня* Беларусі ў псыхіцы.

Папярэдні (папярэдне прэзэнтаваны) этап індывідуацыі беларускай душы праходзіў водле такой структуры:

	Князь	
Ён	[image]	Яна
	Старац	

Старац-чараўнік, як мы ўжо бачылі, выконваў функцыю *псыхапомпа* - ён увёў Выліваху ў новае вымярэньне:

	Старац	
Лявон	[image]	Настачка

Карысна будзе кінуць вокам на працэс праяўленьня Беларусі ў сьвядомасьці Алеся Загорскага з раману Ўладзімера Караткевіча («Каласы пад сярпом тваім» і «Куля для прэзыдэнта» ў пэўным сэнсе ізамарфічныя: у Караткевічавым творы можна знайсьці амаль усе псыхалягічныя структуры, якія будуць адпавядаць псыхалягічным структурам у рамане Падгола). Алесь вярнуўся зь сялянскай хаты ў

панскі
палац.
Пачаткова
гэты
падлетак
перажывае
пакутны
раскол
паміж
«мужыцкай»
і «панскай»
часткай
сваёй душы.
І вось
спатыкае
інтэгруючы
сымбаль:

І ўсё ж найбольш цягнуў да сябе Алеся той самы «Хлопец з канём» Мантэньі. Было ў гэтай карціне нешта наіўна-прывабнае і мудрае.

І ня ў тым справа, што хлопец быў - выліты ён, хаця і ў чужым заморскім касьцюме, а конь - сапраўдны Ўрга, той самы Ўрга, які палюбіў яго, Алеся, больш за іншых...

Ня ў гэтым была справа.

Справа была ў тым, што празь лісьце густа-зялёнай яблыні з залатымі пладамі глядзеў такі далягляд, якога не бывае на зямлі, далягляд невядомай блакітнай краіны...

У рамане Караткевіча трансфармацыі *самасьці* адпавядае наступства вобразаў «Белы конь»-«Стары Вежа»-«Беларусь», а ў рамане Падгола: «Князь»-«Стары Сакрат»-«Беларусь» (варта зацеміць, што ў беларускім гербе «Пагоня» накладваюцца вобраз Белага каня і вобраз Князя).

Беларусь на пэўным этапе псыхічнага разьвіцьця пачынае функцыянаваць як *раздвоеная* рэчаіснасьць. У таго самага Алеся Загорскага (сымбаль *эга*) на яве Беларусь бачылася як рамантычная «невядомая блакітная краіна», а ў сьне са сфэры несьвядомага «вылазілі» іншыя вобразы: «А ўначы прыходзілі забароненыя, брыдкія мужыцкія сны». У таго самага Караткевіча сустракаем супярэчлівыя прэдыкацыі адносна Беларусі: «прыўкрасная» і «няшчасная», «каханая» і

«зьнішчаная». У многіх іншых аўтараў зьяўляюцца ці то мартыралягічныя матывы: «Беларусь Укрыжаваная», ці то хрысталягічныя (параўнайце з пазьнякоўскай інтэрпрэтацыяй колераў бел-чырвона-белага беларускага сьцяга як сымбаляў крыві і вады, што выцеклі з прабітага боку Хрыста). Беларусь супрагае ў сабе вобразы «Божага Гораду» (*Civitas Dei*) і «праклятай масы» (*masa damnata*), яна старая і маладая, старажытная і толькі-што-зьяўленая, народжаная (natio) і ненароджаная (*innatio*). Яна «цнатлівая» і «згвалчаная», ганарыстая і пакорлівая, верная і прадажная - усё гэта можна знайсьці ў беларускіх прарокаў-песьняроў, выражальнікаў калектыўных пачуцьцяў. Беларусь - гэта тыповая *meretrix casta*, «чыстая прастытутка», «прыгажуня-спачвараная».
Перажываньне раздвоенасьці, хоць і ня дужа камфортнае, мае вялікае значэньне, яно сыгналізуе правільны ход разьвіцьця. Тым ня менш, раздвоенасьць тоіць у сабе і небясьпеку: калі ня зьявіцца інтэгравальны элемэнт («верхні» і «ніжні»), то можа пачацца рэгрэс, а менавіта *спроба выцесьніць у несьвядомае адзін з аспэктаў Беларусі*. У выніку паўстаюць устойлівыя і небясьпечныя комплексы: або «комплекс непаўнавартасьці» (фіксацыя на цёмных аспэктах Беларусі), альбо «комплекс звышвартасьці» (фіксацыя на сьветлых аспэктах).
Гляньма, якая структура паўстае ў выніку пошукаў новага інтэгруючага элемэнту:

	Беларусь	
беларускія багі	[image]	папараць-кветка
	Ідал	

Як бачым, у
меру
поступу
індывідуацыі
ўся справа
ня толькі не
вырашаецца,
а нават
ускладняецца.
Ідал як
інтэгруючы
элемэнт

яшчэ больш
узмацняе
амбівалентнасьць,
а нават
выклікае
паняверку:
ці нашае
разьвіцьцё
ідзе ў
правільным
кірунку? І
тут нас
супакойвае...
лепш
сказаць
устрывожвае
Карл Юнг:
ніжні
элемэнт
пераважна
явіцца як
чорная сіла,
д'ябал,
абсалютнае
зло. (Калі
«наверсе» -
дасканалы
Хрыстос, то
«ўнізе» -
грэшны
Адам, а ў
больш
глыбіннай
структуры:
Адам -
верхні
элемэнт, а
ўнізе -
зьмей-
дэман.)

Каменны ідал натуральным чынам выклікае адмоўныя пачуцьці: варожасьць і страх. Тым ня менш, у такіх выпадках неабходна запытаць - раіць Юнг - пра *адваротны бок* зьяўленага сымбалю. Ідал - чытаем у Падгола - гэта дзіця і гадаванец Сьмерці. Здавалася б, абсалютнае зло. Але нельга тут прапусьціць адну інтрыгоўную акалічнасьць, а менавіта тое, што *Сьмерць нарадзіла і выхавала Ідала пад уплывам каханьня*! Ідал зьявіўся на сьвет у выніку неадольнай *цягі Сьмерці да жыцьця і каханьня*. Варта нагадаць таксама, што сьмерць зачала Ідала ад... дзядзькі Вылівахі! Лявон Выліваха - гэта стрыечны брат Ідала. Ідал - гэта *цень* шляхетнага беларуса... Як кажа цытаваная ў эпіграфе кубінская пісьменьніца-дысыдэнтка Зоэ Вальдэс: «У кожным з нас жыве маленькі Фідэль». *У кожным з нас - можам сказаць, перафразуючы Зоэ - жыве маленькі лукавы Ідал*!

Ідал - гэта ўстойлівая структура беларускай псыхікі. У грамадзка-палітычным пляне каменны Ідал праяўляецца як улада «моцнай рукі»: ён, з аднаго боку, ёсьць гарантам «парадку» і «стабільнасьці» (дазваляе ўціхамірыць беларускія супярэчнасьці), а з другога боку, абмяжоўвае, а нават зьнішчае свабоду і блякуе далейшае разьвіцьцё. Гора беларусам, калі спыняцца на гэтым «ідалапаклончым» этапе разьвіцьця. Каменны Ідал можа ўсё ж стацца тым славутым «філязафічным каменем», які стымулюе трансфармацыю сьвядомасьці. Што праўда, далейшае пагружэньне ў несьвядомае нічога суцяшальнага не нясе:

беларускія душы — Ідал [image] СЬМЕРЦЬ — сорак дыктатараў

але яно
неабходнае
для
індывідуацыі.
Ня будзе «і
на нашай
вуліцы
кірмаша»,
калі не
сутыкнемся

з найбольш цёмнымі і жудаснымі аспэктамі нашай псыхікі. Іван Жахлівы, які загадаў Лявону гвалціць уласную дачку, а калі той не хацеў, то сам адсек яму чэлес са словамі «То тады я згвалчу яе тваім х...», Мураўёў-Вешальнік, Гітлер, Сталін - усё гэта рэчаіснасьць, якая тоіцца ў адхланях нашага несьвядомага - калектыўнага і асабовага. На дне гэтага пекла знаходзіцца галоўны спонсар зла і страху - СЬМЕРЦЬ.

І тут найлепшы момант, каб успомніць прароцтва адносна *кветкі-чараўніцы*, якая сымбалізуе *аніму*. Стваральная энэргія магічнай папараць-кветкі бытуе ў душах тых беларусаў, якія ня страцілі здольнасьці кахаць. Парадаксальна, але менавіта ў часе найбольшага трыюмфу Сьмерці (пэрыяд пасьля чарнобыльскай аварыі) праяўляецца вырашальны і канчатковы (цяпер ужо сапраўды канчатковы) трыюмф Каханьня! (Параўнайце словы Сьвятога пісаньня: «Дзе, аднак, узмоцніўся грэх, там яшчэ шырэй расплылася Ласка» - Рымлянаў 5:20.) І гэты трыюмф Каханьня - варта ўвагі - зусім ня ёсьць літаратурнай праекцыяй Падгола; аўтар раману адмыслова прывёў дзясяткі вытрымак з розных газэт, якія рэфэруюць гераічныя і на першы погляд шалёныя ўчынкі закаханых людзей, што апынуліся перад абліччам сьмерці сваіх каханых. І менавіта яны - плеяда закаханых чарнобыльскіх душаў - утварылі ў касьмічнай прасторы «Зорны Чарнабыльнік», які выпрамяняе чароўныя галасы вячыстай песьні закаханых-памерлых. І гэтыя галасы аказваюць як быццам цудадзейны ўплыў на спрасаваныя «саламяныя» беларускія душы: гэтыя пачынаюць абуджацца і адраджацца...

А што са Сьмерцю?

Зорны Чарнабыльнік - гэта таксама сьмерць: сьмерць Сьмерці:

Зорны Чарнабыльнік
(=сьмерць Сьмерці)

Animus Renatus [image] Anima Renata

Куля

Куля → (акола) - найбольш выразны і ўнівэрсальны сымбаль *самасьці*. Куля - гэта альхімічнае *rotundum* (круглае), якое аб'ядноўвае

архетыпічную чацьвёрцу і ў якім злучаюцца чатыры стыхіі: Вада, Агонь, Зямля, Паветра, а таксама эвангелічнае *granum sinapis* (зярнятка гарчыцы), «найменшае сярод зерняў, зь якога вырастае вялікае дрэва, пад якім нябесныя птушкі зьбіраюцца і гнёзды будуюць сабе» (Мц 13:31). Куля зьяўляецца таксама *στιγμα* (пункт), у якім сустракаюцца і злучаюцца супрацьлегласьці (*coincidentia oppositorum*).

Зроблены намі аналіз фэномэну *Беларусь-natura* дазваляе зрабіць пару зацемаў-рэфлексіяў адносна *Беларусь-cultura*. Няпраўду кажа Леанід Лыч, што «ўсе нашыя беды» бяруцца быццам бы з таго, што «беларускі народ - ня ў прыклад іншым эўрапейскім народам - не прайшоў сапраўднай школы нацыяналізму». Усе нашы беды не з таго, што мы не прайшлі «школы нацыяналізму», а з таго, што не адбыўся працэс дыфэрэнцыяцыі беларускага грамадзтва. Усьцяж моцныя ў нашай сьвядомасьці рэлікты племяннога сьветаўспрыманьня, надалей дамінуе ўстаноўка на гамагенную і замкнёную супольнасьць. Праваслаўныя, напрыклад, ня ведаюць, што рабіць з каталікамі, а каталікі - з праваслаўнымі, «сьвядомыя» - зь «несьвядомымі», і наадварот, «эўрапейскія» - з «савецкімі», і *vice versa*. Нацыяналізм жа можна акрэсьліць як мастацтва ідэнтыфікацыі «сваіх» і «чужых», а гэта - мякка кажучы - ня дужа высакароднае майстэрства, і гэтае майстэрства найменей цяпер патрэбна.

Усе беды беларусаў бяруцца з таго, што беларусы ня любяць адзін аднаго. А ня любяць, *бо баяцца* адзін аднаго, а баяцца, *бо ня ведаюць* адзін аднаго. *Невуцтва, страх і нянавісьць* - вось асноўныя нашыя грахі і крыніца нацыянальных няшчасьцяў. Парадаксальным чынам, блюзьнерскія словы Акудовіча, кінутыя Богу: «Ня Ты, грэх - наш бацька» - у гэтым кантэксьце аказваюцца цэльнымі: дапраўды, згаданыя беларускія грахі і легітымізуюць панаваньне бацькі-дыктатара.

Калі ў рамане Падгола трансфармацыя сьвядомасьці праходзіць пасьпяхова, то перш за ўсё таму, што на кожным этапе зьяўляецца каханьне. Любоў, як вучыць сьвяты Тамаш Аквінскі, - гэта *vis concretiva et vis unitiva* - злучальная і яднальная сіла. Такім чынам, як ужо было прыкмечана, любоў утварае «злучальную тканку» і альтэрнатыву для мэханічнага, сілавога аб'ядноўваньня. Поруч з каханьнем Падгол асобна падкрэсьлівае ролю гумару. Беларускі бог Хіхатун зьявіўся тады ў лазьні і зьяўляўся амаль на ўсіх этапах індывідуацыі, а і сам раман, нягледзячы на сур'ёзнае зьмесьціва, перапоўнены сьмехам, жартам і забавай. Цікава, што ў мэдыцыне сыстэма кровазвароту называецца *гумаральнай* сыстэмай (*humor* - вільгаць), аналягічна і ў псыхічнай сфэры гумар адказвае за правільны «энэргазварот», амартызуе стрэс і разблякоўвае адносіны.

Палітыцы сьмерці наканавана сьмерць.

* * *

Адкрытыя намі псыхалягічныя структуры можна лічыць ключом - прынамсі, зубком ключа - да псыхааналітычнай інтэрпрэтацыі «Кулі».
Рэфлексію над раманам Падгола варта закончыць адной павучальнай прыпавесьцю. Ішоў дарогаю стары, зьнямоглы чалавек, на кіёчак абапіраючыся, а насустрач яму шпаркім крокам крочыць малады і дужы, але, відаць, задзірысты хлапец. «Гэй, стары чорце, - крычыць хлапец, - з дарогі сыдзі». Стары ў адказ культурна папрасіў даць яму прайсьці. У адказ малады асілак паваліў старога на зямлю і жорстка зьбіў яго. Праз тыдзень хлапец захварэў і то настолькі, што ніякі лекар ня мог уцяміць, што гэта за хвароба і як яе лячыць. Калі ўжо юнак быў ледзь не пры сьмерці, зьявіўся да яго стары, той самы, каторага гэты хлапец бязьлітасна зьбіў. І высьветлілася, што гэты стары - прафэсіянал у баявым майстэрстве, і што падчас той бойкі ён нанёс тры непрыкметныя ўдары юнаку, але настолькі трапныя, што той неўзабаве занядужаў і апынуўся на ложы сьмерці. Але той самы стары ведаў і сакрэт лячэньня гэтай хваробы, даў юнаку адпаведныя лекі і такім чынам уратаваў яму жыцьцё. Мараль гэтай прыпавесьці адносіцца да сучаснай палітыкі. Як бы апантана рэжым ні змагаўся з культурай і жыцьцялюбнай этыкай, яна, культура, заўсёды здолее нанесьці два-тры (а болей і ня трэба) трапныя ўдары, ад якіх уся аўтарытарная палітычная сыстэма апынецца на ложку сьмерці. Культура - як кажа Булгакаў - страшэнная сіла.
Культура сьмяецца з палітыкі.
Кракаў, люты 2005
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/8

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

[image]

крытыка [image]2005
"да Зыкасту"
паемыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Андрэас Капэлер
Двухсэнсоўнасці русіфікацыі

АНДРЭАС КАПЭЛЕР
супрацоўнік Інстытуту гісторыі Ўсходняй Эўропы Венскага ўнівэрсытэту.

Дасьледуе расейска-ўкраінскія ўзаемаадносіны і ўкраінскую гарадзкую культуру XIX ст. Летась уклаў зборнік «Die Geschichte Russlands im 16. und 17. Jahrhundert aus der Perspektive seiner Regionen», пазалетась

Dolbilov Mikhail. Russification and the Bureaucratic Mind in the Russian Empire’s Northwestern Region in the 1860s // Kritika: Explorations in Russian and Eurasian History. Vol. 5. No. 2. Spring 2004. P. 245–271.

Staliunas Darius. Did the Government Seek to Russify Lithuanians and Poles in the Northwestern Region after the Uprising of 1863–1864? // Kritika: Explorations in Russian and Eurasian History. Vol. 5. No. 2. Spring 2004. P. 273–289.

У 1970-я гг., калі я пачаў даследаваць нацыянальную палітыку расійскага царызму, на гэтую тэму было вельмі мала надзейных акадэмічных работ. Савецкая гістарыяграфія падкрэслівала гарманічныя адносіны паміж расійскай дзяржавай і нерасійскімі этнічнымі групамі («дружба народаў»), і накладала табу на абмеркаванне нацыянальнага пытання. Таму далікатная тэма дачыненняў паміж Расіяй і палякамі, літоўцамі, беларусамі свядома не закраналася не толькі большасцю гісторыкаў у савецкіх рэспубліках (Беларусь, Літва), але і ў камуністычнай Польшчы.

Міжваеннай польскай і літоўскай гістарыяграфіі, традыцыі якой перахоўваліся гісторыкамі-эмігрантамі, была ўласціва ўстаноўка, што ў царскай імперыі вялася мэтаскіраваная,

сістэматычная палітыка русіфікацыі ўсіх нерасійскіх народаў Заходнія спецыялісты па расійскай гісторыі ў значнай ступені запазычылі яе, хаця сустракаліся і выключэнні. Першыя комплексныя, напісаныя па-новаму манаграфіі, прысвечаныя нацыянальнай палітыцы на захадзе імперыі – два тамы, адрэдагаваныя і часткова напісаныя Эдвардам Тэйдэнам, выйшлі з друку толькі ў пачатку 1980-х гг. Тэйдэн не толькі з меркаваннем, што палітыка русіфікацыі мела сістэмны і доўгатэрміновы характар і выявіў адрозненні паміж двума тыпамі русіфікацыі, адміністрацыйным і культурным. Першы браў пачатак за часоў Кацярыны II, быў найбольш прадуктыўны і важным; другі праявіўся пасля 1830 г. і асабліва пасля 1863 г. Культурная русіфікацыя вялася ў імперыі толькі часткова і не была сістэмнай[1]. Ідучы ў рэчышчы гэтай інтэрпрэтацыі, ён паспрабаваў зрабіць колькі абагульненняў адносна нацыянальнай палітыкі царызму[2].

Пасля распаду Савецкага Саюза сітуацыя ў гістарыяграфіі кардынальным чынам змянілася: зніклі табу, навязаныя польскім, літоўскім, беларускім, украінскім і расійскім даследчыкам, адкрыліся дагэтуль недаступныя архівы. У той час як многія старэйшыя гісторыкі зрабілі выбар на карысць «нацыянальнай парадыгмы», маладзейшае пакаленне навукоўцаў умела скарысталася новымі магчымасцямі і занялося публікацыяй глыбокіх даследаванняў, прысвечаных нацыянальнай палітыцы на захадзе імперыі. На сённяшні дзень існуе міжнародная сетка спецыялістаў з Польшчы, Расіі, Літвы, ЗША, краін Заходняй Еўропы, якія плённа працавалі ў архівах, выдатна валодаюць мовамі і здольныя на высокім узроўні падтрымліваць міжнародную дыскусію аб прыродзе, мэтах і праявах русіфікацыі ў 1860–1870-я гг. Я спынюся на двух апошніх артыкулах на гэтую тэму – «Русіфікацыя і бюракратычны дух у Паўночна-Заходнім краі Расійскай імперыі у 1860-я гг.» расійскага гісторыка Міхаіла Далбілава і «Ці спрабаваў урад русіфікаваць Паўночна-Заходні край пасля паўстання 1863–1864 гг.» яго калегі з Літвы Дарыуса Сталюнаса. Іншыя ўдзельнікі дыскусіі, чые творы часта цытуюцца ў згаданых артыкулах – Генрык Глэнбоцкі і Вітальд Радкевіч з Польшчы, Леанід Гарызонтаў і Аляксей Мілер з Расіі, Тэадор Р. Уікс са Злучаных Штатаў, Даніэль Бавуа з

Францыі, Андрэас Рэнэр з Германіі[3].

Артыкулы Сталюнаса і Далбілава тычацца палітыкі русіфікацыі ў Паўночна-Заходнім краі ў 1860-я гг. – таго, як яна задумвалася, фармулявалася і ажыццяўлялася ўладамі, прыватнасці, мясцовай расійскай бюракратыяй. Абодва аўтары добра папрацавалі з расійскімі і літоўскімі архіўнымі дакументамі і з апублікаванымі апошнімі часамі крыніцамі, абодва ўжываюць сучасныя метадалогіі да аналізу дыскурсаў, (асабліва Далбілаў) удала выкарыстоўваюць канцэпцыі рэпрэзентацыі, сімвалаў і міфатворчасці. Аўтары падтрымліваюць агульнапрыняты тэзіс, што мэтаскіраванай, сістэматычнай палітыкі русіфікацыі ў плане культурнай і моўнай асіміляцыі не вялося і што тагачасная карціна была вельмі складанай. Значэнне ключавых тэрмінаў «русіфікацыя», «паляк», «літвін», адносная вартасць разнастайных маркераў нацыянальнасці (мова, алфавіт, рэлігія, класавы/маёмасны стан) мелі гэтаму шмат варыянтаў. Гэтая варыятыўнасць умела праілюстравана добра падабранымі ўзаемасупярэчлівымі цытатамі з крыніц; праўда, часам здаецца, што некаторыя цытаты былі выбраныя такі адвольна і наўздагад, стварае ўражанне, што сведчаннямі з тагачасных крыніц можна пацвердзіць любы тэзіс.

У абодвух артыкулах добра выяўлены шматлікія супярэчнасці ў расійскай нацыянальнай палітыцы. Так, з аднаго боку, царскія чыноўнікі зыходзілі з таго, што беларускія сяляне былі ісцінна расійскімі людзьмі, і адначасна верылі, што тым самым сялянам пагражае паланізацыя і іх трэба вызваліць ад магутнага польскага ўплыву. Таксама назіраліся супярэчнасці і нестыкоўкі паміж прасоўваннем праваслаўя і пашырэннем расійскай мовы – двух асноўных маркераў расійскай нацыянальнай ідэнтычнасці. Гэтае пытанне было шырока разгледжана ў тым раздзеле артыкула Далбілава, дзе апісаны спробы ўвесці расійскую мову ў «дадатковыя» каталіцкія

[1] Edward C. Thaden, Russia's Western Borderlands, 1710–1870. Princeton, NJ: Princeton University Press, 1984; Thaden, ed. Russification in the Baltic Provinces and Finland, 1855–1914. Princeton, NJ: Princeton University Press, 1981; Edward C. Thaden. Russification in Tsarist Russia // Modern Encyclopedia of Soviet and Russian History. Vol. 32. 1983. P. 205–212.

[2] Adam Kappeler, Russlands Vielvölkerreich. Entstehung, Geschichte, Zerfall. München: C.H. Beck, 1992.

[3] Andreas Renner. Russifizierung oder Polonisierung? Nationalitätenpolitik und Nationalismus im Königreich Polen, 1863–1914. Köln: Böhlau, 2001.

1998; Theodore R. Weeks. Nationalism in Late Imperial Russia: Nationalism and Russification on the Western Frontier, 1863–1914. DeKalb: Northern Illinois University Press, 1996; Witold Rodkiewicz. Russian Nationality Policy in the Western Provinces of the Empire (1863–1905). Lublin: Scientific Society of Lublin, 1998; Горизонтов Л. Парадоксы имперской политики: поляки в России и русские в Польше. – Москва: Индрик, 1999; Миллер А. «Украинский вопрос» в политике властей и русском общественном мнении (вторая половина XIX в.). – СПб.: Алетейя, 2000; Andreas Renner. Russischer Nationalismus und Ostkirchenfrage in Zarenreich, 1858–1875. Köln: Böhlau, 2000; Henryk Chęwbocki. Fatalna sprawa. Kwestia polska w rosyjskiej myśli politycznej, 1856–1866. Kraków: Arcana, 2000. Кнігі на літоўскай мове (напр., творы Вітаўта Меркіса, цытаваныя ў абодвух артыкулах) мне недаступныя.

Theodore R. Weeks. Religion and Russification: Russian Language in the Catholic Churches of the «Northwest Provinces» after 1863 // Кентавр. 2001. №1. С. 87–110.

Гістарычныя прыклады і мноства іншых супярэчнасцей. Большасць вынойкаў выступала за падтрымку праваслаўя і расійскай мовы, але не даваралі аўтаномным, непадканцрольным уладам ініцыятывам, якія выходзілі ад расійскага грамадства (напр., праваслаўным брацтвам) і пераследавалі тыя самыя мэты. Зразумела, што чыноўнікі пастаянна ўмешваліся на бок сялянаў, якія выступалі супраць польскага засілля, і той насіл імперскі цэнтр выказваўся супраць падтрымкі прыніжаных сялянскіх культур. Існавалі таксама разыходжанні паміж рознымі дэпартаментамі расійскага ўраду, паміж асобнымі чыноўнікамі або паміж чыноўнікамі і публіцыстамі. Абодва аўтары лічаць, што царская бюракратыя не спрабавала знішчыць або ператварыць гэтыя відавочныя супярэчнасці.

Як можна патлумачыць шматлікія нестыкоўкі ў палітыцы царызму? Аўтары абодвух артыкулаў слушна звяртаюць увагу на глыбінную супярэчнасць паміж традыцыйнай імперскай ідэалогіяй, заснаванай на дынастычнай лаяльнасці і маёмасным цэнзе, з аднаго боку, і мадэрным нацыяналізмам, з другога. Царская палітыка ў дачыненні да памежных краёў, заселеных нерасійскімі народнасцямі, будавалася на прынцыпе супрацоўніцтва з лаяльнымі мясцовымі элітамі, чые прывілеі пацвярджаліся і якім звычайна надавалася дваранская годнасць, якая адпавядала статусу вышэйшага слоя расійскіх землеўладальнікаў. Наўзамен яны павінны былі падтрымліваць законнасць і парадак у памежных раёнах, служыць цару ў войску і бюракратыі. Дзякуючы гэтаму не толькі балтыйскія немцы і шведскамоўныя фіны, але і вышэйшы слой польскай шляхты сталі расійскімі дваранамі. Традыцыйная схема супрацоўніцтва была падарвана ў 1830 г., а асабліва – у 1863 г. З афіцыйнага пункту гледжання, польскія шляхціцы парушылі сваю прысягу на вернасць цару. Цяпер іх лічылі здраднікамі, і таму царскі ўрад быў вымушаны шукаць новых метадаў і сродкаў, каб трымаць пад кантролем заходняе памежжа

імперыі, у якім стагоддзямі дамінавала польская шляхта. У 1860-я гг., калі традыцыйны метад супрацоўніцтва з польскімі элітамі пацярпеў фіяска, вялікія рэформы Аляксандра II перасьледавалі мэту мадэрнізацыі, павелічэння кіраванасці і гамагенізацыі традыцыйна разнароднай сацыяльнай і адміністрацыйнай сістэмы імперыі. Гэта падштурхнула русіфікацыю адміністрацыйнымі сродкамі. Адначасова ў публічнай прасторы, якая актыўна павялічвалася, узнік мадэрны расійскі нацыяналізм і пачаў выступаць за супадзенне імперскай або грамадзянскай нацыі і расійскай этнічнай нацыі. Гэтая новая ідэалогія, галоўным прапагандыстам якой у 1860-я гг. быў Міхаіл Каткоў, аслабляла старыя апоры імперскага рэжыму – палітычную лаяльнасць самадзержцу і стаўку на эліты, незалежна ад іхняй мовы і рэлігіі. Хаця царызм з падазрэннем ставіўся да мадэрнага нацыяналізму, які асацыяваўся з ростам аўтаноміі грамадства і пашырэннем дэмакратычных ідэй, новая візія расійскай этнапалітычнай нацыі пачала ўплываць на афіцыйную палітыку. Дзякуючы нарастанню ўвагі да этнічных пытанняў лаяльнасць пачала атаясамлівацца хутчэй з этнічным паходжаннем, чым з сацыяльным статусам. Палякаў – а пазней немцаў, яўрэяў і іншыя нацыянальнасці – усё часцей сталі разглядаць як «ворагаў». Тым не менш, гэтыя новыя павевы да канца не абумовілі традыцыйнай імперскай палітыкі. У выніку «нацыянальная палітыка» царызму заставалася супярэчлівай і непаслядоўнай аж да краху Расійскай імперыі.

Сталюнас і Далбілаў звяртаюць увагу на амбівалентнасць і полісемію тэрміна «русіфікацыя» і этнонімаў «расіец» («российский»/«русский»), «беларус», «паляк» і «літовец». Яны падкрэсліваюць варыятыўнасць ужывання гэтых тэрмінаў – пытанне, ігнараванае ранейшымі даследчыкамі. Таму трэба вельмі асцярожна падыходзіць да прачытання і інтэрпрэтацыі гэтых тэрмінаў, паколькі яны могуць мець розныя (моўнае, рэлігійнае, сацыяльнае, палітычнае, адміністрацыйнае) значэнні ў залежнасці ад гістарычнага кантэксту і выкарыстаных крыніц. Сталюнас пераканаўча даводзіць, што для большасці расійскіх чыноўнікаў тэрмін «паляк» меў хутчэй сацыяльны і рэлігійны, чым этнічны сэнс. Тэрмін «літовец» мог мець моўнае, сацыяльнае, геаграфічнае значэнне і ўжываўся

паралельна з тэрмінам «жмудзін» («жмудзь»), хаця ў час перапісу насельніцтва 1897 г. жамойцкая мова вылучалася ў асобную катэгорыю. Даследаванні з галіны «паняційнай гісторыі» (Begriffsgeschichte) неабходна працягваць і пашыраць на іншыя супярэчлівыя паняцці, такія, як нацыя, народнасць/нацыянальнасць, народ, племя, ускраіна (окраина), унутраныя губерні, калонія/каланіяльны, імперыя/імперскі, украінскі/маларасійскі/паўднёварасійскі, заходнерасійскі (западнорусский), жыд/яўрэй, татарын, сарт, стара/навахрышчаны (старо/новокрещеный), інародцы, туземцы. Яны маглі б спрычыніцца да стварэння слоўніка Расійскай імперыі – карыснага дапаможніка для гістарычных студый.

У папулярнай літаратуры сярод русіфікацыйных захадаў 1860-х гг. звычайна называюць забарону друку на ўкраінскай, беларускай і літоўскай мовах (на аснове лацінскай графікі)[5]. Украінскі выпадак быў добра прааналізаваны ў нядаўняй кнізе Аляксея Міларад, а факт існавання забароны на беларускамоўны друк быў нядаўна пераканаўча абвергнуты Сталюнасам[6]. Сітуацыя з літоўскай мовай разглядаецца у артыкулах Сталюнаса і Далбілава. Старанна вывучыўшы архіўныя крыніцы, яны згаджаюцца з думкай Тэадора Уікса, згодна з якой царская бюракратыя імкнулася не да асіміляцыі, а да абароны літоўцаў ад польскага ўплыву. Калі Сталюнас падзяляе традыцыйныя погляды, паводле якіх генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў у 1864–1865 гг. выдаў загад аб забароне літоўскага друку лацінскімі літарамі, Далбілаў пераканаўча даводзіць, што такі загад у архівах не зафіксаваны і што кансерватар Мураўёў (вешальнік) быў у гэтым пытанні больш стрыманы, чым ліберал Мікалай Мілюцін, чыё выказванне «расійская грамата завершыць справу, якую распачаў расійскі меч» цытуюць абодва аўтары. Толькі ў верасні 1865 г. новы генерал-губернатар фон Каўфман выдаў цыркуляр, які забараняў літоўскамоўны друк лацінкай, аднак і ў наступныя гады гэтае пытанне абмяркоўвалася царскімі чыноўнікамі. Магчыма, гэтыя хістанні адлюстроўвалі той факт, што афіцыйны Пецярбург надаваў мала ўвагі літоўскай «сялянскай нацыі» як этнічнай групе. Сталюнас падкрэслівае, што некаторыя літоўскія інтэлектуалы станоўча адрэагавалі на забарону літоўскага друку лацінкай. На ранняй стадыі развіцця

5 Май 1860 г. «Украинский вопрос»...

6 Сталюнас Д. Границы в пограничье: белорусы и этнолингвистическая политика Российской империи на западных окраинах в период Великих Реформ // Ab Imperio. № 1. 2003. С. 261–292.

літоўскай нацыянальнай ідэнтычнасці для яе было важней адмежавацца ад каталікоў-палякаў, якія дамінавалі сацыяльна і культурна, чым ад расійцаў і царскага ўраду.

Указаны довад можа дапамагчы разуменню пазіцый розных гістарыяграфічных школ, якія існуюць у вывучэнні русіфікацыі. Сталюнас вылучае два падыходы: згодна з поглядамі, уласцівымі большасці навукоўцаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, царская палітыка мела на мэце культурную русіфікацыю, і рэвізіяністцкую школу расійскай і заходняй гістарыяграфіі. Я б сказаў, што ёсць тры падыходы ў залежнасці ад падставовых інтарэсаў тагачасных актараў. Польская эліта адчувала на сабе жорсткую моўную русіфікацыю і рэлігійную дыскрымінацыю, і большасць польскіх гісторыкаў прымаюць гэты погляд і інтэрпрэтуюць царскую нацыянальную палітыку пачынаючы з 1830-х гг. як сістэматычную культурную русіфікацыю[7]. Для літоўцаў, а часткова для беларусаў і ўкраінцаў, русіфікацыя азначала таксама дэпаланізацыю, якая, наадварот, магла палегчыць іх сацыяльную і нацыянальную эмансіпацыю, таму літоўскія гісторыкі ўспрымаюць русіфікацыю як двухсэнсоўную з'яву. Урэшце, многія расійскія і заходнія даследчыкі разглядаюць прадмет спрэчкі з гледзішча расійскай бюракратыі і падкрэсліваюць адносна млявы (у параўнанні з тачачаснымі і пазнейшымі нацыянальнымі дзяржавамі) і несістэматычны характар гэтай палітыкі. Розныя інтэрпрэтацыйныя школы адлюстроўваюць у асноўным гэтыя розныя пункты гледжання. Аднак ёсць і выключэнні: напрыклад, Гайнц-Дытрых Лёве, які лічыць, што культурная русіфікацыя была доўгатэрміновым праектам, распачатым у перыяд царавання Кацярыны II. Нядаўна ў гэтым жа духу выказаўся Дэвід Соўндэрс[8].

Такім чынам, трэба браць пад увагу розныя бачанні і розныя кантэксты расійскай палітыкі: рэгіянальны, імперскі, міжнародны. Дужа карыснай з'яўляецца заўвага Далібога Радкевіча тым, што гэтыя з'явы трэба вывучаць у кантэксце Вялікіх рэформаў і ў параўнанні з сітуацыяй у іншых імперскіх рэгіёнах. Сапраўды, можна правесці паралелі паміж насаджэннем кірыліцы і падтрымкай мясцовых моваў у лацінцы, польскай мове і каталіцызму на захадзе і

[7] Вялікі ўплыў на Радкевіч абгрунтаваў такую нацыянальную палітыку як «бюракратычны нацыяналізм»,

аналагічнымі захадамі, скіраванымі супраць арабскага
алфавіту, цюркскіх моваў і ісламу на ўсходзе імперыі (гэтую
сістэма Ільмінскага). Увогуле, ёсць неабходнасць у моўную
кампаратыўным вывучэнні палітыкі навяртання ў «праваслаўную
веру на захадзе (не толькі каталікоў, але і лютэранаў
прыбалтыйскіх рэгіёнаў), усходзе і поўдні імперыі. Для
лепшага разумення расійскай нацыянальнай палітыкі ў
Паўночна-Заходнім краі было б карысна параўнаць
захадамі ў прыбалтыйскіх правінцыях; прыбалтыйскія
і польскія эліты, з аднаго боку, і эстонскія або латвійскія
беларускія або літоўскія сяляне, з другога, адыгралі
падобныя ролі. Варта ўключыць і захады царскага ўрада
яўрэяў – і мы атрымаем агульную карціну «русіфікацыі»
Паўночна-Заходнім краі. Што тычыцца міжнароднай
перспектывы, Далбілаў разглядае магчымы ўплыў
палітыкі што да русінаў і палякаў на расійскую палітыку на
паўночным захадзе імперыі. На расійскую грамадскую думку і/
або чыноўнікаў маглі таксама уплываць праграмы асіміляцыі,
прынятыя ў Францыі, Германіі і Венгрыі. Такім чынам, многія
пытанні застаюцца адкрытымі, і трэба чакаць працяг дыскусіі
аб русіфікацыі.

[8] Heinz-Dietrich Löwe: Nationalismus und Nationalitätenpolitik als Integrationsstrategie im zarischen Rußland // Die Russen: Ihr Nationalbewusstsein in Geschichte und Gegenwart. – Köln: Markus, 1990. S. 55–79; David Saunders. Regional Diversity in the Later Russian Empire // Transactions of the Royal Historical Society, *Sixth Series, Volume 10*. Cambridge: Cambridge University Press, 2000. P. 143–163.

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/8

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

крытыка [image]2005

"да Зыкасту"

[image]

[image]

крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Аляксей Бацюкоў Паміж імпэрыяй і нацыяй

АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ выкладае філязофію ў магілёве.

Каваленя А., Лемяшонак У., Далгатовіч Б. і інш. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / Пад рэд. А. Кавалені, М. Сташкевіча. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2004. – 279 с.

ФАНТОМНЫ БОЛЬ

Браць у рукі гэтую кнігу пажадана не адну, а разам зь нейкай іншай, якая называлася б, напрыклад, «Другая сусьветная вайна без стэрэатыпаў і прыўкрас» або «Вялікая Айчынная вачыма палітыканаў усіх масьцей». Пры адсутнасьці падобнага твору айчыннай гістарыяграфіі сьвядомасьць чытача будзе шточасу пранізаная фантомнымі болямі – арыентаваныя на гарачую палеміку з ідэалягічнымі апанэнтамі, аўтары кнігі мала падбалі аб паказе пазыцыяў гэтых самых апанэнтаў на акупаванай імі кніжнай плошчы, і таму часам іхныя адказы «нячэсным» гісторыкам павісаюць у паветры. «На наш погляд, нельга канцэнтраваць увагу толькі на адмоўных момантах германска-савецкага дагавору», – адважна і без усялякіх уступаў заяўляюць аўтары «Вялікай Айчыннай» пра пакт Молатава–Рыбэнтропа. «А што, нехта так робіць?» – тут жа

зьдзіўляецца неабазнаны ў тонкасьцях айчыннай гістарыяграфіі чытач. Але пытаньню ягонаму наканавана застацца рытарычным, бо аўтары расказваюць пра пакт, не канцэнтруючы ўвагі на ягоных адмоўных момантах. Савецкі Саюз не рыхтаваў нападу на гітлераўскую Нямеччыну ў 1941 годзе – у некалькіх месцах катэгарычна заяўляюць яны, прычым настолькі настойліва і акцэнтавана, што ў прыдзірлівага чытача ўзьнікае натуральная прага не паверыць.

КАНЦЭПЦЫЯ

«Вучэбны дапаможнік напісаны з улікам найноўшых мэтадалягічных дасягненьняў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі», – трэба думаць, іранізуюць аўтары кнігі. Насамрэч, калі параўноўваць вучэбны дапаможнік з падобнымі выданьнямі савецкага часу, адразу кідаецца ў вочы істотнае адрозьненьне – у ім больш гнуткая сыстэма ацэнак у шэрагу праблемных тэмаў Другой сусьветнай. Паразы Чырвонай Арміі ў 1941-м цяпер не тлумачацца адной толькі вераломнасьцю гітлераўскай Германіі, а наадварот, сярод асноўных прычынаў трагедыі 1941 г. вылучаецца палітычная і стратэгічная нізкавокасьць вышэйшага ваеннага кіраўніцтва СССР, нізкі ўзровень тактычнай падрыхтоўкі каманднага складу Чырвонай Арміі, слабы ваенна-эканамічны патэнцыял СССР у параўнаньні зь Нямеччынай. Савецкія падручнікі і энцыкляпэдычныя даведнікі такое сабе маглі дазволіць хіба што ў самым фінале перабудовы. Можна нават гаварыць пра стратэгічныя памылкі ваеннага кіраўніцтва СССР, ужываючы крамольныя, як па савецкіх мерках, выразы кшталту: «эўфарыя ад зімовых (гаворка пра зіму 1942–1943 гг.) перамог перашкодзіла савецкаму камандаваньню своечасова адвесьці войскі на больш умацаваныя пазыцыі. Пасьля 23 лютага 1943 г. сытуацыя на фронце для Чырвонай Арміі хутка пагоршылася».

Больш таго, «здараліся выпадкі нядобрасумленных паводзін партызан… Так, у паведамленьні Магілёўскага падпольнага абкаму за май 1944 г. адзначаецца, што сярод каманднага і радавога складу мелі месца амаральныя ўчынкі, марадэрства, дэзэрцірства, парушэньне партызанскіх абавязкаў». Але «партыйныя камітэты, – тут жа заўважаюць аўтары працы, –

вялі жорсткую барацьбу з такімі зьявамі». А калі яшчэ ўлічыць, што «тайная палявая паліцыя сумесна з органамі германскай разьведкі засылала значную колькасьць сваіх агентаў у партызанскія атрады і падпольныя арганізацыі, якія ажыццяўлялі дывэрсіі і правакацыі, дыскрэдытуючы патрыятычны рух», робіцца зразумелаю спроба намякнуць, адкуль ногі растуць у пашыранай сям-там ацэнкі партызанаў як бандытаў.

Падобныя «вольнасьці» не выглядаюць, аднак, асаблівымі здабыткамі ці каштоўнасьцямі айчыннай гістарыяграфіі з той простай прычыны, што ўзросту ім гадоў пятнаццаць. Адразу за натуральнай сьмерцю савецкіх ідэалягемаў на пачатку 1990-х (а Вялікая Айчынная стаяла ў самым цэнтры савецкага патрыятычнага выхаваньня), у гістарыяграфіі ці ня кожнай постсавецкай дзяржавы адбыўся адыход ад клясычнай савецкай сыстэмы ацэнак рэаліяў Другой сусьветнай вайны. Прэзэнтаваная ў падручніку навізна падыходу – хутчэй, канстатацыя згоды з сусьветнай гістарыяграфіяй – і ня больш, бо значных адкрыцьцяў і сэнсацыяў у ім няма.

Наўрад ці добрасумленнасьць у выкладзе супярэчлівага й вострага дагэтуль матэрыялу Другой сусьветнай вайны была асноўнаю мэтай складальнікаў кнігі. Пра гэта сьведчыць ня толькі аднабаковасьць пры паданьні праблемаў, але й ігнараваньне пэўных тэмаў, непрыемных для прыхільнікаў традыцыйнай савецкай канцэпцыі Вялікай Айчыннай вайны.

1. Штрафнікі – барбарская і нечалавечая форма ваеннай тактыкі, своеасаблівыя «прымусовыя бэрсэркеры» XX ст. 2. Цынічнае стаўленьне вышэйшага ваеннага кіраўніцтва Чырвонай Арміі да савецкіх ваеннапалонных як да здраднікаў. Зьвязанае з гэтым поўнае іх ігнараваньне пры дыпляматычных узаемадачыненьнях, што прывяло да таго, што сотні тысяч савецкіх салдатаў пакідаліся на сьмерць, тады як іншыя краіны-саюзьніцы, больш клапатлівыя што да сваіх грамадзянаў, сачылі за выкананьнем прынятых яшчэ ў 1929 г. правілаў утрыманьня ваеннапалонных. На жаль, міжнароднае гуманітарнае права (т. зв. «права вайны») тады дзейнічала па прынцыпе «ты мне – я табе», у выніку чаго правілы ўтрыманьня

ваеннапалонных мелі моц толькі пры двухбаковым іх выкананьні. 3. Татальная падазронасьць і 45-гадовы недавер да іншых соцень тысяч прымусова вывезеных на працы ў Нямеччыну савецкіх грамадзянаў, у выніку якога былыя выгнанцы на Захад, старэйшыя за 5 гадоў, гублялі права на вышэйшую адукацыю і займаньне кіраўнічых пасадаў у савецкай дзяржаве. Ня кажучы ўжо пра кампэнсацыі ці льготы, як гэта практыкавалася краінамі Заходняй Эўропы ў дачыненьні да сваіх грамадзянаў, што прымусова працавалі на немцаў. 4. Зрэшты, чаго вартае адно толькі замоўчваньне Катыні. Усе гэтыя і падобныя тэмы, што маглі б больш шматгранна і праўдзіва раскрыць сутнасьць вайны, у дасьледаванай кнізе застаюцца па-за ўвагай.

Вялікая Айчынная вайна савецкага народу лічыцца падзеленай на вайну абарончую (22.06.1941 – красавік 1944 г.) і вайну ў нападзе (красавік 1944 – 09.05.1945 г.), калі Чырвоная Армія перайшла мяжу СССР і пачала «вызваленчы паход па Эўропе». У савецкай гістарыяграфіі апошні этап падаваўся ўзьнёсла-беспраблемна. Прагная помсты, Чырвоная Армія ганяла гітлераўцаў з прыблізнай хуткасьцю 15 км за гадзіну і неўзабаве павесіла чырвоны сьцяг над райхстагам. Але ж гераічны эпас гэтага паходу мае і трагічныя шматкроп'і. Напярэдадні вызваленьня Польшчы Чырвонай Арміяй у Варшаве ўзьнялося паўстаньне, кіраванае эмігранцкім (дысьлякаваным у Лёндане) урадам Польшчы. Яно пачалося 1 жніўня 1944 г. і доўжылася 63 дні. Савецкія войскі выйшлі да Віслы, на якой стаіць Варшава, ужо амаль празь месяц, 28 жніўня. І спыніліся. Толькі 17 студзеня 1945 г. яны вызвалілі Варшаву – натуральна, ужо ператвораную ў руіны і чырвоную ад патопленага немцамі ў крыві паўстаньня. У гістарычнай навуцы на сёньняшні дзень няма бессумнеўных доказаў, што задоўгае стаяньне Чырвонай Арміі на Вісьле было спрычыненае чаканьнем вышэйшага ваеннага кіраўніцтва СССР, пакуль немцы даб'юць у Варшаве апошніх паўстанцаў. Але праблематызаваць гэтую тэму пры дасьледаваньні паходу Чырвонай Арміі па Цэнтральнай і Заходняй Эўропе лічыцца «прыкметай бантону», згодаю гісторыка зь неперадузятай ацэнкай дзеяньняў вышэйшага ваенна-*палітычнага* кіраўніцтва СССР.

«Ідучы па краінах Цэнтральнай і Заходняй Эўропы, Чырвоная Армія несла гвалт і марадэрства народам гэтага рэгіёну, незалежна ад таго, якую пазыцыю ў вайне займалі ўрады іхных краінаў». У свой час мяне шакавала гэтая фраза, як бы між іншым прамоўленая на тэлеканале «Discovery» ў адной гістарычнай праграме.

«Мы ўсе, нашы дзяўчаты з такім хваляваньнем чакалі прыходу Чырвонай Арміі. Нашы, нашы ідуць! – так расказвала аднойчы аўтару гэтых радкоў былая вязень нямецкага працоўнага канцлягеру ў Матгаўзэне Ірына Т. – А яны прыйшлі і згвалцілі ўсіх нашых дзяўчат», – крыху нават надцятым голасам скончыла яна. І тут жа пачала расказваць прыватную гісторыю, што нейкі камандзір пакахаў адну дзяўчыну з гэтага лягеру і пакараў-такі трыбуналам траіх салдат, што яе гвалцілі. Толькі траіх.

Як ішло вызваленьне Эўропы ад фашызму, пра гэта «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу» маўчыць, даючы чытачу інфармацыю, толькі *што* было вызвалена, і *калі*.

«Чырвоная Армія выканала сваю вызваленчую місію, вярнуўшы свабоду 11 краінам Цэнтральнай і Паўднёва-Ўсходняй Эўропы з насельніцтвам у 113 млн чалавек» – гэты радок, разьмешчаны акурат пад чульлівым фатаздымкам, дзе савецкая мэдсястрычка дапамагае нямецкаму дзядочку, завяршае параграф «Вызваленчы паход у Эўропу». Іншых высноваў не прапанавана.

КАЛЯБАРАЦЫЯНІЗМ

Зь лёгкім недаверам адкрываў я гэтую частку кнігі, прысьвечаную арганізацыям, створаным пад крылом фашыстаў у акупаванай Беларусі. Я, натуральна, не чакаў патрыятычна-рамантычных ацэнак беларускіх калябарантаў. Але справядлівасьці дзеля трэба адзначыць, што ў параграфе «Калябарацыянізм» слова «здраднікі» не сустрэлася ні разу. Характарыстыка ім даецца даволі нэўтральная: арганізацыі, створаныя са згоды нямецкага камандаваньня дзеля

заахвочваньня ляяльна настроеных жыхароў да супрацы з фашысцкім рэжымам ува ўмовах няўдач вэрмахту на савецка-нямецкім фронце і актывізацыі барацьбы падпольшчыкаў і партызанаў у тыле акупантаў. Паўнамоцтвы іх абмяжоўваліся культурніцкай і адукацыйнай дзейнасьцю, вялікага ўплыву ды папулярнасьці ня мелі. Эксплюатацыі адзначанай тэмы па звыклай для айчыннай гістарыяграфіі схеме «нацыяналісты й незалежнікі = здраднікі й прыхвасьні» аўтары дапаможніка стаічна пазьбягаюць. Для параўнаньня, калі аўтары разгляданага выданьня Беларускую краёвую абарону, паўсталую ў 1944-м, вызначаюць як спробу Беларускай Цэнтральнай Рады стварыць нацыянальнае войска, то энцыкляпэдыя «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945», 1990 г. выданьня, адназначна трактуе БКА як нацыяналістычна-фашысцкае вайсковае фармаваньне, створанае пераважна са «здраднікаў і крымінальных элемэнтаў».

ФУНКЦЫЯ

Выхад гэтай кніжкі, прызначанай для мэтадычнага забесьпячэньня аднайменнай навучальнай дысцыпліны – цудоўны прыклад таго стану, у якім знаходзіцца і будзе знаходзіцца надалей вышэйшая ды любая іншая школа ў Беларусі. Універсытэт – не самакаштоўны сацыяльны арганізм, незалежны ад дзяржавы і неабходны ёй і грамадзтву як вольная ўстанова з высокім узроўнем самаарганізацыі і самадысцыпліны. Універсытэт – гэта адзін з процьмы інструмэнтаў узьдзеяньня дзяржавы на сьвядомасьць масаў, у выніку чаго спэцыфічная яго функцыя цяпер – ува ўмовах жорсткай канкурэнцыі таталітарных і дэмакратычных каштоўнасьцяў – прапагандаваць таталітарныя каштоўнасьці ў самым праблемным і збольшага дэмакратычным паводле прыхільнасьцяў асяродзьдзі грамадзтва – у асяродзьдзі моладзі. З гэтай мэтай у 2003–2004 навучальным годзе вышэйшая школа прыняла на сябе павышаныя абавязкі і, ахвяруючы такімі прадметамі, як культуралёгія, рэлігіязнаўства, правы чалавека, лёгіка ці інш. (у залежнасьці ад канкрэтнай ВНУ), увяла прадмет «Асновы ідэалёгіі беларускай дзяржавы». З

нагоды 60-годзьдзя вызваленьня Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 2004–2005 навучальным годзе ўсё тым жа чыноўніцкім рашэньнем у навучальныя пляны вышэйшай школы быў уведзены курс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу». Матэрыял, які навучэнцы й без таго праходзяць у курсе гісторыі Беларусі і ў школе і ў ВНУ, цяпер раздроблены на некалькі тэмаў і займае да 30 навучальных гадзінаў. Такім чынам, за мінулыя два гады Міністэрства адукацыі распрацавала канкрэтную схему занясеньня ў свой рахунак гіганцкай «галачкі» насупраць радка «патрыятычнае выхаваньне і выкананьне іншых даручэньняў прэзыдэнта». А калі схема распрацаваная, ды яшчэ ў настолькі выгадным сьвятле выстаўляе Міністэрства адукацыі, студэнтам ужо можна чакаць новых навучальных дысцыплінаў кшталту «Філязофскія і сьветапоглядныя асновы дысцыпліны і парадку (у кантэксьце дырэктывы № 1)» ці «Беларуская мадэль эканомікі і сыстэмы кіраваньня (паводле матэрыялаў газэты «Советская Белоруссия»)».

Калі «Асновы ідэалёгіі» ўяўляюць сабой збор-мяшанку вытрымак з паліталёгіі, сацыялёгіі, гісторыі Беларусі, Канстытуцыі і выступаў А. Лукашэнкі, дык «Вайна» – куды больш цэласная дысцыпліна, паяднаная адзіным сюжэтным і канцэптуальным стрыжнем. «Вайна», з аднога боку, дае выкладчыку магчымасьць праявіць уласнае бачаньне Другой сусьветнай, з другога – расквеціць сухі навучальны працэс гіганцкім аб'ёмам жывога матэрыялу. Ува ўмелых руках абодва курсы могуць быць накіраваныя на карысьць як прыхільнікаў, гэтак і праціўнікаў сёньняшняга палітычнага рэжыму. Але студэнцтва абодва курсы – як прадукт відавочна штучны, дарэшты палітызаваны і спушчаны зьверху – успрымае аднолькава варожа.

КЛОН

Выдавецкім цэнтрам БДУ таксама адначасова была выпушчана аднайменная кніга ўжо ў якасьці вучэбнага дапаможніка для факультатыву па Вялікай Айчыннай вайне ў 11 клясе агульнаадукацыйных школаў. Аўтарскі калектыў тут той самы,

за выключэньнем аднаго чалавека, аднак зьмест кнігі моцна адрозьніваецца. Ужо з пачатковых фатаздымкаў юнага чытача вітае ўсьмешка вусатага пяцідзесяцігадовага мужчыны ў форме Вярхоўнага Галоўнаначальніка, які паціскае рукі выстраеным у сьценачку і апранутым у аднолькавыя шэрыя строі вэтэранам. Аднолькавыя строі, аднолькавы паварот твараў у бок Галоўнаначальніка, аднолькавыя шэрыя з адлівам кепі – вэтэраны выглядаюць, хутчэй, фонам для пяцідзесяцігадовага мужчыны, чым галоўнымі героямі кнігі (як бы доказам слушнасьці знакамітых словаў пра тое, як «мы гнілі ў акопах»).

У сваім прывітальным слове, якое, натуральна, адкрывае ўсю кнігу, А. Лукашэнка робіць рашучы прарыў у гістарычнай навуцы, заўважаючы, што «менавіта на землях Беларусі, Расеі і Ўкраіны была спынена нястрымная раней машына вэрмахту». Нюанс – Беларусь немцы прайшлі менш чым за тры месяцы. Але юны чытач даведаецца пра гэта толькі на старонцы 70.

Сам школьны дапаможнік пабудаваны паводле адной схемы з ВНУшным, аднак усе тэмы даюцца ў скарочаным выглядзе (на «Прычыны і характар Другой сусветнай вайны», напрыклад, хапіла два абзацы, на «Нюрнбэрскі працэс» – аднаго). Таксама тут нашмат болей мапаў, фатаздымкаў, ілюстрацыяў, гістарычных партрэтаў, чым у асноўным выданьні.

АСНОЎНЫ НЕДАХОП

Асноўны недахоп, калі нават зьмірыцца з тэндэнцыйнасьцю ўсяго аповеду – у кніжцы няма *жывой* вайны, трагічнай, супярэчлівай, *народнай* – такой, якою яна была для дзясяткаў мільёнаў звычайных людзей. У тэксьце практычна не сустракаецца мэмуарны матэрыял, адсутнічае мастацкае апісаньне падзеяў вайны. Так, пра гады ленінградзкай блякады аўтары пакідаюць толькі кароткую рэмарку невядомага паходжаньня. Пры гэтым гіганцкі матэрыял успамінаў саміх «блякаднікаў» – па-за кадрам.

Ніводнага ўспаміну людзей, што перажылі вайну, пра спаленыя вёскі Беларусі, ніводнага канкрэтнага аповеду пра какрэтныя

подзьвігі герояў вайны. Чытач, трэба думаць, наагул не меркаваўся аўтарамі дапаможніка як асоба з элемэнтарнымі псыхічнымі пачуцьцямі ды перажываньнямі – тэкставы матэрыял спрэс сумесь з радкоў дакумэнтаў, лічбаў ды навуковых выкладак. Для жывога аповеду ад імя сьведкаў вайны ў навучальным дапаможніку як школьнага, так і ВНУшнага ўзору, папросту няма ніякага фармату.

МОВА

Нармальная беларуская мова асноўнага тэкставага матэрыялу (з прыемнымі моўнымі сьмеласьцямі кшталту «найноўшая» і «акупаваны» замест «акупіраваны») у канцы кожнага параграфа перапыняецца выключна расейскамоўнымі радкамі гістарычных дакумэнтаў нават у выданьні, прызначаным для школаў зь беларускай мовай навучаньня. Такі моўны выбар застаецца цалкам неспасьцігальным, бо па-расейску ў дапаможніку гавораць Гітлер, Гімлер, Розэнбэрг, Борман, Чэрчыль, Рузвэльт і інш., але пры гэтым тэкст прысягі беларускага партызана ці зварот гаўляйтэра В. Кубэ даюцца па-беларуску.

АФАРМЛЕНЬНЕ

З гэтай часткі рэцэнзію можна было б пачынаць, як з самай моцнай, але ня грэх ёю і скончыць. Насамрэч кніга ілюстраваная багата і густоўна – ніводнай старонкі бязь якаснага малюнка ці фота. У дапаможніку для 11-клясьнікаў апроч фатаздымкаў усюды мапы ці міні-мапы, прыклады абмундзіраваньня ды ўзбраеньня войскаў, партрэты военачальнікаў зь іхнымі біяграфіямі. Так што адна з істотных высноваў адносна характару кнігі – яна ня так дзеля чытаньня, як дзеля павярхоўнага азнаямленьня ці дзеля дэманстрацыі ў аўдыторыі. Найбольш прыдатная слабаўважлівым студэнтам, схільным арыентавацца на яркія карцінкі, і навучэнцам-візуалістам. Другая выснова – дапаможнік мусіць добра выконваць усе вызначаныя яму функцыі з прычыны відавочнага абстрагаваньня ад вострай гістарычнай праблематыкі на тэму

Другой сусьветнай вайны. Выснова нумар тры – айчынная афіцыйная гістарыяграфія каторы раз зафіксавалася на ўзроўні *паміж* – паміж савецкай і сучаснай заходняй, імпэрскай і нацыянальнай.
[image]
[image]

№ 2 (36) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

[image]

крытыка [image]2005

"да Зыкасту"

паэмыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Юры Чавусаў Вайна для народу

ЮРЫ ЧАВУСАЎ

палітоляг, скончыў беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт. сябар рэдакцыйнай рады часопісу «Палітычная сфера».

Каваленя А., Лемяшонак У., Далгатовіч Б. і інш. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / Пад рэд. А. Кавалені, М. Сташкевіча. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2004. – 279 с.

ВЫКЛАДАНЬНЕ І НАВУКОВАЯ ВЕДА

Падручнікі ня ёсьць сродкам прадукаваньня новай навуковай веды. Праз пасярэдніцтва падручнікаў адбываецца рэтрансьляцыя і распаўсюджаньне ў грамадзтве веды, санкцыянаванай сыстэмай адукацыі як афіцыйна навуковай. Гэтая тэза ў той альбо іншай ступені справядлівая для ўсіх сыстэмаў адукацыі і для розных грамадзкіх фармацыяў. Навучальныя дысцыпліны суадносяцца з адпаведнымі галінамі навукі даволі гнутка, часам навука выконвае адну гнасэалягічную функцыю, а адпаведны навучальны прадмет служыць зусім іншым мэтам. Гэта датычыцца і выкладаньня новых навуковых канцэпцыяў. Агучваньне ў навучальных аўдыторыях тэорыяў Дарвіна, фрайдызму, гісторыі савецкай камуністычнай партыі альбо сталінскіх рэпрэсіяў – усё гэта было актамі фармаваньня грамадзкай сьвядомасьці, шырэйшымі за папярэднюю зьмену навуковых парадыгмаў.

Патрапіўшы ў навучальныя дапаможнікі, факт альбо ягоная інтэрпрэтацыя пераўтвараюцца з навуковай веды ў веду будзённую, санкцыянаваную, агульнапрынятую ў якасьці ісьціны. Дзякуючы гэтай сваёй уласьцівасьці падручнікі, якія, здаецца, павінны быць кодэксамі наяўнай навуковай веды і дапаможнікамі ў тым, як гэтую веду назапашваць і пашыраць (вырабляць наноў), часам служаць мэтадам індактрынацыі ў пануючую схему сьветапогляду. Зьмест падручніка з гуманітарнай дысцыпліны як сродку ідэалягічнай сацыялізацыі асобы навучэнца ў грамадзтве часам пераважае над ягонай асьветніцкай функцыяй.

Гэткая тэза датычыцца, перш за ўсё, падручнікаў для агульнаадукацыйных, сярэдніх школаў. Вучань, ня схільны да дадзенай галіны ведаў, засвоіць зьмест падручніка як кампэндыюм таго, што назапасілі навукоўцы да яго, і вынесе неабходны для паўсядзённага жыцьця мінімум ведаў. Умоўна кажучы, ён будзе ведаць, які горад ёсьць сталіцай Францыі і ў межах якой навуковай дысцыпліны можна даведацца пра асаблівасьці геаграфічнага разьмяшчэньня гэтага месца. Вучань, ахоплены сымпатыяй да гэтай дысцыпліны, зацікавіцца выкладзеным матэрыялам і будзе пашыраць свае веды ў гэтай галіне. Зь цягам часу цікаўнасьць да геаграфічных ведаў можа пацягнуць заінтрыгаванага нэафіта да больш спэцыяльнага вывучэньня прадмету, а разам з захапленьнем вандроўкамі і турыстычнымі экспэдыцыямі гэта можа давесьці ажно да асьпірантуры геаграфічнага факультэту і далейшага прасоўваньня па сыстэме афіцыйнай навукі. Трэці ж вучань, натхнёны крытычным стаўленьнем да асобных навуковых канцэпцыяў, пачне аспрэчваць некаторыя зь іх і зробіцца сапраўдным навукоўцам, які будзе ня проста засвойваць старыя веды і займацца іх кадыфікацыяй, а прадукаваць новыя. У межах абранай намі «геаграфічнай» аналёгіі такому чалавеку амаль наканавана займацца памежнымі абсягамі гэтай навукі кшталту геапалітыкі альбо геаэканомікі, дзе і прадукуюцца новыя тэорыі. Такім чынам адбываецца сумяшчэньне ў навучальнай дысцыпліне выкананьня задачаў сацыялізацыі, задачаў разьвіцьця нармальнай навукі і задачаў яе крытычнага пераасэнсаваньня, то бок забесьпячэньня магчымасьці пераходу навукі ў стадыю рэвалюцыйнай, «ненармальнай» навукі. І

менавіта ў першым функцыянальным складніку выкладаньня хаваецца ядро ідэалягічнай індактрынацыі асобы ў межах працэсу яе агульнай сацыялізацыі.

Гэткая мадэль справядлівая для падручнікаў агульнаадукацыйных школаў, і ў меншай ступені датычыцца падручнікаў для вышэйшай школы. Усё ж такі вышэйшая школа рыхтуе прафэсіяналаў з ужо вызначанай роляй у сыстэме грамадзкіх зносінаў – напрыклад, у падручніках для тэхнічных і прыродазнаўчых спэцыяльнасьцяў элемэнт сацыялізацыі (і, адпаведна, ідэалягічнай індактрынацыі) робіцца мінімальным. Аднак зусім асаблівую ролю выконваюць тыя з падручнікаў для ВНУ, што прызначаныя для вывучэньня грамадазнаўчых, гуманітарных дысцыплінаў тымі студэнтамі, асноўная ўвага якіх, з улікам абранай спэцыялізацыі, скіраваная на вывучэньне іншых галінаў ведаў. Тут навучальны курс і адпаведны падручнік амаль цалкам выконвае пазначаную першай функцыю сацыялізацыі індывіда, інтэграцыі яго ў агульнапрынятае поле інтэрпрэтацыяў фактаў чалавечага жыцьця. Задача такога курсу не ў выхаваньні чалавека, здольнага да больш глыбокага разьвіцьця дадзенай галіны ведаў альбо тым больш для ягонага рэвалюцыйнага пераасэнсаваньня, а ў фармаваньні адпаведнасьці паміж афіцыйнымі трактоўкамі сацыяльна-гуманітарных зьяваў і індывідуальнымі стаўленьнямі да іх з боку студэнтаў, якія ў будучыні стануць прафэсіяналамі ў розных галінах чалавечай дзейнасьці. Падобнае становішча распаўсюджанае і ў больш лібэральных за беларускую сыстэмах адукацыі. Аднак у Беларусі, у выніку схільнасьці сыстэмы адукацыі да фармаваньня асобы, здольнай жыць у аўтарытарным грамадзтве, роля гэткіх курсаў робіцца асабліва важнай. Між іншым, гэтым тлумачацца тыя кпіны, якія адэпты распаўсюджанай у нас татальнай савецкай сыстэмы выкладаньня часам адрасуюць заходняй сыстэме выкладаньня. Апошняя, не абцяжараная патрабаваньнем татальнай ідэалягічнай сацыялізацыі суб'екта ўва ўсе магчымыя жыцьцёвыя сытуацыі (каб пасьля нават падзеі прыватнага жыцьця інтэрпрэтаваліся ў правільным ідэалягічным духу), дазваляе пакінуць без увагі «непатрэбныя» будучаму спэцыялісту веды. Магчыма, у такой схеме навучэнцу сапраўды

не стае пэўных ведаў – напрыклад, здольнасьці паказаць на мапе сьвету Маскву альбо веданьня афіцыйнай біяграфіі дзейнага правадыра. Аднак, па-першае, ува ўмовах постіндустрыяльнага грамадзтва каштоўная не сама веда, а здольнасьць да яе здабыцьця і да прадукаваньня новай веды і здабыцьця новага навыку. Па-другое, у плюралістычным сьвеце і веда мае адносны характар – і такое яе разуменьне вельмі каштоўнае.

Паказальна, што факультатывы і не зьвязаныя зь непасрэднай спэцыялізацыяй студэнтаў курсы, такія як «Асновы ідэалёгіі беларускай дзяржавы» і «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу», прысьвечаныя грамадазнаўчай праблематыцы, сваёй значнасьцю ня маюць аналягаў сярод прыродазнаўчых навук. Курсы кшталту «Асноваў інфарматыкі» альбо «Асноваў экалёгіі», калі і прысутнічаюць у навучальных праграмах сацыяльна-гуманітарных аддзяленьняў у Беларусі, то адыгрываюць там другарадную ролю, іх увядзеньне не санкцыянуецца кіраўніком дзяржавы і не суправаджаецца пампэзнымі публікацыямі, а іх чытаньне зьяўляецца выключнай фармальнасьцю – ні пра якія грунтоўныя навучальныя матэрыялы альбо распрацоўку складаных навучальных праграмаў гаворкі тут не ідзе. Мінімум афіцыйных прыродазнаўчых і дакладных ведаў, як лічыцца, даецца моладзі яшчэ ў сярэдняй школе, а вось жа працэс сацыяльна-ідэалягічнай індактрынацыі і фармаваньня сацыяльна-канформнай асобы трэба працягваць і надалей, і нават больш актыўна. Асаблівую ролю ў гэтым працэсе другаснай ідэалягічнай сацыялізацыі індывіда выконваюць падручнікі з гуманітарных дысцыплінаў для студэнтаў вышэйшых навучальных установаў. Падручнік з гісторыі Вялікай Айчыннай вайны стаіць менавіта ў гэтым шэрагу сродкаў ідэалягічнай індактрынацыі.

ВЫКЛАДАНЬНЕ І ІДЭАЛЯГІЧНАЯ ГІСТАРЫЧНАЯ ВЕДА

Мы бачым ролю гэткіх навучальных прадметаў і падручнікаў як не зьвязаную з атрыманьнем студэнтамі прафэсійных ведаў, а разглядаем іх як частку ідэалягічнай працы ў дзяржаве. Гэты сэгмэнт ідэалягічнай працы тым больш важны, што скіраваны

на праблемную ў сэнсе палітычнай ляяльнасьці існуючаму ў Беларусі рэжыму сацыяльную групу – студэнцкую моладзь. Фармаваньне сьветапогляду і сьвядомасьці гэтай групы ў патрэбным кірунку, выхаваньне ляяльных прафэсіяналаў – адна з прынцыповых задачаў беларускай сыстэмы вышэйшай адукацыі. Курс «Асновы ідэалёгіі беларускай дзяржавы» ў дадзенай працы ёсьць, безумоўна, першасным элемэнтам, аднак тут прысутнічаюць і іншыя мэханізмы ідэалягічнай індактрынацыі. Адным з такіх больш вытанчаных мэханізмаў ёсьць курс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу ў кантэксьце Другой сусьветнай вайны». Калі першы курс выконвае тую ж функцыю, што і курс навуковага камунізму ў савецкай вышэйшай школе, то гісторыя Вялікай Айчыннай грае ролю гісторыі КПСС – дапаможнага, але ня менш важнага ў ідэалягічным сэнсе інструмэнту. Гэты прадмет, у адрозьненьне ад асноваў ідэалёгіі, абапіраецца на рэальны падмурак гістарычных фактаў. Ён можа быць важным, эфэктыўным і больш «прыстойным» элемэнтам ідэалягічнай працы, паколькі, з аднаго боку, абапіраецца на гістарычныя «факты» (якія ў выніку спэцыфікі гістарычнай навукі часьцяком насамрэч ёсьць інтэрпрэтацыяй фактаў, пра што ніжэй), а зь іншага боку, у сілу самога прадмету і наяўных у грамадзтве канатацыяў паняцьця «Вялікая Айчынная вайна», набывае характар трансьляцыі сакральнай веды.

Гістарычныя факты, розныя зьявы айчыннай гісторыі самі сабой непазьбежна цягнуць двухсэнсоўныя тлумачэньні і двухсэнсоўныя ацэнкі выкладзенага матэрыялу: адносна вольнае пашырэньне альтэрнатыўных трактовак гістарычных падзеяў зьяўляецца навакольным асяродзьдзем для гэтага працэсу ідэалягічнай індактрынацыі. Праблема плюралістычнасьці сыстэмаў інтэрпрэтацыі ў гістарычнай навуцы дэталёва дасьледаваная Рэймонам Аронам, у прыватнасьці, ува «Ўводзінах у філязофію гісторыі». На яго думку, у якасьці мэтадалягічных асноваў гістарычнай навукі непазьбежна выступаюць філязофскія ідэі, якія маюць характар ідэалягічных канструктаў. Адсюль – немагчымасьць дасягненьня «аб'ектыўнай» гістарычнай веды, якая б мела характар ісьціны для ўсіх ідэйных сыстэмаў інтэрпрэтацыі. У гэтым сэнсе мы павінны казаць не пра гісторыю, а пра

«гісторыі» – дысцыпліны, якія ў розных ідэалягічна-філязофскіх схемах маюць характар розных навук ужо ў сваіх мэтадалягічных асновах. Абагульняць розныя ідэалягічныя інтэрпрэтацыі пад шыльдай адзінай «гістарычнай навукі» было б несправядліва, паколькі яны часьцяком нават ня маюць адзінага прадмету дасьледаваньня. Падаецца парадаксальным, але найбольш «аб'ектыўнай» сфэрай у гістарычнай навуцы (але ж таксама абмежавана!) можа быць хіба толькі… гісторыя філязофіі, паколькі яна мае справу не з гісторыяй фактаў, а з гісторыяй інтэрпрэтацыяў ідэяў.

Шмат хто з выкладчыкаў дзяржаўнай ідэалёгіі знайшлі цяпер сабе прыстасаваньне менавіта ў гістарычным падыходзе да ідэалягічных працэсаў: адлюстроўваючы плюралізм поглядаў на разьвіцьцё грамадзтва ў гістарычным кантэксьце, яны спрабуюць унесьці ў таталітарны ў сваёй сутнасьці навучальны прадмет элемэнт навуковасьці і аб'ектыўнасьці. Так у савецкі час пад шыльдай крытыкі буржуазных ідэалёгіяў ці гісторыі палітычных і праўных вучэньняў можна было ня толькі данесьці да чытача зьмест альтэрнатыўных поглядаў на грамадзтва, але нават дасьледаваць сацыяльныя зьявы, выкарыстоўваючы недазволеныя мэтадалёгіі.

Пытаньне аб'ектыўнасьці гістарычнай веды ў межах ідэалягічнага дыскурсу ня ёсьць праблемным, паколькі ідэалягічная веда адназначна сьцьвярджае аб'ектыўнасьць гістарычных фактаў: маўляў, падзеі мінуўшчыны ёсьць навуковымі фактамі, якія існуюць незалежна ад пазыцыі назіральніка; адпаведна, розьніца ў гістарычных тэорыях і ў ацэнцы гістарычных падзеяў можа вынікаць альбо зь няведаньня аб'ектыўных гістарычных фактаў, альбо зь іх «няправільнай» інтэрпрэтацыі навукоўцам, які не валодае належным мэтадам дасьледаваньня праз сваю няправільную філязофска-мэтадалягічную (то бок ідэалягічную) пазыцыю. Аснова такой канцэпцыі – прынцып наяўнасьці аб'ектыўнай і пазнавальнай гістарычнай ісьціны. У межах жа навуковай веды пра гісторыю аб'ектыўнасьць гістарычных фактаў робіцца пытаньнем дыскусійным, а існаваньне ідэалягічнага акцэнту ў гістарычных дасьледаваньнях ня толькі не хаваецца, але і выкарыстоўваецца дзеля больш поўнага і рознабаковага

пазнаньня сутнасьці гісторыі: напрыклад, асобнае вывучэньне фундамэнтальных працаў Лідэла Гарта ці мэмуараў Уінстана Чэрчыля (заходні канон інтэрпрэтацыі Другой сусьветнай вайны), таксама як асобны разгляд савецкага дванаццацітомніка «Гісторыі Другой сусьветнай вайны» (усходні канон) ня будуць такімі прадуктыўнымі, як вывучэньне абодвух гэтых канонаў з далучэньнем да іх яшчэ й інтэрпрэтацыі пераможаных.

Любая гістарычная веда ёсьць ведай ідэалягічнай. Сьцьвярджэньне аб'ектыўнасьці і неідэалягізаванасьці пэўнай гістарычнай тэорыі – шлях да пабудовы таталітарнай ідэалёгіі на глебе гістарызму. Толькі плюралізм ідэалягізаваных гістарычных тэорыяў, іх барацьба і канкурэнцыя можа прывесьці да фармуляваньня цэльнай гістарычнай карціны, якая, ня будучы аб'ектыўнай, будзе, тым ня менш, як веда адпавядаць існай стадыі разьвіцьця філязофска-мэтадалягічных падмуркаў навукі.

Для ацэнкі вартасьці гістарычнага дасьледаваньня можна ўжыць канцэпцыю Макса Вэбэра: факты гістарычнага парадку ня ёсьць аб'ектыўнымі, гэта праяўляецца ўжо нават у тым, што гісторык вольны выбіраць паміж імі – суб'ектыўны працэс адбору гістарычных фактаў падчас дасьледаваньня адбываецца пад уплывам ідэалягічных схемаў; але аб'ектыўнай ёсьць лёгіка навуковага дасьледаваньня і мэтадалёгія навукі, паколькі пасьля адбору фактаў сувязі паміж імі мусяць мець аб'ектыўны характар, падпарадкоўвацца прычынна-выніковым законам і законам аб'ектыўнай лёгікі. Адрозьненьні ў інтэрпрэтацыі гістарычных падзеяў здараюцца зусім не празь іх розныя ацэнкі, а праз адрозны падбор фактаў. Таму так званая «навуковая і аб'ектыўная» гісторыя насамрэч знаходзіцца ў ідэалягічным полі інтэрпрэтацыяў рэчаіснасьці, а гэта значыць, часта знаходзіцца па-за межамі навуковага дасьледаваньня. Спроба пакласьці ідэалёгію ў падмурак навуковага дасьледаваньня можа быць у пэўнай ступені эфэктыўная толькі як мэтад палітычнай барацьбы і як мэтад назапашваньня веды, а не крытычнага разгляду рэчаіснасьці.

Татальна ідэалягізаваная навукова-гістарычная тэорыя заўжды

знаходзіцца ў небясьпецы стаць ахвярай зьмены навуковых парадыгмаў, якая паставіць пад сумнеў наяўную схему інтэрпрэтаваньня гістарычных падзеяў. З гэтага вынікае імкненьне такой тэорыі да прадухіленьня небясьпекі з боку «непажаданых» фактаў: не ігнараваць наяўныя ерэтычныя інтэрпрэтацыі, а арганічна засвоіць іх, пераінтэрпрэтаваць на ўласны капыл, альбо, прынамсі, раскрытыкаваць як не адпаведныя рэчаіснасьці (замоўчваць не адпаведны ідэалягізаванай тэорыі факт азначае пакінуць магчымасьць для альтэрнатыўнай інтэрпрэтацыі). Таму падручнік «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу ў кантэксьце Другой сусьветнай вайны» ўтрымлівае шмат адрозьненьняў ад «клясычнага савецкага» канону і ня можа ня быць крыніцай для альтэрнатыўных тлумачэньняў і спрэчак. Працэс выкладаньня гэтага прадмету абяцае быць надзвычай цікавым, паколькі будзе суправаджацца барацьбой альтэрнатыўных навукова-ідэалягічных падыходаў за статус «навуковай» (значыць, агульнапрынятай) тэорыі.

Далей мы засяродзімся толькі на адной з магчымых інтэрпрэтацыяў гэтага падручніка і зьвязанай зь ім веды. Мы разгледзім дадзены падручнік па-за межамі навукова-гістарычнай ацэнкі, сканцэнтраваўшыся на той палітычнай і палітычна-міталягічнай ролі, якую выконвае выкладзены ў ім матэрыял. Само ўвядзеньне асобнага прадмету «Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны» можна лічыць часткай таго самага працэсу адбору фактаў – мінуўшчына ведае войны, якія нанесьлі Беларусі такія ж значныя страты, але ў існуючай ідэалягічнай схеме менавіта апошняя вайна выглядае як самы значны фактар у нашай гісторыі, як падзея нумар адзін.

МІТ ВАЙНЫ Ў СХЕМЕ ІДЭАЛЯГІЧНАЙ ПРАЦЫ

Увядзеньне ў сыстэму адукацыі новых «ідэалягічных» прадметаў суправаджаецца скасаваньнем прадметаў, што ня маюць імгненнага практычнага эфэкту. Сама сыстэма адукацыі арыентаваная на выраб спэцыялістаў з гарантаванай «маральнай устойлівасьцю» (засвоеным наборам ідэалягічных штампаў і мітаў, здольных даць адказ на магчымыя пытаньні і

праблемы, што паўстануць перад імі ў іх прафэсійным і асабістым жыцьці альбо ў жыцьці ўсёй краіны). Гэтая сыстэма мае неабходнасьць у стварэньні і пашырэньні штучных ідэалягічных канструктаў унівэрсальнага характару (мітаў). Ідэалягема барацьбы і вайны ў дадзеным кантэксьце ёсьць найважнейшай.

У нашай ідэалягічнай працы мы маем справу з такой гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны, якая робіцца цалкам прыдатнай для выкарыстаньня ў якасьці матэрыялу для мітатворчасьці. Падручнік наконт яе быў выдадзены ў двух варыянтах: палегчаны, больш кароткі варыянт для сярэдніх школаў (232 старонкі) і таўсьцейшы (279 старонак), але такі самы каляровы, прыгожы і цікавы для чытаньня – для ўнівэрсытэтаў. Абодва падручнікі выпушчаныя на беларускай і расейскай мовах. Адначасова не былі забытыя і дзеткі, што ў 2004 г. пайшлі ў першую клясу: малым быў падораны (казалі – «падарунак ад прэзыдэнта») падручнік зь іншага прадмету – «Беларусь – наша радзіма».

Мэтадычныя парады для вывучэньня ў школах і сярэдніх навучальных установах факультатыву «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу» былі распрацаваныя адным з аўтараў падручніка Аляксандрам Каваленем, было знойдзена месца ў навучальнай праграме (пяты курс ВНУ, першы сэмэстар, альбо 11-я кляса агульнаадукацыйнай школы) – і мэханізм далучэньня да ідэалягічнага міту пайшоў на новы віток. Нягледзячы на назоў «факультатыў», дадзены прадмет зрабіўся абавязковым для шматлікіх спэцыялізацыяў. Цяпер пяцікурсьнікі за тыдзень маюць ажно чатыры пары «ідэалягічных заняткаў»: чатыры акадэмічныя гадзіны на тыдзень вывучэньня «Вялікай Айчыннай вайны савецкага народу» і чатыры акадэмічныя гадзіны на тыдзень вывучэньня «Асноваў ідэалёгіі беларускай дзяржавы». Асаблівы інтарэс у іх выклікаюць практычныя заняткі па «Асновах ідэалёгіі беларускай дзяржавы». Ёсьць яшчэ абавязковы ідэалягічны элемэнт у іншых прадметах, кшталту паліталёгіі, эканомікі, прадметаў гістарычнай скіраванасьці. Ня трэба забывацца і пра абавязковыя палітінфармацыі – нягледзячы на фармальны характар, свой уплыў на сьвядомасьць моладзі яны робяць.

Такім чынам, у беларускіх ВНУ склалася міждысцыплінарная схема ідэалягічнай працы, якая ўключае ў сябе вывучэньне ідэалягічных дысцыплінаў, навязваньне ідэалягічнага элемэнту ў зьмест «звычайных» прадметаў і сыстэму «дадатковай» ідэалягічнай індактрынацыі. І ўва ўсім гэтым ёсьць толькі адзіны дысцыплінарны пласт – гістарычная веда (палітэканомія выкарыстоўваецца толькі ў прапагандысцкім дыскурсе і пакуль слаба пранікае ў навучальныя аўдыторыі).

Інтэрпрэтацыя гістарычных фактаў у рэчышчы агульнага ідэалягічнага міту адыгрывае ролю фактычнага абгрунтаваньня існуючай ідэалёгіі. Яе выкладаньне на фоне барацьбы беларускага народу супраць акупантаў не выклікае такой адмоўнай рэакцыі, як іншыя формы ідэалягічнай індактрынацыі. А за разьвіцьцё ідэалягічных установак у патрэбным кірунку адказвае «фундамэнтальны» курс «Асновы ідэалёгіі беларускай дзяржавы» (мэтадалёгія плюс тэорыя) і «практычныя» веды, якія даюцца на палітінфармацыях. Такая тэарэтычная і мэтадалягічная база дазволіць забясьпечыць успрыманьне прэзыдэнта як правадыра, што вядзе вайну супраць ворагаў, недабітых у 1941–1945 гг.

Савецкая ідэалягічная дактрына мела велізарны пазытыўны запал, якога цяперашняя т. зв. дзяржаўная ідэалёгія амаль пазбаўленая. Антыкарупцыйная рыторыка і перамогі хакейных дружынаў ня могуць параўнацца па сваёй моцы зь мітамі савецкага часу. Іканастас прававернага савецкага грамадзяніна часоў 1960–1980 гг. быў надзвычай разнастайным. Ягоны ўплыў на масавую сьвядомасьць можна параўнаць хіба з уплывам амэрыканскай поп-культуры. Процістаяньне ЗША і Савецкага Саюзу мела выразны культурны характар, змагаліся дзьве мадэлі мадэрнізацыі, два лады жыцьця. Вобразна кажучы, войска Мікі-Маўса, Супэрмэна, Кенэдзі, Мэрылін Манро і астатніх герояў Галівуду змагалася зь іншым міталягічным войскам, увасобленым у Чалюскінцах, Трактарыстах, Дзяўчатах, Штырліцу, Гагарыну і Чэ Гевару. Камісары ў шлемах ваявалі з героямі коміксаў за ўплыў на масавую сьвядомасьць на ўсім сьвеце. У гэтай вайне перамагла поп-культура, якая прымусіла працаваць на сваю карысьць савецкія брэнды Чэ і ЦСКА. Пяціканцовай чырвонай зорцы цяпер месца на майцы ад

моднага вытворцы моладзевай вопраткі, чымся на фуражцы рэвалюцыянэра.

З кім параўнаць герояў Берасьцейскай крэпасьці, Марата Казея і Гастэлу? Зь Міхалуцкім? З «праваслаўным віцязем» камбрыгам Паўлічэнкам? Альбо з подзьвігам Уладзімера Ваўчкова на пляцоўцы тэнісных кортаў? Нават прапанова гэткага параўнаньня выглядае кашчунна. Да таго ж і выкарыстаньне расейскіх палітычных мітаў ужо немагчымае без крытычнай рэвізіі – курс на сувэрэнізацыю мітапалітычнай прасторы патрабуе правядзеньня выразнай палітычнай мяжы, якая б ідэнтыфікавала «нас», такіх падобных, і ўсё ж такі адрозных ад «іх».

Для гэтай сувэрэнізацыі як найлепш і надаецца Вялікая Айчынная вайна – і ў сілу яе гістарычнай значнасьці, і адпаведнага міталягічнага патэнцыялу, і ўжо гатовага прапагандысцкага раскладу, і, нарэшце, як поле для нацыянал-патрыятычных асэнсаваньняў.

СТАРОЕ І НОВАЕ

З гледзішча адлюстраваньня розных ідэалягічных падыходаў і антаганістычных гістарычных школаў падручнік з гісторыі Вялікай Айчыннай вайны – значны посьпех аўтараў, якія здолелі выкласьці матэрыял проста і цікава, даўшы карціну змаганьня беларускага народу з ворагам у кантэксьце сусьветнай барацьбы супраць нацызму. Ён ёсьць часткай шырокага спэктру разнастайных навуковых, побытавых, мастацкіх інтэрпрэтацыяў падзеяў 1941–1945 гг. – разам з аповедамі вэтэранаў, зборнікамі «Памяць», кнігамі пра беларускіх калябарантаў, клясычнымі кінастужкамі «Беларусьфільму» і сучаснымі «Акупацыя. Містэрыі» ды «Ў жніўні 1944-га». Усе гэтыя слаі фармуюць выяву гэтай значнай гістарычнай падзеі ў грамадзкай сьвядомасьці, якая будзе канчаткова сфармаваная (у адрозьненьне ад навуковай тэорыі, якая непазьбежна будзе пераацэньваць, здавалася б, ужо раз і назаўсёды цалкам высьветленыя гістарычныя падзеі).

І ўсё-такі падручнік мае вялікую хібу. У ім рэпрэзэнтаваны

«афіцыйны» погляд на гісторыю, які выклікае ў часткі навучэнцаў спрошчанае і скажонае разуменьне неадназначных гістарычных падзеяў.

Зьмяшчэньне падзеяў 1941–1945 гг. у Беларусі ў кантэкст Другой сусьветнай вайны, няхай сабе і ў межах «вайны савецкага народу», ёсьць прынцыпова важным крокам. Гэта крок наперад у асэнсаваньні новай гісторыі беларускага народу, які адлюстроўвае прынцыпова іншае стаўленьне да гераічнай барацьбы беларусаў у час Другой сусьветнай вайны. Гэта нельга не вітаць, нават з улікам таго, што падобная «незалежніцкая» пазыцыя аўтараў падручніка яўна палавіністая, непасьлядоўная, што выклікана бягучай палітычнай каньюнктурай. Для аўтараў падручніка вайна ў Беларусі па-ранейшаму пачалася не з 1939 г. (як, зрэшты, і для ўсіх народаў), а з 1941-га.

У гэтым выданьні кідаецца ў вочы апалёгія рэальнай палітыкі. Найбольш яскрава гэта бачна ў трактоўцы пачатку Айчыннай і прычынаў савецка-фінскай вайны. «З пункту гледжаньня палітычнай практыкі і маралі таго часу пакт Молатава–Рыбэнтропа не ўяўляў сабой нічога экстраардынарнага, асабліва калі параўнаць яго зь Мюнхенскім пагадненьнем» – гэта гучыць не як апраўданьне, а як тлумачэньне законаў палітычнага жыцьця. Такім чынам праяўляецца спэцыфіка ідэалягічнай індактрынацыі ўва ўмовах адносна вольнага распаўсюджаньня інфармацыі, у тым ліку даступнасьці альтэрнатыўных поглядаў на тагачасныя падзеі. Мы як бы вяртаемся ў часы Бісмарка, дапатсдамскія часы, калі рэй вялі рэсурсы і сіла.

Такім чынам, рухавіком гісторыі Вялікай Айчыннай вайны больш ня ёсьць ідэалёгіі – зь сёньняшняга пункту гледжаньня палітычнае жыцьцё і гісторыю рухае сіла і ўлада рэальнай палітыкі. Стваральнікі падручніка былі вымушаныя апраўдваць палітыку, якая рабіла беларускі народ не суб'ектам палітычных зносінаў, а аб'ектам палітычнага гандлю.

Рацыяналізацыя выкладаньня адбываецца і шляхам зьмяшчэньня падручніка ў кантэкст сучасных дасьледаваньняў Вялікай Айчыннай вайны, якія характарызуюцца адыходам ад

шматлікіх старых стэрэатыпаў. Не заплюшчваючы вочы на праблемы калябарацыі і будзённага жыцьця пад акупацыяй, на спрэчныя зьвесткі адносна памераў фізычных стратаў насельніцтва Беларусі падчас вайны, на альтэрнатыўныя тлумачэньні партызанкі, аўтары падручніка як бы ліквідуюць магчымыя небясьпекі для ідэалягічнага недаверу створанай імі карціне. Падручнік мае як бы ўсёахопны характар, адказвае на ўсе пытаньні адносна свайго прадмету.

У гэтым ёсьць адрозьненьне ад курсу «Асновы ідэалёгіі беларускай дзяржавы», які, напрыклад, ня можа нават закрануць пытаньня замежнапалітычнай ізаляцыі краіны альбо зьнікненьняў вядомых палітыкаў і журналіста (рацыянальная палеміка наконт гэтых пытаньняў у межах афіцыйнага ідэалягічнага поля папросту немагчымая). У вывучэньні гісторыі ідэалягічна больш бясьпечна і нават карысна агучыць пэўныя «забабоны», каб пасьля іх скрытыкаваць і абвергнуць. Нельга не згадаць пра дзейнасьць Барыса Рагулі, але пры гэтым трэба давесьці ягоную крыважэрнасьць. Цяпер трэба не замоўчваць існаваньне Саюзу беларускай моладзі, а падаваць інфармацыю пра яго ў вельмі нэгатыўным ключы. Так дасягаецца большы сугестыўны эфэкт.

Цікава, што рэспубліканская рада вэтэранаў цалкам падтрымала ўвядзеньне новага спэцыяльнага курсу як важнай часткі «патрыятычнага выхаваньня», аднак пры гэтым выказала незадавальненьне некаторымі тэзісамі падручніка. Перш за ўсё, гэта няправільнае выкладаньне сапраўдных прычынаў пачатку вайны і пралікаў савецкага кіраўніцтва ў перадваенны пэрыяд («*В этих заблуждениях просматриваются измышления «соросовских» учебников истории, издававшихся в период, когда на идеологическом фронте правили бал Шушкевич и его сторонники*»[1]). Далей, гэта перабольшваньне ролі іншых дзяржаваў антыгітлераўскай кааліцыі ў здабыцьці перамогі над фашызмам, а таксама ролі партызанаў і падпольшчыкаў у вызваленьні Беларусі. Таксама крытыкуецца зьмяшчэньне на старонках падручніка цытатаў з выказваньняў заходніх, у тым ліку нямецкіх лідэраў. Вельмі рэзка вэтэранскі орган выказаўся адносна замоўчваньня ролі камуністычнай партыі і асабіста таварыша Сталіна ў перамозе над фашызмам – у гэтым

бачыцца «адыход ад праўды гісторыі і спрыяньне яе фальсыфікатарам».

Прынцыповае значэньне мае заўвага, што разьдзел «Савецкі Саюз і краіны сьвету напярэдадні і ў пачатку Другой сусьветнай вайны» занадта зацягнуты, ён займае траціну агульнага аб'ёму выданьня. (На наш погляд, менавіта ў якасьць падручніка вельмі важная – беларусы павінны супраць чаго ваявалі тыя ж самыя вэтэраны.) Рэспубліканская рада раіць скараціць дадзены разьдзел, а за ягоны кошт павялічыць плошчу для прапаганды подзьвігаў савецкіх воінаў.

1 Сведанне современное, текст его нуждается в корректировке Вяскага Родины. 2004. 21 лістапада.

Мабыць, стваральнікі падручніка сьвядома ўдзялілі траціну яго аб'ёму падзеям напярэдадні вайны. Аднак тут ёсьць недагаворанасьці. Сутнасьць ідэалёгіі нацызму не была выкладзеная вычарпальна. Аўтары не раскрылі прычынаў нацыфікацыі Нямеччыны і дэталяў ідэалягічнай дактрыны нацыянал-сацыялізму, абмежаваўшыся савецка-марксісцкім тлумачэньнем гэтых зьяваў. Але і ў сацыяльна-эканамічнае тлумачэньне прыроды нацызму і фашызму, і яго гангстэрскае, крымінальнае разуменьне нельга назваць сугучнымі часу.

Падручнік з гісторыі для сярэдняй школы павінен быць ілюстраваны – і дадзенае выданьне ў гэтым сэнсе зроблена няблага. Выклікае адно зьдзіўленьне, што і для вышэйшай школы ілюстрацыйны шэраг застаецца тым самым, што і для навучэнцаў 11-й клясы. Навінкай ёсьць зьмяшчэньне ў кнізе тэкстаў выступаў Гітлера і вялікіх цытатаў з арыгінальных дакумэнтаў акупацыйнага часу. Навучэнцам нарэшце дазволілі самастойна зрабіць высновы з прыведзеных цытатаў альбо, прынамсі, пацікавіцца першакрыніцамі.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

крытыка [image]2005

"да Зьместу"

паэмыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Віктар Корбут Культура вайны

Публікацыі, якія аглядаюцца ў артыкуле:

ВІКТАР КОРБУТ культурны аглядальнік газэты «советская белоруссия». яго артыкул «музэі і выстаўная дзейнасьць у генэральнай акрузе «беларусь» (1941–1944 гг.)» неўзабаве будзе апублікаваны ў часопісе «спадчына»

Коваленя А., Краснова М., Лемешонок В., Новиков с., Жилинский М., Долготович Б., Козак К. *Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны)*: Учеб. пособие для 11 кл. учреждений, обеспечивающих получение общ. сред. образования, с рус. яз. обучения с 11-летним сроком обучения / Под ред. А. Ковалени, Н. Сташкевича; Пер. с бел. яз. А. Скорохода. – Минск: Издательский центр БГУ, 2004. – 231 с.

Каваленя А., Лемяшонак У., Далгатовіч Б., Жылінскі М., Козак К., Новікаў с. *Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)*: Вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйш. адукацыі / Пад рэд. А. Кавалені, М. Сташкевіча. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2004. – 279 с.

Урок памяти // Советская Белоруссия. 2004. 25 лістапада.

1

Ніколі не перастануць крытыкаваць тых, хто скажае мінулае, перапісвае яго, фальсыфікуе яго, перабольшвае значэньне аднае падзеі, замоўчваючы другую; гэтая крытыка правільная (яна і ня можа быць іншаю), але яна ня гэткая значная, калі ёй не папярэднічае крытыка найэлемэнтарнейшая: крытыка людзкой памяці як такой. Бо, папраўдзе, што ёй, гаротнай, падуладна ў рэчаіснасьці? Яна здатная ўтрымаць зь мінуўшчыны ўсяго толькі нязначна малую часьцінку, і нікому ня дадзена ведаць, чаму менавіта гэтую, а ня іншую, бо ў кожнага з нас гэты выбар робіцца таемна па-за нашаю воляй і нашымі інтарэсамі. Нішто ў чалавечым жыцьці ня будзе зразумела, калі ўпарта грэбаваць найпершай з усіх відавочнасьцяў: такой рэальнасьці, якая яна была, больш няма; аднавіць яе немагчыма. Нават найбагацейшыя архівы няздатныя тут дапамагчы.

Мілан Кундэра, «Няведаньне»

За пятнаццаць гадоў, што прайшлі ад часу адкрыцьця архіваў, дазволу больш-менш свабодна гаварыць і пісаць, падзеі Другой сусьветнай вайны ў Беларусі збольшага застаюцца захінутымі заслонай няведаньня. Асобныя сьмелыя дасьледаваньні пакуль няздатныя кампэнсаваць голад на праўду. Сьведкі тых часоў зь несавецкага боку баяцца сказаць лішняга, сьведкі з савецкага боку часта недагаворваюць, стараюцца не выходзіць у сваіх успамінах па-за межы афіцыйна дазволеных «гераізмаў». У абодвух выпадках моцна спрацоўвае аўтацэнзура. Архівісты змушаныя публікаваць тое, што замаўляе або беларуская дзяржава, або нямецкія ды аўстрыйскія фонды. Мінулае, якое немагчыма рэканструяваць цалкам, застаецца ў стане ня складзенага дарэшты пазла. Тое, што паводле папярэдняга прагнозу мае даць «нявыгадную» карціну, наўмысна не складаецца, – у выніку ўся мадэль застаецца ў выглядзе кавалкаў, не зьвязаных адзін з адным.

Падручнік «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу» стаў яшчэ адным з такіх кавалкаў, якія нават пры жаданьні будзе няпроста злучыць адзін з адным. Гэта больш як дапаможнік для вучняў і студэнтаў, каб вывучаць гісторыю. Гэта бясспрэчна ідэалягічны прадукт. Невыпадкова ён зьявіўся ў 2004 г. – у час

адзначэньня 60-годзьдзя вызваленьня Беларусі ад нямецкай акупацыі, або, як прынята гаварыць, ад «нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Яго ўжо пачалі вывучаць у школах і ўнівэрсытэтах – напярэдадні 60-й гадавіны Перамогі ў Другой сусьветнай, або, як часьцей кажуць у сучаснай Беларусі па старой савецкай завядзёнцы, у Вялікай Айчыннай вайне.

Гэты навучальны дапаможнік даўся нялёгка. Дзяржзамова была выканана ў рэкордны тэрмін. Паводле Тацяны Нічыпаровіч, дырэктаркі выдавецкага цэнтру Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, усё рабілася ў *«жудасных умовах»*, беларуская вэрсія падручніка была змакетаваная за два месяцы. Аўтары кнігі запэўніваюць, што днявалі і начавалі пры сваіх працоўных сталох – гнала ня толькі патрэба часу, але і імпэт. Цяжка сказаць, наколькі адкрытая для грамадзтва была гэтая работа. Прынамсі, з публікацыяў у прэсе цяжка зрабіць выснову, што гісторыкі працавалі *«публично, собирали дискуссионные столы с привлечением журналистов, учителей, педагогов, ученых»*[1] (Урок), як дэкляруе Аляксандар Каваленя, галоўны рэдактар дапаможніка, які з восені 2004 г. ачольвае Інстытут гісторыі НАН Беларусі.

На яго думку, падручнік збольшага рэпрэзэнтуе *«объективную точку зрения»* (Урок). Сапраўды, не замоўчваецца калябарацыянізм, гаворыцца пра Армію Краёву (вельмі коратка), пра няпростую сытуацыю ў СССР наканадні вайны. Тым ня менш, нягледзячы на заўвагу Аляксея Літвіна, што *«нет одной правды... тем более когда речь идет о таком эмоциональном событии, как война»* (Урок), у падручніку выкладаецца пераважна *адна праўда*. Дзьвюх думак на адну праблему не дапускаецца. Гэта манатонная гісторыя, як заведзенае кружэлка, спэктакль без антракту. Шмат што недагаворваецца, замоўчваецца, абыходзіцца ўвагаю.

[1] *Цытатную* работ, што тут і наступныя, *мяркуюцца*, *што* *тэкст* друкаваўся, стала ў «Советской Белоруссии» пазначаны як *Урок*.

Школьная гісторыя ніколі не адпавядае праўдзе, яна прызначана для выхаваньня.

Наталя Якавенка, украінскі гісторык

Конечно, все нельзя вместить в учебник. Учащийся, студент и исследователь по-разному воспринимают информацию. Исследовательский труд, разумеется, глубже. Но, на мой взгляд, в учебнике нормально сформулирована история прошедшей войны. Нет перевеса идеологии над фактом, чем страдали раньше…

Вячаслаў Селяменеў, дырэктар Нацыянальнага архіву Беларусі

Насуперак гэтаму меркаваньню, ідэалёгія ў падручніку пра Вялікую Айчынную вайну ўсё ж пераважае. Водгукі прафэсіяналаў яшчэ прагучаць. Тут хацелася засяродзіць увагу на тых фрагмэнтах гісторыі вайны, выкладзеных у кнізе, што сёньня «пастаўленыя на службу» т. зв. ідэалёгіі беларускай дзяржавы.

Першае, што прыцягвае ўвагу, – гэта асьвятленьне пачатку вайны і тое, што папярэднічала яе разьвязваньню. Найперш пакт Молатава–Рыбэнтропа і наступствы яго падпісаньня. Аўтары мяркуюць, што нямецка-савецкі дагавор *«з пункту гледжання палітычнай практыкі і маралі таго часу <…> не ўяўляў сабой нічога экстраардынарнага, асабліва калі яго параўнаць з Мюнхенскім пагадненнем»*. Да таго ж, *«гэтае пагадненне ў пэўнай ступені пасадзейнічала ўз'яднанню беларускага народа і замацаванню тэрытарыяльнай цэласнасці БССР, г. зн. аднаўленню гістарычнай справядлівасці»*, а *«перад працоўнымі заходніх абласцей Беларусі адкрыліся перспектывы развіцця гаспадарчага жыцця, навукі, культуры…»*. Прынамсі, насельнікамі Заходняй Беларусі падзеі 1939 г. успрымаліся неадназначна. Паводле Аляксандра Смаленчука, які праводзіў палявыя дасьледаваньні ў паўночна-заходнім кутку Гарадзеншчыны, *«людзям навязвалася такая гісторыя, якая ніколі не перажывалася іх продкамі»*. Да польскай, савецкай і нямецкай арміяў было практычна аднолькавае стаўленьне. Як «сваю» рэдка хто характарызаваў і першую, і другую, і трэцюю. Успрымаючы сябе як «тутэйшых», аўтахтонаў, мясцовыя людзі пільнавалі свае інтарэсы. Таму гаварыць пра «ўсебеларускую» радасьць, а пасьля пра «ўсенародную» барацьбу няма як.

Цалкам справядліва ўварваньне нямецкіх войскаў на тэрыторыю Польшчы 1 верасьня 1939 г. мянуецца *«агрэсіяй»*. Гаворыцца пра «падставу» нямецкага ўварваньня – справакаваны нямецкім бокам памежны інцыдэнт. Тым часам зусім інакш інтэрпрэтуюцца падзеі ў краінах Балтыі: *«гісторыя гэтых працэсаў празмерна заблытана савецкай афіцыйнай гістарыяграфіяй, а таксама сучаснымі суб'ектывісцкімі ацэнкамі»*. Што гэта за «ацэнкі», становіцца зразумела праз адзін абзац: *«Сярод некаторых палітычных дзеячаў прыбалтыйскіх рэспублік сёння вельмі папулярна трактаваць падзеі тых гадоў як акупацыю. Гэта не адпавядае фактам»*. Між тым, у краінах Балтыі ўсё таксама пачыналася з памежных інцыдэнтаў (Латвія) ды «правакацыяў» супраць савецкіх вайскоўцаў (Літва). Падставы для ўводу войскаў СССР у гэтыя краіны былі надуманыя, накшталт «выкраданьня» чырвонаармейцаў у Літве.

Літоўцы, латышы ды эстонцы сьледам за заходнімі беларусамі (90,7% «за» «ўзьяднаньне») прагаласавалі за «блёк працоўнага народу» (у Латвіі – 97,8%). А каб не было падставаў для закідаў супраць «недэмакратычнасьці працэсу», 100 тыс. рыжанаў (з 350 тыс. магчымых) узялі ўдзел у *«антыўрадавых дэманстрацыях і мітынгах»* (пад урадам маецца на ўвазе «буржуазнае» кіраўніцтва Латвіі). Праз год зь ня меншым імпэтам латышы выходзілі на вуліцы сустракаць немцаў, а пасьля запісваліся ў SS. У падручніку не тлумачыцца, чым выкліканая гэткая імгненная зьмена прыхільнасьцяў у агулам разважлівых балтаў.

Школьнікам да ўсяго ж прапануецца паразважаць над лістом П. Панамарэнкі Іосіфу Сталіну, напісаным 25 верасьня 1939 г. Тут праўдзе гісторыі пашанцавала больш. Ад П. Панамарэнкі мы даведваемся, што хоць

белорусское крестьянство настроено прекрасно, поддерживает всем, чем может, Красную Армию… за Белосток <ом> население встречает наши войска более сдержанно, русский язык знают меньше, чаще раздаются выстрелы из-за угла, из лесу по красноармейцам, командирам… Крестьяне говорят на настоящем белорусском языке, причем употребляют много слов,

о которых нас здесь (у БССР. – **Аўт.**) *уверяли, что они нацдемовские, выдуманные. Нацдемы могли выдумать в литературе, а народу привить не могли, тем более западным белорусам.*

У падручніку не знайшлося месца для асьвятленьня рэпрэсіяў у дачыненьні да мірнага насельніцтва і польскіх жаўнераў на былых «крэсах», арыштаў беларускай інтэлігенцыі ў Вільні (і ня толькі ў ёй) і масавыя высланьні людзей у Сібір (паводле найноўшых зьвестак, з 3 кастрычніка 1939 г. да 20 чэрвеня 1941 г. у Сібір, Казахстан і інш. было дэпартавана 120 000 чалавек з 125 000 рэпрэсаваных у Заходняй Беларусі).

Чытачу прапануецца сухая гісторыя гераізму і патрыятызму – савецкага; «жывая гісторыя» адсоўваецца на апошні плян, яе не відаць. Чытачу забараняецца ведаць, што рабілася на пачатку вайны ў Беларусі, як на фоне кровапралітных баёў савецкае чынавенства ўцякала на Ўсход, НКВД сьпешна расстрэльвала сваіх вязьняў, а ў пакінутых без улады гарадох рабаваліся склады і музэі. Больш важна расказаць пра парад на Краснай плошчы 7 лістапада 1941 г. ды працытаваць Сталіна, які маладым беларусам праз паўстагодзьдзя паведаміў пра *«нашых вялікіх продкаў»*: Аляксандра Неўскага, Дзьмітрыя Данскога, Кузьму Мініна, Дзьмітрыя Пажарскага, Міхаіла Кутузава, не забыўшыся на асабліва дарагога сэрцу кожнага тутэйшага чалавека Аляксандра Суворава.

3

Мы прыйшлі сюды як пераможцы, але пераможцы бальшавізму, а не беларусаў, для якіх мы ёсьць вызваляльнікамі.

Вільгельм Кубэ, генэральны камісар Генэральнай акругі «Беларусь»

Немецкие фашисты ставили цель истребить белорусский народ. На «очищенном» таким образом жизненном пространстве Берлин планировал оставить в живых только

четвертую часть нас, белорусов. В качестве рабов.

Аляксандар Лукашэнка, прэзыдэнт

Мы ня мелі выбару. Мы маглі супрацоўнічаць або зь немцамі, або з савецкімі бальшавікамі, якіх ненавідзелі.

Антон Адамовіч, інтэлектуал

У свой час найвышэйшае кіраўніцтва нашай краіны выказвала занепакоенасьць якасьцю выкладанага ў школах ды ВНУ гістарычнага матэрыялу. Сапраўды, доўгі час беларускія падручнікі былі недасканалыя, «сухія», напісаныя не пэдагогамі, а прафэсійнымі гісторыкамі, якія не заўсёды маглі адрозьніць *важнае* ад *патрэбнага*. Апрача таго, навучальныя дапаможнікі былі неілюстраваныя.

На жаль, сяму-таму «на версе» рупіла і рупіць зусім не пэдагогіка. Тады, гадоў дзесяць таму, выклік?ла незвычайную занепакоенасьць інтэрпрэтацыя гісторыі, асабліва таго, што было зьвязанае зь Вялікім Княствам Літоўскім. Пакрысе, праўда, запал прайшоў, і цяпер *«мы ведаем і паважаем сваю гісторыю, не адмаўляемся ад устойлівых традыцый. Мы памятаем аб Полацкім і Тураўскім княствах, Вялікім княстве Літоўскім», «по праву гордимся тем, что наш белорусский язык в Великом княжестве Литовском был официальным языком»*. Праўда, вытокі свае мы шукаем не ў сівой даўніне, а… у Вялікай Айчыннай вайне.

«Не секрет, что сегодня некоторые лжеученые пытаются «пересмотреть» историю Великой Отечественной войны, принизить роль и значение героической борьбы наших дедов и прадедов, реабилитировать предателей, фашистских прислужников. Свой информационный удар они направляют в первую очередь на молодежь», – з такою прамоваю-наказам зьвяртаецца сам А. Лукашэнка да чытачоў новага школьнага падручніка. Цікава, што ўва ўнівэрсытэцкім дапаможніку прэзыдэнтавай прамове чамусьці не знайшлося месца. Лукашэнкаву прадмову аздабляе фатаздымак, дзе ён у касьцюме галоўнакамандуючага рукаецца з апранутымі ў бялюткую форму вэтэранамі. Вядома, што школьны падручнік

дастаўся найперш вэтэранам. З расейскамоўнага накладу 107 600 ас. ім раздалі 80 000, зь беларускамоўных 17 600 – вэтэранам, 34 600 – школьнікам.

Хто ж такія «лжеученые», якіх ня трэба слухацца юнаком ды дзяўчатам? У сьпісе рэкамэндаванай для дадатковага вывучэньня літаратуры няма прозьвішча Юр'я Туронка, ня кажучы пра іншых, маладзейшых, дасьледнікаў вайны, і таму ўсё робіцца ясна. Калі ў «лібэральным» 1993 г. Туронкаву кнігу «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» трэба было папярэджваць «улагоджвальнай» прадмовай ды зацемамі навуковага рэдактара, то што ўжо казаць пра наш «складаны» ды «супярэчлівы» час.

Найперш зьвернем увагу на два моманты: інтэрпрэтацыю калябарацыянізму і аналіз ваенных стратаў сярод насельніцтва ў трактоўцы падручніка.

Наконт першага А. Каваленя піша: *«нельзя умалчивать и о том, что был коллаборационизм, – это ведь тоже факт истории. Пусть он касается небольшой части общества, но этого нельзя вычеркнуть. Как не вычеркнешь и Армию Крайову. Не слишком вдаваясь в подробности, мы должны беспристрастно отобразить все»* (Урок).

Намаганьні захопнікаў не знайшлі падтрыманьня – ні сярод беларусаў, ні сярод беларускіх татараў і расейцаў, *«большасць беларускай моладзі актыўна ўдзельнічала ў барацьбе супраць акупантаў»*. Для засваеньня матэрыялу студэнтам прапануецца прачытаць лістоўку «Да сяброў беларускай моладзі ў Стоўбцах» з 15 чэрвеня 1944 г., напісаную *«былым дружковым арганізацыі СБМ Суслаевым Паўлам»*, а таксама азнаёміцца са зваротам В. Кубэ да беларусаў, надрукаваным тарашкевіцай. (Школьнікам дакумэнтаў «жывой гісторыі» не прапануецца.)

Пры аповедзе аб АК не адзначаецца, што яе беларускія, украінскія і літоўскія аддзелы папаўняліся зь мясцовых ураджэнцаў, якія ўсьведамлялі сябе палякамі, хаця пераважна і не былі супольнага зь імі этнічнага паходжаньня. Ня ўсе мясцовыя жыхары былых польскіх «крэсаў» прынялі з радасьцю падзеі 1939 г. і таму цалкам натуральна арыентаваліся на

адраджэньне «сваёй», польскай, дзяржавы. Інтарэсамі розных дзяржаваў, складанай этнаканфэсійнай структурай мясцовага насельніцтва і быў выкліканы ўдзел жыхароў Беларусі ў вайне па розныя бакі фронту.

Няма ні слова пра нацыянальную сымболіку. У гэтым сэнсе разьдзелы пра калябарацыянізм напісаныя аб'ектыўна нагэтулькі, наколькі гэта сёньня афіцыйна дазволена. Гэтая тэма выглядае як выпадковая і неабавязковая, складваецца ўражаньне, што на супрацу зь немцамі пайшлі лічаныя людзі, між радкоў чытаецца: «здраднікі».

На фоне некаторых аўтараў, якія не цураюцца такіх выразаў, як *«кучка местных подонков»*, якім В. Кубэ *«разрешил помахать «бел-чырвона-белым» флагом», «негодяи полицаи», «сьвядомыя»*, у якіх *«руки по локоть в крови»*[2], складальнікі падручніка выглядаюць досыць годна. Яны не апусьціліся да такога шальмаваньня.

Аб праблеме стратаў у часе вайны. У падручніку безапэляцыйна цьвердзіцца: *«Беларусь за гады вайны страціла кожнага трэцяга свайго жыхара»*. Адпаведная табліца ў тым месцы гаворыць: усяго зьнішчана 1 409 225 чалавек грамадзянскага насельніцтва, забіта і закатавана ваеннапалонных 810 091, *«вывезена ў нямецкае рабства»* – 377 776. Такім чынам, маем 2 597 092 чалавекі. Дзесяць гадоў таму афіцыйныя лічбы былі крыху іншыя: *«…Загінула больш за 2,2 млн чал. (кожны чацвёрты). На катаржныя работы ў Германію было вывезена 380 тыс. чал.»*[3]. Як бачым, да загінулых прыплюсавалі вывезеных у «рабства» – адсюль і «кожны трэці».

(Гэтая новая маніпуляцыя з гістарычным матэрыялам ужо выклікала тэндэнцыйныя інтэрпрэтацыі ў прэсе: *«Вдумайтесь: каждый третий житель погиб! Столько чужого народу после войны понаехало, сильно мы вам кровь разбавили»* (Советская Белоруссия. 2004. 23 кастрычніка). Словы нібы належаць нейкаму беларускаму чувашу.)

Гаварыць – не ваяваць, не памяраць. Гісторыкі дагэтуль ня могуць разабрацца, колькі ж *папраўдзе* загінула беларусаў жыхароў Беларусі, насельніцтва, якое знаходзілася ў вайну на

[2] Прыклад узятыя з тэксту Пятруленя В. Алмаз и пепел // Советская Белоруссия. 2004. 22 июня.

[3] Гук У. Великая Отечественная война 1941–1945 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 2.

тэрыторыі Беларусі. Менавіта падзел ахвяраў на тры групы – уласна беларусаў, грамадзянаў краіны і тых, хто тут аднаўся воляю лёсу (тыя ж вайскоўцы, і ня толькі савецкія, але і нямецкія), глыбокі аналіз кожнай зь іх можа даць дакладны адказ на пытаньне пра чалавечыя страты.

Беларусь Гімн. – Менск, 1994. с. 434.

Напрыклад, з 380 тыс. беларусаў, вывезеных на работы ў Нямеччыну, 260 тыс. ніколі не вярнуліся дадому, уважаюць, што 196 тыс. зь іх загінула пры розных акалічнасьцях (або зьехала на Захад?). У ліпені 1944 г. на Захад зь Беларусі выбралася блізу 80 тыс. чалавек. Пытаньне: куды трапілі ўсе гэтыя людзі – у «загінулыя»?..

Тое, што найбольшыя страты панесла найперш габрэйскае насельніцтва, у падручніку не акцэнтавана. Як вынік, у сапраўднасьці ліку ахвяраў ёсьць сур’ёзныя падставы сумнявацца, і тым самым у галовах маладога пакаленьня фармуецца стэрэатыпнае, фрагмэнтарнае і недакладнае ўяўленьне пра ўласную гісторыю...

Адмысловай увагі заслугоўвае аздабленьне кнігі. Вокладка школьнага падручніка – салдат, які ўздымае Сьцяг Перамогі над райхстагам, – больш удалая за ўнівэрсытэцкую, дзе чырвонаармеец зь пісталетам заклікае: «За Родину! За Сталина!» Бальшыню ж ілюстрацыяў пры перавыданьні падручніка варта было б зьмяніць. Дужа многа плякатаў, улётак і фатаздымкаў, якія адлюстроўваюць унутрырасейскія рэаліі. Вось, прыкладам, кадар з антыфашысцкай дэманстрацыі ў абарону Э. Тэльмана – але чамусьці маскоўскі, а ня менскі, хаця гэткія акцыі праходзілі ўва ўсім Савецкім Саюзе.

Разьдзел пра ўзьяднаньне дзьвюх паловаў Беларусі аздоблены топарна. Вось уяжджаюць савецкія танкі ў Вільню (праўда, іх ніхто не сустракае), пасьля танкі едуць па Гарадзеншчыне і іх вітае купка сялянаў, далей засядае Прэзыдыюм Народнага Сходу Заходняе Беларусі. У школьным дапаможніку жыхары Гарадзеншчыны сустракаюць Чырвоную Армію – узьнятыя рукі вітаюць змучаных салдатаў, затым радасныя сяляне з мудрым П. Панамарэнкам на першым пляне пляскаюць у ладкі на пасяджэньні Народнага Сходу.

У беларускамоўным падручніку дакумэнты, зь якімі прапануецца азнаёміцца навучэнцам, апублікаваныя парасейску, за выняткам тых, што ў арыгінале былі напісаныя па-беларуску. Матывацыя такога разьмеркаваньня функцыяў між мовамі незразумелая: А. Гітлер або І. Сталін ня могуць «гаварыць» па-беларуску, бо нашаю моваю нельга выказаць нічога «вялікага», або была лянота перакладаць?

4

Без избавления от нацистской оккупации не было бы нашего государства и нашего народа... белорусы вместе со всем советским народом оказали самое упорное в истории человечества сопротивление агрессору.

Советская Белоруссия. 2000. 4 ліпеня.

Дзякуючы гэтаму подзвігу беларускі народ стаў вялікім народам.

Звязда. 2001. 22 жніўня.

Беларуская нацыянальная ідэя ў афіцыйнай вэрсіі фармуецца пры эксплюатацыі тэмы ВАВ. Галоўнае нацыянальнае сьвята, Дзень Незалежнасьці, адзначаецца ў гадавіну вызваленьня сталіцы ад немцаў. Усе падзеі айчыннай гісторыі прывязваюцца да вайны – як «да і пасьля нашай эры». Спэцкурс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу» – гэта ня экскурс у гісторыю, гэта тая самая нацыянальная ідэя, якой няма нават у Расеі, для якой (для дзяржавы, не для асобных народаў РФ са сваімі «рэгіянальнымі» гісторыямі) вайна была сапраўды Вялікая і Айчынная.

Сёньня камусьці выгадна, *каб была вайна*. Але вайна – ня вечная, яна мінае, зрабіўшы сваё. Браць сёньня на «ўзбраеньне» ідэю вайны – гэта значыць станавіцца на небясьпечную дарогу. Думаючы пра *вайну мінулую*, ці не праграмуеш сябе на *вайну будучую*?

Прынцыповае значэньне мае заўвага, што разьдзел «Савецкі

Саюз і краіны сьвету напярэдадні і ў пачатку Другой сусьветнай вайны» занадта зацягнуты, ён займае траціну агульнага аб'ёму выданьня. (На наш погляд, менавіта гэтая якасьць падручніка вельмі важная – беларусы павінны ведаць, супраць чаго ваявалі тыя ж самыя вэтэраны.) Рэспубліканская рада раіць скараціць дадзены разьдзел, а за ягоны кошт павялічыць плошчу для прапаганды подзьвігаў савецкіх воінаў.

Мабыць, стваральнікі падручніка сьвядома ўдзялілі траціну яго аб'ёму падзеям напярэдадні вайны. Аднак тут ёсьць недагаворанасьці. Сутнасьць ідэалёгіі нацызму не была выкладзеная вычарпальна. Аўтары не раскрылі прычынаў нацыфікацыі Нямеччыны і дэталяў ідэалягічнай дактрыны нацыянал-сацыялізму, абмежаваўшыся савецка-марксісцкім тлумачэньнем гэтых зьяваў. Але і ў сацыяльна-эканамічнае тлумачэньне прыроды нацызму і фашызму, і яго гангстэрскае, крымінальнае разуменьне нельга назваць сугучнымі часу.

Падручнік з гісторыі для сярэдняй школы павінен быць ілюстраваны – і дадзенае выданьне ў гэтым сэнсе зроблена няблага. Выклікае адно зьдзіўленьне, што і для вышэйшай школы ілюстрацыйны шэраг застаецца тым самым, што і для навучэнцаў 11-й клясы. Навінкай ёсьць зьмяшчэньне ў кнізе тэкстаў выступаў Гітлера і вялікіх цытатаў з арыгінальных дакумэнтаў акупацыйнага часу. Навучэнцам нарэшце дазволілі самастойна зрабіць высновы з прыведзеных цытатаў альбо, прынамсі, пацікавіцца першакрыніцамі.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

[image]

2[image]
крытыка [image]2005
"да Зьместу"
паэмыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Сяргей Богдан Беларусь, убачаная арыенталістам

СЯРГЕЙ БОГДАН скончыў факультэт міжнародных дачыненьняў БДУ. Займаецца вывучэньнем ісламскай тэалёгіі. Пераклад фрагмэнтаў рэцэнзаванай кніжкі будзе надрукаваны ў наступным нумары часопісу «Палітычная сфера».

Maćków Jerzy. Am Rande Europas? Nation, Zivilgesellschaft und außenpolitische Integration in Belarus, Litauen, Polen, Russland und der Ukraine. – Freiburg–Basel–Wien: Herder, 2004.

Кніжка прафэсара Рэгенсбурскага ўнівэрсытэту Ежага Мацькава была задуманая як выклад праблемы інтэграцыі з Захадам краінаў нашага рэгіёну. Зважаючы на слабую абазнанасьць нямецкага чытача зь іх асаблівасьцямі, др. Мацькаў суправадзіў свае развагі нарысам гісторыі Беларусі, Літвы, Польшчы, Расеі і Ўкраіны. Атрымаліся «ўводзіны ў вывучэньне ўскраінных земляў Заходняй Эўропы», закліканыя асьвятліць узаемасувязі паміж грамадзтвамі, нацыямі і наднацыянальнай інтэграцыяй. Для публіцыстычнага твору занадта мудрагелістыя, для строгага навуковага дасьледаваньня занадта простыя.

УСХОДНЯЯ ЭЎРОПА ЯК ІНШЫ СУСЬВЕТ

Кніжка пачынаецца з прапановы зьвярнуцца да цьвярозага глузду і ўрэшце прызнаць той факт, што Захад і Ўсход Эўропы належаць да розных, часам нават процілеглых, культурных, палітычных, эканамічных і грамадзкіх сусьветаў. Адрознасьць Усходу тлумачыцца на прыкладзе трох пытаньняў, што стала

прысутнічаюць у дасьледаваньнях нацыяналізму і посткамуністычных пераўтварэньняў – нацыятварэньня, дачыненьняў паміж нацыяй і грамадзянскай супольнасьцю, транснацыянальнай інтэграцыі.

Першыя старонкі прысьвечаны доўгім тэарэтычным развагам аб асноўных напрамках дасьледаваньняў нацыі і нацыяналізму – аб т. зв. канструктывізьме (згодна зь якім нацыі ўяўляюць сабой сьвядома створаныя элітамі супольнасьці) і прымардыялізьме (паводле якога нацыі існуюць адвеку, арганічна паўстаючы ў выніку гістарычнага разьвіцьця). Аўтар па чарзе праз прызму кожнай тэорыі разглядае разьвіцьцё ўсходнеэўрапейскіх нацыяў і прыходзіць да высновы, што нацыятварэньне ў краінах Усходняй Эўропы ішло больш рэвалюцыйным шляхам пад уплывам чужынскага панаваньня, тады як заходнія нацыі паўставалі збольшага ў выніку эвалюцыі ў межах ужо існуючай дзяржавы. Таму ўтвораныя нацыі сапраўды адрозьніваюцца.

Сп. Мацькаў яўна ня мае сантымэнтаў да канцэпцыяў Сярэдняй Эўропы, у выніку ў чытача складваецца ўражаньне аб маргінальнасьці нашага рэгіёну ў дачыненьні да заходняй часткі кантынэнту. (Усходняя Эўропа выглядае маргінальна і анамальна, калі яе параўноўваць з Заходняй. Але калі вылучыць яе ў асобны рэгіён Сярэдняй Эўропы – нармальнасьць вернецца.) Адначасова аўтар раіць кіраўніцтву ЭЗ перагледзець сваё варожае стаўленьне да нацыяналізму, бо *«Беларусь і Ўкраіна паказваюць, што альянс нацыяналізму, дэмакратыі і лібэралізму можа быць акурат тым, што неабходна краінам, дзе адсутнічае грамадзянская супольнасьць»*.

Канцэпцыі грамадзянскай супольнасьці (як сукупнасьці аб'яднаньняў і асобаў, што валодаюць прыватнай уласнасьцю ды дзейнічаюць у сваіх уласных інтарэсах) тут процістаіць панятак *ідэякратыі – «умма»*. (Маецца на ўвазе супольнасьць мусульманаў, ад чаго выказваньне мяжуе з паліткарэктнасьцю.) Міт таталітарнасьці мусульманскага грамадзтва – здабытак арыенталізму. Пра арыенталізм мы яшчэ пагаворым пазьней, а пакуль адзначым (заходне)эўропацэнтрычны падыход аўтара.

Др. Мацькаў пэрыядычна ўва ўсім тэксьце заклікае

адкарэгаваць заходняе разуменьне нацыяналізму, традыцыйнае для дасьледаваньняў гэтай зьявы, калі нацыяналізм вызначаецца як імкненьне да нацыянальнага адзінства і ўсталяваньня нацыянальнай палітычнай улады, то бок фармаваньня нацыянальнай дзяржавы. Ён наракае на тое, што гэткая дэфініцыя ахоплівае сабой як «добрыя», гэтак і «благія» нацыяналізмы, а іх ня варта *«часаць адным грабеньчыкам»*. У рэальнасьці мы часьцяком бачым нацыяналізмы, што распальваюць варожасьць да іншых народаў, патрабуючы этнічнай/нацыянальнай чысьціні. Гэта т. зв. эксклюзіўныя нацыяналізмы, што выраджаюцца ў спробы зьнішчэньня чужынцаў. Але ж нярэдка нацыяналізмы прымаюць грамадзянскія і аб'яднаўчыя рысы, становяцца інклюзіўнымі. Гэткія нацыяналізмы станоўча ўплываюць на нацыянальную ідэнтычнасьць, бо дапамагаюць нацыі ўсталяваць цывілізаваныя дачыненьні з суседзямі й чужынцамі, што робіць іх незаменнымі хаўрусьнікамі дэмакратыі ва Ўсходняй Эўропе. (І калі нехта ў тым сумняецца, дык хай сьпярша пазнаёміцца з творамі Ганса Кона, Эрнэста Гелнэра, Лорда Эктана, Элі Кедуры, а пасьля спрабуе гэта абвергнуць.)

Усходняя Эўропа пакутуе на недаразьвітасьць, бо яе «арганічнае» разьвіцьцё было неаднаразова перарванае «зьнішчэньнем Польшчы» (у 1772, 1793, 1795, 1815 і 1939 гг.). Дзяржаваў-рабаўніцаў, што бралі ў ім удзел, можна лічыць аднолькава вінаватымі, бо, дарма што многія зь іх належалі да заходняй культуры (Габсбурская Аўстра-Вугоршчына, Прусія, Трэці Райх), пераступіўшы *«ўсе маральныя стандарты»* Заходняй Эўропы, яны апынуліся ў адным шэрагу з прыналежнай да другога культурнага сьвету Расейскай імпэрыяй/Савецкім Саюзам:

Пакаленьні інтэлектуалаў-прыхільнікаў «эксклюзіўнага» нацыяналізму (альбо проста апартуністаў) краінаў-рабаўніцаў тлумачылі гэты чын як гістарычную справядлівасьць альбо неабходнасьць. Але немагчыма схаваць тых бязьмежна далёкасяжных наступстваў, што меў для ўсёй Эўропы гэты акт. Велізарны эўрапейскі рэгіён, што, пачынаючы з XIV ст., цягам многіх вякоў дэманстраваў сабой узор сапраўды

мультыкультурнай палітычнай фэдэрацыі ды шмат у чым быў прадвесьнікам Эўразьвязу, быў разбураны. Ягоная палітычная слабасьць ўмажлівіла найвялікшыя эўрапейскія катастрофы XX ст.: хуткаплынны посьпех нацыянал-сацыялізму зь яго сьмерцяноснай палітыкай ды працяглы посьпех камунізму.

Аўтар зьвяртаецца да ўмоўнага ладу, маўляў, вось калі б не разбурылі Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, калі б не зьніштожылі Другой Рэчы Паспалітай (1918–1939 гг.)… Змагаючыся за неперадузятую чысьціню тэрміну «нацыяналізм», ці не забываецца ён на чысьціню тэрмінаў «Польшча» ды «Літва»?

АБ ЗЬНІКЛЫХ НАЦЫЯХ І АДЧАІ ПІЛСУДЗКАГА

Польшча рэпрэзэнтуецца як узор пераўтварэньня пад чужынскім уладараньнем *шляхецкай нацыі* (Adelsnation) у *мадэрную* шляхам пашырэньня нацыянальных каштоўнасьцяў сярод першапачаткова сацыяльна і палітычна прыгнечаных ды нацыянальна абыякавых масаў – буржуазіі й сялянаў. *Сучасная* польская нацыя, такім чынам, паўстала на руінах *шляхецкай* нацыі ды пацьвярджае слушнасьць прымардыялізму.

Але ж побач з польскай шляхецкай нацыяй існавала і літоўская шляхецкая нацыя, якая зьнікла ў сьмяротных абдымках братоў і суседзяў. Яе сьляды ў разгляданай кніжцы можна адшукаць у спрэчцы наконт польскай нацыянальнай ідэнтычнасьці, што ішла ў першай палове мінулага стагодзьдзя паміж Раманам Дмоўскім ды Юзафам Пілсудзкім.

Варшавяк-беларусафоб Дмоўскі выступаў за стварэньне сучаснага, этнічна эксклюзіўнага нацыяналізму коштам асыміляцыі нацыянальных меншасьцяў. Гэтай пазыцыі процістаяў Пілсудзкі, прыхільнік інклюзіўнага нацыяналізму ў лепшых традыцыях шляхецкай нацыі. Чаму, маўляў, пілсудчыкам і закідалі архаізм.

Пілсудзкі перамог Дмоўскага палітычна, але не ягоную

канцэпцыю. Кульмінацыяй яе пасьпяховага разьвіцьця сталася паваеннае зьмяшчэньне Польшчы на Ўсход з зачысткамі тэрыторыі ад украінцаў ды немцаў. Усьлед за імі, на думку Ежы Мацькава, пайшлі іншыя:

Фармаваньне сучаснай польскай нацыі паўплывала на нацыябудаўніцтва іншых народаў былой Рэчы Паспалітай. Гэтыя працэсы нацыябудаўніцтва, на жаль, мелі сваім вынікам паўстаньне пераважна этнічна эксклюзіўных нацыяналізмаў – у іх ліку варта назваць і ідэнтычнасьць савецкага чалавека, якая, зрэшты, утрымлівае ў сабе няшмат грамадзянскіх рысаў.

Сапраўды, украінскія і беларускія нацыяналісты калісьці набраліся многіх польскіх ідэяў і стварылі ў XIX–XX стст. свае эксклюзіўныя нацыяналістычныя канцэпцыі. Але пасьля, у выніку гіганцкіх грамадзкіх пераўтварэньняў, яны былі маргіналізаваныя і нават незалежнасьць не дапамагла ім у рэалізацыі іх праектаў. 1991 г. даў уладу намэнклятурным элітам, што пачалі панаваць ды будаваць свае дзяржавы й нацыі, не зважаючы на старыя канцэпты «тубыльцаў». Гэтыя эліты патрапілі перавесьці гадзіньнік нацыянальнай гісторыі на пачатак адліку… Беларуская і ўкраінская нацыі маюць сваіх духаў-двайнікоў – Doppelgänger («тожа-беларускую» і «тожа-ўкраінскую» нацыі), і немагчыма нешта зразумець на Ўсходзе Эўропы, не зважаючы на існаваньне гэтых злавесных духаў, кланаваных імпэрыялізмам і таталітарызмам.

БЕЛАРУСЬ ЯК АБВЯРЖЭНЬНЕ КЛЯСЫЧНЫХ ТЭОРЫЯЎ

Другое пытаньне датычыцца ўзаемасувязі паміж нацыяй/нацыяналізмам і грамадзянскай супольнасьцю. Зыходным пунктам аналізу ёсьць тэза Гелнэра, згодна зь якой чальцы грамадзянскай супольнасьці непазьбежна ёсьць нацыяналістамі, бо нацыяналізм мае аднолькавае паходжаньне з грамадзянскай супольнасьцю. Др. Мацькаў пытаецца, ці ня могуць прынамсі некаторыя з разгляданых краінаў служыць прыкладам зусім процілеглай зьявы, бо сучасная нацыя і

нацыяналізм у іх паўстаў без існаваньня разьвітай грамадзянскай супольнасьці. І гэта, на ягоную думку, яшчэ адна асаблівасьць «ускраіннай» Эўропы.

Выявіўшы гэтую асаблівасьць, польска-нямецкі дасьледнік ставіць пытаньне аб значэньні нацыяналізму як для посткамуністычнай сыстэмнай трансфармацыі (увядзеньня рынку і дэмакратызацыі палітычнай сыстэмы), так і для праектаў наднацыянальнай інтэграцыі. Прынята лічыць, што нацыяналізм нясе найбольшую пагрозу для гэтых абодвух праектаў і адной з асноўных прычынаў сёньняшняга заняпаду Ўсходняй Эўропы. Гэта др. Мацькаў мяркуе абвергнуць узорамі разьвіцьця Беларусі і Ўкраіны – яскравымі прыкладамі правалу спробаў сыстэмнай трансфармацыі і наднацыянальнай інтэграцыі, – адначасова дэманструючы слабаразьвіты нацыяналізм і незакончанасьць працэсу нацыятварэньня.

Др. Мацькаў кажа пра сваё жаданьне, каб ягоная кніжка *«правакацыйна адрозьнівалася ад той плыні паліталягічных дасьледаваньняў працэсаў грамадзкіх пераўтварэньняў, у якіх выказваецца перакананьне, што спэкуляваць пра інстытуцыяналізацыю посткамуністычных сыстэмаў можна, не зважаючы на культурныя асаблівасьці разгляданых грамадзтваў, бо, нібыта, посьпехі ці паразы посткамуністычнай дэмакратызацыі вынікаюць выключна з эфэктыўнасьці палітычных альбо канстытуцыйных пераўтварэньняў»*. Ён мерыцца давесьці, што разбурэньне камуністычнага таталітарызму і ягонай спадчыны раўназначнае стварэньню грамадзянскай супольнасьці ды дэмакратыі толькі ў тых грамадзтвах, у якіх камунізм разглядаецца як нешта чужое і навязанае.

У іншым жа разе менавіта грамадзянская супольнасьць, а не камунізм, небеспадстаўна ўважаецца за чужую брыдоту, накіраваную супраць мясцовай нацыянальнай культурнай традыцыі. *«Сёньня да гэткіх грамадзтваў належаць Беларусь і Ўкраіна, што яшчэ некалькі стагодзьдзяў таму трапілі пад усёабсяжны ўплыў Расеі, якая пакутуе ад гіпэртрафіі ды неэфэктыўнасьці сваёй дзяржавы».*

ІНТЭГРАЦЫЯ ПРАЗ УМАЦАВАНЬНЕ НАЦЫЯНАЛІЗМУ
Разгляданая тут кніжка выросла зь фінансаванага фундацыяй «Фольксваген» у 1999–2002 гг. праекту дасьледаваньня магчымасьцяў пашырэньня ЭЗ на ўсход «Multiplikatoren der Westintegration. Belarus, Litauen, Polen und die Ukraine im Vergleich». У гэтым кантэксьце невыпадкова, што як яшчэ адна адметнасьць Усходняй Эўропы тут падаецца сьцьверджаньне, што «разьвіцьцё нацыяналізму ёсьць незаменнай (але не дастатковай) перадумовай наднацыянальнай інтэграцыі». Гэта датычыцца часткова і грамадзтваў краінаў ЭЗ:

Заходне- і цэнтральнаэўрапейцы ня змогуць па-сапраўднаму зразумець ні саміх сябе, ні праблемаў усходнеэўрапейцаў датуль, пакуль баяцца прызнаць свой уласны нацыяналізм. І калі яны надалей будуць спрабаваць вучыць усходнеэўрапейцаў, як пераадолець нацыяналізм – то бок, таму, што яны самі не патрапілі зрабіць у сябе дома – дык гэта проста несумленна зь іх боку. Ад нацыяў ЭЗ пра «пераадольваньне нацыяналізму» можна даведацца прыкладна тое самае, што і пра іх эўрапейскую ідэнтычнасьць, а менавіта, што ні таго, ні другога ў іх у дастатковай меры не назіраецца і што гэтыя нацыі нічога не баяцца больш, чымся страты свайго дзяржаўнага сувэрэнітэту.

Пры тым др. Мацькаў адзначае, што большасьць беларусаў ды ўкраінцаў шмат менш прывязаныя да сваіх дзяржаваў, хаця гэта яшчэ не азначае аўтаматычнай гатовасьці да актыўнай падтрымкі інтэграцыі з Эўразьвязам ці Расеяй. Гэткае стрыманае стаўленьне хутчэй ужо сьведчыць пра брак адчуваньня агульнанацыянальнай салідарнасьці і нацыянальных інтарэсаў:

Гэтая нястача дужа падобная на тую нястачу разуменьня супольных інтарэсаў, што пануе ў краінах ЭЗ. Як сёньняшнія нацыі ЭЗ не выказваюць вялікай ахвоты дэмакратызаваць Зьвяз ды стварыць у ім эфэктыўныя структуры ўлады, што далі б рады адказаць на выклікі сучаснасьці, гэтак і «незавершаныя» нацыі Ўсходняй Эўропы ніяк ня могуць збудаваць эфэктыўных нацыянальных дзяржаваў.

Вось толькі ці сапраўды малаэфэктыўная беларуская дзяржава? Яна ненацыянальная/недэмакратычная/нелібэральная і г. д., але вось акурат у неэфэктыўнасьці яе абвінавачваць няварта. Іншая справа, куды накіраваная гэтая эфэктыўнасьць і чаго яна нам каштуе.

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ ДЫ ЭЎРАЗЬВЯЗ

Дзьве з трох асноўных тэмаў кніжкі («прымардыялізм альбо канструктывізм» ды «нацыяналізм і грамадзянская супольнасьць»), як прызнае сам аўтар, былі навеяныя, прынамсі часткова, дасьледаваньнямі Гелнэра. Тэма наднацыянальнай інтэграцыі рэгіёну Ўсходняй Эўропы больш аўтарская.

Пад наднацыянальнай інтэграцыяй тут разумеецца эўраінтэграцыя, і таму кніжка нібыта мусіла б абудзіць эўранадзеі і эўрааптымізм. Чаго я зрэшты і спадзяваўся, але так і не зразумеў, чаму мы мусім інтэгравацца і якія прычыны дзеля таго існуюць. Эўраінтэграцыю Ежы Мацькаў, як і бальшыня нашай палітычнай эліты, падае як нешта натуральнае, што не патрабуе жадных доказаў на сваю карысьць.

Заклік сп. Мацькава да прызнаньня эўрапейцамі іх нацыяналізму фактычна ёсьць заклікам да *«Realpolitik»*. У гэтым кантэксьце цікава выглядае тэма яго дасьледаваньняў інтэграцыі, якая добра кладзецца ў шэраг кніжак, накіраваных на «засваеньне-прысваеньне Ўсходу». Ён, як прадстаўнік Захаду, вывучае магчымасьць пераўладкаваньня ўсходніх абшараў Эўропы і іх далучэньня да Захаду (дзеля «эўраінтэграцыі»). Тут ужо любы эўрааптыміст схопіцца за галаву ад пэрвэрсіі ідэі эўрапейскай інтэграцыі, бо інтэграцыя – гэта аніяк не ўсталяваньне дамінацыі і кантролю!

Узаемасувязь ведаў і ўлады аналізаваў быў Мішэль Фуко, а Эдвард Саід выкарыстаў яе для разгляду «*арыенталізму*» – складанага дыскурсу заходніх прэтэнзіяў на ўладу/кантроль над Усходам. У часе абгрунтаваньня гэтай прэтэнзіі Ўсход, па-

першае, ператвараецца ў tabula rasa (успрымаецца як такі сабе геаграфічны панятак). Па-другое, ён апынаецца канструкцыяй, створанай пры ўдзеле сыстэмы суарганізаваных дыскурсаў.

Саід таксама выкарыстаў зробленыя Антоніё Грамшы распрацоўкі панятку *гегемоніі*. Як адныя вобразы Ўсходу пачынаюць дамінаваць над іншымі? Гэта адбываецца не праз грубы і прасталінейны ідэалягічны дыктат. Наадварот, чым больш трывала дамінуе пэўная ідэя, тым больш няяўна і незаўважна гэта робіцца. Дамінуючая ідэя ўспрымаецца па змоўчаньні, выступаючы ў якасьці здабытку штодзённага здаровага глузду, калектыўнага пагадненьня, што ўспрымаецца безь пярэчаньня – накшталт «аб'ектыўнай і непазьбежнай інтэграцыі» – поўнай процілегласьці самога панятку інтэграцыі.

Супраціўляцца ж усяму, што ёсьць здабыткам гэткай артадоксіі (якая ня толькі ўмацоўвае ўладу, але і сама ёсьць яе формай), можна, толькі зразумеўшы любы канкрэтны комплекс ідэяў – якім зьяўляецца і арыенталісцкая ідэя Ўсходу – у якасьці гістарычнага ўтварэньня канкрэтных суадносінаў канцэптуальных пабудоваў, розных як з пункту гледжаньня працягласьці свайго існаваньня, так і з пункту гледжаньня асаблівасьцяў свайго паходжаньня.

Некалі Эдвард Саід, пішучы пра франка-брытанскі арыенталізм у дачыненьні да арабска-мусульманскай цывілізацыі, казаў пра слабасьць нямецкага арыенталізму. Але, здаецца, Саід, заўважаючы спачатку, што арыенталізм як каляніяльны дыскурс не абмяжоўваецца франка-брытанскімі ўяўленьнямі наконт арабска-мусульманскага сьвету, урэшце сам у запале зацятай спрэчкі апынуўся ў пастцы. У кожнай больш-менш разьвітай заходняй ці квазізаходняй краіны паўстаў свой арыенталізм, характэрны для гэтай нацыі, што здолела заснаваць хоць невялікую імпэрскую традыцыю. Толькі арыенты былі розныя.

У немцаў быў свой арыенталізм, які займаўся іх уласным Арыентам. Бэрліну не далі доўга паганяцца за афрыканскімі калёніямі. У яго была Ўсходняя Эўропа, якую і належала засвойваць. Задача застаецца актуальнай і цяпер. Зрэшты ня будзьма вінаваціць яго, бо кожная нацыя схільная да таго ж. У

тым ліку нашыя суседзі палякі, што таксама «засвойвалі-прысвойвалі» Ўсход, і ў чыё поле зроку Беларусь трапляла шмат часьцей у параўнаньні зь немцамі. Таму нават цяжка сказаць, куды залічыць дасьледаваньне др. Мацькава – да польскай ці да нямецкай традыцыі арыенталізму…

Не хацелася б, каб мяне лічылі праціўнікам эўраінтэграцыі. Эўразьвяз стаў пасьпяховым праектам дзякуючы сваёй узважанасьці, узважанасьць акурат і ёсьць сутнасьцю ідэі інтэграцыі і задзіночаньня Эўропы. Ён пачынаўся ў тым ліку і зь пераадоленьня шматлікіх формаў культурнага імпэрыялізму (праяву якога з брытанска-французскага боку ў дачыненьні да арабаў Эдвард Саід назваў арыенталізмам), напрыклад, французскага ўспрыманьня сваіх усходніх суседзяў як «гунаў» ды нашчадкаў Атылы.

Калі цьвяроза зірнуць на рэчы, як заклікае сп. Мацькаў, давядзецца прызнаць, што многія рэчы ў галіне дэмакратызацыі ёсьць толькі праявамі рэальнай палітыкі, што арыенталізм – гэта ня нешта далёка-экзатычнае пра арабаў, а зусім нашае, тое, з чым мы працягваем сутыкацца ў эўрапейскім друку. Абураючыся з кожнай прыватнай праявы дзіўных эўрапейскіх уяўленьняў наконт Беларусі, мы мусім рабіць высновы і бачыць за дрэвамі лес. Яны ўяўляюць і ведаюць тое, што ім трэба.

Галоўная віна – за намі. Бо зьява гэтая магчымая толькі пры нашай маўклівай згодзе ды інтэлектуальным гультайстве. Калі мы самі не займаемся вызначэньнем уласнага лёсу, ім пачынае займацца фундацыя «Фольксвагену»… І добра яшчэ, што гэтыя распрацоўкі не пераўтвараюцца ў нямецкі (польскі/французскі/расейскі ці яшчэ чый заўгодна) маналёг на тэму ўладкаваньня Ўсходу.
[image]
[image]

Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

крытыка [image]2005

"да Зыкасту"

паэмыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Вольф Рубінчык Тупікі і выйсці грамадазнаўцаў

ВОЛЬФ РУБІНЧЫК сталы аўтар «ARCHE».

Кузнецов Н. В. Коммунистическая идеология: истоки, попытка утверждения. – Минск: ИООО «Право и экономика», 2004. – 108 с.

Буховец О. г. Изучение национализма в Европе и Евразии: новые аспекты. – Москва: Институт Европы РАН – издательство «ОГНИ», 2004. – 98 с.

На пачатку 1990-х гг. аўтары дысертацый пра ролю кампартыі ў развіцці адукацыі, сельскай гаспадаркі і г.д. засумавалі, назіраючы, як тамы правадыроў здаюцца ў макулатуру або прадаюцца за медны шэлег у букіністычных кнігарнях. Забарона кампартыі, развал Савецкага Саюза прымушалі іх шукаць новых тэмаў для даследаванняў або перакваліфікоўвацца ў палітолагаў. Прарывы расійскіх камуністаў у Думу 1993 г., адносны поспех Зюганава на прэзідэнцкіх выбарах 1996 г., паспяховае працаўладкаванне ў Беларусі асоб кшталту Малафеева, Чыкіна і Антановіча надалі, аднак, бадзёрасці такім даследчыкам. Новы ідэалагічны курс запатрабаваў ад іх свайго ўнёску ў «навуковую ідэалогію», балазе ён быў заяўлены як ўсёахопны – у ім мусілі спалучацца ідэі камунізму, лібералізму, кансерватызму.

Уражанне спробы рэабілітавання камуністычнай ідэалогіі – задачы мажлівай, але слаба дапасаванай да заяўленай навуковасці – узнікае з першых жа старонак кнігі Кузняцова. З анатацыі ўжо вынікае, што аўтар скажа слова ў абарону ідэалогіі, «некалі бясспрэчнай, а сёння гнанай і паўсюдна адданай нястрымнаму цкаванню» (? – **В. Р.**).

Яе карані, на яго думку, ляжаць у творах утапістаў – і гэта адзін з нямногіх тэзісаў, які не выклікае спрэчак. Аўтар спачувальна піша пра Томаса Мора, Тамаза Кампанелу і Роберта Оўэна, адначасова крытыкуючы іх (як і дзекабрыстаў з народнікамі) за «схаластызм» і адарванасць ад народа. У савецкі час утапізму супрацьстаўся б сапраўдны навуковы камунізм – творы Маркса-Энгельса-Леніна. Але аўтара не здавальняюць напоўніцу і класікі: Маркс і Энгельс жадалі аслаблення Расіі, а Ленін аплёўваў апошняга расійскага цара і яго родзічаў. І ўсё ж гэтыя культавыя постаці былі «анёламі» ў параўнанні са Сталіным, Хрушчовым і Брэжневым: першы вінаваты ў рэпрэсіях, другі – у папулізме і верхаглядстве, трэці – у гультайстве, чацвёрты – у бязвольнасці. «Пераражэнец» Ельцын увогуле заслужыў эпітэты, больш адпаведныя для лаянкі: «бузацёр, дэмагог, узурпатар улады». Здаецца, адзін Андропаў карыстаецца тут павагай, прычына якой у відавочным падабенстве захадаў А. Лукашэнкі для «навядзення дысцыпліны» з андропаўскімі…

Аўтар разглядае рэалізацыю камуністычных ідэй толькі ў СССР, не закранаючы сур'ёзна ні Кітай, ні Кубу, ні еўракамунізм, таму ў чытача часам складаецца ўражанне, што ён чытае публіцыстыку часоў перабудовы з яе перламі накшталт «ёсць меркаванне, што не будзь рэпрэсій 1937 г., вайны можна было б пазбегнуць». Камуністычная практыка на адной шостай частцы сушы ў параўнанні з «чыстай» ідэяй камунізму паўстае як серыя правалаў і падзенняў. Сама крытыка (якой бляклай яна выглядае ў параўнанні з сухімі фактамі, пералічанымі, прыкладам, у «Чорнай кнізе камунізму»!) прызначана адно для таго, каб атрымаць карт-бланш на вядзенне агітацыі і прапаганды. Тактыка нібы запазычаная з «Міфалогій» Р. Барта: прыватная шкода ад таго ці іншага класавага інстытута прызнаецца, каб замаскаваць галоўнае зло. Асобныя недахопы

падкрэсліваюцца, каб паказаць, што рэальнага камунізму ў СССР не было. (Пра такога кшталту хітрыкі яшчэ 25 гадоў таму іранічна пісаў А. Зіноўеў: «усе дэфекты рэальнага жыцця ў камуністычных краінах можна аднесці на рахунак таго, што яшчэ не дасягнулі поўнага камунізму. Пачакайце, маўляў, пабудуем поўны, тады ніякіх дэфектаў не будзе. А пакуль – цярпіце».)

Гэтая кніга поўная звыклых заклёнаў і маральных пажаданняў: «кожны раз, калі ліберальныя, кансерватыўныя і іншыя мадэлі развіцця ў шэрагу краін будуць прыводзіць дзяржавы да тупіка сацыяльна-эканамічных адносін, да паралічу палітычнага, культурна-духоўнага паралічу, грамадства будзе звяртацца да камуністычнай ідэалогіі…». Дапушчэнні «што было б, калі б…» тут усцяж. Гісторыя не мае ўмоўнага ладу, і таму ідэолагі *ipso facto* вымушаны ставіць эксперыменты не толькі над будучыняй, але і над мінулым… Камунізм з яго «гістарычна-прыцягальнымі вытокамі высокай духоўнасці, справядлівасці, узаемадапамогі і братэрства» застаецца непераможным, а ў такім разе мінуўшчыну можна і перайграць. Аптымізм навейвае прароцтва Сен-Сімона: «Залаты век чалавецтва не ззаду нас, а ўперадзе нас», галоўнае – не застацца без «выразна сфармуляванай ідэалогіі», «не стаць бяскрылай птушкай, што лунае над безданню». Цяперашні беларускі шлях развіцця «дасць яркія прыклады рашэння народам сваіх праблем, дасягнення вялікіх мэтаў», зарукай чаго празарлівасць правадыра, спасылкі на якога адкрываюць і закрываюць кніжку.

Гэтая публікацыя ўяўляе сабой мяшанку даўно вядомых ісцін, лозунгаў, урыўкаў з газетных артыкулаў, тэндэнцыёзна падабраных гістарычных тэкстаў ды сацыялагічных даследаванняў. Стылёвы разнабой, фактычныя памылкі (на с. 19 Рыгор Гершуні пераназваны ў «Андрэя», Азеф прылічаны да народавольцаў 1880-х гг., на с. 84 Хасбулатаў і Руцкі сталі членамі ГКЧП, на с. 86 «Советская Белоруссия» пераблытана з «Белорусской деловой газетой») дапаўняюць сумную карціну. Тлумачэннем – але не апраўданнем – можа служыць хіба тое, што кніга выдадзена ў аўтарскай рэдакцыі, але тыя, хто чытаў рукапіс, не маглі не заўважыць прынамсі недарэчнасці анекдотаў пра Хрушчова ці Брэжнева. Спасылак на іх крыніцы,

як і на большасць найбольш контраверсійных наратываў пра найноўшую гісторыю, няма. Мабыць, і рэцэнзентаў др.Бажанава і кафедру сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Бабруйскага філіяла БДЭУ апанавалі ўсім вядомыя млявасць і абыякавасць.

* * *

На тле падобных опусаў праца прафесара БДЭУ Алега Бухаўца выглядае больш навукова, хоць пазбавіцца ідэалагічных забабонаў не здолеў і ён.

Ядро кнігі складаюць два даволі адрозныя зместам раздзелы: «Нацыяналізм канца XX – пачатку XXI ст. у Еўропе і экс-савецкай Еўразіі» і «Гуманітарная веда і нацыяналізм». Трэці раздзел, «Нацыязнаўства ў постсавецкай Еўразіі і Цэнтральна-Усходняй Еўропе», па сутнасці, ёсць працягам другога.

У першым раздзеле разглядаюцца пераважна нацыяналістычныя рухі і іх інтэрпрэтацыі ў краінах Усходняй, Цэнтральнай і Заходняй Еўропы (у сферы ўплыву Еўрапейскага Саюза), у другой і трэцяй – становішча ў краінах былога СССР і ўплыў нацыяналізму на гістарыязнаўства ў Расіі, Украіне і Узбекістане. Аўтар цікавіцца перадусім сферай адукацыі, а канкрэтна – адлюстраваннем пэўных гістарычных падзей і постацяў у падручніках.

Брашура, пабудаваная на шырокім цытаванні заходніх і расійскіх даследчыкаў нацыяналізму і этнанацыяналізму (дзеля размежавання паняццяў мы б назвалі апошні «этнізмам» ці «этніцызмам»), часам выглядае як рэферат. Аднак пазіцыя аўтара дастаткова акрэслена, ён мае ўласны погляд на стасавальнасць заходніх канцэпцый што да расійскай сітуацыі.

Найважнейшае месца займае асэнсаванне вядомых работ Б. Андэрсана, Э. Гелнера, Э. Сміта, Э. Хобсбаўма, У. Альтэрмата. Менавіта кніга апошняга «Этнанацыяналізм у Еўропе» дала Бухаўцу падставу для гульні з тэрмінамі «этнічнае» і «нацыянальнае». Найчасцей тут яны выкарыстоўваюцца як сінонімы, а сам нацыяналізм уважаецца за крыніцу

дэструктыўнасці і этнічных канфліктаў, хаця не выключаецца і яго станоўчая роля ў мабілізацыі мас для пабудовы дэмакратычнага грамадства. Як піша аўтар, разам з «мёдам» грамадзянскай свабоды ў судзіне нацыяналізму аказалася больш чым дастаткова і дзёгцю – войн, ксенафобіі.

Далей ён спрабуе высветліць, ці сціхае «нацыяналістычная хваля» з паскарэннем працэсу еўрапейскай інтэграцыі. На яго думку, узмацненне «еўрапейскай ідэнтычнасці» не толькі «цывілізуе» нацыі, але і стымулюе рост этнічнай свядомасці «перыферыйных» народаў, бо цяпер карсіканцы, брэтонцы etc. маюць магчымасць дабівацца падтрымкі сваіх патрабаванняў «цераз галаву» нацыянальных урадаў. Аналагічныя працэсы прадказваюцца аўтарам і ва Украіне, у Малдове, дзяржавах Балтыі, іншых краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, прычым увага акцэнтуецца на выбухах этнічных канфліктаў у 2004 г. (у Славакіі і Косаве). Зрэшты, выказваецца і асцярожны аптымізм: «пры тым, што… этнакультурнае канфліктнае поле аб'ектыўна павінна… яшчэ больш пашырыцца, яго рэсурсаў будзе яўна недастаткова, каб блакаваць дзеянне фактараў еўрапейскай інтэграцыі».

Аўтару можна закінуць нежаданне дакладна вызначыць паняцце «нацыяналізм». Хіба што аднойчы яно трактуецца як «сакральнае стаўленне да нацыі» (пры гэтым няясна, а як тады трактуецца нацыя). Гэтая аперацыя замоўчвання дазваляе спрэс змешваць «нацыяналізм» з «этнанацыяналізмам», зводзячы, урэшце, нацыянальнае да «этнічнага», то бок да ірацыянальнага. Нацыяналісты тут паслядоўна малююцца як «этнічныя прадпрымальнікі», якія ірвуцца паманіпуляваць этнічнай свядомасцю дзеля сваіх карыслівых мэтаў. Слабое месца даследавання – у рэдукаванні нацыяналістычных рухаў да «варварства», якое здымаецца «еўрачысткай». Усім нацыяналізмам (вялікарасійскаму і інш.) нібыта ўласцівы «пошук ворагаў», а сучасныя «еўрапейскія нацыі» негатыўна ўспрымаюць нацыяналізм – і «этнакультурны», і «палітычны». Тэкст становіцца папросту галаслоўным, набывае выразны ідэалагічны характар: магчыма, не абышлося тут без уплыву беларускіх рэалій[1].

Апрача гэтага, А. Бухавец крытыкуе віктымісцкі дыскурс гісторыі, які здымае са «сваіх» («народу», нацыі») усякую адказнасць, пераносячы яе на іншых («прыгнятальнікаў», «заваёўнікаў») і дрымучы эсэнцыялізм і прымардыялізм (ідэю адвечным існаванні нацый, першасных адносна індывідаў). Ён наводзіць на думку, што аўтар атаясамлівае сябе з канструктывістамі, «пазнавальныя практыкі якіх, бясспрэчна, дамінуюць у сусветнай навуковай літаратуры».

З Бухаўцовай канцэпцыі вынікае, што як да Расіі – сфармаванай і па-свойму мадэрнізаванай нацыі – так і да Беларусі імпартаваныя з «Захаду» канцэпцыі нацыятварэння трэба ўжываць з вялікай асцярогай. Іх тлумачальная вартасць часта пакідае жадаць лепшага, бо яны пісаліся *post factum*, а таму малапрыдатныя для прагназавання этнічных і нацыянальных працэсаў у мадэрнізаваных краінах накшталт Расіі, аўтарам Беларусі. Аўтар з’едліва заўважае, што Б. Андэрсан і Э. Хобсбаўм трапілі пальцам у неба наконадні з’яўлення новых незалежных дзяржаў на прасторах СССР.

Адным з найбольш цікавым фрагментаў кнігі ёсць палеміка з палітолагам В. Чарновым, які станоўча ацэньвае місію «грамадзянскага» нацыяналізму ў Беларусі, «неабходнага для запуску механізму дэмакратызацыі». (І для многіх аўтараў «ARCHE» Беларусь ёсць нацыянальным праектам, які не хутка будзе завершаны.) Нібы адказваючы ім, А. Бухавец спасылаецца на апытанні канца 2002 – пачатку 2003 гг., паводле якіх беларусы не жадаюць бачыць сябе расіянамі – кваліфікаваная большасць, 69–71 %, выказваецца за саюз з Расіяй як за «Саюз незалежных дзяржаў». Такім чынам, фармаванне беларускай грамадзянска-палітычнай нацыі з гледзішча аўтара ўжо адбылося. Усё-такі дапускаючы наяўнасць адрозненняў паміж этнакультурным і палітычным нацыяналізмам, аўтар падкрэслівае небяспеку, якую нясе ў сабе спадзеў на мірны «грамадзянскі» нацыяналізм: «грубасць сацыяльнай практыкі адсоўвае ўбок усе «элегантныя тэарэтычныя схемы», пераносячы міфалагічныя вобразы свету ў падручнікі. Тамака нацыяналістычныя каштоўнасці лёгка перарастаюць у «нездаровы мілітарысцкі патрыятызм, шавінізм і ксенафобію»,

[1] Рудкая І. Праблема «сіманкультычнай» нацыі ў працах А. Луцкевіча // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 1. – С. 2–8.

без ясных крытэрыяў «нацыяналізму» і «нацыяналістаў». Варта адзначыць, што і асобным расіянам і ўкраінцам кар’ераварыць названыя паняцці ў ярлыкі. Гл., напрыклад, «слоўнік-даведнік»: Джунусов М. Национализм. – М.: Славянский диалог, 1998, дзе нацыяналізм абвяшчаецца «палітычнай і маральнай псеўдакаштоўнасцю» (с. 171), «заўседы небяспечнай з явай» (с. 156). У

што, вядома, не можа не адбіцца негатыўна на свядомасці «дзесяткаў мільёнаў школьнікаў». Добра, што крытычнае стаўленне вытрымліваецца не толькі да ўкраінскіх, але і да расійскіх падручнікаў гісторыі, але і да расійскіх СМІ, напрыклад, гісторыя Каўказа фактычна выключана з гісторыі Расіі. Сітуацыю маглі б змяніць у лепшы бок «канвенцыі ненападзе» паміж аўтарамі падручнікаў з розных краін (падобныя дамоўленасці былі дасягнутыя паміж польскімі і літоўскімі гісторыкамі). Аднак, падобна, сам аўтар ілюзій наконт такіх канвенцый не мае і завяршае сваю работу аб нацыяналізме. Гл.: сумнаватай спасылкай на Э. Хобсбаўма: «нічога добрага ў гэтага не выйдзе, але і вечна гэтак працягвацца не можа».

Многія выказаныя ў брашуры ідэі, як мінімум, дыскусійныя. Так, беларускім гісторыкам (напрыклад, У. Арлову) прыпісаны намер «дапячы» Расіі, а тэндэнцыі ў афіцыйнай беларускай гістарыяграфіі, дзе «антырасійскі настрой» ёсць падставай для адмовы зацвердзіць ужо абароненую дысертацыю, пакінутыя па-за ўвагай. Ідэя «адбудовы тэорыі «знізу» замест «механічнага праектавання «заходняга погляду» на незаходнія арэалы «зверху» на першы погляд здаецца шматабяцальнай. Але ці не выглядае яна на вынаход ровару?

Паміж працамі двух дактароў гістарычных навук нямала супольнага: хаця б тое, што ў фокус абедзвюх трапляе сучасная палітыка Беларусі. Яднае кніжкі і грыф «навуковае выданне», і сціплы наклад (75 асобнікаў – твор Кузняцова, 200 – Бухаўца). Аднак падыходы навукоўцаў моцна розняцца. М. Кузняцоў схіляецца да рэстаўрацыі прыёмаў савецкіх ідэолагаў, А. Бухавец спрабуе мысліць крытычна. Пра яго не скажаш, што ён ідзе тупіковым шляхам сучаснага сервільнага грамадазнаўства.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (36) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

Мікола Крывальцэвіч
Дрот у дрэве

МІКОЛА КРЫВАЛЬЦЭВІЧ (нар. у 1958 г. на Любаншчыне) – археоляг. Апошняя кніга – «археалягічныя адкрыцьці сьвету» (2000).

Пад плотам школы-інтэрната, дзе я вучыўся восем гадоў, расла ліпа, якую ў свой час нехта абвязаў тоўстым дротам. Дрот быў такі тоўсты, што дрэва так і не здолела яго разарваць. З года ў год, як разрасталася ліпа, драціны ўрэзваліся ў драўніну. Я вельмі часта прыходзіў да гэтага дрэва, шкадуючы яго. Маіх дзіцячых сілаў не хапала, каб раскруціць тоўсты і ржавы жалезны дрот, вызваліць дрэва ад пакутаў...

Мне было крыху больш за два гады, калі памерла мая маці. У першым класе школы-інтэрната я апынуўся ў 1965-м. Нязвыклае для вясковага маўлення замежнае слова «інтэрнат» дзядзькі і цёткі перайначвалі на «сіроцкі дом». «Здалі Міколку ў сіроцкі дом», – казалі яны, шкадуючы мяне. У інтэрнатах прайшлі ўсе дзесяць гадоў майго школьніцтва.

Школы-інтэрнаты як адмысловыя навучальныя ўстановы з васьмі-, а затым і дзесяцігадовым тэрмінам навучання для дзяцей-сірот ці дзяцей з бедных сем’яў пачалі ствараць у колішнім Савецкім Саюзе пачынаючы з 1956 года. Школу-інтэрнат нельга блытаць з дзіцячым домам. У дзіцячы дом звычайна траплялі дзеці без абодвух бацькоў – поўныя сіроты. Інтэрнатаўцы мелі повязь з домам, вяртаючыся туды падчас вакацый. У большасці выпадкаў бацькі нават выплачвалі штомесяц невялікую суму грошай за ўтрыманне іх дзіцяці ў

інтэрнаце. Розніцу паміж намі, тымі, хто меў хоць нейкую часовую сувязь з роднымі, і дзецьмі, якія назусім згубілі сямейнае апірышча, мы адчулі на сваёй шкуры, бо час ад часу да нас у інтэрнат траплялі дзетдомаўцы. Апошнія вылучаліся незвычайнасцю паводзін, здзяйсняючы неверагодныя па нашых мерках учынкі і парушаючы звыклы лад інтэрнатаўскага жыцця. Адчай і безнадзейнасць, абмежаваны сацыяльны вопыт вельмі часта спараджалі ў іх глухі ці – наадварот – экзальтаваны пратэст.

Неяк да нас з дзіцячага дома прывезлі хлапчука, які ўжо праз колькі дзён здзівіў усю школу. Спачатку ўразіла ягоная шчодрасць. Ён прынёс вялікі папяровы мех цукерак і шчыра частаваў імі ўсіх, каго сустракаў. Назаўтра ў школьным калідоры мы ўбачылі міліцыянта. Хлапчука-дзетдомаўца павялі на следчы эксперымент у школьную канцылярыю, спрабуючы дазнацца, як ён змог адкрыць жалезны сейф. «Цвіком», – казаў той. Яму далі цвік. «Ды не такі!» – буркнуў ён. Са скрыні, якую прынёс загадчык гаспадаркі, малец выбраў патрэбны цвік, падкруціў яго абцугамі і на вачах здзіўленага дырэктара і міліцыянта адамкнуў сейф... Ён так і не давучыўся да восьмага класа, бо праз нейкі час быў накіраваны ў нейкую іншую ўстанову – ці то ў спецшколу, ці то ў нейкае спецыяльнае ПТВ. Такія высылкі ў нас праводзіліся рэгулярна, асабліва пагрозліва гучала папярэджанне накіраваць за дрэнныя паводзіны і вучобу ў ПТВ меліярацыі.

Вайна ды савецкі гвалт прывялі да знявечання аднаго з найбольш традыцыйных і ўстойлівых сацыяльных інстытутаў грамадства – сям'і. У пасляваенны час дзяцей вельмі часта гадавалі адзінокія жанчыны. Многія сем'і, асабліва ў вёсках, жылі ў страшэннай беднасці і нястачы.

Маё маленства прайшло ў палескай вёсцы, якая стаяла пасярод лесу. Калі я падрос, то стаў насіць порткі, якія падвязваліся на поясе вяровачкай. У інтэрнаце я мусіў прывыкаць да гузікаў форменнага казённага адзення. Трэба было практыкавацца колькі дзён, каб навучыцца іх хутка зашпільваць і не адставаць ад іншых. Многія мае аднакласнікі – такія ж знядоленыя дзеці-вяскоўцы – не маглі зразумець, што абсталяваныя унітазамі

прыбіральні знаходзяцца не на вуліцы, а побач са спальнямі, таму на вуліцу «да ветру» можна не бегаць. У першыя дні здаралася так, што некаторыя дзеці імчалі не на унітаз, а забягалі ў шафу, якая нагадвала ім вясковы будынак туалета.

Трапіўшы ў інтэрнат, мы нейкі час адчувалі сябе надзвычай прыгнечанымі і няшчаснымі, баючыся вымавіць слова. Дзеці, адарваныя ад звыклага асяроддзя, плакалі і маўчалі тыднямі. Некалькі тых першых вераснёўскіх тыдняў, адчуўшы сябе падманутым і кінутым, я таксама моўчкі глядзеў у вокны. Я доўга прывыкаў да сцен, якія навісалі над галавой і здаваліся мне высокімі і гнятлівымі, бо свае сем гадоў жыцця я правёў сярод дрэваў і балацін, выганаў і драўляных хатаў. У памяці раз-пораз праплывалі мае дзіцячыя прыгоды, якіх і дагэтуль не магу забыць. Вялікая чорная свіння, якая, рохкаючы, выходзіць на чорны ад бруду падворак. Каля плота на падворку сяджу я, гуляючы з лучынай у ночвах. Свіння насоўваецца на мяне і моцна кусае за руку, якой я спрабаваў яе пагладзіць... Наш каток енчыць на страсе. Ён разадраў сабе жывот, і кішкі цягнуцца за ім па зялёным моху старой страхі. Я лезу, каб выратаваць яго і падаю... Сонца, якое садзіцца за лесам, пакрывае чырванню драўляны ганак хаты, на ім ляжыць вуж. Я палохаюся і хаваюся за спадніцу маёй цёткі. «Не бойся, – кажа тая. – Вужык дабро прыносіць...» За нашымі хатамі капаюць у кар'еры гліну. Там, ля копанкі, ходзяць буслы. Я хаваюся ў густой траве і сачу за імі. Падкрадаюся да аднаго з іх, каб ухапіць за чырвоныя ногі і ўзляцець у неба. Звальваюся з адхону ў мутную ваду...

Ад першага дня ў інтэрнаце мяне акалялі зусім чужыя людзі, якія прымушалі апранаць нязвыклае адзенне і выконваць непрыемныя дзеянні. Напрыклад, распранацца дагала ў лазні, садзіцца ў таз, побач з якім стаіць дзяўчына са старэйшых класаў і палівае цябе гарачай вадой, мыліць пякучым мылам і дзярэ вяхоткай. На першым жа ўроку фізкультуры, перад якім нам выдалі шырокія чорныя шаравары, я абсікаўся, стоячы перад настаўнікам, бо пабаяўся прасіцца ў прыбіральню. Новая шчыльная тканіна і тугая гумка доўга трымала ў калашыне сцулі. Калі я на загад настаўніка рушыў да дзвярэй, то сцулі хліпалі і струменьчыкамі ліліся на свежапафарбаваную

падлогу, выклікаючы ўсеагульны рогат. Можна ўявіць сабе, якія хвіліны сораму і прыніжэння сваёй дзіцячай годнасці я тады перажыў.

Ужо ў першыя дні многія дзеці спрабавалі збегчы са школы, спадзеючыся знайсці свой дом. Абсалютна не арыентуючыся ў прасторы і пазбягаючы сустрэч з дарослымі, яны беглі не ў бок мястэчка, а ў навакольныя палі ці ў кустоўе, за якім пачыналіся поплаўныя балоты ракі Вушы. Звычайна там жа ў балотах іх лавілі пасланыя наўздагон вучні старэйшых класаў ці выхавацелі. Мокрага, бруднага і сплаканага бегуна прыводзілі ў клас, дзе выстаўлялі перад усімі і сарамацілі, папракаючы ў няўдзячнасці. «Куды ты бяжыш, што цябе чакае дома: вошы, зацірка ды бруд? Табе тут блага?» Але былі выпадкі, калі найбольш спрытныя і кемлівыя хлопцы дабіраліся да свайго дому. У такім выпадку па іх ехала выхавацелька і прывозіла ў інтэрнат, спрабуючы ў сваіх аповедах як мага страшней абмаляваць убачаную сямейную і побытавую рэчаіснасць збеглага выхаванца, каб потым папракнуць, маўляў, куды ты бяжыш, няўжо там табе будзе лепш, чым у нас?

Са сваіх мясцін мы прынеслі дыялектную беларускую мову. Як і ў маім Серадзібары, я часта, напрыклад, замест «будуць гуляць» казаў «гуляцьмуць». Наша выхавацелька, яна ж і настаўніца беларускай мовы, высмейвала маю моўную «недасканаласць», называючы яе «муццю». Яе смяшылі словы «гарэпнік» (так звычайна ў нас называлі чалавека, які працаваў, не пакладаючы рук), «паваляка» (п'яны «да пакатынку») і г. д. Найбольш кпінаў сцярпеў Берніковіч, які нарадзіўся недалёка ад Дзякавічаў, што побач з Чырвоным возерам, і прынёс з сабою мясцовую палескую гаворку («муло» замест звыклага «мыла», «буў» замест «быў» і г. д.).

Школа наша была беларуская, ды і асяроддзе, з якога мы трапілі, было беларускамоўным. Нам цяжка давалася расійская мова. Калі да нас прывозілі расійскамоўнага вучня, мы з цікавасцю прыслухоўваліся да яго маўлення і нязвыклых для нашага слыху словаў. Хлопцу, які ганарыста называў сябе «сібіраком», мы зладзілі «цёмную» толькі за тое, што той фанабэрыўся і насміхаўся над нашай мовай.

Савецкая школьная сістэма засноўвалася на канцэпцыі калектыўнага выхавання: падпарадкаванне большасці і выхаванне воляю большасці. Няўрымслівых зломвалі і прымушалі да паслухмянасці. Вельмі часта большасць нацкоўвалі на меншасць. Адну з нашых аднакласніц, якая праз сваю неахайнасць атрымала некалькі двоек, выхавацелька прымусіла прыбіраць класны пакой па-за графікам абавязковага дзяжурства. Дзяўчынка заўпарцілася, маўляў, несправядліва загадваеце, колькі дзён таму я ўжо прыбірала ў класе. У гневе педагагіца прымусіла прынесці і паставіць на падлогу таз вады. Знайшлося некалькі хлопцаў, якія на яе загад схапілі дзяўчо, аблілі вадою і цягалі па падлозе за ногі і за рукі – не хочаш, дык змусім сілай выканаць загад! Спачатку мы ашаломлена глядзелі на здзек, а затым кінуліся ратаваць дзяўчынку...

Тагачасная педагагічная канцэпцыя засноўвалася на выхаванні чалавека новага тыпу – грамадскія патрэбы вышэйшыя за асабістыя. Меркавалася, што выхаваць паўнавартаснага савецкага чалавека магла ў першую чаргу толькі дасканалая школьная сістэма. Школа-інтэрнат была ідэальным палігонам для савецкага цвічэння дзяцей, бо апошнія былі практычна пазбаўленыя ўплыву бацькоў і звыклага людскога асяроддзя. Ад рання да вечара мы былі ў руках школьных педагогаў. Не памылюся, калі адзначу, што ў нашай школе – правінцыйным местачковым інтэрнаце – выхаваўчыя праекты, якія спелі ў нетрах тагачасных педагагічных устаноў, рэалізоўваліся напоўніцу і нават звыш таго.

Ідэалагічная апрацоўка 1960-х гадоў у першую чаргу скіроўвалася на перспектывы міфалагічнай пабудовы камунізму ў СССР. Ужо ў пачатковых класах нам даводзілі, што ў 1980-х гадах мы будзем жыць пры камунізме. Тая светлая будучыня бачылася нашым выхавацелькам спажывецкім раем: крамы, у якіх ёсць усё, што табе захочацца, за тавары не трэба будзе плаціць грошы, а можна проста заходзіць і браць з паліц неабходнае (нават шакаладныя цукеркі!). Запомніўся адзін дзіўны аповед пра транспарт камуністычнага будучага: ездзіць па горадзе мы будзем на тратуарах, якія будуць самі рухацца!

Нашыя школьныя святочныя мерапрыемствы складаліся з традыцыйнага гадавога цыклу савецкіх урачыстасцяў. Напэўна, нас у меншай ступені цікавіў змест тых святкаванняў, бо дзіцячая свядомасць наўрад ці магла дапяць да сэнсу рэвалюцый, войнаў, вартасці савецкіх геніяў і герояў. З іншага боку, мала хто ўвогуле разумеў логіку тых рытуальных дзеянняў, якія даводзілася з года ў год здзяйсняць усім, у тым ліку і нам, дзецям.

Самым стандартным паводле набору асноўных кампанентаў было свята рэвалюцыі. Шэсце ў калонах дэманстрантаў нам падабалася тым, што мы апыналіся па-за школай, у мястэчку, сярод шматлікіх, у тым ліку і дураслівых, людзей. Нас доўга марынавалі перад трыбунай, і, каб нейкім чынам пабавіць час, мы лопалі адзін аднаму надзьмутыя з нагоды шэсця каляровыя шарыкі. Для гэтай мэты выкарыстоўвалі тонкія завостраныя драціны, уцягнутыя ў рукавы ці ў казыркі шапак.

На свята ў самой школе мы павінны былі рабіць бесказыркі з надпісам «Аўрора» і драўляныя стрэльбы. Кожны клас рабіўся «рэвалюцыйным атрадам» і з адпаведнай песняй ішоў уздоўж каланады ў фае, дзе былі расцягнутыя лозунгі кшталту «Вся власть Советам!». Ля калонаў і змайстраваных вогнішчаў стаялі «рэвалюцыйныя вайскоўцы», прапускаючы ў спартовую залу і наколваючы на штык паштоўкі-запрашэнні. У поўнай цемры, сцягваючы адзін з аднаго бесказыркі і поркаючы штыкамі, мы лавілі рукамі прамяні пражэктара, якія блукалі над нашымі галовамі. Затым на сцэне раздаваліся грымоты – гучны стук у тазік, які азначаў стрэл «Аўроры». Пачынаўся «літмантаж» і харавыя спевы рэвалюцыйных песень.

Неяк у класе шостым я нечакана для сябе стаў антысаветчыкам. Неспадзявана і для майго бацькі і маёй выхавацелькі я, маўляў, абразіў самую культавую ў савецкім грамадстве асобу – Леніна. Яму прысвячаліся многія рэпрадукцыі са знакамітых карцін, якія віселі ў самым доўгім калідоры, што злучаў навучальны і спальны карпусы школы. Усё было надзвычай банальна і проста: я любіў хадзіць з засунутымі ў кішэні рукамі. За такое злачынства, якое ў тыя часы лічылася праяваю хуліганістасці, нас каралі. Здаралася

нават так, што кішэні ў штанах прымушалі зашываць. Аднойчы мой думлівы настрой у тым доўгім калідоры – імправізаванай карціннай галерэі класікі – быў перарваны воклічам нашай выхавацелькі, якая патрабавала дастаць рукі з кішэняў і тым самым набыць выгляд, варты піянера і савецкага вучня. Я кіўнуў галавой у бок знакамітай карціны Бродскага, на якой Ленін стаяў, трымаючы рукі ў кішэнях чорных штаноў. «Ах, дык ты, сапляк, прыраўнаў сябе да Леніна!» – выкрыкнула выхавацелька. «Не, толькі ўзяў з яго прыклад», – не разгубіўся я ў адказ.

Гісторыя таго майго злачынства мела амаль дэтэктыўны працяг. Тая «знявага» правадыра скончылася для мяне лістом да бацькі. У лісце яго выклікалі ў школу, каб той паўздзейнічаў на мяне і выправіў мае дрэнныя паводзіны. Блакітны канверт выхавацелька дэманстратыўна на маіх вачах апусціла ў паштовую скрыню, якая вісела на сцяне школы. Сабраўшы сваіх сяброў, я зняў скрыню са сцяны, занёс у кусты парэчкі і, адкрыўшы вечка, выцягнуў дзвюма палачкамі блакітны канверт. Прачытаўшы яго, добра парагатаўшы са скаргаў, з вераю ў тое, што яны не трапяць да бацькі, мы парвалі ліст на кавалачкі і пусцілі яго па ветры.

Але ліст, яшчэ больш гнеўны і скаржлівы, трапіў да бацькі. Уся рэч у тым, што шматкі паперы ад парванага намі ліста прыбіла ветрам да сцяны школы. Іх знайшлі дзеўкі з нашага класа, якія прыбіралі раніцою тратуар. Яны, пабачыўшы знаёмы размашысты почырк, спачатку склалі кавалачкі ў адзін аркуш, а затым, даведаўшыся пра ягоны змест, паслужліва аднеслі адноўлены ліст нашай выхавацельцы.

Так, мой бацька прыязджаў з нагоды тых скаргаў. Дэманстратыўна крычаў на мяне ў настаўніцкай. Затым, калі мы засталіся з ім адны, стаў настойліва і адчайна прасіць мяне «не распускаць язык». Тады я ўпершыню даведаўся ад яго пра лёс майго дзеда Мацвея, які адседзеў у сталінскіх лагерах амаль дванаццаць гадоў, пілуючы тайгу ў Хабараўскім краі.

Фізічная праца была неабходным атрыбутам нашага жыцця, а таксама абавязковым элементам выхавання. Мы прыбіралі

амаль усе памяшканні ў школе, працавалі на школьных агародах, у цяпліцах, садзе, капалі ў калгасе бульбу. Нас настойліва знаёмілі з самымі рознымі сферамі прамысловай вытворчасці, што таксама вынікала з тагачасных канцэпцый выхавання. «Гэта ж трэба, у гарадах некаторыя дзеці не ведаюць, як хлеб расце!» – у павучальных гутарках казалі нам выхавацелі.

На адну з першых выхаваўчых экскурсій – паход на мясцовую птушкаферму – нас павялі ў трэцім класе. Мяне больш за ўсё ўразіла гара здохлых куранят, а таксама смурод, ад якога хацелася выскачыць на свежае паветра. Аднаго разу на крытай брызентам школьнай машыне нас павезлі на мясакамбінат. Па дарозе мы марылі наесціся каўбасаў. Работнікі мясакамбіната сумленна паказалі нам увесь працэс вырабу каўбасы. Толькі некалькі нашых хлопцаў здолелі дагледзець канвеер па забойстве свіней і злупванні шкур. Горы мяса і костак, з якіх рабілі гузікі, стагі шкур, нясцерпны смурод, ад якога ледзь не вanітавала, уразілі нас да такой ступені, што на падвешаныя каўбасы мы ўжо не маглі глядзець. Дабрадушныя цётачкі сунулі кожнаму з нас па вялікім скрутку, маўляў, падсілкуйцеся, бедныя сіроткі. Пачуццё смуродлівага паху доўга не пакідала нас. Мы адкрылі брызент у машыне. Убачыўшы дзядзьку, які няспешна ехаў на ровары па шашы, нехта шпурнуў яму колькі кілбасін. Праз нейкі час мы абдарылі каўбасамі амаль усіх спадарожных, якія траплялiся нам па дарозе да мястэчка.

У нас былі свае гульні, якія мы часта прыдумлялі і якія рабіліся адмысловым працягам нашага ўспрыняцця рэчаіснасці: тэатралізацыяй будзённасці, дзіцячым трагікамічным фарсам.

У трэцім класе памерла адна з нашых аднакласніц – Хрысця. У яе мамы было шмат дзяцей. Яе старэйшыя браты таксама вучыліся ў нашай школе. На пахаванне выхавацелька павяла ўвесь наш клас. Пайшлі некаторыя настаўнікі. Ісці было недалёка – на ўскраіну мястэчка. Глядзець на памерлую Хрысцю я, як і многія іншыя мае аднакласнікі, адмовіўся. Мы моўчкі стаялі каля хаты, уражаныя тым, як з сенцаў, у якіх не было падлогі, выносілі самлелую Хрысціну маці і савалі ёй у

рот стальную лыжку з вадой… Усе плакалі, у тым ліку і нашы настаўнікі, калі ішлі ўслед за труной.

Я не магу зразумець чаму, але, памятаючы пахаванне Хрысці, праз нейкі час мы пачалі гуляць у хаўтуры! Звычайна пахавальнае шэсце мы наладжвалі пасля сварак з нашымі настаўнікамі. Уцякаючы са школы, мы кралі чорны халат адной з нашых прыбіральшчыц, бралі драўляную лесвіцу. Нехта згаджаўся на нейкі час пабыць нябожчыкам. Яго неслі, паклаўшы на драбіны. Наперадзе ішоў хлопец у чорным халаце, размахваючы дымлівай бляшанкай, за нябожчыкам выстройвалася працэсія, якая накіроўвалася да школьнага двара пад вокны настаўніцкага пакоя, спяваючы знаёмыя нам піянерскія песні ў запаволеным тэмпе. Шэсце працягвалася да тога моманту, пакуль з дзвярэй школы не выбягаў хто-небудзь з настаўнікаў…

Напэўна, гэта быў адзін з варыянтаў дзіцячай помсты дарослым: мы памяталі іх слёзы на Хрысціным пахаванні, а таму дамагаліся праз тэатралізаваныя хаўтуры нагадаць ім пра іх слабасць?

У двары нашай школы знаходзілася геаграфічная пляцоўка. Акрамя флюгераў і дажджамераў на ёй былі змайстраваныя горы. На пляцоўку, а тым больш на горы, хадзіць было нельга. Вядома, што дзецям хочацца туды, дзе ім забаронена быць. Неяк надвячоркам нам удалося збегчы з-пад апекі сваёй выхавацелькі і праз дзірку пад плотам пранікнуць на геаграфічную пляцоўку. Мы падкапалі пад адной з найвышэйшых гор нару, нацягалі туды сухой травы, паперы і палак, прабілі ў вяршыні адтуліну. Калі праз яе пацягнуўся дым, мы кінуліся пад вокны настаўніцкай, тыкаючы пальцам на вогненную гару і з радасцю і вялікім задавальненнем ад здзейсненага ўчынку з рогатам паведамілі настаўнікам, што «вулкан прачнуўся».

Сваю адмоўную энергію і раззлаванасць мы вельмі часта скіроўвалі менавіта на выхавацеляў і настаўнікаў. Нашкодзіць і тым самым выклікаць іх злосць – гульня, якая нам здавалася сапраўдным сур’ёзным заняткам. Часам такое супрацьстаянне нагадвала нам вайну, у якой мы лічылі сябе сапраўднымі

героямі – барацьбітамі за справядлівасць, мсціўцамі за крыўду. Варта ў сваё апраўданне дадаць, што многія педагогі ў той «вайне» не спрыялі мірнаму вырашэнню канфліктаў, а ўцягваліся ў перманентную барацьбу, атрымліваючы ад яе асалоду, бо ведалі, што ніколі ў ёй не прайграюць.

Я добра памятаю аднаго з настаўнікаў, які меў здольнасць своечасова адчуць выспяванне сярод дзяцей настрою на чарговую «ваенную аперацыю». Паміж сабою мы звалі яго Шпікам, бо ён умеў заўсёды апынуцца ў патрэбны час у патрэбным месцы. Віжаванне за намі было, бадай, ягоным хобі, ад якога ён атрымліваў асалоду. У сваім асабістым жыцці ён, напэўна, быў няшчасны чалавек, бо хварэў на цяжкую і невылечную хваробу. Аднойчы мы сталі сведкамі эпілептычнага ўдару, які звaліў яго на лесвіцы і прымусіў біцца ў страшэнных канвульсіях з пенай у роце. Пасля згаданага здарэння нам стала шкада Шпіка. У нас адпала жаданне помсціць яму. Ды і сам ён пасля таго выпадку зніякавеў.

Аповеды пра тайных агентаў і выведку карысталіся ў тыя часы вялікай папулярнасцю. Штучная актуальнасць тэмы вынікала з паўсядзённага нагнятання ваеннай істэрыі і небяспекі ад «варожага капіталістычнага акружэння». Лічылася, што людзей з «органаў» трэба шанаваць. Аднойчы да нас прыйшоў новы настаўнік. На нейкі час ён стаў нашым выхавацелем. Ён быў вялікім маўчуном. Ажываў толькі ўвечары, калі збіраў нас у альтанцы і ў цемры зачароўваў, заварожваў нас эмацыйнымі гісторыямі пра самых знакамітых савецкіх агентаў. Мы яго так і празвалі – Агент. Ці то тыя аповеды нам хутка надакучылі, ці то наш новы выхавацель расказаў іх нам усе, якія ведаў, але праз пэўны час у альтанку нас ужо не цягнула. Мы пачалі знікаць у цемры. Скончылася тым, што апавядальнік вымушаны быў змагацца за дысцыпліну. Рабіў ён гэта адмыслова: па адным заводзіў у прыбіральню і балюча лупцаваў. З жадання помсты хлопцы зрабілі яму «расцяжку». «Цёмнаю» і «расцяжкаю» мы карысталіся толькі ў выключных выпадках і толькі для таго, каб правучыць самых ненавісных асоб. Пасля адбою, калі ўсталявалася поўная цішыня, у самым кутку спальні нехта з нас пасля папярэдняй умовы распачаў бойку падушкай і лупцоўку завязаным на вузел ручніком (на нашым

жаргоне – «выклікаць на ратны бой»). Гульня ў «ратны бой» цягнулася да таго моманту, пакуль для ўціхамірвання сваіх выхаванцаў не прыбег Агент. Безумоўна, ён кінуўся ў той куток, дзе толькі што мільгала зброя і голыя лыткі «ратнікаў», але на праходзе паміж ложкаў яго чакаў шнур, які загадзя на адпаведным узроўні быў прывязаны намі. Далей адбылося тое, што і павінна было адбыцца. Агент паляцеў на падлогу, хапаючыся за білы, а мы зрабілі выгляд, што моцна спім і нічога не ведаем.

Але нельга думаць, што нашыя «аперацыі» так проста нам сыходзілі з рук. У той вайне нас жорстка каралі. Звычайнымі і амаль паўсядзённымі мерамі пакарання былі цяганне за вушы, лупцаванне гумавай скакалкай, «высаджванне ружаў». «Ружамі» ў нас называлі тых, каго ставілі ў куток. За некаторыя злачынствы мы павінны былі стаяць у кутку на каленях. У такім разе самым непрыемнымі куткамі былі тыя, у якіх на падлозе была жалезная вентыляцыйная сетка. Здаралася, што ў парыве гневу мы атрымлівалі жорсткую лупцоўку. Найчасцей для такой мэты выкарыстоўвалі драўляныя ўказкі. На ўроках працы мы іх рабілі амаль штомесяц па некалькі дзесяткаў. Безумоўна, мы імкнуліся састругваць указку да мінімальнай таўшчыні, ведаючы, што кожная з іх магла калі-небудзь разляцецца на нашай спіне.

Нам увесь час, асабліва ў падлеткавым веку, хацелася есці. Можа, таму, што ежы было мала, а мо й таму, што яе гатавалі блага? Кожны з нас меў сваю атапляльную батарэю, у якой мы сушылі і хавалі кавалкі хлеба. Час ад часу для пад'ядання мы забягалі ў школьную качагарку, дзе ў вялікім чорным чане варылі бульбу для свіней. Свіная бульба ў мундзірах, пасыпаная соллю, была для нас найсмачнейшым пачастункам. Здаралася, што некаторыя выхавацелі перад дзвярыма сталоўкі ладзілі апытанне па хатнім заданні. У такім разе на вячэру трапляў толькі той, хто без запінкі дэкламаваў вершык і зададзены ўрывак літаратурнага тэксту. Для таго, каб вынадзіць ці атрымаць смачную ежу, некаторыя ішлі на школьную кухню і набіваліся ў дапамогу кухоннаму персаналу. Начысціўшы вядро бульбы ці перабраўшы кош буракоў, можна было спадзявацца на некалькі смачных сырнікаў, хлеб з маслам

ці нават на смакаванне рэштак згушчанага малака, якое звычайна заставалася на дне бляшанак.

Нас вельмі часта папракалі ў дармаедстве. Атрымаў двойку – табе казалі: «Ты жывеш на ўсім гатовым, толькі вучыся!» Дарэчы, аргумент пра дармаедства быў адным з выхаваўчых моўных клішэ, якое гучала амаль штодня. Яно ўваходзіла ў сістэму народнага выхавання і лічылася адным з найбольш пераканаўчых прыёмаў уздзеяння на волю дзіцяці: пакуль цябе кормяць і гадуюць, будзь удзячны за такую ласку і падпарадкуйся за гэта дарослым. У кантэксце прынцыпаў таго ж народнага выхавання фізічны гвалт варта таксама разглядаць як адзін са спосабаў падпарадкавання волі дзяцей – запалохванне. У гэтым сэнсе многім нашым педагогам не ставала класічнай педагогікі. Апошняя ў ідэале павінна скіроваўцца на выхаванне годнага чалавека: вольнага, незалежнага, мараль якога грунтуецца на агульначалавечых прынцыпах. Трагедыя нашага варыянта інтэрнатаўскай педагогікі палягала ў тым, што яна звыродліва спалучала прынцыпы народнага выхавання і нейкія элементы кніжнай педагагічнай навукі. Для нас, інтэрнатаўскіх дзяцей, якія не мелі належнай повязі з сям'ёй, педагагічная супярэчнасць такога кшталту прыводзіла да асабістых маленькіх трагедый, агрубляла дзіцячыя душы.

Я амаль нічога не ведаю пра лёс маіх аднакласнікаў. Некаторых з іх, паводле чутак, якія час ад часу далятаюць да мяне, напаткала няшчасце, і іх жыццю не пазайздросціш. Цяжка паверыць у тое, што сацыялагізацыя прайшла для іх гладка.

Не так даўно я наўмысна паехаў у тое мястэчка, дзе прайшлі мае інтэрнатаўскія гады. Я пайшоў шукаць дрэва, у якое ўрос дрот. Ліпавай прысады за школьным плотам не было. Дрэва з дротам, як і іншыя ліпы, нядаўна спілавалі і на іх месцы пабудавалі недарэчныя гаражы. Цікава, як доўга яшчэ мучылася тое дрэва, пранізанае іржавым дротам? За плотам, як раней, узвышаліся трохпавярховыя інтэрнатаўскія будынкі. У іх працягвала віраваць дзіцячае жыццё.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

[image]

2[image]2005

"да Зыкасту"

паэмыка • аналітыка • крытыка • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Павал Абрамовіч
Мой спосаб чытаньня

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ

літаратурны крытык. У апошнім нумары «Дзеяслова» (№ 13) надрукаваў артыкул «Місія – выхаваць нацыю. Літаратурная крытыка ў «Нашай Ніве» ў 1906–1910 гады».

*** Невядомы «лімаўскі» рэцэнзэнт, разглядаючы ў № 21 за 2004 год вынікі конкурсу маладых літаратараў імя Натальлі Арсеньневай, што ўвасобіліся ў зборніку «12+1», адразу пачаў з абвінавачаньняў. «Лімавец» піша пра «замардаваныя радкі», «напышлівыя практыкаваньні», «іранічны цынізм» канкурсантаў – «мілых літаратурных забаўнікоў часоў глябалізацыі і пафігізму». І тое, што рэцэнзэнт пасьля ўсяго гэтага яшчэ і запэўнівае, быццам ён «не нашчадак Галоўліту», дае падставы назваць яго матэрыял «пагромным», выкарыстоўваючы абраныя самім «лімаўцам» дэфініцыі камуністычна-каляніяльных часоў.

Напрыканцы рэцэнзэнт выводзіць у поле цяжкую артылерыю – цытуе **Натальлю Арсеньневу** (маўляў, павучыцеся ў клясыка!). Аднак Арсеньнева (і пра гэта ў рэцэнзіі няма згадак) пісала верш «Хто ён, паэт?» у Менску ў жудасным 1942 годзе, і ня цяжка здагадацца, да *чаго* яна заклікала літаратараў, *якія* пытаньні перад імі ставіла. Вось чаму цытаваць гэты верш маладым канкурсантам, патрабуючы, каб у іх сьветабачаньні адлюстраваліся эмоцыі часоў Другой сусьветнай вайны, часоў усеагульнай мабілізацыі, найвышэйшага напружаньня фізычных і духоўных сілаў – справа падлаватая. Як і падводзіць да думкі чытачоў «ЛіМу», што ў зборніку «12+1» – не Паэзія, і бяз гэтых дэбютантаў «мы б абышліся».

Дарэчы, **Андрэй Хадановіч**, аўтар пасьлямовы да зборніка, самотна-ціхім голасам «з-пад коўдры» хораша сказаў пра настрой сучаснага паэта: «…бо нашто электронная пошта // калі проста так не ў пару // немавед пра што і навошта // немавед каму гавару». Вельмі шкада, што голасу гэтага, як і галасоў маладых канкурсантаў, не пачулі «лімаўцы».

***

У Лёндане вось ужо 12 гадоў запар аб'яўляюць намінантаў і ляўрэатаў самай непрэстыжнай літаратурнай прэміі году, заснаванай ангельскім часопісам «The Literary Review». Прэміяй «Bad Sex in Fiction» узнагароджваюцца пісьменьнікі за самае бяздарнае апісаньне сэксуальнага акту накшталт «ён лашчыў яе так, быццам шукаў ключы ад аўтамабіля» (**Тама Янавіц**) або «яна кончыла зь вясёлым гіканьнем зграі малпаў-рэзус, якія пакутавалі на задышку» (**Род Лідлз**). Тым самым арганізатары акцыі спадзяюцца прыцягнуць увагу да «грубага, безгустоўнага, нядбайнага і шматслоўнага апісаньня сэксу ў сучаснай літаратуры». Сёй-той з узнагароджаных крыўдуе. Так, ляўрэат «Bad Sex in Fiction»-2004 амэрыканскі пісьменьнік **Том Вулф** адмовіўся завітаць на цырымонію і атрымаць прэмію – статуэтку, падобную да «Оскару», і бутэльку шампанскага.

Многія сучасныя беларускія пісьменьнікі маглі б прэтэндаваць на «Bad Sex in Fiction». Напрыклад, **Мікола Захаранка** за аповесьць «Забойства на вуліцах з прысадамі» (Дзеяслоў. 2002. № 1) (*«Вас трое, вы ня маеце права!» – прастагнала дзяўчына голасам ахвяры, якую гвалтуюць менавіта трое»*) ці **Альгерд Бахарэвіч** за апавяданьне «З вышыні» (ARCHE. 2004. № 1) (*«Сама разумееш чым», – рохкаю я, зрэшты, ужо падатлівы, як дзіцячы канструктар. Яніна рука, сымбіёз коткі й кобры, прасьлізгвае паміж маіх ног»*).

Цікава, ці зьявіліся б яны на ўзнагароджаньне?

***

У маёй хатняй бібліятэцы ёсьць том **М. Салтыкова-Шчадрына**, выдадзены ў 1905 годзе ў Санкт-Пецярбурзе, з занатоўкамі на палёх, якія зрабіў алоўкам невядомы мне расейскамоўны чытач (назавём яго Н.). Ня цяжка было заўважыць, што ў кнізе Н. мэтанакіравана шукаў адказы на пытаньні, зьвязаныя зь верай і рэлігіяй, злачынствам і пакараньнем. Напрыклад, у «Губэрнскіх нарысах» насупраць слоў *«Господи! неужели нужно, чтоб обстоятельства вечно гнели и покалывали человека, чтоб не дать заснуть в нем энергии, чтобы не дать замереть этой страстности стремлений, которая горит на дне души, поддерживаемая каким-то неугасаемым огнем? Ужели вечно нужны будут страдания, вечно вопли, вечно скорби, чтобы сохранить в человеке чистоту мысли, чистоту верования?»* ён напісаў *«да и нет»*, а насупраць фразы *«Известно, что наказание разбойнику следует; однако, если человек сам свое прежнее непотребство восчувствовал, так навряд и палач его столь наказать может, сколь он сам себя изнурит и накажет»* паставіў тлустую рысу.

Нататкі Н. ілюструюць навуковы тэзіс, што спрадвечная культурна-гістарычная блізкасьць літаратуры і рэлігіі ў Расеі прывяла ў XIX стагодьдзі да канчатковага замяшчэньня філязофіі літаратурай. Вось чаму да літаратурна-мастацкага твору Н. ставіўся як да філязофскага – у прасторы літаратурацэнтрычнага тыпу культуры гэта цалкам дапушчальна.

Зразумеўшы, якім быў *спосаб чытаньня* Н., адчуўшы сымпатыю да гэтага чалавека, які шукаў адказы на спрадвечныя пытаньні ў пісьменьніка, прызнаваў аўтарытэт кніжнага слова, я адкрыў гэта стогадовае выданьне і насупраць свайго ўлюбёнага дыялёгу з «Гісторыі аднаго гораду»:

– И тех из вас, которым ни до чего дела нет, я буду миловать; прочих же всех – казнить.

– Так! – отвечали головотяпы.

– А как не умели вы жить на своей воле и сами, глупые, пожелали себе кабалы, то называться вам впредь не

головотяпами, а глуповцами.

– Так! – отвечали головотяпы, –

асадкаю з чорным стрыжнем напісаў: *«пра нас, беларусаў»*.

***

Калі б наша дзяржава забясьпечыла роўны доступ усіх патэнцыйных рэцыпіентаў да літаратурнай прадукцыі, не рэгулявала рынку збыту апошняй і зьняла б цэнзуру, дазволіла нармальна працаваць літаратурным агентам і выдаўцам, у тым ліку замежным, то ў краіне, у прыватнасьці, рэалізаваліся б шмат якія камэрцыйна пасьпяховыя беларускамоўныя праекты. Напрыклад, часопіс «ARCHE», падобна расейскаму часопісу «Иностранная литература», мог бы распрацаваць уласныя канцэптуальныя кніжныя сэрыі і выдаваць па-беларуску інтэлектуальную замежную літаратуру. Так, наколькі я ведаю, раман «Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі» (1997) культавага пісьменьніка **Міхала Вівэга**, які друкаваўся ў гэтым часопісе ў 2003 г., па-расейску не выходзіў, і таму, выдадзены асобнай кнігай, карыстаўся б попытам у нашага чытача.

Ці яшчэ прыклад: калі б айчынным выдаўцам і перакладчыкам хапіла кемлівасьці і спрыту, то чарговы «Гары Потэр», выдадзены па-беларуску, апярэдзіў бы расейскамоўны пераклад, і сотні нашых тынэйджэраў, бясспрэчна, зьвярнулі б увагу менавіта на яго, бо тут закон адзіны: хто першым прачытаў бэстсэлер – той і малайчынка.

У гэтых варунках збылося б і пажаданьне **Максіма Гарэцкага**, які (калі я дакладна цытую ягоныя словы) аднойчы ў роспачы напісаў: «Коміксаў, коміксаў, добрых, маляўнічых коміксаў беларускіх дайце нам!».

***

У славутай «Арэапагітыцы» (1644) – прамове аб свабодзе друку ад цэнзуры – ангелец **Джон Мілтан**, звяртаючыся да Парлямэнту, адзначыў: *«Я не адмаўляю, што для царквы і дзяржавы вельмі важна сачыць за паводзінамі кніг, роўна як і за паводзінамі людзей, і ў выпадку, калі гэта неабходна, затрымліваць іх, кідаць у турму і строга судзіць як злачынцаў*. […] *Я ведаю, што кнігі настолькі ж жывучыя і пладавітыя, як і мітычныя зубы цмока, і я ведаю, што калі іх расьсеяць паўсюль, яны могуць паўстаць у выглядзе ўзброеных людзей».*

Мы ведаем, якія кнігі клясыка беларускай літаратуры **Васіля Быкава** цяпер сядзяць у турме («Мёртвым не баліць»), якія – пакуль вольныя, але за якімі пільна сочаць («Доўгая дарога дадому»), а якія – сышлі ў лясныя гушчары, дзе гартуюць волю («Пакахай мяне, салдацік», «Тры словы нямых», «Аўганец»).

Прыйдзе час, і, расьсеяныя паўсюль, яны паўстануць у выглядзе ўзброеных людзей.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

[image]

[image]

[image]2005

[image] [image] [image]

Вінцэсь Мудроў
Мой кумір Джордж Гарысан

ВІНЦЭСЬ МУДРОЎ нарадзіўся ў 1953 годзе ў полацку. Аўтар трох кніг прозы. Пераклаў «Езуса невядомага» Дзьмітрыя Меражкоўскага для часопісу «Наша Вера».

З ночы горад накрыла непраглядная смуга. Шэрая дарога зьлівалася з туманам, не было бачна нават пункціру разьметкі, што звычайна мякка клаўся пад колы, і здавалася, што аўтобус плыве ў густым паветры ўздоўж шырознай і пустэльнай Лайм-стрыт. Вочы зацята глядзелі наперад, спрабуючы ўгледзець прывідную мяжу, дзе туман ператвараецца ў брукаванку, рукі сьціскалі гарачы навобмацак руль, і здалося на міг, што насустрач аўтобусу, засьцячы цьмянае сьвятло, размытай аграмадзінай ляціць Лівэр-білдынг. За сьпінай, у салёне, спалохана закрычалі, нага машынальна націснула на понаж, і Гаральд прачнуўся. За сьценкаю, амаль на ўсю шпулю, грымеў радыёпрыймач.

– Нас круціць «Люксэмбург»! – гарлаў сярод ночы малодшы сын Джордж, і голас ягоны пакрывала пранізьлівае зумканьне губнога гармоніка:

Love, love me do.
You know I love you…

Выгукнуўшы пару словаў з флёцкага лексыкону – свойчас

містэру Гарысану давялося пагойдацца на гандлёвых караблях, – Гаральд памружыўся на гадзіньнік.

Сын Джордж стаяў у дзьвярным праёме і захліпаным голасам гукаў:

– Нашу песьню круціць радыё «Люксэмбург»!

Містэр Гарысан сьцяў зубы:

– Хто ўрубіў гэты ідыёцкі грамафон? – галава сям'і ўсялякую гучную музыку называў «грамафонам». – Мне ўставаць а пятай гадзіне! – містэр Гарысан, кіроўца аўтобуса, працаваў у першую зьмену.

Дзьверы зачыніліся, музыка аціхла, і жонка Луіза, уздыхнуўшы, стоена прашаптала:

– Гары…

Луіза, як заўсёды, пачала заступацца за сына, але муж, пстрыкнуўшы выключальнікам «грыбка», працадзіў:

– Яго што… гітара да старасьці карміць будзе? – і рашуча крутнуўся на бок.

5 кастрычніка 1962 году, менавіта ў тую хвілю, калі містэр Гарысан крутнуўся на бок, бяссонныя аматары поп-музыкі – а ўначы радыё «Люксэмбург» круціла выключна музычныя навінкі – упершыню пачулі з вуснаў ды-джэя назву незнаёмага гурта:

– Сьпяваў «Бітлз» з ангельскага Лівэрпулю…

Гэты творык я напісаў 30 лістапада 2001 году, пачуўшы пра сьмерць экс-бітла. Быў упэўнены, што Дубавец адгукнецца на такую падзею ў «Вострай Браме» й замовіць адпаведны тэкст. Мая ўпэўненасьць спраўдзілася напалову: Дубавец перадачу зрабіў, але тэксту не замовіў, і гэты ўрывак згубіўся сярод безьлічы файлаў, якімі напампаваны кампутар. І вось, праз тры гады, калі я наважыўся выкінуць з кампутара розную

непатрэбшчыну, вочы засяродзіліся на файле «harysan», і неўзабаве забыты тэксьцік узьнік на экране. «Лайм-стрыт», «Лівэр-білдынг», Гаральд і Луіза Гарысаны… Усё было манерна, кампілятыўна… Курсор злавіў слова «выдаліць», але палец зьнерухомеў: згадалася, як у маладосьці – пры канцы шасьцідзясятых – сам уставаў сярод ночы і ціхенька, на цырлах, ішоў да прыймача, каб паслухаць радыё «Люксэмбург». Пасьля другой гадзіны ночы станцыю было добра чуваць, і якраз гэтым часам там, у рэжыме non-stop, перадавалі канцэрт моладзевай музыкі. Праблема была ў тым, что бацька не дазваляў слухаць «варожыя галасы», і калі я пераносіў радыёлу ў свой пакой, ён вяртаў яе на старое месца – поруч з канапаю, на якой спаў.

Радыёла «Латвія» поўніла пакой ціхім гудам і зладзеяватым, зялёнай водцені сьвятлом, што цадзілася зь пярэдняй панэлі. Настройваючы прыймач на патрэбную хвалю, даводзілася зыркаць на бацькавую канапу, але, пачуўшы бітлоў, крыдэнсаў ці ролінгаў, я прыпадаў вухам да прыймача, умэнт забываючыся на бацьку, на тое, што на гадзіньніку другая гадзіна ночы, што раніцаю трэба цягнуцца ў школу, і што ліхаманкава памоцненае гучаньне можа пабудзіць ня толькі родных і блізкіх, але й суседзяў.

Першай прачыналася маці. Спужанай птушкай, у сваёй падзертай начной кашулі, яна кідалася да прыймача. «Бітлз!» – выдыхаў я голасам асуджанага на сьмерць чалавека, абхопліваў радыёлу, і маці, налаўчыўшыся, вышморгвала вілку з разэткі.

Абуджаны валтузьнёй, бацька рыпеў спружынамі канапы, здушана кашляў, кожнага разу прамаўляючы адну і тую ж фразу: «Вот уродилось дитятко!» Бацька паходзіў з Расеі і, відавочна, паўтараў тыя словы, якія сам чуў у маладосьці.

Потым я доўга ня мог заснуць. Ляжаў, закінуўшы рукі за патыліцу, і ў душы зайздросьціў аднаклясьніку Сашку Мышалову – таму самаму, які падбіў слухаць радыё «Люксэмбург». Сашку страшэнна пашанцавала: у ягоным пакоі стаяла гаргарыстая лямпавая «Беларусь-59», якую ён слухаў начамі. Прыходзячы на заняткі, Сашка згадваў, што круцілі ўночы, а аднойчы цэлы тыдзень хадзіў па школьных калідорах, паўтараючы фразу з кагадзе пачутай песьні: «Бэк ін юэс… бэк

ін юэс…».

– «Бітлз»… з новага альбому. «Люксэмбург» ужо трэцім разам круціць, – тлумачыў сваю жарсьць Сашка Мышалоў, і я, ня чуўшы музычнага баевіка, таксама паўтараў няўцямную фразу: «Бэк ін юэс…», наіўна мяркуючы, што гаворка ішла пра вяртаньне ў ЗША.

Гаворачы пра тое, хто найбольш паспрыяў неверагоднаму ўзьлёту «Бітлз», звычайна згадваюць іхнага мэнэджара Браяна Эпстайна, гукарэжысэра Джорджа Марціна, шоў-бізнэсмэна Дзіка Джэймса, яшчэ нейкіх музона-бізнэсовых дзеячоў. Радыё «Люксэмбург» у пераліку адсутнічае. А менавіта яго перадатчыкі – адны з самых моцных у Эўропе – скаланулі 5 кастрычніка 1962 году прыспаны этэр песенькай «Love Me Do», і ўжо ня толькі маладзёны лівэрпульскага Мэрсісайду ды ваколіцаў гамбурскай Грос-Фрайхайт-штрасэ, дзе бітлы свойчас гастралявалі, а начныя заўзятары поп-музыкі ўсяго цывілізаванага сьвету пачулі мудрагелістае «Beatles».

Ці настройваліся тою ўва ўсіх сэнсах глухою парою на «люксэмбурскую» хвалю беларускія заўзятары біту? Цяжка сказаць. Хутчэй за ўсё – не. У кастрычніку 1962-га беларусам было не да песень: згуртаваўшыся вакол роднай камуністычнай партыі, яны зьбіраліся даваць рашучы адпор амэрыканскім агрэсарам. Я тады хадзіў у другую клясу і, вяртаючыся са школы, чуў з разнасьцежаных вокнаў патасна-брынклівы левітанаўскі голас. Ледзь ня кожнага дня зачытваліся заявы савецкага ўраду – пра агрэсіўныя пляны вашынгтонскай адміністрацыі ў раёне Карыбскага басэйну, пра тое, што амэрыканскія ваенныя самалёты ўчыняюць правакацыйныя аблёты савецкіх вадаплаваў, пра тое, што Савецкі Саюз будзе й надалей аказваць дапамогу братняму кубінскаму народу. Тады ж бацьку паклікалі ў ваенкамат, уляпілі ў ваенны білет ружовага колеру ўкладку, і бацька, пужаючы маці, зачытваў паперку, дзе гаварылася – што трэба браць з сабою ў выпадку мабілізацыі. Дагэтуль памятаю, што сярод іншага трэба было прыхапіць з дому кубак і лыжку.

У 1962 годзе Савецкі Саюз уяўляў сабой маналітны ледавік. І ўсё ж час вялікага абледзяненьня ўжо мінуў; палітычны клімат

рабіўся цяплейшым, і ў самім маналіце ўзьніклі першыя, амаль нябачныя расколінкі. І ўзьніклі яны, дзякуючы ўсё тым жа кароткахвалевым прыймачам.

Аднойчы – ужо і не згадаю, у якім годзе – бацькі пайшлі на вясельле, і я падсеў да радыёлы. Ледзь ня ўсю ноч круціў ручку настройкі, і нечакана, скрозь шум і посьвіст, да мяне даляцелі зыкі, ад якіх я зьлёгку ачмурэў: было поўнае ўражаньне, што я плыву ў паветры, і сэрца маё сьціскаюць нечыя цёплыя і пяшчотныя рукі. На далёкай, зьнявечанай радыёперашкодамі хвалі, гучала бітлоўская песьня «I Want to Hold Your Hand». Сорак гадоў мінула, а ўражаньне ад той песьні і дагэтуль ня выпетрылася з душы. І на пытаньне «У чым фэномэн «Бітлз»?» ёсьць толькі адзін адказ: яны стваралі музыку, якая гучала ў аднолькавай амплітудзе з нашым дыханьнем, з трапятаньнем нашых душаў. І спароджаны бітламі рэзананс скалануў урэшце ледзяную гару, ад якой пачалі адвальвацца першыя камлыгі.

Дасьледнікі, што будуць вывучаць усе гэтыя палітычныя інтэрстадыялы – разбурэньне савецкага ледавіка – мусяць выявіць прозьвішчы людзей, якія зьдзейсьнілі пры канцы шасьцідзясятых грамадзянскі подзьвіг: запісалі на вінілавай кружэлцы славутую «Girl». Гэта была першая ў Савецкім Саюзе афіцыйна выдадзеная бітлоўская песенька. І зьявілася яна толькі таму, што работнікі гуказапісу ўвялі ў зман «апэратараў халадзільнай установкі», ціскануўшы на вініле нязграбна-пукатыя літары: «Девушка», англ. нар. песня. Обработка Леннон–Маккартни». Прачытаўшы сакрамэнтальнае «нар. песня», апэратары ўявілі тую самую дзяўчыну «в кокошнике с набалдашником», і далі дабро на тыражаваньне палітычна небясьпечнай аўдыёпрадукцыі.

У 1968 годзе адна зь песень «Бітлз» загучала на савецкім TV. Тэлепраграма мела назву «В объективе – Америка» і распавядала пра жахі амэрыканскага ладу жыцьця. У застаўцы паказвалі нью-ёрскую Wall Street і гучала знакамітая «Can't Buy Me Love». Уся «прасунутая» моладзь ліпла тады да экранаў. Вядома ж, ня дзеля таго, каб пабачыць плеткара-міжнароднікa Валянціна Зорына, а каб паслухаць «бітлух».

Крыху пазьней песьні «Бітлз» загучалі і ў беларускай

філярмоніі: кагадзе ўтвораны ансамбль «Лявоны» ўключыў у свой рэпэртуар колькі бітлоўскіх зонгаў. Я быў на канцэрце «Лявонаў» і бачыў, зь якім фурорам выконваліся гэтыя песьні. Асабліва публіка шалела ад «Ob-La-Di, Ob-La-Da». Па-ангельску, праўда, выдаваўся толькі першы куплет («Дезмонт хэс э бэров ин зэ макет плейс / Моли ис зэ синге ин зэ бэнд…» – тэксты песень «Лявоны» завучвалі менавіта ў такім варыянце), астатнія сьпявалі па-расейску. Я таксама шалеў ад «Ob-La-Di, Ob-La-Da», але найбольш запала ў душу песьня «Моя гитара».

Моя гита-ара, пой бесконечно,
О том, что в сердце моём.
О чувстве ве-ерном, о чувстве вечном
С тобою вме-есте споём… –

пранікнёна цягнуў Уладзіслаў Місевіч, тулячы да грудзей флейту. У залі Палацу культуры нафтавікоў гучала песьня, якую, здавалася, я чакаў усё жыцьцё. І душа лунала недзе пад стольлю, і сэрца парывіста білася, не пасьпяваючы пампаваць гарачую кроў, а то й зусім замірала, калі Місевіч прыкладаўся вуснамі да флейты. Я быў перакананы, што песьню напісалі L&M, і толькі праз пару гадоў, пабачыўшы «Белы альбом», прачытаў на пацёхканай капэрце: «While My Guitar Gently Weeps» (Harrison)».

У кожнага бітламана быў свой кумір. Найбольш захапляліся Джонам і Полам. Ня менш палкіх прыхільнікаў меў Рынга: ударнік за часамі маёй маладосьці наагул быў культавай асобай. Памятаю, зь піянерскіх пакояў увесь час кралі барабанныя палачкі, і потым, выхопліваючы іх адно ў другога, спрабавалі (кожнага разу беспасьпяхова) крутнуць у пальцах, як гэта рабілі «каралі біту».

Маім кумірам, аднак, быў Джордж Гарысан.

На самым пачатку, захапіўшыся бітламі, я вылучыў яго з усёй чацьвёркі падсьвядома. Мне проста падабалася ягонае прозьвішча, якое ўяўлялася ўзорам нетутэйшасьці, недасяжнасьці, кельцкай ваяўнічасьці і немаведама чаго там яшчэ. Потым, упершыню пабачыўшы бітлоўскі фатаздымак –

цьмяны, сто разоў перазьняты, – пераканаўся ў правільнасьці свайго выбару. У Джорджа Гарысана быў той самы «hair», які мне найбольш імпанаваў і які, вядома ж, я марыў адгадаваць.

І толькі праз колькі гадоў, сабраўшы бітлоўскую фанатэку, я ўбачыў у сваім куміру найвялікшага мэлядыста свайго часу.

Сучасьнікі называлі Джорджа Гарысана задужа сьціплым. Ён не любіў, калі пра яго пісалі ў газэтах, яго раздражняла бітламанія і ўсе гэтыя экзальтаваныя дзявулі і ўвішныя журналюгі, што не давалі праходу аж да скону жыцьця. Стрыманасьць характару выяўляла і тое, як ён паводзіў сябе на сцэне. На экранах TV часьцяком круцяць кадры выступу бітлоў у шоў Эда Салівана (1964 год). Джон і Пол захоплены сабою, вольна рухаюцца, граюць міма нот, усьмешка на ўсе 32! Джордж засяроджаны: ён вядзе мэлёдыю, а калі і спрабуе пасьміхнуцца, дык усьмешка атрымліваецца бляклай і заклапочанай.

Сяргей Дубавец у адной са сваіх «вастрабрамных» перадачаў параўнаў мэнтальнасьць Джорджа Гарысана з мэнтальнасьцю «сярэдняга» беларуса, якая трымаецца на двух асноўных прынцыпах: не вытыркацца й фахова рабіць сваю справу. З такімі раўналежнікамі можна пагадзіцца. Джордж і сапраўды «не вытыркаўся», заўсёды стаяў – у літаральным і ўскосным сэнсе – за сьпінамі L&M, закладваючы пры гэтым гітарныя «салякі», паўтарыць якія L&M наўрад ці маглі. І ўсё ж стаць упоравень са сваімі знакамітымі калегамі ў пляне творчага здабытку Джорджу не дазволіла тая ж прыродная сьціпласьць, а магчыма, і няўпэўненасьць у сваіх сілах. Так, «ціхі бітл» напісаў адносна няшмат, але кожная ягоная рэч – адметная, а згаданая ўжо «While My Guitar Gently Weeps» (думаю, са мною пагодзяцца старыя бітнікі) – найлепшая песьня лівэрпульскага квартэту.

Аднойчы ў нашыя полацкія палестыны завітаў ангельскі славіст і дасьледнік беларускай літаратуры Арнольд Макмілін. Мы павадзілі замежнага госьця па горадзе, паказалі Сафійскі сабор, Эўфрасіньнеўскі манастыр, музэй кнігадрукаваньня, а прытаміўшыся, убіліся ў адно цёплае месца, каб папіць гарбаты. Тут я і задаў славісту пытаньне, якое даўно сьпела на

языку:

– А пры якіх абставінах вы ўпершыню пачулі пра «Бітлз»?

Славіст сёрбнуў гарбаты, пацёр чырвоную лабаціну.

– Ужо і ня памятаю. І наагул: гэтыя хлопцы ніколі мяне не цікавілі. Так… гарлалі нешта…

Словы такія зьбянтэжылі, і я ўпершыню ў жыцьці падумаў: а сапраўды… чым я захапляўся? Ну што такое «Love Me Do»? Прымітыўная песенька, музон для пэтэвэшнікаў і маладых цырульніц. Пра вакальныя дадзеныя і казаць няма чаго. Ленан сьпявае задужа рэзка, да таго ж увесь час чвякае вуснамі, Макартні зусім ня цягне «на вярхах», Гарысан… У гэтым месцы думкі заблыталіся ў галаве і я ня здолеў даць вызначэньне гарысанаўскаму вакалу. А ўвечары, разьвітаўшыся з ангельскім славістам, насунуў на голаў навушнікі і ўключыў «Here Comes the Sun». І зноў, каторым ужо разам, дыхнуў азонам пранізьліва-сьветлай раніцы, убачыў чырвоны дыск сонца, што падымаўся з-за далягляду, і прашаптаў нядобрае слова на адрас замежнага госьця.

Пасьля пяцідзесяці гадоў Гарысан зьмяніўся з твару і ўжо цяжка было пазнаць у чалавеку з сувора-пахмурным абліччам былога Джорджа. Аднойчы давялося пабачыць яго на экране TV. Гарысан быў падобны да тулюз-лётрэкаўскага Арыстыда Бруана – у гэткай жа цёмнай апранасе і з гэткім жа даўжэзным, неахайна закручаным вакол доўгай шыі шалікам. Яго атакавалі журналісты, і «ціхі бітл», насупіўшы кусьцістыя бровы, бязгучна лаяўся ды адпіхваў ад сябе дулю рэпартэрскага мікрафону. З усяго было відаць, што Гарысан стаміўся. Стаміўся ня толькі ад журналістаў, але й наагул – ад людзей.

Такія настроі лагодзілі душу. А неўзабаве, халодным лістападаўскім вечарам, уключыў па старой завядзёнцы прыймач, і сэрца маё балюча сьцялася ад пачутага: «Памёр Джордж Гарысан». Сіпаваты жаночы голас паведаміў пра невылечную хваробу музыканта і згадаў наастачу ягоныя апошнія словы: «Любіце адно аднаго».

Я заплюшчыў вочы і ўявіў такое ж золкае перадзім’е, цьмяна асьветленую клясу, сьпіс големаў сацрэалізму на цёмнай дошцы. Таго дня мы, васьміклясьнікі, пісалі творапіс на тэму: «Герой, на якога я хачу быць падобным». Першым у прапанаваным сьпісе быў пазначаны Паўка Карчагін. Я глядзеў на дошку, з прытоенай радасьцю згадваў бітла з размытага фатаздымку, і ўвушшу бясконцым рэфрэнам гучалі словы, якія лагодзілі жыцьцё і ачышчалі душу: «Любіце адно аднаго».

Лістапад, 2004

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (36) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

— Найперш хацелася б пачуць, што адбываецца вакол беластоцкай газэты «Ніва».

– Пракуратура закрыла справу і падала яе ў суд. Калі адбудзецца першае пасяджэньне суду, дакладна невядома, магчыма — на пачатку сакавіка. Судзіць будуць два склады Праграмнай рады і бухгальтарку — разам 11 асобаў. Апошні падобны працэс адбыўся ў Беластоку ў 1923 годзе. Быў гэта так званы Працэс 45-ці. Тады, прынамсі, частка падсудных фактычна выступала супраць польскай дзяржавы, чаго пра сёньняшніх аніяк ня скажаш. Наагул, у міжваенны пэрыяд палякі дакаралі беларусаў за тое, што быццам бы бралі грошы з Масквы, а цяпер за тое, што бралі грошы з Варшавы...

— Толькі ў беларусаў паўсталі падобныя праблемы ці гэта агульная кампанія, скіраваная на абмежаваньне дзяржаўнай падтрымкі аб’яднаньняў нацыянальных мяншыняў?

— У суд падалі толькі на беларусаў, хаця падобныя абвінавачаньні Найвышэйшая кантрольная палата выставіла

ўкраінцам, літоўцам і іншым нацменам. Пры тым усе выканаўцы гэтай справы апраўдваліся, што дзейнічаюць на патрабаваньне «зьверху». На жаль, справа такая абсурдная, што мы ня можам дакладна ўстанавіць, хто на нас наехаў. Тым ня менш, нехта працуе надалей. Цяпер узяліся выкрасьліць з рэгістру партыяў Беларускае дэмакратычнае аб'яднаньне. Фармальная прычына — з-за адсутнасьці банкаўскага рахунку. Нібыта й праўда, але зноў зьдзіўляе неахвота выслухаць апраўданьні і рашучасьць у гэтым ліквідатарстве. Самае важнае, клопаты маюць выключна тыя беларусы, якія ў 1980-я стваралі антыкамуністычную апазыцыю, у 1990-я — незалежны нацыянальны рух і крытычна адносяцца да рэжыму Лукашэнкі. Тыя, хто падпяваў любой польскай і беларускай уладзе, могуць спаць спакойна.

— Беларуска-польскія праблемы ёсьць і ў галіне гісторыі, якую можна трактаваць з розных нацыянальных пазыцыяў. Як яе пераадольвае беларускі гісторык, які выкладае ў польскіх навучальных установах, Алег Латышонак?

— Гісторыя Беларусі і гісторыя Польшчы — гэта дзьве зусім розныя гісторыі, хаця расказваецца ў іх пра тыя самыя падзеі. Праблемаў з выкладаньнем ня маю ніякіх. Даходзіла да маіх вушэй, што некаторыя прафэсары пляткавалі, нібыта беларус не павінен выкладаць гісторыі Польшчы, вось і ўсё. Зусім іншая справа, калі ідзецца пра спрэчку нашага беларускага асяродзьдзя з польскімі гісторыкамі адносна пасьляваеннага пэрыяду на Беласточчыне. У другой палове 1940-х гадоў пэўная групоўка польскага антыкамуністычнага падпольля дапусьцілася генацыду на беларусах. Для нас гэта вялікі боль, пагатоў галоўны вінаваты, капітан Рамуальд Райс «Буры», які ў лютым 1946 году спаліў некалькі беларускіх вёсак і вымардаваў іхных жыхараў, у 1993 годзе апраўданы быў польскім судом. Нібыта ён кіраваўся «вышэйшым дабром». Мы аніяк ня можам зразумець, якое гэта «вышэйшае дабро» дазваляе паліць людзей жыўцом. Усё чакаем ад палякаў прызнаньня, што як «Буры», так іншыя каты беларусаў былі злачынцамі. На жаль, шмат польскіх гісторыкаў, асабліва маладых, проста адмаўляюцца ад асуджэньня сваіх хвальшывых герояў.

— Які гістарычны час твой улюбёны?

— Як калі. Пачынаў практычна з XX стагодзьдзя, з гісторыі змаганьня за незалежнасьць Беларусі. Доўгі час я найлепш сябе адчуваў у XVIII — пачатку XIX стагодзьдзя, інакш кажучы, у пэрыядзе Асьветніцтва. Уводзіў нанава ў беларускую гісторыю прызабытую віленскую прафэсуру родам зь Беласточчыны. У апошнія гады ўцягнула мяне «самае цікавае з усіх» XIII стагодзьдзе. Гэта было стагодзьдзе «першай глябалізацыі» і зьяўленьня «Белай Русі». Агульна можна сказаць, што паглыбляюся ў вякі. Апошні год жыў я IX стагодзьдзем, працуючы з Алесем Белым над легендарнай гісторыяй Полацку. Глыбей ужо толькі археалёгія, якой я займаўся выключна як далакоп-добраахвотнік. Відаць, усё гэта нейкая натуральная падрыхтоўка да напісаньня гісторыі Беларусі. Люблю таксама чытаць пра іншыя народы на ўсім сьвеце.

— Адзін час ты быў аматарам Афрыкі.

— Афрыка цікавая гісторыку сваёй адсталасьцю. Праходзяць там працэсы, якія ў Эўропе закончыліся ў Сярэднявеччы. Мой улюбёны народ, гэта тутсі, таму што яны такія, як я, высокія. Калі чытаю, што гуту абрэзваюць тутсі ногі ў каленях, каб не былі ўжо такімі выносьлівымі, атаясамліваю сябе з тутсі. Аднойчы мой сябра — беларускі гісторык, спытаў мяне «А каторыя зь іх нашыя?» Дык «нашыя», безумоўна, — бяздольныя сяляне гуту, але хто ж любіць бяздольных? Цікавей наглядаць за пабудовай жменькай тутсі імпэрыі «ад акіяну да акіяну». Пакуль што пабудова гэтай імпэрыі застрахла ў выніку здрады роду Кабілаў у Конга й «першай афрыканскай сусьветнай вайны», у якой на баку Кабілаў выступілі наймагутнейшыя «чырвоныя» афрыканскія рэжымы — Ангола і Зымбабвэ. Цяпер войскі Руанды чарговы раз наехалі на Конга, хаця правадыр Руанды Кагамэ і Кабіла-малодшы выхоўваліся разам. Наагул, пабудове ў Афрыцы ў меру стабільных дзяржаваў і нацыятворчым працэсам перашкаджаюць штучныя межы, накрэсьленыя эўрапейскімі калянізатарамі, ды няспыннае ўмяшальніцтва заходніх дзяржаваў і канцэрнаў. Што ж, адсталыя заўсёды мусяць расплачвацца сваім багацьцем і жыцьцём. Тым ня менш, у Афрыцы ўжо шмат сфармаваных

нацыяў, якія яшчэ праявяць сябе ў будучыні.

— Што табе згадваецца пра Польшчу 1960—1970-х? Ці адчуваў ты ў дзяцінстве сімпатыі да гістарычнай Рэчы Паспалітай?

— Жылося небагата, але й нябедна, хаця мой бацька часта паўтараў, што ён свае даўгі верне да апошняга граша, а вось правадыр Польшчы Герак дык ніколі. Так і атрымалася. Пра ніякую Рэч Паспалітую ў дзяцінстве я не разважаў. Абавязвала мадэль «пястоўскай», этнічнай Польшчы. Толькі ў ліцэі я стаў чытаць кніжкі Паўла Ясяніцы пра Рэч Паспалітую, і прыйшло мне да галавы, што магутная была гэта краіна і што варта было б яе адродзіць.

— Як ты ставішся да сёньняшняга беларускага эміграцыйнага руху?

— Сёньняшнюю палітычную эміграцыю бачу як зьяву часовую і кароткатэрміновую. Цэнтар беларускай эміграцыі ў больш шырокім значэньні можа быць толькі ў Менску. Калі думаць пра палітычны лобінг у гэты гістарычны момант, дык добра было б мець нейкі цэнтар там, дзе вырашаюцца справы, значыць, у Брусэлі або Страсбурзе.

— Распавядзі, як адшукалі магілу Алеся Гаруна ў Кракаве.

— Ну, я яе адшукаў на Ракавіцкіх могілках. Калі я другі раз ехаў у Кракаў у 1983 годзе, Сакрат Яновіч сказаў мне, каб я гэтым пры нагодзе заняўся. Я шукаў даволі доўга, бо загінула гэтак званая кніжка кватэры (чатырохвугольнага надзелу) з зазначаным месцам спачынку Прушынскага. Блудзіў я па Ракавіцкіх могілках доўга, піў гарэлку з далакопамі, ажно мая аднакурсьніца Караліна Градзіская, якая напісала гісторыю гэтых могілак, знайшла ўспомненую кніжку. Магіла існавала ўжо толькі як пустое месца, але нікога іншага тут не пахавалі. Аб сваёй знаходцы я паведаміў Кастусю Акулу, які арганізаваў збор грошай сярод беларускіх вэтэранаў на Захадзе. Пабудовай помніка заняўся мой бацька, валун прывезлі мы зь Беласточчыны. Адкрывалі яго ўрачыста, якраз тады я першы раз пабачыў бел-чырвона-белы сьцяг на публіцы. Пасьля

прыехаў зь Вішнева а. Уладзіслаў Чарняўскі і пасьвяціў магілу.

— Ці трэба нам стварыць нацыянальны Пантэон?

— Безумоўна трэба. У нацыі павінен быць свой Пантэон. Мне гэта прыйшло ў голаў, калі прачытаў пра Пантэон лужыцкіх сэрбаў. Народ маленькі, а свой Пантэон мае. Мы, беларусы, замала дбаем пра ўвекавечаньне нашых продкаў. Безупынна дакараю сябе, што замала робім, каб ушанаваць выдатных беларусаў Беласточчыны і адзначыць хаця б сьціплымі помнікамі важныя для нашай гісторыі месцы.

— І адбудаваць царкву-пахавальню Ўсяслава Чарадзея ў Полацку…

— Абавязкова. Калісьці я быў гістарычным пурыстам і лічыў адбудову помнікаў старадаўнасьці бескарыснай. Але ўсё-такі зразумеў, што народ мае права жыць у сваёй гістарычна-эстэтычнай прасторы. Ворагаў справа нашы сьвятыні развальваць, а наша — адбудоўваць, нават калі б прыйшлося паўтараць гэта некалькі разоў. Да таго ж Усяслаў — мой улюбёны гістарычны герой. Ды й я дзеля яго стараюся — прыпісаў яму продкаў ажно да гоцкага караля Германарыка.

— Ты напісаў, што ў дзяцінстве шмат чытаў беларускіх кніг. Што з прачытанага трывала засталося ў памяці?

— Я не сказаў бы, што чытаў шмат беларускіх кніжак — адкуль было іх узяць? Кірыліцу я вывучыў ці не раней за лацінку, але з расейскага буквара. Бацька цягнуў дахаты ўсё, што знайшоў, але беларускай дзіцячай і моладзевай літаратуры практычна ня ведаю. Маёй Бібліяй быў збор твораў Максіма Багдановіча ў 2-х тамах, выдадзены ў Менску ў 1968 годзе. З Багдановіча памятаю ўсё.

— Ці слухаў ты ў юнацтве рок-музыку?

— От, слухаў, як усе мы тады, і тое самае, што мае аднагодкі. Агульнавядомыя заходнія гурты пералічаць дарма, з польскіх мы слухалі перш за ўсё «Чырвоныя гітары», «Скальдаў» і «Будку суфлёра». Не бяруся ацэньваць сёньняшняй польскай рок-

музыкі, бо ні польскай, ні якой небудзь рок-музыкі ня слухаю. Цяпер яна мне проста не цікавая. Нават на нашае «Басовішча» падаюся нейк з абавязку, бо штогод знаходзяцца сябры, якія яшчэ «Басовішча» ня бачылі. Да нядаўна некалькі год слухаў выключна рэгей Боба Марлея, але й гэта нейк прайшло. Усё, відаць, справа веку — цяпер падабаецца мне толькі опэра.

— Ну і пытаньне на засыпку: што беларусам рабіць, каб выстаяць у віхуры глябалізацыі?

— «Здароў будзь вецер з заходняга краю!» Глябалізацыяй няхай пераймаюцца маскоўцы, нам, беларусам, баяцца няма чаго. Беларусь праяўляе сябе менавіта ў час глябалізацыі. Як я ўжо сказаў, «Белая Русь» зьявілася ў выніку першай глябалізацыі ў XIII стагодзьдзі. Беларускі нацыянальны рух высьпеў у пэрыяд глябалізацыі канца XIX — пачатку XX стагодзьдзя. Не залішне прыпомніць, што тады глябалізацыя была большай за цяперашнюю. А не было б цяперашняй, не разваліўся б Савецкі Саюз, дык не было б чарговага беларускага адраджэньня. Усё будзе добра, толькі нічога ня трэба рабіць.

22.12.2004

Гутарыў Алесь Аркуш
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

— Што такое сёння беларуская літаратура?

— Гэта – тэксты, не адэкватныя сутнасці нашага часу, за рэдкім выключэннем (да прыкладу, раман Ю. Станкевіча «Любіць ноч – права пацукоў» і нядаўняя кніжка паэзіі У. Някляева «Так» – высокамастацкія творы). Літаратура павінна не толькі адпавядаць свайму часу, але ў нечым і апярэджваць яго – *прадракаць новы, наступны час*, звязваючы яго з папярэднім альбо грунтуючыся на ім… Цяперашнія літаратары не абцяжараныя лёсавызначальнымі зломамі, легкаважныя паводзінамі і ўчынкамі і ў той жа час занадта самаўпэўненыя і крыўдлівыя. Іх мала хто сёння чытае, чуе і ўспрымае. Яны пішуць для сваіх «часовых сукамернікаў» па мастацкай няволі. Свабода ім толькі сніцца…

— Ці парушыў ты сваю адмову пісаць вершы?

— Не адразу, але паступова я стаў адчуваць, што з мяне выветрываецца энергетыка… Зразумеў, што, як і большасць белпаэтаў, ужо колькі гадоў намагаюся пісаць на яе астаткавай

інерцыйнай сіле. Без запалу і парывання. А тут Міхась Скобла ў гутарцы са мной на радыё «Свабода» падкінуў па сутнасці даўно наспелае пытанне: «А ці мог бы не пісаць?» І я ўжо тады быў гатовы да адказу. Быў перакананы, што мог бы, што кідаць трэба, больш за тое, неабходна… Сівуху піць кінуў, нікатынам труціцца – таксама, а ўжо ж вершы – «*сам Бог наказаў*»…

Пытаеш, ці парушаў я хоць калі тую «радыёклятву»? Скажу, як на духу, я ўжо і празаічныя тэксты пад змусам пішу. Нечым жа трэба зарабляць на жыццё. Паэзіяй не заробіш. Хіба толькі на жыццё пасмяротнае… Але для гэтага трэба насамрэч быць Паэтам ад Бога. Мець такое пакутнае наканаванне… Гасподзь, аднак, маёй падобнай *ахвяры не прыгледзеў*, як некалі прыгледзеў Ён Авелеву… альбо хоць Багдановічаву, Купалаву, Караткевічаву, ахвяру Купрэева ці, урэшце, Сыса… З удзячнасцю наталяюся *імі*. Каінам быць не жадаю…

— Наколькі крыўдна было чытаць адкрыты ліст Васіля Сёмухі да цябе з «падзякай» за бясплатную падпіску на «ЛіМ»?

— На Васіля Сёмуху я ніколі не злобіўся і цяпер не крыўдую. Як творцу я яго вельмі высока цаню і паважаю. Перакладзеная ім Біблія чытаецца з пожадам, без прыгнечанасці і натугі, натуральна, як Богам яўленае (абеларушанае) гістарычна-міфалагічнае жыццё зямнога чалавецтва…

Проста мне было непамысна, што гэты самы чалавек, які *суперажыў* Кнігу Кніг, не можа перажыць факту існавання цяперашняга «ЛіМу»… Дагэтуль здзіўляюся.

— Калі ліквідуюць Саюз пісьменнікаў, ці пойдзеш у пісьменніцкую арганізацыю Вараб'ёва–Бондар?

— Уступіць у згаданую менскую гарадскую пісьменніцкую арганізацыю мне ўжо прапаноўвалі два гады таму на агульным арганізацыйным сходзе рэдакцыйна-выдавецкай установы «Литература и искусство». Там былі ўсе сябры СБП, што працавалі на той час у згаданым холдынгу. Бальшыня пагадзілася ўступіць у новую арганізацыю, не пакідаючы *старой* (СБП). Галасаванне, дарэчы, было адкрытым і

дэмакратычным, на мой погляд. Здаецца, чатыры чалавекі (з дваццаці з гакам) устрымаліся: В. Коўтун (яна яшчэ з абуральнай прамовай выступіла і, грукнуўшы дзвярыма, пакінула холдынг назусім – балазе, на пенсіі), А. Федарэнка, Л. Рублеўская і я. Ніякага асаблівага ўціску з гэтай прычыны не было, прынамсі, на мяне, і, наколькі ведаю, на Федарэнку… Наконт Рублеўскай – нічога пэўна сказаць не магу, там у іх свае ўнутраныя расклады і ўзаемаадносіны. Я – індывідуаліст і самотнік. Гадоў пяць таму Алесь Разанаў прапаноўваў дамагчыся сяброўства ў ПЭН-цэнтры (даваў рэкамендацыю і яшчэ з дзвюма абяцаў дапамагчы) – я адмовіўся. ПЭН-цэнтр – гэткая ж малатворчая *кантора*, як і СБП, – адным маслам мазаныя: адна – яго экспартным варыянтам, а другая – айчынным. Што праўда, бліноў нямнога і рэдка бываюць… А СБП, ходзяць чуткі, і ўвогуле прыкрыць хочуць. Там, дзе ідэалогія першынствуе, – якая творчасць, там – барацьба… Я, дзякаваць Богу, дажыў да той пары, калі душа прагне споведзі і пакаяння. А гэта патрабуе засяроджанасці і таемства… І тут мне аніякія саюзнікі непатрэбныя. Ні з аднаго, ні з другога боку. Патрэбны толькі саюз з Самім Першатворцам…

Шчыра кажучы, я і сам з СБП развітаўся б, каб не патаемныя думкі пра будучую пенсію. Бо, па праўдзе кажучы, і ў гэтую арганізацыю амаль кожны з нас найперш ірваўся з меркантыльных мэтаў і матэрыяльных выгод. Зрэшты, хрушчоўка з двума прахаднымі пакойчыкамі хіба і ёсць усім маім набыткам ад СП БССР…

Кажуць, Саюз беларускіх пісьменнікаў патрэбны сёння найперш як орган, што акумулюе і фармуе беларушчыну. Відаць, так. Але для чаго тады патрэбныя ўсе іншыя органы дзяржаўнай улады ў Беларусі?

(А што тычыцца цэнзуры, то яна існуе практычна паўсюль, і ў дзяржаўных, і ў незалежных выданнях: у адных яна – лабавая і відавочная, у другіх – вытанчаная і прыхаваная.)

— Мяркуючы па чытацкай пошце «ЛіМу» і «Полымя», ці атрымліваюць творы сучаснай беларускай літаратуры якікольвечы рэзананс у грамадстве?

— Амаль ніякага, за выняткам заангажаваных сваімі публікацыямі аўтараў. *Нечытэльны час*. Адпаведна вельмі вузкім стаў аўтарскі актыў. Прапала рэха. Лесу няма, метафарычна кажучы. Як пісаў яшчэ юны А.Разанаў: «*тады выстойваюць падлескі, калі выстойваюць лясы*». І гэта тычыцца ўсіх беларускамоўных выданняў – дзяржаўных і незалежных. Сённяшняй уладзе выгадна, каб беларушчына драбілася, каб была вузкая нацгуртаўшчына, а не самасвядомая народная грамада. Я не сказаў бы, што, прыкладам, у холдынгу працуюць менш заангажаваныя нацыянальнай ідэяй творцы, чым у «Дзеяслове», «НН» ці «ARCHE»… (Некалькіх асобных малатворчых людзей супрацьлеглай арыентацыі ў нашай гаворцы апусцім і папросту забудзем…) Нехта не хоча супрацоўнічаць з Таісай, Раяй і Міколам? Дык і я не рвуся ў таварышы да Андрэя і Валеркі. І што з таго? Але ж незалежна ад гэтага я хачу тварыць нашу беларускую справу разам з такімі выданнямі, як «Полымя» і «ARCHE», «Маладосць» і «Дзеяслоў», «ЛіМ» і «НН»… Тады і розгалас пра нас шырэйшы будзе. І ацэнкі нашых мастацкіх твораў будуць больш аб’ектыўныя. І агулам наша беларуская справа вызначыцца настолькі поўна, наколькі яна ёсць насамрэч. Мы спазнаем сваю сапраўдную нацыянальную вартасць і грамадзянскую моц.

А то на словах ваяроў і герояў многа, а фронт усё на той жа (трамвайнай) лініі супрацьстаяння. Маю на ўвазе вуліцу Варвашэні…

Некаторы закапыліць губу і з прынцыпу не друкуецца ў выданнях холдынга, а ў іншых выданнях яго самога друкаваць не хочуць. І сядзіць ён ціхма за пісьмовым сталом – у «апазіцыі» да ўсіх і ўсяго – і лічыць сябе змагаром за лепшую беларускую долю. Маць тваю! На цябе б Булак-Балаховіча з яго ўдалымі хлопцамі!..

А другі так да грантаў звык, так ля іх прыгрэўся, такім рахманым стаў, што ўжо і забыўся, за што яму (ці ўсёй арганізацыі?!) тыя гранты дзесяць гадоў запар даюць. Хіба такое без Аляксандра Рыгоравіча магчыма?.. Жыве Лукашэнка!

— Ты нязменна бароніш і папулярызуеш творчасць «праклятых» паэтаў – Купрэеў, Сыс, Гадулька. Чаму?

— Абараняю? Ад чаго і каго іх абараняць? Ды і «папулярызую» – замоцна сказана… У нас нават музы**ы**кі *раскручваюцца*, не раўнуючы як клубок нітак: чым даўжэй раскручваюцца, тым хутчэй ён менее…

Я пражыў пяцьдзесят пяць гадоў. Нямала. І так напакутаваўся, крый Божа яшчэ каму… Столькі памылак нарабіў, кепства і для сябе і для іншых людзей! Да літаратуры я прыйшоў праз зямное пекла. І садзілі і лячылі. Па справе і без… Я ўдзячны Госпаду і блізкім людзям. Не за пекла, за літаратуру. Хоць разумею, што паасобку яны не даюцца…

Таму я спрабую зразумець такіх людзей. З імі цяжка. Часам проста паскудна і невыносна. Але каб не адступіцца ад іх, трэба ведаць, што **ПАЭЗІЯ** – мастацтва трагічнае. Яе творцы – таксама. Як ні дзіўна, ім амаль немагчыма дапамагчы пры жыцці, паколькі **ШЛЯХ** іх лёсавы, наканаваны. Змяніць яго накірунак – дарэмная трата сілаў. Можна толькі дапамагчы ім у пераадольванні гэтага шляху. А галоўнае – захаваць і перадаць нашчадкам іх нерукатворны плён. Гадулькі, Купрэева і Асташонка ўжо няма з намі. Трэба парупіцца, каб сабраць іх рукапісы і выдаць кніжкі. Гэта няпростая справа. Бескарысная. Але л**ю**дская. «*А так, кто б знал о нас*», – як пісаў адзін расейскі класік.

А мы ўсё больш пра сябе, «любімых», дбаем і думаем. Эпоха гэткая – тэхнакратычная. І людзі такія – прагматычныя. Пачытайце, што пішуць сёння маладыя на розных сваіх інтэрнэт-сайтах! Гэта ўжо вельмі блізка да таго, што яны напраўду думаюць – пра свет, пра нас і пра сябе. Тое, чым яны «жывуць у падкорцы галаўнога мозгу» – тое, што яны пакуль яшчэ ўтойваюць у сваіх творах, прызначаных для публічнага друку пад сваімі сапраўднымі імёнамі. Зрэшты і тут – свае *трагікі*, няхай і віртуальныя…

— Ці падтрымліваеш ты кантакты з былымі аднагрупнікамі па маскоўскім літінстытуце?

— Толькі з неардынарнай, і як след у паэзіі не ацэненай Галяй Булыкай, з якой жыву праз два тралейбусныя прыпынкі. Апроч кіраўніка нашага паэтычнага семінару паэта Юрыя Кузняцова

ды чачэнскага паэта Зелімхана Яндарбіева, ніхто на мяне асаблівага ўражання не зрабіў. Як, пэўна, і я на ўсіх іншых разам з вышэй згаданымі. Ні з кім ні аднаго разу не ліставаўся і не бачыўся. Нават у самой Маскве не быў з таго часу (1989 г.). А Яндарбіева з Кузняцовым ужо няма. Затое засталіся **Ічкерыя** і **Паэзія**…

— Ведаю, што ты ўважліва сочыш за літмоладдзю. Ці падрастае змена?

— Большасць з таго, што час ад часу з'яўляецца ў перыядычным друку, не ўражвала. Былі, праўда, паасобныя рэдкія спробы здзіўлення… (Агаварыся, што буду згадваць маладых, маючы на ўвазе ўзроставы цэнз.) Ярына Дашына з Берасцейшчыны, Юрась Чарнякевіч з Пінска, Андрэй Ключнікаў і Віка Трэнас з Менска… Хоць цэльнага ўражання, апроч Ярыны Дашынай, ніхто з названых пакуль не выявіў. Тады-сяды нешта з'яўляецца і ў прозе. Але тут я менш абазнаны, можна сказаць, дылетант. Шкада, што наша сучасная флегматычная крытыка мала турбуецца пра маладое дзёрзкае пакаленне беларускіх творцаў, не адсочвае іх здабыткаў і пралікаў, не фармуе іх мастацкіх напрацовак для вызначэння заўтрашняй культурнай і духоўнай прасторы…

З крытыкаў адзначыў бы Данілу Жукоўскага з Горадні і Сяргея Грышкевіча з Берасця, асабліва першага… Не так і мала, улічваючы мае асабістыя прыхільнасці і чыста суб'ектыўны выбар.

— Калі б цябе прызначылі дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» і прапанавалі сфармаваць тэмплан на свой густ, якія пяць кніг ты надрукаваў бы ў першую чаргу?

— Такое ні пры якім раскладзе немагчыма, але працягваючы «гульню», адказаў бы так: найперш я выдаў бы тых, каго ўжо няма з намі: «Выбранае» Міколы Купрэева (паэзія і проза), «Выбранае» Алеся Асташонка (проза, эсэ, інтэрв'ю). А ў дадатак – томік вершаў Юрася Пацюпы, а ў серыі «дэбют» першыя кнігі Наталлі Кучмель і Ярыны Дашынай. Кажу гэта так, для блізіру, асабліва не ўзважваючы ўласнага пожаду і чытацкага попыту,

калі ён увогуле на мастацкую літаратуру яшчэ ёсць…

— Як табе «аранжавая» рэвалюцыя ва Ўкраіне?

— Я не прапусціў аніводнага выпуску НТВэшных навін. Праўду кажучы, мне нават не так важнай была перамога Юшчанкі, як перамога самой нацыянал-дэмакратычнай апазіцыі. Я перажываў за «самостійну Украіну», якая падпірала б нас з Поўдня да паўночнай Балтыі, змушаючы гэтым разам выбіраць канчаткова паміж імперскай Расеяй і цывілізаванай Еўропай… Думаю, нашым БАТЭшным барысаўскім барабаншчыкам было чаму павучыцца ў барабаншчыкаў на кіеўскім Майдане…

— Калі ты чытаеш свае артыкулы 1980-х гадоў, у якім святле ты бачыш сябе тагачаснага?

— Я бачу сябе ў тлумным і цмяным святле брэжнеўскага запойна-застойнага часу. Мяркую, што пры мажлівасці я мог бы і сёння вярнуцца туды без асаблівых псіхалагічных праблем і комплексаў. Мне там не соладка жылося, аднак, як ні дзіўна, у тым часе мне хораша і вольна думалася, узвышана і ўзрушана пісалася… Штодня не пакідала надзея на лепшае. І яно, хоць і з цяжкасцямі (праз церні!), але паступова наступала. Урэшце, я дажыў да ясных дзён перабудовы і беларускай незалежнасці… Дзіўна, але тады ўсё і супынілася… Цяпер у мяне ўжо няма надзеі на **СВОЙ** заўтрашні светлы дзень. Старасць безнадзейная.

Але ж затое такі спадзеў (нават, можна сказаць, упэўненасць!) ёсць у маёй шаснаццацігадовай дачкі. І гэта не *ружовыя* мроі, а самая што ні на ёсць набліжаная верагоднасць. То чаго ж мне наракаць на свой прамінулы і неадназначны час?

Я пражыў яго сумленна, не здрадзіўшы ні Паэзіі, ні Айчыне, ні Жанчыне…

— Які са сваіх ранейшых перыядаў жыцця ты лічыш найбольш плённым, цікавым, значным?

— Той, дзе мне ўдавалася быць самім сабой. Недзе паміж першай і трэцяй гадзінамі ночы…

— Ці ёсць у нас цяпер, пасля смерці Васіля Быкава, кандыдат на атрыманне Нобелеўскай прэміі?

— Я выкажу ўласную думку, якая ў мяне не мянялася цягам апошніх дваццаці гадоў. Васіль Быкаў – найвялікшы савецкі пісьменнік. Затоены глыбакадумны *дысідэнт* камуністычнай эпохі. Ён не мог быць узнагароджаны гэтай прэміяй не толькі з прычыны атрымання з рук савецкай улады Ленінскай прэміі і звання Героя Сацыялістычнай Працы, але і з прычыны звужанай літаратурнай тэматыкі, якая, пачынаючы з сярэдзіны 1980-х, ужо не мела ў заходнім свеце чытацкага попыту. Разблытваць жа ўнутраныя і псіхалагічныя калізіі чалавечых характараў ягоных герояў ніхто ў Еўропе, на жаль, не захацеў… І дарма. Не падабаўся мне ў той сітуацыі з вылучэннем Васіля Быкава на Нобелеўскую прэмію ўзняты ажыятаж вакол гэтага «беларускага праекта», а падчас і проста гвалт і маленне-ўпрошванне: «*Ну дайце, дайце нам гэтую прэмію, мы ж так прыгнечаныя цяперашняй таталітарнай уладай і так доўга закабаленыя расейскім шавінізмам, што мала каму ў свеце і вядомыя, дык дайце ж гэтую прэмію нашаму Быкаву, а значыць, і ўсёй беларускай нацыі – і мы ўстрапянёмся, развінём свае плечы, і «тым пераможам*»… Там да падобных ставяцца непаважліва і гідліва. Трэба мець гонар. (Праўда, кажуць, што быццам бы дзеля атрымання гэтай прэміі І. Бродскі калісьці выгульваў сабачку адной немалаважнай *прыкамітэцкай* дамы…) Нашы ж, прабачаюся, паспрабавалі «выгульваць» перад *камітэцкай* публікай свайго слыннага – старога і хворага – пісьменніка. Прабачце, Васіль Уладзіміравіч.

Уласна ў мяне быў і ёсць свой кандыдат на Нобелеўскую прэмію. Яго ўсе ведаюць, але чамусьці не ўсе любяць. Гэта чалавек, які першым паказаў нам кірунак да дэмакратычных каштоўнасцяў, напісаўшы (і выдаўшы ў 1981 г.!) **свой «Шлях**-360». Алесь Разанаў. Менавіта праз ягоную творчасць мы можам заявіць, мне думаецца, пра сябе ў сучасным свеце як пра высокадухоўную, высокамыслярскую нацыю з вялікім гістарычным мінулым і не менш значным будучым. Чалавек і Паэт (плоць і дух) у асобе Разанава гарманічна супалі. Еўрапейская эліта XXI стагоддзя павінна нарэшце заўважыць яго інтэлектуальныя высілкі і ацаніць па заслугах…

Між іншым, заўважу, што высокі статус Нобелеўскай прэміі ў інтэлектуальных колах з кожным годам зніжаецца. У маім разуменні цяпер гэтая прэмія не столькі вызначае і вылучае высокамастацкія творы з агульнага літаратурнага шэрагу, колькі выяўляе *элітарна-саноўнаму свету* самога аўтара, на якога, з тых ці іншых прычын, выпаў такі неспадзявана-шчаслівы вырак (найперш матэрыяльны)…

Вядома, што і Алесю Разанаву Нобелеўская прэмія таксама нічога істотнага не дадала б. Але ж хоць грошы былі б. І не ў каго-небудзь, а ў свядомага беларуса…

Снежань, 2004

Гутарыў Алесь Аркуш
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image] [image] 2005

"да Зьместу"

паэмыка • аналітыка • крытыка • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Арцём Арашонак Сны дзяцей

АРЦЁМ АРАШОНАК (нар. у 1981 г. у віцебску) – выпускнік літаратуры філялягічнага факультэту віцебскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Апошняя публікацыя – дзёньнікавыя нататкі «Маўчу» (Дзеяслоў. 2004, № 12). Жыве ў Віцебску.

Узросты *немаўляці* і *ранняга дзяцінства* беларускай літаратуры мінулі. Надышоў *ранні дашкольны ўзрост* – узрост «чамучкі». І пасыпаліся пытанні з усіх бакоў: «Чаму нас ніхто не чытае? Чаму мы не такія, як усе? Чаму не даюць Нобелеўскай прэміі за літаратуру?»

Гэта не простая цікавасць прадстаўнікоў маладой літаратурнай эліты, гэта відавочная супярэчнасць паміж двума ўяўленнямі. З аднаго боку, беларуская літаратура адчувае моцны ўплыў больш сталай, вялікай і багатай культуры Расеі, а з другога – не менш моцны ўплыў дасведчанага, сталага еўрапейскага і амерыканскага пісьменства. Узрост нашай культуры яшчэ характарызуецца засваеннем мовы: цяпер дзеці з гарадскіх расейскамоўных (нават этнічна расейскіх) сямей вывучаюць беларускую мову, з’яўляюцца пераклады. Нам, дзецям у сусветнай культуры, пакуль уласцівая мегаламанія («наша літаратура – самая лепшая»), няздольнасць здабыць пазіцыі еўрапейскага і расейскага кніжнага рынку. Яшчэ ніколі Нобелеўскім камітэтам не прысуджалася прэмія па літаратуры шасцігадовым дзецям. Сярэдні век лаўрэатаў – 60–70 гадоў. Самым маладым быў Кіплінг – 42 гады. Да Нобеля беларускай літаратуры трэба дарасці. Адчуваю папрокі: «А як жа Васіль Быкаў? Ён жа мог атрымаць прэмію!» На што адкажу: спадар Васіль у ваеннай тэматыцы працаваў пасля Хемінгуэя

(Нобель-1954), пачынаў, калі Рэмарк ужо напісаў (ён таксама вылучаўся) свае не менш таленавітыя раманы. Апошнія ж творы Быкава падпадаюць пад нацыянальны эгацэнтрызм, у іх боль за Радзіму, які блізкі нам, але не зразумелы ў астатнім літаратурным свеце.

У маёй хатняй бібліятэцы стаяць дзве таўшчэзныя таміны абрыкосавага колеру – раман Ражэ Мартэна дзю Гара «Сям'я Тыбо». Ніколі не чытаў, ахвоты не было корпацца ў французскім побыце пачатку XX стагоддзя. Але з асалодай перачытваю «Ірландскі дзённік» Генрыха Бёля і «Тысячакрылага жорава» Кавабаты. Першую кнігу чытаў у арыгінале – па-нямецку, другую ў перакладзе – па-расейску. Абедзве згаданыя кнігі – творы нобелеўскіх лаўрэатаў. На сённяшні дзень, каб пазбавіцца літаратурнага інфантылізму, неабходна перакладаць і перакладаць кнігі па кіно, тэатры, мастацтве, навуцы. Стварыць культурны падмурак для наступных генерацый літаратараў на мове тытульнай нацыі. Я проста дзіўлюся, калі чую: «Навошта перакладаць трактаты Дзюрэра, лісты Гагена і Ван Гога, мемуары Жана Марэ, Клаўдзіі Кардынале, па-расейску ж ёсць?» Ёсць, але, можа, досыць мяць цыцку? Час ужо навучыцца есці лыжкай.

Для многіх айчынных літаратараў Нобелеўская прэмія як салодкі дзіцячы сон, у якім матуля – прыгожая і шчаслівая – ідзе ў краму і купляе чыгунку фірмы *PIKO*. Сяргей Рублеўскі, выдатны літаратурны стыліст, у сваім апавяданні «Лаўровая лісцінка ад пана Нобеля» сціпла пераносіць уласную запаветную мару на героя Андрэя, які жадае атрымаць прэмію выключна з-за меркантыльных памкненняў, з-за грошай. Ілля Сін не саромеецца, піша Нобелеўскую лекцыю. Напісаць Нобелеўскую лекцыю можна і за паўгадзіны, але напісаць літаратурны твор, дакладней серыю твораў, якія папярэднічаюць ёй, – немагчыма.

Падсвядома атрымаць прэстыжную ўзнагароду мроілі многія майстры слова. Гэта адчуваеш па самакрасаванні ў раманах Генры Мілера, але зроблена гэта бездакорна, на высокім узроўні. Яшчэ больш адчувальна гэта ў Набокава. Ён, як пакрыўджаны хлапчук, піша ў Палерма: «Замежныя расейцы

чытаюць савецкія раманы, захапляючыся кардоннымі данцамі на гэткіх жа кардонных хвастах-падстаўках альбо тым лірычным доктарам з лубочна-містычнымі павевамі...»

А што вартага напісалі айчынныя пісьменнікі, што хацелася б перачытваць, што б адкрывала новы пласт рэчаіснасці? Лягчэй заангажаваць сябе ў палітыцы, учыніць сварку на старонках газеты альбо напісаць кнігу «Разбурыць Парыж». Парыж стаяў і будзе стаяць, стомленасць нашых пісьменнікаў гэтай сталіцай пасля правінцыі – толькі іх уласная праблема. Гэта дзіцячае хныканне: «Мама, я стаміўся, у мяне ножкі баляць, давай з'едзем з Парыжа». Негатывізм – перанос адказнасці на іншага – вельмі часта сустракаецца ў дзяцей: «Гэта не я, гэта ён!» Французская літаратура ў 1937–1938 гг. на беларускую мову перакладалася шчыра, кніга выходзіла за кнігай! Прыйшлі «Разбуральнікі Парыжа» – і дзесяткі таленавітых людзей, аснову нацыі, павезлі ў Курапаты. Што засталося? Вялікая культура, якую беларусы – на думку Акудовіча – не бачылі з-за сталіцы вялікіх мастакоў? Не! Месца элітарнай культуры занялі песенькі-дрындушкі «Цячэ вада ў ярок», панельныя гмахі і наіўнае мастацтва. Бабуля Мозес, калі выйшла на пенсію і занялася жывапісам, марыла трапіць у Луўр, але трапіла ў музей Клеменс-Сельс.

Парыж жыве, жыве і малады, паспяховы празаік Фрэдэрык Бегбедэр (патэнцыяльны прэтэндэнт на Нобеля), сур'ёзна займаецца літаратурай, у яго «Прыпавесцях пад экстазі» знойдзеце і Беларусь. Аўтар змясціў яе ў спісе экзатычных краін. Мсье Фрэдэрык не прыедзе ў Менск, але 1 снежня 2004 года адбылася ягоная сустрэча з чытачамі ў Пецярбурзе.

Сярод дзяцей ёсць таленавітыя і адораныя, у працы з якімі можна дасягнуць сусветных поспехаў. Нобелеўскі лаўрэат ад беларускай літаратуры – гэта дзіця з добрай сям'і, вундэркінд з невычарпальнай энергіяй, які ведае некалькі моваў і літаратур, мае выдатныя веды ў галіне міфалогіі, філасофіі, тэалогіі, жывапісу, тэатра, кіно і архітэктуры. Сённяшнюю перспектыўную літаратуру я б падзяліў умоўна на дзве ўзроставыя групы: першая – *малодшы школьны ўзрост* (пісьменнікі, якія апярэджваюць развіццё айчыннай

літаратуры). Гэтыя літаратары народжаны ў асноўным у 1945–1950-я гг.: Алесь Разанаў, Пятро Васючэнка, Вольга Іпатава і Франц Сіўко. Другая – *немаўляты*, «да-да» маладых літаратараў, народжаных у 1980-я гг., пры дасканалай працы гувернантак, рэпетытараў зробіцца палымянай Нобелеўскай лекцыяй. Вось імёны, якія вартыя ўвагі: Вальжына Морт (Вольга Мартынава), Вольга Гапеева, Анатоль Івашчанка і Ігар Пракоф'еў (ён нарадзіўся ў 1973). Ні ў якім разе нельга ставіць толькі на аднаго творцу, бо шлях да прызнання доўгі, нехта можа не вытрываць, кінуць літаратуру, як кідаюць дзеці свае ўлюбёныя цацкі.

Давайце глыбей зірнём на вартасці вышэй названых мною творцаў. Акрамя літаратурных вартасцяў я браў ва ўлік і вонкавы выгляд, і мілагучнасць прозвішчаў аўтараў, бо не можа Зміцер Вішнёў з яго даліянскімі манерамі з'явіцца перад каралевай у труне альбо выпацканы сочывам. Усе кпяць з айчыннага авангардыста, ставяцца да яго несур'ёзна, але ён таленавіты і меў бы не меншыя шанцы, чым ніжэй прыведзеныя мною асобы, тым не менш спадар Зміцер гэтак і не вырас са свайго веку дзіцячых мрояў.

Алесь Разанаў – бясспрэчны майстар паэзіі, мае пераклады ўласных кніг на іншыя мовы. Ён не ішоў на кампраміс з уладай ні ў студэнцкія, ні ў пасляперабудовачныя гады, і займаўся літаратурай. Займаўся сур'ёзна. Адсутнасць мэтанакіраванай падтрымкі з боку аднадумцаў зрабіла сваю справу, паэт з'ехаў у Нямеччыну. Цяпер выходзяць ягоныя кнігі па-нямецку. Выходзяць, але позна. Мала каго сёння здзівяць эксперыменты 1960–1970-х гадоў у постдадаісцкай нямецкай літаратуры. Праз незапатрабаванасць на радзіме, тытанічную працу над перакладам уласных кніг Разанаў пачаў меней пісаць, пісаць, на мой погляд, не так глыбока і пранікнёна. Чаму ўсё ж бачу яго намінантам на прэстыжную прэмію? У Алеся Разанава застаўся боскі талент і, спадзяюся, не дашчэнту растрачаная энергія з глыбокімі ведамі.

Пятро Васючэнка з'явіўся ў літаратуры, як позняе дзіця. Праца над сабой, засваенне фундаментальных ведаў па літаратуры, воля да высокага ўражваюць: выдатныя п'есы («Пясочны

гадзіннік» – п’еса, пабудаваная на вечна актуальнай пары смерць–жыццё), якія чакаюць сваіх пастановак яшчэ ў Беларусі, а ёсць жа замежныя тэатральныя фестывалі. Удзел у іх ёсць сведчаннем не ізаляванасці ад еўрапейскай культуры, а здольнасці гарманічна існаваць у ёй. Праца на тэлевізіі, радыё, перадача «Адкрыты архіў» надае цікавай асобе яшчэ адну грань. Спадар Пятро арганічна ўводзіць беларускую літаратуру ў сусветны кантэкст, пісьменніка адрознівае здольнасць аналізаваць, супастаўляць несупастаўляльнае (дзеці пяці гадоў аб’ядноўваюць таксама несупастаўляльнае: аблокі–шалік, бо яны мяккія).

Вельмі сардэчная і шчырая Вольга Іпатава стварыла самы значны твор пачатку XXI стагоддзя. «Альгердава дзіда» – гэта фрэска, у якой спалучаецца вялікая мастацкая школа, глыбіннае веданне чалавечай псіхалогіі і культуры, іх увядзенне ў беларускі кантэкст пры пазбяганні местачкова-народных матываў. Смеласць, цвёрдая грамадзянская пазіцыя акумулююцца ў выдатных творах (дзіцячае непрыманне ў дачыненні да дарослых: «Бацька, я разумею сама, што мне трэба»). Трэба мець смеласць, якая не ўласціва часам многім дзяржаўным мужам, каб адкрыта сказаць уладару краіны праўду. Колькі прыйшлося вытрываць спадарыні Іпатавай плебейскіх нападак і ў прэсе, і на тэлебачанні, і на радыё. Вытанчанасць і арыстакратызм вялікай ва ўсіх праявах жыцця жанчыны дазваляюць мне сцвярджаць, што яна вартая вылучэння на высокую ўзнагароду.

Сучасныя і бескапрамісныя творы Франца Сіўка, якога ў адной з газет вельмі трапна ахрысцілі «паўночны і каталіцкі творца». Гэты аўтар стаў «джокерам» у калодзе шасцёрак як у дзяржаўным «Полымі», так і ў незалежнай «Нашай Ніве». Я наўмысна яго вылучаю: спадар Франц – чалавек сціплы, пазбягае тусовак, якія нічога не даюць творцу, акрамя зайдроснікаў. Адукаваны, высакародны празаік і перакладчык з польскай і расейскай развіў свой уласны, непадобны да іншых, стыль. Ягоныя творы – гэта пакаянне за юначыя грахі, за бязвер’е, за бяздушнасць суайчыннікаў. Многія апавяданні хочацца перачытваць: «Шанц», «Мыйшчык Лёха», «Пеклы», «Рэфлексія: смерць». Ніколі не ўключаць у падручнікі

абачлівыя супрацоўнікі Міністэрства адукацыі аповесць «Удог», ды ўвогуле яго творы нікуды не ўключаць. Чую пярэчанні: «Каму ў Вене або Мілане цікава чытаць пра пакуты беларускага народа?» Адкажу: «Трэба перакласці, бо падыход да праблемы нестандартны, гэта можа зацікавіць замежнага чытача». У мініяцюрах аўтар раскрывае свае дзіцячыя перажыванні, адлюстроўвае стан цяперашняга, парадаксальна-паранаідальнага грамадства. Нельга сказаць, што крытыка абмінула Франца Іванавіча. На яго пішуць як хвалебныя, гэтак і сварлівыя рэцэнзіі. Цікавы аўтар яшчэ і тым, што ён займеў літаратурнае прызнанне, жывучы не ў сталіцы. Як і астатнім, яму патрэбныя перакладчыкі і прамоўтары.

Калі старэйшае пакаленне патрабуе актыўных інвестыцый, то маладзейшае пакаленне не чакае лепшых часоў, яно вывучае мовы, робіць пастаноўкі, інтэрнэт-праекты, займаецца перакладамі, удзельнічае ў міжнародных конкурсах.

Абаяльная Вальжына Морт смела і дзёрзка рушыць у літаратуру. Яе вершы перакладаліся на балгарскую, латышскую і нямецкую. Спадарыня Вольга выдатна ведае некалькі моваў, мае моцную адукацыю Лінгвістычнага універсітэта, сама выкладае. Твор «Гопнікі» вылучаецца на фоне сучаснага моладзевага фарсу. «Гопнікі» блізкія па эстэтыцы і манеры да стылістыкі Эльфрыды Елінэк. Аўстрыйская аўтарка, няшчасная па жыцці (сябра камуністычнай партыі з 1974 года) пратэстуе супраць сытага капіталістычнага грамадства, Вальжына, наадварот, супраць калгасна-абшчыннага ладу, які пазбаўляе чалавека адзіноты, індывідуальнасці. Крытыкі Леанід Галубовіч і Любоў Гарэлік цкавалі дзяўчыну за яе залішнюю натуралізацыю, неадпаведнасць эстэтычным катэгорыям узвышанага і прыгожага. Мастак – чалавек вольны, нясе адказнасць толькі перад Богам; калі твор зроблены па-майстэрску, іншыя пытанні адпадаюць. На фестывалі «Віленіца-2004» элегантная Вальжына атрымала пацвярджэнне свайму таленту – «Крышталь Віленіцы», які стаў супакаеннем для яе прыхільнікаў і мазалём для зайздроснікаў. Для больш сур'ёзных перамог аўтарцы неабходна працаваць і далей.

Сімпатычная Вольга Гапеева, як і Вальжына Морт, выпускніца

Лінгвістычнага універсітэта. Аўтарка глыбокага, псіхалагічнага рамана ў дэталях «Рэканструкцыя неба». У ім выявіліся добры густ, падлеткавая наіўнасць і бунтарства, за якімі хаваецца бліскучае веданне сусветнай культуры. Вольга займаецца перакладамі з нямецкай і ангельскай моваў, на гэтыя ж мовы перакладаліся і яе творы. Мае цікавыя знаходкі ў паэзіі. Пры тытанічнай працы над сабой, падтрымцы аднадумцаў, у Вольгі ёсць усе шанцы атрымаць самую запаветную літаратурную прэмію.

Высокі і статны Анатоль Івашчанка запамінаецца сваім інтэлектуалізмам, але не маскарадным, а адстаронена-халодным, амаль мізантрапічным. Анатоль не баіцца эксперыментаў, выдатна разбіраецца ў сучаснай культуры, мае філалагічную адукацыю, удзельнічае ў інтэрнэт-праектах, піша тэксты песень. Пры жалезнай волі і бездакорным гусце ў яго можа ўсё атрымацца.

Ігар Пракоф'еў, які цяпер амаль невядомы, запомніўся мне сваімі геніяльнымі мініяцюрамі, што былі надрукаваныя ў «ЛіМе» і «Маладосці» ў 2003 годзе. Ён нарадзіўся ў Цюменскай вобласці, не гаварыў па-беларуску, але бліскуча пісаў на гэтай мове. Самотны, з глыбокімі, удумлівымі, але і па-дзіцячы даверлівымі вачыма псіхолаг Ігар, які працаваў качагарам, зрабіў на мяне гэткае ўражанне, як і Рубен Давід Гансалес-Гальега з раманам «Чорным па белым». Што з Ігарам цяпер – я не ведаю. Спадзяюся, ён здаровы і працягвае пісаць, бо літаратурны палёт быў вельмі высокі. З разумнымі перакладчыкамі і прамоўтарамі ён мог бы зрабіцца сусветнавядомым аўтарам.

Магчыма, ёсць асоба больш вартая для Нобеля за літаратуру, якой я не ведаю, але якая пляваць хацела на ўсе прэміі і піша ў сто разоў лепей за Разанава, Васючэнку, Іпатаву, Сіўка, Морт, Гапееву, Івашчанку і Пракоф'ева, валодае шаманскай магіяй альбо адзначана Боскаю ласкай, не працуе на дзяржаўнай службе, бухае ананасны лікёр з Гаваны, любіць усё чалавецтва і аднойчы, кінуўшы літаратуру на дваццаць год, здольная з'ехаць разам з Ахмаду Курума лекаваць дзетак у Кот-д'Івуары, а вечарамі тлумачыць ім ля мора, куды дзяюцца жоравы на

ўзбярэжжы ці баіць на ноч казкі. Афрыканскія дзеці таксама сняць пра снежаньскія святы ў Стакгольме. Сны часам збываюцца.

Снежань, 2004

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

[image]

[image]

[image]2005

[image] [image] [image] **УЛАДЗІМЕР КОНАН**

Уладзімір Конан Беларусь на мяжы цывілізацый (нар. 23.04.1934 г. у вёсцы Вераскава Наваградзкага раёну) філезаф. пазалетась выдаў кніжку «Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэньне ў Беларусі».

Мінарыя (9’2000)

Беларуская класічная літаратура не была ні правідэнцыяльнай, ні фаталістычнай, ні, тым больш, «занадта сацыялізаванай», як гэта здаецца сёння сяму-таму з маладзейшых літаратараў. Бо па аналогіі з ёю можна было б з такой жа падставай казаць пра «занадта сацыялізаванае вучэнне Ісуса Хрыста – аўтара прыпавесці пра Лазара Беднага і ягонага багатага брата. Паводле той жа логікі (ненавуковай, хутчэй імпрэсіяніcцкай) можна было б назваць «сацыёлагам» аўтара энцыклікі «Rerum Norarum» (1891 г.) Папу Рымскага Льва XIII або яго паслядоўніка Папу Яна Паўла II, аўтара энцыклікі «Centsimus annus» (1991 г.), якія шукалі альтэрнатыву да палярызацыі людзей на бедных і багатых.

Усе вялікія і малыя рэвалюцыі ды іхнія наступствы – смерці, катастрафічнае паніжэнне маралі і культуры на масавым узроўні – ад таго бяздоння, што аддзяляе бедных і багатых. Вялікія рэвалюцыі XVII–XX стст. пахавалі пад сабой сацыяльную і шляхетную эліту – дваранства. Вынікі гэтай сацыяльнай катастрофы – трагікамічнае паніжэнне культуры на ўсіх узроўнях. Не дваранства было галоўным віноўнікам сацыяльнай і нацыянальнай несправядлівасці, зайздрасці, адмовы ад спрадвечных маральных імператываў. Відавочная

праўда, якая чамусьці не заўважаецца: дастаткова было б выконваць дзесяць запаведзяў Старога Запавету, каб унікнуць войнаў, рэвалюцыяў, дзяржаўнай тыраніі і перыядычных генацыдаў. А дабравесці Хрыстовай з Нагорнага казання было б дастаткова, каб абысціся без дзяржаўнага Левіяфана, які заўсёды раздзяляў людзей на бедных і багатых. За дваццаць стагоддзяў хрысціянству так і не ўдалося ахрысціць гэтага Левіяфана – вялікія імперыі. Хрысціянскія ідэалы сталіся асабістым выбарам чалавека.

Лёс беларусаў аказаўся такім жа, як даўніх «сялянскіх» народаў – земляробаў, садоўнікаў, жывёлаводаў, акружаных імперскімі левіяфанамі. Юдзейскія этнасы біблейскай эпохі аказаліся ў аблозе Асірыйска-Вавілонскай, Егіпецкай, Персідскай, урэшце, Рымскай імперыяў. Метады каланізацыі ўсюды і заўсёды аднолькавыя: генацыд, вынішчэнне сацыяльнай і культурнай эліты, рассеянне народу па вялізных абшарах імперыі. Замест нацыі з моцным этнічным ядром – нейкі хімерны этнас-мяшанка на ўзор Галілеі, што ўзнікла на прасторы былой Ізраільскай дзяржавы. Беларусы былой імперыі, якая вынішчыла беларускую інтэлектуальную і сялянскую эліту ды рассейвала народ па вялізным абшары, засяляючы Беларусь сваімі агентамі-«культуртрэгерамі», сёння аказаліся нацыянальна свядомай меншасцю на сваёй зямлі, ператворанай у еўразійскую Галілею.

Сучасную драму беларускай нацыі не хочуць зразумець павярхоўныя сацыёлагі, гісторыкі, палітыкі і ўсе тыя, хто бачыць Беларусь і беларусаў толькі як аб'ект «эпохі Лукашэнкі».

Каб зразумець прыродны або касмічны аб'ект, а тым больш чалавека, народ, нацыю, патрэбна бачыць яго ў трох вымярэннях: мінуўшчыне, сучаснасці і верагоднай будучыні. Такое бачанне народу ёсць гістарычнае і несумяшчальнае з банальнымі «мненіями». Для старонняга наглядальніка Беларусь падаецца *terra incognita*, штучна створанай бальшавікамі і адноўленай пасля «выпадковага» распаду СССР. Сотні фактаў сведчаць: бальшавікі не ствараліі, а метадычна разбуралі беларускую нацыю, спачатку варварскімі метадамі

знішчэння яе эліты, пазней «ліберальнымі» метадамі – расцярушаннем этнічнага ядра нацыі па бяскрайніх прасторах імперыі. Урэшце, прыёмам «задушэння ў абдымках», сёння найбольш эфектыўным метадам дэнацыяналізацыі «малых» народаў.

Дзяржаўная гісторыя Беларусі мела сваю спецыфіку, але тыпалагічна паўтарыла (са спазненнем на некалькі стагоддзяў) гістарычныя этапы заходнееўрапейскага рэгіёну. Праўда, сярэднявечная Еўропа атрымала ў спадчыну культурную традыцыю антычнай цывілізацыі. Але і ўсходнееўрапейскія княствы даўняй Русі перанялі яе фрагменты праз хрысціянства ад Візантыі, дзе сфармавалася еўра-азіяцкая «рэпрыза» грэка-рымскай культуры. Пазней Вялікае Княства Літоўскае аб'яднала былых геапалітычных канкурэнтаў і далучылася да цэнтральна-еўрапейскага макрарэгіёну хрысціянскай цывілізацыі.

ВКЛ было не спецыфічна нацыянальным, а міжэтнічным дзяржаўным утварэннем. Не была польскай нацыянальнай дзяржавай канфедэратыўная Рэч Паспалітая. Яе гістарычная місія заключалася ў тым, каб выгадаваць у міжэтнічнай творчасці беларускую, літоўскую, польскую, украінскую нацыі. Не выпадкова культура гэтай унікальнай у Еўропе прававой і дэмакратычнай дзяржавы стала агульнай спадчынай узгадаваных ёю нацыяў. Рэч Паспалітая была геапалітычнай неабходнасцю, бо паасобку беларусы, літоўцы, палякі, украінцы не ўстаялі б ад імперскай экспансіі з чатырох бакоў свету – усходу (Маскоўскае царства), захаду (германскія дзяржавы), поўдня (Турцыя з яе крымска-татарскім фарпостам), поўначы (шведскія прэтэнзіі на Прыбалтыку). Эпоха Сярэднявечча і Новага часу – гэта этапы экстэнсіўнай эканоміі і адпаведнай ёй палітыкі: хто аказваўся дужэйшым, больш цэнтралізаваным, той няспынна пашыраў зоны свайго ўплыву.

Рэлігійныя, культурныя, геапалітычныя супярэчнасці моцна аслабілі беларускую этнічную супольнасць у XVIII–XIX стст., якая складалася пераважна з вясковага сялянства і фальваркавай шляхты. Гэта запаволіла працэс нацыянальнай кансалідацыі беларусаў. Рэч Паспалітая стала ахвярай трох

агрэсіўных імперыяў – Расеі, Аўстрыі і Прусіі, хаця паводле яе нерэалізаваных дэмакратычных канстытуцыяў 1791 і 1793 гг. яна магла б трансфармавацца ў нацыянальныя дзяржавы яшчэ ў XIX ст. Зусім верагодна, што ў гэтым варыянце геапалітычнай структуры не адбылася б Першая сусветная вайна 1914–1918 гг. Праўда, вайна гэтая закончылася поўным паражэннем ворагаў Рэчы Паспалітай – Расейскай, Германскай і Аўстра-Венгерскай імперыяў. На іх развалінах адрадзіліся Польшча, Фінляндыя, Літва, Латвія, Эстонія. Беларусь і Украіна не атрымалі адэкватнай ваеннай, палітычнай, эканамічнай і дыпламатычнай падтрымкі з боку пераможцаў – дзяржаваў Антанты. Дэмакратычнай Еўропе і ЗША тады не ўдалося (або не хацелася) падавіць у самым зародку ні расейскі бальшавізм, ні крыху пазней нямецкі фашызм. Страшныя наступствы Другой сусветнай вайны дэталёва апісаны і засталіся ў памяці нашых сучаснікаў. На жаль, вайна закончылася крахам толькі гітлераўскага Райху, і на карысць нямецкай нацыі, сёння самай моцнай і багатай у Еўропе.

Сучаснасць і будучыня застаюцца шматвектарнымі, пакуль падзеі праграмуюцца, а дзеячы робяць свой выбар. Свабода выбару ёсць боскі дар чалавеку. Але якраз тут праходзіць мяжа паміж дабром і злом. Дабро – гэта гарманічнае міжнацыянальнае супрацоўніцтва дзеля сацыяльнага прагрэсу. Зло – гэта аднаўленне тэрытарыяльных імперыяў і падрыхтоўка да вайны. Ідэальны варыянт для Беларусі пакуль – сцвердзіцца нейтральнай дзяржавай на памежжы Усходняй і Заходняй Еўропы. Пры ўмове, калі Захад у асобе НАТО і Расея загарантуюць гэты нейтралітэт.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

Мігрыя (3'2000)

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image]2005
Гісторыка-філасофскі часопіс
**гісторыка • філасофія • палітыка • эканоміка • сацыялогія • права • палітычная навука • культуралогія • этналогія • археалогія • археаграфія • археаметрыка • археаінфарматыка • археаграфія • археаметрыка • археаінфарматыка • археаграфія • археаметрыка • археаінфарматыка

бургундцаў. Я перакананы, што гэтыя межы – глыбока натуральныя, што яны абрысоўваюць вельмі старыя існасьці, сфармаваныя яшчэ да ўсталяваньня дзяржаўных утварэньняў. Неўзабаве новыя дзяржаўныя ўтварэньні наклаліся на іх і часткова іх згладзілі.

Існуюць два розныя падыходы да пытаньня пра межы Эўропы – пры дапамозе вонкавых фактараў, якія вызначаюць, што ўваходзіць у Эўропу, і пры дапамозе ўнутраных, якія вызначаюць, што ў яе не ўваходзіць. Я буду прытрымлівацца апошняга падыходу.

Першы абрыс Эўропы – імпэрыя Каралінгаў. Гэты абшар ляжыць і ў цэнтры сёньняшняе Эўропы. Імпэрыя Каралінгаў фармуецца незалежна ад другое вялікае дзяржавы, усходнярымскае імпэрыі, якая ня пала, маючы выразную мяжу з арабскага боку і барбарскую пэрыфэрыю на поўначы – краіну славянаў, больш ці менш упарадкаваную варагамі, з цэнтрам у Кіеве. Імпэрыя Каралінгаў мае падобныя межы: выразна вызначаныя ў Каталёніі і Арагоне, дзе вядуцца войны з тым жа арабскім захопнікам, яны размываюцца на ўсходзе і поўначы, дзе імпэрыя суседзіць з барбарскімі народамі: аварамі і вугорцамі з прыдунайскае раўніны, саксамі зь нямецкіх земляў; яна лёгка дасягальная для скандынаўскіх купцоў і няўлоўных піратаў.

Калі памёр Карл Вялікі, ужо даўно існавала рэлігійная еднасьць. Арыянскія раскольнікі былі пераможаныя. Рымскі біскуп распасьцёр свой патрыярхат на ўвесь Захад. Манаства, чый аскетычны і анархічны стыль пашырыўся быў з Ірляндыі на частку кантынэнту, было падпарадкавана суворaму статуту сьвятога Бэнэдыкта.

Аднак гэтая ўнутраная еднасьць суправаджаецца расколам у адзінай хрысьціянскай Царкве. Вера, безумоўна, была тая ж самая, але, паколькі цывілізацыйная адлегласьць паміж дзьвюма часткамі колішняе Рымскае імпэрыі ўсьцяж паглыблялася, праявы гэтае веры разумеліся абодвума бакамі па-рознаму. Адрозьненьні і непаразуменьні разглядаліся як недаравальныя ерасі. Гэта быў прыняты ў тую эпоху сродак легітымізаваць і сублімаваць схаваныя прычыны расколу. Так, у

Рыме выкарыстоўвалі для эўхарыстыі аблаткі, а ў Бізантыі гэта лічылася найцяжэйшым замахам на веру.

Непасрэднай нагодай для расколу стала паступовае ўвядзеньне ў лацінскі сымбаль веры ўдакладненьня *«Filioque»*. Паводле яго Сьвяты Дух паходзіць ад Айца *і Сына*. Гэтая інтэрпаляцыя зьявілася ў V стагодзьдзі ў Гішпаніі як сродак у змаганьні супраць арыянаў. Яе прынялі ў Каралінскай імпэрыі, потым у Рыме. Але калі францкія місіянэры скарысталі яе ў Баўгарыі – то бок у бізантыйскай сфэры ўплыву, – патрыярх Фоцій у 866 годзе прызнаў гэты выраз, які дагэтуль не будзіў аніякае крытыкі, за найвялікшае зло. Хрысьціянскую еднасьць удалося часова захаваць, але судзіна ўжо дала расколіну. Канчаткова яна разьбілася ў 1066 годзе, а штурм Канстанцінопалю крыжакамі ў 1204 годзе зрабіла немагчымым якую-любя спробу сабраць патрушчаныя часткі ў адно цэлае.

Гэта стала яшчэ адной прычынай, чаму хрысьціянства ў сваім лацінскім варыянце надоўга зрабілася галоўнай адзнакай прыналежнасьці да Эўропы, якая ў той час фармавалася. Мяжа Эўропы была найперш мяжою лацінскага каталіцызму. Першай назвай Эўропы (назвай, што гучала ў такой якасьці пры перамозе над сарацынамі паблізу Пуат'е) было хрысьціянства. Разгледзім цяпер, як яно ўсталёўвалася.

Барбарскія нашэсьці часткова вынішчылі хрысьціянства на Захадзе. У Галіі яго аднавілі біскупы, што паходзілі ў сваёй балышыні з гальска-раманскае арыстакратыі і баранілі свае гарады. Эвангелізацыю Сярэдняе Эўропы распачалі ірляндзкія місіянэры, а працягнулі – ангельскія. Бэнэдыктынскі манах Вінфрыд – магчыма, найвялікшы прапаведнік Эвангельля ў гісторыі – пад рымскім імем Баніфацыя прайшоў праз Гесэн, Баварыю, Турынгію. Ангельскія манахі і біскупы навярнулі Галяндыю, Фрызію, занялі катэдры Гамбургу і Брэмэну, далі першых біскупаў Данії, заснавалі місіі ў Нарвэгіі, дабраліся да Ісьляндыі і Грэнляндыі.

У імпэрыі франкаў выкарыстоўваліся больш радыкальныя мэтады хрысьціянізацыі. Жорсткая трыццацігадовая вайна скончылася здушэньнем саксаў і вяртаньнем іх у хрысьціянства. Адмова ад хросту азначала сьмерць. Ня

выключана, што памяць пра такі характар пераходу ў новую веру спрычынілася да посьпеху рэфармацыі ў паўночнай Нямеччыне. Нягледзячы на гэта, хрысьціянская прышчэпка прынялася. Але панаваньне над *regnum teutonicum* пераняла менавіта Саксонія, а не Баварыя, і тое, чаго зазналі саксы за панаваньне Карла Вялікага, паўтарылі саксонскія імпэратары ў дачыненьні да славянскіх плямёнаў на землях паміж Эльбай і Одэрам. Для нямецкіх магнатаў гэтая тэрыторыя была своеасаблівым *Far East*. Там не было закону, там можна было чыніць рабункі, эксплюатаваць сялянаў і весьці эвангелізацыю. У тамтэйшых маркграфствах былі ўтвораны біскупствы, якія сталі сьведчаньнем нямецкага *Drang nach Osten* – у Гавэльбэргу, Брандэнбургу, Майсэне. Отан меркаваў зрабіць у Магдэбургу сядзібу мітрапаліта ўсяго славянскага Ўсходу.

Аднак мяжа Эўропы Каралінгаў (наш першы Эўрапейскі Зьвяз «пятнаццаці дзяржаваў») не зрабілася мяжой гістарычнае Эўропы. Гэтаму перашкодзіла ўзьнікненьне Польшчы. Мешка аб'яднаў славянскія плямёны, што насялялі землі паміж Одэрам і Віслай, але каб даць рады нямецкім крыжацкім выправам, конча трэба было прымаць хрысьціянства. Таму ён сьпешна ажаніўся з чэскаю князёўнаю, ужо хрысьціянкаю, прыняў хрост, атрымаў ад Папы дазвол на заснаваньне ўласнае сеткі біскупстваў і масава ахрысьціў народ у рэках і азёрах. Было тое ў 966 годзе.

У апошнія трыццаць гадоў X стагодзьдзя аналягічным парадкам прынялі хрысьціянскую веру і іншыя барбарскія князі, якія потым ахрысьцілі свае народы: у 965 годзе – Гаральд Сінязубы, кароль Даніі; у 985 годзе – Геза I Вугорскі і яго сын сьвяты Стэфан; у 993 годзе – Олаф Нарвэскі; а ў 1008 годзе – Олаф Швэдзкі. Заключны і самы ўсходні хрост адбыўся нашмат пазьней – у 1385 годзе. Літва, апошні бастыён паганства, атрымала ў спадчыну ад мангольскае арды заходнюю палову Расеі. Але ці ня кожнага году яна мусіла чыніць адпор нашэсьцям крыжакоў і мечаношаў. І тут таксама паратунак быў у зьмене веры, якая зьдзейсьнілася праз шлюб Уладыслава Ягайлы з дачкою караля Польшчы. Ягайла сам пераклаў «Ойча наш» і ахрысьціў свой народ у рэках і азёрах.

Вось жа, паганскія князі, а разам зь імі і падлеглыя ім народы прынялі новую рэлігію з палітычных меркаваньняў. Хрост бараніў іхнія княствы ад крыжовых паходаў, гэтае надзвычай грознае формы вайны, дазваляючы, наадварот, самім браць у іх удзел. Дзякуючы моцнай і маналітнай касьцёльнай арганізацыі, хрост забясьпечваў духоўную еднасьць каралеўства. Духавенства давала інструмэнт кіраваньня, яно было знаёмае з правам і магло складьці ядро рэгулярнае адміністрацыі. Яно ўмацоўвала легітымнае становішча сувэрэна, бо той з звычайнага правадыра рабіўся каралём і мабілізоўваў вакол сваёй годнасьці ўсю дактрыну, якая з часоў Канстанціна і Давіда абкружала манархію німбам сьвятасьці. Урэшце, і то перадусім, ён уваходзіў на роўных правох у эўрапейскую сям'ю, мог жаніцца з прадстаўніцамі каралеўскіх родаў, мацуючы гэтым трываласьць укладзеных дамоваў і павагу да іх. Мы бачым: каб удзельнічаць у тым, што стане Эўропаю, трэба было споўніць пэўныя ўмовы. Сёньня гэта дэмакратыя, праўная дзяржава і г. д. У сярэднявеччы такою ўмоваю было прыняцьце рыма-каталіцкае рэлігіі. Касьцёл быў нечым накшталт сучаснае Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў альбо Эўрапейскае Камісіі.

Мы бачым, як вымалёўваецца зародак унутранае эўрапейскае мяжы – той, якая аддзяляе каралінскую Эўропу (тую самую Эўропу «пятнаццаці дзяржаваў», з Англіяй, Францыяй і адваяванай Гішпаніяй) ад Эўропы «дваццаці пяці дзяржаваў», што аб'ядноўвае краіны, дзе прыняцьце веры зьдзейсьнілі свае ўласныя князі, дапамагаючы адны адным (як польскія і чэскія) і карыстаючыся непасрэднай падтрымкаю рымскага папства.

З гэтых прычынаў усходняя мяжа «татальнай» Эўропы спынілася на польска-літоўскім каралеўстве. Славянскія князі, варагі з Кіева, яшчэ вагаліся. Расейская назва касьцёлу – *«Церковь»*, ад нямецкага *Kirche*. Але бізантыйскі імпэратар, якому ў пэўных акалічнасьцях спатрэбіўся саюз зь імі, перацягнуў іх на свой бок. Гэта адбылося праз шлюб кіеўскага князя з парфірагенэткаю і масавы хрост у 989 годзе. Мяжою з гэтага боку стала мяжа *«Filioque»*. Пазьней яна рабілася мяжою татарскае Арды, далей Маскоўскага княства, але *«Filioque»* заставалася сымбалем аддзяленьня і фактарам чыстае нянавісьці.

Мы на схіле сярэднявечча. Межы застануцца нязрушнымі яшчэ два стагодзьдзі. Яны па-ранейшаму маюць рэлігійны характар. На ўсходзе – праваслаўе. На паўднёвым усходзе Атаманская імпэрыя захапіла Бізантыйскую і займае Балканскі паўвостраў. На поўдні Міжземнамор'е застаецца прадметам спрэчак. Ягоны ўсход – унутранае турэцкае мора, што, аднак, аспрэчваецца Вэнэцыяй. Заходняй частцы пагражаюць піраты з Магрыбу. Паўднёвая Італія, Сыцылія, Мальта імі даўно ўжо занятыя, а ў Гішпаніі рэканкіста завяршылася ўзяцьцем Гранады.

Аднак мяжа, пра якую мы гаворым, ужо ня чыста рэлігійная. Яна робіцца мяжой цывілізацыі, мяжой, якую ўжо не ахарактарызуеш толькі пры дапамозе рэлігіі. Згодна з гісторыкамі, пачынаючы з XI стагодзьдзя гэтая замкнёная тэрыторыя робіцца месцам разнастайных пераўтварэньняў, якія па-за яе межамі не назіраюцца. Гэтыя зьмены (часам яны адбываюцца праз паяднаньні, а часам – праз падзелы) маюць настолькі спэцыфічны і эўрапейскі характар, што апасродкавана спрычыняюцца да еднасьці эўрапейскае цывілізацыі.

Сярод фактараў паяднаньня – тэхнічныя і матэрыяльныя навацыі, што распаўсюджваліся з цэнтральнае зоны, распасьцертае ад паўночнае Італіі да Фляндрыі. Пералічу іх у адвольным парадку і невычарпальна: мэтады ўзворваньня, прыстасаваныя да вільготных глебаў поўначы; усё больш разнастайныя прылады працы; архітэктурныя прыёмы; будова караблёў; ваенныя практыкі; вынаходкі ў галінах мэталюргіі і ткацтва і г. д. Сьпіс доўгі. Гэта ўсё дазволіла Эўропе павялічыць колькасьць насельніцтва. Пачынаючы ад XIII стагодзьдзя на ўрадлівых раўнінах Пікардыі шчыльнасьць насельніцтва складае 40 чалавек на км^2. Напярэдадні эпідэміі чумы, якая паклала канец нямецкай калянізацыі і спрычыніла вялізную сьмяротнасьць у Францыі, Эўропа дасягнула дэмаграфічнага росту, які будзе перасягнуты толькі з аграрнай рэвалюцыяй XVIII стагодзьдзя. У той жа час на поўдні і ўсходзе – у Афрыцы і ў Расеі – распасьціраюцца адносна пустэльныя абшары.

Працягваюць існаваць інстытуты, якія льга назваць панэўрапейскімі. Такі інстытут – Касьцёл, а разам зь ім –

лаціна як вышэйшая мова зносінаў. Дзякуючы лаціне спадчына антычнае літаратуры засталася жывою і легла ў аснову адукацыі. Структура касьцёльнае гіерархіі дапаўняецца буйнымі ордэнамі бэнэдыктынцаў, цыстэрцыянцаў (менавіта ў цыстэрцыянскім кляштары ўва ўсходняй Прусіі быў вынайдзены рэцэпт гарэлкі), дамініканцаў і францішканцаў. Сетка ўнівэрсытэтаў ахоплівае ўжо ня толькі Балёнью, Парыж, Оксфард і Кёльн, а пашыраецца на поўнач і на ўсход – да Чэхіі, Польшчы, Вугоршчыны.

Фэўдальнае грамадзтва – вытвар чыста эўрапейскі. Яго дасканалы ўзор – у Францыі, паміж Люарай і Маасам, але ягоны дух пануе па ўсёй Эўропе, хоць і слабне пры набліжэньні да нямецкіх маркграфстваў і Польшчы. Грунтуецца яно на васальнай дамове, якая зьвязвае васала з вышэйшай інстанцыяй – князем, каралём. Васал ідзе на службу да сувэрэна, а той забясьпечвае яго матэрыяльнымі сродкамі, каб служыць, – звычайна даючы ў лен зямлю. Вось жа, фэўдальнае грамадзтва – добраахвотная арганізацыя вольных людзей, зьвязаных міжсобку ўзаемнымі абавязаньнямі, якія гарантуюцца прысягаю. Такой сыстэмы няма больш нідзе, ні ў Расеі, ні ў мусульманскіх краінах, ні ў Індыі, ні ў Кітаі. Трэба дабрацца аж да Японіі, каб знайсьці нешта падобнае. Васальная сыстэма забясьпечвае існаваньне шляхты, якая ўсьведамляе свой маральны абавязак, свае вышэйшыя манеры, грунтаваныя на глыбокім пачуцьці ўласнае свабоды.

Відавочнае выяўленьне эўрапейскае еднасьці – мастацтва, асабліва гатычнае. Усходнюю мяжу Эўропы можна разумець як лінію, што злучае апошнія гатычныя касьцёлы. У яе абсяг трапляюць Фінляндыя, балтыйскія краіны, Польшча, Вугоршчына, Харваччына, Славенія. Якраз тут і праходзіць мяжа Эўропы дваццаці пяці дзяржаваў, мяжа, якая сёлета ў траўні робіцца афіцыйнаю. За ёю рэзкім кантрастам выступае бізантыйскае і мусульманскае мастацтва.

Стыль канфліктаў, якія адбываюцца на эўрапейскай прасторы, таксама спрычыняецца да еднасьці Эўропы, бо такія канфлікты не сустракаюцца больш нідзе. Два асноўныя – няспыннае процістаяньне паміж Касьцёлам і палітычнаю ўладаю і

процістаяньне паміж Імпэрыяй і нацыянальнымі дзяржавамі, а на гэта накладаюцца драбнейшыя міждзяржаўныя спрэчкі. Быў момант, калі Касьцёл мог апынуцца пад уладай імпэратара і буйных фэўдалаў. Вядома, што ён вызваліўся ад гэтае пагрозы пасьля доўгага змаганьня, у якім папства абаперлася на рэлігійныя ордэны. Грыгарыянская рэформа паглыбіла прорву паміж аўтаномным лацінскім Касьцёлам і ўсходняй Царквою, якая падпарадкоўвалася імпэратарскай уладзе. З другога боку, як часта падкрэсьліваў Бэхлер (Baechler), сама прырода заходнярымскае імпэрыі не дазволіла ёй адрадзіцца. Неўзабаве яна распалася на драбнейшыя адзінкі, больш ці менш нацыянальныя, якія не перастаралі ваяваць між сабою і канцэнтрацыя ўлады ў якіх знаходзілася па-над сыстэмай фэўдальнае залежнасьці.

Яшчэ адна адметная рыса Эўропы – значнасьць дагматычнага канфлікту. У адрозьненьне ад праваслаўнага сьвету, у якім цэрквы абапіраліся на этнічную базу, лацінскі наднацыянальны Касьцёл мог захаваць еднасьць, толькі засяроджваючы пільную ўвагу на непарушнасьці сваёй дактрыны. Гэта рабіла ўнівэрсытэты асяродкамі бурлівага інтэлектуальнага жыцьця і стварала нагоду для дыспутаў і нязгодаў. Нейкі час Касьцёл мог спадзявацца на замірэньне вакол надзвычай шырокага і прыгожага сынтэзу сьв. Тамаша Аквінскага. Але як толькі «Анёльскі доктар» адышоў у лепшы сьвет, ягоная сыстэма рухнула, а Дунс Скот, Ўільям Окам і шмат іншых распачалі інтэлектуальную рэвалюцыю, якая з той пары ўжо не спынялася.

Працяглыя крызісы – імпэрскі, царкоўны і дагматычны – спарадзілі вялікі рэфармацыйны раскол. Але трэба заўважыць, што якраз з гэтага моманту дзьве процілеглыя паловы Эўропы робяцца больш эўрапейскімі, чым калі да таго. Пратэстантызм аб'яднаў у сабе экзыстэнцыяльную праблематыку, што паходзіла ад Аўгустына, посттамісцкую ідэалёгію, індывідуальную рэлігійнасьць, канчатковую перамогу нацыянальнае дзяржавы над імпэрскай ідэяй. Каталіцкі сьвет, у сваю чаргу, правёў уласную рэформу ў напрамках, якія ня вельмі адрозьніваліся ад названых, і гэта яшчэ больш аддаліла эўрапейскае хрысьціянства ад яго ўсходняга блізьнюка.

Рэлігійны канфлікт вёў палітычную ўладу і грамадзтва да сьцьверджаньня прынцыпаў сьвецкасьці, зародак якіх існаваў ужо ў каталіцкай тэорыі ўзаемнае аўтаномнасьці духоўнага і часовага.

XVII стагодзьдзе было арэнай інтэлектуальнае рэвалюцыі. Галілееўская, а пазьней ньютанаўская навука фармулявала сьцьверджаньні, слушнасьць якіх не залежала ні ад філязофіі, ні ад рэлігіі: каб іх прыняць, патрабаваўся рацыянальны розум. На гэтым грунце паўсталі не зьвязаныя з хрысьціянствам філязофскія сыстэмы і распачалася тэхналягічная рэвалюцыя. Эўропа – адзіны рэгіён на Зямлі, які зазнаў гэтыя вялікія пераўтварэньні.

Таму Эўропу XVIII стагодзьдзя ўжо трэба ўспрымаць сынтэтычна. Гэтая Эўропа больш не акрэсьлівалася праз ідэю хрысьціянства – бо хрысьціянства падзялілася, яно пазбылася інтэлектуальнае манаполіі, а ягоныя гіерархічныя органы страцілі аўтарытэт. Канстанцінаўскі кампраміс, які легітымізаваў дзяржаву праз Царкву і гарантаваў, што дзяржава будзе трымацца зацьверджаных Царквой нормаў, больш не існуе ў пратэстанцкіх краінах і пераможаны ў краінах каталіцкіх. Тым часам якраз праз такі адмысловы, складаны пэйзаж мы і пазнаем рысы Эўропы. У гэтым пэйзажы адбыліся ўсе пераўтварэньні, што надалі ёй новы выгляд.

У параўнаньні з мусульманскім і праваслаўным сьветам Эўропа ў той час – дынамічная зона. Насельніцтва яе шпарка расьце, багацьце і ўзровень жыцьця радыкальна падвышаюцца. Вёска асвойвае новыя тэхналёгіі ўрабленьня зямлі. Горад – аўтаномны палітычны цэнтар, эканамічны тыгель, новы грамадзкі сьвет мяшчанаў, рамесьнікаў, работнікаў, людзей вольных прафэсіяў, чым далей тым больш шматлікіх і дыфэрэнцыяваных. Вышэйшыя клясы акрэсьліваюць свае звычаі як эўрапейскія, імкнуцца да іх уніфікацыі. Адно і тое ж мастацтва – клясыцызм, барока, ракако – пакідае свой адбітак на ўсім.

Пры апісаньні тагачаснае новае Эўропы трэба хутчэй браць у разьлік матэрыяльныя і грамадзкія, а не духоўныя элемэнты. Але паколькі яны разьмяркоўваюцца няроўна, трэба выразна

адрозьніваць цэнтар гэтае мадэрнае Эўропы ад яе пэрыфэрыі. Цэнтар месьціцца на абшары паміж паўднёвай Англіяй і паўночнай Італіяй. Ён не супадае дакладна з палітычнымі цэнтрамі, але Францыя, Англія і Галяндыя – краіны ўзорныя, а пэрыфэрыя імкнецца імітаваць іхную магутнасьць, іхны дабрабыт і іхныя звычаі. Пэрыфэрыйныя краіны – гэта, з аднаго боку, краіны Ібэрыйскага паўвострава, а з другога – краіны на ўсход ад Эльбы. У гэтых апошніх селянін не настолькі вольны, часта запрыгонены, гарадоў менш, грамадзтва не такое разнароднае, тут пануюць грубейшыя звычаі і больш суровая палітычная ўлада.

Але хоць на краёх Эўропы пэйзаж страчвае эўрапейскія рысы, яе ўсходняя мяжа застаецца тамсама, што і ў канцы сярэднявечча. Іншымі словамі, гэтая мяжа надалей аддзяляе Расею ад Швэцыі і Польшчы, а Атаманскую імпэрыю – ад Польшчы і Сьвятое рымска-германскае імпэрыі. Зьмены адбываюцца ў іншых месцах: на поўдні Міжземнае мора сталася ўнутраным эўрапейскім морам, на захадзе Эўропа пашырае свой абсяг па-за акіян праз калёніі, якія засяляюцца і жорстка кантралююцца з мэтраполіяў.

Пераскочым праз стагодзьдзе і перанясёмся думкаю ў наступны дзень пасьля падпісаньня Венскага трактату. Зьмены адбыліся сур'ёзныя. Амэрыканскія калёніі здабылі самастойнасьць. Перад намі Эўропа, якая вярнулася да свайго акіянскага ўзьбярэжжа, але новыя дзяржавы захоўваюць яе матэрыяльную і духоўную цывілізацыю, а межы, што іх падзяляюць, ня носяць такога характару, як вонкавыя межы на Ўсходзе і Поўдні.

Якраз Усход і спарадзіў праблемы, якія стаяць перад намі аж да сёньня: турэцкую і расейскую.

Доўгі час турэцкі сьвет быў – не бяз дай прычыны – пудзілам Эўропы. Не забудзем, што ў XIV стагодзьдзі Кітай, Расея, Эгіпэт, арабскі, пэрсідзкі і частка індыйскага сьвету знаходзіліся пад панаваньнем турэцка-мангольскіх валадароў.

Тут трэба зрабіць адну заўвагу. Хоць у матэрыяльным, сацыяльным, інтэлектуальным дачыненьні тагачасная Эўропа была вышэйшаю за турэцкі сьвет, але вайсковую перавагу яна

здабыла вельмі позна. Лепшая тэхніка коннае язды, лепшае выкарыстаньне луку, лепшая тактыка – гэтага туркам хапала, каб граміць эўрапейскую кавалерыю ўдрузачкі. У 1526 годзе амаль уся вугорская шляхта была вынішчана ў бітве пад Могачам, і Вугоршчына – старая і магутная эўрапейская манархія – на паўтара стагодзьдзя апынулася пад турэцкім панаваньнем. Трошку не хапіла, каб у 1529 годзе той жа лёс не спасьціг Аўстрыю. Турэцкая армія, «Арда», валодала добрай артылерыяй і, дзякуючы мэтадам падрыхтоўкі янычараў, перасягала паводле якасьці і сучаснасьці найлепшыя эўрапейскія войскі. У 1571 годзе пад Лепанта, а ў 1683 годзе пад мурамі Вены туркі былі вельмі блізкія да перамогі. Потым сытуацыя дыямэтральна зьмянілася, але вайна з туркамі ніколі не была дробнаю справаю – будзь гэта кампанія князя Яўгена або расейскія кампаніі Пятра, Кацярыны ці Аляксандра I. Гэта зазналі на сабе і саюзныя войскі падчас Першае сусьветнае вайны, і грэкі ў 1922 годзе.

Акрамя моцнае арміі, туркі найчасьцей мелі выдатную дыпляматыю. Ёй удавалася выкарыстаць Францыю ў сваёй гульні супраць Сьвятое Імпэрыі, Сьвятую Імпэрыю – супраць Пэрсіі, Англію і Францыю – супраць Расеі, Нямеччыну – супраць Англіі, урэшце – цягам пяцідзесяці гадоў – Злучаныя Штаты супраць савецкае Расеі.

Гэта тлумачыць, чаму Турцыя так павольна адступала ў XVIII і XIX стагодзьдзях. Ведучы гульню між вялікімі дзяржавамі, яна, як той слынны «хворы пацыент», здолела захаваць частку Балканаў аж да XX стагодзьдзя і сёньня яшчэ валодае пралівамі. У Канстанцінопалі, то бок Істамбуле, – сёньня чыста турэцкім горадзе – жыве больш людзей, чымся ў Парыжы ці Лёндане.

Хоць турэцкі сьвет і месьціцца сярод эўрапейскага аркестру, ён ніколі не разглядаўся як эўрапейскі. Так было і з гістарычных прычынаў, паколькі яму заставаўся чужым увесь досьвед, пра які я згадваў дагэтуль, і дзеля тамтэйшае рэлігіі, права, звычаяў. Эўрапеец ня мог пасяліцца ў імпэрыі і займаць важную пасаду, не перайшоўшы ў іслам. Калі туркі захапілі Вугоршчыну, гэтая краіна страціла мноства жыхароў:

мужчынаў забралі ў рабства, жанчын – у гарэмы.

У XIX стагодзьдзі, асабліва за панаваньнем султана Абдул-Мэджыда, імпэрыя спрабавала праводзіць рэформы. Іхнаю мэтай перадусім было ўмацаваць цэнтральную адміністрацыю і войска з выкарыстаньнем шэрагу эўрапейскіх рэцэптаў. Але гэта не ішло ні ў якае параўнаньне з праектам поўнае эўрапеізацыі, які спрабавалі ажыцьцявіць пецярбурскія імпэратары. Рэвалюцыя «младатуркаў» 1908 году, нацыяналістычная і аўтарытарная, працягвала тую ж рэформу зь яе абмежаванымі мэтамі. Гэта, аднак, не прадухіліла здрабненьня імпэрыі, эканамічнае залежнасьці, паразаў на Балканах і ўрэшце яе канчатковага скону ў 1918 годзе.

З гэтага досьведу вырасла нацыя. Пераможны Ататурк, забясьпечыўшы дзяржаўную незалежнасьць, набраў досыць моцы, каб цьвёрда і дэспатычна, як Пётар Вялікі, узяцца за глыбокую эўрапеізацыю краіны. Гэтыя зьмены пайшлі далей за звычайны вайсковы праект. Гарантам рэформы выступала армія, «Арда». Але рэформа ахапіла і цывільныя інстытуты, юстыцыю, права, адукацыю, літаратуру, парлямэнцкую сыстэму, урэшце скасаваўшы халіфат, афіцыйна аддзяліўшы дзяржаву ад ісламскае рэлігіі, так бы мовіць, зьдзейсьніўшы сэкулярызацыю. Турэцкі народ, які дасягнуў маналітнасьці (калі не лічыць курдзкага элемэнту) шляхам вынішчэньня альбо выгнаньня армянаў і грэкаў, і знутры і звонку нагадвае эўрапейскую нацыю якабінскага тыпу. Ці можна гэтую нацыю прызнаць за эўрапейскую? Гэта справа вызначэньня. З пункту гледжаньня гісторыі, адзінства перажытага і цывілізацыі – безумоўна, не. Калі разглядаць інстытуты, лічачы іх за крытэр прыналежнасьці да Эўропы, – пытаньне застаецца адкрытым; трэба яшчэ прыгледзецца, як яны рэальна функцыянуюць.

Расейская праблема выглядае зусім інакш. У XVII стагодзьдзі Расейская імпэрыя, ужо тады гэткая ж вялізная, як і сёньня, была ў вачох Эўропы нашмат больш барбарскай і менш вядомай, чым Атаманская. Была яна і менш грознаю: слабых сілаў Швэцыі і Польшчы хапала, каб трымаць яе ў страху. Рэвалюцыя і Пятра I мела першапачаткова вялікія пляны, на турэцкі ўзор. Але, нягледзячы на сваю выключную жорсткасьць,

гэтыя дзеяньні далі пачатак нашмат глыбейшай рэвалюцыі, якая адбылася таму, што расейскі народ быў хрысьціянскім народам. Хоць праваслаўная Царква жывіла да каталіцкага і пратэстанцкага Захаду глыбокую нянавісьць, яе поўнае падпарадкаваньне, аж да поўнага зьняволеньня, цару – рашучаму заходніку – дапамагло пераадолець бар'еры.

Такая заходніцкая лінія «разьвіцьця» на эўрапейскі манер, прага «дагнаць і перагнаць» была ўласьцівая для ўсіх пецярбурскіх цароў, за выключэньнем, бадай, Мікалая II. Эўрапеізацыя вялася па дзьвюх лініях, якія перапляталіся міжсобку. Першая, лінія Пятра, палягала на мабілізацыі і ўзмацненьні ўсіх рэзэрваў расейскае дзяржавы дзеля пастаўленае мэты. Сялянства было запрыгонена, а вышэйшы слой, і царкоўны і сьвецкі, быў вымушаны аж да 1761 году служыць усё жыцьцё дзяржаве, гэткай жа дэспатычнай, як і ў часы Івана Жахлівага, але больш ці менш рацыянальнай і цалкам сэкулярызаванай. Другая лінія склалася пад канец XVIII стагодзьдзя, калі Кацярына зразумела, што кляса «служилых людей» павінна стаць, паводле сваіх манер, адукацыі і асабістых правоў, сапраўднаю шляхтай, на швэдзкі, прускі і, наколькі магчыма, французскі ўзор. Каб дасягнуць гэтае мэты, яна аддала паном ува ўласнасьць сялянаў – бліскучая прыватызацыя сродкаў вытворчасьці. Абодва гэтыя рашэньні можна назваць удалымі. Расея Пятра вельмі хутка атрымала магутную армію. Расея Кацярыны ад пачатку XIX стагодзьдзя сталася ўжо сапраўднай цывілізацыяй. Без сумневу, такая цывілізаваная Расея была толькі плытом, які насіўся па моры барбарства (тут я парафразую Пушкіна), але яна няспынна разьвівалася цягам усяго XIX стагодзьдзя. Яна стварыла літаратуру, музыку, мастацтва, чые крыніцы і натхненьне былі цалкам эўрапейскімі і як такія атрымалі прызнаньне ўва ўсёй Эўропе.

Вось жа, цягам двух стагодзьдзяў Атаманская імпэрыя страчвала свой уплыў у Эўропе, а Расейская імпэрыя тым часам пасоўвалася наперад. У Швэцыі яна адабрала балтыйскія краіны і Фінляндыю, у Польшчы – Украіну і дзьве траціны ўласна польскае тэрыторыі. Калі б у 1917-м яна выстаяла яшчэ год, то атрымала б, згодна з абяцаньнямі Францыі, рэшту

Польшчы, вялікую частку Нямеччыны, дамінаваньне на Балканах і, нарэшце, Канстанцінопаль. Зважаючы на незвычайную дынамічнасьць Расеі ў дэмаграфіі, эканоміцы і культуры, яна запанавала б у Эўропе. На шчасьце (ці наадварот), зьявіўся Ленін.

Тым часам як Турцыю ніколі не ўважалі за эўрапейскую краіну, Расею, хоць у часы Пятра Вялікага яна таксама такою не была, лёгка прынялі ў «эўрапейскі канцэрт». Адзін толькі Папа да 1815 году адмаўляў расейскаму цару ў імпэратарскім тытуле. Галоўнай прычынаю было тое, што ў меру прасоўваньня Расеі на Захад Прусія і Аўстрыя пасоўваліся на ўсход, а Англія магла бесьперашкодна дзейнічаць на ўсім астатнім сьвеце. Таму расейская экспансія атрымала прызнаньне.

Такім чынам, у 1914 годзе Расея належала да «эўрапейскага аркестру». Але ці лічылася яна эўрапейскаю? Адказ ня будзе адназначным. Эўрапейскімі былі ўсе творы расейскае культуры, гэтаксама як манеры і стыль жыцьця вышэйшае клясы. Існавалі, аднак, дзьве перашкоды.

Перадусім рэлігія, якая цягам усяго XIX стагодзьдзя рабілася ўсё менш талерантнаю, усё больш фанабэрыстаю, ганарыстаю. Яна сьцьвярджала славянафільскую міталёгію, ідэю асобнага шляху Расеі, пагарды да «Эўропы». Яна прасякнула сабою літаратуру. Ніколі бар'ер *«Filioque»* не набываў настолькі калясальных маштабаў і не выклікаў такіх радыкальных падзелаў, як напярэдадні Першае сусьветнае вайны. Наступнай перашкодаю быў дзяржаўны лад. Які ён быў у Расеі? Можна сказаць, што пад канец панаваньня Кацярыны ён набыў выгляд «Ancien Régime» эўрапейскага кшталту. Нягледзячы на свой грубаваты і павярхоўны характар – больш прускі, чым французскі – ён меў вядомасьць і прызнаньне. Тым часам якраз у гэты момант французская рэвалюцыя зрынула ўсе «Ancien Régimes» у Эўропе і прымусіла іх паступова прыстасоўвацца да новага прадстаўнічага ладу. Усе, за выключэньнем расейскага, які захаваў свой ранейшы характар аж да 1905 і нават да 1917 году. Расейскі «Ancien Régime» страціў сваю легітымнасьць нават у вачох уласнае шляхты, асьвечаных чыноўнікаў і інтэлігенцыі, якія усё больш эўрапеізаваліся. Вось жа, ягоны

крах быў чаканым.

І крах адбыўся, але не такі, якога чакалі. Мяжа Эўропы ў гэты час скочыла на Ўсход – дзякуючы вызваленьню Польшчы, балтыйскіх краінаў, Фінляндыі, Бэсарабіі. Лёс Расеі нам вядомы, далейшае разьвіцьцё гэтае краіны кардынальна супярэчыць эўрапейскім звычаям. Расейскі лад няправільна параўноўвалі з дэспатызмам Маскоўскага княства: так, ён пераняў ад апошняга пэўныя рашэньні, але гэта было выклікана ўтапічнымі матывамі, цалкам падпарадкаванымі таталітарнай ідэалёгіі.

Мяжа, што аддзяляла Эўропу ад СССР, сталася непераадольнаю, яе нашмат пільней умацоўвалі, сьцераглі, яна мела нашмат больш паліцэйскі характар, чым мяжа колішняе Расейскае імпэрыі, якая ўжо тады была выключэньнем у кантэксьце эўрапейскіх нормаў. Пазьней гэтая жалезная заслона, дзякуючы вайне, пасунулася на Захад і адрэзала ад Эўропы Варшаву, Будапэшт, Прагу, Дрэздэн. Яна прайшла па самым сэрцы гістарычнае Эўропы. Цягам сарака гадоў здавалася, што межы Эўропы вярнуліся да яе старога каралінскага ядра часоў отанскіх імпэратараў.

Больш як сорак гадоў саветызаваную частку Эўропы пазбаўлялі элітаў, прыніжалі, ізалявалі, часткова русіфікавалі, зьнішчалі ўсе яе структуры. Ужо дзесяць гадоў яна выходзіць з гэтага палону, які прывёў яе ў вельмі кепскі стан. Згалелая, скалечаная запаволеным разьвіцьцём, яна ні ў чым ня ўпэўненая, акрамя аднаго: сваёй неадрыўнае прыналежнасьці да Эўропы. Цяпер, больш чым калі, найважнейшая мяжа – тая, якая аддзяляе яе ад Расеі і якую яна стараецца ўмацоўваць усімі сродкамі. Мы ў сябе на Захадзе не ўсьведамляем, якім сьвятам для Польшчы быў уступ у NATO. Зноўку апынуцца ў Эўропе – вось супольная праграма ўсяго рэгіёну. Зразумела, што ён пры гэтым спадзяецца на амэрыканскую моц. Пра расейскі ўплыў у культуры, у думцы, у мастацтве няма ўжо і гаворкі.

А што сама Расея? Яна выходзіць зруйнаванаю з эпохі камунізму. Яна зазнала небывалы дэмаграфічны спад. Расейцаў сёньня менш, чым у 1917 годзе, асабліва дзяцей. Паводле

эканамічнае моцы яна слабейшая за Гішпанію. Усе тэрытарыяльныя набыткі ад часоў Пятра Вялікага і нават Аляксея Міхайлавіча страчаны.

Ня статус сусьветнае дзяржавы перашкаджае яе магчымай інтэграцыі з Эўропай (калі б такая інтэграцыя адбылася, то межы Эўропы пашырыліся б не да Ўралу, які ніколі ня быў мяжою, а да Кітаю і Ціхага акіяну). Гэтая перашкода, хутчэй, воля саміх расейцаў. Расея мае такі рэжым, які мае, і шчырыя заходнікі сярод расейцаў, а такіх нямала, ня ведаюць, ці ім сьмяяцца, ці плакаць, калі заходняя прэса называе гэты рэжым *emergent democracy*. Што да праваслаўнае Царквы, то ўлады зь яе дапамогай падсілкоўваюць скрайні нацыяналізм, надзвычай варожы ўсялякаму збліжэньню з лацінскім сьветам.

Даводзіцца скончыць на невясёлай ноце: Эўропа спынілася тамсама, што і ў XVII стагодзьдзі, калі сустрэлася зь іншай цывілізацыяй, зусім адрозным дзяржаўным ладам і рэлігіяй, якая яе ня хоча.

Пераклаў з польскай Мікола Раманоўскі

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (36) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

[image]

аналітыка [image]2005
"да Зьместу"

[image] [image] [image]

УЛАДЗІМЕР КАЛУПАЕЎ

Уладзімер Калупаеў Забыты Рэнэсанс Беларуская эканамічная школа 1920-х гг.

эканаміст. адзін з аўтараў зборніка «Эўрапейскі выбар для Беларусі / Беларусь: сцэнары рэформаў» (Варшава, 2003).

Нас аб’яднала адно моцнае жаданьне, адзінае творчае імкненьне – культурна-эканамічны Рэнэсанс Беларусі…

Гаўрыла Гарэцкі, 1921 г.

Пасьля закрыцьця Віленскага ўнівэрсытэту ў 1832 г. у Беларусі не засталося ніводнага цэнтру разьвіцьця фундамэнтальнай эканамічнай навукі. Такое становішча доўжылася без малога 90 гадоў, пакуль не адчыніліся Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт у 1921 г. і Інстытут беларускай культуры ў 1922 г. За гэты час перарвалася традыцыя айчыннай эканамічнай навукі, якая была знаходзілася пад уплывам ангельскай палітычнай эканоміі. Практычна ўся беларуская моладзь па навуцы ў сярэдніх школах дзеля далейшай адукацыі была змушаная ехаць углыб Расеі, у Польшчу або далей у Эўропу – да чужых людзей, чужых народаў… І цэлымі масамі заставалася ўжо там на ўсё жыцьцё, бо дома для іх месца не было. Сюды царскі ўрад

насылаў процьму чужынцаў, верных служкаў рэжыму ў нішчаньні самабытнасьці Беларусі[1]; у гэты пэрыяд не вялося сыстэмнага збору статыстычных зьвестак і не праводзілася досьледаў аб разьвіцьці эканомікі беларускага краю.

Такая вось «спадчына» дасталася пакаленьню беларускіх эканамістаў, якія жылі ў часы пасьля абвяшчэньня незалежнасьці ў 1918 г. Але ўжо празь дзесяць гадоў узровень навуковых працаў і вынікі аграрнай палітыкі далі магчымасьць казаць пра рэнэсанс беларускай эканамічнай навукі. Закончыўся гэты рэнэсанс у засьценках АДПУ. Амаль увесь наклад надрукаваных кніг быў спалены, а іх аўтары былі арыштаваныя і рэпрэсаваныя па сфабрыкаваных справах.

ВЫВУЧЭНЬНЕ БЕЛАРУСІ ЯК ФАКТАР КУЛЬТУРНА-ЭКАНАМІЧНАГА АДРАДЖЭНЬНЯ

Пасьля ўваходжаньня ў склад Расейскай імпэрыі беларускі край зрабіўся настолькі забытым, што, акрамя этнаграфічных досьледаў, у навуковай сфэры тут не рабілася фактычна нічога. Эканамістам, як і прадстаўнікам іншых навук, давялося пачынаць з краязнаўства, каб здабыць тыя неабходныя зьвесткі, якія папярэднічаюць сур'ёзным эканамічным досьледам, найперш – статыстычныя, дэмаграфічныя, аб стане гаспадаркі і інш. Задачы пачатку 1920-х гг. трапна акрэсьліў тады яшчэ студэнт Гаўрыла Гарэцкі: «Вывучэньне Беларусі навучыць беларусаў той азбуцы, бязь веданьня якой нельга чытаць Вялікую Кнігу Рэнэсансу»[2].

У першыя гады Незалежнасьці, у 1918–1920, ініцыятывы па вывучэньні Беларусі прыйшла з-за яе межаў. У Маскве і Пецярбурзе былі створаны найбольш уплывовыя арганізацыі: адпаведна Беларуская культурна-навуковая асацыяцыя (далей: БКНА) пры Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі (старыя – г. Гарэцкі) і Беларускае вольна-эканамічнае таварыства (куды ўваходзілі эканамісты Я. Канчар, Я. Пятровіч). Ідэю падхапілі беларускія студэнты іншых навучальных установаў Расеі (у тым ліку суполка Маскоўскага межавага інстытуту, куды ўваходзіў Я. Кісьлякоў), і ў Маскве было створана Бюро, якое займалася ўжо каардынацыяй дзейнасьці беларускіх арганізацый, дзе было задзейнічана каля 300 студэнтаў. Яны ладзілі захаваньнем

[1] Выраз належыць М. Доўнару:
Зняволены: В (старыя
Ціпер куды
Нохаці
1918. (у 61,
6 ўвайшлі
зрамасьліся
з, дзе
захаваньнем

экспэдыцыі ў родны край, зьбіралі і апрацоўвалі неабходныя статыстычныя зьвесткі для Наркамзему Беларусі. Беларускія студэнцкія арганізацыі існавалі і ў іншых краінах. У 1927 г. у Празе была адчыненая першая дасьледчая ўстанова – Беларускі навуковы габінэт (БНГ), які ўпершыню на прафэсійнай аснове распачаў збор матэрыялаў па Беларусі, у тым ліку праблемы эканомікі. У 1928 г. БНГ выдаў адозву да ўсіх беларускіх эміграцыйных асяродкаў з заклікам да каардынацыі супрацоўніцтва ў справе зьбіраньня і вывучэньня беларускай культурнай і навуковай спадчыны.

Як толькі ў Беларусі пачалі адчыняцца інстытуты, да сумыснай справы далучаліся іх выкладчыкі і студэнты. У 1919–1924 гг. пры Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце працавала беларуская сэкцыя студэнтаў (старшынямі былі ў розны час с. Журык і М. Ганчарык), пры Беларускім політэхнічным інстытуце на працягу 1921–1922 гг. дзейнічала таварыства аднайменнае пецярбурскаму (туды ўваходзіў с. Скандракоў). У Інстытуце беларускай культуры ў 1922 г. была заснаваная сельскагаспадарчая сэкцыя, якая аб'яднала супрацоўнікаў Інбелкульту і Наркамзему (у 1926 г. туды ўваходзіла 62 чалавекі, старшынём быў З. Прышчэпаў, намесьнікам – А. Смоліч). У 1925 г. частка чальцоў гэтай сэкцыі, якая знаходзілася ў Горках, аб'ядналася ў Навуковае таварыства па вывучэньні Беларусі. Дзейнасьць яго 115 чальцоў (сярод якіх – с. Скандракоў, Б. Бойка, с. Журык, Т. Плятнер, М. Лайкоў, с. Тупяневіч) разгортавалася ў шасьці сэкцыях. Да 1930 г. таварыствам было выдадзена сем тамоў працаў, якія ўключалі вялікі і разнастайны матэрыял па сельскай і лясной гаспадарцы, сабраны ў экспэдыцыях і атрыманы ў выніку правядзеньня экспэрымэнтаў.

У тых умовах нельга было абысьціся без арганізацыйнай працы. Была створана сетка краязнаўчых арганізацый, адчыняліся дасьледчыя станцыі. Але самае галоўнае – была надоба рыхтаваць уласныя кадры, дзеля чаго патрэбен быў хоць адзін сапраўдны ўнівэрсытэт. У праекце камісіі, у працы якой бралі ўдзел М. Доўнар-Запольскі і Я. Карскі, былі ўлічаныя пажаданьні беларускіх навуковых колаў адкрыць адразу два факультэты эканамічнага профілю: камэрцыйна-эканамічны і

а) Беларускія і беларускага паходжаньня дасьледчыкі Беларусі, якія ў 1926 г. г. Гарэцкі з даведніка «Наука России»: «па адным толькі Ленінградзе налічвалі вышэйшых за Беларусі вучоных: прафэсароў 55, дацэнтаў і выкладчыкаў 51, асыстэнтаў 9, лябарантаў 6, навуковых супрацоўнікаў 6 і інш. 49, а разам 176 чалавек» (Гарэцкі г. ак. беларусізацыі вышэйшых навучальных установу

агранамічны. Мясцовыя кадры неабходнай кваліфікацыі адсутнічалі, таму былі запрошаныя прафэсары зь іншых унівэрсытэтаў, беларусы па нацыянальнасьці. Сьпіс прафэсараў-беларусаў быў настолькі прадстаўнічы, што беларускі ўнівэрсытэт ужо з моманту аднаўленьня мог стаць адным з самых моцных ва Ўсходняй Эўропе. Але людзі, адказныя за гэтую справу, плянавалі запрашаць выкладчыкаў з маскоўскага, кіеўскага і іншых унівэрсытэтаў, без увагі на іх нацыянальнасьць. Тым ня менш, беларусізацыя, што пачалася неўзабаве, парушыла гэтыя намеры, бо ахвочых прыехаць амаль не было. Затое менавіта дзякуючы беларусізацыі пачалі вяртацца беларускія навукоўцы-эканамісты, якія дасягнулі посьпехаў на навукова-выкладчыцкай ніве за межамі бацькаўшчыны. Ільля Герцык вярнуўся з Рыгі, Аркадзь Смоліч – зь Вільні, Гаўрыла Гарэцкі – з Масквы, Аляксандар Цьвікевіч – з Прагі, а апошнім, пасьля доўгіх блуканьняў памяж Кіевам, Харкавам і Баку, вярнуўся Мітрафан Доўнар-Запольскі. У навастворанай ВДУ зьмесьцілі лекцыі па асноўных эканамічных дысцыплінах, у тым ліку па эканамічнай тэорыі, гісторыі эканамічнай думкі, сусьветнай эканоміцы, банкаўскай справе, грашовым абарачэньні і крэдыце (агульны аб'ём тэкстаў склаў больш за сто разьдзелаў) распрацаваў Ільля Герцык[3]. Ён чытаў гэтыя дысцыпліны з 1921 па 1931 г., пакуль ня быў арыштаваны. На ўнівэрсытэцкі ўзровень выкладаньня арыентаваліся М. Доўнар-Запольскі і У. Пічэта, якія чытали лекцыі па гісторыі народнай гаспадаркі, А. Смоліч і г. Гарэцкі – па эканамічнай геаграфіі (апошні ў Горках). У той час БДУ ўсё ж набліжаўся да сапраўднага ўнівэрсытэту. Там чыталі лекцыі навукоўцы, якія ў сваёй галіне мелі распрацоўкі на ўзроўні ўласных тэорыяў, вядомых за мяжой, напрыклад, М. Доўнар-Запольскі і ягоны вучань У. Пічэта[4].

ФАРМАВАНЬНЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГРУПОЎКІ ЭКАНАМІСТАЎ

Разам з вывучэньнем роднага краю ў дасьледчыкаў-этнографаў адбывалася фармаваньне нацыянальнай сьвядомасьці. У гэтаксама, як гэта было з польскамоўнымі філяматамі і філярэтамі, з расейскамоўнымі этнографамі ў XIX стагоддзі

[3] Нарадзіўся ў 1872 г. у Мінскай губэрні ў

ЕССР // Гарэцкі г. Выбранае / Укл. і прадмова Р. Гарэцкага; Маст. Г. Шаблоўскага. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2002. с. 76–77).

[2] Горецкий г. Изучение Белоруссии как фактор ее Возрождения // Первый год деятельности Белорусской Культурно-Научной Ассоциации студентов Петровской сельскохозяйственной академии. Материалы первого годичного собрания Ассоциации. 14 ноября 1921 г. – Типография Горецкого сельскохозяйственного института, 1922. с. 9.

беларуску імкнуліся весьці працу сябры БКНА на чале з Гарэцкім, Горацкай беларускай сэкцыі на чале з с.Журыцкага і М. Ганчарыкам.

Сярод маладых эканамістаў прызнаным лідэрам культурнай эканамічнага адраджэньня быў Аркадзь Смоліч. Ён стварыў камісію па распрацоўцы эканамічнай тэрміналёгіі, сам актыўна ўдзельнічаў у яе працы, а таксама прыцягнуў туды ахрамя маладых эканамістаў вядомых яму зь юнацтва Янку Купалу і Якуба Коласа. А. Смоліч увогуле быў адным з распачынальнікаў працэсу беларусізацыі эканамічнай навукі. Як намесьнік сельска-гаспадарчай сэкцыі Інбелкульту, якая тады выконвала ролю акадэмічнага цэнтру, ён запрашаў на працу навукоўцаў-эканамістаў з улікам іх стаўленьня да адраджэньня; у выніку за часы працы ў гэтай сэкцыі склалася і ўмацавалася нацыянальна сьвядомая групоўка эканамістаў. Пад уплывам Смоліча прыхільнікам беларусізацыі стаў старшыня сельска-гаспадарчай сэкцыі, наркам земляробства Зьміцер Прышчэпаў (1896–1940), які з 1926 г. пачаў выдаваць свае працы выключна на беларускай мове. Менавіта А. Смоліч угаварыў М. Доўнара-Запольскага вярнуцца ў Менск, прыцягнуў яго да рэдактарскай справы. На той час у сэкцыі ўжо працавалі «сьвядомыя беларусы»[5] – эканамісты Я. Кісялюкоў, с. Скандракоў, г. Гарэцкі, Я. Грабоўскі, А. Трахімаў, М. Лайкоў, К. Кіпрыянец. Але праца сельскагаспадарчай сэкцыі была арганізавана на добраахвотнай аснове; разгортваньне патрэбных эканамічных досьледаў перашкаджала благое забесьпячэньне матэрыяльнымі рэсурсамі. Таму яшчэ ў 1925 г. А. Смоліч распрацаваў праект стварэньня на аснове сельскагаспадарчай сэкцыі інстытуту, які б аб'ядноўваў навукоўцаў, што вывучалі сучасную беларускую вёску. Заданьнем гэтага інстытуту, утворанага ў 1927 г. пры БНДІ, было выдаленьне з беларускай эканамічнай навукі ўсіх рэшткаў «буржуазнага» мысьленьня, а таксама прыцягненьне да працы беларускіх эканамістаў, якія ў той час працавалі ў іншых установах. Ініцыятарам гэтага праекту быў Доўнар-Запольскі, які ў 1926 г. М. Доўнар-Запольскі быў «адкомандаваны» ў Менск, «арганізаваўшы» яго ад'езд, Масква прыняла яго як сусьветна вядомага навукоўца. Яго вылучылі на акадэмікі, ён пачаў выкладаць у Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі. Платонаў Г. Аб выдаленні М. Доўнара-Запольскага з Беларусі // Платонаў Г. Лесы. Некаторыя дакумэнтальныя парысы аб людзях і падзеях

Журыцкага першай гільдыі. Скончыў Рыскі політэхнічны інстытут, там жа атрымаў навуковую ступень кандыдата камэрцыйных навук. Працаваў выкладчыкам эканамічнай тэорыі ў Берліне. Пэўны час працаваў у банку, затым быў загадчыкам гарадзкой статыстыкі ў Менску.

[1] Як сведчаць Г. Платонаў і Я. Кісялюкоў, Доўнар-Запольскі ўстаноўны пачаткі 1924 г. з беларускіх навукоўцаў, з якімі ўтварыў Маладоўнара-Запольскага з Беларусі // Платонаў Г. Лесы. Некаторыя дакумэнтальныя парысы аб людзях і падзеях

Аднанакова была зроблена спроба стварыць першую нацыянальную беларускую вышэйшую навучальную ўстанову (бо БДУ з яго запрошанымі выкладчыкамі не беларусамі ня быў у поўным сэнсе нацыянальным). Было выдана, зрабіць яе

[5] З 1920 г. яго імя ўпершыню з'явілася ў назвах аддзелаў і ўстаноў, якія ажыццяўлялі гарэцкія ідэі беларусізацыі. Гарэцкі, Менскі сельскагаспадарчы інстытут далучыў да 1920-я г. г. Гарэцкі. Пачынаючы з 1925 г. імя Гарэцкага ў Менскім і Горацкім сельскагаспадарчых інстытутах, Беларускага Гарэцкага — Мінскага беларускага (БСГА), 1998. — (Серыя «Людзі беларускага Адраджэння»). — с. 201.

[6] Ганчарык М. Беларуская Дзяржаўная Акадэмія сельскагаспадарчых навук // Гарэцкі і Менскі сельскагаспадарчы інстытут. — Менск, 1998. — с. 10. — Гэта, на жаль, не выпадкова: і ў 1920 г. і 1929 г. Гарэцкаму не давялося ўзначаліць Менскі сельскагаспадарчы інстытут. Пасля 1929 г. Гарэцкі ўпершыню з'явіўся на пасадзе кіраўніка БСГА.

[7] Гаў: БНДІ выкладчыкаў былога сельскагаспадарчага інстытуту, а таксама ўзмацніць, далучыўшы «сьвядомых беларусаў» зь ліку навуковых кадраў Менскага сельскагаспадарчага інстытуту. Каго абраць у склад навуковага пэрсаналу будучай сельскагаспадарчай акадэміі, вырашаў галоўным чынам А. Смоліч; ён жа фактычна даручыў г. Гарэцкаму каардынаваць дзейнасьць беларускай групоўкі, увёўшы яго ў склад управы БСГА. Цалкам зрабіць з БСГА беларускую нацыянальную ВНУ доўга не ўдавалася; ніяк не маглі абраць на пасаду рэктара чалавека, які б прыхільна ставіўся да справы беларусізацыі. Але беларуская групоўка паступова пашырала свой уплыў: колькасьць яе чальцоў неўзабаве дасягнула свайго максымуму – 115 чалавек, працы гэтага таварыства, а таксама запіскі БСГА выходзілі выключна на беларускай мове і сёньня зьяўляюцца гістарычным помнікам беларусізацыі аграрнай эканамічнай навукі. Як сьведчыў у 1929 г. М. Ганчарык, «па сутнасьці БСГА зьяўляецца сапраўднай беларускай вышэйшай навучальнай установай. Малодшыя катэгорыі нав. супрацоўнікаў усю вучэбную працу вядуць выключна на беларускай мове, шэраг дацэнтаў і прафэсараў гэтак-жа ўжо перайшлі ў выкладаньні на бел. мову, а частка пераходзіць у бліжэйшы час. Зараз пры сэкцыі навуковых працаўнікоў працуюць спэцыяльныя курсы для вывучэньня бел. мовы»[6]. Пры Навуковым таварыстве працягвала працу тэрміналягічная камісія, якая займалася між іншым і ўдасканаленьнем беларускай эканамічнай тэрміналёгіі (адказным быў Т. Плятнер); для гэтай справы Інбелкультам былі выдаткаваныя немалыя грошы, каб набыць чэскую, польскую і ўкраінскую тэрміналягічную літаратуру[7] (заўважце: не расейскую).

З 1927 г. акадэмічным цэнтрам эканамічнай навукі стаў

сельскай і лясной гаспадаркі. Сельскагаспадарчая сэкцыя Інбелкульту, як і плянавалася, была распушчаная, а ўсе яе дасьледчая справа перайшла ў новы інстытут. Дырэктарам быў прызначаны г. Гарэцкі, а А. Смоліч стаў загадчыкам аддзелаў – сельскагаспадарчай эканоміі і гаспадаркі сельскай гаспадаркі. Чаму дырэктарам інстытуту стаў не ўплывовы А. Смоліч, а малады, як потым будуць казаць нядобразычліўцы, недавучаны асьпірант г. Гарэцкі? Бясспрэчна, што калі ў 1927 г. статут Інбелкульту фактычна стаўры акадэмічным, і туды маглі выбірацца толькі тыя, хто ўжо зрабіў навуку ў сваёй галіне асабліва значнымі працамі, правадзейным членам быў абраны з эканамістаў толькі А. Смоліч, у той час, як у 1924–1926 гг. такіх было болей за дзесятак чалавек, у тым ліку і г. Гарэцкі[8]. Напэўна, ужо тады па партыйнага кіраўніцтва да А. Смоліча стаўленьне рабілася больш крытычным, і ягонае прызначэньне было немагчымае наступным годзе яго ня вылучаць на акадэміка, прыпадобна «грахі» маладосьці: арыентацыю на капіталістычны заходні агульнапалітычных і нацыянальных матываў выступаў у Расеі падчас Першай сусьветнай вайны), дзейнасьць супраць савецкай улады ў часы адстойваньня БНР на міжнароднай арэне. Аднак забараніць працаваць яму пакуль ніхто ня мог, і часопіс «Сельская і лясная гаспадарка», які прапанаваў стварыць А. Смоліч, а таксама «Працы аддзелу сельскагаспадарчай эканоміі…» надрукавалі грунтоўныя эканамічныя досьледы, праведзеныя ў сярэдзіне 1920-х. Беларусізацыя эканамічнай навукі патрохі ахапіла і дзяржаўныя ўстановы, у прыватнасьці Наркамзем і Дзяржпляну. Гэты працэс можна бачыць на прыкладзе палітычнае эканамічнага часопісу Дзяржпляну «Савецкае будаўніцтва». У 1926–1927 (да № 4 уключна) часопіс выходзіў па-расейску, у 1927–1930 частка матэрыялаў па-расейску, частка па-беларуску, з 1931 – толькі па-беларуску.

Акрамя згаданых А. Смоліча, З. Прышчэпава, г. Гарэцкага, М. Доўнара-Запольскага, у *беларускую нацыянальную групоўку эканамістаў* уваходзілі Ян Кісьлякоў, Сяргей Скандракоў, Барыс Бойка, Міхась Ганчарык, Сьцяпан Журык, Аўдакім Ярашчук, былыя чальцы БКНА Сяргей Ждановіч, Ян Грабоўскі, Мікіта Лайкоў, Пётра Хоцкі, а таксама маладыя эканамісты-

Вялікі ўплыў на справу мела Надзвычайная камісія па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам // Праца Наркамзему БССР. 1920. № 10. С. 3–4.

[8] Дзяржпляновы аддзел Інбелкульту ў 1924–1926 гг., якія так ці іначай маюць да эканамічнай навукі: А. Смоліч, І. Гарэцкі, М.

асьпіранты Тодар Плятнер, Кірыл Кіпрыянец, Алесь Дзянісавіч. Усе гэтыя эканамісты выдавалі свае працы па-беларуску, заклаўшы падмурак па-сапраўднаму беларускай эканамічнай навукі. Нават акты абвінавачаньня ў нацдэмаўшчыне складаліся на беларускай мове. Такім чынам, існавала ня толькі эканамічная навука ў нэаклясычнай традыцыі, але яна была яшчэ і пераважна беларускамоўнаю.

Дзянісавіч. Зарэцкі, З. Пазнічанаў, с. Сяргіевіч, Я. Пятровіч, А. Рыпінскі, І. Краскоўскі, М. Бурштэйн, Ц. Родзевіч, А. Кірсанаў, М. Козыраў, Э. Русецкі. Гл.: Інстытут беларускай культуры. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. с. 252–253.

ІДЭЯ ЭКАНАМІЧНАГА АДРАДЖЭНЬНЯ – КАНЦЭПЦЫЯ «БЕЛАРУСЬ-ДАНІЯ»

Упершыню ідэя арыентаваньня Беларусі на разьвітыя эўрапейскія краіны ўзьнікла ў публіцыстыцы. Газэта «Наша Ніва» часьцяком зьмяшчала матэрыялы аб дасягненьнях у сельскай гаспадарцы Даніі, Швайцарыі, Усходняй Прусіі і іншых краінаў, якія ў некаторых пазыцыях мелі нават горшыя, чым у Беларусі, умовы для гаспадараньня[9].

Затым гэтая думка набыла папулярнасьць у студэнцкіх колах, а таксама сярод палітычнай эліты абвешчанай БНР. У дыскусіях паміж чальцамі БНКА пры Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі была вылучана ідэя ператварыць праз 20–30 гадоў Беларусь у Данію. «Насьлаждающа адказныя часы, у якія эканамічны разьвітак Беларусі павінен злажыць ей гісторыю Даніі і Вэльгіі», – казаў на штогадовым пасяджэньні Гарэцкі[10]. Эканамічна моцная і падобная да беларускага краю прыродна-кліматычнымі і дэмаграфічнымі умовамі Данія была абраная не выпадкова. Прыклад яе эканамічнага росквіту абвяргаў даўнія стэрэатыпы, што адсутнасьць значнай колькасьці карысных выкапняў, неспрыяльны клімат для вядзеньня сельскай гаспадаркі ды недастатковая гушчыня насельніцтва быццам бы перашкаджаюць Беларусі стаць заможнай краінай. Сябры БКНА, якія затым зрабіліся знакавымі постацямі ў беларускай эканамічнай навуцы, – Гаўрыла Гарэцкі, Сяргей Ждановіч, Ян Грабоўскі, Мікіта Лайкоў, Пётра Хоцкі – а таксама сябры моладзевых арганізацый іншых ВНУ – Ян Кісьлякоў, Сьцяпан Журык, Барыс Бойка – галоўнымі чыньнікамі росквіту Беларусі лічылі падвышэньне рынкавасьці яе эканомікі і нацыянальнае адраджэньне. Ажыцьцяўленьне

[9] Сельская гаспадарка ў Даніі // Наша Ніва: Факсімільнае выданне. 1909. № 51–52. с. 756–758; Ялвігін Ш. (Антон Лявіцкі). [Пераклад кнігі с. Сямёнава «Па чужынскім землям (пра сельскую гаспадарку Швайцарыі, Англельшчыны, Італіі)»] // Наша Ніва: Факсімільнае выданне. 1910. № 22, 23, 24, 36. с. 339–341, 360–362, 548–551.

гэтай ідэі было падмацавана распрацоўкай адпаведнай *канцэпцыі эканамічнага разьвіцьця* з працоўнай назвай «Беларусь-Данія» (сустракаліся, праўда, і іншыя назовы-параўнаньні, напрыклад, «Беларусь-Бэльгія», «Беларусь-Нідэрлянды»).

У пэрыяд так званага НЭПу вакол гэтай канцэпцыі аб'ядналася беларуская нацыянальная групоўка эканамістаў. Праўда, яе назва, з улікам паноўнай у той час афіцыйнай ідэалёгіі, была зьмененая на «Беларусь – Чырвоная Данія»[11], але ад гэтага сваёй не зрабілася менш прарынкавай і празаходняй. Акрамя ўжо згаданых г. Гарэцкага, с. Ждановіча, Я. Кісьлякова, Я. Журыка, яе падтрымлівалі З. Прышчэпаў, А. Смоліч, Р. Бонч-Асмалоўскі. Каб упэўніцца ў дакладнасьці сваіх меркаваньняў, г. Гарэцкі і З. Прышчэпаў адмыслова ад Інбелкульту праходзілі навуковую стажыроўку ў Нямеччыне, Польшчы і Даніі ў жніўні – верасьні 1926 г.[12]. У 1927 г. ад БНДІ сельскай і лясной гаспадаркі ў Нямеччыне і Даніі чатырохмесячную стажыроўку прайшоў Сьцяпан Журык, дзе знаёміўся са сьвінагадоўляй і зводзіў сьвіней на бэкон, вывучаў спэцыяльную навуковую літаратуру. Па вяртаньні, напісаўшы некалькі працаў[13], с. Журык стаяў каля вытокаў спачатку дасьледчую станцыю, а потым і інстытут сьвінагадоўлі, дзе выкарыстоўваў замежны досьвед.

Лічылася, што ліквідаваць адсталасьць беларускай сельскай гаспадаркі ад Польшчы, Чэхіі, краінаў Балтыі, ня кажучы ўжо пра заходнеэўрапейскія краіны, можна толькі шляхам перайманьня ў гэтых краінаў прагрэсіўных мэтадаў і тэхналёгій гаспадараньня. У адрозьненьне ад цяперашніх часоў тады існавала традыцыя параўноўваць разьвіцьцё народнай

[11] Канцэпцыі Беларусь-Данія і краіны, з якімі яна параўноўвалася, былі ня толькі ў эканамічнай літаратуры, але і ў мастацкай. Так, В. Гапеева ў кнізе «Экономайчыкі» Беларусь-Данія» (Мінск, 2000. с. 247–248) дае нават такое зьмешчана ім у асобным артыкуле (Бусько В. О концепции «Беларусь – Красная Дания» // Белорусский экономический журнал. 2000. № 4. с. 108–117), і яна некалькі разоў узгадваецца ў Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі, усё ж ёсьць сумневы ў фізычным існаваньні гэтай канцэпцыі. Хутчэй за ўсё,

эканамічная думка Беларусі ў 1920-х гг. – Мінск, 1999. – С. 5–10.

2. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя арганізацыйныя і эканамічныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 11–20.

3. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя фундаментальныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 21–30.

4. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 31–40.

5. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 41–50.

6. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 51–60.

7. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 61–70.

8. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 71–80.

9. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 81–90.

10. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 91–100.

11. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 101–110.

12. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 111–120.

13. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 121–130.

14. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 131–140.

15. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 141–150.

16. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 151–160.

17. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 161–170.

18. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 171–180.

19. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 181–190.

20. Прыш-Ільяш І. Беларускія эканамісты 1920-х гг. пра асноўныя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі // Беларуская эканамічная думка: Зб. навук. прац. – Мінск, 1999. – С. 191–200.

Смоліч падтрымліваў шчыльныя навуковыя сувязі са сваім былым настаўнікам. У 1924 г. прыязджаў у Маскву, каб паказаць зроблены ім пераклад на беларускую мову кнігі А. Чалінцава «Аб рахункавым аналізе сялянскай гаспадаркі».

Самыя вядомыя на той час у сьвеце расейскія эканамісты – М. Кандрацьеў і А. Чаянаў[16] – выкладалі эканамічную тэорыю ў Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі вялікай групе студэнтаў – ураджэнцаў Беларусі. Чаянаў выступаў зь лекцыяй перад сябрамі БКНА на тэму «Праблемы Краю». Цікава, што г. Гарэцкі мог абраць сваім навуковым кіраўніком у час вучобы ў асьпірантуры і А. Чаянава, і М. Кандрацьева. Ён некалькі разоў быў на кватэры А. Чаянава ў памяшканьні Сэлекцыйнай станцыі ў Разумоўскім, зьвяртаўся па кансультацыі да М. Кандрацьева, які, у прыватнасьці, вычытваў рукапіс адной з самых грунтоўных эканамічных працаў г. Гарэцкага «Народны прыбытак». Але ў выніку г. Гарэцкі выбраў навуковым кіраўніком А. Рыбнікава. Менавіта А. Рыбнікаў у 1926 г. напісаў прадмову да працы «Народны прыбытак», а ў 1927 г. яны выдалі сумесную працу «Эканамічны ўплыў Масквы на арганізацыю сельскай гаспадаркі вобласьці», прадмову да якой напісаў ужо А. Чаянаў. У сваёй прадмове А. Чаянаў высока ацаніў навуковы ўзровень г. Гарэцкага і вынікі ягонай экспэдыцыі, адзначыў навіну выкарыстанага ім мэтаду эканамічнага профілю для вывучэньня недасьледаваных прастораў, у тым ліку Беларусі. Але яшчэ да гэтай працы А. Чаянаў пісаў рэкамэндацыйны ліст г. Гарэцкаму на французскай мове, калі той ехаў на навуковую стажыроўку ў Польшчу, Нямеччыну, Данію (жнівень–верасень 1926). Пазьней паміж А. Чаянавым і г. Гарэцкім вялося ліставаньне. У часы працы ў Беларусі г. Гарэцкі таксама не аднойчы наведваў М. Кандрацьева ў Каньюнктурным інстытуце і нават запрашаў яго чытаць лекцыі па дысцыпліне «каньюнктура і рынкі» ў БСГА ў Горках[17].

Г. Гарэцкі быў, безумоўна, адным з самых актыўных беларусаў, якія навучаліся і працавалі ў той час у Маскве. Ён узначальваў БКНА (1920–1922), у 1922 г. пасьля першага арышту яго плянавалі выслаць у Нямеччыну на тым самым параходзе, які на загад Леніна вывез інтэлігенцыю за межы Расеі. Акрамя А.

Чаянава, М. Кандрацьева і А. Рыбнікава, г. Гарэцкі меў сяброўскія адносіны з прафэсарам А. Фартунатавым (які быў, дарэчы, этнічным беларусам), быў асабіста знаёмы зь Юроўскім, Студзенскім, Літошанкам, Ванштэйнам; у 1928 г. разам з А. Чалінцавым аглядаў Харкаўскую дасьледчую станцыю, запрашаў на працу ў Горкі прафэсара А. Фабрыканта. Заснавальнікі арганізацыйна-вытворчай школы А. Чаянаў, М. Кандрацьеў, А. Чалінцаў і М. Макараў, знаходзячыся ў Бутырскай турме, калі трэба было назваць лідэра так званай беларускай філіі, вылучылі на гэтую роль менавіта г. Гарэцкага (праўда, быў названы яшчэ с. Ждановіч). Сьледам за імі г. Гарэцкі быў арыштаваны і дастаўлены ў Маскву, сядзеў спачатку ў адной камэры са сваім былым навуковым кіраўніком А. Рыбнікавым, а потым у супольнай камэры на 60 чалавек з усёй групай прафэсараў, якія праходзілі па сфабрыкаванай АДПУ справе Працоўнай сялянскай партыі. Ён быў вымушаны даць паказаньні пра свае адносіны з расейскімі эканамістамі, што выкладалі ў бадай самай моцнай на той час у Расеі Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі, і гэта сёньня ёсьць асноўнай крыніцай нашых ведаў. Без сумненьня, творчыя сувязі мелі і іншыя выпускнікі, але яны застаюцца амаль нявывучаныя. Вучнямі А. Чаянава, М. Кандрацьева і іншых расейскіх эканамістаў, заснавальнікаў арганізацыйна-вытворчай школы, можна лічыць выпускнікоў маскоўскіх ВНУ пачатку 1920-х, ураджэнцаў Беларусі, якія потым разьвівалі беларускую эканамічную навуку ў межах нэаклясычнай традыцыі. Акрамя г. Гарэцкага, гэта былі Ян Кісьлякоў, Сяргей Ждановіч, Ян Грабоўскі, Пётра Опра, Пётра Хоцкі і іншыя. Былі кантакты і іншага кшталту, напрыклад, прафэсар М. Доўнар-Запольскі пасьля вымушанага ад’езду зь Менску ў 1926 г. пераехаў у Маскву і выкладаў у Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі.

Чаму беларускія эканамісты таго пакаленьня ня сталі шырока вядомымі ў сусьветнай эканамічнай навуцы? На маю думку, іх папросту не хапіла часу. У сваёй большасьці яны былі вучнямі вядомых у сьвеце расейскіх эканамістаў, таму іх працы ішлі са спазьненьнем прыкладна на 10 гадоў, а ўвогуле лёс адвёў ім часу на навуковую працу ўсяго 3-7 гадоў. Шмат сілаў было згублена на дасьледаваньне каляэканамічных тэмаў і

[18] Там жа, с. 207.

[19] Гарэцкі г. Выбранае. с. 15.

[20] Гл.: Смоліч А. Сельскагаспадарчыя раёны БССР: 1927–1928 гг.: Папярэдняя схема і мэтадалягічныя ўвагі. – Менск, 1929. –

выраз. Тыны геаграфічных прац беларусаў Русі. – Мінск, 1995. – С. 11–13.

ведаюць пра іх.

ізнаньне на рэгіянальным узроўні ўсё ж было. Навуковымі інстытутамі, найперш БНДІ сельскай і лясной гаспадаркі, была наладжана сыстэма шырокай рассылкі працаў беларускіх эканамістаў за межы Беларусі (50 % усіх выданьняў ішло за межы БССР, а з гэтага ліку каля паловы і за межы СССР). Выданьні згаданага НДІ, а таксама Наркамзему і БСГА ў Горках канцэнтравалі на той час найлепшыя эканамічныя досьледы, надрукаваныя па-беларуску; рассылка іх за мяжу, на думку г. Гарэцкага, павінна была стаць цудоўнай дэманстрацыяй дасягненьняў найвышэйшых формаў беларускай культуры[18], у тым ліку ў галіне эканамічнай навукі. Таму пераважная большасьць эканамічных працаў таго часу мела разгорнутае рэзюмэ на нямецкай альбо ангельскай мовах (на расейскай мове рэзюмэ амаль не сустракалася). Паводле сьведчаньня Міхася Мушынскага[19], праца «Межы заходняй Беларусі ў Польшчы», выдадзеная на беларускай мове з разгорнутым рэзюмэ на ангельскай, атрымала шырокую вядомасьць, і г. Гарэцкі быў запрошаны чытаць лекцыі ў славуты Кембрыдзкі ўнівэрсытэт. Яшчэ раней, у 26 гадоў, г. Гарэцкі выдаў перадавую кнігу «Народны прыбытак Беларусі», бо на той час у сьвеце ўласны народны прыбытак мелі ня болей за 15 краінаў. Залатым мэдалём расейскага геаграфічнага таварыства (станоўчую рэцэнзію даў П. Сямёнаў-Цяньшанскі) былі ўзнагароджаны працы А. Смоліча[20]. Шырокі рэзананс у расейскай навуковай літаратуры атрымала дасьледаваньне Я. Кісьлякова «Пасёлкі (оптымум тэрыторыі і эфэкт землеўпарадкаваньня», у якім ён фактычна працягнуў распрацоўку навукі аб арганізацыі сялянскай гаспадаркі А. Чаянава (потым у абвінаваўчых дакумэнтах АДПУ быў уведзены нават тэрмін «кісьлякоўцы» ў тым самым разуменьні, што і «чаянаўцы»). Бо, сапраўды, у «беларускіх пятроўцаў», як яны самі сябе называлі ў студэнцкія гады, у канцы 1920-х пачалі зьяўляцца вучні, беларускія эканамісты, якія атрымалі адукацыю ўжо ў Беларусі – Т. Плятнер, М. Макараў, А. Камінскі (навуковы кіраўнік Я. Кісьлякоў), К. Кіпрыянец, А. Дземідовіч, с. Маргелаў (навуковы кіраўнік г. Гарэцкі)[21]. Тыя адзінкі, якія ўсё ж дачакаліся рэабілітацыі ў сярэдзіне 1950-х, дасягнулі значных посьпехаў у іншых навуках: г. Гарэцкі стаў выдатным беларускім геолягам, заснавальнікам новай навукі

палеапатамалёгіі (навукі пра рэкі мінулага), доктарам геолага-мінэралагічных навук, акадэмікам, а М. Ганчарык – доктарам біялагічных навук, дырэктарам Інстытуту біялогіі Акадэміі навук.

Калі ўпершыню знаёмішся з працамі беларускіх эканамістаў сярэдзіны 1920-х, можа скласьціся ўражаньне, што ім нельга залічыць да эканамічнай навукі – нейкая сьвядомасьць, севазвароты, плошчы і культуры пасеваў і г. д. Зьдзіўляе, аднак, высокі індэкс цытаваньня працаў прадстаўнікоў расейскай арганізацыйна-вытворчай школы: М. Кандратаева, А. Чаянава, А. Чалінцава, М. Макарава, А. Рыбнікава, Л. Літошанкі, г. Студзенскага, Л. Юроўскага, А. Вайнштэйна, А. Фартунатава, А. Фабрыканта. Іначай гэтыя працы ўспрымаюцца, калі ведаеш, што яны адносяцца да навукі аб арганізацыі *сялянскай* гаспадаркі[22]. Ва ўмовах, калі Беларусь была пераважна аграрным краем (у 1913 г. вага сельскай гаспадаркі ў ВУП складала 62,3 %, колькасьць занятых – 89 %), з наяўнасьцю такіх перажыткаў у вядзеньні гаспадаркі, як трохпольле (заставалася яшчэ ад аграрнай рэформы 1557 г.), шнуры, цераспалосіца, шматпольле (узьнікла пасьля скасаваньня прыгону ў 1861 г.), першай задачай эканамічнай навукі было абгрунтаваць перабудову сялянскіх гаспадаркі ў улікам шмат якіх абставінаў: прыродна-гістарычных (асаблівасьці эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі, шчыльнасьці насельніцтва, клімату), эканамічных (сітуацыя адносна рынкаў збыту, транспартных шляхоў), геаграфічных (ляндшафтныя, глебавыя, дэмаграфічныя і інш. асаблівасьці). Трэба было аптымальна па-новаму разьмясьціць сялянскія гаспадаркі з максымальным эфэктам атрыманьня прыбытку, правесьці новае эканамічнае раянаваньне. Аграрная эканоміка хутарызацыі, утварэньня пасёлкаў, землеўпарадкавання, інтэнсыфікацыі сельскай гаспадаркі, за часамі наркама Зьмітра Прышчэпава ў 1924–1929 гг. праводзілася ў Беларусі // падмурку гэтай новай эканамічнай навукі[23]. Я. Кіс называў яе *тэорыяй разьвіцьця нашае сельскае гаспадаркі* і *беларускай сельскагаспадарчай эканоміяй*. Зь іншага боку, гэтая навука зусім ня ўлічвалася ў часы калектывізацыі і ўтварэньні вёсак, якія ствараліся як цэнтры калгасаў і прымусовага сьцягваньня хутароў і пасёлкаў. Нежыцьцяздольнасьць такіх штучна створаных пасяленьняў,

[21] Гл. Пленер Т. Развіццё і размяшчэнне сельскай гаспадаркі ў Заходняй Беларусі. Мінск, 1927; Пленер Т. Змены ў будове сялянскіх гаспадарак Заходняй Беларусі пасля 1921 г. // Працы Інстытута эканомікі. Мінск, 1928; Кіс Я. Дасьледаваньня рабочага земляўпарадкаваньня ў Беларусі // Праца і гаспадарка. 1928. Т. 5. с. 218–241; без

уліку вышэйзгаданых абставінаў яшчэ на момант іх Маральнае
дакладна прадказаў Т. Плятнер[24]. Падкрэсьліваў адсутнасць
тэарэтычнага абгрунтаваньня пераваг калгасных вёсак над сяляскімі
сялянскімі гаспадаркамі і г. Гарэцкі, які разглядаў перш
посьпехі калектывізацыі як цуд альбо другую рэвалюцыю[25] на
Гэта адказ таму, хто не зразумеў дагэтуль, чаму вялікія
якія былі створаныя за часамі калектывізацыі, вымушаны
Беларусі ў першым-другім пакаленьні (засталіся дзеці
нейкіх прычынаў выявіліся непрыдатнымі да гарадзкога
жыцьця, ня здолелі зьбегчы з калгасу і вымушаны
працаваць ва ўмовах бязладзьдзя, ад чаго дэградуюць
прататыпы былых беларускіх хутароў і пасёлкаў ужо
кілямэтраў за Берасьцем – за польскай мяжой – зьдзіўляюць
нас сваім росквітам.

Дарэчы, ідэалізацыя ўмоваў жыцьця ў Заходняй Беларусі
завецца бізаджатнай прапагандай. Гл.: Ярашчук А. Ці
жыцьцё ў Заходняй Беларусі? // Наша Ніва. – 1926. – № 40. –
с. 3; Ён жа. Ці жыцьцё ў Заходняй Беларусі? // Наша Ніва. –
1926. – № 41. – с. 3; Ён жа. Ці жыцьцё ў Заходняй Беларусі? //
Наша Ніва. – 1926. – № 42. – с. 3; Ён жа. Ці жыцьцё ў
Заходняй Беларусі? // Наша Ніва. – 1926. – № 43. – с. 3; Ён
жа. Ці жыцьцё ў Заходняй Беларусі? // Наша Ніва. – 1926. –
№ 44. – с. 3; Ён жа. Ці жыцьцё ў Заходняй Беларусі? // Наша
Ніва. – 1926. – № 45. – с. 3; Ён жа. Ці жыцьцё ў Заходняй
Беларусі? // Наша Ніва. – 1926. – № 46. – с. 3; Ён жа. Ці
жыцьцё ў Заходняй Беларусі? // Наша Ніва. – 1926. – № 47. –
с. 3; Ён жа. Ці жыцьцё ў Заходняй Беларусі? // Наша Ніва. –
1926. – № 48. – с. 3; Ён жа. Ці жыцьцё ў Заходняй Беларусі? //
Наша Ніва. – 1926. – № 49. – с. 3; Ён жа. Ці жыцьцё ў
Заходняй Беларусі? // Наша Ніва. – 1926. – № 50. – с. 3; Ён
жа. Ці жыцьцё ў Заходняй Беларусі? // Наша Ніва. – 1926. –
№ 51. – с. 3; Ён жа. Ці жыцьцё ў Заходняй Беларусі? // Наша
Ніва. – 1926. – № 52. – с. 3.

Гарэцкі Р. Ахвярую сваім «я»... – с. 199.

Маральнае
Дарэчы
сяляскімі
першыя
пасёлкаў
Беларусі
Гарэцкі
Мінск, 1988.

[22] Аб гэтым съведчаць і назвы працаў: Смоліч А. Арганізацыя
гаспадаркі ў раёне аб'яднаных сялянскіх гаспадарак: паводле
матэрыялаў бюджэтна-рэпрэзентатыўнага абсьледаваньня 1923 году. –
Менск: Інбелкультцэнтр, 1926. – 140 с.; Кіпель Я. Тыпы беларускіх
сялянскіх гаспадарак // Наш Край. – 1925. – № 2. – с. 3–5. Ярашчук А.
Сувязь земляробства з гаспадаркай // Наш Край. – 1926. – № 7. – с.
3–5. Ён жа. Гаспадарка БССР у сваіх асноўных рысах. – Менск:
Выдавецтва Наркамзему БССР, 1926. – 77 с. Ён жа. Нарысы
эканомікі Беларусі. – Менск: Выдавецтва Наркамзему БССР, 1927. –
Т. 2. – с. 98–181. Гаўрылкін М. Пытаньні эканомікі і арганізацыі
сялянскай гаспадаркі. – Менск: Інбелкультцэнтр, 1925.

[23] Гаўрылкін М. Пытаньні эканомікі і арганізацыі сялянскай
гаспадаркі. – Менск: Інбелкультцэнтр, 1925. – с. 3–5; Ён жа.
Матэрыялы да вывучэньня эканомікі некаторых беларускіх
сялянскіх гаспадарак. – Менск: Інбелкультцэнтр, 1925. – с. 3–5;
Гатоўцаў І. Нарысы эканомікі і арганізацыі сялянскай гаспадаркі. –
Менск: Інбелкультцэнтр, 1925. – с. 3–5; Кіпель Я. Тыпы беларускіх
сялянскіх гаспадарак // Наш Край. – 1925. – № 2. – с. 3–5; Ён жа.
Сялянскія гаспадаркі Беларусі (Матэрыялы да вывучэньня
эканомікі і арганізацыі сялянскай гаспадаркі). – Менск: Беларускі
дзяржаўны інстытут сельскай гаспадаркі, 1928. – 256 с.; Макараў М.
Спроба вывучэньня эфэктыўнасьці форм землекарыстаньня ў
БССР. – Менск, 1929. – 207 с.; Ждановіч с., Ярашчук А.
Характарыстыка сельскай гаспадаркі Беларусі на падставе
даных аб чыгуначнай і вадзяной перавозцы / Пад рэд. Я.
Кісьлякова. – Менск, 1926. – 97 с.; Ждановіч с. Да пытаньня аб
умовах разьвіцьця рынкавае сьвінагадоўлі ў Беларусі // Працы
Бел. НДІ сельскай і лясной гаспадаркі. Т. IX. Вып. 4. – Менск,
1928.

[24] Гл.: Плятнер Т. Рахункавасьць у сялянскіх гаспадарках //
Сельская і лясная гаспадарка. Кн. 2. 1927. с. 63–66.

[25] Гарэцкі Р. Ахвярую сваім «я»... – с. 199.

Дзякуючы досьледам беларускіх эканамістаў у 1920-я гг.
сеньня можна зрабіць рэканструкцыю разьвіцьця эканомікі
беларускага краю ў эпоху станаўленьня тут капіталізму. *Дарма
што наша краіна ў XIX ст. знаходзілася ў складзе Расейскай
імпэрыі, шляхі разьвіцьця эканомік Беларусі і Расеі ў гэты час
значна розьнілісь.* Асабліва значныя разыходжаньні сталі
складвацца ў другой палове XIX ст., калі пачала адбывацца

экспансія заходняга капіталу. Буйны замежны капітал, каб пранікнуць сюды, павінен быў атрымаць дазвол царскіх уладаў і прыняць выстаўленыя ўмовы. Вядомы факт, што капіталізм, які разьвіўся ў Расейскай імпэрыі да кастрычніцкага перавароту, адрозьніваўся ад заходняга тым, што тут так і не адбылося аддзяленьня эканомікі ад дзяржавы. Царскі ўрад накіроўваў замежны капітал галоўным чынам на разьвіцьцё рэгіёнаў вакол Масквы і Пецярбургу.

У дачыненьні ж да Беларусі ў гэты пэрыяд праводзілася асобная эканамічная палітыка. Пасьля паўстаньня 1863–1864 гг. распачалася хваля русіфікацыі. Царскія ўлады разгарнулі барацьбу з так званымі «польскімі маёнткамі», забараніўшы каталікам і асобам «польскага паходжаньня» купляць зямлю. Землеўладальнікі баяліся прадаваць зямлю і ўкладаць грошы ў прамысловасьць, бо ў выніку няўдачы маглі застацца ні з чым. З другога боку, каб атрымаць канкурэнтаздольную прадукцыю ў сельскай гаспадарцы, ужо ў той час патрабавалася набыцьцё мэханічных прыстасаваньняў, штучных угнаеньняў і г. д. Без пачатковага капіталу падняць яе на адпаведны ўзровень было складана. Дадатковыя ж даходы можна было атрымаць толькі з вытворчасьці, якая б абапіралася на ўласную сыравіну – зь лесанарыхтовак, броварaў, і таму шмат гаспадарак банкрутавала. Іх танна набывалі прыежджыя расейцы, часьцяком для таго, каб толькі высечы лес і прадаць далей. Калі ў 1874–1900 гг. на сусьветных рынках яшчэ і ўпалі цэны на збожжа, банкруцтва мясцовых панскіх маёнткаў набыло масавы характар. Але яшчэ да таго расейскі ўрад нанёс «сьмяротны» ўдар па эканоміцы беларускага краю. Каб выціснуць так званых польскіх памешчыкаў на тэрыторыю карэннай Польшчы (у тую яе частку, якая ўваходзіла ў склад імпэрыі), мытная мяжа, якая аддзяляла Расею ад танных замежных тавараў, была праведзена не па Польшчы, а паміж Беларусьсю і Польшчай. У выніку эўрапейскі капітал, найперш нямецкі, уздымаў прамысловасьць у Варшаве, Лодзі, Беластоку, а адтуль польскія танныя тавары траплялі на беларускі рынак. З другога боку расейскія танныя тавары траплялі на беларускі рынак. І расейцы, і палякі разглядалі Беларусь як рынак збыту ўласных тавараў. Пра зацікаўленасьць царскіх уладаў разьвіваць тут прамысловасьць з дапамогай замежнага капіталу

не магло быць і гаворкі. Гэты край быў яшчэ вельмі чужы, ён быў больш польскі, чым расейскі. Паводле зьвестак А. Смоліча, перад Першай сусьветнай вайной прамысловасьць Беларусі вырабляла тавараў на суму ня больш як 150 мільёнаў рублёў, у той час як толькі расейская частка Польшчы вырабляла на 800 мільёнаў, а прамысловасьць толькі Падмаскоўнага раёну давала тавараў больш чым на мільярд рублёў у год.

Акрамя таго, царскія ўлады чынілі дыскрымінацыю жыдоў, увёўшы для іх стаўкі падаткаў у 3–5 разоў вышэйшыя, чым для астатніх прадпрымальнікаў. З улікам таго, што, напрыклад, у 1897 г. удзельная вага жыдоў у гандлі складала 88,6 %, а ў прамысловасьці – 56,5 %, такая падатковая палітыка моцна стрымлівала разьвіцьцё прамысловасьці ў Беларусі. Нездарма *большасьць беларускіх дасьледчыкаў пасьля абвяшчэньня БНР, а потым БССР, якія разглядалі гэты пэрыяд разьвіцьця эканомікі беларускага краю* (А. Смоліч, г. Гарэцкі, М. Доўнар-Запольскі, А. Цьвікевіч, А. Луцкевіч)[26] *з нацыянальных інтарэсаў, у адзін голас называлі эканамічную палітыку царскай Расеі ў дачыненьні да Беларусі каляніяльнай*.

Беларускі селянін быў у найгоршым становішчы: зямлю кідаць страшна, бо назад ня вернешся (да 1885 г. яе было самавольна набываць і сялянам-каталікам, тады як, напрыклад, у Заходнім сярод сялян налічвалася толькі 6 % праваслаўных), на фабрыку ня пойдзеш, бо няма блізка, на казённую службу паміж усі не бяруць тутэйшага[27]. Акрамя таго, мужык плаціў вельмі працэнтны падаходны падатак ды яшчэ зямельны падатак (для параўнаньня – у 1902 г. з мужыцкае дзесяціны бралі 1 руп. 80 кап., а з дворнай – 15 кап.). У выніку сельскаму насельніцтву, якое складала амаль 90 %, не было за што набываць фабрычных тавараў, а гэта была ўжо другая прычына, чаму тут не зачэплівалася прамысловасьць.

Такім чынам, да абвяшчэньня БНР, а затым усталяваньня БССР Беларусь была пераважна аграрным краем, а разьвіцьцё прамысловасьці адставала нават ад эўрапейскай часткі Расеі яшчэ да Другой сусьветнай вайны. У дадатак самыя буйныя прамысловыя раёны былі разьмешчаны па ўскраінах этнаграфічнай Беларусі – Беластоцка-Берасьцейскі, Віленскі і

[26] Гл. кідаць Сабалеўскі А. Эканамічнае становішча Беларусі, ды перад 80 гадамі (1830–1910) // Беларускі звон. – 1990. – № 1; Беларусы : нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху»]. – Менск, 1924.

Дзьвінскі, Віцебскі, Гомельска-Клінцоўскі, – што стварала цэнтрабежнасьць беларускай гаспадаркі. У першыя гады савецкай улады, так званага НЭПу, таксама мелі месца пэўныя каляніяльнай палітыкі; калі Савецкая Расея ў 1924 і 1926 гг. вяртала беларускія землі, адным са значных фактараў іх уласных эканамічных інтарэсаў. Дарма што мясцовыя (Гомель, Гародоў Рудня, Любавічы (сучасная Смаленская вобласьць), Навазыбкаў, Клінцы, Злынка, Старадуб (сучасная Брянская вобласьць) былі згодныя ўвайсьці ў склад Беларусі, яны былі вернутыя, як лічаць дасьледчыкі[28], з прычыны існаваньня ў іх буйных ткацкіх і сярнічных фабрык. Якраз пасьля гэтага нарадзілася ідэя індустрыялізаваць менавіта Менск, а ня Гомель ці Віцебск, як геаграфічны цэнтар і сталіцу будучай абмежанай этнаграфічнай Беларусі[29].

КАПІТАЛІЗАЦЫЯ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ Ў БЕЛАРУСІ

Вельмі важным для разуменьня сучасных праблемаў у сельскай гаспадарцы зьяўляецца вывучэньне пэрыяду капіталізацыі беларускай вёскі ў 1861–1939 гг. Ён паказвае, якой магла быць сялянская гаспадарка ў Беларусі, і дазваляе сёньня легка правесьці мяжу – дзе постсавецкія стэрэатыпы, а дзе тыя мажлівасьці, на якія можна разьлічваць з тае прычыны, што так ужо было.

Дробныя сялянскія гаспадаркі пакутавалі ад старажытнага архаічнага землеўпарадкаваньня. Справа ў тым, што ў панову зямля яшчэ з аграрнай рэформы 1557 г. была нарэзана на валокі (21,36 га), якія складаліся з трох палёў, што адпавядала трохпольнай сыстэме севазвароту. З адменай прыгону сялянам пачалі прадаваць зямлю, абмерваючы яе дзесяцінамі (надзел роўны 1/10 вярсты). У выніку надзел селяніна, як правіла, уяўляў сабой некалькі загонаў даўжынёй больш за кілямэтар, які ў народзе зваўся «шнуром» (напрыклад, 4 дзесяціны (4,5 га) – гэта надзел шырынёй 4 мэтры, а даўжынёй – 1066 мэтраў). Гэта не дазваляла перайсьці з адсталага трохпольнага на шматпольны севазварот, падвышаць інтэнсіўнасьць гаспадаркі (вырошчваць болей інтэнсіўных культураў), пераходзіць са збожжавай скіраванасьці на жывёлагадоўчую. Калі паўстала пытаньне падвышэньня таварнасьці гаспадарак (гэта значыць,

С. 22–77; Гарадзкі г. Народавы склад Беларусі // Беларускі зьбор. – 1926. – № 1. – С. 1–9; Дубовы, Заніскі, Мінскі Нарысы з гісторыі Беларуссіи 1861–1914. – Менск: Изд. Госплана БССР, 1926. – 239 с.; Цьвікевіч А. Западно-руссизм: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. – Выд. 2. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.; Лушкевіч А. Эканамічная эвалюцыя і беларускі рух // Лушкевіч А. Да гісторыі

большай вытворчасьці сельскагаспадарчых тавараў (для беларускага продажу), стала зразумела, што безь землеўпарадкаваньня не абысьціся. Іначай нельга было канкураваць з заходнімі замежнымі вытворцамі.

Ідэя вырашэньня праблемы прыйшла да нас з Польшчы і Балтыі, дзе яшчэ ў канцы XIX ст. пачалася практыка разьмеркаваньня сялянаў на хутары. Памер зямельнага надзелу вызначаўся з улікам таго, каб хапіла наладзіць так званую культурную гаспадарку. Для Беларусі ён прыкладна складаў 10 га. Наладзіць дзевяціпольны ці болей севазварот (дзевяць культураў з розным прызначэньнем, якія чаргуюцца, і адна культура застаецца на гэтай самай ніве на два гады) на адным ці нават на дзьвюх надзелах было немагчыма без 3–4 гаспадарчых будынкаў. Гэтых культураў павінна было хапіць, каб прынесці найбольшы, ці, прынамсі, добры прыбытак. Акрамя таго, трэба было, каб яны ўзаемна дапаўнялі адзін аднаго, каб ураджай адной культуры не пагаршаў глебу для наступнай. Разам з тым, гэтыя культуры павінны былі адпавядаць мясцовым умовам[27].

Такім чынам, ідэя хутарызацыі ў Беларусі ўзьнікла ў 1906 г. і ўвайшла ў практыку ў 1907 г. Яе аўтарам быў Пётр Аркадзевіч Сталыпін[28]. Ён лічыў, што беларускі край абавязаны хутарызацыяй Сталыпіну. На самай справе, Сталыпін менавіта ў часы свайго губэрнатарства на Гарадзеншчыне падгледзеў гэтую ідэю і пачаў яе рэалізоўваць па ўсёй імпэрыі. Што сапраўды можна паставіць у заслугу Сталыпіну, дык гэта тое, што ён паскорыў працэс хутарызацыі, надаў яму сыстэмнасьць правядзеньнем заахвочвальнай крэдытнай і падатковай палітыкі. *Увогуле ж і да Сталыпіна, і пасьля яго працэс хутарызацыі ў Беларусі насіў аб'ектыўны няспынны характар, бо праходзіў на добраахвотнай аснове.* Найлепшыя гаспадары ад самага пачатку разумелі, што цераспалосіца, трохпольле, шнуры і іншыя анахранізмы замінаюць прагрэсіўнаму вядзеньню сельскай гаспадаркі, і самі жадалі ствараць хутарскія гаспадаркі. Сталі зьяўляцца паказальныя хутары, якія вялі рахункавыя запісы расходаў і даходаў сваёй гаспадарчай дзейнасьці, а таксама дасьледчыкі, якія на падставе тых зьвестак рабілі адпаведныя колькасныя разьлікі і даводзілі да астатніх сялянаў выгаднасьць пераносу сваёй гаспадаркі са шнуроў на хутар[30]. Адбывалася камунікацыя паміж сялянамі і на месцы. У выніку знаходзіліся ўсё новыя ахвотнікі перасяліцца. Працэс хутарызацыі то паскараўся, то запавольваўся, але не спыняўся ні ў час Першай сусьветнай

Выбраныя творы / Пад. рэд. А. Сідарэвіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2003. с. 66–73.

27 Вайцяхоўскі М. Сялянская гаспадарка Беларусі // Наша ніва. 1906. № 5 і 2; 1907. № 6. с. 2–4; № 7. с. 2–3.

28 Мірановіч М. Сталыпін і беларускі хутар // Беларускі гістарычны агляд. Т. 9. Кн. 1 (17). Мінск, 2002; Кацубо А. Разгромная война: Столыпинская аграрная реформа в Беларуси. – Минск: Беларускі Гістарычны Агляд, 2000. с. 26.

29 Так лічыў, у прыватнасьці, т. Гарэцкі. Гл.: Гарэцкі Т. Ахвяруючы сваім «я»... с. 198.

вайны, ні пасьля кастрычніцкага пераваротy, ні ў часе палітыкі «суцэльнай калектывізацыі» і вынішчэньня так званых «кулацкіх» гаспадарак. З тэхнічных прычынаў (сродкі на перанос сядзібы, на аплату землеўпарадкавальных работаў, атрыманьне крэдыту, узрост і колькасьць дзяцей і г. д.) гэты працэс ня мог адразу ахапіць усіх ахвотных, а прапускная здольнасьць яго для Беларусі была ў сярэднім каля 5 тысяч хутароў у год. Пры гэтым можна вызначыць тры хвалі паскарэньня хутарызацыі ў Беларусі, калі палітыка ўладаў актыўна спрыяла гэтаму працэсу – акрамя першага паскарэньня за Сталыпіным (1906–1911), гэта пэрыяд хутарызацыі за Прышчэпавым (1924–1929), а таксама нейкі час пасьля артыкулу Сталіна «Галавакружэньне ад посьпехаў». Да 1937 г. у Савецкай Беларусі налічвалася каля 190 тысяч хутарскіх гаспадарак, альбо 24 % ад усіх двароў[31]. З 1927 г. пачалася масавая хутарызацыя і ў Заходняй Беларусі, дзе да 1938 г. на хутары перасялілася 259,3 тысяч сялянскіх гаспадарак, каля 43 % ад усіх двароў, якія мелі 60 % сялянскай зямлі[32]. Сустракаліся ў Беларусі і суцэльна хутарскія раёны. Напрыклад, самым хутарскім раёнам у Беларусі ў канцы 1930-х быў Лёзьненскі раён, дзе колькасьць хутарскіх гаспадарак складала каля 95 % (з 10 048 двароў 9 416 былі на хутарах). Шчыльнасьць насельніцтва ў ім была большая за 70 чал./км², роўная сёньняшняй найбольшай канцэнтрацыі сельскага насельніцтва ў Беларусі вакол буйных гарадоў. Сёньня Лёзьненшчына – адзін з самых адсталых раёнаў Віцебскай вобласьці, мае ўсяго 18 фэрмэрскіх гаспадарак, і шчыльнасьць насельніцтва – 14 чал./км².

Хутарызацыя спрыяла ліквідацыі паўпрыгонных адносінаў і расчышчала шлях для разьвіцьця капіталізму ў вёсцы. Такая палітыка прынесла чаканыя вынікі – у 1937–1938 гг. Віцебскае, Навагрудзкае, Палескае ваяводзтвы Заходняй Беларусі дасягнулі паводле ўраджайнасьці збожжа і бульбы ўзроўню Францыі[33].

Нягледзячы на шматлікія перашкоды, спачатку з боку царскіх, потым з боку савецкіх уладаў, у акрэсьлены пэрыяд беларуская сельская гаспадарка мела посьпехі, якіх сёньня ня мае. Яны заснаваны на калгаснай сыстэме, дзяржаўнай уласнасьці

[30] Улас А. Аб Такая палітыка, // Наша Ніва: Фактычнае выданьне. 1909. № 6–7. с. 82–101;

дзяржаўнай падтрымцы. Напрыклад, пакуль захоўваецца самастойнасць сялянаў у вырашэньні пытаньняў, што вырабляць, у якім памеры, каму і куды прадаваць, усе гэтыя пытаньні да Беларусі дзейнічала тэорыя адносных пераваг Д. Рыкардо[34]. Хоць прадукцыйнасьць працы беларускага селяніна была ў 2–3 разы меншая, чым ангельскага ці нямецкага, беларускія тавары пранікалі глыбока ў Заходнюю Эўропу. Як пісала ў 1910 г. «Наша Ніва», «ангельцы ў Лёндане ядуць масла з Дзісны й яйкі з-пад Радашкавічаў». Пры гэтым сяляне ўлічвалі ня толькі попыт на ўнутраным рынку, але і сусьветныя цэны на сельскагаспадарчыя прадукты. У залежнасьці ад зьмяненьня канъюнктуры цэнаў зьмянялася і прапанова тавараў. Напрыклад, з 1890 х гг. пачалі падаць цэны на збожжа, сялянe скарацілі яго вытворчасьць, і краіна стаў яго імпартаваць. Але, як зазначаў А. Смоліч, на пачатку 1920 х гг. «Беларусь прывозіць хлеб са стараны не таму, што ня можа прахарчавацца сваім, а таму, што гаспадарка яе цяпер ужо менш цікавіцца вырабам зярна і свае ўвагу што раз, то больш зьвяртае на больш зыскоўныя галіны гаспадаркі. Уже на захад ад Беларусі ляжаць эўрапейскія краіны так самa, як і Беларусь, маюць недахоп улаcнага хлеба і прывозяць яго са стараны. Надварот, Масквошчына і часамі Украіна вывозяць шмат хлеба за граніцу»[35]. Той жа Смоліч даводзіў, што беларускія глебы добра прыдатныя для вырошчваньня травы, а таксама тэхнічнай культуры, такіх, як бульба, бураки, лён, канюшына, і таму тут заўсёды будзе экаманічна выгадна адносна іншых краінаў займацца жывёлагадоўляй. Паркам Прыш гэтаму казаў пра гэта так: «Да сацыялізму на сьвіньні». Такім чынам, у Беларусі няма будзе чаго вырабляць беспалстайных. сьведчыць, што у рынкавых умовах сяляне самі здольныя сфармаваць аптымальную структуру вытворчасьці, выявіць адносныя перавагі і знайсьці свае месца у міжнародным падзеле працы без умяшальніцтва дзяржавы.

Трасціна В. Зямельная рэформа 1906–1911 гг. у справаздачах Гомельскага аддзялення Сялянскага пазямельнага банка // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3. с. 51–55.

[31] Зьвесткі ўзятыя з: Прочька Т. Вынішчэньне сялянства. с. 51.

[32] Залінскі П. Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1921–1939) // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канфэрэнцыі, 17–18 верасня 1999. – Мінск: БДУ, 2000. с. 28.

[33] Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). – Мінск: Энцыклапедыкс, 2003. с. 277.

[34] Нават калі ў Беларусі ўсе тавары будзе вырабляць паражэй, чымся на Захадзе, усё роўна будуць такія тавары, якія выгаднеі вырабляць тут, бо выгаднасьць вызначаецца адноснымі выдаткамі на вытворчасьць тавараў не паміж краінамі, а ўнутры краіны. Напрыклад, калі б у Беларусі таньнейшая адносна віна на большую ступень, чым у Францыі, то нават калі і бульба, і віно будуць у Беларусі таражэйшыя, чым у Францыі, усё роўна Францыі выгаднеі у сябе вырабляць віно, а бульбу купляць у Беларусі. Іначэ кажучы, асноўнага накопт таго, што калі адчыніць мяжу для танных замежных тавараў, то

[35] Смоліч А. Геаграфія Беларусі. / Пасьлясл. А. Ліса. – Выд. 4. – Мінск: Беларусь, 1993. с. 159–160.

[36] Адамушка У. Палітычныя рэпрэсіі 20–50 х гадоў у Беларусі. – Мінск: Беларусь, 1994. с. 9.

[37] Платонаў Р. Лёсы. с. 27–40.

[38] Тамсама. с. 36.

ЗЬНІКНЕНЬНЕ Ў ПРОРВЕ «ВЯЛІКАГА ПЕРАЛОМУ»

Згодна з падлікамі У. Адамушкі, у пэрыяд 1917–1929 гг. было толькі судовымі органамі рэпрэсавана 10 тысяч чалавек, 1929–1934 – 46 тысяч, 1935–1940 – 85 тысяч, 1941–1945 – 55 тысяч,

1946–1953 – 50 тысяч[36]. У першыя гады пасьля стварэньня Савецкага Саюзу шмат хто з тагачаснай мясцовай палітычнай і навуковай эліты лічыў Савецкую Беларусь асобнай краінай. Статус Цэнтральнага бюро ЦК(б)Б дазваляў яшчэ абараняць беларускіх навукоўцаў ад саюзных сілавых органаў. Акрамя г. Гарэцкага, у тым самым 1922 г. АДПУ прыняло рашэньне аб высылцы зь Беларусі эканаміста с. Скандракова. Аднак за яго заступіўся тагачасны наркамзем А. Славінскі. У пастанове ЦБ ЦК(б)Б, прынятай адносна с. Скандракова, гаварылася: «Пакінуць для работы ў Н.К.З.Б. пад асабістую адказнасьць Славінскага, аб чым паведаміць ДПУ»[37]. Але ў 1926 г. бюро ЦК(б)Б амаль у нязьмененым складзе ўжо не падтрымала хадайніцтва старшыні Дзяржпляну Сяргея Карпа (1892–1937) пакінуць М. Доўнара-Запольскага ў Беларусі, які, на на яго думку, быў кваліфікаваным спэцыялістам у галіне народнай гаспадаркі[38].

Кропкай адліку фізычнага вынішчэньня інтэлектуальнай эліты стала канфэрэнцыя аграрнікаў-марксістаў у сьнежні 1929 г., на якой Сталін у сваёй прамове сказаў: «Непонятно только, почему антинаучные теории «советских» экономистов типа Чаяновых должны иметь свободное хождение в нашей печати…» Тут жа яму ў лад рэктар БСГА П. Пінчук і М. Карклін сярод буржуазных прадстаўнікоў эканамічнай навукі ў Беларусі назвалі с. Ждановіча, Я. Кісьлякова, З. Прышчэпава, А. Смоліча, г. Гарэцкага, О. Хаўке. Прагучала думка, што кандрацьеўшчына і чаянаўшчына ў Беларусі – самая моцная ў Савецкім Саюзе.

Пасьля канфэрэнцыі з мэтай тэарэтычнага абгрунтаваньня агучаных абвінавачаньняў у нацдэмаўшчыне, супрацьстаяньні калектывізацыі і падтрымцы рынкавых адносінаў, шэраг навукоўцаў на замову, згодна з усталяванаю каньюнктурай, пачалі пісаць адпаведныя артыкулы і кнігі. Для крытыкі, зразумела, была абраная беларуская нацыянальная групоўка эканамістаў. Былыя калегі і вучні – с. Маргелаў, г. Бондар, М. Ганчарык – выдалі крытычныя заўвагі на працы З. Прышчэпава, М. Доўнара-Запольскага, Я. Кісьлякова, с. Ждановіча, М. Лайкова, М. Макарава, А. Ярашчука, г. Гарэцкага, с. Скандракова, а г. Арцямкоў – на Р. Бонч-Асмалоўскага. М.

Ганчарык пісаў абвінаваўчы артыкул пра дзейнасьць інстытуту г. Гарэцкага, хоць яны былі сябрамі і г. Гарэцкі ў час адпачынку пакідаў яго сваім намесьнікам; Шэйнін і Каплан давалі абвінаваўчыя паказаньні, ад якіх пазьней адмовіліся. Абвінаваўчыя артыкулы пісалі таксама с. Вальфсон, І. Верба, Д. Чудноўскі, М. Гольман, Р. Выдра. Аўтары, як ім здавалася, рабілі ўсё ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі паноўнай ідэалёгіі, але рэпрэсіўны мэханізм пасьля дабраўся й да іх – большасьць будзе расстраляная.

Па справе так званага «Саюзу вызваленьня Беларусі» з нацыянальнай групоўкі эканамістаў праходзілі А. Смоліч, Я. Кісьлякоў, З. Прышчэпаў, с. Скандракоў, па справе беларускай філіі «Працоўнай сялянскай партыі» (ПСП) – г. Гарэцкі, с. Ждановіч, Б. Бойка, Р. Бонч-Асмалоўскі, П. Хоцкі, па справе «Беларускай філіі меншавікоў» – І. Герцык, па справе «Беларускага нацыянальнага цэнтру» – М. Ганчарык.

Былі расстраляныя Смоліч, Ждановіч (?), Бойка, Бонч-Асмалоўскі, Герцык, памерлі ў зьняволеньні Прышчэпаў, Журык. Выратаваліся, але не дажылі да рэабілітацыі Кісьлякоў, Скандракоў. З тых, хто выжыў (Г. Гарэцкі, М. Ганчарык), ніхто ня стаў больш займацца эканамічнай навукай, бо для гэтага патрабавалася адрачыся ад самога сябе, сваіх поглядаў. Тое самае датычыць і расейскай арганізацыйна-вытворчай школы, дзе толькі Вайнштэйн знайшоў у сабе моц у 1960-я гг. завяршыць свае працы аб праблемах народнага прыбытку (хоць там выжылі Чалінцаў, Макараў, Даярэнка і інш.). Дый патрэбы ў такой тэорыі ўжо не было, бо сялянскія прыватныя гаспадаркі былі ўжо зьнішчаныя. Як заўважыў Главэлі, «узьніклая на заклік А. Чаянава ў год паўвекавога разьняволеньня сялян арганізацыйна-вытворчая школа праіснавала меней за 20 гадоў – да новага, калгасна-саўгаснага, зьняволеньня – і зьнікла ў прорве «вялікага пералому»[39].

Без разуменьня таго, што адбылося ў часы ліквідацыі бальшавікамі прыватных уласьнікаў на сяле, немагчыма сёньня знайсьці выйсьце ў вырашэньні аграрнага пытаньня. Організационно-была забароненая хутарская форма землекарыстаньня. У 1935 г. у Маскве было прынятае рашэньне аб зьнішчэньні

[39] Гломаздзіна. У 1929 г. пра Узводственная школа //

хутароў шляхам іх «сьцягваньня» на цэнтральныя кантоны сядзібы. Былі даведзеныя плянавыя лічбы і вылучанае адпаведнае фінансаваньне. Першапачаткова высяленне плянавалася правесьці на добраахвотнай аснове, але рэальнае становішча рабіла гэта немагчымым. Тры гады запар беларускія ўлады не маглі выканаць плянаў па ліквідацыі (у 1936 г. з запланаваных 13 000 было выселена 5623, у 1937 г. з 13 000 – 4273, у 1938 г. з 30 000 – 21 406)[40]. Хутарызацыя адбывалася ажно да той пары, пакуль бальшавікі не перайшлі да фізычнага вынішчэньня сялянства. У адпаведнасьці з пастановай ЦК ВКП (б) і СНК СССР ад 27.5.1939 г. «Аб захадах па ахове грамадзкіх земляў калгасаў ад разбазарваньня», усе хутарскія гаспадаркі да верасьня 1940 г. падлягалі ліквідацыі. На гэты час на тэрыторыі сучаснай Беларусі існавала яшчэ каля 425 тысяч хутароў. За 1939–1940 ва Ўсходняй Беларусі было зьліквідавана болей за 160 тысяч хутарскіх гаспадарак; распачалася іх ліквідацыя і ў далучанай Заходняй Беларусі, але пачатая неўзабаве вайна перапыніла гэты працэс, таму канчатковая ліквідацыя хутароў у Беларусі адбылася ў 1950-я гг. За два гады да вайны і за два гады пасьля вайны было ліквідавана прыблізна па 200 тысяч хутароў. Калі ўлічыць, што ў сярэднім памер сям'і складаў 8 чалавек, дык выходзіць прыблізна 3,4 мільёну скалечаных лёсаў. Гэта адказ таму, хто ідэалізуе перамогу ў Другой сусьветнай вайне, а значыць, і той час у гісторыі Беларусі.

[40] Процька Т. Вынішчэньне сялянства. с. 57.

* * * Непрацяглы час ад абвяшчэньня БНР да вынішчэньня бальшавікамі беларускай інтэлігенцыі (1918–1929) дае сёньняшнім беларускім эканамістам апірышча ў выглядзе эканамічнай школы, якую, паводле сучасных крытэраў клясыфікацыі, можна аднесьці да нэаклясычнай ці да інстытуцыянальнай плыні.

Вучэньне навуковых набыткаў гэтай школы можа спрыяць стварэньню ўласнай тэорыі, на грунце якой можна было б дасягнуць народнага дабрабыту, роўнага такім краінам, як Данія і Бэльгія (калі гаварыць пра аднаўленьне канцэпцыі «Беларусь-Данія»).

Ёсьць патрэба і ў выданьні анталёгіі найбольш выдатных

працаў, якія датычацца навукі аб арганізацыі сялянскай гаспадаркі.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к № 2 (36) - 2005

[image]

[image]

[image]

[image]

[image]

[image]2005

"Дзяржаўны"

палеміка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Дзмітры Шырокі Стагодзьдзе спрэчак: Да сістэмнасці ў беларускім правапісе

ДЗЬМІТРЫ ШЫРОКІ нарадзіўся ў 1981 г. у Менску. Скончыў фізычны факультэт БДУ, спэцыялізаваўся ў тэарэтычнай фізыцы. Ляўрэат Рэспубліканскага конкурсу 2003 г. на найлепшую навуковую працу па гуманітарных, сацыяльна-эканамічных, прыродазнаўчых і тэхнічных навуках сярод студэнтаў ВНУ

---

1. ПУНКТ АДЛІКУ

Дастаткова пагартаць старонкі гэтага нумару «ARCHE» — ці нават паглядзець на розныя часткі вось гэтай адной старонкі — каб у чарговы раз упэўніцца: адзінай агульнаўжывальнай арфаграфічнай сістэмы беларускай мовы не існуе. Спрэчкі паміж аматарамі «тарашкевіцы» і прыхільнікамі «наркамаўкі», паміж прапагандыстамі лацінкі і апалагетамі кірылічнага алфавіту доўжацца ці не ад пачатку XX ст. і не сціхаюць нават сёння, праз колькі ўжо гадоў пасля аднаўлення незалежнасці. Трэба думаць, спрэчкі гэтыя ніяк не спрыяюць ані пашырэнню сфераў ужытку беларускай мовы ў грамадстве, ані падвышэнню ейнага прэстыжу, а вядуць хутчэй да «арфаграфічнай трасянкі» і маўленчага разнабою. Зацятасць і бясплённасць гэтых спрэчак тлумачацца, відаць, тым, што мала хто, на жаль, акцэнтуе метадалагічны бок крытыкі пабудовы арфаграфічных сістэм, і выбар на карысць аднаго з варыянтаў напісання робіцца звычайна на падставе цьмяных, ірацыянальных меркаванняў ці нават палітычных перакананняў[1]. У гэтым невялічкім нарысе

мы паспрабуем унікнуць гэтай хібнай завядзёнкі і перавесці дыскусію з плоскасці палітыкі ў прастору логікі. Да прыняцця адразу аб кірылічнай аснове нашага алфавіту — бо аргументацыя «лацінізатараў» наўрад ці выглядае пераканаўчай і таму яна малацікавая для палемікі, — будзем кіравацца разборы існых сёння, альтэрнатыўных адзін адному варыянтаў беларускага правапісу па магчымасці «імперсанальным» аргументамі: агульным *прынцыпам мінімалізму* і двума, знанымі ў лінгвістыцы прынцыпамі пабудовы алфавіта пісьма, а менавіта *фанетызмам* і *марфемнай інерцыяй пісьма*. Пры гэтым, зважаючы на традыцыйна моцныя пазіцыі фанетычнага прынцыпу ў беларускай арфаграфіі, мы запрапануем яго тыпалагізацыю, якая дазволіць правесці дакладную фармальную мяжу паміж пэўнымі арфаграфічнымі асаблівасцямі «тарашкевіцы» і «наркамаўкі». Запрапануем мы і некалькі наспелых удакладненняў нашай арфаграфіі, робячы націск, аднак, на высвятленні сістэмнасці таго ці іншага варыянту напісання ў святле згаданых прынцыпаў і пакідаючы ўкладанне канчатковых зводаў арфаграфічных правіл іншым, кампетэнтным у гэтым аўтарам.

Беларусі. Зь 2004 г. - цэнтральнай Дацэнта СОЎМ (Communications, Материалы) і Дацэнта Мэхнічнага ўніверсытэту.

2. ТЫПАЛОГІЯ ФАНЕТЫЗМУ

Непасрэднай і першаснай задачай якой-кольвек арфаграфічнай сістэмы алфавітнага пісьма — у адрозненне ад пісьма ідэаграфічнага або сімвальна-матэматычнага — ёсць як найлепей перадаваць жывую вусную гаворку, г. зн. акуратна транскрыбаваць уласцівыя мове сэнсаадрозныя гукі. Гэтая задача мае натуральным увасабленнем т. зв. *прынцып фанетызму*, або фанаграфічны прынцып арфаграфіі, які мы сфармулюем наступным чынам: *мусіць ужывацца гэткая сукупнасць графем (літар, дыякрытычных знакаў etc.) і правіл іх прачытання, якая б ізаморфна адлюстроўвала сукупнасць характэрных фанем разгляданай мовы*.

Або экстралінгвістычны рухавіках моўных рэформаў гл.: Лыч Л. Рэформа беларускага правапісу 1933 года: ідэалагічны аспект. - Менск: Навука і

Словазлучэнне «і правіл іх прачытання» ў гэтай фармулеўцы пакідае шырокую прастору для разважанняў. Так, калі гэтыя «правілы прачытання» тычацца набору з асобных графем, дастатковага для перадачы вуснай мовы шляхам «адпытунага», «аналітычнага» іх чытання, мы маем ідэалізаваны *чысты*

фанетычны прынцып, фактычна скарыстаны, бадай, толькі ў навуковых сістэмах транскрыпцыі ды архаічных сілябарыях. Далей, назавем фанетычны прынцып *спалучальным*, калі ён прачытанне літары могуць вядомым чынам уплываць суседнія з ёй графемы. Гэты адыход ад чыстага фанетызму, характэрны ці не для ўсіх моваў з алфавітным правапісам, дазваляе рэзерваваць пэўныя спалучэнні літар (як трыграф *sch* у нямецкай, дыграф *ch* у польскай або спалучэнне зычнай з мяккім знакам ці памякчальнай галоснай у беларускай, ўкраінскай арфаграфіі), фіксуючы іх прачытанне, што істотна скарачае колькасць неабходных для перадачы гаворкі літар алфавіту. Нарэшце, арфаграфію, правілы якой ставяць прачытанне графем у залежнасць не толькі ад іх пазіцыі, але і ад марфалогіі або этымалогіі чытанай словаформы (кажуць пра «надграфічных» умоваў, будзем лічыць адпаведнай *эміграцыю* фанетычнаму прынцыпу. Найпершы прыклад тут дае англійская пісьмовая традыцыя засваення іншамоўных словаў — на памяць адразу прыходзіць вядомы досціп са словам *ghoti*, утвораным Бернардам Шоў з *gh* ад *laugh*, *o* ад *women* і *ti* ад *nation* і прачытаным ім як *fish*. Трапляе сюды і недарэчная «наркамаўская» *дзесятка*, як і *не быў* проці *ляснога*.

Умоўны фанетычны прынцып разбурае дух фанетызму і фактычна набліжае нас да ідэаграфічных стандартаў. Дык чаго ж апраўдана гэтая «ўмоўнасць», прыкладам, у англійскай арфаграфіі? Магчыма, у англійскай — так, бо англійская мова, як ці ніводная іншая еўрапейская, зведала надзвычай моцны і сувымерны ўплыў шэрагу моваў з лацінічнымі алфавітамі, але рознымі традыцыямі чытання; бо аналітызм англійскай граматыкі дазваляе ўжываць замежныя словы «гатовымі», як больш-менш аўтаномныя цагліны, не размякчаючы іх суфіксамі-прэфіксамі-канчаткамі; бо беспрэцэдэнтная распаўсюджанасць англійскай мовы, тая роля lingua franca, якую выпала ёй выконваць у свеце, вядзе да неадназначнасці англійскага маўлення, і пэўна таму шматлікія праекты рэфармавання англійскай арфаграфіі дасюль заставаліся і ніжэ доўга будуць заставацца праектамі. З іншага боку, якія могуць быць высунутыя аргументы на карысць умоўнасці фанетычнага прынцыпу ў мове беларускай?

1993. Аксіёмы. Вільня: Gaudeamus, 2000. Уласцівасці і інварыянты беларускага націску. Варшава: Варшаўскі Універсытэт, 2004. Гістарычна-параўнальная рыторыка пераважае сярод нармалізатараў правапісу дасюль: Вячорка В. Правапіс. Спроба сучаснае нармалізацыі //

Пакінуўшы гэтае пытанне ў якасці рытарычнага, пяройдзем да глыбейшай тыпалагізацыі арфаграфічных правіл у межах спалучальнага прынцыпу, які здаецца найбольш адэкватным беларускай правапіснай традыцыі.

3. СТУПЕНІ ЛАКАЛЬНАСЦІ

Натуральным крокам будзе ўдакладніць спалучальны прынцып праз *прынцып лакальнасці* пісьма, які можа быць сфармуляваны як (а) *моцны*: *прачытанне літары вызначаецца гэтай самай літарай і найбліжэйшымі — сумежнымі з ёй (калі іх не аддзяляе знак прыпынку)*; так, мяккасць гука [с’] пры напісанні *мяккасьць* пазначаецца непасрэдна мяккім знакам пасля літары *с*; і (б) *слабы*: *прачытанне літары вызначаецца гэтай самай літарай і прачытаннем найбліжэйшых — сумежных з ёй (калі іх не аддзяляе знак прыпынку)*; так, мяккасць таго ж [с’] перадаецца ў «наркамаўскай» *мяккасці* апасродкавана, праз мяккі [ц’]. Наследаванне моцнаму альбо слабому прынцыпу лакальнасці (а менавіта ў гэтым, як бачым, палягае мяжа паміж «наркамаўкай» і «тарашкевіцай») вызначае на практыцы колькасць літар, якія трэба адначасова трымаць у полі зроку, каб правільна чытаць, або ў хуткай памяці, каб правільна пісаць.

Сойдзем да 1995. № 5; Шкут М. Нетыповы народ // litara.net, 2002; Пазняк К. Правапіс трохі абеларусіцца // naviny.by, 27.12.2002; Ці добра ўчынілі адраджэнцы канца 80-х, зрабіўшы выбар на карысьць тарашкевіцы? // ARCHE. 2003. № 3; Тарашкевіца-наркамаўка: складанае збліжэньне // ARCHE. 2003. № 4; Аксак В. Тарашкевіца, наркамаўка, "таракамаўка", трасянка - калі ж беларусы дамовяцца пра правапіс? // svaboda.org,

Праблема лёгкасці засваення правапісу, тэхнік чытання і пісання ёсць на Захадзе — асабліва ў ангельскамоўных краінах — актуальнай і дыскусійнай[2]. Актуальнай, хоць і не дыскусійнай пакуль, уяўляецца мне гэтая праблема зборнік: Беларусі. У гэтым рэчышчы варта заўважыць, што слабы прынцып лакальнасці лепш прыстасаваны для чытання, а моцны, наадварот, зручны пры пісанні: пішам бо па-літаратурнаму, а чытаем, хутчэй, словамі; і таму выбар на карысць моцнага прынцыпу «тарашкевіцы» быў бы значнай палёгкай навучэнцам і... пісьменнікам — хаця трэба ўсведамляць, што слабы прынцып «наркамаўкі» таксама не выводзіць нас па-за межы правапіснага фанетызму (закіданыя кімсьці «непаслядоўнасці» кшталту *кімсьці*, *барацьбіт*, *пісьменнік*, *супрацьлеглы* — натуральна тлумачацца марфалагічнай інерцыйнасцю, пад *кімсь, барацьба*, *пісьмо*, *супраць*).

20.09.2004. Цікавыя паралелі: Скапненка А. Кадыфікацыйныя тэндэнцыі ў беларускай і ўкраінскай літаратурных мовах XX ст.: тыпалогія і спецыфіка // Беларуская мова: шляхі развіцця, кантакты, перспектывы. - Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. С. 123-131.

[2] Гл. і нахрыстаў свежы зборнік: Theoretical Models and Processes of Reading / Eds. R. B. Ruddell, N. J. Unrau — Newark, DE: International Reading Association,

Закрануўшы напісанне збегаў мяккіх зычных, немагчыма абмінуць і перадачу мяккіх падоўжаных зычных на пісьме праз падваенне літар: *ве**цц**е*, *стаго**ддз**е* ў «наркамаўцы» vs. *ве**цьц**е*, *стаго**дзьдз**е* ў «тарашкевіцы». Дасюль публічнымі абаронцамі «тарашкевіцы» ігнараваная, фанаграфічная недарэчнасць апошняй пары прыкладаў палягае ў тым, што, скажам, афрыката [ц] ёсць складаным гукам кшталту [t_s], і ейнае падоўжанне — гэта не простая сума [цц] = [t_st_s], а хутчэй [$t\hat{}t_s$], і вось ужо гэты складаны гук мусіць памякчацца або не памякчацца. Таму напісанне *стаго**дзьдз**е* не толькі супярэчыць прынцыпу лакальнасці і, увогуле, эканоміі пісьма — маскуючыся псеўдафанетычным тут мяккім знакам, а фактычна знаходзячыся па-за сістэмай у астатнім лакальнай арфаграфіі, яно можа адмоўна ўплываць на арфаэпію мовы, сімулюючы і тым стымулюючы ў маўленчай практыцы падвоенасць афрыкаты замест падоўжанасці.

Наступная мая заўвага тычыцца графічнага адлюстравання такой вядомай і тыповай для літаратурнага беларускага маўлення з’явы, як «дзеканне». Прынятая сёння традыцыя пазначэння мяккага [дз’] праз дыграф *дз* і наступную за ім памякчальную галосную або мяккі знак адпавядае слабому прынцыпу лакальнасці: дайшоўшы вачыма пры чытанні да *д* і ўбачыўшы далей *з*, мы мусім глянуць і на наступную за *з* літару, у адпаведнасці з каторай давядзецца прачытаць *дз* мякка альбо цвёрда. Гэткае напісанне, такім чынам, ёсць несумяшчальным з правапісам, які, у духу «тарашкевіцы» (але датычна гэтага пункту — у адрозненне ад «тарашкевіцы» існай), грунтаваўся б на лакальнасці моцнай. Больш за тое, у сучасным правапісе літара *д* увогуле не сустракаецца ў пазіцыі перад мяккім знакам альбо памякчальнымі галоснымі — замест яе *заўсёды* пішуць у гэтых выпадках *дз*; *аўтаматызм* гэтага правіла азначае *збыткоўнасць* літары *з*, другой літары дыграфу, у гэтай пазіцыі.

Дарэчы, падобныя разважанні знаходзім ужо ў В. Ластоўскага[3], калі той прапаноўваў скасаваць літары *ў* і *й*, дамовіўшыся аб адпаведным прачытанні *у* і *і* пасля галосных — што мне, адсюль, здаецца няслушным як мінімум з той прычыны, што пераходы *у*→ *ў* і *і* → *й* у беларускай мове не універсалізаваныя фармы

[3] Ластоўскі В. Ураходы рэформы

спадзяюся, універсалізаванымі не будуць. Пераход жа ў лаўскае перад мяккімі не мае выключэнняў, бо адлюстроўвае тыповую рысу нашага маўлення; але ад нас залежыць, якое *фанетычнае значэнне* надаць таму ці іншаму напісанню, таму слушным будзе, на мой погляд, адмовіцца ад ужывання *дз* для мяккага гуку [дз’], пакінуўшы гэты дыграф для цвёрдага [дз] — у пары з «зацвярдзелым» *дж* для [дж]; тымчасам [дз’] мусіць перадавацца праз спалучэнне літары *д* з мяккім знакам або памякчальнай галоснай — у адпаведнасці з агульным прынцыпам мінімалізму, сфармуляваным вышэй моцным прынцыпам лакальнасці, а таксама прынцыпам графічнай інерцыйнасці, які мы неўзабаве патлумачым.

4. ІНЕРЦЫЙНАСЦЬ У ЧАСЕ І Ў МОЎНАЙ ПРАСТОРЫ

Сённяшнім рэфарматарам беларускай арфаграфіі пашанцавала з тым, што арфаграфія старабеларуская — а ў нас няма аніякіх падстаў адкінуць *прынцып традыцыйнасці*, які *сцвярджае пераемнасць сучаснай графічнай сістэмы з традыцыйна ўжыванай* у рэчышчы ранейшай пісьмовай традыцыі, — паслядоўней за сучасную пільнавалася *марфемнай інерцыйнасці*, што *патрабуе як найболей устойлівага напісання марфем пры словазмяненні*, таму павяртанне ўва ўлонне старабеларускай традыцыі ў пэўнай ступені цягне за сабой і меншую марфемную зменлівасць. Напрыклад, вышэй прапанаванае спрашчэнне *дзь* → *дь* сталася б крокам і да ранейшай традыцыі, і да больш паслядоўных нормаў словазмянення: *ваяво**да*** → *ваяво**де***. Прыемна, што крок гэты адначасна ўзмацніў бы таксама і лакальнасць фанетызму нашага правапісу.

Ці з’яўляецца мая прапанова радыкальнай, рэвалюцыйнай з гледзішча новабеларускай традыцыі? Вядома, што не — наеўнт пажаданай раўнавагі паміж фанетызмам і графічнай інерцыйнасцю пісаў у сваёй «Граматыцы» і сам Б. Тарашкевіч: «Галосныя пішуцца так, як вымаўляюцца (гукавая або фонэтычная аснова)... зычныя, наадварот, пішуцца для яго паходжаньне (этымолёгію) слова». Гэткі баланс паміж фанетычным і марфемным прынцыпамі назіраем фактычна ўжо ў старабеларускіх тэкстах, ненарматыўнае гіпер-окавыя, у якіх

4 Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школы. Вільня, 1929. — 5 ўжо вы, § 73.

адлюстроўвала рэальнае фанетычнае аканне беларусаў[5]. Таму вяртанне да нормаў напісання *дь*, *ть* замест цяперашніх *дзь*, *ць* (з нарматыўным наданнем адпаведнага фанетычнага значэння новым-старым спалучэнням) — лагічны і з усіх бакоў паслядоўны крок.

Але ўсё ж чаму, у той час як у старабеларускіх помніках практычна немагчыма знайсці *дз* перад мяккім знакам альбо перад памякчальнымі галоснымі, у новабеларускіх тэкстах у тых самых пазіцыях паўсюдна стаіць гэты дыграф? Здаецца, тлумачэнне ляжыць у палітычнай сферы: калі ў Высокім сярэднявеччы беларусы мелі развітую пісьмовую культуру і не рупіліся аб тым, каб пісаць як мага адрознейшым ад усходніх суседзяў правапісам, бо самі заўважна ўплывалі на мову тых усходніх суседзяў, дык у XIX—XX стст. істотна змяніліся палітычныя і культурныя варункі, і першыя беларускія «адраджэнцы», поруч з «западноруссистами», змушаныя былі літарамі расейскага алфавіту і *грунтуючыся на расейскай традыцыі іх чытання* як мага дакладней — а гэта значыць, *кантрастыўна* — перадаваць асаблівасці беларускай гаворкі, сцвярджаючы тым самым, свядома ці не, другаснасць і «масквацэнтрызм» новабеларускай арфаграфіі. Ці варта трымацца гэтай прымальнай тактычна, але стратэгічна разбуральнай лініі кантрастыўнай пабудовы арфаграфіі і сёння — пытанне, здаецца, ізноў рытарычнае.

Не выклікае ў мяне сумненняў і неабходнасць вяртання ўва ўжытак сістэматычна ўжыванага ў старабеларускіх помніках дыграфу *кг* для пазначэння выбухнога гуку [ґ], які суіснуе і сёння ў жывой народнай мове (***кг**анак*) поруч з [*г*] фрыкатыўным. Крытыка графічнага афармлення гэтага *факту мовы* зводзіцца, па сутнасці, да пункту аб тым, што гук не нясе сэнсаадрознай функцыі і таму без вялікіх стратаў, дзеля спрашчэння правапісу, можа быць рэдукаваны да фрыкатыўнага. Гэтую крытыку не засмучае тое, што мова — вялізны пласт не заўсёды рацыянальнай культуры і нясе, апрача камунікацыйнай, таксама і эстэтычную, выяўленчую функцыі; што фанетычны правапіс мусіць як мага дакладней перадаваць гэтую мову, бо сам хоцькі-няхоцькі фармуе яе арфаэпію; што дбанне аб спрашчэнні правапісу можа і значна

[5] Гіс. Гзь, ць Н. Да пытання станаўлення беларускай арфаграфічнай сістэмы (па матэрыялах заходнярускай пісьменнасці XIV-XV стст.) // Уч. зап. Гродн. гос. пед. ин-та. Вып. VI (сер. гуманитарная). Минск, 1960. С. 82.

далей нас завесці, бо для перадачы інфармацыі — якой заўгодна інфармацыі ў гэтым свеце — выдатна прыстасаваны і бінарны код — алфавіт (0,1). Нарэшце, супярэчыць уніфікатарскім разважанням і моўная практыка іншых краін: ніхто не збіраецца атаесамляць, прыкладам, гукі [θ] і [ð] у ангельскай мове (якія ў стараангельскай арфаграфіі эквівалентна перадаваліся праз *th*, ð і торн þ рунічнага алфавіта) на падставе іх «ізафанемнасці», але наадварот, здаўна чуваць прапановы замацаваць адрознасць гэтых гукаў графічна — напрыклад, праз *th* для [θ] і *dh* для [ð][6], стандартнае і даўняе правіла для брытанскай картаграфіі[7].

Канатацыі ***кганку***, аднак, падводзяць нас неўпрыкмет да (не адной, вынесенай у асобны раздзел і асабліва «гаразвай» тэмы — правапісу запазычанняў.

[6] Гл. (не звяжаючы на ініцыялы): Hinds J. I. D. A New Orthography // Science. 1893. № 22.

[7] A System of Orthography for Native Names and Places // Science. 1887. № 9.

5. ЗАПАЗЫЧАННІ: СВАЁ ЦІ ЧУЖОЕ?

Правапіс запазычанняў — адно з найбольш палемічных пытанняў цяперашняга «арфаграфічнага дыскурсу» і закранае праблему выпрацоўкі маўленчых правіл, фанетычных стандартаў мовы per se, што сягае за межы нашага артыкула. Заўважым, аднак, што выключна няўдалай з метадалагічнага гледзішча бачыцца пастаноўка задачы аб нармалізацыі напісання асобнага корпусу словаў, аднесеных кімсьці па тых ці іншых прыкметах — пакінем убаку штучнасць вылучэння такіх прыкмет — да *запазычанняў*; ужо сама семантыка *запазычання* не-свайго вядзе нас па сцяжыне *выкарыстання* лексем заміж *засваення*. Але цяперашняе абвастрэнне пытання правапісу запазычанняў сведчыць, як мне здаецца, аб небяспечным абвастрэнні значна глыбейшага канфлікту: канфлікту свой—чужы сярод нашай культурнай эліты; канфлікту, які сілкуе нашыя нацыянальныя фобіі і комплексы; канфлікту, які магчыма эфектыўна пераадолець, дасягнуць нарэшце нутраной цэльнасці і ладу праз простую дамову аб тым, што нацыянальная культура — гэта *не створанае* колішнімі «прадстаўнікамі» дадзенай нацыі, а *засвоенае* цяперашнімі.

Набыткі літаратурнай крытыкі другой паловы XX стагоддзя, а

менавіта вядомыя канцэпцыі «смерці аўтара» (Р. Барт), «адкрытага тэксту» і «транстэкстуалізму» (Ж. Жэне) робяць відавочнай штучнасць правядзення якіх-кольвек дэмаркацыйных ліній паміж нацыянальнымі літаратурамі і, шырэй, паміж нацыянальнымі культурамі ў традыцыйным разуменні, вымагаючы канструктыўнага (пера)азначэння паняцця «нацыянальная культура» як такога. Дзеля гэтага абгрунтаваным здаецца размежаваць *культуру-як-створанае*, як сукупнасць ідэй, вобразаў, тэкстаў па-за пытаннем аб іх засвоенасці («культура-для-нас»), і *культуру-як-засвоенае*, «культуру-ў-нас», і засяродзіць увагу на гэтай апошняй. Фактычна гэта будзе сацыяльнай праекцыяй агалошанага структуралістамі пераносу акцэнтаў крытыкі з рэляцыі аўтар—твор на рэляцыю твор—чытач.

Відавочна, што для грамадства мае вагу толькі культура-як-засвоенае, толькі ў гэтым разуменні культура паўстае рэальнасцю сацыяльнага жыцця. Менавіта ўспрынятае, засвоенае грамадзянамі ўтварае тое, што варта было б называць «нацыянальнай культурай» — культурай, якая натуральна прасціраецца сёння значна далей за створанае ейнымі носьбітамі ў цяперашнім часе або ў часе мінулым. Адпаведная дэмаркацыя нацыянальных літаратур, моваў, міфаў прадухіляе ўсе «памежныя спрэчкі»: і а-ля чый Адам Міцкевіч, і ў адпаведнасці з якой традыцыяй, «нямецка-лацінскай» або «ўсходне-візантыйскай», мы мусім пісаць чужынскія словы. Чужынскія словы бо пераўтвараюцца ў свае, і ўжываць іх застаецца адно паводле сваёй, беларускай традыцыі, беручы пад увагу (1) наяўнасць уласнабеларускіх адпаведнікаў, (2) натуральнасць гучання, (3) этымалагічную абгрунтаванасць напісання, (4) практыку засваення. Фантасмагарычны *філёляг*, напрыклад, не вытрымлівае крытыкі ані па адным з першых трох пунктаў, што натуральна адбіваецца і на статыстыцы ўжывання: так, пошук па Google проці 197 *філолагаў* дае 76 *філёлягаў*. Гэткім жа чынам *парламентаў* знойдзем 64, *парлямэнтаў* — 127, а *парлямантаў* — 16. Колькасць жа спасылак на словы *матар'ял* і *матэрыял* суадносіцца як 212 да 15 900!

6. ВЫСНОВЫ

У гэтым артыкуле зроблена спроба параўнаць арфаграфічныя нормы суіснуючых сёння беларускіх правапісных традыцый, «наркамаўкі» і «тарашкевіцы», з гледзішча ступені іх адпаведнасці (а) вылучанаму вышэй спалучальнаму фанетычнаму прынцыпу — альбо моцнай, альбо слабой лакальнасці, і (б) прынцыпу марфемнай інерцыйнасці, які, дзякуючы гістарычным асаблівасцям развіцця беларускай мовы, сугучны з агульным моўным і правапісным традыцыяналізмам. Прапанаваная тыпалагізацыя фанетычнага прынцыпу на аснове крытэрыя лакальнасці дазваляе фармалізаваць лінію падзелу паміж «тарашкевіцай» і «наркамаўкай» як двума правапісамі з перавагай лягчэйшага пісання або лягчэйшага чытання. Пэўныя ж захады па паглыбленні фанетызму абедзвюх гэтых правапісных сістэм — адмова ад атавістычнага *дз* на карысць *д* перад мяккімі etc. — не супярэчаць, а цалкам сугучныя з пунктам (б). Гэтая дзіўная простасць, з якой здаецца магчымым аптымізаваць цяперашнюю арфаграфію і адначасова ўзмацніць ейны гістарызм, канечне, проста сведчыць аб параўнальна высокім развіцці арфаграфіі старабеларускай.

Тут цяжка — як кажуць звычайна дзеля надання ўласнаму словам патрэбнай вагі, — цяжка не пагадзіцца са спадаром, які заклікае[8]: «Даўно пара наўсьлед за Ф. Багушэвічам і Я. Станкевічам не рабіць штучнага разьмежаваньня паміж старабеларускаю моваю і сучаснаю; такія помнікі, як «Статут» (1588), для папулярных выданьняў варта друкаваць сучасным правапісам». Адзінае ўдакладненне хацелася б зрабіць: «сучасным правапісам» зусім не значыць «існым», адным з ужываных на бягучы момант у новабеларускай традыцыі, але — абгрунтавана, сістэмна ўпарадкаваным і сапраўды сучасным правапісам новай беларускай традыцыі, якой прысвяціла ўжо даўно пара. Так ці не?

[8] Пашкопа Ю. Падбаем, чаму дзіва ў правапісу: Старонкі з гісторыі // ARCHE. 2003. № 6.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (36) - 2005
[image]да Зьместу

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

[image]

палеміка [image]2005

палеміка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Пётра Рудкоўскі

Пра «светлае заўтра каталіцкай філасофіі» (Палеміка з «праграмай хабітуальнай дыскрымінацыі» сп. Шырокага)

«Мае абвінаваўцы так пераканаўча гаварылі, што ледзь мяне самога не пераканалі», – прыкладна гэтак пачаў сваю славутую прамову філосаф Сакрат, калі яго абвінавацілі ў дзейнасці на шкоду Афінскай дзяржавы. Ну, я зусім не Сакрат, наша дзяржава зусім не Афінская, а ўжо напэўна сп. Шырокі, які скрытыкаваў мяне ў артыкуле «Праграма хабітуальнай дыскрымінацыі», або Понт Беларускі» не мае нічога супольнага са зламыснікам Мелетосам, які і запачаткаваў тую сумнавядомую кампанію супраць Сакрата. Тым не менш, успрымаю вышэй цытаваныя словы афінскага філосафа як даволі трапнае апісанне таго пачуцця, якое ўзнікла ў мяне непасрэдна пасля прачытання артыкула сп. Шырокага. Ці прадугледжвае ён для мяне хоць якую магчымасць рэабілітацыі?

Так ці гэтак, заўсёды можна спрабаваць. Крытыка (і асуджэнне)

сп. Шырокага адносіцца, перш за ўсё, да майго артыкула «Пагоня за духамі ды ідэямі». Гэты артыкул асацыюецца майму крытыку з жартоўным эксперыментам А. Сокала, які захацеў у свой час праверыць гуманітараў, засяроджаных вакол часопіса «Social Text», і змясціў там якуюсь бязглуздзіцу, а тыя нават не заўважылі… Няўжо сп. Шырокі і сапраўды лічыць, што нейкі там шарлатан Рудкоўскі здольны быў аж так аблытаць рэдактараў «ARCHE»? Напісаў суцэльную бязглуздзіцу, а тыя і не разабраліся?

Сп. Шырокі кажа пра «*мяшанку малазразумелых словаў-наватвораў з абавязковай у такіх выпадках тэрміналагічнай блытанінай, з неабавязковасцю цытавання і да т. п.*». Наколькі я зразумеў свайго крытыка, метадалагічны закід датычыць усіх трох аспектаў логікі: *прагматычнага*, *семантычнага* ды *сінтаксічнага*. Інакш кажучы: я гаварыў незразумелымі словамі («прагматычны» грэх), не падбаў пра суаднясенне маіх словаў з рэчаіснасцю («семантычны» грэх), дапусціўся «тэрміналагічнай блытаніны» («сінтаксічны» грэх).

Наконт «малазразумелых словаў». Сапраўды, дбанне пра зразумеласць і як мага большую яснасць выказванняў – гэта добры паказнік і навукоўца, і публіцыста. Я і сам неаднойчы абураюся на «закручанасць» ды непатрэбную «акадэмічнасць» тэкстаў многіх аўтараў. Адначасна ж заўважу, што «зразумеласць» ці «незразумеласць» – паняткі, якія не маюць устойлівага зместу. Яны сітуацыйныя і заўсёды абумоўлены стасункам аўтар–адрасат. Прызнаю, што, прынамсі, некаторыя рэчы можна было б сказаць прасцей, напрыклад, замест разрэкламаванай «хабітуальнай дыскрымінацыі» можна было б казаць «устойлівая дыскрымінацыя», замест «кансумпцыянізм» лепш, канечне ж, казаць па-свойму «спажывецтва», а замест «дэзавуаваць» – «раскрыць». Магчыма, тут даў аб сабе знаць шкодны ўплыў польскай публіцыстычнай мовы, у выпадку якой можна ўжо казаць пра хранічную тэндэнцыю да выяснення карэнных польскіх словаў рознымі запазычаннямі. Тым не менш, надалей невядома, што рабіць з «трыумфалістычна-віктымістычнай інтэрпрэтацыяй» – гучыць дзіка, але – даруйце – мне гэты тэрмін сапраўды патрэбен!

Наконт семантыкі. У сп. Шырокага выклікаюць засцярогі ўжытыя мною тэрміны «грамадская філасофія», «энергічная філасофія» ды «крытычная філасофія». Крытык закідае: «Аўтар (…) не абцяжарвае чытачоў ані тлумачэннем паняцця «*грамадская філасофія*» (…) ані «*экземпліфікацыяй*» свайго разумення тэрміну «філасофія» ўвогуле». Закід тыпу «адсутнасць тлумачэння» мае сэнс толькі ў двух выпадках: 1) калі сам тэрмін незразумелы або 2) ужыты аўтарам у своеасаблівым значэнні. Засцярога (1), відаць, адпадае, бо, напэўна, усе чытачы «ARCHE» маюць неблагое разуменне згаданых тэрмінаў. Значыць, я ўжываў слова «філасофія» і «грамадская філасофія» ў *сваім* сэнсе, неагульнапрынятым. «Своеасаблівасць» майго разумення філасофіі палягае ў тым, што я прапанаваў падзел на «энергічныя філасофіі» ды «крытычную філасофію». Тым часам – сугеруе сп. Шырокі – рысы, якія я прыпісаў «крытычнай філасофіі» (*эмпірыя, інтэлектуальная дысцыпліна ды крытыцызм*) уласцівыя *філасофіі ўвогуле*, а не нейкаму аднаму тыпу. Ці сп. Шырокі лічыць, што філасофія Гегеля характарызуецца эмпірыяй, а Леніну ўласціва была інтэлектуальная дысцыпліна? А ці ім абодвум быў уласцівы крытыцызм? Ці яны дапускалі магчымасць крытыкавання сваіх філасофіяў? Ці, можа, мой крытык не лічыць Гегеля і Леніна філосафамі? Калі так, то гэта патрабавала б тлумачэнняў, бо, бадай, ува ўсіх падручніках па гісторыі філасофіі яны прадстаўлены як філосафы…

Наступная праблема – гэта маё новаўвядзенне «*энергічныя філасофіі*». Сп. Шырокі кажа, што «і ролік сацыяльнай рэкламы, і прамова Лукашэнкі на селектарнай нарадзе, і піск немаўляці – усё гэта, у адпаведнасці з такім азначэннем, ёсць «*энергічнымі філасофіямі*». Наконт «піску немаўляці», то мой крытык яўна перагнуў: няўжо гэты піск характарызуецца «*ідэйнасцю*» ды «*абстрактнасцю*»? Сапраўды, *своеасаблівае* ў сп. Шырокага разуменне гэтых тэрмінаў! Наконт жа прамоваў Лукашэнкі ды сацыяльных ролікаў, дык я б прапанаваў перагледзець іх адпаведнасць маёй дэфініцыі «энергічных філасофіяў». Згодны з тым, што згаданыя прамовы і ролікі *не разлічаны на крытычнага адрасата*, але ці сапраўды яны характарызуюцца *ідэйнасцю, абстрактнасцю* ды *візіянерствам*? Тры апошнія дыстынктыўныя прыметы ўказваюць на наяўнасць тэарэтычнай

падбудовы, і яна ёсць у крытыкаваных мною Лыча, Крукоўскага ды Кірвеля, але няма яе ў прамовах Лукашэнкі ды сацыяльных роліках. Калі мой крытык з гэтым нязгодны, то было б пажадана атрымаць ад яго дэфініцыю гэтых тэрмінаў.

Адначасна ж заўважу, што падзел на «энергічныя філасофіі» ды «крытычную філасофію» меў рабочы характар, ён мне быў патрэбен для апісання *некаторых тэндэнцый* у беларускай грамадскай філасофіі (*далей* – БГФ). Такія рабочыя новаўвядзенні кожны мае права рабіць. А *якіх* тэндэнцый тычылася апісанне – пра гэта сп. Шырокі мог даведацца, чытаючы сам тэкст, – *нацыяналізму*, *гегельянства*, *экалагізму* ды *культурнага дыялогу*. Не разумею, чаму сп. Шырокі сумняецца ў тым, што яны ёсць прыкладамі *БГФ*? Можа, яны не беларускія, а польскія ці расейскія? Можа, яны не грамадскія, а эстэтычныя ці рэлігійныя? А можа, яны не філасофіі, а проста мастацкія творы? Калі так, то прапаную дадатковую дыскусію наконт тэрмінаў і паняткаў. Бо на гэты момант я глыбока перакананы, што згаданыя чатыры тэндэнцыі можна называць *тэндэнцыямі ў БГФ*.

Наконт «тэрміналагічнай блытаніны» ды «ўнікання якой-кольвек аргументацыі». Гэтую праблему я назваў сінтаксічнай у лагічным разуменні гэтага слова, бо яна датычыць пабудовы сказаў, стасунку паміж сказамі і стасунку паміж высновамі і аргументамі. Вось тут было б пажадана высветліць, што маецца наўвеце, калі гаворыцца пра «аргументы». Можна вылучыць, прынамсі, два разуменні аргумента – матэматычнае і гуманітарнае. Аргументацыя ў фармальных навуках (логіка, матэматыка) палягае ў *доказах*, дзе *аксіёмы*, з якіх могуць быць выведзены сцверджанні, і *правілы* вынікання характарызуюцца высокай ступенню відавочнасці. Ян Валенскі стасуе акрэсленне «моцная рацыянальнасць» датычна фармальных навук. Калі сп. Шырокі патрабуе ад мяне «моцнай рацыянальнасці» на грунце гуманітарных навук, то мушу шчыра сказаць: здаюся. Я сапраўды не ў стане гарантаваць тут даказальнасці ў матэматычнам сэнсе. Толькі цікава было б ведаць, ці сам мой крытык прадугледжвае магчымасць такога «матэматычнага праекту» гуманітарных навук? Што праўда, былі спробы

рэалізацыі ідэі *more geometrico* ў гуманістыцы (Спіноза), але, наколькі мне вядома, гэта нікому яшчэ не ўдалося. А калі сп. Шырокі прадугледжвае аргументацыю ў *гуманітарным* сэнсе, то мушу ў яго запытацца, чаму ён не праверыў як след маёй аргументацыі ў артыкуле «Пагоня...»? «Як след» – значыцца: паводле логікі прэферэнцыі (хіба што сп. Шырокі прапануе іншы, лепшы метад праверкі), наколькі дадзены аргумент горшы ад магчымага контраргумента і паводле якога крытэру горшы.

Мой крытык спыняецца толькі на *блізкім* кантэксце маіх выказванняў, ну, прыкладам, калі я прасоўваю думку, што *нацыяналізм* не сумяшчаецца з *разнастайнасцю*, то сп. Шырокі заўважае толькі такі мой «аргумент»: «*Калі ж мы дакладна прааналізуем...*» (а дзе ж, маўляў, той дакладны аналіз?). Ну, то шкада, што аналітычная работа над тэкстам Леаніда Лыча, якая папярэднічае майму сцверджанню, засталася па-за ўвагай. Іншая справа, калі б сп. Шырокі паказаў, што *або* 1) мая крытыка Лыча нятрапная, *або* 2) сп. Хадыка (да якога і адносіцца тая заўвага наконт несумяшчальнасці *разнастайнасці* і *нацыяналізму*) меў іншае разуменне нацыяналізму, чымся гэта вынікае з майго выказвання. Што тычыць другога пункта, то дапускаю, што ён *можа* быць дыскусійным: ці мая інтэрпрэтацыя поглядаў Хадыкі была адэкватнай? Але сп. Шырокі не ўзяўся за праверку маёй інтэрпрэтацыі. Мой закід тут такі: сп. Шырокі не захацеў мяне належным чынам скрытыкаваць!

Іншыя месцы, дзе, паводле сп. Шырокага, «адсутнічае аргументацыя» – гэта мой тэзіс (запазычаны ад аналітычнага філосафа Валенскага), што «мы не можам пазбегнуць плюралізму» (у філасофіі), а таксама мае крытычныя ўстаўкі наконт гістарыцызму. Калі на тое справа пайшла, то заўважма, што тут недастаткова чыста сінтаксічных заўваг, мой крытык павінен узяць пад увагу семантыку згаданых паняткаў. Ці сп. Шырокі лічыць, што мы *можам* пазбегнуць плюралізму ў філасофіі? А калі так, то якая філасофія павінна быць прызнана адзіна правільнай і справядлівай? Ці сп. Шырокі лічыць, што існаванне гістарычнага закону ёсць бясспрэчным фактам і што ёсць магчымасць адкрыць і сфармуляваць гэты закон? А калі

так, то чый гістарыцызм будзем вызнаваць – платонаўскі, гегельянскі, Марксаў, Кірвелеў? (Нагадаю, што ў сваім тэксце я выразна адзначаў, што крытыкую адно толькі прэтэнзіі гістарыцызму да *беспамылковасці*, адначасна падкрэсліваючы *эўрыстычнае* значэнне такога пункту гледжання.)

Дзмітры Шырокі не толькі выкрыў «метадалагічную блытаніну» ў маім артыкуле, а вырашыў яшчэ пасварыць мяне з Поперам, кажучы, напрыклад, што я прапаную прыняць «факт» грэшнасці людзей на базе індукцыі, а гэтая прапанова суседзіць з «рэверансамі ў бок Попера, вядомага нязломнага змагара з прыгнётам індукцыі». «З прыгнётам індукцыі» сп. Шырокі так радыкальна паставіў справу, што паўстае ўражанне, што індукцыя для Попера была хіба што класавым ворагам! Гэта – тыповы прыклад сітуацыі, калі хтосьці «чуў звон, але не ведае, дзе ён». Аўстрыйскі філосаф зусім не быў «нязломным змагаром з прыгнётам індукцыі», ён крытыкаваў адно толькі *індукцыянізм*, а гэта ўжо зусім іншая справа. Коратка патлумачу, у чым справа. *Індукцыя* (фармаванне цверджанняў шляхам абагульнення) належыць да гэтак званага *кантэксту адкрыцця*. Вось жа кантэкст адкрыцця Попера амаль не цікавіў. Пытанні, тыпу: якім чынам *S* даведаўся, што *p*, не мелі вялікага значэння для Поперавай метадалогіі. Прадметам пільнай увагі быў для аўстрыйскага філосафа гэтак званы *кантэкст абгрунтавання*: якім чынам праверыць, што *p*? І вось тут згаданы філосаф быў праціўнікам індукцыянізму (не індукцыі!), г. зн. пераканання, што *p* праўдзівае (альбо: прымальнае) тады, калі атрымана шляхам дазволенага абагульнення (погляд большасці неапазітывістаў). А калі б Попер пачуў ад мяне, што я нешта сцвярджаю на базе індукцыі, то проста б пацiснуў плячыма і сказаў бы: сцвярджай, як хочаш, абы толькі ты мог мне прадставіць умовы фальсіфікацыі твайго тэзісу. І гэта, бадай, сутнасць Поперавага «антыіндукцыянізму», які не мае нічога супольнага з быццём «змагаром з прыгнётам індукцыі».

Мае высновы «па-за пытаннем аб іх аргументаванасці і вызваленыя з-пад розных «*згаджаюся з*» (пяць разоў) і іншага друзу другаснасці» пакідаюць у сп. Шырокага «дзіўнае ўражанне». Наконт аргументаванасці была ўжо гаворка –

закіды майго крытыка маюць пераважна характар сінтаксічны і таму недастатковыя, каб іх ацаніць. Сп. Шырокі не прадставіў альтэрнатыўнага, лепшага спосабу асвятлення ўзнятай мной праблематыкі. У логіцы ёсць такі панятак, як «*энтымематычная спасылка*» – спасылка, якая прымаецца, але не называецца падчас аргументацыі. Непазбежнасць такіх спасылак, на маю думку, відавочная – было б перагібам абгрунтоўваць кожны сказ у тэксце, тым больш, што абгрунтаванне таксама складаецца са сказаў, а тыя зноў жа трэба было б абгрунтоўваць! Я прызнаю, што шэраг аргументаў у маім тэксце меў «скарочаны» характар, ну, прыкладам, сказ Кірвеля, што «чалавецтва не можа больш рухацца па пуцявінах, закладзеных у матрыцах тэхнагеннай цывілізацыі», я «сквітаваў» толькі характарыстыкамі тыпу «нефальсіфікавальны», «мае эзатэрычны характар», «няясны статус: ці то прагноз, ці то сцверджанне». А *чаму* нефальсіфікавальны, *чаму* эзатэрычны і г. д. я пакінуў без аргументацыі, лічачы, што *для патрэб артыкула* згаданая характарыстыка цалкам дастатковая, каб паказаць праблематычнасць Кірвелевага тэзісу. Ну, а калі сп. Шырокі, можа, лічыць, што згаданы тэзіс *фальсіфікавальны, адкрыты*, а статус яго – *ясны*, толькі я гэтага не заўважыў, то калі ласка, можам працягнуць дыскусію. Раскрыццё энтымематычных спасылак неабходнае толькі тады, калі хтосьці прадставіць *семантычную* праблематычнасць дадзеных аргументаў. Намёкі на «друз другаснасці» ды патрэбу «вызвалення з-пад розных «*згаджаюся з*» тут недастатковыя.

Сп. Шырокі згадвае пра такую маю выснову: «*агульначалавечае часам будзе разбураць ці перабудоўваць нашу свойскасць*». Мой крытык не можа зразумець, як гэта можна проціпастаўляць *агульначалавечае свойскаму*. Не бачу сэнсу тут разводзіцца над выясненнем гэтай дылемы, прапаную толькі сп. Шырокаму аналагічную галаваломку: як гэта можна проціпастаўляць *прыватны інтарэс агульнаму інтарэсу*? А такое супрацьпастаўленне бытуе ўжо з часоў Арыстоцеля. Калі мой крытык прывык заўсёды надаваць абсалютнае значэнне універсаліям, то, хіба, да канца свету не вырашыць гэтай загадкі.

Наконт згаданых вышэй месцаў можна, пэўне, спрачацца і выясняць магчымыя непаразуменні. Але іранічная заява наконт «светлага заўтра каталіцкай філасофіі» альбо фармулёўка: «зусім гратэскава глядзіцца ў артыкуле каталіцкага філосафа сцверджанне...» і сапраўды маюць нейкую дыскрымінацыйную падаснову. Ну, бо і што тут мае на ўвазе мой крытык, кажучы пра «каталіцкую філасофію» ці пра «каталіцкага філосафа»? Асабіста я больш схіляюся да крытычнага рацыяналізму ў філасофскіх поглядах ды да лібералізму ў грамадска-палітычных, але – заўважу – абодва гэтыя накірункі не дужа папулярныя сярод каталікоў, а ўжо напэўна не тыповыя для каталіцызму. І пры чым тут «светлае заўтра каталіцкай філасофіі»? А можа, сп. Шырокі лічыць, што этыкетка «каталіцызм» аўтаматычна здымае абавязак дыскутаваць?..

Апошняя заўвага будзе датычыць абвінавачання ў стваранні «словаў-наватвораў». Калі праз «наватворы» мы будзем разумець папросту ўвядзенне неалагізмаў і неафразеалагізмаў, то так, у мяне нямала такіх. Адзначу толькі, што неалагізмы – гэта натуральная для кожнай мовы з'ява. Мы павінны мець багаты лексікон, каб апісваць складаную рэчаіснасць. Але калі праз «наватворы» мы будзем разумець аперавanne словамі з няяснай семантыкай, то баюся, што гэтае абвінавачанне трэ будзе скіраваць перш за ўсё на адрас сп. Шырокага. Дыягностыку (якая павінна быць выражана на максімальна яснай мове!) майго артыкула сп. Шырокі фармулюе пры дапамозе «тэрмінаў»: *différance, la condition postmoderne, la condition зусім critique*. Семантычная акрэсленасць згаданых «тэрмінаў» настолькі нізкая, што нават штандаровыя постмадэрністы іх пазбягаюць!

Ну, і хто тут аперуе наватворамі? І ці сапраўды «праграма хабітуальнай дыскрымінацыі» – пусты фразеалагізм?

12.01.2005, Кракаў

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (36) - 2005

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

палеміка [image]2005

палеміка аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Даніла Жукоўскі Аднарог і кола

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ

крытык новай хвалі.

Творы Сяргея Балахонава, згаданыя ў публікацыі:

Аднарогі Беларусі // Наша Ніва. 2002. № 9.

Купальле // Наша Ніва. 2002. № 23.

Зямля пад крыламі Фэнікса // ARCHE. 2004. № 5.

Ёсць тэксты, нагэтулькі перасычаныя свежымі ідэямі, што колькасць інтрыгуючых думак не толькі перашкаджае іхняму належнаму развіццю, але й стварае пагрозу мастацкаму ўзроўню. Багацце патэнцыялу твора робіцца відавочным пазней, калі наступнікі збяруць багаты ўраджай з нівы, і нехта сумленны згадае, што знайшоў гэтую зямлю менавіта N. Запозненае прызнанне не выведзе ў шэраг шэдэўраў – твору назаўсёды застанецца роля прадвесніка. Навек – на парозе бліскучае эпохі.

Класічным прыкладам ёсць «Туманнасць Андрамеды» Яфрэмава, дзе што ні сказ – дыямент, які сёння, раскручаны на тысячах старонак, блішчыць у кароне кагосьці з карыфеяў

жанру, а тут схаваны пад стосам гэткіх самых неабробленых, неразвітых эмбрыёнаў. Месца хапіла адно на згадкі. Не раман, а картатэка.

Яфрэмаву ўсё ж пашанцавала: выказаныя ім ідэі знайшлі годнае ўвасабленне што ў коле прыхільнікаў ягонага таленту, што сярод тых, хто ніколі не чуў ягонага імя, але каго захаплялі тыя ж праблемы. Здараецца ж, што прывабнасць вынаходства відавочная, прыцягальнасць неадольная (як у яфрэмаўскае жалезнае зоркі), але крыштальна празрыстая і бліскучая на першы погляд, ідэя насамрэч выяўляецца слізкаю і небяспечнаю, бы шчупальцы гіганцкага асьміногa.

Прыклад ізноў жа агульнавядомы: Борхес. Прыдумкі вялікага бібліятэкара тырчаць з ягоных тэкстаў, бы тыя закладкі з мармонскае Бібліі, але пакарыстацца імі іншым разам не прасцей, чым прыдуманымі пісьменнікам-бібліяфілам магічнымі аб'ектамі. Вынік карыстання борхесаўскім інструментаром часта малапрыемны: напісаныя пад Борхеса творы пераконваюць, што бліскучая эпоха скончылася перад іхнім з'яўленнем. Паўтор не на карысць – ці не гэта, паміж іншым, ілюструюць шарады аргентынца, заснаваныя на парадоксах бясконцасці? Борхесаўскія тэксты нагадваюць картатэку мо часцей, чым нейкія іншыя, але пазнакаю ягонага пісьменніцкага майстэрства тое, як доўга чытач не заўважае, што ўсе спасылкі – выключна на самога Борхеса.

Спакуслівыя прыдумкі бібліяфіла з Буэнас-Айрэса немагчыма распрацоўваць як яфрэмаўскія, іх можна толькі рэпрадукаваць. Тым не менш у кантраляваных дозах рэцэпты з-пад знака алефа дапамагаюць, асабліва калі іх дапоўніць нечым іншым. Напрыклад, самаіроніяй. «Аднарогі Беларусі» і «Купальле» Сяргея Балахонава чытаюцца з задавальненнем. Хай сабе смех па-борхесаўску крыху роблены і сухавата-інтэлектуальны – але ўсё адно жывейшы за скамянела-сур'ёзнае самазахапленне «традыцыйнае беларускае прозы». Агульнае правіла пацвярджаецца: пакуль аўтар устрымліваецца ад шчырага самазамілавання і не абвяшчае *ўсе* свае словы геніяльнымі, ягоныя прыдумкі захоўваюць дасціпнасць. «Тэма папараць-кветкі доўгі час была зачыненая для дасьледзінаў». Чаму б не

ўсміхнуцца, пакуль побач пасмейваецца сам аўтар? Урэшце, што толькі не было зачыненым у савецкі час.

Для паўнавартаснага літаратурнага існавання гэткія канструкцыі абавязкова патрабуюць апорнае думкі-сімбіёнта. Для Балахонава, беларуса і гісторыка, невычэрпная і відавочная крыніца задумаў – айчынная гісторыя, беларуская мінуўшчына. Аўтар «Аднарогаў» выціснуў, здаецца, усё магчымае з (небеспадстаўна) распаўсюджанага пераканання, што гісторыя наша недаследаваная і хавае шмат невядомага. Шчодра рассыпаючы спасылкі на неіснуючыя крыніцы, ён дапаўняе іх назвамі і месцамі знаходжання, якія нагадваюць, што ўсё, у прынцыпе, магчыма, пакуль нічога не даследавана. Пакуль не знойдзены крыж святое Еўфрасінні, хто можа з упэўненасцю сказаць, што ў Беларусі не было феніксаў? Борхес у аналагічных выпадках спасылаўся на тое, што яму здавалася абсалютна недасяжным: немагчыма не тое што прачытаць, але нават праверыць, ці існуе нешта такое. Тэксты Балахонава выглядаюць правакацыйна, бо ён прыдумляе «крыніцы», недасяжнасць якіх нельга патлумачыць экзатычнасцю, а хіба толькі зачыненасцю. Мастацкі здзек з гістарычнае навукі магчымы толькі таму, што навука тая мала што можа супрацьпаставіць літаратурнай містыфікацыі і стэрэатыпам грамадскае думкі.

І літаратура таксама ёй не дапаможа. Балахонаў насяляе дзівосамі зусім недалёкія часы і ўсім знаёмыя землі – Марка Пола збялеў бы ад зайздрасці: абы-што чалавек піша, і ў Кітай не трэба ездзіць! Свавольствы гомельскага літаратара вызначаюцца адчайнай зухаватасцю, бо землі гэтыя культурна незаселеныя. Яны нічые, цэлыя стагоддзі! Там збудавала замак Іпатава, там Арлоў змураваў падворак, там Дайнэка дом і бровар паставіў, а паміж імі – аблог. І літаратар з Гомеля раскідвае сцяжкі з надпісам «я тут быў, гэта маё», як колісь самалёты над Антарктыдаю. Месца многа, але загаспадараваць яго па-сапраўднаму не выйдзе. Выходзіць сатыра на Адраджэнне – адраджаем, адраджаем, а феніксаў з аднарогамі дасюль не вывелі. Гэтак цывілізацыі, прынамсі, еўрапейскае, не збудуеш.

І ўсё б нічога, калі б не тое, што гэтае голае незаселенае месца насамрэч – не палі і сенажаці, а чытацкія галовы, і балахонаўскія сцяжкі сталі трапляць адзін на аднаго. «Тут быў аднарог» – выдатна. «Тут прайшоў Мішэль дэ Востраграм з ахапкаю Папараць-Кветак» – цудоўна. «Тут праляцеў фенікс» – хай сабе, але неяк задумваешся: а што ж далей? Што яшчэ будзе ўжыта, каб нагнаць сорам на беларускіх гісторыкаў? І ці не выкліча гэты раздражняльны сродак неадэкватнае рэакцыі ў чытача? Гледзячы па тэкстах, варта чакаць базылішкаў і НЛА, трытонаў і палтэргейст, Гаруду, русалак, іфрытаў і йеці. Самалёт Балахонава (ці ўсе ж фенікс?) наразае кола за колам у беларускім небе, але нічога, акрамя вышэйпамянутых сцяжкоў з пазнакамі, у ягоным чэраве няма. Большага з Борхесавага трафарэту, з замкнёнага кола спасылак, не выціснуць. Трэба або пашукаць іншы трафарэт, або абраць новыя арыенціры – па-за колам бібліятэчных зданяў.

Беларуская гісторыя, хочацца спадзявацца, здатная прапанаваць больш, чым можа змясціцца ў абраным фармаце. Пра гэта сведчаць, хай сабе нешматлікія, гістарычныя творы нашых сучаснікаў. Куды б ні кіраваўся Сяргей Балахонаў: ці бліжэй гістарычнае прозы, ці далей у борхесаўскія нетры, час, падаецца, весці самалёт на пасадку. Бо або паліва пракісне, або пасля пасадкі тубыльцы (то бо чытачы) задзяўбуць сцяжкамі – ім бы хацелася чаго смачнейшага, чым дайджэст (неіснуючых) картак з каталога рукапісаў Тамбоўскае абласное бібліятэкі.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

ЦІ МУСЯЦЬ У БЕЛАРУСІ ЗАСТАЦЦА ДЗЬВЕ ДЗЯРЖАЎНЫЯ МОВЫ?

Аляксандру Фядуту
Іспыт на веданьне дзьвюх дзяржаўных моваў для чыноўнікаў і кандыдатаў на кіраўнічыя пасады ў дзяржаўных структурах не зьяўляецца дастатковым, бо веды маюць уласьцівасьць забывацца, калі яны не падтрымліваюцца і не ўдасканальваюцца практыкай. А практыку ў нашых умовах можа забясьпечыць хіба што справаводства ў дзяржаўных установах. Такім чынам, на пачатковым этапе дзяржаўнаю моваю справаводства інстытуцыяў улады мусіць быць адна беларуская.

Што тычыцца моўнага камунізму, то бок поўнай роўнасьці моваў, дык усялякія ўтопіі могуць рэалізоўвацца, бадай, на паперы, але не ў жыцьці.

Аляксандру Саснову
Нацыянальнае самавызначэньне – гэта вызначэньне сваёй этнічнай прыналежнасьці, на якое ўплывае дзяржава. Грамадзянства ж вызначае дзяржаўную прыналежнасьць.

Першае – суб’ектыўна, другое – аб’ектыўна. Насамрэч адбываецца падмена адсутнасьці нацыянальнага самавызначэньня грамадзянствам, а мова ёсьць адным з чыньнікаў нацыянальнага самавызначэньня. «Канадцы ў Квэбэку ня робяцца французамі толькі таму, што гавораць па-французску», але яны не жадаюць быць канадцамі таму, што не гавораць па-ангельску. Аб’ектыўна канадзкай ці квэбэцкай нацыянальнасьці няма, як няма канадзкай ці квэбэцкай моваў. Існуе, хіба, адсутнасьць нацыянальнага самавызначэньня і моўны падзел прасторы.

Леаніду Злотнікаву
«Правы грамадзяніна вышэйшыя за інтарэсы дзяржавы або нацыі». Бздура!

Грамадзянін – адзінка супольнасьці, і яго інтарэсы могуць быць роўныя альбо ніжэйшыя за інтарэсы супольнасьці, інакш ён будзе ізгоем. Права як прадукт супольнасьці, нацыі, дзяржавы замацоўвае такі парадак. Адзінае, што застаецца грамадзяніну, гэта пераконваць у сваёй рацыі іншых, то бок займацца палітыкай. Думаю, спадару Злотнікаву трэба разабрацца зь лібэральна-дзмакратычным сьветапоглядам.

Леаніду Заіку
Калі вы супраць выцясьненьня адной лінгвістычнай сыстэмы празь іншую, тады вы супраць рэчаіснасьці. А моцныя і ўплывовыя краіны (паводле вашага меркаваньня) за нас вырашаць, якія мовы ім выцясьняць і якія народы асымільваць. Толькі вось навошта нам дзяржава?

Віктару Марціновічу

Дзяржаўная мова – гэта ў першую чаргу мова справаводства і афіцыйных мерапрыемстваў. А мова камунікацыяў (міжнацыянальных зносінаў) выбіраецца адвольна і не патрабуе афіцыйнага абвяшчэньня.

ПАВОДЛЕ ЯКОГА ПРЫНЦЫПУ МУСІЦЬ ВЫЗНАЧАЦЦА МОВА НАВУЧАНЬНЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ СЫСТЭМЕ АДУКАЦЫІ?

Сьвятлане Алексіевіч
Родная мова як родная маці, ува ўлоньні якой фармуецца дзіця. І гэтае разуменьне роднасьці дэ-факта немагчыма зьмяніць. Дэ-юрэ вашая маці можа памяняцца, але яна ўжо ня будзе роднай. Спроба заплюшчыць вочы на факт – гэта элемэнт самазаспакаеньня, але не вырашэньня праблемы самазахаваньня. Пра самазахаваньне беларускасьці «ў гэтым сьвеце глябалізацыі» можна будзе казаць тады, калі роднае ці дэ-факта няроднае для большасьці беларусаў беларускае будзе ўзгадоўваць нашых дзяцей.

Сяргею Панькоўскаму
Як павінна расьці колькасьць беларускіх школаў, вырашае попыт на белмоўную адукацыю.

Юр'ю Дракахрусту
Базавым прынцыпам, які вызначае прапорцыю паміж беларускамоўнымі і расейскамоўнымі школамі, ёсьць попыт.

Сямёну Букчыну
Ніхто ня дзеліць усіх на «тытульную нацыю», нацыянальныя меншасьці, віртуальныя супольнасьці, але адно адлюстроўвае гэты падзел у рэчаіснасьці.

ЦІ ВЫШЭЙШАЯ РАСЕЙСКАЯ КУЛЬТУРА ЗА БЕЛАРУСКУЮ?

Сьвятлане Алексіевіч
«І кітайскага, і японскага інтэлектуала зьдзівіла б пытаньне: ці вышэйшая кітайская культура?» А беларускі інтэлектуал без эмоцыяў запытаў бы: «Дайце крытэр вышэйшасьці культуры».

Скажонае разуменьне, недакладная ацэнка «вядзе нас да крызісу сьветапогляду».

Сяргею Панькоўскаму
«Свой дом ёсьць свой дом». Што з таго, што сёньня іншы лепшы ці горшы, вышэйшы ці ніжэйшы?

Галоўнае – свой дом рабіць утульным для сябе. Мяняемся мы, мяняюцца нашыя магчымасьці, і мяняецца наш дом.

Аляксандру Саснову
Гістарычна так адбывалася, што расейская культура пераводзіла ў сваё рэчышча напрацоўкі «культураў усіх народаў, што складалі імпэрыю», зьбядняючы іх ды асымілюючы.

Леаніду Злотнікаву
Мусіць, я невук, бо ня ведаю, якая «навука ўжо адказала: няма народаў вышэйшых ці ніжэйшых». Але як у такім разе яны разьвіваюцца? Можа, па розных законах? Навука ў сваіх доказах мае абапірацца на фундамэнтальныя законы, а не на здольнасьці ці няздольнасьці «зводзіць у адзін паказьнік каштоўнасьці народаў». Ніжэйшасьць і вышэйшасьць вынікае з рознай дынамікі разьвіцьця, што выяўляецца ў колькасных і якасных характарыстыках. Сьцьвярджаць, што «проста ёсьць розныя культуры», тое самае, што казаць, быццам няма людзей дурных і разумных, проста ўсе людзі розныя. Але вельмі часта ўсе робяць каму-кольвечы такія ацэнкі, можа, нават не зусім аб'ектыўныя, адно вось Гітлера пры гэтым ня згадваюць. Што тычыцца ўзроўню культуры народу, дык навука адмаўляецца рабіць такога кшталту ацэнкі, бо яны нікому не патрэбныя. Ня важна, што ты дурнейшы ці разумнейшы за кагосьці, важна, каб ты разьвіваўся, а разьвіцьцё адным інтэлектам не абмяжоўваецца. Тое самае тычыцца і культуры.

Леаніду Заіку
Не з адказаў на гэтыя пытаньні вынікаюць канцэнтрацыйныя лягеры і гета, а з палітыкі, якая шукае грунт для авантурных плянаў. Тады адны палітыкі выбіраюць ніжэйшасьць і вышэйшасьць, а іншыя – правейшасьць і лявейшасьць ды гэтак

далей, але сутнасьць адна і дасьледуе яе псыхалёгія.

Віктару Марціновічу
Відавочна, адна культура ня можа быць вышэйшай за іншую, бо яна не вымяраецца мэтрамі і кілямэтрамі, як вышыня. Але культуры можна такім чынам параўноўваць, калі разглядаць узроўні іх разьвіцьця. А вышэйшасьць – рэч умоўная і адносная. Ужо здаўна ўсе атаясамліваюць прагрэс з рухам угору. Застаецца адно высьветліць: што лічыць прагрэсам культуры? Калі колькасьць літаратурных, музычных, мастацкіх і гэтак далей традыцыяў павялічваецца, якасьць іх прадуктаў паляпшаецца, можна казаць пра прагрэс. Калі попыт на творы культуры расьце колькасна і якасна – гэта таксама прагрэс, то бок умоўны рух угору, які ня ёсьць аднолькавым для нацыянальных культураў, адкуль і вынікае ўмоўная вышэйшасьць ці ніжэйшасьць. Проста слова «ўмоўная» неяк не прынята ўжываць як само сабой зразумелае.

Пятру Марцаву
Культура можа быць лепшай і горшай, паводле вашага меркаваньня, калі лепшае разумець як шырэйшае і ярчэйшае. Такім чынам, усё залежыць ад таго, што вы маеце на ўвазе, ужываючы тыя ці іншыя словы.

ЦІ ВІТАЕЦЕ ВЫ АБМЕЖАВАНЬНЕ Ў ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ РАСЕЙСКАГА ЎПЛЫВУ?

Сьвятлане Алексіевіч
Сьвет ня будзе зьвяртаць увагу на нас, пакуль мы ня зьвернем яе на саміх сябе. І адным з крокаў тут ёсьць абмежаваньне (не ізаляцыя) у сваёй інфармацыйнай прасторы чужых уплываў. Сорамна карыстацца чужымі вокнамі, няўжо сваё ня здольныя зрабіць. Вы ж самі лічыце, што мы не ніжэйшыя за іншых.

Аляксандру Фядуту
Ня варта рабіць высновы выключна паводле ўкраінскіх

тэлеканалаў, ёсьць жа шмат іншых невялікіх краінаў у сьвеце. А што паказваць? Дык хай займаюцца гэтым на ТБ. Датычна якасьці можна не хвалявацца: колькасьць абавязкова пяройдзе ў якасьць. Адно трэба разьвіваць сваю культуру, рэфлексіі, а з чужымі можна проста пазнаёміцца – нас ніхто не ізалюе. Што праўда, некаторыя не жадаюць проста знаёміцца, ім карціць заміж свайго ўзгадоўваць тут чужое. Менавіта так ім бачыцца нашае разьвіцьцё і пераход у іншую якасьць. У гісторыі беларускага народу такое ўжо было як мінімум двойчы, і вынікі навідавоку – мы дагэтуль тутэйшыя.

Юр'ю Дракахрусту
Ува ўмовах плюралізму дзяржаўная ахова ад замежных канкурэнтаў не касуе ўнутранай канкурэнцыі. Таму разьвіцьцё будзе (пры ўмове плюралізму).

Станіславу Багданкевічу
У інфармацыйнай прасторы сутыкаюцца інтарэсы, якія маюць месца ў жыцьці. Наша адкрытасьць для распаўсюджваньня інфармацыі з боку Расеі можа прывесьці да такой сытуацыі, калі ў нас сваіх інтарэсаў ня будзе.

Леаніду Злотнікаву
Абмежаваньне ў інфармацыйнай прасторы расейскага ўплыву – гэта яшчэ не таталітарызм. Безумоўна, трэба глядзець на цывілізаваныя краіны, але ўлічваць свае рэаліі. Напрыклад, у Нарвэгіі, Швэцыі, Даніі, Чэхіі сфармаваныя нацыі, а мы яшчэ на пачатку шляху.

Леаніду Заіку
Асновай свабоднага разьвіцьця грамадзтва ёсьць выбар, які фармальна ці нефармальна прадугледжвае правы чалавека. Але з чаго выбіраць – вызначае аб'ектыўная рэальнасьць. Рэчаіснасьць у грамадзкай сфэры залежыць ад стану супольнасьці і канцэпцыі яе разьвіцьця. Такім чынам, любая свабода, у тым ліку і распаўсюджваньня інфармацыі, заўжды абмежаваная.

Калі вы спасылаецеся на прыклад ЗША, дык давайце параўнаем нашыя супольнасьці і канцэпцыі разьвіцьця. Гэта па-першае, а па-другое: ці лічылі вы, колькі з тых 90 каналаў ТБ трансьлююцца зь іншых краінаў і зь якіх?

Сямёну Букчыну
Сыпаць незьвязанымі словамі ды вобразамі, выбухаць эмоцыямі можа любы. Інтэлектуалам трэба даводзіць сваю думку інакш.

Пятру Марцаву
Простае перакрыцьцё *часткі* расейскіх СМІ дае магчымасьць хуткага абмежаваньня расейскага інфармацыйнага ўплыву. На жаль, расьцягваць гэты працэс, разьвіваючы свае СМІ, не дазваляе рэчаіснасьць. Ня ўсё добра тое, што папулярна і якасна. Упадабаньні грамадзтва могуць яго і зруйнаваць, калі яно не дасьледуе магчымыя наступствы, пагатоў у такой галіне, як СМІ.

ЦІ БУДЗЕ БЕЛАРУСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ З ЭЎРАЗЬВЯЗАМ АЗНАЧАЦЬ АДНАЧАСОВА «ПРЭЧ АД РАСЕІ?»

Леаніду Злотнікаву
У людзкім сьвеце ёсьць усяго адзін стрыжань – інтарэсы. Менавіта яны вызначаюць разьвіцьцё супольнасьцяў, цывілізацыяў і вызначаюць іх межы ў прасторы-часе. Перадусім іх ствараюць і руйнуюць эканамічныя інтарэсы. А нагоду для гэтага можна прыстасаваць любую – аж да таго, што мы ўсе ад Адама.

Погляды насельніцтва, на якія любяць спасылацца палітыкі, могуць быць вынікам непісьменнасьці, прапаганды і гістарычных фальсыфікацыяў. Наўрад ці хто з сацыёлягаў запытаў тыя 42,6% насельніцтва Беларусі, якія лічаць беларусаў за адну з галінаў «трыадзінай рускай нацыі»: што такое нацыя і «трыадзіная руская нацыя»? А як бы вы адказалі, пан Злотнікаў?

Леаніду Заіку
«Ніякіх візаў ні для кога, ніякіх мытных тарыфаў, ніякіх абмежаваньняў што да продажу ўласнасьці і зямлі замежнікам». Усё гэта можна рабіць, калі рабіць так, каб адпавядала нацыянальным інтарэсам. Адно застаецца высьветліць мэтадалёгію вызначэньня адпаведнасьці нацыянальным інтарэсам ды акрэсьліць самі нацыянальныя інтарэсы.

Віктару Марціновічу
Той адзіны спосаб уваходжаньня Беларусі ў ЭЗ паводле вашай схемы «прэч ад Расеі» зможа рэалізавацца толькі тады, калі яго захоча сама Расея. Чарвячок прынадны для рыбкі, адно гачак адпалохвае.

ЯКІМ, НА ВАШУЮ ДУМКУ, БУДЗЕ РЭАЛЬНЫ БАЛЯНС МОВАЎ У БЕЛАРУСІ Ў АГЛЯДНАЙ БУДУЧЫНІ?

Леаніду Заіку
Выбар мовы вызначае рэчаіснасьць. А рэчаіснасьць не абмяжоўваецца Інтэрнэтам ці інфармацыйнай прасторай.

У моўных пытаньнях, як, дарэчы, і ў іншых, трэба кіравацца самазахаваньнем, бо гэта ўнівэрсальна. Мы ўсе некалі фізычна памром, але імкнёмся захоўваць сябе ў залежнасьці ад індывідуальных здольнасьцяў. І калі ўжо «рухацца з арыентацыяй на сытуацыю 2090–2100 гадоў», як прапануеце вы, дык адно з адчуваньнем і плянамі сваёй непарушнай нацыянальнай прысутнасьці ў прасторы-часе. А іншыя хай самі за сябе вырашаюць. Можа, тады яны стануць беларусамі?

Што да вашага крытэру «прасунутасьці» краіны паводле колькасьці моваў. «Прасунутасьць» заўжды вызначаецца інтэлектуальным узроўнем кіроўных элітаў. Так што выбірайце інтэлект.

Сямёну Букчыну

«Няўжо трэба тлумачыць, што *перадусім* трэба *паспрабаваць* стварыць больш-менш *нармальнае жыццё* ў Беларусі, з *нармальнай павагай* да чалавека?» Ясна, што нічога ня ясна. Жыццё супольнасьці ўтрымлівае ў сабе ўсё, што тычыцца яе, у тым ліку павагу да чалавека і мову. Таму, калі вядзецца аб цэлым, трэба разглядаць усё паасобку, бо інакш мы не акрэсьлімся з жыццём, а пагатоў яшчэ і «нармальным». Ну а раптам бракуе інтэлекту, дык можна «перадусім паспрабаваць», патыліцу чухаць будзем потым.

Ігар Хаменка, Менск
gaspadar@gaspadar.com
[image]
[image]

№ 2 (36) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

як нацыяналісты, я ахвотна чытаю друк выключна ў беларускай мове. Жадаючы дадаць да свайго небагатага чытацкага рэпэртуару часопіс «ARCHE», я папрасіў свайго добрага знаёмага даць мне пару апошніх нумароў, каб пачытаць «крамольныя» артыкулы і, калі арыентацыя часопісу мне спадабаецца, падпісацца на яго.

Я атрымаў №№ 4 і 5. Якім жа было маё расчараваньне, калі я, старанна чытаючы артыкулы ў першай палове часопісу, прызнаўся сабе, што мала што разумею з прачытанага.

Я спрабаваў чытаць урыўкамі. Не памагло.

Тады я падзяліўся сумненьнямі з калегам – шчырым нацыяналістым – прыкладна гэткай жа адукацыі і гэткага ж сацыяльнага статусу, як і я – наконт сваёй здольнасьці разумець «дыскурс» часопісу. Той бяз комплексаў прызнаўся, што неяк купіўшы часопіс, паспрабаваў яго чытаць, але сутыкнуўшыся з праблемай разуменьня, адмовіўся. «Нашто я буду ламаць сабе галаву расшыфроўкаю?» – былі ягоныя словы.

І сапраўды, выпадкова разгарнуўшы с. 38, чытач у першым жа абзацы нападзе на «пазыцыянаваньне сябе», «эскаляцыю», «радыкалізм», «палітычную рэпрэзэнтацыю», «небясьпеку дэзынтэграцыі», «дэмапалітыка» (дэмагагічнага?

дэмакратычнага? дэманічнага?), «моўную дыфэрэнцыяцыю», «моўную канвэргенцыю», «практычны білінгвізм», «каляніяльную сацыялізацыю».

Дзякаваць Богу, няма «максымальнай апраксымацыі», «экспліцытнай пазыцыі», «адэкватнага вакабулярыю».

Словам, «дыскурс» ды «інстытуцыялізацыя» – ня ўпэўнены, што правільна напісаў гэтае слова – застаюцца незразумелымі.

І гаспадар №№ 4 і 5 часопісу таксама прызнаўся, што разумее далёка ня ўсё, патлумачыўшы, што хлопцы-аўтары маюць філязофскую адукацыю. І што часопіс для інтэлектуалаў. Як да мяне, то мая філязофская адукацыя завяршылася навуковым камунізмам разьліву ажно 1973 году; тым ня менш, я ня меў праблемаў з разуменьнем навуковых тэкстаў, бо цалкам разумеў артыкулы з «Scientific American» у ангельскай мове і з «Природы» ў расейскай мове.

Аказваецца, рэдактары згаданых выданьняў вызнавалі правіла не друкаваць незразумелыя ці цяжкія для ўспрыманьня матэрыялы. Добра было б і «ARCHE» спавядаць тое правіла.

То мо праўда часопіс «ARCHE» для элітарнай эліты, так бы мовіць fior di fiore?

Але чаму тады такая грувасткая канструкцыя 4-га абзацу с. 45? Каб зразумець гэтую «беларускую» фразу, трэба сама меней прачытаць яе двойчы і міжволі прааналізаваць.

«Пакуль расейскамоўныя інтэлектуалы будуць бачыць у разьвітаньні з каляніяльнай культурнай спадчынай, якая перашкаджае эўрапеізацыі і дэмакратызацыі грамадзтва і блякуе мадэрнізацыю нацыянальнай культуры, паразу, пра такую канвэнцыю няма чаго і гаварыць». «Канвэнцыя»! Простае дапаўненьне пастаўлена богвед дзе і ўскладняе разуменьне фразы.

Часам трэба дысцыплінаваць музу аўтаматычнага пісаньня.

Выклікае пратэст і расейская канструкцыя дзеясловаў. Ніколі

ня пішуць «вінаваціць», а толькі «абвінаваціць», не напішуць «знайсьці», а «адшукаць».

Э-э-э-э, братка. Здаецца, што тыя, хто вырасьлі на нізкабальнай глебе тутэйшай нашай нівы шчэ ня ў стане адолець пачаткаў «ARCHE». Калі ж тая «агромністая грамада» датупае да кайназою?

Мікалай Бусел

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E Пачатак № 2 (36) - 2005

[image]

[image]

[image]

[image]2005
аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

Ліст да спадара Сямёна Букчына

Здаўна я прыглядаўся да Вашай публіцыстыкі. Вельмі прыемна было знайсьці Вашу думку ў «Свабодзе» і «Нашай Ніве». Калі мне трапіў у рукі «ARCHE» № 5 (34), я прагна вышукаваў Ваша прозьвішча ў адказах на анкету. Але, на жаль, пасьля пары адказаў Вы зьбіліся на прыкрую лаянку. Вас абурае, што гэтыя, здавалася б, інтэлігентныя нацыяналісты не разумеюць элемэнтарнай схемы: сьпярша трэба «стварыць нармальнае жыцьцё, у якім годнае месца – не экзатычнае, а нармальнае – зойме нацыянальная мова». Складваецца ўражаньне, нібы Вы паднялі народ на стварэньне «нармальнага жыцьця». А тут уварваліся нацыяналісты са сваім «Законам аб мовах» і такім чынам «прайгралі краіну, будучыню». Я ня бачу залежнасьці між нармальным жыцьцём і разумным стаўленьнем да мовы. Гэта як у показцы. Прапаршчык зьвяртаецца да інтэлігентаў: «Если вы такие умные, почему же строем не ходите?» Бізнэсовец пераклаў гэту показку на свой капыл: «Калі вы такія разумныя, дык чаму такія бедныя?» Хрысьціянін сказаў бы: «Калі ты такі разумны, напісаў цэлую дысэртацыю па Бібліі, чаму ж у Бога ня верыш?» Ну а мне, апантанаму нацыяналісту, карціць спытацца так: «Шаноўны спадар Сямён! Калі Вы такі разумны, дык чаму да гэтай пары не перайшлі цалкам на беларускую мову?»

У разумным, годным, сытным жыцьці Амэрыкі ацалелыя мовы

індыянаў займаюць «натуральнае» (прыроднае) месца рэзэрвацыі. Дарэчы, хачу яшчэ спыніцца на слове «натуральнае», якое Вы ўжываеце. Яно занадта шматсэнсавае, каб ім штосьці тлумачыць. Напрыклад, я яго прачытваю як «пануючае», «нармалёвае» месца для беларускай мовы. Але ж вы ўкладалі ў гэтае слова свой сэнс – натуральны выбар чалавека размаўляць без прымусу на той мове, на якой лічыць патрэбным. Але азірніцеся навокал – выбар зроблены, наша мова ўжо сёньня займае «натуральнае» месца. І дзеля гэтай мэты адпадае патрэба стварыць «годнае, чалавечае жыцьцё». Я ўжо цяпер – у гэтай нягоднай краіне – размаўляю толькі па-беларуску. А Вы ня будзеце так размаўляць нават забіўшы апошні цьвік у будаўніцтве раю на Беларусі. Ці ня так?

Ліст да спадара Данілы Жукоўскага

Мне блізкая Ваша пазыцыя ў дыскусіі зь Юр'ем Дракахрустам («ARCHE» № 5). Бо я – нацыяналіст. Але Вы пацьвердзілі словы свайго апанэнта, што «беларускі нацыяналізм гаворыць па-расейску».

Калісьці на пачатку 80-х мінулага стагодзьдзя ў нас на «Майстроўні» таксама былі дыскусіі – на якой мове размаўляць. Вінцук Вячорка прапанаваў быў такую сытуацыю, калі можна і нават трэба перайсьці на расейскую мову. Ты ляжыш на рэйках, на цябе нясецца цягнік. Адзінае, што яго можа спыніць – гэта расейская мова з тваіх вуснаў. Дык не марудзь, хутчэй прамаўляй ды заставайся жывым! З тых пор ужо 20 гадоў я пераконваюся ў Вінцуковай рацыі – сапраўды, такіх сытуацыяў у жыцьці не бывае. За гэты час я бачыў розныя адносіны да мовы: і спагадныя, і пару разоў варожыя. Але ніколі (за выключэньнем службы ў савецкім войску) не было патрэбы пераходзіць на расейскую мову. Ніколі.

Мяне зьдзіўляе пазыцыя маладога пакаленьня. Пакаленьня, якое ў шушкевіцкую адлігу навучалася ў школе, выдатна авалодала беларускай мовай і не гаворыць ёю. Адзін юнак у пэўным сэнсе адказаў на гэтае пытаньне. Было гэта, калі мы рыхтавалі чарговы пленэр «Lehiendy ź piasku». Я сабраў быў

хлопцаў і тлумачыў ім найсьвяцейшую мэту, што трэба абараняць родную мову. Міма праходзіла прыгожая дзяўчына. Адзін з маіх хлопцаў адхіліўся ад нас і пайшоў да яе знаёмцца, прычым па-расейску, як я пачуў здалёк.

– Чаму па-расейску? – пытаюся.

– Ну як чаму? – кажа, хаваючы вочы. – А раптам яна не захацела б са мной, беларусам, знаёміцца і...

– І абарваўся б твой род ня зямлі. Што ж, гэта высокая прычына, каб пакінуць мову нашу беларускую.

Спадар Даніла! Вы таксама размаўляеце на роднай мове ў мінімальным аб'ёме. Можа, Вам ня цяжка было б распавесьці мне пару тыповых выпадкаў з Вашага асабістага жыцьця (з той часткі, якую можна было б назваць «максымальным аб'ёмам»), калі маўленьне па-беларуску пагражала Вашаму жыцьцю, здароўю, кашальку ці якімсьці іншым вышэйшым каштоўнасьцям, дзеля ўратаваньня якіх Вы былі вымушаныя перайсьці на расейшчыну.

Ну што, знайшлі такі выпадак, калі была патрэба і магчымасьці, каб зьнішчыць родную мову? Значыць, такі факт сьведчыць толькі пра адно – беларуская мова мае патрэбу і магчымасьць быць зьнішчанай. Навошта тады дыскусія з Дракахрустам? Напэўна, дзеля таго, каб шчыра выказаць мне спачуваньні з нагоды немінучай сьмерці маёй беларускай мовы. Бо для Вас яна ня ёсьць сьвятыняю безумоўнаю.

Прынамсі, у адным я згодны з Дракахрустам – вайна ідзе (калі хочаце, называйце гэта канкурэнцыя, асыміляцыя ці інш.). Мая Вам парада: не вылазьце на бруствэр, там і свая куля можа зачапіць, а займіце ясную баявую пазыцыю ў акопе.

Гэнік Лойка
[image]
[image]

№ 2 (36) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к № 2 (36) - 2005

[image]

[image]

[image]

[image]

[image]2005

[image] [image] [image]

Уільям Фолкнэр
Гоман і ятра
7 красавіка
1928

УІЛЬЯМ ФОЛКНЭР
амэрыканскі пісьменьнік. ляўрэат нобэлеўскай прэміі ў галіне літаратуры (1949)

Паміж месцамі, дзе кучаравіліся кветкі, я праз плот бачыў, як яны ўдараюць. Яны кіравалі, дзе быў сьцяжок, а я ішоў уздоўж плота. Ластэр шукаў у траве пад гарлачыкавым дрэвам. Яны выцягнулі сьцяжок і ўдарылі па мячыку. Потым уставілі сьцяжок назад і перайшлі на пляцоўку, адзін ударыў, а за ім другі. Потым яны пайшлі далей, а я ішоў уздоўж плота. Ластэр адышоў ад гарлачыкавага дрэва, і мы пайшлі ўздоўж плота, яны спыніліся, і мы таксама, я глядзеў праз плот, а Ластэр шукаў у траве.

— Давай, кэдзі[1] . – Ён ударыў па мячыку. Яны пайшлі прэч цераз поплаў. Я трымаўся за плот і глядзеў, як яны ідуць прэч.

— Ты зноў сваё, – сказаў Ластэр. – Нічога сабе хлопец, трыццаць тры гадочкі, а ўсё роўна што малы. А я ў горад колькі дарогі схадзіў па торт для цябе. Перастань мне румзаць. Лепш дапамог бы знайсьці той чацьвяртак, а то не схадзіць мне вечарам у цырк.

Яны ўдаралі, малыя, па другі бок поплаву. Я вярнуўся ўздоўж плота туды, дзе сьцяжок. Ён лапатаў насупроць яснай травы і дрэваў.

— Хадзі, – сказаў Ластэр. – Тут мы ўжо шукалі. Яны ўжо сюды ня прыйдуць. Хадзем долу, пашукаць той чацьвяртак каля ручайка, пакуль які чорны не знайшоў.

Сьцяжок быў чырвоны і лапатаў насупроць поплаву. Потым прыляцела птушка, села на ім наўскось. Ластэр шпурнуў. Сьцяжок лапатаў насупроць яснай травы і дрэваў. Я трымаўся за плот.

— Перастань румзаць, – сказаў Ластэр. – Я не магу іх прымусіць вярнуцца, раз яны пайшлі. Калі не заціхнеш, дык няня не наладзіць табе дня нараджэньня. Калі не заціхнеш, дык ведаеш, што я табе зраблю. Зьем увесь той торт. І сьвечкі. Усе трыццаць тры сьвечкі зьем. Хадзем, пойдзем над ручаёк. Мне трэба знайсьці мой чацьвяртак. Можа, знойдзем які зь іхных мячыкаў. Там. Там яны. Вунь там, далёка. Бачыш. – Ён падышоў да плота і паказаў рукою. – Бачыш. Яны ўжо ня вернуцца. Хадзем.

Мы пайшлі ўздоўж плота і дайшлі да садка. На садковым плоце былі нашы цені. Мой быў на плоце вышэйшы, чымсьці Ластэраў. Мы дайшлі да месца, дзе была дзіра ў плоце, і пралезьлі.

— Пачакай хвілінку, – сказаў Ластэр. – Ты зноў зачапіўся за той цьвік. Ніколі ня можаш пралезьці, каб не зачапіцца за яго.

Кэдзі[2] адчапіла мяне і мы пралезьлі. «Дзядзька Моры сказаў, што нас ніхто не павінен убачыць, дык давай лепш пахіліся, – сказала Кэдзі. – Пахіліся, Бэнджы. Вось так, бачыш» Мы пахіліліся і прайшлі садок, дзе аб нас шаргацелі й шапацелі кветкі. Зямля была цьвёрдая. Мы пралезьлі цераз плот, пахіліліся і пасопвалі сьвіньні. «Яны, відаць, шкадуюць, што ў якую сёньня закалолі», – сказала Кэдзі. Зямля была ўтаптаная і гарбастая.

[1] *скажу* (caddie) – хлопец, які падае гольфістам клюшкі, ходзячы з імі па полі.

[2] *Кэдзі* (Caddy) – кіпцюняя скарга Кэдзі. А іменем Кэдзі (Caddie) называюць.

«Не зьвіхні шчыкалатку, – сказала Кэдзі. – А то зьмерзьнеш (Caddie) хочаш, каб табе замерзьлі рукі на Каляды, што».

— На дварэ захаладна, – сказаў Вэрш. – Табе нельга на двор.

— Чаго яму цяпер, – сказала мама.

— Ён хоча на двор, – сказаў Вэрш.

— Пусьцеце яго, – сказаў дзядзька Моры.

— Захоладна, – сказала мама. – Няхай лепш сядзіць дома. Бэнджамін. Перастань жа.

— Нічога яму ня будзе, – сказаў дзядзька Моры.

— Паслухай, Бэнджамін, – сказала мама. – Калі будзеш нядобры, пойдзеш на кухню.

— Няня казала, каб мы яго сёньня не прыводзілі на кухню, – сказаў Вэрш. – Яна сказала, што й так не пасьпявае з гатаваньнем.

— Пусьці яго на двор, Кэралайн, – сказаў дзядзька Моры. – А то яшчэ расстроішся і захварэеш.

— Я ведаю, – сказала мама. – Гэта крыж, які спаслаў мне Бог. Часам думаецца, за што.

— Я ведаю, я ведаю, – сказаў дзядзька Моры. – Табе трэба ашчаджаць сябе. Я зраблю табе пунш.

— Ад яго мне стане яшчэ горш, – сказала мама. – Нібыта ты ня ведаеш.

— Табе ад яго палепшае, – сказаў дзядзька Моры. – Захутай яго акуратна, хлопча, і выйдзі зь ім на хвілінку на двор.

Дзядзька Моры пайшоў. Вэрш пайшоў.

— Калі ласка, сьціхні, – сказала мама. – Мы стараемся выправіць цябе на двор найхутчэй, як можам. Я не хачу, каб ты нам расхварэўся.

Вэрш надзеў мне боты і паліто, мы ўзялі маю шапку і пайшлі на двор. У сталовай дзядзька Моры ставіў у суднік бутэльку.

— Пабудзь зь ім з паўгадзінкі, хлопча, – сказаў дзядзька Моры. – Але не выпускай яго з панадворку.

— Так, сэр, – сказаў Вэрш. – Мы ніколі не дазваляем яму адбіцца ад дому.

Мы выйшлі на двор. Сонца было халоднае й зыркае.

— Ты куды ўзяў, – сказаў Вэрш. – У горад сабраўся, ці што.

Мы прайшлі па шаляскім лісьці. Весьніцы былі халодныя.

— Лепш не вымай рук з кішэняў, – сказаў Вэрш. – Прымерзнуць да жалеза і што тады зробіш. Чаму табе не пачакаць іх дома. – Ён засунуў мае рукі ў кішэні. Я чуў, як ён шалясьціць па лісьці. Я адчуваў пах холаду. Весьніцы былі халодныя.

— На табе арэхаў. Вой. Скокнула на дрэва. Паглядзі на тую вавёрку, Бэнджы.

Я зусім не адчуваў весьніцаў, толькі пах зыркага холаду.

— Схавай тыя рукі назад у кішэні.

Кэдзі ішла. Потым пачала бегчы, сумка з кніжкамі матлялася й падскоквала ззаду.

— Прывітаньне, Бэнджы, – сказала Кэдзі. Яна адчыніла весьніцы, увайшла, нахілілася. Пахла як лісьцё.

— Ты выйшаў мне на спатканьне, – сказала яна.

— Ты выйшаў Кэдзі на спатканьне? Чаму ў яго такія настылыя рукі, Вэрш?

— Я яму казаў, каб ён трымаў іх у кішэнях, – сказаў Вэрш. – Ён трымаўся за жалезныя весьніцы.

— Ты выйшаў Кэдзі на спатканьне, – сказала яна, расьціраючы мае рукі. – Што. Што ты хочаш сказаць Кэдзі. – Кэдзі пахла як дрэвы і як калі яна гаворыць, што мы ўжо паспалі.

«Чаго ж ты енчыш, – сказаў Ластэр. – Калі дойдзем да ручайка, дык зможаш зноў на іх глядзець. На. Вось табе дурнап'ян». Ён даў мне кветку. Мы прайшлі праз плот на пашу.

— Што, – сказала Кэдзі. – Што ты хочаш сказаць Кэдзі? Гэта яны выправілі яго з дому, Вэрш.

— Яго нельга было ўтрымаць дома, – сказаў Вэрш. – Ён не пераставаў, пакуль яго не пусьцілі, і прыйшоў адразу сюды, глядзець празь весьніцы.

— Ну, што? – сказала Кэдзі. – Ты думаў, я прыйду са школы і адразу будуць Каляды. Ты так думаў. А Каляды пасьлязаўтра. Са Сьвятым Мікалаем, Бэнджы. Са Сьвятым Мікалаем. Давай пабяжым дадому пагрэцца.

Яна ўзяла мяне за руку, і мы пабеглі па зыркім шалясткім лісьці. Падняліся па прыступках і зь яснага холаду ўвайшлі ў цёмны холад. Дзядзька Моры ставіў бутэльку назад у суднік. Ён паклікаў Кэдзі. Кэдзі сказала:

— Завядзі яго да печкі, Вэрш. Ідзі з Вэршам, – сказала яна. – Я праз хвілінку прыйду.

Мы пайшлі да печкі. Мама сказала:

— Ён прастыў, Вэрш.

— Дзе там, – сказаў Вэрш.

— Зьнімі зь яго паліто і боты, – сказала мама. – Колькі разоў табе казаць, каб ты не прыводзіў яго ў пакой у ботах.

— Так, – сказаў Вэрш. – Стой спакойна.

Ён зьняў мае боты і расшпіліў паліто. Кэдзі сказала:

— Пачакай, Вэрш. Ці ён ня мог бы яшчэ раз на двор, мама? Я хацела б, каб ён пайшоў са мною.

— Няхай лепш застанецца тут, – сказаў дзядзька Моры. – Ён ужо сёньня пабыў на дварэ.

— Я думаю, што вы абое павінны застацца дома, – сказала мама. – Дылсі кажа, што ідуць халады.

— Ай, мама, – сказала Кэдзі.

— Глупства, – сказаў дзядзька Моры. – Яна ўвесь дзень была ў школе. Ёй трэба падыхаць сьвежым паветрам. Бяжы, Кэндэйс.

— Пусьці яго, мама, – сказала Кэдзі. – Прашу цябе. Ты ж ведаеш, што ён будзе плакаць.

— Дык чаму ты сказала пры ім? – сказала мама. – Чаго табе было ўваходзіць сюды. Каб даць яму зачэпку зноў мяне мучыць. Табе сёньня ўжо хопіць двору. Лепш пасядзі зь ім тут і пазабаўляйся.

— Пусьці іх, Кэралайн, – сказаў дзядзька Моры. – Марозік ім не пашкодзіць. Не забывай, што табе трэба ашчаджаць сілы.

— Я ведаю, – сказала мама. – Нікому не зразумець, як я баюся Калядаў. Нікому. Я ня з тых жанчын, якія стрываюць усё. Як мне хацелася б быць дужэйшай, дзеля Джэйсана і дзяцей.

— Ты павінна рабіць усё магчымае, каб яны цябе не расстройвалі, – сказаў дзядзька Моры. – Бяжыце, абое. Але ненадоўга, бо мама будзе хвалявацца.

— Так, сэр, – сказала Кэдзі. – Хадзі, Бэнджы. Пойдзем зноў на двор.

Яна зашпіліла маё паліто, і мы пайшлі да дзьвярэй.

— Дык ты хочаш вывесьці малога бяз ботаў? – сказала мама. – Дом поўны гасьцей, а ты хочаш, каб ён захварэў.

— Я забылася, – сказала Кэдзі. – Я думала, ён у ботах.

Мы вярнуліся.

— Табе трэба думаць, – сказала мама. *«Стой жа спакойна», – сказаў Вэрш. Ён надзеў мне боты.* – Аднойчы мяне ня стане, і табе прыйдзецца думаць за яго. – *«Цяпер тупні»*, – сказаў Вэрш.

– Хадзі пацалуй маму, Бэнджамін.

Кэдзі падвяла мяне да мамінага фатэля, мама ўзяла мой твар у свае рукі, а потым прыціснула мяне да сябе.

— Маё беднае дзіцятка, – сказала яна. Пусьціла мяне. – Вы з Вэршам добра за ім прыгляньце, любачка.

— Так, мама, – сказала Кэдзі. Мы выйшлі. Кэдзі сказала: – Можаш застацца, Вэрш. Я прайдуся зь ім адна.

— Добра, – сказаў Вэрш. – Якая мне пацеха лезьці ў такую халадэчу.

Ён пайшоў, а мы спыніліся ў калідоры, Кэдзі прысела, абняла мяне, прыціснула свой халодны ясны твар да майго. Яна пахла як дрэвы.

— А ты ня беднае дзіцятка. Хіба ня так. У цябе ёсьць твая Кэдзі. У цябе ёсьць твая Кэдзі, праўда.

«Ці ты ня можаш перастаць енчыць і саплячыцца, – сказаў Ластэр. – Як табе ня сорамна падымаць увесь гэты вэрхал». Мы мінулі вазоўню, дзе стаяла павозка. У яе было новае кола.

— Залезь туды і сядзі ціха, пакуль ня прыйдзе мама, – сказала Дылсі. Яна ўпіхнула мяне ў павозку. Т. П. трымаў лейцы. – Я зусім не разумею, чаму Джэйсан ня хоча купіць новую каляску, – сказала Дылсі. – Аднойчы гэты драндулет рассыплецца пад вамі на дробныя кавалачкі. Пагляньце толькі на колы.

Выйшла мама і апусьціла вуаль. У яе былі кветкі.

— А дзе Роскус, – сказала яна.

— Роскус сёньня рук не падыме, – сказала Дылсі. – Т. П. таксама ўмее падвезьці.

— Я баюся, – сказала мама. – Раз на тыдзень вы маглі б знайсьці мне возьніка. Бог ведае, што прашу ў вас няшмат.

— Вы ня горш за мяне ведаеце, міс Кэралайн, што Роскуса

хапіў такі раматус, што ён ня можа рабіць больш, чымсьці мусіць, – сказала Дылсі. – Хадзеце і сядайце. Т. П. завязе вас ня горш за Роскуса.

— Я баюся, – сказала мама. – З гэтым дзіцяткам.

Дылсі ступіла на ганак.

— Гэта вы яго называеце дзіцяткам? – сказала яна. Узяла маму за руку. – Ён жа такі бамбіза, як і Т. П. Давайце, калі хочаце ехаць.

— Я баюся, – сказала мама. Яны сышлі з ганка, і Дылсі дапамагла маме сесьці. – Мабыць, так будзе найлепш для ўсіх нас, – сказала мама.

— Як вам ня сорамна такое гаварыць, – сказала Дылсі. – Быццам ня ведаеце, што васямнаццацігадовага нэгра замала, каб Квіні панесла. Ёй жа будзе больш гадоў, чымся яму і Бэнджы разам. А ты не шалапутнічай з Квіні, чуеш мяне, Т. П. Калі ты ня будзеш кіраваць так, каб міс Кэралайн было даспадобы, я напушчу на цябе Роскуса. Яго скруціла яшчэ не настолькі, каб ён з табою ня ўправіўся.

— Так, – сказаў Т. П.

— Я проста ведаю, што нешта здарыцца, – сказала мама. – Перастань, Бэнджы.

— Дайце яму патрымаць кветку, – сказала Дылсі. – Вось чаго ён хоча. – Яна працягнула руку.

— Не, не, – сказала мама. – Так яны ўсе рассыплюцца.

— А вы іх прытрымайце, – сказала Дылсі. – Я выцягну яму толькі адну. – Яна дала мне кветку і забрала руку.

— Цяпер едзьце, пакуль Квэнтына ня ўбачыла і таксама не захацела ехаць, – сказала Дылсі.

— А дзе яна, – сказала мама.

— Дома, забаўляецца з Ластэрам, – сказала Дылсі. – Едзь, Т. П. Кіруй гэтай брычкай, як табе казаў Роскус.

— Так, – сказаў Т. П. – Но, Квіні.

— Квэнтына, – сказала мама. – Не дазволь ёй...

— Напэўна не, – сказала Дылсі.

Павозка трасла і хрумсьцела па жвіраваным пад'ездзе.

— Я баюся пакідаць Квэнтыну адну, – сказала мама. – Я не павінна ехаць, Т. П.

Мы выехалі за браму, дзе ўжо ня трэсла. Т. П. сьцебануў Квіні пугаю.

— Што ты робіш, Т. П., – сказала мама.

— Трэба запусьціць яе ў ход, – сказаў Т. П. – Каб не заснула, пакуль ня вернецца ў стайню.

— Завярні, – сказала мама. – Я баюся пакідаць Квэнтыну адну.

— Тут не магу завярнуць, – сказаў Т. П. Потым стала шырэй.

— А тут ужо можаш, – сказала мама.

— Добра, – сказаў Т. П. Мы пачалі заварочваць.

— Што ты робіш, Т. П., – сказала мама, хапаючы мяне.

— Я ж мушу неяк завярнуць, – сказаў Т. П. – Тпрру, Квіні. – Мы спыніліся.

— Ты нас перакуліш, – сказала мама.

— Дык чаго вы ўрэшце хочаце? – сказаў Т. П.

— Я баюся, калі ты будзеш заварочваць, – сказала мама.

— Давай, Квіні, – сказаў Т. П.

Мы паехалі далей.

— Я ведаю, што Дылсі безь мяне недагледзіць і Квэнтыне нешта станецца, – сказала мама. – Нам трэба вярнуцца як мага хутчэй.

— Но-о, – сказаў Т. П. Ён сьцебануў Квіні пугаю.

— Слухай, Т. П., – сказала мама, хапаючы мяне. Я чуў Квініны капыты, і зыркія плямы ішлі гладка й роўна з абодвух бакоў, а цені ад іх плылі па Квінінай сьпіне. Ішлі ўвесь час, як яркія вярхі колаў. Потым перасталі з таго боку, дзе была высокая белая будка з жаўнерам. Але па другі бок ішлі гладка й роўна, адно што памалей.

— Чаго ты хочаш, – сказаў Джэйсан. Ён меў рукі ў кішэнях і аловак за вухам.

— Мы едзем на могілкі, – сказала мама.

— Дык едзьце, – сказаў Джэйсан. – Я ж вас не трымаю. Нічога іншага ты не хацела, адно гэта сказаць.

— Я ведаю, што ты з намі не паедзеш, – сказала мама. – Але з табой я так не баялася б.

— Баялася чаго, – сказаў Джэйсан. – Ні бацька, ні Квэнтын табе нічога ня зробяць.

Мама сунула хустачку пад сваю вуаль.

— Перастань, мама, – сказаў Джэйсан. – Хочаш, каб гэты кляты прыдурак разроўся пасярод пляцу? Едзь, Т. П.

— Но, Квіні, – сказаў Т. П.

— Гэта крыж, які спаслаў мне Бог, – сказала мама. – Але хутка ўжо і мяне тут ня стане.

— Спыні, – сказаў Джэйсан.

— Тпру, – сказаў Т. П. Джэйсан сказаў:

— Дзядзька Моры хоча ўзяць пяцьдзясятку з твайго рахунку. Што з тым будзеш рабіць.

— Навошта ты ў мяне пытаешся, – сказала мама. – Мой голас тут ні пры чым. Я стараюся ня быць цяжарам для цябе і Дылсі. Хутка ўжо мяне ня будзе, і тады ты...

— Едзь, Т. П., – сказаў Джэйсан.

— Но, Квіні, – сказаў Т. П. Плямы паплылі зноў. Тыя па другі бок таксама, зырка, хутка і гладка, як калі Кэдзі кажа, што ідзем спаць.

«Плакса, – сказаў Ластэр. – Як табе ня сорамна». Мы пайшлі праз стадолу. Стойлы былі паадчыньваныя. «Няма ўжо ў цябе пярэстага коніка, на якім ты мог бы паезьдзіць», – сказаў Ластэр. Ток быў сухі й запылены. Дах абвальваўся. У касых дзірах віравала жоўтае. «Чаго пайшоў тудою. Хочаш, каб які мячык выцяў цябе ў лабаціну».

— Трымай рукі ў кішэнях, – сказала Кэдзі. – А то адмарозіш. А Бэнджы ня хоча адмарозіць рук на Каляды, праўда.

Мы абыходзілі стадолу. Вялікая карова і малая стаялі ў дзьвярах і было чуваць, як у сярэдзіне стадолы тупаюць Прынс, Квіні і Фрэнсі. – Калі б ня гэтая халадэча, мы праехаліся б на Фрэнсі, – сказала Кэдзі. – Але сёньня захоладна, ты ня ўтрымаўся б. Потым мы ўбачылі ручаёк, над якім снаваўся дым. – Там смаляць сьвіньню, – сказала Кэдзі. – Мы можам вярнуцца тудою і паглядзець.

Мы спусьціліся з гары.

— Ты хочаш несьці гэты ліст, – сказала Кэдзі. – Дык нясі. – Яна пераклала ліст з свае кішэні ў маю. – Гэта калядны падарунак ад дзядзькі Моры. Дзядзька Моры хоча зрабіць сюрпрыз місіс Патэрсан. Нам трэба аддаць ёй ліст так, каб ніхто ня ўбачыў. Ну, не вымай рук з кішэняў. Мы дайшлі да ручайка.

— Замерз, – сказала Кэдзі. – Глядзі. – Яна разьбіла воду зьверху і прыклала кавалачак яе да майго твару. – Лёд. Бачыш, які

халодны. – Яна перавяла мяне на другі бок, і мы пайшлі ўверх. – Нам нельга сказаць нават маме і тату. Ведаеш, што гэта, па-мойму. Я думаю, гэта сюрпрыз для мамы і таты, а таксама для містэра Патэрсана, таму што містэр Патэрсан прыслаў табе цукеркі. Помніш, як мінулым летам містэр Патэрсан прыслаў табе цукеркі.

Там быў плот. Павойныя расьліны былі сухія, у іх шаргацеў вецер.

— Толькі я не разумею, чаму дзядзька Моры не паслаў Вэрша, – сказала Кэдзі. – Вэрш не прагаварыўся б. – Місіс Патэрсан выглядвала з акна. – Пачакай тут, – сказала Кэдзі. – Пачакай у гэтым месцы, я зараз вярнуся. Дай мне ліст. – Яна выняла ліст з маёй кішэні. – Не вымай рук з кішэняў.

Зь лістом у руцэ яна пералезла цераз плот і пайшла паміж карычневымі шарготкімі кветкамі. Місіс Патэрсан пайшла да дзьвярэй, адчыніла іх і стала на парозе.

Містэр Патэрсан матычыў у зялёных кветках. Перастаў матычыць і глянуў на мяне. Місіс Патэрсан прыбегла да мяне садком. Я ўбачыў ейныя вочы і заплакаў. «Ты, ідыёт, – сказала місіс Патэрсан, – я ж яму казала, каб больш не пасылаў цябе аднаго». «Дай сюды. Хутчэй». Містэр Патэрсан прыбег з матыкай. Місіс Патэрсан нагнулася над плотам, працягваючы руку. Хацела ўзьлезьці на плот. «Дай сюды, – сказала. – Дай сюды». Містэр Патэрсан пералез цераз плот. Узяў ліст. Сукенка місіс Патэрсан зачапілася за плот. Я зноў убачыў ейныя вочы і пабег з гары.

— Тамака далей стаяць дамы, – сказаў Ластэр. – Хадзем долу да ручайка.

Над ручайком мылі бялізну. Адна зь іх сьпявала. Я чуў у носе выбіваную бялізну і дым, які плыў над ручайком.

— Пастой тут, – сказаў Ластэр. – Там наверсе табе няма чаго рабіць. Там напэўна папалі б у цябе.

— А што ён хоча рабіць?

— Ён ня ведае, што ён хоча рабіць, – сказаў Ластэр. – Ён думае, што ён хоча наверх, дзе яны б'юць у той мячык. Сядзь тут і пазабаўляйся з дурнап'янам. А калі хочаш паглядзець на нешта, дык паглядзі на хлопцаў, як купаюцца ў ручайку. Павёў бы сябе як людзі хоць разок.

Я сеў на беразе, дзе яны мылі і плыў сіні дым.

— Тут чацьвертака ніхто ня бачыў, – сказаў Ластэр.

— Якога чацьвертака?

— Такога, што я меў сёньня раніцай, – сказаў Ластэр. – Дзесьці яго згубіў. Ён выпаў праз гэтую во дзірку ў кішэні. Калі не знайду, ня будзе за што пайсьці ў цырк сёньня вечарам.

— А адкуль ты ўзяў дваццаць пяць цэнтаў, хлопец. У белага ў кішэні, калі той зазяваўся.

— Узяў, дзе давалі, – сказаў Ластэр. – І там яшчэ шмат такіх, як гэты. Але цяпер мне трэба знайсьці якраз гэты. Вы ніхто ня бачылі.

— Мне яшчэ толькі чацьвертакі выглядваць. Нібыта іншага клопату не хапае.

— Хадзі сюды, – сказаў Ластэр. – Памажы мне шукаць.

— Ды ён не пазнае, што грошы, нават калі іх будзе мець перад вачыма, хіба ня так.

— Усё роўна няхай памагае, – сказаў Ластэр. – А вы ўсе ідзяце паглядзець той цырк сёньня вечарам.

— Не ўпамінай мне пра цырк. Пакуль я ўпраўлюся з гэтай балеяй, буду так зьняможаная, што й рукі не сагну.

— Іду ў заклад, што пойдзеце, – сказаў Ластэр. – Іду ў заклад, што вы былі там учора. І што ўсе будзеце там сёньня, як толькі адчыняць тую палатку.

— Туды й безь мяне нэграў паналезе. Хадзіла ўжо ўчора.

— Чорныя плацяць такія самыя грошы, што й белыя.

— Белы плаціць чорнаму, таму што ведае, што як прыедзе першы белы з музыкай, ён дастане ўсё назад, каб чорнаму зноў трэба было ісьці і зарабляць.

— Ніхто ж цябе ня гоніць ісьці глядзець той цырк.

— Пакуль яшчэ не. Пакуль яшчэ не дадумаліся, мабыць.

— А што ты маеш супроць белых.

— Нічога супроць іх ня маю. Я іду сваёй дарогай, а белыя сваёй. Мне начхаць на іхны цырк.

— Там у іх адзін мужык грае на піле. Усё роўна як на банджа.

— Вы хадзілі ўчора, – сказаў Ластэр, – а я пайду сёньня. Калі толькі прыпомню, дзе згубіў той чацьвяртак.

— І яго, мабыць, возьмеш з сабою.

— Я, – сказаў Ластэр. – Думаеце, мне ён там патрэбны, калі развыецца.

— А што ты робіш, калі ён развыецца.

— Даю яму лупцоўку, – сказаў Ластэр. Ён сеў і падкасаў нагавіцы. У ручайку забаўляліся.

— Вы тут зацураную апуку ніхто не знайшлі, – сказаў Ластэр.

— Ты лепш не гавары брыдкіх слоў. А то пачуе твая бабуля, і ты пашкадуеш.

Ластэр улез у ручаёк, дзе гулялі. Шукаў у вадзе ўздоўж берагу.

— Калі я тут быў раніцай, дык ён яшчэ быў пры мяне, – сказаў Ластэр.

— А як жа ты яго згубіў.

— Праз гэтую во дзірку ў кішэні, – сказаў Ластэр. Яны шукалі ў

ручайку. Потым усе раптам выпрасталіся і перасталі, а потым пачалі пырскаць вадою і біцца. Урэшце ён дастаўся Ластэру, і яны прыселі ў вадзе, паглядаючы ўгору праз кусты.

— Дзе яны, – сказаў Ластэр.

— Яшчэ не відаць.

Ластэр сунуў яго ў кішэню. Тыя спусьціліся з гары.

— Сюды мячык не заляцеў.

— Ён мусіць быць у вадзе. Вы ня бачылі або ня чулі, хлопцы?

— Я ня чуў, каб тут што падала, – сказаў Ластэр. – Вунь там аб дрэва нешта стукнула. Але куды паляцела, ня ведаю.

Яны глядзелі ў ручаёк.

— Чорт. Паглядзі ўздоўж ручая. Ён упаў сюды. Я бачыў.

Яны пашукалі ўздоўж ручайка. Потым вярнуліся на гару.

— Ці ня ты ўзяў той мячык, – сказаў хлопец.

— А нашто ён мне, – сказаў Ластэр. – Я ня бачыў ніякага мячыка.

Хлопец увайшоў у ваду. Пабрыў у вадзе. Адвярнуўся і зноў паглядзеў на Ластэра. Потым пайшоў далей ручайком.

Той чалавек наверсе паклікаў: «Кэдзі!» Хлопец вылез з вады і пайшоў пад гару.

— А ты зноў сваё, – сказаў Ластэр. – Замоўкні.

— Чаго ён зноў румзае?

— А Бог яго ведае, – сказаў Ластэр. – Ён заўсёды так пачынае. Усю раніцу ные. Можа, таму, што сёньня ў яго дзень нараджэньня.

— А колькі яму?

— Трыццаць тры, – сказаў Ластэр. – Сёньня раніцай яму было трыццаць тры.

— Ты хочаш сказаць, ужо мінула трыццаць гадоў, як яму тры гады.

— Я кажу вам тое, што мне сказала няня, – сказаў Ластэр. – Ня ведаю. Але яму запаляць трыццаць тры сьвечкі на торце. А торцік невялікі. Ледзь памесьцяцца. Замоўкні. Хадзі сюды. – Ён падышоў і схапіў мяне за руку. – Ты, стары прыдурак, – сказаў ён. – Хочаш, каб цябе адлупцавалі.

— Так і паверу, што адлупцуеш.

— Ня раз ужо лупцаваў. Ша, – сказаў Ластэр. – Колькі разоў табе казаць, што туды наверх табе нельга. Яны табе мазгавешку зьнясуць сваімі мячыкамі. Хадзі сюды. – Ён пацягнуў мяне. – Сядай. – Я сеў, ён зьняў мае чаравікі і падкасаў нагавіцы. – А цяпер ідзі туды ў ваду і гуляй, і каб ня енчыў і не саплячыўся.

Я заціх і ўлез у ваду, *і прыйшоў Роскус, кліча на вячэру, а Кэдзі сказала: «Яшчэ рана вячэраць. Я не іду».*

Яна была мокрая. Мы гулялі ў ручайку, і Кэдзі прысела і замачыла сукенку, а Вэрш сказаў:

— Твая мама дасьць табе лупцоўку за мокрую сукенку.

— Яна нічога такога ня зробіць, – сказала Кэдзі.

— А ты адкуль ведаеш, – сказаў Квэнтын.

— Проста ведаю, – сказала Кэдзі. – А адкуль ведаеш ты.

— Бо яна так сказала, – сказаў Квэнтын. – А да таго я старэйшы за цябе.

— Мне сем гадоў, – сказала Кэдзі. – А таму, мабыць, я ведаю.

— Я старэйшы за цябе, – сказаў Квэнтын. – Я ўжо хаджу ў школу. Праўда, Вэрш.

— Я пайду ў школу ў наступным годзе, – сказала Кэдзі. – Як толькі пачнецца. Праўда, Вэрш.

— Сама ведаеш, што табе злояць скуру за мокрую сукенку, – сказаў Вэрш.

— Яна ня мокрая, – сказала Кэдзі. Устала ў вадзе і паглядзела на сваю сукенку. – Я зьніму яе, і яна высахне.

— Аб што заклад, што ня зьнімеш, – сказаў Квэнтын.

— Аб што заклад, што зьніму, – сказала Кэдзі.

— Аб што заклад, што пабаішся, – сказаў Квэнтын.

Кэдзі падышла да Вэрша і мяне і павярнулася задам.

— Расшпілі, Вэрш, – сказала яна.

— Ня сьмей, Вэрш, – сказаў Квэнтын.

— Гэта не мая сукенка, – сказаў Вэрш.

— Расшпілі, Вэрш, – сказала Кэдзі. – Інакш скажу на цябе Дылсі, што ты ўчора зрабіў.

І Вэрш расшпіліў.

— Толькі паспрабуй зьняць, – сказаў Квэнтын. Кэдзі зьняла сукенку і кінула яе на бераг. На ёй засталіся толькі станік і майткі, Квэнтын ляпнуў яе, і яна пакаўзнулася і ўпала ў ваду. Калі ўстала, пачала пырскаць вадою на Квэнтына, а Квэнтын пачаў пырскаць на Кэдзі. Трохі вады апырскала Вэрша і мяне, Вэрш падняў мяне і вынес на бераг. Ён сказаў, што паскардзіцца на Кэдзі й Квэнтына, і тады Квэнтын і Кэдзі сталі пырскаць на Вэрша. Ён схаваўся за кустамі.

— Я скажу на вас на ўсіх няні, – сказаў Вэрш.

Квэнтын вылез на бераг і спрабаваў схапіць Вэрша, але Вэрш кінуўся наўцёкі і Квэнтын не дагнаў яго. Калі Квэнтын вярнуўся, Вэрш спыніўся і крыкнуў, што скажа на іх. Кэдзі

сказала яму, што калі ня скажа, дык яны дазволяць яму вярнуцца. Вэрш сказаў, што ня скажа, і яны яму дазволілі.

— Цяпер ты, мабыць, задаволеная, – сказаў Квэнтын. – Цяпер нам абаім злояць скуру.

— Ну й няхай, – сказала Кэдзі. – Я ўцяку.

— Я ўжо бачу, – сказаў Квэнтын.

— Я ўцяку і ніколі не вярнуся, – сказала Кэдзі. Я пачаў плакаць. Кэдзі павярнулася і сказала «Ціха». Дык я заціх. Потым яны забаўляліся ў ручайку. Джэйсан таксама забаўляўся. Ён быў у ручайку кавалак далей. Вэрш выйшаў з-за кустоў і зноў мяне падняў і паставіў у ваду. Кэдзі была ўсюды мокрая і запэцканая ззаду, і я пачаў плакаць, а яна падышла і прысела на кукішкі ў вадзе.

— Будзь ужо ціха, – сказала яна. – Я не ўцяку. – Дык я заціх. Кэдзі пахла як дрэвы пад дажджом.

«Што з табою, – сказаў Ластэр. – Перастань хныкаць і забаўляйся ў ручайку як астатнія».

«Чаму ты не адвядзеш яго дахаты. Ці табе не загадалі не адводзіць яго далёка ад дому».

«Ён усё думае, што гэты поплаў усё яшчэ іхні, – сказаў Ластэр. – Усё роўна ад дому сюды нікому не відаць».

«Але мы яго бачым. А чалавеку няма радасьці глядзець на прыдурка. Прыносіць няшчасьце».

Роскус прыйшоў і паклікаў на вячэру, а Кэдзі сказала, што на вячэру яшчэ зарана.

— Не, не зарана, – сказаў Роскус. – Дылсі кажа, каб вы ўсе ішлі дахаты. Вядзі іх, Вэрш.

Ён пайшоў пад гару, дзе мычала карова.

— Магчыма, мы абсохнем, пакуль дойдзем дадому, – сказаў

Квэнтын.

— Гэта ўсё твая віна, – сказала Кэдзі. – Я спадзяюся, нам сапраўды злояць скуру.

Яна надзела сукенку, і Вэрш зашпіліў яе.

— Яны не пазнаюць, што ты яе замачыла, – сказаў Вэрш. – Нічога не відаць. Калі толькі мы з Джэйсанам ня скажам.

— Джэйсан, ты скажаш, – сказала Кэдзі.

— На каго, – сказаў Джэйсан.

— Ён ня скажа, – сказаў Квэнтын. – Скажаш, Джэйсан.

— Ён напэўна скажа, – сказала Кэдзі. – Скажа бабулі.

— Ён ёй ня скажа, – сказаў Квэнтын. – Яна хварэе. Калі будзем ісьці паволі, сьцямнее, і яны не заўважаць.

— А мне ўсё роўна, заўважаць ці не, – сказала Кэдзі. – Я сама ім скажу. Панясі яго пад гару, Вэрш.

— Джэйсан ня скажа, – сказаў Квэнтын. – Помніш той лук і стралу, што я табе зрабіў, Джэйсан?

— Ён ужо паламаўся, – сказаў Джэйсан.

— Няхай кажа, – сказала Кэдзі. – Мне на гэта начхаць. Занясі Моры на гару, Вэрш. – Вэрш прысеў на кукішкі, і я залез яму на сьпіну.

«Да пабачэньня ў цырку вечарам, – сказаў Ластэр. – Пайшлі. Нам трэба знайсьці той чацьвяртак».

— Калі будзем ісьці паволі, сьцямнее, пакуль дойдзем, – сказаў Квэнтын.

— Я не хачу ісьці паволі, – сказала Кэдзі.

Мы пайшлі пад гару, а Квэнтын застаўся. Калі мы дайшлі да месца, дзе было чуваць сьвіньні, ён усё быў над ручайком.

Сьвіньні рохкалі і нюхалі ў карыце ў кутку. Джэйсан ішоў ззаду з рукамі ў кішэнях. Роскус даіў карову ў дзьвярах стадолы.

Са стадолы выскачылі каровы.

— Давай, – сказаў Т. П. – Завый яшчэ. Я таксама завыю. Ууу. – Квэнтын зноў таўхануў Т. П. нагою. Таўхануў яго ў карыта, дзе елі сьвіньні, і Т. П. у ім застаўся. – Чорт рагаты, – сказаў Т. П. – Вось як ён мяне. Бачылі, як гэты белы мяне таўхануў. Ууу.

Я ня плакаў, але ня мог спыніцца. Я ня плакаў, але зямля не хацела застацца на месцы, і таму я заплакаў. Зямля падымалася коса ўверх, і каровы беглі ўверх. Т. П. спрабаваў устаць. Ён зноў упаў, а каровы пабеглі ўніз. Квэнтын трымаў мяне за руку, і мы ішлі да стадолы. Але потым стадолы там не было, і мы мусілі пачакаць, пакуль вернецца. Я ня бачыў, як яна вярталася. Яна вярнулася ззаду, і Квэнтын пасадзіў мяне ў жолаб, адкуль ядуць каровы. Я трымаўся за жолаб. Ён таксама адбягаўся, і я трымаўся за яго. Каровы зноў беглі ўніз, міма дзьвярэй. Я ня мог спыніцца. Квэнтын і Т. П. пайшлі ўверх біцца. Т. П. падаў з гары, а Квэнтын валок яго пад гару. Квэнтын ударыў Т. П. Я ня мог спыніцца.

— Устань, – сказаў Квэнтын. – І застанься тут. Нідзе не ідзі, пакуль не вярнуся.

— Мы з Бэнджы вяртаемся на вясельле, – сказаў Т. П. – Ууу.

Квэнтын зноў ударыў Т. П. А потым пачаў грукаць Т. П. аб сьцяну. Т. П. сьмяяўся. Кожны раз, як Квэнтын грукнуў Т. П. аб сьцяну, той хацеў сказаць Ууу, але ня мог ад сьмеху. Я перастаў плакаць, але ня мог спыніцца. Т. П. паляцеў на мяне, і дзьверы стадолы адышліся. Яны адышліся ўніз, а Т. П. біўся сам з сабою і зноў упаў. Ён усё сьмяяўся, а я ня мог спыніцца, спрабаваў устаць і паваліўся, і ня мог спыніцца. Вэрш сказаў:

— Ну, ты сябе паказаў. Нічога ня скажаш. Перастань выць.

Т. П. усё сьмяяўся. Паваліўся на вароты і сьмяяўся.

— Ууу, – сказаў ён. – Мы з Бэнджы вяртаемся на вясельле. На

сарсапарылку.

— Будзь ціха, – сказаў Вэрш. – Дзе ты яе дастаў.

— У склепе, – сказаў Т. П. – Ууу.

— Будзь ціха, – сказаў Вэрш. – А дзе ў склепе.

— Усюды, – сказаў Т. П. Ён зноў засьмяяўся. – Там больш за сто бутэлек. Больш за мільён. Зважай, чарнашчокі. Я зараз віскну.

Квэнтын сказаў:

— Паднімі яго.

Вэрш падняў мяне.

— Выпі гэта, Бэнджы, – сказаў Квэнтын. Шклянка была гарачая. – І будзь цяпер ціха, – сказаў Квэнтын. – Пі.

— Сарсапарылка, – сказаў Т. П. – Дайце і мне папіць, паніч Квэнтын.

— Ты заткніся, – сказаў Вэрш. – Паніч Квэнтын зараз дасьць табе пакурыць.

— Патрымай яго, Вэрш, – сказаў Квэнтын.

Яны прытрымалі мяне. Пякло на маім падбародку і кашулі.

— Пі, – сказаў Квэнтын. Прытрымалі маю галаву. Запякло ў маім нутры, і я зноў пачаў. Цяпер я плакаў, а штосьці рабілася ў маёй сярэдзіне, і я плакаў яшчэ мацней, а яны трымалі мяне, пакуль не прайшло. Потым я заціх. Усё яшчэ кружылася, а потым пачаліся тыя плямы. – Адшчапі жолаб, Вэрш. – Яны наплывалі паволі. – Засьцялі гэтыя пустыя мяшкі на падлозе. – Паплылі хутчэй, амаль захутка. – Цяпер схапі яго за ногі.

Наплывалі далей, гладкія і зыркія. Я чуў, як расьсьмяяўся Т. П. Я ішоў разам зь імі, пад зыркую гару.

Наверсе Вэрш ссадзіў мяне.

— Квэнтын, хадзі, – паклікаў ён, паглядаючы долу.

Квэнтын усё яшчэ стаяў каля ручайка. Кідаў нешта ў цень, дзе быў ручаёк.

— Дык няхай той дрыгунчык застаецца, – сказала Кэдзі.

Яна ўзяла мяне за руку, і мы прайшлі міма стадолы ў весьніцы. На цагляным ходніку была жаба, сядзела проста пасярэдзіне. Кэдзі пераступіла яе і пацягнула мяне за сабой.

— Хадзем, Моры, – сказала яна.

Жаба сядзела далей, пакуль Джэйсан не таўхануў яе наском.

— Табе зробіцца бародаўка, – сказаў Вэрш.

Жаба паскакала прэч.

— Хадзем, Моры, – сказала Кэдзі.

— У вашых сёньня госьці, – сказаў Вэрш.

— Адкуль ведаеш, – сказала Кэдзі.

— Бо ўсюды сьвеціцца, – сказаў Вэрш. – Ува ўсіх вокнах.

— А нельга нам запаліць сьвятло, калі захочам, безь ніякіх гасьцей, – сказала Кэдзі.

— Аб што заклад, што госьці? – сказаў Вэрш. – Лепш шмыгайце наверх заднімі сходамі.

— Мне ўсё роўна, – сказала Кэдзі. – Я пайду проста да іх у гасьцёўню.

— Аб што заклад, што тата дасьць табе лупцоўку? – сказаў Вэрш.

— Мне ўсё роўна, – сказала Кэдзі. – Я пайду проста ў гасьцёўню. Я пайду проста ў сталовую і сяду вячэраць.

— А дзе ты сядзеш? – сказаў Вэрш.

— На бабуліна крэсла, – сказала Кэдзі. – Ёй носяць есьці ў ложак.

— Я хачу есьці, – сказаў Джэйсан.

Ён мінуў нас і пабег па ходніку. Трымаў рукі ў кішэнях і ўпаў. Вэрш падышоў і падняў яго.

— Калі б выняў рукі з кішэняў, дык ня ўпаў бы, – сказаў Вэрш. – Такі таўстун ніколі не пасьпее іх выняць, каб нечага хапіцца.

Каля кухонных сходаў стаяў тата.

— Дзе Квэнтын? – сказаў ён.

— Ідзе па ходніку, – сказаў Вэрш.

Квэнтын ішоў паволі. Ягоная кашуля была як белая размазаная пляма.

— Ага, – сказаў тата. Па прыступках падала на яго сьвятло.

— Кэдзі з Квэнтынам пырскалі адно на аднаго вадою, – сказаў Джэйсан. Мы чакалі.

— Вось як, – сказаў тата. Квэнтын дайшоў да нас і тата сказаў: – Сёньня будзеце вячэраць на кухні. – Ён змоўк, узяў мяне на рукі, сьвятло пакацілася са сходаў і на мяне, і я глянуў зьверху на Кэдзі, Джэйсана, Квэнтына і Вэрша. Тата павярнуўся да сходаў. – Але будзьце ціха, – сказаў ён.

— Чаму мы маем быць ціха, тата, – сказала Кэдзі. – У нас госьці.

— Так, – сказаў тата.

— Я казаў, што госьці, – сказаў Вэрш.

— Ты не казаў, – сказала Кэдзі. – Гэта я казала. І што я пайду...

— Ціха, – сказаў тата.

Яны заціхлі, тата адчыніў дзьверы, і мы прайшлі заднім ганкам

на кухню. Там была Дылсі, тата пасадзіў мяне на крэсла, зашчапіў яго і падсунуў да стала, дзе стаяла вячэра. Зь вячэры ішла пара.

— Слухайцеся Дылсі, – сказаў тата. – Не давай ім падымаць гармідар, Дылсі.

— Так, сэр, – сказала Дылсі. Тата пайшоў.

— Памятайце, каб слухацца Дылсі, – сказаў ён за нашымі плячыма.

Я пахіліўся над вячэрай. Пара ішла мне ў твар.

— Тата, няхай сёньня вечарам слухаюцца мяне, – сказала Кэдзі.

— Я ня буду, – сказаў Джэйсан. – Я буду слухацца Дылсі.

— Калі тата табе скажа, дык будзеш, – сказала Кэдзі. – Няхай слухаюцца мяне, тата.

— Я ня буду, – сказаў Джэйсан. – Я ня буду слухацца цябе.

— Ціха, – сказаў тата. – Значыць, усе слухайцеся Кэдзі. Калі скончаць, завядзі іх наверх заднімі сходамі, Дылсі.

— Так, сэр, – сказала Дылсі.

— Бачыш, – сказала Кэдзі. – Цяпер будзеш слухацца мяне.

— Усе будзьце ціха, – сказала Дылсі. – Сёньня вам нельга падымаць шуму.

— Чаму сёньня нам нельга падымаць шуму? – сказала Кэдзі.

— Таму што нельга, – сказала Дылсі. – Самі зразумееце, калі настане той Божы дзень. – Яна прынесла маю міску. Пара зь яе паказытала мой твар. – Хадзі сюды, Вэрш, – сказала яна.

— А калі настане той Божы дзень, Дылсі? – сказала Кэдзі.

— У нядзелю, – сказаў Квэнтын. – Ты нават гэтага ня ведаеш.

— Ша, – сказала Дылсі. – Ці містэр Джэйсан не казаў вам усім быць ціха? Ежце сваю вячэру. На, Вэрш. Вазьмі ягоную лыжку.

Рука Вэрша ўсадзіла лыжку ў міску, паднесла яе да майго рота. Пара казытала мне ў ноздрах. Усе перасталі есьці, мы моўчкі паглядзелі адзін на аднаго, пачулі тое зноў, і я пачаў плакаць.

— Што гэта было, – сказала Кэдзі. Яна паклала сваю руку на маю.

— Гэта была мама, – сказаў Квэнтын. Лыжка паднялася да рота, я зьеў і зноў заплакаў.

— Ціха, – сказала Кэдзі. Але я ня сьціхнуў, і яна падышла і абняла мяне. Дылсі пайшла, зачыніла адны дзьверы і другія, і мы перасталі тое чуць.

— Ну, будзь ціха, – сказала Кэдзі. Я заціх і еў. Джэйсан таксама еў, а Квэнтын не.

— Гэта была мама, – сказаў Квэнтын. Ён устаў.

— Сядай на месца, – сказала Дылсі. – У іх там госьці, а ў цябе апратка ўся ў гразі. Ты таксама сядай, Кэдзі, і бяры еж сваю вячэру.

— Яна плакала, – сказаў Квэнтын.

— Гэта хтосьці засьпяваў, – сказала Кэдзі. – Праўда, Дылсі.

— Усе бярыцеся за сваю вячэру, як вам сказаў містэр Джэйсан, – сказала Дылсі. – Усё зразумееце, калі настане той Божы дзень. – Кэдзі села назад на сваё крэсла.

— Я ж вам казала, што ў іх госьці, – сказала яна.

Вэрш сказаў:

— Ён ужо ўсё зьеў.

— Дай мне ягоную міску, – сказала Дылсі. Міска зьнікла.

— Дылсі, – сказала Кэдзі, – Квэнтын ня есьць свае вячэры. А яму казалі слухацца мяне.

— Зьеж сваю вячэру, Квэнтын, – сказала Дылсі. – Канчайце і выходзьце з кухні.

— Я больш не хачу, – сказаў Квэнтын.

— Калі я скажу, дык ты мусіш есьці, – сказала Кэдзі. – Праўда, Дылсі.

Міска паравала мне ў твар, Вэрш уваткнуў туды лыжку, і пара паказытала мой рот.

— Я больш не хачу, – сказаў Квэнтын. – Як яны могуць прымаць гасьцей, калі бабуля хворая.

— Госьці ў іх нанізе, – сказала Кэдзі. – А яна можа выйсьці і паглядзець на іх зьверху. Я таксама так зраблю, калі адзену начную кашулю.

— Гэта мама плакала, – сказаў Квэнтын. – Праўда, што плакала, Дылсі.

— Не дуры мне галавы, хлопча, – сказала Дылсі. – Вы вось паелі, а мне яшчэ трэба нарыхтаваць вячэру для ўсіх тых людзей.

Неўзабаве даеў Джэйсан і расплакаўся.

— Яшчэ й ты да хору, – сказала Дылсі.

— Ён так кожную ноч, адкуль бабуля захварэла і яму нельга зь ёю спаць, – сказала Кэдзі. – Плакса.

— Я на цябе скажу, – сказаў Джэйсан. Ён плакаў далей.

— Ты ўжо сказаў, – сказала Кэдзі. – Табе ўжо няма чаго больш сказаць.

— Вам усім ужо час ісьці спаць, – сказала Дылсі. Яна падышла, выняла мяне з крэсла і паставіла на падлозе, выцерла мой твар

і рукі цёплым шматком. – Вэрш, завядзі іх наверх заднімі сходамі, толькі паціху. Джэйсан, перастань румзаць.

— Яшчэ зарана ісьці спаць, – сказала Кэдзі. – Мы ніколі так рана не лягалі.

— Сёньня ляжаце, – сказала Дылсі. – Ваш тата сказаў вам ісьці наверх, як толькі скончыце есьці. Вы чулі.

— Ён сказаў слухацца мяне, – сказала Кэдзі.

— Я ня буду слухацца цябе, – сказаў Джэйсан.

— Ты мусіш, – сказала Кэдзі. – Хадзем ужо. Мусіце рабіць, што я вам кажу.

— Толькі каб былі ціха, Вэрш, – сказала Дылсі. – Сёньня будзьце ціха, праўда.

— А чаму сёньня маем быць ціха, – сказала Кэдзі.

— Вашай маме нездаровіцца, – сказала Дылсі. – Пайшлі ўсе за Вэршам.

— Я ж вам казаў, што гэта мама плакала, – сказаў Квэнтын. Вэрш падняў мяне і адчыніў дзьверы на задні ганак. Мы выйшлі, Вэрш зачыніў за намі, і дзьверы пачарнелі. Я чуў Вэрша ў носе і пад рукамі. – Цяпер будзьце ціха. Не, хадзем яшчэ наверх. Містэр Джэйсан сказаў вам ісьці адразу пасьля вячэры. Ён сказаў, каб слухаліся мяне. Я не хачу слухацца цябе. Але ён сказаў, каб усе слухаліся. Праўда, Квэнтын. – Пад рукамі была Вэршава галава. Я чуў нас. – Праўда, Вэрш. Так, праўда. Дык я вам загадваю выйсьці трохі на двор. Хадзем.

Вэрш адчыніў дзьверы, і мы выйшлі.

Мы сышлі па прыступках.

— Давайце лепш пойдзем у бок Вэршавага дому, адтуль нас не пачуюць, – сказала Кэдзі. Вэрш паставіў мяне, Кэдзі ўзяла мяне за руку, і мы ўсе пайшлі па цагляным ходніку.

— Хадзем, – сказала Кэдзі. – Той жабы ўжо няма. Паскакала ў агарод. Можа, трапіцца якая іншая.

Роскус нёс вёдры з малаком. Прайшоў міма нас. Квэнтын з намі не пайшоў. Ён сеў на кухонных сходах. Мы падышлі да Вэршавага дому. Мне падабаўся пах Вэршавага дому. *Гарэў там агонь, а Т. П. сядзеў перад ім на кукішках у кашулі, якая падолам ляжала на падлозе, і падкладваў.*

Потым я ўстаў, Т. П. апрануў мяне, мы пайшлі на кухню і паелі. Дылсі сьпявала, я пачаў плакаць, і яна перастала.

— Не пускай яго дадому цяпер, – сказала Дылсі.

— Нам туды нельга, – сказаў Т. П.

Мы забаўляліся ў ручайку.

— Нам туды нельга, – сказал Т. П. – Ты што, ня чуў, як няня сказала, што нельга.

Дылсі сьпявала ў кухні, і я пачаў плакаць.

— Ціха, – сказаў Т. П. – Хадзі. Давай пойдзем у стадолу.

Роскус даіў карову ў стадоле. Ён даіў адной рукою і стагнаў. Птушкі сядзелі на дзьвярах стадолы і глядзелі на яго. Адна зьляцела на зямлю і пачала есьці з каровамі. Я глядзеў, як Роскус доіць, а Т. П. даваў корм Квіні і Прынцу. Цялятка было ў загародцы для сьвіней. Тыцкала пысаю ў дрот і мыкала.

— Т. П., – сказаў Роскус. – Так, – сказаў Т. П. у стадоле. Фэнсі выставіла галаву са стойла, бо Т. П. яшчэ не накарміў яе. – Канчай там, – сказаў Роскус. – Прыйдзецца табе дадойваць. Мая правая ўжо зусім не згінаецца.

Т. П. падышоў і стаў даіць.

— Чаму ты ня пойдзеш да доктара? – сказаў Т. П.

— Доктар нічога не дапаможа, – сказаў Роскус. – У гэтым доме.

— А што дрэннага ў гэтым доме? – сказаў Т. П.

— Гэты дом няшчасны, – сказаў Роскус. – Упусьці цялятка, калі скончыш.

«Гэты дом няшчасны», – сказаў Роскус. Агонь за ім і Вэршам уставаў і апускаўся і соўгаўся па іхных тварах. Дылсі паклала мяне спаць. Пасьцель пахла як Т. П. Мне гэта падабалася.

— Што ты пра гэта ведаеш? – сказала Дылсі. – У цябе прасьвятленьне ці што.

— Мне ня трэба прасьвятленьне, – сказаў Роскус. – Вось знак няшчасьця, ляжыць у гэтай пасьцелі. Ужо пятнаццаць год, як людзі бачаць гэты знак.

— Ну й хай сабе, – сказала Дылсі. – Зрабіў ён табе ці тваім якую шкоду. Вэрш працуе, Фроні выдалі замуж, Т. П. расьце і зойме тваё месца, калі цябе твой раматус скруціць дарэшты.

— Ужо два было, – сказаў Роскус. – І будзе яшчэ адно. Я бачыў знак, і ты таксама.

— Я чуў, як у тую ноч гукала сава, – сказаў Т. П. – І Дэн таксама не падышоў есьці вечарам. Не пайшоў далей, чымсьці да стадолы. Як толькі сьцямнела, пачаў выць. Вэрш таксама чуў.

— Туды адыдзе больш, чымсьці адзін, – сказала Дылсі. – Пакажы мне чалавека, які не памрэ.

— Тут ідзецца ня толькі пра паміраньне, – сказаў Роскус.

— Ведаю, пра што ты, – сказала Дылсі. – Але калі вымавіш тое імя ўголас, дык наробіш бяды і будзеш сядзець пры ім, каб ня румзаў.

— Гэты дом няшчасны, – сказаў Роскус. – Я бачыў гэта ад пачатку, але калі зьмянілі яму імя, дык зразумеў дакладна.

— Прыкусі сваю мянташку, – сказала Дылсі. Яна падцягнула коўдру. Коўдра пахла як Т. П. – Цяпер усе памаўчэце, пакуль не

засьне.

— Я бачыў знак, – сказаў Роскус.

— Знак, што Т. П. прыйдзецца рабіць за цябе ўсю работу, – сказала Дылсі. – *«Т. П., забяры яго і Квэнтыну, няхай пазабаўляюцца каля дому з Ластэрам, дзе Фроні за імі прыгляне, а ты бяжы пасобіць тату».*

Мы скончылі есьці. Т. П. узяў Квэнтыну на рукі, і мы пайшлі з Т. П. да іх. Ластэр забаўляўся на пяску. Т. П. паставіў Квэнтыну, і яна таксама пачала забаўляцца на пяску. Ластэр меў шпулькі, і Квэнтына зь ім пабілася, і яны апынуліся ў яе. Ластэр заплакаў, прыйшла Фроні, дала Ластэру пазабаўляцца бляшанку, потым я ўзяў шпулькі, Квэнтына пачала біцца, і я заплакаў.

— Ціха, – сказала Фроні. – Як табе ня сорамна забіраць цацкі ад малой.

Яна забрала шпулькі ад мяне і дала іх Квэнтыне.

— Цяпер ужо ціха, – сказала Фроні. – Будзь ціха, кажу.

— Замоўкні, – сказала Фроні. – Табе трэба лупцоўку. – Яна падняла Ластэра і Квэнтыну. – Хадзем, – сказала яна.

Мы пайшлі да стадолы. Т. П. даіў карову. Роскус сядзеў на скрыні.

— А цяпер зь ім што? – сказаў Роскус.

— Няхай застанецца тут з вамі, – сказала Фроні. – Зноў б’ецца з малымі. Забірае ім цацкі. Пабудзь тут з Т. П., можа, заціхнеш на які час.

— Ужо пакінь і вытры вымя, – сказаў Роскус. – Мінулай зімою ты выдаіў тую маладую да апошняй кроплі. Калі і гэтую так выдаіш, зусім без малака застанемся.

Дылсі сьпявала.

— Туды нельга, – сказаў Т. П. – Ты ж ведаеш, што няня туды не дазваляе.

Яны сьпявалі.

— Хадзем, – сказаў Т. П. – Пазабаўляешся з Квэнтыный і Ластэрам. Хадзем.

Квэнтына і Ластэр забаўляліся на пяску перад домам Т. П. У доме падымаўся і апускаўся агонь, а Роскус сядзеў перад ім зусім чорны.

— Вось і трэцяга Госпад забраў, – сказаў Роскус. – Я яшчэ два гады таму вам казаў. Гэты дом няшчасны.

— Дык чаму ты не пераедзеш, – сказала Дылсі. Яна распранала мяне. – Тыя твае гутаркі пра няшчасьце ўдзяўблі Вэршу ў галаву Мэмфіс. Гэтага табе магло б і хапіць.

— Каб толькі Вэрша ніколі не спаткала большае няшчасьце, – сказаў Роскус.

Увайшла Фроні.

— Скончылі ўжо, – сказала Дылсі.

— Т. П. канчае, – сказала Фроні. – Міс Кэралайн хоча, каб ты прыспала Квэнтыну.

— Прыйду, як толькі ўпраўлюся, – сказала Дылсі. – Магла б ужо ведаць, што ў мяне няма крылаў.

— Дык вось я й кажу, – сказаў Роскус. – Якое шчасьце можа быць у доме, дзе нельга вымаўляць імя ўласнага дзіцяці.

— Ціха, – сказала Дылсі. – Ты хочаш, каб ён зноў пачаў.

— Выхоўваць дзіця, каб ня ведала імя ўласнае маці, – сказаў Роскус.

— Не тлумі сабе галавы, – сказала Дылсі. – Я выхавала іх усіх і мяркую, што дам рады выхаваць яшчэ адну. Будзь ужо ціха.

Дай яму заснуць, калі захоча.

— Вымаўляць імя, – сказала Фроні. – Ён жа ня ведае нікога па імені.

— Толькі скажы, а пабачыш, ці ня ведае, – сказала Дылсі. – Ты ў сьне яму скажы, а ён пачуе.

— Ён ведае больш, чымсьці людзі думаюць, – сказаў Роскус. – Ён ведаў кожны раз, калі надыходзіў іхны час, як наш пойнтэр. Ён табе сказаў бы, калі настане і ягоны час, калі б мог гаварыць. І калі твой час настане. І калі мой.

— Няня, забярэце Ластэра ад яго з пасьцелі, – сказала Фроні. – А то яшчэ сурочыць.

— Ціпун табе на язык, – сказала Дылсі. – Нічога лепшага ўжо не прыдумала. А ўвогуле, чаго ты ўвесь час слухаеш таго Роскуса. Лягай, Бэнджы.

Дылсі піхнула мяне, і я лёг у ложак, дзе спаў Ластэр. Дылсі ўзяла доўгае палена і паклала яго паміж мною і Ластэрам. – Ляжы спакойна на сваім баку, – сказала Дылсі. – Ластэр яшчэ маленькі і ты можаш яго прыдушыць.

«Табе яшчэ нельга ісьці, – сказаў Т. П. – Пачакай».

Мы выглядвалі з-за вугла і назіралі, як ад'яжджаюць каляскі.

— Ужо, – сказаў Т. П. Ён падняў Квэнтыну, і мы пабеглі ў куток плота паглядзець, як яны праяжджаюць. – Там ён едзе, – сказаў Т. П. – Бачыш тую з тым шклом. Паглядзі на яго. Ён там ляжыць. Бачыш.

«Хадзі, – сказаў Ластэр, – я вазьму гэты мячык дахаты, каб не згубіць. Не, табе яго я ня дам. Калі б тыя людзі пабачылі яго ў цябе, яшчэ сказалі б, што ты яго ўкраў. Будзь ціха. Я табе яго ня дам. Што ты зь ім рабіў бы. Усё роўна ня ўмееш ім гуляць».

Фроні і Т. П. забаўляліся на пяску каля дзьвярэй. Т. П. меў у бутэльцы сьветлячкі.

— Чаго вы выйшлі яшчэ раз вонкі, – сказала Фроні.

— У нас госьці, – сказала Кэдзі. – Тата сказаў, каб усе мяне сёньня вечарам слухаліся. Табе і Т. П. таксама трэба мяне слухацца.

— Я ня буду цябе слухацца, – сказаў Джэйсан. – Фроні і Т. П. таксама ня трэба цябе слухацца.

— Калі я ім скажу, дык будзе трэба, – сказала Кэдзі. – Але, можа, я не захачу сказаць.

— Т. П. нікога ня слухаецца, – сказала Фроні. – Ужо пачалі з тымі паховінамі.

— Што гэта паховіны, – сказаў Джэйсан.

— Ці няня табе не гаварыла, каб ты ім не казала, – сказаў Вэрш.

— Гэта калі галосяць, – сказала Фроні. – Над цёткай Бюлай Клэй два дні галасілі.

Яны галасілі ў Дылсіным доме. Дылсі галасіла. Калі Дылсі загалаcіла, Ластэр сказаў нам «Будзьце ціха» і мы сядзелі ціха, потым я заплакаў і развыўся Блу пад кухоннымі сходамі. Потым Дылсі перастала, і мы таксама перасталі.

— Ага, – сказала Кэдзі. – Гэта ў нэграў. У белых няма паховінаў.

— Няня гаварыла, каб мы ім гэтага не казалі, Фроні, – сказаў Вэрш.

— Што каб вы не казалі, – сказала Кэдзі.

Дылсі галасіла, і калі гэта даляцела да дому, я пачаў плакаць, а Блу выць пад сходамі. «Ластэр, – сказала Фроні ў акне, – адвядзі іх пад стадолу, у гэтым вэрхале я не магу нічога ўварыць. І таго сабаку. Забяры іх адсюль».

«Я не пайду туды, – сказаў Ластэр. – Яшчэ дзядуля пакажацца.

Я бачыў яго ўчора надвячоркам, махаў мне рукамі са стадолы».

— А чаму я маю не гаварыць, – сказала Фроні. – Белыя таксама паміраюць. Ваша бабуля памерла ўсё роўна як любая нэгрыцянка.

— Гэта сабакі паміраюць, – сказала Кэдзі. – А калі Нэнсі ўпала ў роў і Роскус яе прыстрэліў, прыляцелі коршакі і разьдзелі яе.

Там, дзе ў чорным рове былі павойныя расьліны, закругляліся косьці пад месячным сьвятлом, а некаторыя плямы як быццам спыніліся. Потым яны ўсё спыніліся і было цёмна, а калі я перастаў, перад тым як пачаць зноў, я пачуў маму і крокі, якія хутка адыходзілі, а потым пачуў тое ў носе. Потым пакой вярнуўся, але мае вочы заплюшчыліся. Я не перастаў. Я чуў тое ў носе. Т. П. адшпіліў прасьцірадла.

— Ціха, – сказаў ён. – Шшшшшш.

Але я чуў тое ў носе. Т. П. выцягнуў мяне і хутка апрануў.

— Ціха, Бэнджы, – сказаў ён. – Пойдзем да нас. Пойдзем да нас, да Фроні. Ціха. Шшшш.

Ён завязаў мае чаравікі, надзеў мне шапку, і мы выйшлі. У калідоры сьвяцілася. Па другі бок калідору мы чулі маму.

— Шшшш, Бэнджы, – сказаў Т. П. – Праз хвілінку будзем на дварэ.

Дзьверы адчыніліся, і запахла зусім моцна, і паказалася галава. Але ня татава. Тата ляжаў хворы там усярэдзіне.

— Выведзі яго з дому.

— А я што раблю, – сказаў Т. П. Па сходах уверх ішла Дылсі.

— Ціха, – сказала яна. – Ціха. Забяры яго да нас, Т. П. Фроні пасьцеле яму. Прыгляньце за ім там. Ціха, Бэнджы. Ідзі з Т. П.

Яна пайшла туды, адкуль было чуваць маму.

— Хай там у вас застанецца. – Гэта ня быў тата. Ён зачыніў дзьверы, але я далей адчуваў пах.

Мы спусьціліся. Сходы вялі ў цемру, і Т. П. узяў мяне за руку, і мы выйшлі празь дзьверы зь цемры. На панадворку сядзеў Дэн і выў.

— Ён гэта чуе, – сказаў Т. П. – У цябе і на гэта ёсьць чуцьцё.

Мы сышлі па прыступках туды, дзе былі нашы цені.

— Я забыўся надзець табе паліто, – сказаў Т. П. – Трэба было б. Але ня буду ўжо вяртацца.

Дэн завыў.

— Будзь ціха, – сказаў Т. П. Нашы цені варушыліся, а Дэнаў не, адно тады, калі ён завыў.

— Я не забяру цябе да нас, калі ты будзеш так мычаць, – сказаў Т. П. – І раней, калі яшчэ ў цябе не было гэтага жабінага басу, цяжка было трываць. Хадзем.

Мы ішлі па цагляным ходніку, а з намі нашы цені. Сьвінячы катух пахнуў сьвіньнямі. Карова стаяла ў загарадзі і жавала на нас. Дэн завыў.

— Збудзіш увесь горад, – сказаў Т. П. – Ня можаш цішэй.

Мы ўбачылі Фэнсі, якая паслася над ручайком. Калі мы да яе дайшлі, на вадзе сьвяціў месяц.

— Не, паночку, – сказаў Т. П. – Гэта яшчэ заблізка. Тут спыніцца ня можам. Пайшлі далей. Ты толькі паглядзі на сябе. Цэлыя нагавіцы замачыў расою. Хадзем. – Дэн завыў.

З гудлівай травы выглянуў роў. Косьці закругляліся сярод чорных павойных расьлінаў.

— Ну вось, – сказаў Т. П. – Верашчы сабе тут колькі ў змогу. Перад табою ўся ноч і дваццаць акраў поплаву.

Т. П. лёг у рове, а я сеў і глядзеў на косьці, дзе коршакі елі Нэнсі і выляталі з рову чорныя, павольныя і цяжкія.

«Калі мы тут былі папярэднім разам, дык я яго яшчэ меў, – сказаў Ластэр. – Я табе яго паказваў. Помніш. Я выняў яго з кішэні якраз тут і паказаў табе».

— Ты думаеш, што коршакі распрануць бабулю, – сказала Кэдзі. – Ты здурнеў.

— Ты балахуда, – сказаў Джэйсан. Ён заплакаў.

— А ты дурачмут, – сказала Кэдзі. Джэйсан плакаў. Ягоныя рукі былі ў кішэнях.

— Джэйсан будзе багаты, – сказаў Вэрш. – Ён увесь час трымаецца за грошы.

Джэйсан плакаў.

— Цяпер ты яго запусьціў, – сказала Кэдзі. – Ціха, Джэйсан. Як бы коршакі мелі дастацца туды, дзе ляжыць бабуля. Тата іх ня пусьціць. Ты таксама ня даўся б распрануцца коршаку. Перастань плакаць.

Джэйсан перастаў.

— Фроні сказала, што гэта паховіны, – сказаў ён.

— Ды не, – сказала Кэдзі. – Гэта гасьціна. Фроні нічагуткі пра гэта ня ведае. Ён хоча патрымаць твае сьветлячкі, Т. П. Дай яму на хвіліну.

Т. П. даў мне бутэльку са сьветлячкамі.

— Іду ў заклад, што калі мы абыдзем дом навокал і заглянем у акно гасьцёўні, дык нешта ўбачым, – сказала Кэдзі. – Тады мне паверыце.

— Я ўжо ведаю, – сказала Фроні. – Мне нічога глядзець ня трэба.

— Ты лепш перастань ляпаць языком, Фроні, – сказаў Вэрш. – Няня табе ўсыпле.

— Што ты ведаеш, – сказала Кэдзі.

— Што ведаю, тое ведаю, – сказала Фроні.

— Хадзем, – сказала Кэдзі. – Давайце абыдзем да акна гасьцёўні.

Мы рушылі.

— Т. П. хоча свае сьветлячкі назад, – сказала Фроні.

— Дай яму яшчэ крыху патрымаць, Т. П., – сказала Кэдзі. – Мы іх табе прынясём.

— Гэта ня вы іх лавілі, – сказала Фроні.

— А калі я дазволю, каб вы з Т. П. пайшлі з намі, дык ён можа патрымаць яшчэ трохі, – сказала Кэдзі.

— Нам з Т. П. ніхто не загадваў слухацца цябе, – сказала Фроні.

— А калі я скажу, што вам ня трэба мяне слухацца, дык ён можа патрымаць, – сказала Кэдзі.

— Добра, – сказала Фроні. – Дазволь яму яшчэ патрымаць, Т. П. А мы паглядзім, як там галосяць.

— Яны там не галосяць, – сказала Кэдзі. – Я табе кажу, што гэта гасьціна. Праўда, Вэрш.

— Калі застанемся тут, дык не даведаемся, што яны там робяць, – сказаў Вэрш.

— Хадзем, – сказала Кэдзі. – Фроні і Т. П. ня мусяць мяне слухацца. Але астатнія так. Лепш панясі яго, Вэрш. Ужо амаль цёмна.

Вэрш узяў мяне на сьпіну, і мы абышлі кухню.

Калі мы выглянулі з-за вугла, дык убачылі, што па пад'езьдзе

набліжаецца сьвятло. Т. П. вярнуўся да склепу і адчыніў дзьверы.

«Ведаеш, што там нанізе, – сказаў Т. П. – Сода. Я бачыў, як містэр Джэйсан выходзіў адтуль з поўным ахапкам бутэлек. Пачакай хвілінку».

Т. П. пайшоў і загляну у кухонныя дзьверы. Дылсі сказала: «Чаго ты тут віжуеш. Дзе Бэнджы».

«Ён тут на дварэ», – сказаў Т. П.

«Ідзі і пільнуй яго, – сказала Дылсі. – Не пускай яго цяпер дадому».

«Так, – сказаў Т. П. – Ці ўжо пачалі».

«Ты ідзі і гуляй зь ім далей ад вачэй, – сказала Дылсі. – У мяне і без таго поўныя рукі».

З-пад дому выпаўз вуж. Джэйсан сказаў, што ён не баіцца вужоў, а Кэдзі сказала, што ён баіцца, а яна не, а Вэрш сказаў, што яны абое баяцца, а Кэдзі сказала, каб не шумелі, як загадаў тата.

«Ты толькі не разравіся мне цяпер, – сказаў Т. П. – На табе лепш гэтай сарсапарылкі».

Тое паказытала мяне ў носе і вачах.

«Калі ня хочаш, дык дай я вып'ю, – сказаў Т. П. – Ну добра, на. Давай возьмем яшчэ адну бутэльку, пакуль нам ніхто не перашкаджае. Памаўчы цяпер».

Мы спыніліся пад дрэвам насупроць акна ў гасьцёўню. Вэрш пасадзіў мяне на мокрую траву. Яна была халодная. Ува ўсіх вокнах сьвяцілася.

— Там ляжыць бабуля, – сказала Кэдзі. – Яна цяпер усе дні хварэе. Калі ачуняе, мы будзем мець пікнік.

— Што ведаю, тое ведаю, – сказала Фроні.

У дрэвах шумела, і ў траве таксама.

— А побач пакой, дзе мы хварэем на адзёр, – сказала Кэдзі. – А дзе вы з Т. П. хварэеце на адзёр, Фроні.

— Дзе пападзецца, – сказала Фроні.

— Яны яшчэ не пачалі, – сказала Кэдзі.

«Яны зараз пачнуць, – сказаў Т. П. – Пастой тут, а я пайду прынясу тую скрыню, каб мы маглі заглянуць у акно. Давай ужо скончым з гэтай сарсапарылкай. Ад яе мне ў жываце вухкае сычом».

Мы дапілі сарсапарылку, і Т. П. запіхнуў бутэльку цераз драўляную крату пад дом і пайшоў прэч. Я чуў іх у гасьцёўні і пачаў скрэбці па сьцяне. Т. П. валок скрыню. Ён упаў і пачаў сьмяяцца. Ён ляжаў у траве і сьмяяўся. Потым устаў, прывалок скрыню пад акно і стараўся не засьмяяцца.

— Я баяўся, што вярэсну, – сказаў Т. П. – Залезь на скрыню і паглядзі, ці ўжо пачалі.

— Яны не пачалі, бо яшчэ не прыехалі музыкі, – сказала Кэдзі.

— Ня будзе ніякіх музыкаў, – сказала Фроні.

— Ты адкуль ведаеш, – сказала Кэдзі.

— Што ведаю, тое ведаю, – сказала Фроні.

— Ты нічога ня ведаеш, – сказала Кэдзі. Яна падышла да дрэва. – Падсадзі мяне, Вэрш.

— Твой тата не дазволіў табе лазіць на гэтае дрэва, – сказаў Вэрш.

— Гэта было даўно таму, – сказала Кэдзі. – Я думаю, ён ужо забыўся пра гэта. Да таго, ён прыказаў слухацца мяне сёньня вечарам. Ці ён не сказаў слухацца мяне сёньня вечарам.

— Я ня буду цябе слухацца, – сказаў Джэйсан. – Фроні і Т. П.

таксама ня будуць.

— Падсадзі мяне, Вэрш, – сказала Кэдзі.

— Ну добра, – сказаў Вэрш. – Калі будуць лупцаваць, дык цябе, не мяне.

Ён падышоў і падсадзіў Кэдзі на першую галіну. Мы глядзелі на яе запэцканыя майткі ззаду. Потым мы яе ўжо ня бачылі. Чулі, як трашчаць і хістаюцца галіны.

— Містэр Джэйсан сказаў, што як ты паламаеш гэтае дрэва, ён табе ўсыпле, – сказаў Вэрш.

— Я таксама скажу на яе, – сказаў Джэйсан.

Дрэва перастала хістацца. Мы глядзелі ў нерухомае гольле.

— Што ты там убачыла, – сказала Фроні.

Я ўбачыў іх. Потым я ўбачыў Кэдзі, з кветкамі ў валасах, і доўгі вэлюм як бліскучы вецер. Кэдзі. Кэдзі.

— Ціха, – сказаў Т. П. – А то яшчэ пачуюць. Мігам злазь.

Ён пацягнуў мяне. Кэдзі. Я скроб па сьцяне Кэдзі. Т. П. цягнуў мяне.

— Ціха, – сказаў Т. П. – Ціха. Хадзі сюды мігам. – Ён цягнуў мяне. Кэдзі. – Будзь ціха, Бэнджы. Хочаш, каб цябе пачулі. Хадзі, вып'ем яшчэ сарсапарылкі, а потым вернемся, калі замоўкнеш. Хадзем лепш возьмем яшчэ адну бутэльку, пакуль абодва не загарлапанілі. Скажам, што гэта Дэн выпіў. Містэр Джэйсан заўсёды кажа, які ён разумны сабака, а мы скажам, ён і сарсапарылку ўмее піць.

Па сходах у склеп спусьцілася месячнае сьвятло. Мы выпілі яшчэ сарсапарылкі.

— Ведаеш, чаго б мне хацелася, – сказаў Т. П. – Мне хацелася б, каб сюды ў склеп прыйшоў мядзьведзь. Ведаеш, што я зрабіў бы. Падышоў і плюнуў бы яму ў морду. Дай мне тую пляшку,

каб заткнуць рот, пакуль яшчэ не загарлапаніў.

Т. П. упаў. Засьмяяўся, дзьверы ў склеп і месячнае сьвятло адскочылі, і нешта мяне ўдарыла.

— Ціха, – сказаў Т. П. і стараўся не засьмяяцца. – Божанькі, яны ж нас пачуюць. Уставай, – сказаў Т. П. – Уставай, Бэнджы, хутка. – Ён кідаўся ва ўсе бакі і сьмяяўся, а я спрабаваў устаць. Прыступкі ў склеп уцякалі пад гару ў месячным сьвятле, Т. П. упаў згары ў месячнае сьвятло, я набег на плот, а Т. П. бег за мною і гаварыў: – Цішэй, цішэй.

Потым ён упаў у кветкі і сьмяяўся, а я набег на скрыню. Але калі я спрабаваў на яе ўзьлезьці, яна адскочыла і ўдарыла мяне ззаду галавы, а з майго горла вылецеў нейкі гук. Потым яшчэ адзін, і я перастаў намагацца ўстаць, потым з горла вылецеў зноў той гук, і я расплакаўся. Калі Т. П. цягнуў мяне за ногі, маё горла далей выпускала тыя гукі. Выпускала іх далей і далей, а я ня ведаў, плачу я ці не, а потым на мяне са сьмехам упаў Т. П., з майго горла выйшлі далейшыя гукі, а Квэнтын таўхануў Т. П. нагою, а Кэдзі абняла мяне, і той бліскучы вэлюм, але паху дрэваў я ўжо ня чуў і заплакаў.

«Бэнджы, – сказала Кэдзі, – Бэнджы». Яна зноў мяне абняла, але я адышоў.

— Чаго ты, Бэнджы, – сказала яна. – Ці не ад гэтага капелюша.

Яна зьняла капялюш і вярнулася да мяне, але я адышоў.

— Бэнджы, – сказала яна. – Чаго ты, Бэнджы. Што Кэдзі зрабіла.

— Яму не падабаецца, як ты выфінцілася, – сказаў Джэйсан. – Ты думаеш, што ты ўжо дарослая, што. Ты думаеш, што ты лепшая за астатніх, што. Модніца.

— Зачыні зяпу, – сказала Кэдзі. – Ты засморканы паўзунок. Бэнджы.

— Ты думаеш, калі табе чатырнаццаць, дык ты ўжо дарослая, што, – сказаў Джэйсан. – Ты думаеш, што ты немаведама хто.

Хіба ня так.

— Ціха, Бэнджы, – сказала Кэдзі. – Каб не расстроіў маму. Ціха.

Але я не заціх, і калі яна пайшла, я пайшоў за ёю, а калі яны спынілася на сходах, я таксама спыніўся.

— Чаго, Бэнджы, – сказала Кэдзі. – Скажы Кэдзі. Яна зробіць. Паспрабуй.

— Кэндэйс, – сказала мама.

— Так, мама, – сказала Кэдзі.

— Чаму ты яго дражніш, – сказала мама. – Прывядзі яго сюды.

Мы зайшлі ў мамін пакой, дзе яна ляжала з хваробай у белым шматку на галаве.

— Што з табой, Бэнджамін, – сказала мама.

— Бэнджы, – сказала Кэдзі. Яна падышла зноў, але я адсунуўся.

— Ты яму, відаць, нешта зрабіла, – сказала мама. – Чаму ты яго чапаеш, каб я ня мела ні хвіліны спакою. Дай яму скрыначку і, калі ласка, адыдзі, пакінь яго аднаго.

Кэдзі дастала скрынку, паставіла на падлогу і адчыніла яе. У ёй было поўна зорак. Калі я стаяў нерухома, яны таксама былі нерухомыя. Калі я паварушыўся, яны замігцелі і зазьзялі. Я заціх.

Потым я пачуў, як Кэдзі ідзе прэч, і я зноў пачаў.

— Бэнджамін, – сказала мама. – Хадзі сюды. – Я падышоў да дзьвярэй. – Да цябе гавару, Бэнджамін, – сказала мама.

— Што там зноў, – сказаў тата. – Куды ты ідзеш.

— Завядзі яго наніз, Джэйсан, і скажы, няхай хто-небудзь за ім прыгляне, – сказала мама. – Ты ж ведаеш, што я хворая, аднак.

Тата зачыніў дзьверы за намі.

— Т. П., – сказаў ён.

— Сэр, – сказаў Т. П. зьнізу.

— Бэнджы ідзе наніз, – сказаў тата. – Пабудзь з Т. П.

Я падышоў да дзьвярэй у ванную. Я чуў ваду.

— Бэнджы, – сказаў Т. П. зьнізу.

Я чуў ваду. Прыслухаўся да яе.

— Бэнджы, – сказаў Т. П. зьнізу.

Я прыслухаўся да вады.

Я перастаў чуць ваду, і Кэдзі адчыніла дзьверы.

— А, Бэнджы, – сказала яна. Яна паглядзела на мяне, а я падышоў і яна мяне абняла. – Ты зноў знайшоў Кэдзі, – сказала яна. – Ты думаў, што Кэдзі зьбегла.

Кэдзі пахла як дрэвы.

Мы пайшлі ў Кэдзін пакой. Яна села перад люстрам. Калі перастала рукамі, паглядзела на мяне.

— Чаго ты, Бэнджы. Што такое, – сказала яна. – Ня трэба плакаць. Кэдзі нікуды не ідзе. Паглядзі, – сказала яна. Яна ўзяла бутэлечку, выняла корак і паднесла яе да майго носа. – Пахне. Панюхай. Як прыемна.

Я адышоў і не заціх, а яна трымала бутэлечку ў руцэ і глядзела на мяне.

— Ага, – сказала яна. Яна паставіла бутэлечку, падышла і абняла мяне. – Вось у чым рэч. Ты спрабаваў сказаць гэта Кэдзі, але ня змог. Ты хацеў, але ня мог, праўда. Вядома, што Кэдзі гэтага ня зробіць. Вядома, што не. Пачакай, я апрануся.

Кэдзі апранулася, узяла зноў бутэлечку, і мы пайшлі на кухню.

— Дылсі, – сказала Кэдзі. – Бэнджы дае табе падарунак. – Яна

пахілілася і ўклала бутэлечку ў маю руку. – Цяпер дай яе Дылсі.

Кэдзі выцягнула маю руку, і Дылсі ўзяла бутэлечку.

— Ну, падумайце толькі, – сказала Дылсі. – Маё дзіцятка дае мне пляшачку парфумы. Паглядзі, Роскус. Кэдзі пахла як дрэвы. – Мы з Бэнджы ня любім парфумы.

Кэдзі пахла як дрэвы.

— Ну, яшчэ чаго, – сказала Дылсі. – Ты ўжо завялікі, каб спаць зь некім у адным ложку. Ты ўжо вялікі. Табе трынаццаць гадоў. Табе ўжо столькі, каб ты спаў адзін у пакоі дзядзькі Моры, – сказала Дылсі.

Дзядзька Моры хварэў. У яго былі нездаровыя вока і рот. Вэрш панёс яму вячэру наверх на тацы.

— Моры кажа, што застрэліць таго нягодніка, – сказаў тата. – Дык я яму сказаў, каб ён не абвяшчаў гэта Патэрсану загадзя.

Ён выпіў.

— Джэйсан, – сказала мама.

— Застрэліць каго, тата, – сказаў Квэнтын. – І за што дзядзька Моры хоча яго застрэліць.

— За тое, што той не разумее жартаў, – сказаў тата.

— Джэйсан, – сказала мама. – Як можаш. Калі б Моры забілі з-за нейкага вугла, ты толькі сядзеў бы і пасьмейваўся б.

— Дык няхай Моры абыходзіць вуглы здалёк, – сказаў тата.

— Застрэліць каго, – сказаў Квэнтын. – Каго дзядзька Моры хоча застрэліць.

— Нікога, – сказаў тата. – У мяне няма пісталета.

Мама расплакалася.

— Калі табе шкада трохі свае ежы для Моры, чаму ты ня скажаш яму гэта як мужчына проста ў вочы. А то падымаеш яго на сьмех перад дзецьмі, за яго сьпінаю.

— Мне не шкада, – сказаў тата. – Я захапляюся Моры. Ён дае неацэнны ўклад у падмацаваньне майго пачуцьця расавай перавагі. Я не памяняў бы Моры і на ладную запрэжку. А ведаеш чаму, Квэнтын.

— Не, тата, – сказаў Квэнтын.

— *Et ego in arcadia я* забыўся як па-лацінску сена, – сказаў тата. – Ну так, ну так, – сказаў ён. – Я толькі жартаваў.

Ён выпіў, адставіў кілішак, падышоў да мамы і паклаў ёй руку на плячо.

— Гэта ніякі ня жарт, – сказала мама. – Мой род ні каліва ня горшы за твой. Адно што Моры слабога здароўя.

— Безумоўна, – сказаў тата. – Слабое здароўе – першапрычына ўсялякага жыцьця. Створаныя нямогласьцю, мы гніем ажно да распаду. Вэрш.

— Так, сэр, – сказаў Вэрш за маім крэслам.

— Вазьмі графін і напоўні яго.

— І скажы Дылсі, каб прыйшла па Бэнджы і паклала яго спаць, – сказала мама.

— Ты ўжо вялікі хлопец, – сказала Дылсі. – Кэдзі ўжо абрыдла спаць з табою. Будзь ціха і сьпі.

Пакой адышоў, але я не заціх, пакой вярнуўся і прыйшла Дылсі, села на ложку і глядзела на мяне.

— Ты ня хочаш быць добрым хлопцам і заснуць, – сказала Дылсі. – Ня хочаш, што. Ну дык пачакай хвілінку.

Яна пайшла. У дзьвярах не было нічога. Потым у іх зьявілася Кэдзі.

— Ціха, – сказала Кэдзі. – Я ўжо іду.

Я заціх, Дылсі адгарнула покрыўку, і Кэдзі ўлезла паміж покрыўкі і прасьцірадлам. Яна не зьняла купальнага халата.

— Ну, бачыш, – сказала яна. – Я тут.

Дылсі прыйшла з пледам, прыкрыла і ахутала ім Кэдзі.

— Яшчэ хвіліна, і ён будзе гатовы, – сказала Дылсі. – Я пакіну сьвятло ў тваім пакоі.

— Добра, – сказала Кэдзі. Яна прымасьціла галаву побач з маёй на падушцы. – Дабранач, Дылсі.

— Дабранач, золатка, – сказала Дылсі.

Пакой пачарнеў. *Кэдзі пахла як дрэвы.*

Мы глядзелі ўверх на дрэва, дзе была Кэдзі.

— Што яна там бачыць, Вэрш, – шапнула Фроні.

— Шшшшшш, – сказала Кэдзі на дрэве.

Дылсі сказала:

— Злазь сюды. – Яна выйшла з-за рогу дому. – Як гэта так, што вы не пайшлі наверх, як наказаў ваш тата, а пракраліся за маёй сьпінай. Дзе Кэдзі і Квэнтын.

— Я казаў ёй, каб яна ня лезла на дрэва, – сказаў Джэйсан. – Я скажу на яе.

— Каму на якое дрэва, – сказала Дылсі. Яна падышла і глянула ўверх, у дрэва. – Кэдзі, – сказала Дылсі.

Галіны пачалі зноў трэсьціся.

— Чартоўка адна, – сказала Дылсі. – Злазь долу.

— Будзь ціха, – сказала Кэдзі. – Ці ня ведаеш, што тата сказаў быць ціха. – Паказаліся яе ногі, Дылсі выцягнула рукі і зьняла

яе з дрэва.

— Ты ўжо нічога лепшага не прыдумаў, чымсьці прывесьці іх сюды, – сказала Дылсі.

— А што я супроць яе мог сказаць, – сказаў Вэрш.

— Што вы тут усе робіце, – сказала Дылсі. – Хто вам дазволіў прыйсьці сюды.

— Яна дазволіла, – сказала Фроні. – Яна сказала нам прыйсьці.

— А хто вам сказаў рабіць тое, што яна скажа, – сказала Дылсі. – Пайшлі дахаты.

Фроні і Т. П. пайшлі. Яны ішлі, але нам не было іх відаць.

— На дварэ пасярод ночы, – сказала Дылсі. Яна падняла мяне, і мы пайшлі на кухню.

— За маёй сьпінай прашмыгнулі, – сказала Дылсі. – А ведалі ж, што даўно ўжо пара спаць.

— Шшш, Дылсі, – сказала Кэдзі. – Не гавары так голасна. Нам трэба паціху.

— Дык не падымай шуму сама, – сказала Дылсі. – А дзе Квэнтын.

— Ён зазлаваў, што яму сказалі слухацца мяне сёньня вечарам, – сказала Кэдзі. – Ён усё яшчэ мае тую бутэльку са сьветлячкамі ад Т. П.

— Т. П. абыдзецца і бязь іх, – сказала Дылсі. – Вэрш, пашукай Квэнтына. Роскус кажа, ён пайшоў да стадолы. – Вэрш ішоў. Але мы яго ня бачылі.

— Яны там нічога ня робяць, – сказала Кэдзі. – Проста сядзяць на крэслах і глядзяць.

— Яны дзеля гэтага не патрабуюць вашай дапамогі, – сказала Дылсі.

Мы абыходзілі кухню.

«Куды ты цяпер, – сказаў Ластэр. – Зноў глядзець, як яны б'юць па тых мячыках. Мы ўжо там шукалі. Пастой. Пачакай хвілінку. Пачакай тут, пакуль я зьбегаю дахаты па той мячык. Мне нешта падумалася».

На кухні было цёмна. Дрэвы былі чорныя насупроць неба. Дэн вышкандыбаў з-пад ганка і пасьлініў мне шчыкалатку. Я абышоў кухню да месца, дзе быў месяц. Дэн пацягнуўся за мной, да месяца.

— Бэнджы, – сказаў Т. П. у доме.

Гарлачыкавае дрэва каля акна гасьцёўні не было цёмнае, але густыя дрэвы былі. Трава гудзела пад месячным сьвятлом у месцы, дзе праходзіў мой цень.

— Гэй, Бэнджы, – сказаў Т. П. у доме. – Куды ты схаваўся. Вышмыгнуў на двор. Я ведаю.

Ластэр вярнуўся. «Пачакай, – сказаў ён. – Тут. Туды ня ідзі. Там на гушкалцы панна Квэнтына з сваім кавалерам. Хадзі сюдою. Вярніся, Бэнджы».

Пад дрэвамі было цёмна. Дэн не хацеў да мяне. Застаўся ў месячным сьвятле. Потым я ўбачыў гушкалку і расплакаўся.

«Хадзі назад, Бэнджы. Ведаеш, што міс Квэнтына можа раззлавацца».

На гушкалцы былі двое, потым адзін. Кэдзі хутка падышла, белая ў цемры.

— Бэнджы, – сказала яна. – Як ты вышмыгнуў з дому. Дзе Вэрш.

Яна абняла мяне, і я заціх, схапіў яе за сукенку і хацеў адцягнуць.

— Чаго табе, Бэнджы, – сказала яна. – Чаго. Т. П., – паклікала яна.

Адзін на гушкалцы ўстаў і падышоў да нас, я заплакаў і пацягнуў за Кэдзіну сукенку.

— Бэнджы, – сказала Кэдзі. – Гэта Чарлі. Ты ж ведаеш Чарлі.

— Дзе ягоны нэгр, – сказаў Чарлі. – Чаму яго пускаюць без дагляду.

— Будзь ціха, Бэнджы, – сказала Кэдзі. – Адыдзі, Чарлі. Ты яму не падабаешся. – Чарлі адышоў, і я заціх. Я цягнуў Кэдзі за сукенку.

— Чаго табе, Бэнджы, – сказала Кэдзі. – Няўжо ты ня пусьціш мяне пасядзець тут хвілінку і пагаварыць з Чарлі.

— Пакліч таго нэгра, – сказаў Чарлі.

Ён вярнуўся. Я заплакаў мацней і пацягнуў за Кэдзіну сукенку.

— Адыдзі, Чарлі, – сказала Кэдзі.

Чарлі падышоў і ўзяў Кэдзі рукою, я заплакаў мацней. Я плакаў голасна.

— Не, не, – сказала Кэдзі. – Не. Не.

— Ён ня ўмее гаварыць, – сказаў Чарлі. – Кэдзі.

— Ты з глузду зьехаў, – сказала Кэдзі. Яна пачала хутчэй дыхаць. – Але бачыць. Пакінь. Пакінь. – Кэдзі вырывалася. Яны абое хутка дыхалі. – Прашу цябе. Прашу цябе, – шапнула Кэдзі.

— Пашлі яго прэч, – сказаў Чарлі.

— Добра, – сказала Кэдзі. – Пусьці мяне.

— А пашлеш яго прэч, – сказаў Чарлі.

— Так, – сказала Кэдзі. – Пусьці мяне. – Чарлі пайшоў. – Будзь ціха, – сказала Кэдзі. – Ён пайшоў. Я заціх. Я чуў і бачыў, як падымаюцца яе грудзі.

— Я мушу адвесьці яго дадому, – сказала Кэдзі. Яна ўзяла мяне

за руку. – Я прыйду, – шапнула яна.

— Пачакай, – сказаў Чарлі. – Пакліч нэгра.

— Не, – сказала Кэдзі. – Я вярнуся. Хадзі, Бэнджы.

— Кэдзі, – шапнуў Чарлі ўголас. Мы ішлі. – Толькі вярніся. Вернешся. – Мы з Кэдзі пачалі бегчы. – Кэдзі, – сказаў Чарлі.

Мы выбеглі на месячнае сьвятло да кухні.

— Кэдзі, – сказаў Чарлі.

Мы з Кэдзі беглі. Мы ўбеглі па кухонных сходах на ганак, і Кэдзі стала на калені ў цемры і прыціснула мяне да сябе. Я адчуваў, як падымаюцца яе грудзі.

— Ня буду, – сказала яна. – Я больш ня буду, ніколі. Бэнджы, Бэнджы. – Потым яна заплакала, і я заплакаў, і мы трымалі адно аднаго. – Ціха, – сказала яна. – Ціха. Я больш ня буду.

Я заціх, Кэдзі ўстала, і мы пайшлі на кухню і запалілі сьвятло, Кэдзі ўзяла кухоннае мыла і памыла сабе рот пад кранам, дакладна. Кэдзі пахла як дрэвы.

«Колькі разоў казаць, што табе туды нельга», – сказаў Ластэр. Яны селі на гушкалку, хутка. Квэнтына трымала рукі на сваіх валасах. На ім быў чырвоны гальштук.

«Ты няшчасны дурнаваты вар’ят, – сказала Квэнтына. – Я скажу Дылсі, як ты яго пускаеш цягацца за мною, дзе б я ні ішла. Яна табе зрэжа азадак за гэта».

— Я ня змог яго ўтрымаць, – сказаў Ластэр. – Хадзі сюды, Бэнджы.

— Ты мне не кажы, што ня змог, – сказала Квэнтына. – Ты не схацеў. Вы абодва віжуеце за мною. Вас бабка паслала, каб вы сачылі тут за мною. – Яна саскочыла з гушкалкі. – Калі ты не забярэш яго ў гэтую самую хвіліну і яшчэ раз яго сюды пусьціш, я скажу Джэйсану, каб цябе адлупцаваў.

— Я яму не даю рады, – сказаў Ластэр. – Сама паспрабуй, калі думаеш, што дасі рады.

— Заткні дзюбу, – сказала Квэнтына. – Забярэш яго адсюль ці не.

— Ды няхай застаецца, – сказаў ён. У яго быў чырвоны гальштук. Сонца на ім было чырвонае. – Глянь сюды, Джэк. – Ён запаліў запалку і сунуў яе сабе ў рот. Потым выняў запалку з рота. Яна яшчэ гарэла. – Хочаш паспрабаваць сам, – сказаў ён. Я падышоў да іх. – Адкрый рот, – сказаў ён.

Я адкрыў. Квэнтына ўдарыла ў запалку рукою і запалка зьнікла.

— Каб цябе ў пекле смалілі, – сказала Квэнтына. – Ты хочаш, каб ён пачаў. Як бы ты ня ведаў, што ён можа ныць увесь дзень. Я зараз паскарджуся на вас Дылсі.

Яна пабегла.

— Пачакай, любка, – сказаў ён. – Гэй, вярніся. Я ўжо ня буду яго цьвяліць.

Квэнтына бегла дадому. Павярнула за кухню.

— Ну, ты заварыў кашу, Джэк, – сказаў ён. – Хіба не.

— Ён не разумее, што вы кажаце, – сказаў Ластэр. – Ён глуханямы.

— Вось як, – сказаў ён. – І доўга ён ужо так.

— Сёньня стукнула трыццаць тры гадочкі, – сказаў Ластэр. – Дурнаваты ад нараджэньня. Ці вы ня будзеце ад тых з цырку.

— Чаму, – сказаў ён.

— Я неяк не прыгадаю, каб бачыў вас раней, – сказаў Ластэр.

— Ну, а што, – сказаў ён.

— Нічога, – сказаў Ластэр. – Я іду паглядзець сёньня вечарам.

Ён глянуў на мяне.

— А вы ня будзеце той, што ўмее зайграць песьню на піле, – сказаў Ластэр.

— Гэтага даведаешся, калі заплаціш чацьвяртак, – сказаў ён. Ён глянуў на мяне. – Чаму яго ня возьмуць дзе-небудзь пад ключ, – сказаў ён. – Чаго ты яго сюды прывёў.

— Гэта не ў мяне пытацца, – сказаў Ластэр. – Я зь ім не даю рады. Я сюды прыйшоў пашукаць згубленага чацьвертака, каб схадзіць сёньня ў цырк. Толькі што цяпер яно выглядае, што схадзіць не змагу. – Ластэр паглядзеў на зямлю. – У вас лішняга чацьвяртака не знайшлося б, – сказаў Ластэр.

— Не, – сказаў ён. – Не знайшлося б.

— Відаць, мне трэба будзе знайсьці той, – сказаў Ластэр. Ён сунуў руку ў кішэню. – А мячыка купіць ня хочаце, – сказаў Ластэр.

— Якога мячыка, – сказаў ён.

— Гольфавага мячыка, – сказаў Ластэр. – Больш чымсьці чацьвяртак не хачу.

— Навошта ён мне, – сказаў ён. – Што я зь ім буду рабіць.

— Я так і думаў, – сказаў Ластэр. – Хадзем, дубовая галава, – сказаў Ластэр. – Пайшлі глядзець, як яны гупцяць тыя мячыкі. Паглядзі. Вось табе яшчэ цацка пазабаўляцца разам з тым дурнап'янам.

Ластэр падняў і падаў мне. Яно блішчала.

— Дзе ты гэта ўзяў, – сказаў ён. Калі ён ішоў на сонцы, ягоны гальштук чырванеў.

— Знайшоў пад гэтым во кустом, – сказаў Ластэр. – Я быў падумаў, што гэта мой чацьвяртак.

Ён падышоў і забраў.

— Будзь ціха, – сказаў Ластэр. – Як толькі паглядзіць, дык аддасьць табе назад.

— Агнэс Мэйбл Бэкі, – сказаў ён. Паглядзеў у бок дому.

— Будзь ціха, – сказаў Ластэр. – Ён зараз аддасьць.

Ён даў мне, і я заціх.

— Хто ў яе быў учора вечарам, – сказаў ён.

— Ня ведаю, – сказаў Ластэр. – Яны тут ходзяць кожны вечар, калі яна навучылася злазіць па дрэве. Я іх не адсочваю.

— Але адзін зь іх пакінуў сьлед, – сказаў ён. Ён глянуў на дом. Потым пайшоў і лёг на гушкалцы. – Пайшлі адсюль, – сказаў ён. – Ня дзейнічайце мне на нэрвы.

— Хадзем, – сказаў Ластэр. – Ты цяпер разьвязаў мех з чартамі. Самы час, каб міс Квэнтына на цябе наскардзіла.

Мы пайшлі да плота і глядзелі празь месцы, дзе кучаравіліся кветкі. Ластэр шукаў у траве.

— У гэтым месцы я яго яшчэ меў, – сказаў ён.

Я бачыў, як на шырокім газоне лапатаў у касым сонцы сьцяжок.

— Неўзабаве хто-небудзь тут будзе праходзіць, – сказаў Ластэр. – Тамака нехта ёсьць, але яны адыходзяць. Хадзі і памажы мне шукаць.

Мы ішлі ўздоўж плота.

— Будзь ціха, – сказаў Ластэр. – Я ж іх не прымушу, каб яны ішлі сюды, калі яны ідуць туды. Пачакай. Хто-небудзь сюды неўзабаве прыйдзе. Паглядзі туды. Ужо ідуць.

Я пайшоў уздоўж плота, да весьніц, дзе праходзілі дзяўчаткі з школьнымі сумкамі.

— Гэй, Бэнджы, – сказаў Ластэр. – Хадзі назад.

«Няма сэнсу выглядваць на дарогу, – сказаў Т. П. – Міс Кэдзі цяпер далёка адсюль. Выйшла замуж і пакінула цябе тут. Няма сэнсу тырчаць каля весьніц і плакаць. Яна цябе ня ўчуе».

«Чаго ён увесь час хоча, Т. П., – сказала мама. – Пазабаўляйся зь ім, няхай замоўкне».

«Ён хоча ісьці туды і выглядваць празь весьніцы», – сказаў Т. П.

«Гэтага якраз яму нельга, – сказала мама. – Падае. Няўжо ты ня можаш пазабаўляцца зь ім, каб ён замоўк. Перастань, Бэнджамін».

«Ён не замоўкне ад нічога, – сказаў Т. П. – Ён думае, калі ён будзе стаяць тут каля весьніц, дык міс Кэдзі вернецца».

«Глупства», – сказала мама.

Я чуў, як яны размаўляюць. Я выйшаў за дзьверы і ўжо іх ня чуў, і пайшоў да весьніц, дзе праходзілі дзяўчаткі з школьнымі сумкамі. Яны паглядзелі на мяне, адвярнулі галовы і хутка мінулі. Я хацеў сказаць, але яны ішлі далей, і я пайшоў уздоўж плота і ўсё хацеў сказаць, але яны пайшлі хутчэй. Потым яны пабеглі, а я дайшоў у куток плота і ня мог ісьці далей, і я трымаўся за плот, глядзеў за імі і стараўся сказаць.

— Слухай, Бэнджы, – сказаў Т. П. – Чаго ты ўсё ўцякаеш з дому. Хочаш, каб Дылсі цябе адсьцябала.

— Што толку енчыць і саплячыцца каля плота, – сказаў Т. П. – Ты толькі дзяцей напужаў. Бачыш, яны ідуць па другі бок дарогі.

«Як ён выйшаў навонкі, – сказаў тата. – Ці ты забыўся зачыніць весьніцы на засаўку, калі ўваходзіў, Джэйсан».

«Вядома, што не. У мяне яшчэ не настолькі слабая галава, каб я забываўся. Ці ты, можа, думаеш, што я хацеў, каб нешта такое счаўплося. Бог бачыць, што і бяз гэтага ў нашай сям'і хапае. Я ўвесь час ведаў, што так яно і кончыцца. Цяпер, мабыць, ужо

звозіш яго ў Джэксан. Калі толькі місіс Бэрджыс не застрэліць яго раней».

«Ціха», – сказаў тата.

«Я ўвесь час ведаў, што так яно і кончыцца».

Я крануў весьніцы, і яны былі адчыненыя, і я схапіўся за іх у сутоньні. Я ня плакаў, я стараўся перастаць, і глядзеў на дзяўчатак, якія ішлі ў тым сутоньні. Я ня плакаў.

— Вунь ён.

Яны спыніліся.

— Ён ня можа выйсьці. А прытым, ён нікому ня зробіць крыўды. Хадзем.

— Я баюся. Баюся. Я лепш пайду па другі бок.

— Ён ня можа выйсьці.

Я ня плакаў.

— Ня будзь такая баязьліўка. Хадзем.

Яны ішлі ў сутоньні. Я ня плакаў, я трымаўся за весьніцы. Яны надыходзілі паволі.

— Я баюся.

— Ён табе нічога ня зробіць. Я кожны дзень сюдою хаджу. Ён толькі бегае ўздоўж плота.

Яны пайшлі далей. Я адчыніў весьніцы, яны спыніліся і адвярнуліся. Я хацеў сказаць, таму я схапіў яе і спрабаваў сказаць, а яна вярэснула, а я ня мог сказаць і ня мог, і зыркія плямы перасталі, і я спрабаваў вырвацца. Я спрабаваў сарваць з майго твару, але зыркія плямы пабеглі зноў. Яны пабеглі на гару, дзе яна падала ўніз, і я схацеў крыкнуць. Але калі набраў паветра, дык ня мог выдыхнуць, каб крыкнуць, і я не хацеў упасьці з гары, але ўпаў з тае гары ў віраваньне зыркіх плямаў.

«Глядзі, прыдурак, – сказаў Ластэр. – Вунь нехта надыходзіць. Канчай тут свае сусьлі-гусьлі».

Яны дайшлі да сьцяжка. Ён выняў яго, яны ўдарылі, і ён уставіў яго назад.

— Містэр, – сказаў Ластэр.

Ён аглянуўся. – Што, – сказаў ён.

— Хочаце купіць гольфавы мячык, – сказаў Ластэр.

— Пакажы, – сказаў ён. Ён падышоў да плота, і Ластэр прасунуў празь яго мячык.

— Дзе ты яго ўзяў, – сказаў ён.

— Знайшоў, – сказаў Ластэр.

— Я гэта ведаю, – сказаў ён. – Дзе. У чыімсьці гольфавым мяшку.

— Ён ляжаў там у нас на панадворку, – сказаў Ластэр. – Аддам за чацьвяртак.

— Як ты дапяў, што ён твой, – сказаў ён.

— Я яго знайшоў, – сказаў Ластэр.

— Тады знайдзі сабе яшчэ адзін, – сказаў ён.

Ён паклаў мячык у кішэню і пайшоў.

— Я мушу сёньня вечарам у цырк, – сказаў Ластэр.

— Вось як, – сказаў ён. Ён пайшоў на пляцоўку. – Увага, кэдзі. – сказаў ён. Ён ударыў.

— З табой не разабрацца, – сказаў Ластэр. – Калі іх ня бачыш, скуголіш, калі іх бачыш, таксама скуголіш. Ня мог бы ты замоўкнуць. Ня цяміш, што людзям ужо абрыдла слухаць цябе ўвесь час. Глядзі. Ты і свой дурнап'ян упусьціў. – Ён падняў і даў яго мне. – Табе трэба новая кветка. Гэтая ўжо ўся памятая.

Мы стаялі каля плота і глядзелі на іх.

— З тым белым цяжка дайсьці да ладу, – сказаў Ластэр. – Бачыў, як ён забраў мой мячык.

Яны пайшлі далей. Мы пайшлі ўздоўж плота. Мы дайшлі да садка і не маглі ісьці далей. Я трымаўся за плот і глядзеў паміж кветкамі. Яны адышлі.

— Цяпер табе няма чаго енчыць, – сказаў Ластэр. – Сьціхні. Гэта мне трэба было б раўці, а табе няма чаго. Глядзі. Чаго ты ўпускаеш сваю кветку. А потым пачнеш выць празь яе. – Ён даў мне кветку. – Куды ты сабраўся.

На траве былі нашы цені. Яны дайшлі да дрэваў хутчэй, чымсьці мы. Мой дайшоў туды першы. Потым мы туды дайшлі, і цені прапалі. У бутэльцы была кветка. Я ўставіў у яе другую кветку.

— Такі даросты бамбіза, – сказаў Ластэр. – Забаўляецца з траўкамі ў бутэльцы. А ведаеш, што з табою зробяць, калі памрэ міс Кэралайн. Яны пашлюць цябе ў Джэксан, дзе тваё месца. Містэр Джэйсан так кажа. Там будзеш сабе зь іншымі псыхамі трымацца за краты і саплячыцца ўвесь дзень. Як табе гэта падабаецца.

Ластэр махнуў рукою і перакуліў кветкі.

— Вось што табе зробяць у Джэксане, калі спрабуеш там зараўці.

Я хацеў пазьбіраць кветкі. Ластэр пазьбіраў іх, і кветкі зьніклі. Я расплакаўся.

— Раві сабе, – сказаў Ластэр. – Раві сабе. Хочаць мець чаго раўці. Дык добра. Кэдзі, – шапнуў ён. – Кэдзі. Раві цяпер. Кэдзі.

— Ластэр, – сказала Дылсі з кухні.

Кветкі вярнуліся.

— Будзь ціха, – сказаў Ластэр. – Вось яны. Глядзі. Зноў усё так,

як было раней. Сьціхні, кажу.

— Слухай, Ластэр, – сказала Дылсі.

— Так, няня, – сказаў Ластэр. – Ужо ідзем. Ты нам наварыў кашы. Уставай.

Ён тузануў мяне за руку, і я ўстаў. Мы выйшлі з дрэваў. Нашы цені зьніклі.

— Будзь ціха, – сказаў Ластэр. – Паглядзі, як усе на нас глядзяць. Будзь ціха.

— Прывядзі яго сюды, – сказала Дылсі. Яна сыходзіла па сходах.

— Што ты яму зноў зрабіў, – сказала яна.

— Я яму нічога не зрабіў, – сказаў Ластэр. – Ён папросту пачаў раўці.

— Не, ты зрабіў, – сказала Дылсі. – Ты штосьці яму зрабіў. Дзе вы былі.

— Вунь там, пад кедрамі, – сказаў Ластэр.

— Каб угнявіць Квэнтыну, – сказала Дылсі. – Чаго ты водзіш яго туды, дзе яна. Ці ня бачыш, што яна гэтага ня любіць.

— У яе столькі часу для яго, што і ў мяне, – сказаў Ластэр. – Гэта яшчэ і ня мой дзядзька, а ейны.

— Не нахабнічай перада мною, чарнапысы, – сказала Дылсі.

— Я яму нічога не зрабіў, – сказаў Ластэр. – Ён забаўляўся і ні з таго ні зь сяго разроўся.

— Ці не раскідаў ты ягоных могілак, – сказала Дылсі.

— Я не чапаў ягоных могілак, – сказаў Ластэр.

— Не хлусі мне, хлопча, – сказала Дылсі. Мы ўвайшлі па сходах на кухню. Дылсі адчыніла дзьверцы пліты, прыцягнула перад іх

услон і я сеў. Я заціх.

«Вы хацелі, каб яна зноў пачала, – сказала Дылсі. – Навошта ты яго туды водзіш».

«Ён толькі глядзеў на агонь, – сказала Кэдзі. – Мама прывучала яго да ягонага новага імя. Мы не хацелі, каб яна зноў пачала».

«Яшчэ каб хацелі, – сказала Дылсі. – На гэтым канцы дому зь ім давай рады, на тым зь ёю. Мае справы тут пакіньце ў спакоі. Не кранайце нічога, пакуль не вярнуся».

— Як табе ня сорамна дражніць яго, – сказала Дылсі.

Яна паставіла на стале торт.

— Я яго не дражніў, – сказаў Ластэр. – Ён забаўляўся з той бутэлькай з сабачым румянкам і ні з таго ні зь сяго пачаў раўці. Вы самі чулі.

— Кажаш, што не чапаў ягоных кветак, – сказала Дылсі.

— Я не чапаў ягоных могілак, – сказаў Ластэр. – Навошта мне гэтае ягонае барахло. Я шукаў свой чацьвяртак.

— Дык ты яго згубіў, – сказала Дылсі. Яна запаліла сьвечкі на торце. Некаторыя былі малыя. Некаторыя былі вялікія, разрэзаныя на меншыя кавалкі. – Я табе казала, каб ты яго схаваў. Цяпер, як мяркую, хочаш, каб я выпрасіла табе другі ад Фроні.

— Я мушу схадзіць у той цырк, Бэнджы нябэнджы, – сказаў Ластэр. – Мала днём, дык яшчэ вечарам зь ім цягайся.

— Будзеш рабіць тое, што ён хоча, чарнапысы, – сказала Дылсі. – Чуеш, што кажу.

— А што я ўвесь час раблю, – сказаў Ластэр. – Ці ж я не раблю ўвесь час таго, што ён хоча. Праўда, Бэнджы.

— Так і рабі далей, – сказала Дылсі. – А не каб прыводзіць яго сюды, каб ён роў і расстройваў яшчэ і яе. Давайце ежце гэты

торт, пакуль не прыйшоў Джэйсан. Я не хачу, каб ён чапляўся да мяне за торт, які я купіла за свае грошы. Паспрабуй упячы нешта тут, калі ён лічыць кожнае яечка, як прыйдзе на кухню. Глядзі, не чапай яго цяпер, калі хочаш пайсьці ў той цырк.

Дылсі пайшла.

— Ты й так гэтых сьвечак ня зьдзьмухнеш, – сказаў Ластэр. – Глядзі, як гэта зраблю я. – Ён пахіліўся і надзьмуў шчокі. Сьвечкі адышлі. Я заплакаў. – Будзь ціха, – сказаў Ластэр. – Глядзі, які ў пліце агонь. А я парэжу торт.

Я чуў гадзіньнік, чуў, як за мною стаіць Кэдзі, і чуў дах. «Усё яшчэ ліе, – сказала Кэдзі. – Я ненавіджу дажджу. Я ненавіджу ўсяго». Яе галава лягла на мае калені, Кэдзі заплакала і прыціснулася да мяне, і я таксама заплакаў. Потым я зноў паглядзеў на агонь, і зыркія плямы паплылі зноў. Я чуў гадзіньнік, і дах, і Кэдзі.

Я зьеў трохі торта. Ластэрава рука прыйшла і ўзяла яшчэ кавалак. Я чуў, як ён есьць. Я паглядзеў на агонь.

Над маім плячом зьявіўся доўгі кавалак дроту. Ён дайшоў да дзьверцаў, і агонь зьнік. Я заплакаў.

— Чаго ты зноў заскуголіў, – сказаў Ластэр. – Глядзі. – Агонь быў ззаду. Я заціх. – Чаму ты ня можаш сядзець і глядзець на агонь і быць ціха, як табе наказала няня, – сказаў Ластэр. – Як табе ня сорамна. На. Вазьмі яшчэ кавалак.

— Што ты яму тут зрабіў, – сказала Дылсі. – Чаму ты ня можаш адстаць ад яго.

— Я акурат стараўся, каб ён заціх і не перашкаджаў місіс Кэралайн, – сказаў Ластэр. – А ён зноў чагосьці пачаў.

— Я ведаю, як тое штосьці называецца, – сказала Дылсі. – Як прыйдзе дахаты Вэрш, я яму скажу, каб узяў на цябе кій. Ты ўвесь дзень кія просіш. Ты вадзіў яго да ручайка.

— Не-а, – сказаў Ластэр. – Мы ўвесь дзень былі на панадворку, як вы сказалі.

Ягоная рука прыйшла па новы кусок торта. Дылсі ўдарыла па гэтай руцэ.

— Яшчэ раз пацягнешся, дык я адсяку яе гэтым во секачом, – сказала Дылсі. – Іду ў заклад, што ён ня зьеў яшчэ ні кавалка.

— Яшчэ як зьеў, – сказаў Ластэр. – Ён зьеў у два разы больш за мяне. Няхай сам скажа.

— Паспрабуй толькі пацягнуцца яшчэ раз, – сказала Дылсі. – Паспрабуй толькі.

«Слушна, – сказала Дылсі. – Мабыць, цяпер самы час заплакаць мне. Як мяркую, Моры не супроць, каб і я трохі паплакала над ім».

«Яго цяпер завуць Бэнджы», – сказала Кэдзі.

«Чаму ж гэта, – сказала Дылсі. – А імя, зь якім ён нарадзіўся, ужо знасілася, ці што».

«Бэнджамін паходзіць зь Біблії, – сказала Кэдзі. – Гэта лепшае імя для яго, чым Моры».

«Чаму ж гэта», – сказала Дылсі.

«Мама так кажа», – сказала Кэдзі.

«Га, – сказала Дылсі. – Новае імя яму не дапаможа. А старое не пашкодзіць. Але зьмена імя не прыносіць людзям шчасьця. Я называюся Дылсі, адкуль сябе помню, і буду называцца Дылсі, калі ўсе пра мяне даўно забудуць».

«Як яны будуць ведаць, што ты называешся Дылсі, калі даўно пра цябе забудуць», – сказала Кэдзі.

«Яно застанецца ў Кнізе, любачка, – сказала Дылсі. – Запісанае».

«А ты зможаш прачытаць яго», – сказала Кэдзі.

«Мне ня будзе трэба, – сказала Дылсі. – Яны прачытаюць гэта за

мяне. Мне хопіць сказаць – я тут».

Доўгі дрот зноў зьявіўся над маім плячом, і агонь адышоў. Я пачаў плакаць.

Дылсі з Ластэрам біліся.

— Я ўбачыла, – сказала Дылсі. – Ага, цяпер я ўбачыла. – Яна выцягула Ластэра з кутка і пачала ім трэсьці. – Дык вось тваё я яго не чапаў. Пачакай толькі, аж прыйдзе твой тата. Калі б я была маладзейшая, я табе вушы з галавы паабрывала б. Вазьму і замкну ў пограбе, і столькі ты пабачыш той цырк сёньня вечарам.

— Вой, няня, – сказаў Ластэр. – Вой, няня.

Я паклаў руку, дзе быў агонь.

— Схапі яго, – сказала Дылсі. – Адцягні яго.

Мая рука адскочыла назад, і я сунуў яе ў рот, а Дылсі мяне схапіла. Паміж сваім голасам я далей чуў гадзіньнік. Дылсі адвярнулася і дала Ластэру па галаве. Мой голас крычаў і крычаў.

— Падай мне тую соду, – сказала Дылсі. Яна выняла руку з майго рота. Мой голас выкрыкнуў і рука хацела вярнуцца назад у рот, але Дылсі схапіла яе. Мой голас выкрыкнуў. Яна папырскала содай на маю руку.

— Паглядзі ў каморы, там на цьвіку анучка, адарві кавалак, – сказала яна. – Будзь ціха. Хіба ты хочаш, каб твая мама зноў расстроілася. Паглядзі лепш на агонь. Дылсі зараз забярэ больку з твае рукі. Глядзі на агонь.

Яна адчыніла дзьверцы. Я глянуў на агонь, але боль не перастаў, і я не перастаў. Мая рука хацела ў рот, але Дылсі не пускала.

Яна абвязала руку анучкай. Мама сказала:

— Што тут зноў. Ці я і пахварэць не магу спакойна. Ці мне

трэба ўставаць з ложка і ісьці да яго, нават калі там займаюцца ім два дарослыя нэгры.

— Зь ім ужо добра, – сказала Дылсі. – Ён зараз перастане. Ён толькі трохі апёк руку.

— Два дарослыя нэгры, а прыводзяць яго дадому, калі раве, – сказала мама. – Вы так наўмысна, бо ведаеце, што я хворая. – Яна падышла да мяне і стала. – Перастань, – сказала яна. – У гэтай жа хвіліне. Вы далі яму гэтага торта.

— Я яго купіла, – сказала Дылсі. – Гэта ня з Джэйсанавай каморы. Я зрабіла яму дзень нараджэньня.

— Ці ты захацела атруціць яго гэтым танным купленым тортам, – сказала мама. – Гэтага, відаць, хочаш. Ці я не магу мець нават хвіліны спакою.

— Ідзеце наверх і ляжце, – сказала Дылсі. – Праз хвілінку яму перастане пячы і ён заціхне. Ідзеце.

— Ісьці і пакінуць яго тут, каб вы яму яшчэ што-небудзь зрабілі, – сказала мама. – Як я магу там ляжаць, калі ён тут вішчыць. Бэнджамін. Тут жа перастань.

— Няма куды яго ўзяць, – сказала Дылсі. – У няс няма ўжо столькі месца, як раней. А на дварэ ён заставацца ня можа, там яго бачылі б усе суседзі, як плача.

— Ведаю, ведаю, – сказала мама. – Гэта ўсё мая віна. Але я ўжо доўга тут не пабуду, дык табе і Джэйсану стане лягчэй.

Яна расплакалася.

— Ну, перастаньце, – сказала Дылсі. – А то зноў занядужаеце. Ідзеце наверх. Ластэр завядзе яго ў бібліятэку і пазабаўляецца зь ім, пакуль я звару яму вячэру.

Дылсі і мама выйшлі.

— Ціха, – сказаў Ластэр. – Ціха мне. А то апяку табе другую руку. Ужо ж не баліць. Замоўкні.

— На, – сказала Дылсі. – Ня плач ужо. – Яна дала мне пантофлік, і я заціх. – Вазьмі яго ў бібліятэку, – сказала яна. – А калі я пачую яго яшчэ раз, дык адсьцябаю цябе сама.

Мы пайшлі ў бібліятэку. Ластэр запаліў сьвятло. Вокны пачарнелі, а на сьцяне зьявілася высокае цёмнае месца, і я падышоў і дакрануўся. Яно было як дзьверы, але гэта не былі дзьверы.

За мною зьявіўся агонь, я падышоў да агню і сеў на падлозе, трымаючы пантофлік. Агонь вырас. Дарос да падушачкі на маміным фатэлі.

— Будзь ціха, – сказаў Ластэр. – Ці ня можаш перастаць хоць на хвілінку. Я распаліў табе тут агонь, а ты нават не зірнеш.

«Цябе называюць Бэнджы, – сказала Кэдзі. – Чуеш. Бэнджы. Бэнджы».

«Не гавары да яго так, – сказала мама. – Прывядзі яго да мяне».

Кэдзі ўзяла мяне пад пахамі і падняла.

«Устань, Мо... гэта значыць, Бэнджы», – сказала яна.

«Не насі яго, – сказала мама. – Ня можаш яго сюды папросту прывесьці. Хаця б гэта магла запомніць».

— Я магу яго і падняць,

– сказала Кэдзі. – Дылсі, дай мне занесьці яго наверх.

— Але ж, драбнюта, – сказала Дылсі. – Ты яшчэ ня вырасла, каб і блыху туды занесьці. Ідзеце паціху, як прыказаў містэр Джэйсан.

Зьверху на сходах было сьвятло. Там быў тата, толькі ў кашулі. Глядзеў, нібыта казаў «Будзь ціха». Кэдзі шапнула:

— Мама занядужала.

Вэрш паставіў мяне, і мы ўвайшлі ў мамін пакой. Там быў агонь.

Ён падымаўся і апускаўся на сьценах. У люстры быў другі агонь. Пахла хваробай. Хвароба была ў белым шматку на маміным лобе. Маміны валасы былі на падушцы. Агонь не дасягаў да іх, але сьвяціўся на ейнай руцэ, і маміны пярсьцёнкі падскоквалі.

— Хадзем, скажам маме дабранач, – сказала Кэдзі.

Мы падышлі да ложка. Агонь выйшаў зь люстра. Тата ўстаў з ложка і падняў мяне, а мама паклала руку мне на галаву.

— Колькі гадзін, – сказала мама. Яе вочы былі заплюшчаныя.

— Дзесяць да сёмай, – сказаў тата.

— Яшчэ зарана класьці яго спаць, – сказала мама. – Ён прачнецца на досьвітку, а я проста не перанясу яшчэ адзін такі дзень, як сёньня.

— Не кажы так, – сказаў тата. Ён дакрануўся да мамінага твару.

— Я ведаю, што я табе толькі цяжарам, – сказала мама. – Але мяне ўжо хутка ня стане. І ўжо ня буду нікому дакучаць.

— Перастань, – сказаў тата. – Я вазьму яго на хвіліну наніз. – Ён падняў мяне. – Ідзем, мой сябра. Пойдзем на хвіліну наніз. Але мы мусім быць ціха, бо Квэнтын цяпер вучыцца.

Кэдзі падышла, пахілілася над ложкам, і маміна рука зьявілася ў сьвятле агню. Маміны пярсьцёнкі скакалі на Кэдзінай сьпіне.

«Мама занядужала, – сказаў тата. – Дылсі пакладзе цябе спаць. Дзе Квэнтын».

«Вэрш пайшоў па яго», – сказала Дылсі.

Тата стаяў і глядзеў, як мы праходзім каля яго. Мы чулі маму ў яе пакоі. Кэдзі сказала «Ціха». Джэйсан яшчэ ішоў па сходах наверх. Рукі трымаў у кішэнях.

— Сёньня ўсе павінны быць добрыя, – сказаў тата. – І будзьце ціха, не трывожце маму.

— Мы будзем ціха, – сказала Кэдзі. – Ты павінен быць ціха, Джэйсан, – сказала яна. Мы ішлі на пальчыках.

Мы чулі дах. Агонь відаць і ў люстры. Кэдзі падняла мяне зноў.

— Хадзі, – сказала яна. – Потым можаш яшчэ вярнуцца да агню. Будзь ціха.

— Кэндэйс, – сказала мама.

— Ціха, Бэнджы, – сказала Кэдзі. – Мама хоча цябе на хвілінку да сябе. Будзь добрым хлопчыкам, Бэнджы. А потым можаш сюды вярнуцца.

Кэдзі паставіла мяне, і я заціх.

— Пакіньце яго тут, мама. Калі ён наглядзіцца на агонь, дык тады яго будзеце вучыць.

— Кэндэйс, – сказала мама. Кэдзі пахілілася і падняла мяне. Мы хістануліся. – Кэндэйс, – сказала мама.

— Будзь ціха, – сказала Кэдзі. – Ты ж яшчэ бачыш яго. Ціха.

— Прывядзі яго сюды, – сказала мама. – Ён ужо завялікі, каб ты яго насіла. Перастань браць яго на рукі. Яшчэ хрыбет сабе пашкодзіш. Жанчыны ў нашым родзе заўсёды ганарыліся сваёй паставай. Хіба ты хочаш горбіцца, як прачка.

— Ён не такі цяжкі, – сказала Кэдзі. – Я магу яго падняць.

— Але я не хачу, каб яго насілі, – сказала мама. – Пяцігадовае дзіця. Не, не. Толькі не на мае калені. Няхай пастаіць.

— Калі вы возьмеце яго на калені, дык ён перастане, – сказала Кэдзі. – Ціха, – сказала яна. – Зараз туды вернешся. Глядзі. Вось твая падушачка. Бачыш.

Я паглядзеў на падушку і заціх.

— Вы яму занадта патураеце, – сказала мама. – Ты і твой бацька. Вы не ўсьведамляеце, што за ўсё прыйдзецца плаціць

мне. Такім жа чынам бабуля расьпесьціла Джэйсана, і два гады цягнулася, пакуль ён з таго вырас, а ў мяне няма столькі сілы, каб я праходзіла гэта яшчэ раз з Бэнджамінам.

— Вы ня мусіце ім тлуміць сабе галавы, – сказала Кэдзі. – Я люблю ім апекавацца. Праўда, Бэнджы.

— Кэндэйс, – сказала мама. – Я табе забараніла, каб ты да яго так зьвярталася. Хопіць, што твой бацька заўпарціўся называць цябе гэтай дурнаватай мянушкай. Я не дазволю, каб і да яго зьвярталіся мянушкай. Мянушкі вульгарныя. Толькі просты народ карыстаецца імі. Бэнджамін, – сказала яна.

— Глядзі на мяне, – сказала мама.

— Бэнджамін, – сказала яна.

Яна ўзяла мой твар у рукі і павярнула да свайго.

— Бэнджамін, – сказала яна. – Забяры гэтую падушачку, Кэндэйс.

— Ён будзе плакаць, – сказала Кэдзі.

— Я сказала, забяры гэтую падушачку, – сказала мама. – Яго трэба навучыць слухацца.

Падушачка зьнікла.

— Будзь ціха, Бэнджы, – сказала Кэдзі.

— Адыдзі ад яго, сядзь сабе там, – сказала мама. – Бэнджамін. – Яна трымала мой твар блізка свайго.

— Перастань, – сказала яна. – Перастань.

Але я не перастаў, і мама абняла мяне і заплакала, і я таксама плакаў. Потым падушачка зьявілася зноў, Кэдзі трымала яе над мамінай галавою. Яна пацягнула маму за плячо і паклала яе назад у фатэль, і мама ляжала на чырвона-жоўтай падушачцы і плакала.

— Ня плачце, мама, – сказала Кэдзі. – Ідзеце наверх, ляжце на ложак і хварэйце. Я пайду паклічу Дылсі.

Яна падвяла мяне да агню, і я глядзеў на зыркія плаўныя плямы. Я чуў агонь і дах.

Бацька падняў мяне. Ён пахнуў як дождж.

— Ну, Бэнджы, – сказаў ён. – Ці сёньня ты быў добрым хлопчыкам.

Кэдзі і Джэйсан біліся ў люстры.

— Кэдзі, – сказаў тата.

Яны біліся. Джэйсан пачаў плакаць.

— Кэдзі, – сказаў тата.

Джэйсан плакаў. Ён ужо ня біўся, але мы бачылі ў люстры, што Кэдзі б'ецца, і тата паставіў мяне, пайшоў у люстра і таксама пачаў біцца. Ён падняў Кэдзі. Яна білася. Джэйсан ляжаў на падлозе і плакаў. У ягонай руцэ былі нажніцы. Тата трымаў Кэдзі.

— Ён распароў усе Бэнджавы лялькі, – сказала Кэдзі. – Я яму зараз распару пуза.

— Кэндэйс, – сказаў тата.

— Вось пабачыце, – сказала Кэдзі. – Вось пабачыце.

Яна пачала вырывацца. Тата трымаў яе. Яна таўханула нагою Джэйсана. Ён пакаціўся зь люстра ў куток. Тата паднёс Кэдзі да агню. У люстры не было нікога. Толькі агонь. Выглядала, нібыта агонь быў у дзьвярах.

— Перастань, – сказаў тата. – Ты хочаш, каб мама расхварэлася ў сваім пакоі.

Кэдзі перастала.

— Ён распароў усе лялькі, што мы з Мо… з Бэнджы зрабілі, – сказала Кэдзі. – Ён зрабіў гэта назло.

— Я не назло, – сказаў Джэйсан. Ён сядзеў і плакаў. – Я ня ведаў, што гэта ягоныя лялькі. Я думаў, гэта старыя паперыны.

— Ты ня мог ня ведаць, – сказала Кэдзі. – Ты зрабіў гэта…

— Ціха, – сказаў тата. – Джэйсан, – сказаў ён.

— Я табе заўтра зраблю іншыя, – сказала Кэдзі. – Мы зробім шмат лялек. На, глядзі сабе на падушачку.

Увайшоў Джэйсан.

«Калькі разоў табе казаць, заціхні», – сказаў Ластэр.

«Што тут робіцца», – сказаў Джэйсан.

— Ён проста так, – сказаў Ластэр. – Ён увесь дзень так цягне.

— Дык чаму ты ад яго не адчэпішся, – сказаў Джэйсан. – Калі ты ня ўмееш яго супакоіць, дык пайшлі зь ім на кухню. Мы ўсе ня можам зачыніцца ў пакоі, як мамуля.

— Няня казала не прыводзіць яго на кухню, пакуль ня зварыць вячэры, – сказаў Ластэр.

— Дык пазабаўляйся зь ім, каб быў ціха, – сказаў Джэйсан. – Цэлы дзень працуеш не адгінаючыся, а як прыходзіш дадому, тут як у вар’ятні. – Ён разгарнуў газэту і стаў чытаць.

«Можаш глядзець на агонь, і ў люстра, і на падушачку, – сказала Кэдзі. – Ня мусіш чакаць да вячэры, каб паглядзець на падушачку». Мы чулі дах. Мы таксама чулі Джэйсана, як плакаў за сьцяною.

Дылсі сказала:

— Хадзі сюды, Джэйсан. А ты пакінь чапляцца да яго.

— Так, – сказаў Ластэр.

— Дзе Квэнтына, – сказала Дылсі. – Вячэра амаль гатовая.

— Я ня ведаю, – сказаў Ластэр. – Я яе ня бачыў.

Дылсі пайшла.

— Квэнтына, – сказала яна ў калідоры. – Квэнтына. Вячэра гатовая.

Мы чулі дах. Квэнтын таксама пахнуў як дождж.

«Што Джэйсан зрабіў», – сказаў ён.

«Распароў усе лялькі Бэнджы», – сказала Кэдзі.

«Мама казала не называць яго Бэнджы», – сказаў Квэнтын. Ён сядзеў на дыване з намі. «Каб толькі дождж хутчэй перастаў, – сказаў ён. – А то нельга нічога рабіць».

«Ты біўся, – сказала Кэдзі. – Праўда».

«Не зашмат», – сказаў Квэнтын.

«Па табе відаць, – сказала Кэдзі. – Тата пазнае».

«Ну і няхай, – сказаў Квэнтын. – Каб толькі дождж хутчэй перастаў».

Квэнтына сказала:

— Дылсі не казала, ці вячэра гатовая.

— Так, – сказаў Ластэр. Джэйсан паглядзеў на Квэнтыну. Потым зноў стаў чытаць газэту. Квэнтына ўвайшла. – Яна сказала, што амаль гатовая, – сказаў Ластэр. Квэнтына ўскочыла ў мамін фатэль. Ластэр сказаў:

— Містэр Джэйсан.

— Чаго, – сказаў Джэйсан.

— Вы не далі б мне дваццаць пяць цэнтаў, – сказаў Ластэр.

— Навошта табе, – сказаў Джэйсан.

— Пайсьці сёньня вечарам у цырк, – сказаў Ластэр.

— Я чуў, што Дылсі хацела для цябе папрасіць гэты чацьвяртак ад Фроні, – сказаў Джэйсан.

— Яна яго дастала, – сказаў Ластэр. – Толькі што я згубіў. Мы з Бэнджы шукалі яго ўвесь дзень. Запытайце ў яго.

— Дык ад яго і пазыч, – сказаў Джэйсан. – Я свае грошы мушу запрацаваць.

Ён зноў чытаў газэту. Квэнтына глядзела на агонь. Агонь быў у яе вачах і на яе вуснах. Яе вусны былі чырвоныя.

— Я стараўся, каб ён туды не хадзіў, – сказаў Ластэр.

— Трымай язык за зубамі, – сказала Квэнтына.

Джэйсан паглядзеў на яе.

— Я табе што абяцаў зрабіць, калі пабачу цябе яшчэ раз з тым цыркоўцам, – сказаў ён. Квэнтына глядзела на агонь. – Ты мяне чуеш, – сказаў Джэйсан.

— Я вас чую, – сказала Квэнтына. – Дык чаму ня зробіце.

— Будзь спакойная, – сказаў Джэйсан.

— Я і ёсьць, – сказала Квэнтына.

Джэйсан зноў пачаў чытаць газэту.

Я чуў дах. Тата пахіліўся дапераду і паглядзеў на Квэнтына.

«Во як, – сказаў ён. – Хто перамог».

— Ніхто, – сказаў Квэнтын. – Нас разьвялі. Настаўнікі.

— Хто гэта быў, – сказаў тата. – Скажаш мне.

— Усё было справядліва, – сказаў Квэнтын. – Ён быў роўны са

мною.

— Дык гэта ў парадку, – сказаў тата. – А можаш мне сказаць, за што вы.

— За нішто, – сказаў Квэнтын. – Ён сказаў, што пакладзе жабу ў яе сумку, а яна пабаіцца яму ўсыпаць.

— Ага, – сказаў тата. – Яна. А потым што.

— Так, тата, – сказаў Квэнтын. – А потым я яго стукнуў.

Мы чулі дах, і агонь, і пахліпваньне за дзьвярыма.

— А дзе ён хацеў узяць жабу ў лістападзе, – сказаў тата.

— Ня ведаю, тата, – сказаў Квэнтын.

Мы чулі іх.

— Джэйсан, – сказаў тата.

Мы чулі Джэйсана.

— Джэйсан, – сказаў тата. – Хадзі сюды і перастань.

Мы чулі дах, і агонь, і Джэйсана.

— Зараз жа перастань, – сказаў тата. – Хочаш, каб я табе зноў урэзаў.

Тата падняў Джэйсана на фатэль побач з сабою. Джэйсан хліпаў. Мы чулі дах і агонь. Джэйсан усхліпнуў мацней.

— Яшчэ толькі раз, – сказаў тата.

Мы чулі агонь і дах.

«Добра, – сказала Дылсі. – А цяпер хадзеце ўсе вячэраць».

Вэрш пахнуў як дождж. Ён таксама пахнуў як сабака. Мы чулі агонь і дах.

Мы чулі, як хутка ідзе Кэдзі. Тата і мама паглядзелі на дзьверы. Кэдзі хутка прайшла міма. Не паглядзела. Прайшла хутка.

— Кэндэйс, – сказала мама.

Кэдзі перастала ісьці.

— Так, мама,– сказала яна.

— Ня трэба, Кэралайн, – сказаў тата.

— Хадзі сюды, – сказала мама.

— Ня трэба, Кэралайн, – сказаў тата. – Пакінь яе ў спакоі.

Кэдзі падышла да дзьвярэй, спынілася, паглядзела на тату і маму. Яе вочы заляцелі да мяне і адляцелі. Я заплакаў. Потым заплакаў больш і ўстаў. Кэдзі ўвайшла, стала пад сьцяной, паглядзела на мяне. Я пайшоў да яе, плачучы, яна прыціснулася сьпінай да сьцяны, я ўбачыў яе вочы, заплакаў мацней і пацягнуў яе за сукенку. Яна выставіла рукі, але я цягнуў. Яе вочы ўцякалі.

«Ты цяпер называешся Бэнджамін, – сказаў Вэрш. – А ведаеш, чаму ты цяпер называешся Бэнджамін. Яны хочуць зрабіць зь цябе сінядзяснага. Няня кажа, за старым часам твой дзед зьмяніў імя нэгру, і той стаў прапаведнікам, а калі паглядзелі, у яго і дзясны сінія. Хоць раней у яго не было сініх дзяснаў. А калі цяжарная паглядзіць такому сінядзяснаму ў вочы ў час поўні, дзіця ў яе народзіцца таксама зь сінімі дзяснамі. І аднойчы вечарам, калі ўжо тут па панадворку бегала з тузін сінядзясных дзяцей, ён не вярнуўся дадому. Паляўнічыя за апосумамі знайшлі яго потым у лесе, абабранага дачыста. А ведаеце, хто яго зьеў. Тыя сінядзясныя дзеці».

Мы былі ў калідоры. Кэдзі глядзела ўвесь час на мяне. Руку трымала каля рота, а я бачыў яе вочы і плакаў. Мы пайшлі па сходах уверх. Яна зноў спынілася, абаперлася аб сьцяну і паглядзела на мяне, а я плакаў, яна пайшла далей, і я за ёй, я плакаў, а яна абаперлася аб сьцяну і глядзела на мяне. Яна адчыніла дзьверы ў свой пакой, але я цягнуў яе за сукенку, мы

ўвайшлі ў ванную, і яна стала каля дзьвярэй і глядзела на мяне. Потым закрыла твар рукою, а я папіхаў яе да ўмывальніка і плакаў.

«Што ты яму робіш, – сказаў Джэйсан. – Чаго ты да яго чапляешся».

«Я да яго не чапляюся, – сказаў Ластэр. – Ён сёньня ўвесь дзень так цягне. Яго трэба адлупцаваць».

«Яго трэба адаслаць у Джэксан, – сказала Квэнтына. – Як можна жыць у такім доме».

«Калі вам, маладая дама, у нас не падабаецца, дык не жывеце».

«А я і не зьбіраюся, – сказала Квэнтына. – Не турбуйцеся».

Вэрш сказаў:

— Адсунься крыху, дай мне пасушыць ногі. – Ён адсунуў мяне крыху. – І не пачынай нам зноў раўці. Табе ўсё яшчэ відаць. Толькі ў цябе і работы, што на агонь глядзець. Пад дажджом табе, як мне, мокнуць не прыходзіцца. Ты нарадзіўся шчасьліўцам і сам пра гэта ня ведаеш. – Ён лёг на сьпіну перад агнём.

— А ведаеш, чаму ты цяпер называешся Бэнджамін, – сказаў Вэрш. – Паводле няні, твая мама занадта ганарыстая, каб ты.

— Сядзі ціха і дай мне пасушыць ногі, – сказаў Вэрш. – А не, дык ведаеш што табе зраблю. Аблуплю табе скуру з пасядзелкі.

Мы чулі агонь, і дах, і Вэрша.

Вэрш хутка сеў і тузануў ногі назад. Тата сказаў:

— У парадку, Вэрш.

— Я пакармлю яго сёньня вечарам, – сказала Кэдзі. – Ён часам плача, калі яго корміць Вэрш.

— Занясі гэтую тацу наверх, – сказала Дылсі. – І бяжы назад

карміць Бэнджы.

— Хочаш, каб Кэдзі цябе пакарміла, – сказала Кэдзі.

«Ці яму яшчэ трэба класьці на стол той стары брудны пантофель, – сказала Квэнтына. – Чаму вы ня корміце яго на кухні. Чалавеку здаецца, што есьць са сьвіньнёю».

«Калі табе не падабаецца, як мы ямо, дык не прыходзь да стала», – сказаў Джэйсан.

Ад Роскуса ішла пара. Ён сядзеў перад плітой. Дзьверцы духоўкі былі адчыненыя, і Роскус трымаў у ёй свае ногі. Пара ішла ад міскі. Кэдзі лёгка сунула ложку мне ў рот. У місцы паказалася чорнае месца.

«Ну, ну, – сказала Дылсі. – Ён табе ўжо ня будзе больш дакучаць».

Ежа была ўжо пад значком. Потым міска стала пустой. Адышла.

— Ён сёньня такі галодны, – сказала Кэдзі. Міска вярнулася. Я ня бачыў чорнага месца. Потым убачыў. – Ён сёньня выгаладаўся, – сказала Кэдзі. – Паглядзеце, колькі зьеў.

«Але ж будзе, – сказала Квэнтына. – Вы ўсе пасылаеце яго, каб ён віжаваў за мной. Я ненавіджу гэты дом. Я адсюль уцяку».

Роскус сказаў:

— Будзе падаць усю ноч.

«Ты ўжо ўцякаеш даволі доўга, але кожны раз не застаешся там даўжэй, чым да абеду», – сказаў Джэйсан.

«Вось пабачыце», – сказала Квэнтына.

— Ня ведаю, што мне рабіць, – сказала Дылсі. – Схапіла мяне ў клубе так моцна, што амаль не магу рухацца. Увесь вечар бегаеш па гэтых сходах уверх-уніз.

— Гэтым мяне ня зьдзівіш, – сказаў Джэйсан. – Гэтым ты мяне

зусім ня зьдзівіш.

Квэнтына кінула сурвэтку на стол.

— Замоўкні, Джэйсан, – сказала Дылсі. Яна падышла і абняла Квэнтыну. – Сядай, любка, – сказала Дылсі. Як яму ня сорамна папікаць цябе чужой віною.

— Яна зноў мігрэніцца, праўда, – сказаў Роскус.

— Замоўкні, – сказала Дылсі.

Квэнтына адпіхнула Дылсі. Глянула на Джэйсана. Яе вусны былі чырвоныя. Яна падняла сваю шклянку з вадою, замахнулася рукою, глядзела на Джэйсана. Дылсі схапіла яе за руку. Яны сталі біцца. Шклянка разьбілася аб стол, вада пацякла ў стол. Квэнтына пабегла.

— Мама зноў захварэла, – сказала Кэдзі.

— А як жа іначай, – сказала Дылсі. – У гэткае надвор'е кожны расхварэецца. Калі гэты ты кончыш есьці, хлопча.

«Каб цябе скруціла, – сказала Квэнтына. – Каб цябе скруціла. Мы чулі, як яна бегла па сходах. Мы пайшлі ў бібліятэку».

Кэдзі дала мне падушачку, і я мог глядзець на падушачку, і люстра, і агонь.

— Вы мусіце быць ціха, калі Квэнтын вучыцца, – сказаў тата. – Што ты там робіш, Джэйсан.

— Нічога, – сказаў Джэйсан.

— Дык выйдзі адтуль, – сказаў тата.

Джэйсан выйшаў з кутка.

— Што ты жуеш, – сказаў тата.

— Нічога, – сказаў Джэйсан.

— Ён зноў жуе паперу, – сказала Кэдзі.

— Хадзі сюды, Джэйсан, – сказаў тата.

Джэйсан кінуў тое ў агонь. Яно зашыпела, раскруцілася, пачарнела. Потым стала шэрае. Потым зьнікла. Кэдзі, тата і Джэйсан сядзелі ў маміным фатэлі. Прыпухлыя вочы Джэйсана былі заплюшчаныя, а ягоны рот варушыўся, нібыта нешта смакаваў. Кэдзіна галава была на татавым плячы. Яе валасы былі як агонь, і ў яе вачах былі кропкі агню, я падышоў, і тата падняў мяне таксама ў фатэль, і Кэдзі абняла. Яна пахла як дрэвы.

Яна пахла як дрэвы. У кутку было цёмна, але я бачыў акно. Я прысеў там і трымаў пантофлік. Я ня бачыў пантофліка, але мае рукі бачылі яго, і я чуў, як настае ноч, мае рукі бачылі пантофлік, а я сябе ня бачыў, але мае рукі бачылі пантофлік, і я сядзеў там і слухаў, як настае ноч.

«Вось ты дзе, – сказаў Ластэр. – Глядзі, што я дастаў». Ён паказаў мне. «Ведаеш, дзе я яго дастаў. Міс Квэнтына дала. Я ведаў, што мяне ня могуць не пусьціць туды. А што ты тут сам адзін робіш. Я думаў, ты дзе вышмыгнуў на двор. Ты сёньня не наенчыўся і не насаплячыўся ўдосталь, так што табе яшчэ трэба было схавацца ў пустым пакоі, каб мармытаць і цягнуць далей. Хадзі завяду спаць, а то спазьнюся ў цырк. У мяне сёньня няма часу вазіцца з табою ўвесь вечар. Як толькі яны затрубяць у трубы, я змываюся».

Мы не пайшлі ў свой пакой.

— Тут мы хварэем на адзёр, – сказала Кэдзі. – Чаму нам сёньня нельга спаць у сваім пакоі.

— Як быццам табе ня ўсё роўна, дзе спаць, – сказала Дылсі. Яна зачыніла дзьверы, села і пачала распранаць мяне. Джэйсан заплакаў. – Будзь ціха, – сказала Дылсі.

— Я хачу спаць з бабуляй, – сказаў Джэйсан.

— Яна захварэла, – сказала Кэдзі. – Ты будзеш спаць зь ёю, калі яна агоўтаецца. Праўда, Дылсі.

— Ціха ўжо мне, – сказала Дылсі. Джэйсан заціх.

— Тут нашы начныя кашулі і ўсё, – сказала Кэдзі. – Нас назусім пераводзяць сюды ці што.

— Ну дык надзявайце іх хутчэй, – сказала Дылсі. – Расшпілі Джэйсану гузікі.

Кэдзі расшпіліла Джэйсана. Ён пачаў плакаць.

— Ты просішся лупцоўкі, – сказала Дылсі.

Джэйсан заціх.

«Квэнтына», – сказала мама ў калідоры.

«Чаго», – сказала Квэнтына за сьцяною. Мы чулі, як мама замкнула дзьверы на ключ. Яна заглянула ў нашы дзьверы, увайшла, пахілілася над ложкам і пацалавала мяне ў лоб.

«Калі пакладзеш Бэнджаміна, сходзіш і спытаеш Дылсі, ці яна не супроць нарыхтаваць мне грэлку, – сказала мама. – Скажы ёй, калі яна супроць, што я абыдуся і бяз грэлкі. Я проста хачу ведаць».

«Так, – сказаў Ластэр. – Давай. Скідай порткі».

Увайшлі Квэнтын і Вэрш. Квэнтын адварочваў твар.

— Чаго ты плачаш, – сказала Кэдзі.

— Будзь ціха, – сказала Дылсі. – Распранайцеся хутчэй. А ты, Вэрш, ідзі дахаты.

Я, распрануты, паглядзеў на сябе і пачаў плакаць. «Ціха, – сказаў Ластэр. – Глядзі не глядзі, іх у цябе няма. Прапалі. Калі будзеш так далей, дык мы ўжо ніколі ня зробім табе дня нараджэньня». Ён надзеў мне кашулю. Я заціх, а Ластэр раптаў стаў і павярнуў галаву да акна. Потым падышоў да акна і выглянуў. Вярнуўся і ўзяў мяне за руку. Глядзі, як яна злазіць, сказаў ён. Толькі будзь ціха. Мы падышлі да акна і выглянулі. Выйшла з Квэнтынінага акна, пералезла на дрэва. Мы глядзелі, як хістаецца дрэва.

Хістаньне зьлезла з дрэва, потым выйшла, і мы глядзелі, як ідзе прэч па траве. Потым ужо перасталі бачыць. «Хадзі, – сказаў Ластэр. – Чуеш. Затрубілі. Лягай у ложак, пакуль просяць па-добраму».

Ложкі было два. Квэнтын лёг на другі. Павярнуўся тварам да сьцяны. Дылсі паклала Джэйсана зь ім. Кэдзі зьняла сукенку.

— Паглядзі на свае майткі, – сказала Дылсі. – Тваё шчасьце, што мама ня бачыць.

— Я ўжо сказаў на яе, – сказаў Джэйсан.

— Ну, ты б не сказаў, – сказала Дылсі.

— І што, пахвалілі цябе, – сказала Кэдзі. – Нагаворшчык.

— А што, набілі, – сказаў Джэйсан.

— Чаго ты не апранаеш сваю кашулю, – сказала Дылсі. Яна падышла і дапамагла Кэдзі зьняць станік і майткі. – Паглядзі толькі на сябе, – сказала Дылсі. Яна скамячыла майткі і пачала імі церці Кэдзі ззаду. – Наскрозь сябе запэцкала, – сказала яна. – Але купаньня сёньня ня будзе. Стой. – Яна нацягнула на Кэдзі кашулю, і Кэдзі ўзьлезла на ложак, а Дылсі пайшла да дзьвярэй і падняла руку гасіць сьвятло. – І цяпер ужо будзьце ціха, чуеце, – сказала яна.

— Добра, – сказала Кэдзі. – Мама сёньня ня прыйдзе сказаць дабранач. Значыць, мяне трэба слухацца і далей.

— Так, – сказала Дылсі. – Ну, сьпеце.

— Мама хворая, – сказала Кэдзі. – Яна і бабуля абедзьве хворыя.

— Ціха, – сказала Дылсі. – Сьпеце.

Пакой пачарнеў, акрамя дзьвярэй. Потым і дзьверы пачарнелі. Кэдзі сказала:

— Ціха, Моры.

Яна паклала сваю руку на мяне. Я заціх. Мы чулі нас. Мы чулі цемру.

Цемра адышла, і на нас глядзеў тата. Паглядзеў на Квэнтына і Джэйсана, потым падышоў і пацалаваў Кэдзі і паклаў руку мне на галаву.

— Ці мама моцна хворая, – сказала Кэдзі.

— Не, – сказаў тата. – Глядзі, каб Бэнджы чаго ня сталася.

— Так, – сказала Кэдзі.

Тата пайшоў да дзьвярэй і паглядзеў на нас яшчэ раз. Потым цемра вярнулася, ён стаяў чорны ў дзьвярах, а потым і дзьверы пачарнелі. Кэдзі трымала мяне, і я чуў нас усіх, і цемру, і яшчэ нейкі пах. А потым стала відаць вокны, за якімі шумелі дрэвы. Потым цемра пачала ісьці зыркімі плаўнымі плямамі, як заўсёды ідзе, нават калі Кэдзі кажа, што я спаў.

З ангельскай мовы пераклаў Ян Максімюк

Гэта казка, расказаная дурнем…
(Ад перакладчыка)

Уільям Фолкнэр напісаў «Гоман і ятру» («The Sound and the Fury») у 1928 годзе, які, разгляданы з пэрспэктывы ягонай усёй творчасьці, стаўся для пісьменьніка annus mirabilis. У гэтым самым годзе ён яшчэ закончыў раман «Flags in the Dust», які ў скарочанай форме выйшаў друкам у выдавецтве «Гаркарт і Брэйс» («Harcourt and Brace») у студзені 1929-га пад загалоўкам «Сарторыс». Раман «Гоман і ятра» апублікавала ў кастрычніку 1929-га выдавецтва «Кэйп і Сьміт» («Cape and Smith»). Абедзьве кніжкі – «Сарторыс» і «Гоман і ятра» – запачаткавалі найважнейшы і найбольш плённы пэрыяд творчасьці Фолкнэра, у якім зьявіліся яшчэ такія ягоныя шэдэўры, як «As I Lay Dying» (1930), «Sanctuary» (1931), «Light in August» (1932), «Absalom, Absalom» (1936), «The Wild Palms» (1939) і «The Hamlet» (1940). Да таго, у ацэнцы шмат якіх амэрыканскіх крытыкаў, «Гоман і

ятра» – найбольш арыгінальны твор усяго амэрыканскага літаратурнага мадэрнізму, які ня сорамна паставіць на той самай паліцы з «Улісам» Джэймса Джойса або «Ў пошуках страчанага часу» Марсэля Пруста.

Чытачам «ARCHE» я прапаную свой пераклад першай часткі «Гоману і ятры», якая называецца «7 красавіка 1928». Тры наступныя часткі раману таксама носяць назвы, прывязаныя да датаў: «2 чэрвеня 1910», «6 красавіка 1928» і «8 красавіка 1928». Тры першыя часткі напісаныя тэхнікай «плыні сьвядомасьці» – яны, па сутнасьці, уяўляюць сабою ўнутраныя маналёгі трох братоў Компсанаў: Бэнджаміна, Квэнтына і Джэйсана. Чацьвертая частка напісаная ў традыцыйнай, аб'ектывізаванай форме нарацыі ад трэцяй асобы. «Цяпер» у рамане – гэта Вялікдзень 1928-га: 6 красавіка 1928-га – Велікодная пятніца, 7 красавіка 1928-га – Велікодная субота, 8 красавіка 1928-га – Велікодная нядзеля. Другая частка раману пераносіць чытача 18 гадоў таму – апавядальнікам у ёй зьяўляецца Квэнтын Компсан, 20-гадовы студэнт Гарварду, які якраз 10 чэрвеня 1910-га пастанавіў пакончыць жыцьцё самагубствам. (Інакш кажучы, Фолкнэр знаёміць нас з думкамі і сьвядомасьцю Квэнтына ў апошні дзень ягонага жыцьця.)

Але самым арыгінальным, з гледзішча пісьменьніцкай тэхнікі, ёсьць якраз першая частка раману, дзе роля наратара адведзеная 33-гадоваму Бэнджаміну Компсану, ідыёту ад нараджэньня, чыё псыхічнае і разумовае жыцьцё запынілася на ўзроўні трохгадовага дзіцяці. Для Бэнджаміна, да якога бальшыня пэрсанажаў зьвяртаецца мянушкай Бэнджы, не існуе часу як наступства будучыні пасьля мінуласьці. Для Бэнджы, фактычна, усе падзеі ягонага жыцьця адбываюцца ў нечым, што можна назваць «безупыннай цяперашнасьцю». Безумоўна, для яго не існуе і асэнсаванай, лягічнай сувязі паміж прычынай і наступствам. Ягоны ўнутраны маналёг – «гоман і ятра», што згаданыя ў загалоўку – разьвіваецца хутчэй паводле чыста асацыятыўнага прынцыпу, чым якога-небудзь іншага. Пераход ад аднаго часовага пласту сьвядомасьці да іншага ў Бэнджы адбываецца нечакана і капрызна, хоць не зусім адвольна. Чытач, які набярэцца сьмеласьці прачытаць першую частку раману, несумненна прызнае, што і ў гэтым часавым

«гармідары» існуе, калі можна так выказацца, свая «ідыёцкая лёгіка». (Каб палегчыць арыентацыю для чытача, Фолкнэр кожны такі «часавы скок» у сьвядомасьці Бэнджы сыгналізуе ў кніжцы курсівам.)

Гэтая кароткая зацемка ня ставіць сваёй мэтай апавесьці чытачу, пра што апавядаецца ў «Гомане і ятры». (Калі б у сапраўднасьці гэткае заданьне было выканальнае ў дачыненьні да раманаў, дык навошта было б іх чытаць? Хапіла б, пэўна, нейкага рэзюмэ ці пераказу зьместу.) Гэтая зацемка, хутчэй за ўсё, перасьцярога, што маем дачыненьне зь цяжкім чытацкім заданьнем. І заадно – заахвочаньне, што «скурка вартая свайго вырабу», то бок, што час, прысьвечаны прачытаньню гэтай прозы, ня будзе страчаны.

Яшчэ адна рэч, відаць, патрабуе высьвятленьня для тых беларускіх чытачоў, якія глыбей не знаёмыя з ангельскамоўнай літаратурнай традыцыяй. Гэта – загаловак раману, які для сярэднеадукаванага ангельскамоўнага чытача суадносіць Фолкнэраву кніжку з магутным фрагмэнтам ангельскай паэзіі, маналёгам Макбэта ў пятай дзеі аднайменнай п'есы Ўільяма Шэксьпіра:

Tomorrow, and tomorrow, and tomorrow,
Creeps in this petty pace from day to day,
To the last syllable of recorded time;
And all our yesterdays have lighted fools
The way to dusty death. Out, out, brief candle!
Life's but a walking shadow; a poor player,
That struts and frets his hour upon the stage,
And then is heard no more: it is a tale
Told by an idiot, full of sound and fury,
Signifying nothing.

У перакладзе Ўладзімера Шахаўца, апублікаваным у Менску ў 1954 годзе, гэты фрагмэнт гучыць так:

Павольным крокам: заўтра, заўтра, заўтра,
Пляцецца дзень за днём, аж да апошніх
Складоў у кнізе нашага жыцьця.
А нашы «ўчора» асьвятлялі шлях
Вар'ятам к сьмерці. Дык згасай, агарак!
Жыцьцё – блукаючая здань, фігляр,
Што пакрыўляецца крыху на сцэне
І зьнікне назаўсёды; гэта казка,
Расказаная дурнем: многа трэску,
Ды сэнсу мала.

Асабіста мне гэты пераклад падабаецца, і калі б мяне папрасілі даць яму ацэнку паводле меркі, якую калісьці прыкладалі да мяне мае настаўніцы польскай і беларускай моваў, я б сказаў, што такая ацэнка бліжэйшая да чацьвёркі, чым да тройкі з плюсам. Адно бяда, што прыгожая шэксьпіраўская мэтафара – sound and fury – губляецца амаль дашчэнту ў Шахаўца, і яе нельга было зацытаваць, а давялося перакласьці нанава. Ад чаго, аднак, я на Шахаўца ня ў крыўдзе. Мне было прыемна паставіць словы «Гоман і ятра» ў загаловак свайго перакладу.

Прага, сьнежань 2004

Ян Максімюк
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к № 2 (36) - 2005

[image]

[image]

[image]

[image]

[image]2005

паэмыка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ЛЕАНАРД КОЭН

Леанард Коэн

знакаміты паэт, раманіст, аўтар і выканаўца песьняў. Нарадзіўся ў 1934 у Канадзе ў габрэйскай сям’і. Аўтар раманаў «Улюбёная гульня» (1963) і «Прыўкрасныя няўдачнікі» (1966), кніг паэзіі «Давай параўнаем міталёгіі» (1956), «Сальніца зямлі» (1961), «Кветкі для

Будучыня

Дай мне зноў разьбітых сноў,
Мой тайны храм, люстраны схоў –
Сумна ў катавальні. Дзе ахвяра?
Дай мне ўладу і кантроль
Над усім, што церпіць боль,
І кладзіся побач – гэта кара!

Зьнесла крэкам паўстрахі.
Што звычайныя грахі,
Што садомскі – ўсё адно з табой мне.
Дай мне зноў вялікі пост,
Генацыд і галакост:
Будучыня – проста сьмерць на бойні!

Усё на глум, на глум,
Былое – сьмецьце.
Толькі рэшткі,
Рэшткі ўсё віруюць увушшу.
Завея, завея ўва ўсім сьвеце
Й апрамецьце,
Як навала,

Зруйнавала ўшчэнт душу.
Мне крычаць: ПРЫЗНАЙ ВІНУ!
Але чаму адну?
Мне крычаць: ПРЫЗНАЙ ВІНУ!
Чаму ўсяго адну?

Я табе амаль ніхто,
Я нуль, падзелены на сто,
Маленькі вечны жыд, што піша Тору.
Я глядзеў на ўсё, што ёсьць,
І паўсюль адно мілосьць
Прарастае часам у прастору.

Вунь прыйшоў твой пасланец –
Расказаць, што ўсім канец,
Пасланец суворы й непадкупны.
Неба падае згары,
Д'ябал дыхае ўнутры:
Будучыня – бойня. Хто наступны?

І раптам лясьнецца заходні ўвесь канон,
Жыцьцё тваё пакоціць пад адхон:
Агні на трасах і пачвары наўздагон –
З танцорам у белым…
І ўбачыш галавою ўніз яе:
Сукенка да зямлі не дастае…
І ўсе падонкі вершаваньня,
Што скуголяць,
Як маньяк над мёртвым целам, –
З танцорам белым…

Дай мне зноў вялікі пост,
Генацыд і галакост,
Дай мне ўкрыжаваньне ў Хірасыме.
Зьнішчы новае жыцьцё,
Усё адно, чыё дзіцё, –
Будучыня здарыцца з усімі!

Гітлера» (1964), «Паразыты нябёсаў» (1966), «Энэргія рабоў» (1972) ды інш., а таксама шматлікіх музычных альбомаў, сярод якіх «Песьні Леанарда Коэна» (1967), «Песьні каханьня й нянавісьці» (1971), «Я – твой мужчына» (1988), «Будучыня» (1992) ды інш.

Ідзе вайна

Ідзе вайна між багачом і жабраком,
паміж кабетай і мужчынам.
Ідзе вайна між тым, хто грозіць кулаком,
і тым, хто кажа: ні пры чым ён.

А ты чаму ня йдзеш на вайну? Зьбірай валізку.
А ты чаму ня йдзеш на вайну? Вайна ўжо блізка.

Я ім кажу: «Са мной каханка і дзіцё».
Яны ў адказ: «Ня трэба казак!»
Яна заплача: «Ім пляваць на пачуцьцё».
Я растлумачу: «Абавязак».

А ты чаму ня йдзеш на вайну? Пасьцель – для хворых.
А ты чаму ня йдзеш на вайну? Ня дрэмле вораг.
А ты чаму ня йдзеш на вайну? Панюхай порах.

А ты мяне не пазнаеш:
маўляў, рамантыка люблю
свайго юнацтва.
А мне гавораць: «сьпі!» і «еж!»,
і я слухмяна ем і сплю,
а думкі пра вайну – адно вар'яцтва!

А ты чаму ня йдзеш на вайну? З крывёй і потам.
А ты чаму ня йдзеш на вайну? Вясельле – потым.

Ідзе вайна між багачом і жабраком,
паміж кабетай і мужчынам.
Ідзе вайна між даланёй і кулаком,
вайна між пальцам і курком,
між немагчымым і магчымым.

А ты чаму ня йдзеш на вайну? Вайна – твой шанец!

А ты чаму ня йдзеш на вайну? Пакуй свой ранец!
А ты чаму ня йдзеш на вайну? Хутчэй, засранец!

Кожнаму відно

Кожнаму відно, што падмануць карты.
Кожнаму відно – сплюнь цераз плячо!
Кожнаму відно, што дзяцюк быў варты
І дарма чакае з вайны дзяўчо.
Кожнаму відно, хто вярнуўся босы:
Жабракі галеюць, таўсьцеюць босы.
Кожнаму даўно
Гэта ўсё відно.

Кожнаму відно, працякае лодка.
Кожнаму відно, капітан – мудак.
Кожнаму паршыва на сто адсоткаў,
Нібы страціў бацьку, паршыва так.
Кожнаму відно, дзе чые кішэні,
Шакалядкі, ружы ды запрашэньні,
Фішкі ў казіно, –
Кожнаму відно.

Кожнаму відно, як мяне бязьмерна
Ты кахаеш, дзетка, на старане.
Кожнаму відно, як была ты вернай:
Тры-чатыры ночы – дый то ня мне.
Кожнаму відно, што вакол нямала
Тых, перад якімі ты ўсё здымала,
І тваё кіно
Кожнаму відно.

Кожнаму відно,
Кожнаму відно,
Кожнаму даўно

Гэта ўсё відно!

Кожнаму відно – сёньня ці ніколі.
Кожнаму відно, што ня я – дык ты.
Кожнаму відно – жыць яшчэ даволі:
Хопіць алькаголю і наркаты.
Кожнаму відно – ў нас усё цудоўна:
Чорны Джо зьбірае й далей бавоўну
Нам на палатно –
Кожнаму відно.

Кожнаму відно – наступае голад.
Кожнаму відно, што ідзе Чума.
Кожнаму відно, што мілосьць – ня волат:
Двум каханкам трупамі быць двума.
Кожнаму відно, што ўвесь сьвет – магільнік,
Толькі ў тваім ложку стаіць лічыльнік,
Лічыць усё адно,
Кожнаму відно.

Кожнаму відно, што ў шызе ты профі,
Трубіш па жыцьці – і жыцьцё ў трубу:
Ад крыжовых мук на тваёй Галгофе
Да ружовых сук з пляжаў Малібу.
Кожнаму відно – гэта ўсё ўтрасецца,
Толькі паглядзі на Сьвятое Сэрца:
Кожнаму відно –
Выбухне яно!

Алілюя

Таемны голас. Вы – удвох.
Пяе Давід і чуе Бог,
Астатніх гэта песьня не хвалюе.

Знаёмы лад. Вядомы сьпеў.
Так цар зьбянтэжана хрыпеў,
Усё, што меў, уклаўшы ў Алілюя.

Ты прагнуў веры? Вось яна:
На даху ў ваннай давідна
На трон і на жыцьцё тваё палюе.
Прывяжа да сваёй красы,
На кухні зрэжа валасы
І вып'е з тваіх вуснаў Алілюя.

Ты кажаш: хібнае імя.
Ды што ў імёнах, акрамя
Таго, за што й бязь імені люблю я.
Ня важна, грэшнік ці сьвяты,
Бо ў кожным слове чуеш ты,
Як вогнішчам палае Алілюя.

Як неслухмянае дзіцё,
Жыву навобмацак жыцьцё:
Раблю няшмат, з табою не махлюю.
Ды Госпад Песьні ўсё адно
У хвілю, калі ўсё чутно,
Ня словы чуцьме – толькі Алілюя.

Пераклаў з ангельскай Андрэй Хадановіч

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

2[image][image]2005

"да Зьместу"

паэмыка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Сяргей Астравец
Як мы збудавалі Бабілёнскую вежу

СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ
празаік, журналіст радыё «Свабода». Выдаў тры кнігі прозы. Жыве ў Горадні.

Вежа пачала будавацца нібы сама сабой: камень на камень, цагліна на цагліну. Усё ўзьнікла з фальклёрнага шэсьця, з карнавальнага сьвята, шматтысячнай пагулянкі і начнога фаервэрку. Айцы гораду ад празьмерных уражаньняў захварэлі, так бы мовіць, на мэсійнасьць. Усе рымы страцілі сваё глябальнае значэньне, ніхто больш нацыі не гуртуе, адно спрачаюцца на асамблеях у Нью-Ёрку пад сьцягамі на высозных флягштоках. Ну, а мы абвесьцім горад дружбы ўсіх народаў і паставім пасярод незвычайную вежу.

Будаваць пачалі не адразу. У крэсавякаў быў свой дом, яны раскашавалі, у прусакоў – кватэрка, на якой яны зайздросьцілі сваёй гістарычнай радзіме. Астатнія існавалі бяздомкамі. А ў горадзе захавалася месца, у самым цэнтры, дзе калісьці стаяў вялікі стары храм, на якім кожная ўлада вешала то крыжы разнастайныя, то зоркі, то маладзік, сярпы-молаты, а самая апошняя прывезла грузавік дынаміту і – лясь!

Месца больш выгоднага і прыдатнага не знайсьці. Народаў першым разам улады пазнаходзілі роўна тузін, таму будаваць пачалі менавіта дом-вежу на дванаццаць паверхаў. Зацьвердзілі

праект, каштарыс і кінуліся хуценька вытрасаць грошы зь бізнэсмэнаў: ахвяруйце, бо горш будзе. Вы што – супраць дружбы народаў? Ды ні ў якім разе: дружба-фройндшафт! Як у настальгічнай песьні колішняй: усягда мы ўмесьце – ГДР і Савецкі Саюз.

Гэта я ўжо потым даведаўся, што ня так гладка з праектам атрымалася. Спрэчкі напачатку здарыліся ў саюзе архітэктараў – наконт формы вежы, колькасьці паверхаў і вышыні столі. Паводле яшчэ абкамаўскіх стандартаў, нельга было будаваць столі, вышэйшай за 2.20, хіба толькі для інтурыстаў. Ну, а хто ж тады нашыя госьцейкі дарагія? Чыстай вады замежныя турысты, якія знайшлі ў нас другую радзіму. Таму што тут лепш, чым дома ў сваіх сызранях ды ленінабадах, пра гэта сам наш галава гаварыў.

Вежа атрымалася чатырохкутная – накшталт баявых, пры дапамозе якіх бралі ў аблогу гарады і замкі пэрсідзкія цары. Ну, а папярэднічалі цэгле і цэмэнту спрэчкі пра форму вежы, пра што я казаў ужо. Круглы данжон стаяў калісь справа ад нашай замкавай брамы, на гары, нагадвалі адныя. А хто яго бачыў? – пярэчылі іншыя. А Белавеская? Таксама круглая. Зікурат – ня круглы, а Бабілёнская вежа была зікуратам. А як жа славуты Пітэр Брэйгель Старэйшы? Усе ведаюць Бабілёнскую менавіта зь ягонай карціны.

Спрэчкі пра чыстае мастацтва ў дойлідзтве не датычылі саміх нацменаў, якія сталі чакаць ордэры на жытло. А будаўнікі сказалі айцом гораду, што круглай вежы ім чакаць удвая болей, чымся звычайнай чатырохкутнай. Айцы разгарнулі Кнігу Царстваў: «Цар Саля-мон ста-віць храм Гос-паду Бо-гу ў Э-ру-саліме», – прасылябізавалі тэкстоўку пад вядомай гравюрай 1518 году. Штось падобнае і распачалося: чалавек у кароткім плашчы, пэўна ж, дойлід, у кароткіх жа нагавіцах з матузкамі, у куртцы з гафрыраванымі рукавамі паказвае вяльможнай публіцы, як адбываецца будаўніцтва, і тлумачыць, якой будзе вежа, бо перш будуюць менавіта вежу ці, скажам, званіцу.

Вежа ў гатычным стылі. Зьнізу каменячосы апрацоўваюць каменныя брылы, кірка, дзежка з цамянкай. На вежы муляры. Лябёдкай узьнімаюць начоўкі з цамянкай, падганяюць камяні.

«Майна-віра!»

«Віра-майна!»

«Ня стой пад стралой!»

«Ня сьпі ў шапку!»

«Ня ляскай зяпай!»

Моўная амаль што ідылія неўзабаве ператварылася ў звычайную мулярскую лаянку, безь якой не будуецца сёньня ніякая камяніца ці гмах, а пагатоў вежа. Лаяліся са смакам, павынаходніцку. З эпітэтамі, сынонімамі і мэтафарамі. А таксама зь літотамі, сынэкдахамі і мэтаніміяй. Цэгла хутчэй клалася, хаця й не найлепей – бо як атрымаецца. Пагатоў учынілі спаборніцтва на хуткасьць сярод вучняў пэтэвэ. Плацілі на будоўлях кепска, таму прысылалі арыштантаў-сутачнікаў і былых вязьняў, якіх ніхто ня браў.

Гарадзкі галава спадар Антончык любіў наведваць новабудоўлю, браць дэпутатаў, журналістаў, замежных прадстаўнікоў і, асабліва, рэдкіх дыпляматаў. Разам са сьвітай ён уважліва слухаў тлумачэньні архітэктурна-будаўнічага начальства. Зусім як на старажытнай кніжнай гравюры. Кватэры будавалі з новым ухілам – з павялічанай плошчай, з большымі кухнямі і ваннымі, са шклопакетамі. Галава тлумачыў пісакам і чужаземцам, што будзе вежа дружбы розных народаў, першая і адзіная пасьля Бабілёнскай.

Фальклёрнае шэсьце наступным годам крочыла міма расквечанай сьцяжкамі і транспарантамі будаванай вежы, вітаючы муляроў. Яны з рыштаваньняў махалі рукамі: не перашкаджайце працаваць! Калёна ў вянках і стужках, у экзатычных строях, капелюшах і кучомках, сьпяваючы і танцуючы, не магла стрымацца ад абмеркаваньня: каму які дастанецца паверх? Большасьці былі даспадобы толькі другі-трэці, ад першага і апошняга ў думках адмаўляліся ўсе рашуча.

Калі будаўнічыя рыштаваньні далезьлі амаль да дванаццатага, у кватэрным аддзеле пачалі дзяліць шкуру будучага

мядзьведзя. Ад дружбы народаў не засталося ані званьня. У барацьбе за паверхі ніхто не згаджаўся прайграваць. Тады знайшлі пункт адліку, крытэр: адныя народы ў горадзе пераважалі, іншыя ўяўлялі нейкія неістотныя лічбы, джыгіт у кудлатай кучме ўвогуле крочыў у калёне аднаасобна, хаця ў думках ён меў цэлы паверх і пачынаў пакрысе разважаць пра гарэм.

Празрысты барабан з паперкамі, першаклясьнікі з бантамі, журы пры гальштуках. Лёсаваньне паверхаў адбывалася тамсама, дзе й розыгрыш лятарэі – у палацы культуры з грувасткімі дарычнымі калёнамі. Незадаволенымі засталіся ўсе, так заўжды на дурніцу бывае. Адныя сталі патрабаваць па два паверхі на будучыню: нас шмат. Пачаліся пераробкі ўнутры: нехта хацеў некалькі прыбіральняў, камусьці заманулася выкінуць ванну і зрабіць душ, іншым абавязкова спатрэбілася бідэ. Большасьць пачала шкліць балконы, а некаторыя спрабавалі зрабіць хляўчук, галубоўню або бусьлянку. Індусы праглі трымаць карову, а прававерныя хацелі, каб вокны глядзелі ў бок Сьвятога места. Ня дом, а гармідар.

Папраўдзе, усіх паверхаў атрымалася трынаццаць, на апошнім зрабілі кухню і банкетную залю – для вясельляў і нацыянальных сьвятаў. Пра гэта на адкрыцьці з гонарам прамаўляў гарадзкі галава, настойліва паўтараючы, што ня супраць пакаштаваць стравы розных народаў. Уперад, як перарэзаць чырвоную стужку, гаварылі ўдзячныя нацмены, а адразу за галавой – бацюшка, які важка мовіў, што біблейская вежа была «няправільная», таму Бог яе разбурыў. Будаўнікі бо са сваёй «майнай-вірай» лезьлі на неба. А цяперашняя вежа пастаўлена дзеля дружбы народаў, якой больш нідзе няма.

Мясцовае тэлебачаньне зь іншымі рупарамі толькі што языкі не намулялі, цэлымі днямі паўтараючы, што такой вежы і такога сьвята нідзе больш няма. Банкетная заля, праўда, усім перашкаджала па чарзе. Адны сьвяткавалі вясельле або дзень Сьвятарнай Перамогі, а ў іншых здараўся курбан-байрам, рамадан, кітайскі новы год, угодкі Хо Шы Міна, дзень Гогі і Магогі, сьвята зялёнага кракадзіла і кучкі. Заля то пуставала,

то яе разрывалі на кавалкі. Вежа то спала бяз задніх ног, то барабаніла музыкай і танцамі, сьпявала да зарніцы. Атрымаўся Бабілёнскі інтэрнат. Некаторыя пачалі абменьваць кватэры на спакайнейшы раён, іншыя здавалі на суткі за баксы, нават зь Сярдзючкай, якая сваімі гіпэрцыцкамі і перчанымі тостамі весяліла публіку.

Мацаваньне вежавай ідэі было прызнана дзяржаўным прыярытэтам, і саму вежу пачалі надбудоўваць. Зноўку зьявілася рыштаваньне, будаўнічыя краны, «майна-віра!» і «ня ляскай зяпай!». Кожны год на фальклёрным сьвяце зьяўляліся новыя нацмены, якіх называлі «народамі краіны» дзеля лічбаў. Цяпер кожнага, каго раней называлі «афраазіятамі», сустракалі на вакзале ўсьмешкамі і абдымкамі. У кожнага пыталі нацыянальнасьць, бо ў пашпартох пайшла мода не пісаць.

Раней на мяжы ў лесе лавілі азіяцкіх уцекачоў – палявалі на іх з пражэктарамі, са зброяй, з сабакамі. Цяпер – госьцейкі дарагія, рады вас вітаць на нашай гасьціннай зямельцы. Чым хата багата – тым рада. Можа, хто згаладнеў, а каму, можа, чарку наліць ды скварку закусіць? На ручніку хлеб-соль пад нос. Афраазіятаў раней – у кутузку без размоваў і дэпартавалі. Цяпер – не. Усіх – у вежу, самых экзатычных – у найлепшыя кватэры. Вежа – гэта каб усе мовы ў адную зьліліся, гэтым займалася ідэалягічная ўправа разам з рэлігійным дэпартамэнтам.

У вежы новых парушальнікаў мяжы чакалі падарункі: пампэрсы, наборы пасьцельнай бялізны, навюткія пашпарты з «капустай» і прапіскай, савецкае шампанскае на кухні, электраімбрыкі і пыласосы, ровары мясцовай вытворчасьці. Пабудавалі вежу, у рэшце рэшт, ажно да аблокаў, самі не чакалі, што так атрымаецца. А тут землятрус зьнянацку, штуршкі з-пад Кёнігсбэргу: шафы хісталіся, посуд біўся. Зь верхніх паверхаў далі лататы. Хто ведае: раптам мацней страсяне альбо Бог паўторна зруйнуе? Сталі жыць як на вугольлі, пра сьвяты забыліся.

А ўлады нашыя, трэба сказаць, вельмі змагаліся супраць глябалізму і пашырэньня НАТО на ўсход. І ўсё манэўры праводзілі, штораз буйнейшыя, бразгалі сваёй даваеннай

зброяй. Ну й пачалі тут «жалезную заслону», але толькі ў небе, каб «паветраных піратаў» зьнішчаць, а таксама каб ракетамі – па нябачных партызанах і тэрарыстах, на якіх мода пайшла. Выпрабоўвалі новую ракету саманаводную ўласнай вытворчасьці, «зямля–неба», а яна не знайшла паветраных піратаў і паляцела ў бок гораду...

Пра разбурэньне нашай Бабілёнскай вежы нават натаўскія газэты паведамілі, якія ігнаравалі яе будаўніцтва. Падкія да сэнсацыяў, яны ахвотней пісалі пра самую высокую і вялікую калядна-навагоднюю яліну – тэлевежу ля Гедымінавай гары, аздобленую гірляндамі зь лямпачак. Газэта міністэрства абароны «Слава Богу Вайны» паспрабавала дэзавуяваць паведамленьні, сьпісаць на тэрарыстаў, а ўрэшце махнула рукой і заклікала ўсіх прыйсьці на рэфэрэндум і сказаць «хай» паўторнай адбудове нашай вежы. Раіцца з народамі стала модна.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

[image]

[image]

[image]

[image]

2005

"да Зьместу"

паэмыка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Пэтэр Слотэрдайк Прыйсьці на сьвет - прыйсьці да мовы Франкфурцкія лекцыі

Мастацтва шырыць?
Не. Але ідзі з мастацтвам у сваю самую асабістую праблему. І вызвалі сябе.

Паўль Цэлян, «Мэрыдыян»

1. ТАТУЯВАНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

«Паэзія, – казаў паэт Паўль Цэлян, – паэзія не навязваецца, яна падстаўляецца». Спадарыні і спадары, я ня ведаю іншага сказу, які б гэтак сама правільна і патрабавальна называў справу літаратуры яе імем. Правільным гэты сказ ёсьць перадусім таму, што ён зьвязвае мову паэзіі з жэстам выхаду наперад. На мой слых, ён таксама натрапляе на правільны тон у тым, што сьцьвярджае раманскую ідэю паэзіі: свабода мастацтва існуе пры ўмове, што яно не пачынае панаваць. Перакладзеце словы

ПЭТЭР СЛОТЭРДАЙК (нар. у 1947 у Карлсруе) – разам з Юргенам Габэрмасам найвядомейшы ў сьвеце нямецкі філёзаф. Аўтар шырокавядомай працы «Крытыка цынічнага розуму» (1983). З 2001 году займае пасаду рэктара Вышэйшай школы дызайну (Hochschule fur Gestaltung) у горадзе

Цэляна на французскую мову, і вы зразумееце, наколькі дрэнна. Калі гэты сказ пачуваецца ў раманшчыне: *la poésie ne s’impose pas, elle s’expose* – адразу становіцца бачным ягонае паходжанне з дасціпнай гульні словаў, і, як гэта часта бывае ў французскай мове, рызыка глыбакадумнасьці парыруецца элегантнасьцю. Такім чынам, гэты сказ сфармуляваны на нябачнай нямецка-французскай мяжы, у тым месцы, якое, як я даўно мяркую, можа быць зонай найбольш плённых сустрэчаў. Той, хто прамаўляе з гэтага памежжа, мае шанец узяць удзел у абмене тэмпэрамэнтамі. Іншым разам тэўтонскі дух ахоўвае элегантнае маўленьне ад павярхоўнасьці, элегантнасьць, натомест, заўсёды выратоўвае глыбакадумнасьць ад самое сябе. «Паэзія не навязваецца, яна падстаўляецца» – гэта сказ, які вызначае крайнюю мерку для твораў ды аўтараў. Самападстаўленьне, пра якое ідзецца, невыпадкова ня мае пры сабе адрасата; калі паэзія падстаўляецца, то, перадусім, не суду публікі, ухвале альбо ганьбе сучаснікаў ці аналізу і неразуменьню нашчадкаў. Само сабой зразумела, гэтыя элемэнты належаць да ўмоваў літаратуры, і тэкст без падстаўленьня чытачу быў бы гэтак сама страчаны, як немаўля Майсей у сваёй калысцы з трысьнягу без фараонавай дачкі, якая апякуецца кінутай істотай. Але самападстаўленьне паэзіі, пра якое гаворыць Цэлян, у сілу сваёй абсалютнай прыроды сягае вышэй за камунікацыю, яно не вычэрпваецца гульнёй пасылу і прыёму. Паэзія падстаўляецца, бо яна ня менш як аналёгія экзыстэнцыі – безаб’ектнае, адкрытае рызыкаваньне. Слова «існаваньне», якім у нашым стагодзьдзі ахарактарызавалі анталягічную ўмову чалавека, для таго, хто ўслухоўваецца ў крыніцу яго значэньня, утрымлівае дакладнае рэха самападстаўленьня паэзіі паводле Цэляна. Калі паэзія падстаўляецца і калі існаваць азначае «высунуцца» ў сусьветную ноч, то экзыстэнцыя і паэзія салідарныя ў сваіх асноўных рухах. Самападстаўленьне і самавысоўваньне ёсьць канстытуцыйнымі рухамі чалавека. Толькі ў іх адбываюцца жэсты «сапраўды мэтафізычнай дзейнасьці». Гэта відавыя жэсты чалавека як паэтычнай жывёлы. Празь іх істота, здольная ператварыцца ў пачвару, набывае легкадумнасьць ня быць жывёлай. Мастацкі твор становіць сьвет, кажа Гайдэгер; паэзія падстаўляецца сьвету, адказвае Цэлян – без сумневу, гэтыя сказы сугучныя. Філёзаф і паэт з розных бакоў узыходзяць на

Калі гэты сказ пачуваецца ў раманшчыне: *la poésie ne s’impose pas, elle s’expose* – адразу становіцца бачным ягонае паходжанне з дасціпнай гульні словаў, і, як гэта часта бывае ў французскай мове, рызыка глыбакадумнасьці парыруецца элегантнасьцю.

адну і тую ж арэну. На гэтай сцэне гавораць пра стан сьвету ў глыбокім сэнсе слова.

У гэтых уводных развагах, шаноўнае спадарства, я спасылаюся на Цэлянавы і Гайдэгеравы ідэі не без абмежаваньняў у выпадку першага аўтара і не без агаворак у выпадку другога. У мяне ў думках няма наўпрост зьвязваць мае папярэднія пісьмовыя творы з тым, што Цэлян разумеў пад паэзіяй – гэта значыла б ня толькі няправільна разумець вялікага паэта, гэта было б тыпалягічнай памылкай, таму што мае моўныя спробы належаць не да лірыкі, а да філязофскай лёгкай прозы альбо да займальнай містыкі. Што да Гайдэгера, «на жаль, найвялікшага мысьляра гэтага стагодзьдзя», як сказаў Эмануэль Левінас, дык тут вялікая адлегласьць вынікае ўжо з манумэнтальнасьці і цьмянасьці ягонай творчасьці. Калі я і адчуваю блізкасьць да ягоных пасылак, дык заўсёды празь літаральнае і ўпартае чытаньне. Я бачу ў ім ня толькі героя мысьлярства ў рангу сучаснага Плятона, маўленьне якога працягвае бітву тытанаў за сэнс быцьця, але і падсьвядомага Ўленшпігеля[1] , пры якім філязофія пераходзіць у эпоху сваёй самапародыі. Ад Гайдэгера здольнасьць рабіцца сьмешным ёсьць паказьнікам таго, што філязофскае мысьленьне перастае адварочвацца ад астатняга сьвядомага жыцьця. Высокая крайнасьць вяртаецца ў нізкае, артадаксальнае ператвараецца ў парадаксальнае. Для мяне з гэтага вынікае, што трэба пачаць вызваляць Гайдэгерава мысьленьне ў такую мову, у якой яно было б слушнейшым, чым у яго ўласнай. Тут трэба ня толькі ўрбанізаваць правінцыю; тут трэба таксама разьвесяліць абстрактную пакуту і насяліць людзьмі фальшывую самоту.

Спадарства, я цытаваў Цэляна і згадваў Гайдэгера таму, што бачу ў іхных сьмелых паэталягічных і філязофскіх тэзах шчыліну для асабістага ўнёску. Давайце на нейкі час пакінем вышыні паэзіі і мысьлярства. Хай сабе быцьцё азначае выстаўленасьць у нішто; я таксама ня маю нічога супраць таго, што паэзія не навязваецца, а падстаўляецца. Але нязначны ўнёсак пра самападстаўленьне набудзе зусім штодзённы сэнс, калі ён будзе вызвалены ад мастацка-анталягічных афарызмаў. Я думаю пра нешта накшталт ўяўляльную рызыку, якую зьведвае кожны мастак, публікуючы свой твор. Калі аўтар рызыкуе высунуцца зь нейкай нішы, то

[1] Ўленшпігель – персанаж нямецкага народнага эпасу, хітрэц, дасьціпнік і вясёлы падарожнік.

ён без сумневу падстаўляецца, але не таму, што паэтыкавыгрышаў. падстаўляецца; хутчэй таму, што аўтар хоча навязацца, але яшчэ больш з тае прычыны, што ён, мастак, альбо яна, мастачка, не прыйшлі б «да сябе», калі б яны ня вызвалілі зь сябе свае моўныя памкненьні – я пакідаю адкрытым пытаньне, куды прыходзіць той, хто падстаўляецца ў гэтым сэнсе.

Гэтак, спадарства, да рызыкаў, зьвязаных з самападстаўленьнем у якасьці нямецкамоўнага пісьменьніка, здаецца, належыць чытаньне лекцыяў па паэтыцы. Той, хто гаворыць з гэтага франкфурцкага подыюму, як правіла, падстаўляецца не як у першы раз, але азіраецца на гісторыю свайго самападстаўленьня. Тут маюць слова тыя, хто ўжо аднойчы прамаўляў у іншым месцы. У іншым месцы і раней яны мелі слова, таму што не маглі не падставіцца, і таму што ўпарта дабіваліся, каб іх маглі чуць і чытаць. У літаратуры мае моц панятак, супрацьлеглы французкай прымаўцы *«on ne peut pas кtre et avoir été»*, няможна адначасова быць і быць пабыўшы – не, быць можна толькі тады, калі ты ўжо быў, можна гаварыць толькі тады, калі ты гаварыў раней, можна падстаўляцца толькі тады, калі ты падстаўляўся раней – нават паберагчы сябе ў Франкфурце можна было б толькі ў тым выпадку, калі ты не бярогся раней.

Тут мы сутыкаемся зь ляйтматывам гэтых лекцыяў: калі ёсьць чырвоная нітка, якая зьвяжа сёньняшні выклад з наступнымі, то клубком, зь якога яна раскручваецца, ёсьць ідэя, што паэтыка самападстаўленьня мусіць быць разгорнутая як паэтыка пачынаньня. Гэта лягчэй сказаць, чым падумаць. Таму што і пачынаць можа толькі той, хто ўжо пачаў, ці, можа, лепей: хто ўжо быў пачаты? Калі ласка, ня думайце, спадарства, што розьніца паміж «пачаў» і «быў пачаты» ёсьць толькі граматычным фінтом. Яшчэ сёньня і перадусім на наступных лекцыях я спадзяюся прадставіць аргумэнты, якія ўказваюць на наяўнасьць сапраўднай праблемы – пры ўмове, што ёсьць воля да праблемы, таму што ў філязофскіх рэчах выбіраць даводзіцца ня толькі рашэньні, але і пастаноўку праблемаў.

Пытаньне, як пачынаюць пачынаць, я хачу выкласьці так, каб яно дазволіла даць адначасова асабісты і агульны адказ. Я

казаў, што аўтар пачынае сябе, падстаўляючыся, але ён здольны падставіцца толькі таму, што ён ужо падстаўляўся. Калі б мы выправіліся на пошукі нейкага абсалютнага пачатку, то пусьціліся б у бясконцы рух, вядомы лёгікам як бясконцы рэгрэс. Знайсьці мэтадам дэдукцыі нейкі першы спантанны пачатак і патрабаваць ад чорта зьвіць зь пяску моцную вяроўку – задачы роўнай ступені цяжкасьці. Але апроч таго, гэтыя патрабаваньні былі б яшчэ і залішнімі. Таму што аўтарам, як і астатнім існуючым, дастаткова ўключыцца ў свой бягучы пачатак, каб здаць сабе справу з свайго быцьця. На працягу ўсяго нашага жыцьця, спадарства, мы знаходзімся ў становішчы людзей, якія спазьняюцца ў тэатар – у перапынку паміж актамі дзьверы яшчэ раз напалову прачыняюцца, мы задыхана праціскваемся ў залю і ў цемры шукаем нашае месца. Пачатак прадстаўленьня мы прапусьцілі, і ўсё, што нам застаецца ў гэты момант – сачыць за хадой падзеяў як мага больш пільна. Падумайце, можа, гэта адно з правілаў гэтай гульні – тое, што здагадвацца пра яе пачаткі можна толькі заднім чыслом. Сапраўдны пачатак ніколі не яўляецца нам іначай як у выніках ужо-пачатасьці. Вось ужо й зморшчыны на твары, вось ужо й складкі ў кутках рота, вось ужо й страх сядзіць у патыліцы, сьпіна стала нягнуткай, дрыжыкі ў каленях, напяцьце ў сэрцы. Сказаўшы, што расколіна сьвету праходзіць пасярэдзіне сэрца паэта, Гайнрых Гайнэ сказаў тое, што знайшоў – ягонае сэрца пазнала сябе няйначай як праз уласную разьбітасьць. Гэтак наша сучаснасьць засланая гіерогліфамі ранейшых пачаткаў, якія трэба расшыфраваць і асучасьніць, каб мець што-небудзь сказаць.

Ня ведаю, ці згадваеце вы, спадарства, той час, калі большасьць з нас яшчэ мела фізіягнамічны зрок – я маю на ўвазе бязьлітасна відушчы ўзрост перад пачаткам сэксуальнасьці і ўяўленьня, узрост, калі бачыш зь першага позірку, хто перад табой – ягоны характар, ягоныя прыхамаці, ягоную гісторыю, ягонае іство, ягоную будучыню, усё, зграмаджанае ў адным гіерогліфе цела, які стаіць перад намі цалкам чытэльны; пра яго ня трэба нічога казаць, бо ён становіць канцэнтрат усяго таго, што само сябе абазначае і выдае. Рэшта гэтага спосабу бачаньня яшчэ захавалася ў гульні, калі дарослыя чытаюць уласныя рысы – адзін позірк у люстра, і адразу пазнаеш візаві,

ты ведаеш яго аж занадта добра, баразёнкі, шнары, гладкія месцы, сьлед гадоў – яны незаўважна і жыва расказваюць раман пачаткаў, падрабязнага ўсьведамленьня якіх у нас зазвычай няма.

Спадарыні і спадары, я ахвотна гуляю з уяўленьнем, што кожны чалавек увасабляе сабой склад, непаўторнае ўнікальнае зрашчэньне зычных і галосных, жывы склад па дарозе да слова, да тэксту. Кожны з гэтых складоў вырас і індывідуалізаваўся ў вобраз, які не паўтараецца ніводным іншым, як у старых дубровах Поўдня ніколі ня ўбачыш двух аднолькавых камлёў. Да гэтага ўяўленьня жывых складоў я дадаю яшчэ дапушчэньне, што гэтыя склады ня могуць чытаць сябе самі, бо ня маюць органу, які забясьпечвае непасрэднае самаўспрыманьне. Што дапамагае гэтым жывым і схаваным ад саміх сябе складам натрапіць на сьлед уласнага гучаньня, дык гэта пісьменнасьць. Гэта яна прапануе ім мэдыюм, з дапамогай якога яны могуць адбівацца ў «вонкавым» матэрыяле, і так праз шматлікія спробы пісьмовага выражэньня і камбінацыі з суседнімі складамі ўзьнікае прыпадабненьне да гукавога вобразу схаванага складу жыцьця. Само сабой зразумела, нічога падобнага Цэлян сабе не ўяўляў, кажучы, што паэзія не навязваецца, а падстаўляецца. Але мне не здаецца цалкам несправядлівым надаць выслоўю пра самападстаўленьне яшчэ і тое значэньне, якое ўтрымліваецца ў гульні думак пра склады-індывіды. Калі ты – склад, то было б натуральным напісаць сябе, а для складу, які шукае сваё гучаньне, сваё пісьмовае выражэньне, сваю матэрыялізацыю, сваіх правільных суседзяў, выраз «ён падстаўляецца» асабліва дарэчны.

Я не хацеў бы залішне эксплюатаваць гэтую фантазію пра склады. Мой намер у тым, каб зь яе дапамогай абудзіць ідэю, якую можна давесьці да яснасьці і нефантастычным шляхам. Натуральна, што індывіды ня ёсьць жывымі складамі, але яны ёсьць жывымі субстанцыямі, дыхаючымі тэмамі, якія распрацоўваюць самі сябе, часам падрабязна, часам ляканічна. Але і гэта гаворыць яшчэ занадта мала. Бо кожнае жыцьцё па-свойму знаходзіцца ў скачку да мовы – яно ўжо напоўненае гукамі, словамі, базавымі вобразамі і сцэнамі, пры дапамозе якіх выпісвае тэкст свайго штодзённага раману. Магчымасьць

пачаць, якую асабліва добра спазнаюць у сабе літаратары-пачаткоўцы, грунтуецца ва ўжо-пачатасьці перадлітаратурнага тэксту жыцьця. Ён навобмацак прапісваецца ад першага радка першай кнігі, ён робіцца больш ясным, ён ампліфікуецца і ўзмацняецца, падымаючыся да поўнай чытэльнасьці. Толькі таму, што мы ўжо знаходзімся пасярод аповеду, мы можам пачаць апавядаць нашу гісторыю. Мы ёсьць, беручы *status quo*, чым заўгодна, толькі не некранутымі аркушамі. Зь першага ўдыху, нават з самых раньніх стадыяў унутрыматачнай ночы кожнае жыцьцё прыдатнае да пісьма як васковая дошка – і чульлівае як найадчувальная фатастужка. На нэрвовым матэрыяле высякаюцца непаўторныя характары індывідаў. Тое, што мы называем індывідам, ёсьць спачатку толькі жывым пэргамэнтам, на якім пісьменнасьцю нэрваў з сэкунды ў сэкунду запісваецца хроніка нашай экзыстэнцыі. Можна нават сказаць, што надрукаваныя чорным па белым кнігі ёсьць таму, што існуюць індывіды, якія зьвяртаюць навонкі сваё нэўралягічнае быцьцё-кнігай. Сьпісаныя аркушы аднаго дня пачынаюць гартаць самі сябе і робяцца пісьменьнікамі.

Спадарства, я не магу падабраць да ўсіх тых надпісаў, якія робяцца на кожным жыцьці ад самага пачатку, больш трапнага азначэньня, чым «татуяваньне». Я ўжываю гэтае слова мэтафарычна, ня думаючы пра малюнкі на скуры пілігрымаў Сярэднявечча альбо наколак маракоў, дзівакоў, актораў ды фэтышыстаў, якія з канца XVIII стагодзьдзя саступалі спакусе насіць пад скурай незмывальныя выявы. Тое, што ўяўляецца мне – гэта татуіроўкі душы, якія падказваюць нам нашы падставовыя словы і выпальваюць у нас нашы падставовыя вобразы; гэта татуіроўкі нэрваў, наколатыя ў нас у якасьці сэнсавых асацыяцыяў і пракладзеных пераживаньнямі шляхоў, гэта энграмы, якія вызначаюць нам сыгналы трывогі і сыгналы да дзеяньня, да адступленьня і настальгіі. З гэтага гледзішча было недастаткова расказаць пра сьпісаныя аркушы, якія пазьней замяняюцца ў тых, хто іх сьпісвае. Тое, што прымушае пісаць, ня ёсьць нейкай папярэдне ўведзенай праграмай, ня ёсьць чым-любя вывучаным. Падставовыя словы паэзіі ўтвараюцца па-над экзыстэнцыйнымі татуіроўкамі, якіх любое выхаваньне ня можа цалкам схаваць і любая размова ня можа цалкам змаўчаць. Паэзія прамаўляе з апёкаў душы, з наколатых

пад скуру знакаў. З гэтымі раньнімі знакамі зьвязана таксама і разьвітае літаратурнае маўленьне, яны – пасьведчаньне аб прыняцьці пісьменьнікаў у быцьцё. Дзіця, якое апяклося, баіцца агню, але татуяванае дзіця прывязанае да літараў, не, літары прывязаныя да яго як character indelibilis, незьнішчальныя, як непазбыўная пячатка, якая сьведчыць пра пэўны рытуал хрышчэньня. Таму для пісьменьнікаў, перафразуючы дэвіз псыхааналізу, слушнае правіла: там, дзе была татуіроўка, паўстане мастацтва, там, дзе было выпаленае кляймо, паўстане мова. Аднак простае дэманстраваньне старых пазнакаў ня робіць літаратуры. Засвойваючы маўленьне, я атрымліваю таксама свабоду ад знакаў, якімі я ёсьць. Бадай што няма літаратуры без аўтэнтычнага татуяваньня, але татуіроўкі як такія ня ёсьць літаратурай – яны застаюцца манатоннымі сьлядамі непрамінулай мінуўшчыны, якія ўпарта паўтараюцца, пазачасавыя, як несьвядомае, і непапраўныя, як інстынкты. Але пазьней набытая альбо адваяваная дыстанцыя ад наколатых падставовых словаў забясьпечвае прыток новых знакаў, празь якія яўляецца сьвет, каб ператварыцца ў вольна прамоўленае. Чым больш новых знакаў сьвету дадаецца, тым больш блякнуць наколатыя даўней, і тое, што мы можам прамовіць, да непазнавальнага аддаляецца ад таго, што прамаўляе само сябе на нашым уласным целе. Нарэшце, у цалкам замененым у мову сьвеце адсунутае гаварэньне ўжо робіцца самацечным – уключыце любую радыёстанцыю, спадарства, адкрыйце любы ілюстраваны часопіс, і вы зразумееце, што я маю на ўвазе: неабавязковасьць на ўсіх каналах, легкамоўнасьць з кожнай рэдакцыі. Як толькі адвольнае гаварэньне стане ўсюдыісным, можа паўстаць і патрэба ў адкрыцьці сьвету аўтэнтычных татуіровак. Але ў гэтым выпадку пра іх ідзецца без мэтафар. Там, дзе панує новабуржуазная балбатня, узьнікае прага да істотных знакаў, крывавых парэзаў і апёкаў экзыстэнцыі. Вядома, што татуіроўка бяз мовы – гэта манатоннасьць, але мова без татуіроўкі – гэта адвольнасьць, і хто з уласнага досьведу спазнаў, што адвольнасьць ёсьць большым злом, той можа быць гатовы пайсьці на гвалтоўную манатоннасьць рэдукцыяў да непазбыўных апазнавальных знакаў – гатовы да скальпэля на ілбе ды атраманту пад скурай.

Упершыню ідэю адкрытага татуяваньня ў сваіх мастацка-

крытычных разважаньнях ужыў Гуга Баль, у паэталягічным паквітаньні з дадаісцкім фарсам. Ён думаў, што адкрыў у ім жэст аднаўленьня сур'ёзнасьці. Пасьля сваіх выступаў у кабарэ «Вальтэр» у якасьці паэта-анамата[2], біскупа магіі і дэкляматара бязглузьдзіцы ён зразумеў, што адвольнасьць нельга пабіць іншай адвольнасьцю – бо абывацелі авалодваюць ёй усё лепш. Так ён вярнуўся да ідэі пісьменьніка як сьведкі.

«А можа, трэба, – пытаецца ён у сваіх дзёньніках, – змагацца на ілбе сэрца? Тады ўвесь сьвет бачыў бы: яму далося ўкалоць сэрца. І дзеля таго, што гэта было б атрамантава-сіняе, сьмяротна сіняе, аганізуючае сэрца, можна было б сказаць: яму далася ў галаву сьмерць. Нам трэба толькі запісаць, наколькі глыбока нас апанаваў жах».

[2] **Анатыятанць** — **суўтварайнік. Заўв. пераклад.**

На другой старонцы ён пазначае: «Татуяваньне, бадай, спачатна было гіератычным мастацтвам. Калі б паэты мусілі выразаць свае вершы альбо хаця б іх правобразы на ўласным целе, то стваралася б, бадай, менш. З другога боку, яны былі б менш здольныя абысьці першапачатковы сэнс публікацыі як формы самаагаленьня».

«Паэзія не навязваецца, яна падстаўляецца», – вучыў Паўль Цэлян. Мы ўжо ведаем, што паэзія падстаўляецца, бо яна сьведчыць пра штосьці, чаму былі падстаўленыя яе аракулы, перш чым справа дайшла да іх самападстаўленьня. Паэтычны твор мімаволі заўсёды блізкі да сьведчаньня, бо ён парафразуе, перапісвае і выяўляе старую энграму. Бо паэзія стаецца магчымая як мова толькі праз тое, што ў гульню яшчэ раз уступае татуяваньне. Літаратурная прастора адчыняецца шляхам перайманьня і апублікаваньня першасных татуіровак – пазьней у мяне будзе нагода прывесьці доказы таго, што гэта слушна таксама для драматычнай і філязофскай прастораў, дзякуючы ўзьнікненьню якіх адкрываецца сцэна ўсіх уласна чалавечых дзеяў. Калі літаратура сваёй рызыкай публікацыі аднаўляе рызыку татуяваньня, то яна тым самым пазьбягае адвольнасьці і дэкаратыўнасьці. Таму – нягледзячы на вялікія адрозьненьні – мастацка-мэтафізычная максыма Цэляна і мартыралягічная дэфініцыя літаратуры Гуга Баля роднасныя. Самападстаўленьне паэзіі і публікацыя як самаагаленьне –

зусім ня тое самае, аднак абодва гэтыя жэсты зьвязаныя пэўным мастком. І ў адным, і ў другім выпадку патрэбны выяўленчы жэст, перамога над задышкай, выхад наперад, выстаўленьне, выяўленьне і агучаньне, ахвяра таемнасьці на карысьць публічнасьці, адмова ад ночы і туману прыватнага на карысьць прасьвятленьня пад агульнымі нябёсамі.

Спадарства, збліжэньне Цэляна і Баля, ідэяў самападстаўленьня паэзіі і самаагаленьня паэтаў, было зробленае не без зацікаўленасьці з майго боку. У гэтым спалучэньні духаў мяне прыцягвае магчымасьць зьвесьці Цэлянавы ды Балевы думкі з пантамімічным паняцьцем ісьціны антычных кінікаў. Бо ідэя сьведкі, якая належыць Гуга Балю, ягоная візія татуяванага паэта, які фізычна, на ўласным целе выстаўляе напаказ свае першавобразы, ёсьць ня толькі пераносам прынцыпу пакутніцтва на эстэтыку; яна ўтрымлівае ў сабе таксама выразную спасылку на самаагаляльныя жэсты філёзафа-сатырыка з бочкі. Гуга Баль усьведамляў, што ён ёсьць нашчадкам Дыягена з Сынопу, адкрывальніка пантамімічных унівэрсаліяў. Праўда, ён таксама меркаваў, што ягонаму антычнаму папярэдніку жылося лепш, чым яго сучаснаму спадкаемцу, бо калі Дыяген пачаў зь ліхтаром шукаць людзей, грамадзяне Атэнаў мелі «дабрадушнасьць абвяшчаць пошукі Дыягена». Сучасных жа самаагаляльнікаў чакае небясьпека палітычнай і псыхіятрычнай сьмерці – трэба заўважыць, што Гуга Баль замоўчвае дабрадушнасьць нашай эпохі, у якой творцы пры жыцьці могуць увайсьці ў гісторыю мастацтва. Для пазьнейшага Гуга Баля, які ператварыўся з дадаіста ў тэоляга вызваленьня, творца, які паказвае ўзоры ранаў часу на сабе, ёсьць напалову кінікам, напалову пакутнікам. Выстаўляючы сябе на агульны агляд, ён удае зь сябе блазна і набліжаецца да сьвятога. З аднаго боку сваёй экзыстэнцыі ён нападае і агаляе, з другога боку ён сам – проста аб'ект нападу і агаленьня. І толькі дзякуючы таму, што ён ёсьць тым і тым адначасова, і што ён безабаронны ў абодвух выпадках, мастак у поўным сэнсе можа адпавядаць сваёй ролі сьведкі. Гэта значыць: у мастацтве ідзецца пра сьведчаньне і толькі потым пра стварэньне, а калі гіерархія гэтых функцыяў іншая, то мастацтва ператвараецца ў ідэю фікс, у наркотык, яно набівае сабе цану, яно навязваецца, яно робіцца інстанцыяй

распаўсюду бліскучай нішчымніцы.

Спадарыні і спадары, я мушу прызнацца, што, вывучаючы працы нямецкага дысыдэнта Гуга Баля, я даведаўся шмат пра тое, што мяне займала ў «Крытыцы цынічнага розуму». Балева спалучэньне блазна і сьведкі пераканала мяне ў тым, што кінізм – гэта вэрызм. Абодва ўвасабляюць дзьве неаддзяляльныя адна ад другой цяжкасьці пры адкрываньні ісьціны ўва ўмовах так званай высокай цывілізацыі. Але што ж тады такое вэрызм на самай справе? Як я магу ўбачыць у ім больш, чым варыянт натуралістычнага стылю, якому ў дзевятнаццатым стагодзьдзі ўдаўся прарыў і які спрамогся на колькі яркіх успышак у дваццатым? Яшчэ раней я выступаў за тое, каб бачыць у фэномэне кінізму нешта большае за блазенскую ці рэгрэсіўную інтэрлюдыю вялікай філязофіі аргумэнтаў. Я быў прапанаваў прызнаць за ім статус перадмоўнай маніфэстацыі ісьціны, формы шчырасьці, якая перакідваецца ў жэст. Кінічны жэст выяўляе пантамімічную якасьць *aletheia*. Цяпер калі я скажу, што кінізм ёсьць вэрызмам, то я павінен паказаць, што вэрызм – гэта штосьці большае, чым агідная натуралістычная манера, у якой сто гадоў таму знаходзілі задавальненьне некаторыя дробнабуржуазныя фанатыкі ісьціны. Падобна да таго, як кінічны аргумэнт быў уцялесьненай крытыкай ідэалістычнай абстракцыі, вэрызм распачынае крытыку эстэтычнай абстракцыі. Такім чынам, супольнае ў вэрызьме і кінізьме – іх выступленьне за ісьціну зьнізу і супраць прыгожай сьмерці зьверху. Калі б паэзія ні падстаўлялася, заўсёды аднаўляецца і гэтае выступленьне супраць фальшывай вышыні. Яна падстаўляецца супраць наперадведаньня зьверху, супраць самаўпэўненасьці, супраць эстэтыцызму – супраць культуры спадарынь і спадароў і супраць культуры рэдактараў зь іхнымі актывамі і крытэрамі, якія навязваюцца дзе толькі могуць. Але калі паэзія падстаўляецца, то яна робіць гэта перадусім дзеля сябе самой, таму што яна, са свайго боку, знаходзіцца пад сталай пагрозай сьмерці ад эстэтычнай абстракцыі. Зноў і зноў адраджацца пры дапамозе вэрыстычнай рызыкі – яе ўласнае непазьбежнае рызыкаваньне. Адраджацца азначае пачынаць спачатку, зноў і зноў губляць ключ, які ўчора яшчэ пэўна адчыняў замкі, азначае адыходзіць на пазыцыю перад тым, што ўжо мог,

агаляцца аж да татуіровак, манатонна ўрэзаных у маўклівае цела, гэта азначае гартаць старонкі да пачатку, да тых несьпісаных, на якіх мы яшчэ без майна і адчуваем пустэчу. У гэтым сэнсе мне здаецца легітымным сьцьверджаньне, што вэрызм толькі выпадкова і між іншым быў таксама і спосабам пісьменства, манерай, мастацкім стылем. Яго сапраўдны сэнс – быць пэрманэнтнай унутранай умовай мастацтва, бо няма такога мастацтва, якое б не спазнавала ў свой спосаб самападстаўленьня і высоўваньня твораў наперад. Калі б на франкфурцкай зямлі можна было ўжываць слова «анталёгія», ня будучы ўпэўненым у непаразуменьнях, то я не пабаяўся б сьцьвердзіць, што вэрыстычны рух у непрыхаванае сам па сабе ёсьць анталягічнай умовай мастацтва. Паэзія дае тое, што можна слухаць, выяўленчае мастацтва дае тое, што можна глядзець, літаратура дае тое, што можна чытаць – аднак гэтыя формы «дачы» ня толькі ёсьць адно зададзенасьцямі ў тым сэнсе, што твор, дрэнна ці добра, мусіць паддавацца рэцэпцыі. Насамрэч тое, што можна слухаць, бачыць і чытаць, даюць зададзенасьці, якія адначасова ёсьць выступленьнямі і выпадзеньнямі ў адкрытае; толькі ў вызваленьнях і адкрыцьцях сапраўды зьяўляюцца чутнае і відочнае як такія. Такім чынам, сутнасьць мастацтва сама па сабе ня ёсьць нечым мастацкім. Здаецца, мастацтва толькі этымалягічна ўзыходзіць да «магчы», на самай справе «магчы» само паходзіць ад «адкрываць». Таму ніводнаму віду мастацтва вэрыстычная рыса ня ёсьць цалкам чужой – бо тое, што падстаўляецца, у тым ліку лагоднае, безабароннае, ненаступальнае, адкрывае сьвет, і ўжо праз простае выступленьне само па сабе ёсьць адкрываючай сілай. Тое, што застаецца заўсёды віртуальным і схаваным, ніколі не кампрамэтуе сябе. Але мастацтва, як любое іншае тварэньне, пачынаецца з рашэньня скампрамэтаваць сябе і падставіцца рызыцы відавочнасьці. Нават біблійны Бог пайшоў на гэтую рызыку, невядома, ці ад адзіноты, ці ад пыхі, і праз наступствы гэтага несьмяротна скампрамэтаваў сябе – прынамсі, з гнастычнага пункту гледжаньня. Яшчэ раз хачу сказаць, што сапраўды шкада, што ў франкфурцкага мясцовага духу анталягічныя тоны выклікаюць такое раздражненьне – інакш на гэтым месцы можна было б разьвіць анталёгію публікацыі ды паказаць, што публікацыя – гэта больш чым камунікацыйны акт паміж пасылальнікамі і адрасатамі; можна было б асьцярожна

паказаць, што публікаваньне, у правільным разуменьні, ёсьць асноўнай падзеяй палітычнай анталёгіі, таму што толькі дзякуючы жэстам адкрыцьця, дапушчэньня, вызваленьня, высоўваньня і перадачы ствараюцца магчымасьці і прасторы для ўсіх паасобных так званых выяўленьняў і публікацыяў. Можна было б нават дадумаць да канца думку Цэляна з гледзішча анталёгіі падстаўленьня і патлумачыць вэрызм мастацтва з гледзішча анталёгіі нараджэньня – усё-ткі асацыяцыя людзей зь іхным родавым рухам гучыць не інакай, як нарадзіць на сьвет. Але, спадарства, я не зьбіраюся апякаць сабе пальцы аб прынцыповыя філязофскія пытаньні такога маштабу.

Так што я вяртаюся да вобразу татуяванага жыцьця. Я сказаў, што літаратура ёсьць, таму што існуюць індывіды, якія нібыта жывуць паводле правіла: там, дзе была татуіроўка, павінна стацца мова. Цяпер ня трэба шмат тэарэтычнай фантазіі, каб здагадацца, што паміж тым, што я называю татуяваньнем, і тым, што ў псыхалёгіі называецца падсьвядомым, павінна існаваць моцная ўзаемасувязь. Мост паміж абодвума панятками ідзе цераз тэорыю знакаў – ці, лепш, тэорыю значаньня. Ня можа быць выпадковым, што Гуга Баль у якасьці паверхні для накрэсьленьня свайго сьмяротна сіняга сэрца згадаў менавіта лоб. Лоб належыць да ўчасткаў цела, асабліва адкрытых для падсьвядомага – таму што ілбам уласьціва ніколі ня бачыць саміх сябе. Яны зьвернутыя толькі да іншых, даючы такім чынам прыклад дзіўнага факту: няма нічога публічнейшага, чым нябачнае мне самому. Тое, чаго я сам ня бачу, *a priori* падстаўленае іншым. Людзі ўрастаюць у сваю індывідуальнасьць не інакай, як навучаючыся разумець розьніцу паміж унутры і вонкі: схаваны ад сябе ёсьць прадметам для іншых. І той, хто ня мае навідавоку татуіровак-сэрцаў, таксама мусіць мець лоб, каб у вайне паглядаў сьцьвердзіць сваю невідочнасьць для сябе. Прыклад з ілбом, калі браць даслоўна, раскрывае дзіўную рысу падсьвядомага: істотнае падсьвядомае ня можа не выдаваць сябе. Ягоная самаздрада належыць да ягонай рэчаіснасьці гэтаксама, як зіхаценьне атраманту да скуры з надпісамі пад ёй. Яно заўсёды само выкрыквае сябе, але татуяваныя ня ў стане самі чытаць свае гіерогліфы і сьляды апёкаў. Надпісы заўсёды знаходзяцца

на схаваных месцах, недасягальных для бачаньня і адчуваньня іх уладальніка – на патаемным месцы душы, на недаступных палёх, на адваротных бакох і тыльных паверхнях таго цёмнага цела, якім ёсьць я.

Тое, што жыцьцё хацела ўбіць у нас як наймацней і адначасова схаваць ад нас як найдалей, яно запісала індывідам паміж лапатак. Там наколатыя нашы падсьвядомыя місіі. І той, хто, як Зыгфрыд, выкупаўся ў цмачынай крыві і зрабіўся нібыта няўразьлівым, мае там адно адкрытае месца, свой уласны здрадлівы ліпавы лісток, які мае форму сэрца і далёкі ад «я», і без сумневу недзе ёсьць забойчы назіральнік, які глядзіць на гэтую патаемную пляму як на мішэнь. Але гэтая мішэнь магла б быць і чорнай дошкай, на якой запісаныя абсалютныя надпісы – хіба ня гэта ўяўляў сабе Антанэн Арто, з алоўкам у руцэ зьвіваючыся ў стане сьветлага разладжаньня на парыскім аўтобусным прыпынку ў дарэмных спробах напісаць нешта на ўласнай сьпіне на вышыні лапатак?

Спадарыні і спадары, адсюль сьлед вядзе да найстарэйшай паэталягічнай легенды. Арфэй, грэцкі протапаэт, так змучаны тугою з-за сьмерці Эўрыдыкі, што гатовы сысьці ў падземны сьвет, каб упрасіць багоў цемры вярнуць Эўрыдыку. Што ягоныя пакуты могуць узрушыць і другіх, бачна па неверагодным сыходзе прадпрыемства: нават пекла можна праняць модламі. Сваім мастацтвам Арфэй ссунуў межы сьмерці, ён атрымлівае нечуваны дазвол вывесьці каханую памерлую да сьвятла і да жывых, зь бязьлітаснай умовай, што падчас шляху ў дзённы сьвет ён ні разу на яе не азірнецца; пакуль краіна ценяў ня будзе пройдзена, ён не павінен глядзець на аб’ект сваёй прагі. Але ставіць Арфэю такую ўмову азначае патрабаваць немагчымага ад таго, хто патрабуе немагчымага, таму што прага, якая не адступіла перад фактам сьмерці, наўрад ці здолее выканаць прадпісаньне не паварочвацца да каханай. Бо ж прага мітычнага паэта ўключае ў сябе няздольнасьць скарыцца перад законам разлукі, найбольш жорсткім выяўленьнем якога ёсьць сьмерць іншага. Калі сама сьмерць ня ўразіла яго настолькі, каб ён адмовіўся ад прагі ЯЕ, то заслабым будзе і загад, які забараняе яму «заўчаснае» абяртаньне да каханай. Так што Арфэй мусіць

павярнуцца, ён мусіць парушыць загад і зноў страціць Эўрыдыку, гэтым разам назаўсёды. Калі б Арфэй здолеў выканаць прадпісаньне, то ён ня быў бы чалавекам, які патрабаваў для Эўрыдыкі другое жыцьцё. Ён ня быў бы паэтам, які засьпяваў у немагчымым месцы – і жаданьне скарыць вышніх багоў і расчуліць падземны сьвет з самага пачатку падалося б яму бессэнсоўным.

Спадарства, для сытуацыі літаратуры няма больш моцнага вобразу, чым вобраз нецярплівага сьпевака Арфэя, які ідзе паўз зону сьмерці з амаль жывой нябожчыцай за сьпінай, насустрач дню. Зразумела, ён не ўстрымаецца ад фатальнага абароту, ён парушыць загад, ужо таму, што пранікненьне ў сьвет ночы імплікуе парушэньне ўсіх законаў магчымага. Паэт – гэта той, хто шукае сапраўднае нават у немагчымым. Таму ён зноўку губляе аб'ект каханьня, дзеля якога была арганізаваная паездка цераз Гадэс. Гэта дазваляе падазраваць, што паэт і падарожнік у краіну мёртвых ёсьць таксама і ўзорным татуяваным. Сьмяротны досьвед запісаны ў яго паміж лапатак, прымушаючы яго ўвесь час сьпяваць пра нешта страчанае. З Эўрыдыкай у краіне ценяў ён спазнае тое, што слушнае для любой літаратуры, якая падстаўляецца. Пакуль ён дзеля сваёй паэтычнай прагі вядзе яе за сабой да дня, да сьвету, да мовы, пакуль ён не паварочваецца, каб валодаць ёю, датуль ён перамагае тое, што зазвычай пазбаўляе людзей мовы і спакушае скарыцца, – сьмерць. Тым самым Арфэй становіцца першым сьведкам паэзіі – прамоўцам супраць сьмерці і супраць нематы. Ён заклеймаваны невыносным у сваім самым недаступным месцы, якое, можа, і бачнае іншым, але не яму самому. Так што можна зразумець, чаму да нас лёсіла дайсьці толькі гісторыі пра яго, але не ягоны сьпеў. Паэталягічна гэта значны факт, бо ён таксама паказвае, што сьведчаньне важнейшае за тварэньне. Нашай задачай застаецца зразумець, што забарона аглядацца толькі сымбалізуе немагчымасьць паглядзець сабе самому паміж лапатак, дзе стаяць апёкі незваротных расстаньняў. Таму паэт не павінен рабіць выявы прадмета сваёй прагі. Але тое, чаго Арфэй не павінен рабіць, яшчэ ў большай ступені ёсьць тым, чаго ён ня *зможа*, але чаго ён мусіць хацець, каб знайсьці сваё дыханьне. Арфэй мусіць страціць тое, чаго ён прагне, таму што ён ужо страціў гэта. Але

паміж адбытай стратай і новым страчаньнем адкрываецца прастора для жыцьця, якое адпавядае дыхаючым, размаўляючым, прагнучым істотам. У гэтай прасторы мы супраціўляемся занадта рэальнаму і вучымся быць пачынальнікамі немагчымага. Гэтую прастору адкрывае паэзія, выстаўляючы сябе ў невядомасьць. Праз сваё выстаўленьне яна пачынае абыгрываць непрымальнае. Такім чынам, адназначнасьць сьмерці магчыма перавесьці ў шматзначнасьць жыцьця. Зь непрымірэнчасьці расстаньняў вырастае цуд новых злучэньняў, якія адтэрміноўваюць фатум.

Спадарства, у загалоўку гэтых лекцыяў я згадаў паэтыку прыходу на сьвет, якая адначасова павінна паказаць, як мы прыходзім да мовы. Здаецца, пакуль зусім мала што з гэтай тэмы стала ясным. Што да мяне, то я быў бы задаволены гэтым уражаньнем, калі яно дасьць стымул да таго, каб у наступны раз усур'ёз узяцца за справу. Спадарыні і спадары, я рады таму, што праз тыдзень змагу выкласьці вам некаторыя свае думкі пра паэтыку пачынаньня.

2. ПАЭТЫКА ПАЧЫНАНЬНЯ

Пачынаньне – дзіўная рэч. Калі я не разважаю пра гэта, я ведаю, што такое пачынаць, але калі разважаю, дык ня ведаю гэтага.

Спадарства, уявіце сабе, калі ласка, што аднаго дня да вас стукаюць у дзьверы, вы адчыняеце і ўваходзіць незнаёмец, апрануты ў шэрае, з валізкай у руцэ, мужчына высокага росту, зьнешнасьць якога выдае прыстойную беднасьць. Калі вы жыва ўявіце сабе гэтую сцэну, то далей з вамі можа здарыцца тое, што здарылася з апавядальнікам вусьцішнага апавяданьня Хорхе Люіса Борхеса пра пяшчаную кнігу. Чужаніца, пэўна з паўночных краінаў, называецца прадаўцом бібліяў. Дзякуючы камбінацыі, прырода якой не раскрытая, ён, падобна, ведае, што гаспадар кватэры на вуліцы Бэльграна ў Буэнас-Айрэсе, які адчыніў яму дзьверы, калекцыянуе кнігі. Гаспадар гаворыць свайму наведніку, што яму не стае ня бібліяў – таму што ён

мае шмат бібліяў на ангельскай мове, сярод іх біблію Джона Ўікліфа, і яшчэ біблію Цыпрыяна фон Валера, да таго ж біблію Лютэра і адзін асобнік вульгаты. Мэлянхалічны чужынец нейкую хвілю маўчыць, потым адказвае, што ён прадае ня толькі біблії, ён можа паказаць гаспадару другую сьвяшчэнную кнігу на ангельскай мове, якая можа яго зацікавіць, ён набыў яе на мяжы Біканіру, у Індыі. І на самай справе, на вокладцы незвычайна цяжкай кнігі чытэльныя словы: Holy Writ, пад імі назоў места: Бамбэй. Апавядальнік адкрывае кнігу на адвольным месцы. На левай старонцы бачны нумар 40 514, а вось супрацьлеглая правая мае нумар 999. Пасьля перагортваньня старонкі высьвятляецца, што наступная мае васьмізначны нумар. Апавядальнік закрывае кнігу і спрабуе зноў адкрыць яе на тым самым месцы – але дарэмна, адкрытыя хвілю таму старонкі немагчыма знайсьці, колькі ні гартай. Прадавец бібліяў бляклым голасам апавядае, што ён купіў том у адной вёсцы на раўніне, выменяў біблію на колькі рупій. Яе колішні ўладальнік, недатыкальны, які ня мог чытаць, сказаў, што гэтая кніга называецца пяшчаная кніга, бо ні яна, ні пясок ня маюць ні пачатку, ні канца. А цяпер, спадарства, надыходзіць месца, дзеля якога я хацеў асьвяжыць гэтую гісторыю ў вашай памяці. Паслухайце трохі голас апавядальніка ў прамой цытаце.

Ён – прадавец – папрасіў мяне знайсьці першую старонку.

Я паклаў сваю левую руку на пераплёт і адкрыў кнігу, прыціснуўшы вялікі палец да ўказальнага. Мае высілкі былі дарэмнымі – паміж вокладкай кнігі і маім вялікім пальцам заўсёды заставалася некалькі старонак. Здавалася, яны выскоквалі з кнігі.

– А цяпер знайдзіце апошнюю старонку.

І цяпер мае спробы скончыліся няўдачай. Голасам, які мала быў падобны на мой, я прамармытаў:

– Гэта немагчыма.

Прадавец кнігі азваўся ўсё тым жа ціхім голасам:

– Гэта немагчыма, і тым ня менеў гэта так. Колькасьць старонак гэтай кнігі сапраўды бясконцая. Ні адна зь іх ня ёсьць першай, ні адна ня ёсьць апошняй. Я ня ведаю, чаму яны пранумараваныя так адвольна. Магчыма, каб выразіць, што элемэнты бясконцага шэрагу могуць быць пранумараваныя абсалютна адвольным чынам.

Потым ён дадаў, як быццам бы разважаючы ўслых:

– Калі прастора бясконцая, то мы знаходзімся на адвольным месцы ў прасторы. Калі час бясконцы, то мы на адвольным месцы ў часе.

Спадарства, няцяжка ўявіць, што для бібліямана жаданьне набыць гэтую кнігу мусіць быць непераадольным. Гэтаксама лёгка зразумець, што такая кніга пасьля яе набыцьця хутка пераканае новага ўладальніка ў тым, як невыносна мець нешта такое ў доме. Кніга без пачатку і канца непрыдатная для таго, каб ёю валодаў чалавек, яго розум трапляе пад пагрозу прывыкнуць да рэчаў монстрападобных, і калі ён будзе занадта часта гартаць гэтую бязьмерную кнігу, то рызыкуе сам стаць монстрам. Працяг Борхесавага апавяданьня выразна даказвае гэта. У канцы апавядальнік робіць мудрае рашэньне – пасьля шматмесячнага спусташальнага ўплыву бясконцай кнігі на ягонае жыцьцё – ён пакідае д'ябальскую кнігу на якойсьці вільготнай паліцы ў лёхах аргентынскай Нацыянальнай бібліятэкі і робіць усё, каб забыцца на дакладнае месца, дзе ён яе «згубіў». Як сапраўдны бібліяман, ён набыў гэтую немагчымую кнігу. Але неўзабаве розум – і чысты інстынкт самазахаваньня – прымусілі аматара выпусьціць з рук аб'ект, якім нельга валодаць. Сама думка аб тым, што ты ім валодаў, ёсьць небясьпечнай – бо хто ня можа выкрасьліць з сваёй сьвядомасьці гэтую думку, лёгка становіцца ахвярай мэлянхоліі. Адваротным бокам бязьмежнага валоданьня абавязкова ёсьць бязьмежная страта, а ў гэтым палягае ўмова мэлянхоліі.

Спадарства, сёньня я гавару пра цяжкасьць пачынаньня, і я хацеў бы закласьці некалькі камянёў у падмурак паэтыкі пачынаньня. Карысьць бяздоннага аповеду Борхеса для гэтага

намеру вынікае з цытаванага ўрыўку. Бо ў ягонай пачварнай кнізе ёсьць адна цяжкасьць, якая нармальным чынам не здаецца такой – цяжкасьць адкрыць першую старонку кнігі. У бясконцай кнізе няма першай старонкі, д'ябальскі літаратурны твор спыняе ўсякую спробу натрапіць на пачатак тэксту, паміж вокладкай і адкрытай «першай» старонкай увесь час уплішчваюцца новыя старонкі, так што ні адна старонка ня ёсьць на самай справе першай, як бы блізка яна ні была ад пераплёту. З такой кнігі можна ўведаць вырашальную рэч што да пытаньня пачатку. Натуральна, нельга сказаць, што такую кнігу немагчыма пачаць чытаць; чытач можа, нават мусіць пачаць чытаць яе зь любога месца, дзе хочацца. Але гэтая кніга дазваляе пазнаць, што пачынаць і пачынаць ад пачатку – гэта дзьве вельмі адрозныя рэчы. З гэтым адрозьненьнем мы і будзем мець справу сёньня, і, калі вы ласкава згадаеце мінулую лекцыю, вы ўбачыце, што мы ўжо мелі з гэтым справу мінулым разам. Карыстаючыся са зручнага моманту, я дадам, што мы будзем сутыкацца з гэтым адрозьненьнем ва ўсіх наступных лекцыях, і калі я зраблю сваю справу больш-менш добра, то ўрэшце вы мусіце атрымаць адчуваньне, што ў даўна знаёмай розьніцы паміж пачынаньнем і пачынаньнем з пачатку дадалося крыху прасторы, у якой адначасова ўзмацняюцца яснасьць і загадкавасьць.

Спадарства, вы згодзіцеся, што нікому яшчэ не прыходзіла да галавы ўважаць за праблему адкрываньне першай старонкі ў звычайнай кніжцы. Але сёньня гаворка не пра нармальную кнігу, і выглядае, што рэчы нечакана ўскладняюцца. І калі бясконцая кніга, пра якую расказаў Борхес, – толькі фікцыя, якой ні ў якіх уяўляльных умовах не адпавядае рэалістычны сэнс, гэта ня мусіць ашаламіць нас і выклікае толькі праблемы літаратурнага ці казачнага кшталту. Калі літаратура – гэта заўсёды толькі літаратура, а жыцьцё – гэта заўсёды толькі жыцьцё, тады праблемы літаратуры ніяк ня могуць стаць праблемамі жыцьця; тады яны ніколі ня будуць тым, што ў мэтафізыцы паўсядзённасьці мы называем «сапраўднымі праблемамі». Але хутка мы ўбачым, што адрозьненьне паміж літаратурай і жыцьцём нельга сфармуляваць так адназначна. Спадарства, вы пераканаецеся ў гэтым, калі наважыцеся на ўяўны экспэрымэнт. Перад намі зноў ільнянавалосы

шатляндзкі прадавец бібліяў з мэлянхалічным голасам. Цяпер ён не прапануе патэнцыйнаму пакупніку пяшчанай кнігі адкрыць першую старонку – не, ён прапануе нам адкрыць першую старонку нашага ўласнага жыцьця, каб прачытаць, што там напісана. Але стоп, наш розум чуйнуе, і гэтая падмена паняткаў хутка распазнаная: зноў робіцца спроба прадставіць татальнасьць чалавечага жыцьця праз старую кніжную мэтафару – гульня, у якую людзі гуляюць з таго часу, як ёсьць кнігі. І чаму б ім не гуляць у яе, калі кніга належыць да найпрыемнейшых у сьвеце дэталяў, якія могуць замяняць сабой цэлае. Але праблема хутка пачынае паказваць свае кіпцюры. Нашае жыцьцё, калі ўжо параўноўваць яго з кнігай, ніяк ня ёсьць бясконцай кнігай. Мы ведаем, што жыцьцё, якое мы вядзём, пачынаецца з зачацьця альбо нараджэньня і заканчваецца сьмерцю. Такім чынам – працягваючы вобраз – гэта канечная кніга, а людзкія біяграфіі – гэта гісторыі, якія можна дачытаць да апошняга радка і прагартаць ад пачатку да канца. Прынамсі, гэта здаецца відавочным, пакуль мы застаёмся пры думцы, што канечныя кнігі – прыдатная мэтафара для канечных жыцьцяў. Але згадайце мэлянхалічнага прадаўца бібліяў і яго прапанову адкрыць першую старонку кнігі, у якой запісана гісторыя вашага жыцьця. Такая прапанова была б абсурднай і цынічнай, калі б размова ішла пра апошнюю старонку – гэта значыла б прапаноўваць жывым уявіць сябе мёртвымі і закрыць кнігу свайго жыцьця. А вось прапанова адкрыць першую старонку свайго жыцьця цалкам трапляе ў абсяг дапушчальнага. Дзіўным чынам у гэтым выпадку ніякі шлях не вядзе ад дапушчальнага да магчымага. Таму што і той у канечнай кнізе, у якой расказваецца пра пачаткі канечнага жыцьця, выяўляецца эфэкт, які прымусіў Борхесавага апавядальніка пабляднець і заўважыць: гэта немагчыма. На што прадавец бібліяў адказвае, як мы чулі: так, гэта немагчыма, і тым ня менеў гэта так. Калі мне прапаноўваюць расказаць пра маё жыцьцё і пачаць з пачатку, я адчуваю сябе як той бібліяман з Буэнас-Айрэсу, адно што ў маім выпадку здаецца, што я абавязкова павінен быў бы здолець пачаць з пачатку, бо гісторыя, якую я меў бы распавесьці, калі б мог – гэта ж канечная гісторыя. Але дзіўным чынам я не магу гэтага зрабіць, таму што, як ні дзіўна гэта гучыць, гэтая мая гісторыя пачынаецца ў маю адсутнасьць

альбо, асьцярожней кажучы, у адсутнасьць майго ўспаміну і майго ўсьведамленьня ўласнай прысутнасьці. Можна дапусьціць, што на першых старонках маёй кнігі трэба было б апавесьці пра маё нараджэньне; гэтая падмена зусім не экстравагантная, бо я як герой маёй гісторыі нейкім чынам умудрыўся ўшанаваць гэтую зямлю сваім візытам. І тым ня менш усякага, хто падрабязна расказаў бы пра ўласнае нараджэньне ад першай асобы і без іроніі, адразу прызналі б за махляра ці за Мюнхгаўзэна, які выцягвае сябе за валасы з мацярынскага ўлоньня. Але гэта азначае: і ў нашай канечнай гісторыі, якую ніхто не палічыць індыйскай д'ябальшчынай, нам не ўдаецца адкрыць першую старонку. Бо калі мы можам яе адкрыць, то мы напэўна ведаем: гэта ня першая старонка. Калі мы пачынаем распавядаць пра сябе, то мы з пэўнасьцю пачалі не з пачатку, але з пазьнейшага моманту – скажам, зь першага ўспаміну, як тата кружыць мяне ў паветры, маленькі я заходзіцца ад радасьці на арэлях, як я павыкідаў фамільны посуд на вуліцу. Гэтыя тыповыя дэталі паказваюць, што якраз ува ўласным пачатку зеўрае незачыняльны прагал. Калі б нашае жыцьцё было звычайнай канечнай кнігай, то ў ёй, рыхтык як у пачварнай кнізе Борхеса, паміж вокладкай і тым месцам, дзе мы пачынаем гаварыць самі за сябе, заставалася б колькі неадкрывальных старонак. Гэта значыць ня што іншае як тое, што для людзей як канечных гаворачых істотаў пачатак быцьця і пачатак мовы ні ў якім разе не супадаюць. Бо калі пачынаецца мова, то быцьцё ўжо наяўнае; калі хочаш пачаць з быцьця – тонеш у чорнай дзіры бязмоўя. Гэтая першапачаткова неразьвязальная дылема, наколькі мы ведаем з гісторыі, займала людзей яшчэ ў раньні час іхнага разважаньня – задоўга да зьяўленьня філязофіяў. Можа быць, у немагчымасьці пачаць з уласнага пачатку ляжыць выток міталёгіі, здаецца, неадлучнай ад фэномэну культуры. З таго часу, як яна «ёсьць», людзі апавядаюць больш альбо менш фантастычныя гісторыі пра тое, што было ў сапраўдным пачатку, каб мець што-небудзь, за што можна было б трымацца, калі яны, хранічныя позьнепачынальнікі, пачынаюць уключацца ў плынную гісторыю. «Чалавек» – гэта гаворачая жывёла, бо ён ёсьць істотай, выратанай пачынаць, істотай, якая мусіць арыентавацца ў сьвеце, ня могучы прысутнічаць пры «сапраўдным» пачатку як пільны сьведка. Такі ягоны лёс, што

ён ня можа пачаць зь сябе як бязмоўнай жывёлы, якая чуе адкрытасьць, але пераймае сябе толькі ў той момант, калі мяне дае мне мова. Таму ён цыруе дзірку пачатку аповедамі і пачынае ў іх заблытвацца, бо ён ёсьць істотай, якая ня мае свайго пачатку.

Спадарства, я бадай што завінаваціўся вам некалькі даведак пра пачаткі маёй цікавасьці да пачаткаў. Ня бойцеся, што я зараз пачну ўспамінаць юнацтва – я яшчэ не ў мэмуарным узросьце. Пэўная частка маёй аўтабіяграфіі ў гэты момант уяўляе цікавасьць толькі ў адным – праўда, дзіўным – тэарэтычным аспэкце. Каб аўтабіяграфічна апавесьці, як пачалася мая цікавасьць да пачаткаў, я мушу пачаць апавядаць пра маю цікавасьць да аўтабіяграфіяў. Гэта гучыць як гульня словаў – але заўважу, што яна карэктна перадае рэальны стан рэчаў.

Ужо падчас навучаньня ва ўнівэрсытэце мяне моцна вабіла творчасьць Вільгельма Дыльтэя, аднаго з заснавальнікаў сучасных гуманітарных навук. Дыльтэй быў ня толькі вялікім думаньнікам гістарычных фактаў, які паставіў перад сабой задачу стварыць крытыку гістарычнага розуму; ён быў таксама першым вартым увагі тэарэтыкам аўтабіяграфіі. Дыльтэй угледзеў у аўтабіяграфіі філязофскую праблему першай велічыні. Кажучы вельмі спрошчана: на пытаньне «як наагул магчыма гістарычнае пазнаньне?» ён даў сабе адказ: так, як магчыма аўтабіяграфічнае самапазнаньне. Але апошняе ёсьць ня толькі абстрактнай віртуальнасьцю, яно на ўзорным узроўні разгорнутае ў творах Аўгустына, Русо, Гётэ. У іх з найвялікшай магчымай пластычнасьцю праяўляецца падставовая зададзенасьць чалавечай экзыстэнцыі – тое, што ўжо само па сабе «жыцьцё» мае структуру пасьлядоўнасьці ўзаемазьвязаных выразаў, якая разумее сама сябе, якая для самой сябе ёсьць унутрана празрыстай і інтэлігібэльнай. Гэта значыць, што жыцьцё як такое ўжо гермэнэўтычнае. Адпаведна, і гісторыя як навука магчымая толькі як разгортваньне элемэнтарных падзеяў жыцьцёвых гісторыяў, якія разумеюць самі сябе. З аўтабіяграфікі, згодна з гэтым, мусілі б брацца ўсе катэгорыі, патрэбныя для разуменьня прадметаў гістарычнага сьвету.

Гэтыя разважаньні заўсёды захаплялі мяне, і я ўжыў іх у якасьці зыходнай гіпотэзы аднаго жахліва аб'ёмнага літаратурна-філязофскага дасьледаваньня, невялікая частка якога ў 1978 годзе выйшла асобнай кніжкай пад хутчэй маскавальным назовам «Літаратура і жыцьцёвы досьвед». У выніку маё дасьледаваньне, без сумневу, было крытыкай Дыльтэя; я ня мог пагадзіцца з тым, што мадэль аўтабіяграфіі на самай справе здольная служыць асновай для крытыкі гістарычнага розуму, урэшце, я ўзяў пад сумнеў нават тое, што аўтабіяграфіі сьведчаць толькі пра самаразуменьне жыцьця. Так, я спачатку прыйшоў да высновы, што фэномэн жыцьця, якое разумее само сябе, ня мае дастатковай вытлумачальнай моцы – і апроч таго, ёсьць унутрана надта нетрывалым, – каб угрунтоўваць на ім усю пабудову гістарычнасьці. У гэтых кантэкстах я ўпершыню сутыкнуўся з праблемай пачатковага прагалу. Калі б Дыльтэй меў рацыю, то жыцьцё, якое сябе ведае, мусіла б знайсьці нейкі асьвятляльны адказ і для цемры сваіх пачаткаў. Але аўтабіяграфіі, якія я дасьледаваў, адназначна паказвалі, што іх аўтары якраз не маглі грунтаваць пачатковыя разьдзелы сваіх гісторыяў на аўтабіяграфічных ведах у вузкім сэнсе слова. Калі вялося пра ўласна пачатак жыцьця, аўтары адразу выходзілі паза абсяг уласных ведаў, яны паслугоўваліся перанятым веданьнем, вуснымі сямейнымі гісторыямі, чуткамі, тым, што ім расказалі пасьля; некаторыя аўтары малявалі шырокія культурна-гістарычныя фрэскі, каб ахарактарызаваць момант свайго зямнога зьяўленьня, як быццам хацелі акунуць падзею свайго нараджэньня ў сусьветна-гістарычную аб'ектыўнасьць і зафарбаваць horror vacui, які выпраменьваецца з уяўленьня такога сьвету, у якім «я» суб'екта, які прамаўляе, яшчэ не было. Усё гэта даказвае, што аўтабіяграфічная нітка абрываецца нават у асобным жыцьці, як толькі яе размотваюць дастаткова далёка ў бок ягонага пачатку – не гаворачы ўжо пра сусьветна-гістарычную пасьлядоўнасьць, што як такая натуральным чынам не належыць ніводнаму індывіду ў якасьці яго ўласнай веды, хіба што самому Богу альбо сусьветнаму духу, пра аўтабіяграфічныя амбіцыі якіх, зноў жа, нічога не вядома. Ад таго часу я пачаў адчуваць сымпатыю да тэзы, што індывіды, прынамсі, у такой самай ступені не разумеюць сябе, як і разумеюць, і што ў стаўленьні людзей да сябе на працягу жыцьця заўсёды існуе перапляценьне самаазарэньняў і

зацямненьняў. У самаведаньні сьвядомага жыцьця заўсёды адыгрывае сваю ролю яшчэ і канстытуцыйная сьлепата. Істотная прычына для гэтага меркаваньня палягала якраз у схаванасьці пачаткаў чалавечых гісторыяў жыцьця.

Як вядома, Гайдэгер і Гадамэр з падобных разважаньняў зрабілі выснову пра правал Дыльтэевага падыходу. З прычыны таго, што нітка аўтабіяграфіі, праўдападобна, непазьбежна рвецца, гістарычную веду і сьвядомасьць чалавечай гістарычнасьці наагул трэба было б абгрунтоўваць інакш, чым гэта спрабаваў зрабіць Дыльтэй. Гайдэгер адварочваецца ад суб'ектыўнай веды аўтабіяграфікі, нават ад асноўнай пазыцыі суб'ектыўнасьці ўвогуле на карысьць думкі аб тым, што ён называе гісторыяй быцьця. Гадамэр узрывае небасяг самасьвядомасьцяў на карысьць шырока закладзенага разуменьня працэсу перадачы; en passant нагадаю запамінальную фармулёўку: ня мы маем традыцыю, а традыцыя мае нас. Тым самым, здаецца, прамоўлены канчатковы вотум супраць ідэяў Дыльтэя – вотум супраць аўтабіяграфікі і на карысьць тэорыі надсуб'ектных працэсаў перадачы гісторыі. Філязофія жыцьця і вера ў празрыстасьць суб'екта, здаецца, выходзяць з гульні; крытыка гістарычнага розуму, паводле новых пераканаьняў, можа прасунуцца наперад толькі антыдыльтэйскімі (і антыкантыянскімі) шляхамі. Разьвітаньне з завышанымі патрабаваньнямі да пражытага і самастойнай веды даецца нават ня надта цяжка: бо якраз там, куды, паводле агульнай згоды, не сягае суб'ектыўная веда, канечны гістарычны індывід можа аддацца плыні перададзеных аповедаў. Як толькі гэты давер да плыні робіцца дастаткова моцным, – непрыемнасьць, якую дастаўляе нам самім цямрэча нашых пачаткаў, напалову меншае – мы апынаемся вольнымі ад стрэсу самапачынаньня і самаведаньня ад самага пачатку, таму што традыцыя як вялікая маці ўжо паклапацілася пра пачатак з нашага месца. Перадача пачынае нас за нас, пакуль наш «уласны» дух ня стане дастаткова моцным, каб у сваю чаргу пераняць справу пачынаньня за іншых. Згодна з гэтым, любая самасьвядомасьць схаваная ў працэсе быцьця больш высокага парадку. Мы як зьвёны гермэнэўтычнага ланцуга, адпаведна, ня маем патрэбы ў радыкальнай аўтабіяграфіцы, а ўтульна месьцімся ўва ўлоньні традыцыі, як у мацярынскім улоньні, якое забясьпечвае

нам адначасна і выношваньне, і вызваленьне. Тады не было б сапраўднай праблемы пачатку, таму што ўсялякае жаданьне самастойнага пачатку ў канцавым выніку мусіла б выліцца ў спакойнае прызнаньне той акалічнасьці, што мы пачалі ня самі, а былі пачатыя. Іншымі словамі, тады мы былі б не выканаўцамі ўласнага пачатку, але й ня толькі пасіўнымі ахвярамі альбо агентамі чужога ўплыву, а пасярэднікамі, чый спосаб быцьця можна ахарактарызаваць як пачатую магчымасьць пачынаць.

Гэта спакусьлівыя развагі, як мне здаецца, – нездарма некаторыя з наймацнейшых думаньнікаў гэтага стагодзьдзя знаходзяцца сярод іх аўтараў. Прасачыўшы гэтыя думкі да іх экзыстэнцыйнага грунту, можна адчуць магутнае пераконваньне быць спакойным, якое сыходзіць ад іх, яны намаўляюць ня ўпарціцца ў перабольшаньні суб'ектыўнасьці і яе волі да самастойнага пачынаньня, яны запрашаюць да веры ў сусьветна-гістарычную размову, якая перасягае нас як з боку мінуўшчыны, так і з боку будучыні, і яны нагадваюць пра непаўторную адказнасьць цяперашніх пакаленьняў за перадачу гістарычнай эстафэты. Калі коратка, у велікадушнасьці і гістарычнай праніклівасьці Гайдэгеравых і Гадамэравых разваг ня можа быць сумневу. Але сумневы і пярэчаньні распальвае той відавочны факт, што маці гісторыя даволі часта подла кідала сваіх дзяцей у бядзе. У шматлікіх выпадках падаецца зьдзекам адсылаць нас да традыцыі, калі мы хочам спраўдзіць нашыя пачаткі. Можа быць, што ня мы маем традыцыю, а традыцыя нас, але часта яна мае нас так, як разбураны горад мае сваіх жыхароў альбо заганнае згуртаваньне мае сваіх удзельнікаў, якія ў ім сьпяшаюцца насустрач катастрофе. Так, традыцыя мае нас, кон быцьця трымае нас на далоні, але той, хто быў народжаны немцам у сярэдзіне гэтага стагодзьдзя, выпаўз з улоньня сваіх нацыянальных традыцыяў як пазасталы ў жывых з разбомбленага дому. У такой сытуацыі, калі атрымліваеш у спадчыну пустэльню, здольнасьць пачаць самому набывае нечаканае новае значэньне. Спакой, што дазваляе лічыць сябе ўжо пачатым, раптам аказваецца ў невыгодным становішчы ў параўнаньні з рашучасьцю наноў пачаць сябе самому. З гэтага вынікае: заклік Дыльтэя да аўтабіяграфіі ашаламляльным чынам зноў аказваецца слушным

у процілегласьць анталягічнаму ўзвышэньню традыцыі над самасьвядомасьцю. Тое, што можа быць правільным для ўдалых традыцыяў – аддацца плыні добрых перадачаў, – для няўдалых традыцыяў самазабойчае і няправільнае. Няўдалыя традыцыі падобныя да атручаных рэк: у іх сплывае пена самаразбурэньня, яны зносяць заразу скажоных формаў жыцьця ад месцаў зьліву да мораў. І гэтак тым, хто ўсьведамляе сваю ўлучанасьць у перадачу разбурэньня, застаецца толькі шукаць ратунку ў сілах новага самапачынаньня. Яны мусяць хацець вяртаньня да больш чыстых крыніцаў самабыцьця. Так, яны мусяць дасягнуць надзвычайных вышыняў у здольнасьці пачынаць, бо ніякая плынь здалёк не прынясе ім таго, што яны хочуць улучыць у добрую форму самасьці. Толькі таму, што перадача можа быць і мачыхай, людзі з такой жарсьцю суб'ектываваліся: дзеля гэтага яны разьвілі сваю найцудоўнейшую і найнебясьпечнейшую здольнасьць – здольнасьць да рэвалюцыі самапачынаньня насуперак пачатасьці. Прыгода суб'ектывацыі не адрозьніваецца ад волі да гэтай ініцыятывы. Самавызначэньне, самасьцьвярджэньне, самазаснаваньне – гэтыя словы ніколі ня сталі б вялікімі лёзунгамі чалавецтва, калі б людзі з самага пачатку высокаразьвітых культураў не былі зацікаўленыя ў вызваленьні ад дрэнных традыцыяў. Гэтая зацікаўленасьць прадзе адну зь нітак, зь якіх сатканая сусьветная гісторыя: гэта жаданьне вызваліцца ад традыцыяў самаразбурэньня, якія былі выпаленыя на скуры чалавецтва старымі сіламі перадачы традыцыі і якія непераадольна распаўсюджваюцца праз стагодзьдзі.

Спадарства, гэтыя разважаньні прыводзяць да ўзрушальнай у філязофска-гістарычным сэнсе тэзы: змаганьне паміж ідэяй аўтабіяграфіі Дыльтэя і анталёгіяй перадачы Гайдэгера і Гадамэра адкрытае надалей. Аж так пераадолены, як пра гэта кажуць, Дыльтэй ні ў якім разе ня быў – і дарэчы, тое, што бохумскія дасьледчыкі Дыльтэя, у прыватнасьці Фрыт'ёф Родзі, так настойліва і пасьпяхова змагаюцца за выданьне працаў са спадчыны вялікага навукоўца – гэта ня толькі шчасьлівы выпадак для гістарыяграфіі ідэяў, але і акт тэарэтычнай справядлівасьці.

Спадарыні і спадары, тое, што я толькі што сказаў пра атручаныя традыцыі, непазьбежна гучыць як камэнтар да найноўшай гісторыі Нямеччыны. Падкрэсьліваньне здольнасьці пачынаць наноў і квазі *ex nihilo* сіламі суб'екта – неабходная рыса ў профілі інтэлігенцыі, якая ў Нямеччыне пасьля 1945-га, у народзе разбомбленых і самаразбуральнікаў хацела заснаваць формы жыцьця, вартыя перадачы. Я думаю, што ў гісторыі было няшмат пакаленьняў, якія ўва ўсіх жыцьцёва важных рэчах былі б настолькі вырачаныя на аўтадыдактыку, як тыя, хто цяпер мае нямецкія пасьведчаньні асобы. Цяпер гэтыя пасьведчаньні, як кажуць, абароненыя ад падробак, але індывіды – не. Мы як ніводзін іншы народ жывём у традыцыі немагчымасьці-на-што-колечы-абаперціся. Тут наўрад ці ёсьць дадатная традыцыя, якой можна было б даверыцца і аддацца, як мог даверыцца хвалям Цюрыхскага возера памысны вясьляр, не раўнуючы эмбрыён і дзіця сьвету ў адной асобе – я маю на ўвазе чаўнара з слыннага верша Гётэ, у слыннасьці якога з ужо названых прычынаў таксама няма больш упэўненасьці. Што ў гэтай краіне насамрэч ёсьць, дык гэта салідная традыцыя падману перадачамі вартага перадачы, традыцыя надзейнай ненадзейнасьці, традыцыя сталай патрэбы самазаспакаеньня, каб рабіць добрыя міны пры кепскіх гульнях. Можна меркаваць, што гэтая няпэўнасьць перадачы вызначае нямецкі спосаб быцьця-ў-сьвеце ўжо на працягу стагодзьдзяў. Захопленасьць характэрна нямецкай філязофіі пытаньнямі вытокаў і пачаткаў, ва ўсялякім выпадку, можна было б вытлумачыць у гэтым сэнсе. Пытаньне пра пачатак і пра тое, як жа пачаць з абсалютнага пачатку, належыць да мэнтальнасьці, якая вымушаная сама закладаць свае найглыбейшыя падмуркі, таму што атрыманае і перанятае не выклікаюць пэўнага адчуваньня цьвёрдай глебы пад нагамі і мацавальных традыцыяў за сьпінай. Тут у анталягічным пляне заўсёды дзіўным чынам паходзіш ад кепскіх бацькоў, маеш бездань за сабой там, дзе іншыя маюць генэалягічныя дрэвы, і пачуваешся бежанцам, тады як іншыя, здаецца, пачуваюцца як дома ў сваіх старых правах грамадзянства. З 1945 году мы ўжо конча маем за сьпінай неапісальнае, і мы татуяваныя безумоўным страхам. Калі, такім чынам, пытаньні пачаткаў і вытокаў ёсьць нямецкімі хваробамі, то я мушу прызнаць, што я пакутую на іх хрэстаматыйныя формы. Мае пытаньні відавочна

хрэстаматыйна нямецкія, калі не клінічна нямецкія, хоць пра мяне й ласкава кажуць, што, прынамсі, адказы дазваляюць зрабіць выснову пра выздараўленьне ад нямецкай існасьці.

Спадарства, я вяртаюся да ідэі радыкальнай аўтабіяграфікі і нагадваю пра патас кампэтэнтнасьці ў справе ўсяго ўласнага жыцьця, улучна зь ягонымі цёмнымі пачатковымі формамі. Той, хто мае прычыны зноў пачаць сябе з самага раньняга пачатку, ня можа дазволіць дэмаралізаваць сябе цяжкасьці, зь якой адкрываюцца першыя старонкі жыцьця. Ці ня мусіць сам факт забыцьця пачатку, што характэрнае амаль для ўсіх існуючых у прыродзе формаў самасьвядомасьці, у найвышэйшай ступені наводзіць на роздум? Ці пазбаўленьне самасьвядомасьці яе пачатку ня здраджвае таксама пэўны недахоп і ці ня ёсьць яно такім жа красамоўным, як маўчаньне, якім у пэўных сем'ях ахінаецца існаваньне пэўных родзічаў? Каб абараніць ідэю аўтабіяграфіі ў яе найцямнейшым месцы, я мушу прытрымлівацца таго, што мой рэальны пачатак быцьця належыць мне, нават калі ён недасяжны для маёй здольнасьці апавядаць. У гэтым пункце ніякая перадача ня можа спакусіць мяне да самападману, ніякі трыюмф кону быцьця ня можа падмануць мяне ілюзіяй мацярынскага ўлоньня, якое не было сапраўды маім, ніякі пераказ не заменіць унікальнага працэсу, які азначае маё выпадковае прыбыцьцё ў гэты непараўнальны сьвет. Я занадта блізкі сабе, у тым ліку і як аматар мовы, каб пагадзіцца пачаць сваё існаваньне толькі ад таго часу, калі пачынаецца мая здольнасьць гаварыць і калі мая моўная памяць утварыла ядры майго «я». Я не скаруся думцы, што мова апярэдзіла мяне ўва ўсіх істотных рэчах. Хіба не абуральна, што яна нахабна бярэцца назаўсёды аддзяліць мяне ад пачынаньня з дамоўных пачаткаў жыцьця? Хай нават я абавязаны мове здольнасьцямі арыентавацца і дзейнічаць у небясьпечным адкрытым сьвеце – але я таксама ведаю, што яна адно завалодала мною, як пірат, які ўзяў на абардаж маё жыцьцё, калі яно трохі аддалілася ад мацярынскага берагу. Аднойчы яна ўзышла на борт мяне, з бліскучымі словамі і рэзкімі камандамі, як матрона, якая прымушае мяне скакаць пад яе дуду. Ужо даўно мова ёсьць капітаніхай, маючы вялікія паўнамоцтвы, яна кіруе большай часткай таго, што адбываецца на палубе, а таксама ў шмат якіх справах пад палубай. Аднак,

працягваючы вобраз, у маім спуску на ваду – і я магу паклясьціся ў гэтым хоць на пяшчанай кнізе, хоць на хрысьціянскіх бібліях – апроч моўных бралі ўдзел яшчэ і іншыя сілы, – і ў той час на першыя старонкі маёй гісторыі, без сумневу, былі запісаныя найістотнейшыя для яе працягу рэчы. Нават калі я ніколі не змагу прагартаць кнігу жыцьця назад да гэтых падзеяў, я ўсё роўна ведаю, што гэтыя старонкі існуюць і што там мноства запісаў. На іх знаходзяцца апёкі ад сьвятла, невынішчальныя знакі, якія вядуць да залічэньня ў сьпіс жывых. На іх стаяць татуіроўкі нараджэньня і бязмоўных дзіцячых начэй, у якія адчыняецца сусьвет і ў якія ў нэрвах выпальваецца *Pavor nocturnus* – пазьней ён пазнае сябе ў мэтафізыцы. Адтуль жыцьцёвы шлях вёў у дзень, у мову, у сьвет – але дзень з мовай, дзень у сьвеце мае ў заплеччы бязмоўную дзіцячую ноч пачатку. Ён наступнічае яснай ночы Нічога, у якім зьнікае сьвет, перш чым узьнікнуць, ён наступнічае вусьцішным прыцемкам, у якіх растуць цені непрамоўленых імёнаў і лёсаў. Дзень з мовай наступнічае поўнаму прадчуваньняў лунаньню ў брызе пачуцьця, якое абцякае ўсё сумежнае, як вада паўтарае формы любой вазы. Перш, чым надыдуць словы і сказы, псыхіка дрэйфуе ў каляровым цякучым чуваньні, якое, распушчальнае ў жаданьні, у дотыку, у прыязнасьці, выяўляе суседзтва рэчаў. Але калі пачынае панаваць мова, калі словы пачынаюць называць рэчы, Я і Сьвет усё больш разыходзяцца, душа, даўней распушчаная ў сьвеце, вучыцца супрацьстаяць масіву рэчаў. Праз вызначальную сілу мовы плазма сьвету пачынае застываць. Бясконцая прастора існага дзеліцца на дзялянкі значэньняў, бясконцая стужка зьяваў разразаецца на апазыцыі, бязьмежнаму прызначаюцца краі і рамкі, аморфнае набывае абрысы, цякучае скіроўваецца ў трывалыя рэчышчы, неадрознае крышталізуецца ў дзесяць тысяч розных рэчаў. Слоўнікі адкрываюць сьветы, граматыкі фармуюць сувязі паміж існуючым, дыскурсы кіруюць абсягамі пазытыўна рэальнага.

Спадарыні і спадары, ідэя радыкальнай аўтабіяграфіі застаецца ўнутрана супярэчлівай датуль, пакуль яна лічыць ужо пануючай самазразумеласьцю наяўную мову апавяданьня, а разам зь ёй – упарадкаваньне часу і біяграфічныя формы, у якіх жыцьцё заўсёды прадстаўлялася як плынь. Фундамэнтальная

аўтабіяграфіка, якая застаецца ў арэоле асобнай сьвядомасьці і не спрабуе пераняцца мэтафізыкай Я, сягае ў прастору пачаткаў асобнага жыцьця толькі тады, калі прасочвае яго да бязмоўна цякучага, дзе яшчэ не названыя рэчы гуляюць на берагах панятку, не застываючы. Той, хто гартае кнігу свайго жыцьця назад аж да гэтых раньніх знакаў сваіх пачаткаў, той у сапраўдным сэнсе слова пачынае яшчэ раз – ён адкрывае пустыя старонкі, на якіх накрэсьленыя першыя адрозьненьні, ён разгортвае жывы пэргамэнт з наколкамі яго асаблівай татуіроўкі. Тое, што робіцца бачным пры гэтым, пацьвярджае псыхалягічную здагадку аб тым, што ёсьць слаі псыхічнага, у якіх час стаіць. Аднак як толькі старонкі раньняй бязмоўнай прысутнасьці адкрытыя, я пачынаю разумець, чаму іхнае адкрыцьцё здаецца цалкам немагчымым. За ахоўнай упэўненасьцю ў тым, што чалавек ня можа гэтага зрабіць, варушыцца панічная боязь таго, што ён, магчыма, усё-ткі здольны да гэтага. Бо калі б я мог вярнуцца да майго сапраўднага пачатку, што тады здарылася б? Ці не адкрылася б раптам былое пачатковае бязьмежжа? Звышчуйны *Apeiron* дзіцячае ночы зноў адчыніўся б, бясконцая кніга сьвету рассыпалася б, пазбаўленая пераплёту, каб выклікаць жахі беспрадметнасьці. Але перадусім вось што: да мяне зноў наблізіліся б іголкі рэчаіснасьці, каб пазначыць мяне жахлівым атрамантам ідэнтычнасьці, і распаленае жалеза зноў наблізілася б да маёй скуры, каб выпаліць на ёй мае пазнавальныя якасьці і выразаць абароненыя ад падробкі аддзяляльныя знакі паміж маімі лапаткамі.

Паколькі радыкальнае гартаньне кнігі жыцьця назад зьвязанае з рызыкай яшчэ раз напаткаць раньнія жахі, у бальшыні выпадкаў для нас дабрадзейнай фікцыяй ёсьць вера ў тое, што падзеі, якія былі да мовы, надзейна забытыя. Што здарылася б зь людзкой патрэбай у ціхіх днях, калі б гэтыя дні не пражываліся пад абаронай цемры пачатку?

Спадарства, гэтымі развагамі я хачу даць зразумець, што трэба мець вельмі важкія прычыны, каб адважыцца на радыкальна-аўтабіяграфічны экспэрымэнт новага пачынаньня з самага раньняга пачатку. Толькі зь цікаўнасьцю і акадэмічнымі матывамі ў такой экспэдыцыі не прасунешся далёка. Толькі

калі нейкая форма жыцьця аказваецца нежыцьцяздольнай, калі атручаная перадача самога сябе ў асобнай сьвядомасьці становіцца невыноснай, калі зьяўляецца воля вырвацца з заклятага кола, парваць зь сямейнай і нацыянальнай традыцыяй разбурэньня, толькі тады патас пачынаньня стане рэальнай жарсьцю. Ці можа гэта прывесьці да сапраўдных посьпехаў – гэта пытаньне, якім я пакуль ня буду пераймацца. Тут дастаткова сказаць, што сапраўды бываюць воля да новага пачатку і вера ў тое, што ён магчымы. У якасьці доказаў гэтае волі і веры можна назваць некаторыя з найважнейшых фэномэнаў людзкой культуры: рэлігіі зь іхным абяцаньнем рэінкарнацыяў, паэзія зь яе імкненьнем паставіць побач з наяўнымі дрэннымі сьветамі магчымыя лепшыя; тэрапэўтычныя мэтодыкі зь іхным абяцаньнем магчымасьці новых жыцьцёвых пачаткаў; і першапачатковая філязофія зь яе намерам аблегчыць думаючым душам разьвітаньне з скажонымі перадузятымі меркаваньнямі, каб нарадзіць іх на сьвет нанова ў сьвятле ісьцінных разваг. Рэлігія, паэзія, тэрапэўтычныя мэтодыкі і – з агаворкамі – філязофія ў цэлым зьяўляюцца пастаяннымі інстытутамі высокаразьвітых культураў. Сваім вялікім узростам і ўпартым вяртаньнем яны даказваюць, што незьлічоныя людзі ўжо тысячагодзьдзі мелі самыя важкія прычыны патрабаваць радыкальных новых пачаткаў жыцьця. З пачатку пісьменства выяўляюцца самыя разнастайныя імпульсы, якія сьведчаць пра патрэбу ў пагашэньні дрэннага жыцьцёвага досьведу і пра жаданьне аднавіць шанцы, якія былі колісь, калі першыя старонкі жыцьця былі яшчэ несьпісаныя. Бяз здольнасьці пачаць зноў зь лепшых матываў альбо, як кажуць сёньня, бязь сьмеласьці апярэдзіць кантрафактычныя дапушчэньні, чалавецтва, перадусім у яго гістарычна вядучых культурах, ужо даўно памерла б ад набытага досьведу, яно загінула б ад старэчай мэлянхоліі, ад трупнага яду сьвядомасьці фактаў. Праз тысячагадовае навучаньне горычы яно б стала непапраўна стомленае жыцьцём – ці так і ня ёсьць месцамі? Але разам з тым, ці ж не было заўсёды змаганьня паміж тэндэнцыяй да акамяненьня і тэндэнцыяй да ажыўленьня? Хіба вечна жывы геній людзей не вынаходзіў усё новых магчымасьцяў прагартаць кнігу жыцьця назад, да пэўнага месца перад сьмяротнымі старонкамі гісторыі, і з духу пачынаньня адказаць на невылечную традыцыю заснаваньнем

новых формаў жыцьця? Спадарства, гэтыя развагі высьвятляюць, чаму перадумовай паэтыкі пачынаньня ёсьць супрацьлегласьць рамантычнай прыхільнасьці да старых добрых часоў. Таму што чым больш радыкальна людзі спрабуюць прагартаць сябе назад, тым магутнейшыя яны маюць прычыны, каб пачынаць спачатку, і тым інтэнсіўнейшы іх клопат аб тым, каб нешта, што мела цяжкі пачатак, ня мела б і кепскага канца.

Спадарства, дазвольце мне скончыць гэтую лекцыю яшчэ адной незвычайнай гісторыяй. Яе героя клічуць Ян ван Лейдэн, што ў галяндзкай мове нагадвае Янт'е ван Лейдэна, бадзягу і няўмеку, у нямецкай мове пэрсанажа раманаў, у якім паядноўваюцца рысы Айхэндорфавага Абібока і Зыгмунда Фройда. Чытач сустракаецца зь ім у рамане-эсэ з загалоўкам «Чароўнае дрэва: Узьнікненьне псыхааналізу ў 1785 годзе», у якім імя нашага героя зьяўляецца ў сьпісе пэрсанажаў на другой пазыцыі, у суправаджэньні наступных словаў: «малады лекар зь Вены, характар пасіўны, здольны да навучаньня, спэкулятыўна адораны, эратычна паліморфны пры аказіяналістычнай прынцыповай пазыцыі, тып псыханаўта». Відавочна ідзецца пра амалоджанага на сто гадоў брата слыннага венскага псыхоляга. Але ван Лейдэн ніколі не напіша ні кнігу з загалоўкам «Тлумачэньне сноў», ні эсэ пра дыскамфорт у культуры. Ягоная манера вынаходзіць «псыхааналіз» значна адрозьніваецца ад прапановаў ягонага пазьнейшага венскага калегі. Яму даводзіцца мець справу з досьведамі, якія ўказваюць на больш глыбокія карані чалавечых разладаў і на больш раньнія пачаткі дыскамфорту ў сьвеце, чым тыя, якія прывялі Фройда да фармуляваньня ягонай тэорыі Эдыпавага комплексу. Ван Лейдэн не пакідае аб'ёмнай спадчыны, толькі два лісты, першы пра абывацельскую дэманалёгію – навуку, якая больш вядомая пад яе афіцыйным імем «псыхалёгія», – другі пра флюідальную рэвалюцыю новага часу, якая была выкліканая грашыма, навінамі і іншымі электрызуючымі рэчамі, і яшчэ крыху прэтэнцыёзны нарыс антрапалёгіі, які быў апублікаваны пад назовам «Tractatus psychologico-philosophicus». Аднак ключавым дакумэнтам пра Лейдэнаву псыхалягічную экспэдыцыю ёсьць пратакол сну, схаваны ў 18-м разьдзеле кнігі. Запісанае тут мае

якасьць таго, што называюць ініцыяцыйнымі снамі. Іхная адметнасьць палягае ў тым, што яны не паслугоўваюцца іншаказальнымі вобразамі для кадаваньня патаемных думак-мараў. У іх часам праяўляецца вобразная мова абяззбройвальнай і застрашальнай беспасярэднасьці, як быццам душы надакучыла гуляцца з сымбалічнымі кадаваньнямі і яна хоча як мага больш адкрыта прызнацца ў сваіх зьместах. Сон ван Лейдэна паказвае знутры недаступны пачатак жыцьця; ён паказвае тое, чаго людзі звычайна ня могуць уявіць. Ён аднаўляе падзею, пра якую большасьць людзей мае адчуваньне, што іх саміх пры гэтым нібыта не было. Толькі пазьней бацькі перадаюць нам, калі гэта здарылася, і ласкава ўнушаюць нам, што трэба сьвяткаваць штогадовы зварот гэтага дня. Але ван Лейдэн сьцьвярджае, што ведае гэта сам. Ён адмежаваўся ад чутак, ягонае падарожжа ў аўтабіяграфічны падземны сьвет вядзе далей за традыцыю. Нібы асьвечаны Арфэй, ён спускаецца ў свой уласны цень. Ён сьніць:

Прастору... напаўняла бурчаньне. Як ён вызначыў праз хвілю, яно ішло зь яго ўласнага рота. Ягонае цела пачалі абвіваць працяглыя крыкі. Хутка ён быў шчыльна спавіты ніткамі, якія выбіваліся зь яго рота. Чым больш гэтых нітак ён выціскаў зь сябе, тым марудней пачынаў цягнуцца час. Чаканьне разбухла ў ягоным роце, як кляп. На паднябеньні пачало разрастацца сіняе глыбокае скляпеньне, зь якога, боўтаючыся, зьвісалі ў грудзіну і пройму жывата мэталёвыя пласьціны, і калі яны стукаліся адна аб адну, чуўся высокі звон... Час рос далей і далей і стаў катаваньнем, якое ня мела канца. З нутра болю выбівалася бясконцае Цяпер, унікнуць якога было сэнсам жыцьця...

Ён адчуў кроў на паднябеньні, а на патыліцы ўдушальны захоп. Ад насавой косьці ў чырвона міргаючы сусьвет галавы прабіваўся сьмяротны ціск. Як кіслата, роспач разьядала сабе дарогу празь яго нутро, і зазьзяў той страх, зь якім жыцьцё ўпершыню незваротна пачынае пачувацца страчаным і абмежаваным...

...ён ішоў уброд за плыняй у цёмны тунэль... аж урэшце плынь імкліва паднялася паміж яго ног. Сьцены падземнага каналу

сталі мякчэйшыя. Яны хісталіся, як шлянгі, якія зьвіваюцца пад цяжарам цякучых паўзь іх масаў... Ён баяўся захлынуцца ў кіслай жыжцы тунэлю. Плынь малаціла ў вушы. Аднекуль здалёк яна несла ў ягоную галаву глухія крыкі і стогны. Плынь пачала больш рэзка тузаць яго цела. Сьценкі-шлянгі выціснулі яго ўніз у трубу, у канцы якой зеўрала сьляпучая шчыліна. Гэта было ўвасабленьне жаху. Яму ні за што ня вытрываць такога вострага жаху. Накаціла пурпуровая прыліўная хваля, захліснуўшы яго па грудзі; яна прасьлізнула ад падэшваў яго ног да жывата, бы вялікая электрычная панчоха. Ён зь бясконцай лютасьцю прыціскаўся да трубы, у канцы якой тачыла свае нажы сьвятло. Прыліўная хваля зь фіялетавымі іскрамі яшчэ раз пракаціласа паўзь яго цела, якое бясконца павольна падала, пакуль не набегла яшчэ адна хваля, захліснуўшы яго зь зеленаватым сьвячэньнем, і іншыя хвалі, якія блакітней і сьвятлей пеніліся ў ягоным целе. Частка яго ўжо была звонку, аддадзеная лютаму сьвятлу. Ён прайграў, і адначасова ён перамог у змаганьні, у якім яму ня варта было б выйграваць...

Пачало пячы нешта кіслае, халаднаваты, вялікі агонь апаліў ягонае нутро, занялася полымем горыч, і ў галаве запалымнеў незабыўна балючы пах хлёру і сьвятла, кіслаты і быцьця. Апошняя хваля пракаціласа паўзь яго і стала крыкам, які падняўся ад ног і вырваўся на волю праз адтуліну рота. Гэта быў крык трыюмфальнай роспачы і намеру – адгэтуль назаўжды непазбыўнага – пранікнуць у іство гэтага жаху, каб зразумець сэнс гэтай катастрофы. Паміж ягоных скроняў грымелі званы сьвятла...

(Sloterdijk P. Der Zauberbaum. – Frankfurt/Main, 1985. c. 240–242.)

Спадарства, спадзяюся, што на наступнай лекцыі мне ўдасца прадставіць вам развагі, якія высьветляць тое, што вы толькі што пачулі. Я буду гаварыць пра прыроджаную сьлепату філязофіі і пра акушэрскае мастацтва Сакрата. Пры гэтым міту, быццам дзяцей прыносіць бусел, дастанецца ў другі раз. Першым разам саступіць перад асьветай мусілі дзіцячыя сэксуальныя тэорыі. Цяпер гэта будуць казкі дарослых.

3. САКРАТАВА МАЕЎТЫКА І ПРЫРОДЖАНАЯ ЗАБЫЎЛІВАСЬЦЬ ФІЛЯЗОФІІ

Спадарыні і спадары, на сёньняшняй лекцыі вырашаецца лёс усяго курсу. Я пачуваюся так, як быццам каменны госьць заступіў на пост ля кожнага выхаду з залі, каб спагнаць плату за перарасход падтасовак у апошняй лекцыі. Я ўсьведамляю, што на апошняй лекцыі прамаўляў легкадумна, бо я гуляў з тым, што амаль немагчыма ўявіць, і спрабаваў разважаць аб тым, аб чым немагчыма падумаць, пад маркай таго, што гэта неабходна асэнсаваць. Сёньня мне здаецца, што ў прыступе тэарэтычнага донжуанізму я выказаў нешта такое, што выказваць больш небясьпечна, чым запрашаць на вячэру забітага камандора. Гэта як калі б я закляў мацярок і запрасіў спачатны хаос на гарбату ў васямнаццаць пятнаццаць. Мне б хацелася, каб была ўжо дзевятнаццатая.

Але цяпер васямнаццаць шаснаццаць, і мяне, як духі помсты, перасьледуюць абвесткі, зробленыя мной мінулым разам. Абяцаньне выступіць сёньня з ідэяй радыкальнай аўтабіяграфікі супраць філязофскіх казак дарослых раптам здаецца мне пустым, бы гісторыі Мюнхгаўзэна, – нешта такое пасавала б людзям, якія лётаюць на гарматных ядрах да туркаў, альбо для тэарэтыкаў канчатковага абгрунтаваньня / гранічнай падваліны (*Letztbegrüendung*), якім не чужое нішто чалавечае, пры ўмове, што яно апрыёрнае. Але мне гэта здавалася сур'ёзным – я хацеў раскрыць прыроджаную сьлепату філязофіі. Мне ўяўлялася, што я вазьму на сябе ролю вар'ята, якую ўвесь час хтосьці займае, каб абвясьціць на кірмашовым пляцы, які яшчэ трэба больш дакладна вызначыць, другую сьмерць бусла. Я маю на ўвазе бусла, у якога вераць дарослыя, хаваючыся ў бяспамяцтва, калі ідзецца пра іхныя ўласныя пачаткі. Спадарства, вы памятаеце: мінулым разам я з пэўнай асьцярожнасьцю на працягу гадзіны выбудоўваў дапушчэньне, што адкрыць першыя старонкі ў кнізе ўласнага жыцьця, мусіць, магчыма, дарма што відавочным, здаецца, ёсьць адваротнае. Я сьцьвердзіў, што нераспазнавальныя праз спачатную цемру і склееныя забыцьцём старонкі найдаўнейшых дакумэнтаў аб нашым побыце ў гэтым сьвеце можна знайсьці і расшыфраваць.

Я хацеў зьвярнуць вашу ўвагу на, так сказаць, пратакольны скандал, які вісіць над амаль кожным жыцьцём. Бо ваш афіцыйны візыт у гэты сьвет, спадарства, так аморфна і няўцямна прадстаўлены ў вашай уласнай сьвядомасьці, як быццам вы – якісьці Ніхто, які неяк ноччу без дакумэнтаў пракраўся з поўдня празь мяжу. Шчыра кажучы, я хацеў абудзіць ваша славалюбства і падбухторыць вас да таго, каб вы абурыліся гэтым парушэньнем пратаколу. Афіцыйным гасьцям належацца афіцыйныя цырымоніі прыбыцьця – кожны чалавек, богападобны альбо не, вясёлы альбо змрочны, мае права на тое, каб яго віталі на цёмнай зямлі ў якасьці высокага госьця. Але ў нашым выпадку, здаецца, эканомілі нават на самых простых фармальнасьцях. Наш прыезд адбыўся ў цемры. Калісьці, дзесьці – пра гэта даведваюцца потым – наш самалёт апусьціўся на пасадачную паласу сьвету, афіцыйны госьць, здавалася, знаходзіўся ў коме, сонны супрацоўнік бюро запісаў грамадзкага стану выпісаў дакумэнты, якія ні пра што ня кажуць, бацькі забралі новага наведніка, нібы прайшоўшы зь ім праз мытню без дэклярацыі, і толькі шмат пазьней, пасьля гадоў непрыемных зьдзіўленьняў у некаторых гасьцей гэтага сьвету ўсплываюць сумненьні ў правільнасьці працэдуры. Чаму пры прызямленьні не было агляду ганаровага шыхту ўжо наяўнага? Чаму не чуваць было нацыянальнага ці радзіннага гімну ў выкананьні аркестру? Чаму вакол гэтай біяграфічнай апэрацыі «Ноч і туман» пануе такое глыбокае маўчаньне? І чаму час ад часу ўзьнікае падазрэньне, што да гэтага маўчаньня належаць стогны, моц якіх не запісаная ні ў якім пратаколе?

Спадарства, ужо васямнаццаць дваццаць, мой унутраны трэнэр гукае мне з бакавой лініі, каб я не цягнуў час, маўляў, яшчэ зарана трымаць мяч, і нават той, хто здаволіўся б нічыйным вынікам, мусіць ісьці наперад і адцягваць увагу брамніка суперніка. Але трэнэрам лёгка гаварыць – мой робіць выгляд, як быццам нічога ня ведае пра апатыю, якая гэтым часам апаноўвае нападнікаў усіх ліг. Спадарства, сёньня я асабліва выразна адчуваю сымптомы, характэрныя для хваробы цяжкасьці пачынаньня. У папярэдніх лекцыях я мог задаволіцца асьвятленьнем папярэдняга і разглядам структуры двайнога пачатку з розных пунктаў гледжаньня. Дастаткова было

растлумачыць, што чалавек ужо мусіць быць носьбітам надпісаў, каб пісаць, і мусіць быць ужо пачатым, каб пачынаць. Гэтыя развагі маглі паслугоўвацца простай рэгрэсіўнай лёгікай, якая зводзіць кожнае сучаснае пачынаньне да ранейшага пачатку і з-пад кожнага нібыта ўласнага пачатку выцягвае даўнейшы чужы пачатак. Калі сёньня адбываецца прэм'ера, дык толькі таму, што яна ёсьць паўторам генэральнай рэпэтыцыі, якая ў сваю чаргу згасае ў шэрагу даўнейшых рэпэтыцыяў. Калі сёньня я магу гаварыць ад першай асобы, дык гэта дзякуючы таму, што даўней нехта зьвярнуўся да мяне на «ты».

Аднак сёньня мы натыкаемся на адваротны бок праблемы пачатку. Бо ці пачаў я што-небудзь на самай справе, высьветліцца толькі пазьней. Калі тое, што я скажу сёньня, ня будзе працягам абвестак зь мінулай лекцыі, дык тое, што было раней, не было пачаткам чагосьці. Я мог бы сёньня адвярнуцца ад сказанага ўчора і пачаць што-небудзь новае – пры гэтым я мог бы трымацца па-сучаснаму і ўслаўляць маньерызм перарывістасьці, і тады я зноў мог бы закінуць і гэтае новае на карысьць іншай дэталі, і пасьля сталася б відавочным, што ўсе гэтыя жэсты былі не пачаткамі, а скачкамі, перапынкамі, канстатацыямі і іншымі відамі безвыніковай імгненнасьці. Тое, што мне належыць зрабіць сёньня, ёсьць працягам папярэдняга, якое выпрабоўвае зроблены пачатак як такі. У рэгрэсіўнай пэрспэктыве пачынаць заўсёды азначае быць пачатым; аднак з прагрэсіўнага гледзішча пачынаць заўсёды значыць працягваць штосьці ўжо наяўнае, альбо, з улікам непазьбежнай пятлі назад: быць на пачатку значыць *a priori* працягваць. У працягу выдае сябе пачатак, працяг ёсьць сапраўдным пачаткам. Кажучы: *pour écrire, il faut déjà écrire*, Марыс Бляншо дае ўзор падваеньняў, уласьцівых усім вялікім дзеясловам актаў духу і жыцьця ў адкрытай прасторы; ён мог бы таксама сказаць так: каб пісаць, трэба працягваць пісаць. Спадарства, калі цяпер, а васямнаццатай дваццаць дзьве, я перапыню гэтую спробу паэтычнага і маеўтычнага запачаткаваньня новай філязофіі, то тады я не пачаў яго два тыдні таму. Каб давесьці пачатковы характар сказанага дагэтуль, сёньня трэба зьдзейсьніць крок, які вядзе ў незваротнае. Калі сёньня грыміць, то перад гэтым бліскала – але слушна і адваротнае: калі ўперад не было маланак, то пазьней ня можа быць грымотаў, ані сёньня, ані

пасьля.

Спадарыні і спадары, мінулым разам я даводзіў, што можна адкрыць нібыта страчаную першую старонку нашай канцавой гісторыі. Цяпер я прапаную вам наступны вобраз: нараджэньне чалавека – гэта маланка, якая бліскае па-над гэтымі забытымі першымі старонкамі. Для нашай цяпершчыны гэтая падзея ёсьць ужо надзвычай далёкай навальніцай, з цэнтру якой мы, здаецца, даўно ўцяклі. Але гэтая далёкая падзея, як я мяркую, для нас ніколі не прамінула зусім, пакуль мы можам чуць яе грымоты. Падумайце: маланка нараджэньня мае дзіўную ўласьцівасьць ня гаснуць пасьля таго, як яна запалілася. Калі пры начной навальніцы разрываецца неба і навакольле на сэкунду асьвятляе маланка, пасьля гэтага цямрэча навокал нас становіцца яшчэ больш цёмнай. Маланка нараджэньня, насупраць, у пэўным сэнсе завісае ў небе, яе нават падоўгу блытаюць з самім небам, людзі прывыкаюць верыць, што сьветла, таму што сьвеціць сонца, таму што дзень, таму што функцыянуе асьвятленьне залі, але ж на самай справе сьветла толькі таму, што маланка нараджэньня не перастала сьвяціць і таму што яна, хоць сама і стала нябачнай і непрыкметнай, дапамагае ўсяму астатняму бачнаму стаць бачным. Маланка нараджэньня – гэта прасьвет, у якім рухаюцца ўсе, хто прыйшоў на сьвет. Але толькі пазьнейшы гром народзінаў можа раскатурхаць нас з прывычкі жыць у нябачным бесьперапынным маланкавым сьвятле. Час ад часу ў сьвядомасьці грыміць, калі здараюцца падзеі, тоесныя асноўнай падзеі. Іншым разам нас зацягвае вір падзеяў, якія зноў выкідваюць нас у адкрытую прастору, можа быць, нават ня зноў, а ў пэўным сэнсе ўпершыню – тады зьяўленьне на сьвет працягваецца драматычнымі штуршкамі, паўтараючы і адкрываючы адначасова. Калі ў сьвядомым жыцьці чалавек перакрочвае парог наперад і вонкі, то, як жыцьцёвае хваляваньне перад выхадам на сцэну, могуць зноў зьявіцца сымптомы, якія належаць да непараўнальных турбуленцыяў першай навальніцы. Страх і экстаз, сярод іншага, – гэта праявы таго грому нараджэньня, якому часам патрабуецца палова жыцьця, каб дасягнуць свайго суб'екта. Таму гатовасьць да страху і здольнасьць да экстазу могуць лічыцца ўскоснымі доказамі анталягічнай чуйнасьці да надвор'я, уласьцівай

паэтычным і, у рэдкіх выпадках, таксама філязофскім душам.

Спадарства, я больш не гляджу на гадзіньнік. Ідэя радыкальнай філязофскай аўтабіяграфікі ад гэтага моманту не патрабуе больш ніякіх уступаў. Цяпер я магу зрабіць ход, на наступальную сілу якога можна пакласьціся нават у самых цяжкіх сытуацыях. Для гэтага я скарыстаюся перадачай, якую зрабіў пазьнейшым філёзафам Фрыдрых Ніцшэ – я маю на ўвазе зацем з працы «Па той бок дабра і зла», які меў важкія наступствы і які гучыць так: «Паступова мне адкрылася, чым была любая вялікая філязофія дагэтуль: наймя, самаспавяданьнем яе пачынальніка і свайго роду ненаўмыснымі і незаўважнымі мэмуарамі...» Калі б гэты эпахальны сказ здабыў агульнае прызнаньне, то ён абавязкова грунтоўна памяняў бы ўсё, што да гэтага называлася філязофіяй. Ён выціснуў бы прафэсію філёзафа ў рэчышча, у якім любы думаньнік мусіў бы стацца аўтабіёграфам уласнага думаньня, магчыма, нават уласным псыхааналітыкам, паколькі найвышэйшыя формы рэфлексіўнасьці маюць займацца таксама й сваім патагенэзам. Але, як вядома, такога павароту ў філязофіі пасьля Ніцшэ амаль не заўважана, наадварот – ствараецца ўстойлівае ўражаньне, што найбольш моцныя зрухі да дэпэрсаналізацыі думаньня адбыліся ў стагодзьдзі, якое прайшло пасьля зацему Ніцшэ. Наколькі філёзафам удалося прасунуцца ў зьнішчэньні спавядальных і аўтабіяграфічных сьлядоў у сваіх тэкстах, зразумела толькі пачынаючы з Гусэрля і Карнапа, з раньняга Вітгенштайна і аналітычных філёзафаў – і з усяго таго, што было пасьля аж да сёньня, зь месячных ляндшафтаў бязьлюднага панятку.

Але гэтая канстатацыя не адказвае на пытаньне пра праўдзівасьць тэзы Ніцшэ. Бо ж можа быць, што дэпэрсаналізацыя філязофскай тэорыі ў ХХ стагодзьдзі, з свайго боку, ёсьць чымсьці накшталт нядобраахвотнага самаспавяданьня яе аўтараў, і калі там бракуе аўтабіяграфічных жэстаў, аўтатанатаграфічныя помнікі робяцца яшчэ больш прыкметныя. Між іншым, прыметнікі «міжвольны» і «незаўважны» маюць вялікую стратэгічную вартасьць – гэта яны, уласна кажучы, забясьпечылі тэзе Ніцшэ доўгатрываласьць. Дзеля іх гэты сказ пакуль застаецца

неаспрэчным, бо празь яго глыбінна-дыягнастычную пабудову ён можа заставацца слушным нават насуперак самасьвядомасьці адпаведнай асобы. Ніцшэў дыягнастычны разгляд філязофіі падобны да вынаходніцтва канапы: толькі з таго часу, калі зьявіўся псыхааналіз, можна рашыць не рабіць яго; толькі з таго часу, калі была адкрытая падсьвядомасьць, можна вырашыць ня браць у разьлік «сваю ўласную». Такім самым чынам толькі пачынаючы ад Ніцшэ філёзафы могуць адмовіцца падаваць свае тэорыі як свае споведзі. Аднак гэтыя адмовы ніяк не абароненыя ад іх прачытаньня як міжвольных прызнаньняў. Хто хоча, бачыць і ў іх сымптомы, якія выдаюць, што яны павінны схаваць. З таго часу, як у палеміцы сустрэчных меркаваньняў стала немагчыма абыходзіцца без дыягнастычных аргумэнтаў, у любым адрозьненьні меркаваньняў палягае крыніца крызісу, зь якой можа разьвіцца татальная вайна аргумэнтаў.

Спадарства, Вітгенштайн прытрымліваўся думкі, што прывітаньнем філёзафаў паміж сабой мела быць «Не сьпяшайся!», чым ён хацеў указаць на тое, што ўсё, што філёзафы выказваюць, яны звычайна выказваюць занадта рана і занадта хутка. *Дэ-факта* сучасныя філёзафы вітаюцца цывілізаванай усьмешкай, якая значыць: не заўважай па мне нічога, тады я нічога не заўважу па табе! Не зьвяртай увагі на тое, што я не даю па сабе нічога заўважыць, тады я не зьвярну ўвагі на тое, што ты не даеш па сабе нічога заўважыць! Гэта сапраўдны сэнс шмат цытаванага апрыёры камунікацыйнай супольнасьці. Гэта нецікаўнасьць, якая вядзе да неразуменьня і на якой угрунтаваная ўся найноўшая філязофія. І трэба прызнаць: гэтая дамова пра сьлепату паміж калегамі – за нешматлікімі выняткамі – працуе вельмі добра, яна гарантуе філязофскім факультэтам стабільнасьць дасягненьняў у мастацтве тлумачыць сьвет, не абцяжарваючы сабе жыцьцё больш блізкім знаёмствам зь ім.

Адным з тых, хто не прытрымліваўся такіх дамоваў, быў кагадзе зацытаваны Фрыдрых Ніцшэ. Спадарыні і спадары, аўтар «Вясёлай навукі» быў занудным эгаманам, які не баяўся ніякіх наступстваў. Ён бестактоўна дазваляў сабе заўважаць штосьці па сваіх калегах; а можа, ён проста быў безабаронны

перад праўдай, не заўважаць якой яму давалася цяжэй, чым большасьці іншых. Карацей, ён штосьці заўважаў па людзях, і паколькі любоў да людзей яму таксама давалася цяжка, зь яго лёгка выходзіла пагарда. Ён вышукваў вялікія аб'екты незадаволенасьці, каб кампэнсаваць сваю агіду захапленьнем, якое таксама можна выказаць праціўніку, чыя веліч неадпрэчная. У гэтых псыхалягічных умовах паўстае адна з самых неверагодных у гісторыі філязофіі сытуацыяў: Ніцшэ заўважае штосьці па Сакрату. Прынамсі, ён мяркуе, што заўважыў па вялікім філёзафу штосьці, чаго дагэтуль ніхто не насьмельваўся заўважыць; ён упэўніваецца ў тым, што ведае, як стаяла справа з гэтым мудрым чалавекам у рэчаіснасьці. Як быццам не было паміж імі двух тысячагодзьдзяў, ён выклікае найпаважнейшага і найбольш загадкавага пэрсанажа эўрапейскай філязофскай традыцыі на двубой. Пры гэтым Ніцшэ гаворыць так, як быццам супрацьстаіць Сакрату як сучасьнік і супернік. Празь бяспрыкладнае намаганьне ўявы ён малюе партрэт філёзафа, у якім нібы выкрываецца збачэнства, якое дагэтуль заставалася схаваным. Мае спадарыні і спадары, сёньня мы ведаем, што Ніцшэ ніколі не цікавіла размалёўваньне пабляклых школьных праблемаў думаньня рытарычнымі сродкамі. Ягоны нястрымны актуалізм паходзіць з больш гарачых крыніцаў. Ніцшэ сапраўды «мае» праблемы, пра якія многія другія аўтары толькі пішуць, ён жыве на вульканічнай глебе, якая яшчэ родзіць ад старых выбухаў праблемаў, – часам ён сам ператвараецца ў вулькан, зь якога цякуць праблемныя плыні: «Я не чалавек, я дынаміт», – гаворыць ён пры канцы свайго апошняга выбуху, сам сабе вульканоляг ці піратэхнік.

Вядомыя папрокі, якія ў Ніцшэ выклікалі падазроныя рысы вобразу Сакрата зь першага твору базэльскага прафэсара старажытнай філялёгіі: «Нараджэньне трагедыі з духу музыкі». Для Ніцшэ Сакрат уяўляе сабой першы ўзор таго, што ён называў тэарэтычным чалавекам; празь яго ў сьвет прыходзіць дэманія задуменнасьці, а зь ёй няздольнасьць аддаць належнае трагічнаму адчуваньню жыцьця старажытных людзей. Сакрат сымбалізуе аптымізм Асьветніцтва і саладжавасьць спадзяваньняў на паляпшэньне людзей праз цноту, якой можна навучыцца, ён царкоўны айцец, да якога ўзыходзяць

тэарэтычная пабожнасьць і маралізм, ад яго часу людзі сьпяваюць песьні пра чалавека добрага і іншыя філянтрапічныя арыі кастрата. Але ён таксама і першы нігіліст, у якога воля да жыцьця была зламаная хімэрамі саманазіраньня. У ім перамаглі інстынкты адмаўленьня, спарадзіўшы такую форму душы, зь якой вялікія жарсьці выганяюцца заўсёды чуйным розумам. Дух у ім ператвараецца ў вечны сьветач, утароплены ў рэшткі ўнутранага жыцьця, як панаптычнае шкляное вока. Сакрат, мяркуе Ніцшэ, наставіў заходняе чалавецтва на розум, але на хваравіты розум, які ня можа дакрануцца ні да чаго жывога, не разбураючы яго. Тым самым Сакрат нібыта зьяўляецца першым з «апошніх людзей».

Спадарыні і спадары, як вядома, антысакратаўская атака прывяла да вялікіх наступстваў у некаторых разнавіднасьцях ірацыяналізму, які шалеў перадусім у першай палове XX стагодзьдзя. Але вульгарны ірацыяналізм, як лёгка відаць, скрозь грунтуецца на непаразуменьнях і схаванай непрыязі, бо ўяўная супярэчнасьць паміж духам і жыцьцём праяўляецца толькі там, дзе пакрыўджанае жыцьцё шукае вінаватых, каб бяздушна зьвінаваціць дух у спараджэньні безжыцьцёвасьці. Некаторыя ірацыяналісты меркавалі, што могуць тут спасылацца на Ніцшэ, выяўляючы грубае неразуменьне тонкага непаразуменьня.

Каб паказаць гэта, я прапаную наноў абмеркаваць старую загадку Сакратавага нэгатывізму. Ідзецца пра тое, што падазрэньне ў нігілізьме, якое акрыляе атаку Ніцшэ супраць сакратызму, пры бліжэйшым разглядзе выяўляецца тонкай памылкай, якая закралася ў развагі Ніцшэ пра Сакратаву мэтодыку. У «Нараджэньні трагедыі» гаворыцца, што Сакрат больш не разумеў трагедыі, і з гэтага неразуменьня быццам бы пачаўся заняпад першапачатковага трагічнага думаньня грэкаў, які навонкі выяўляецца як уздым аптымістычнай і аргумэнтаванай філязофіі. Але што, калі Ніцшэ памыліўся ў найдатклівейшым пункце сваёй крытыкі? Можа быць, ён сам больш не разумеў, чаму Сакрату больш ня трэба было надаваць трагедыі як эстэтычна-рытуальнай форме нагэтулькі вялікага значэньня? Можа быць, Сакрату ўспала на вока штосьці, што зрабіла наведваньне тэатра лішнім для яго? Можа, Сакрату ня

трэба было болей глядзець разам зь іншымі на гібель герояў у безвыходных дылемах на сцэне, таму што ён вычуваў трагічны разрыў з кожнага праяўленьня чалавечага існаваньня? Перш чым пераняцца гэтымі падазрэньнямі, застаецца зафіксаваць, што Ніцшэ, на ягоную думку, заўважыў па Сакрату. Спадарства, я думаю, найбольш трапным словам для таго, у чым Ніцшэ западозрыў філязофскага спакусьніка і ягоны ўплыў, ёсьць біянэгатывізм. Каб стаць дэманам усёпранікальнага пытаньня, вялікі дыялектык павінен быў, паводле Ніцшэ, паводле сваёй натуры быць чалавекам, які ставіў пад пытаньне і адмаўляў само жыцьцё. Скрозь плятонаўскія рэдакцыі Ніцшэ бачыць у прамовах Сакрата нігілістычную перадузятасьць супраць жыцьця як такога. Спрабуючы пытаньнямі выкрываць беспадстаўнасьць меркаваньняў сваіх сучасьнікаў, Сакрат кіраваўся не высакароднай любоўю да ісьціны, а ўсёахопнай нянавісьцю да жыцьця, зь якога прарастаюць непазьбежна няправільныя меркаваньні. На самай справе вялікі пытаньнік кіруецца гнятуча вялікім жаданьнем паказаць, што любое меркаваньне, якое можна сустрэць, заблытаецца ў сваіх унутраных супярэчнасьцях, як толькі будзе паддадзена праверцы. Але паколькі любое жыцьцё выяўляецца чымсьці, што падманвае само сябе няправільнымі меркаваньнямі, то ў канцавым выніку скампрамэтаваным выяўляецца ўсё сапраўднае жыцьцё. Калі ў меркаваньнях тых, хто жыве, няправільнасьць і неабгрунтаванасьць ганебна ўсюдыісныя, тады ў канцавым выніку няправільным і неабгрунтаваным ёсьць рэальнае жыцьцё. І такім чынам, як мяркуе Ніцшэ, за сакратаўскім шаленствам пытаньняў адкрываецца біянэгатыўная бездань – найноўшы слоўнік мае для гэтага агідны спэцыяльны тэрмін нэкрафілія. На самай справе чытач Плятона і сёньня можа жахацца тым месцам, дзе Сакрат гаворыць пра памкненьне філёзафаў быць як мага больш мёртвымі жыўцом. Калі ўчапіцца ў гэтыя словы, то самыя цяжкія папрокі Ніцшэ на адрас патрыярха эўрапейскай філязофіі пададуцца хутчэй занадта мяккімі, чым занадта рэзкімі. У сьвятле такіх выказваньняў Сакрат можа выглядаць спакушальнікам да самагубства, які маскуецца пад мудрую абачлівасьць.

Спадарства, да падазрэньня Сакрата ў біянэгатыўнасьці я хачу

даць двайны камэнтар, пазытыўны і нэгатыўны. Для гэтага я акрэсьлю, як Ніцшэ не зразумеў Сакрата – зь непасрэднай блізіні і ў фатальнай інтымнасьці зь незразуметым фэномэнам. Ніцшэ – адзін зь нямногіх філёзафаў новага часу, магчыма, адзіны варты згадкі, які яшчэ раз аглядае дэманічнага пытаньніка на ўзроўні вачэй – таму ён ня ставіцца да яго ні як да дзядзькі, ні як да традыцыйнага сьвятога, але як да фатума. Ён адчувае ў Сакрату маланку, зь якой пачалася эпоха мэтафізычнага мысьленьня. У нэгатывізьме атэнскага дыялектыка ўспыхвае штосьці ад таго самага цьмянага сьвятла, якое адначасова загарэлася ў вялікіх школах азіяцкіх нэгатывізмаў, каб цалкам не пагаснуць да сёньня. На самай справе Сакрат, як зараз будзе паказана, думае пасярод маланкі, зь якой узьнікла філязофія, але толькі Ніцшэ пачуў гром. Мінула дзьве тысячы гадоў, перш чым іншы думаньнік трапіў у абсяг чутнасьці навальніцы, у якой была народжаная філязофія – вось колькі часу спатрэбілася, каб мэтафізыкі ды філёзафы азадачыліся сваёй уласнай справай. Магчыма, столькі часу мусіла прайсьці, таму што філязофская традыцыя ў цэлым паводзіць сябе – калі ідзецца пра адкрыцьцё першых старонак яе быцьця – як звычайны індывід, які ня памятае свайго нараджэньня. Яна ня згадвае з аўтабіяграфічным агнём той драмы, якой яна заўдзячвае сваё быцьцё – дзеля чаго, між іншым, гартаньне папулярных гісторыяў філязофіі зазвычай гэтаксама тупы занятак, як і гартаньне сямейных альбомаў, дзе можна ўбачыць, як бліскуча голае немаўля сучыць ножкамі на ягнячай скуры. Бо падобна да таго, як фатаграфіі толькі паказваюць, як выглядала колішняе дзіця, але не выдаюць таямніцы, якая палягала ў быцьці гэтым дзіцем, так і звычайныя гісторыі філязофіі адно перадаюць, што выказвалі паважаныя старажытныя грэкі і індыйцы, але не выдаюць таямніцы, якая палягала ў быцьці думаньнікамі на сцэне ў той час мысьленага. Ніцшэ належаў да тых, хто, чэрпаючы з большай глыбіні ўспаміну, пачаў асучасьніваць старыя духоўныя напяцьці бы знутры. Нападаючы на Сакрата, ён узнаўляе канфлікт у вырашальным месцы – быццам бы ведаючы, што пытаньні сучаснасьці нельга зрушыць ні на палец, калі ня ўдасца крытычней, чым дагэтуль, паназіраць Сакрата, гэтую павітуху заходняй філязофіі, за ягоным заняткам.

Цяпер нам вядомыя праблемы, якія вынікаюць з таго факту, што вучэньне Сакрата дайшло да нас толькі скрозь плятонаўскі вэлюм. Тое, што было пад вэлюмам, ніколі ня зможа быць рэканструявана беспасярэдне – хіба што мы знойдзем нейкі «беспасярэдні» доступ да загадкі Сакрата, уявіўшы з дапамогай сучасных актуалізацыяў падзею, акторам і сьведкам якой быў Сакрат. Тое, чаго насамрэч хацеў Сакрат, больш выразна, чым у Плятонавых зафарбоўках, можа праяўляцца ў крызісах некаторых найноўшых думаньнікаў, у якіх сакратаўская праблема паўтараецца з настойлівасьцю чагосьці абсалютна абавязковага да асэнсаваньня. Там, дзе церпіць няўдачу філялёгія, драма часам ідзе далей – але якая драма? Сакрат не пакінуў ні радка, і дагэтулешнія спробы прыстасаваць да вуснага опусу філёзафа нейкі загаловак аказваліся так мізэрна несамастойнымі, што ня робяць думаньніку гонару; мы даволі іх ведаем, гэтых гістарычна-філязофскіх спробаў неяк азначыць вучэньне Сакрата: каралеўскі шлях няведаньня, філёзаф на вуліцы, філязофія як мастацтва памяць, дыялектыка як мэтад цноты, маеўтыка як мужнасьць да выхаваньня. Адзіная самастойная найноўшая канфрантацыя з сакратаўскім духам носіць здагадлівы загаловак «Нараджэньне трагедыі» – і калі слушным ёсьць маё падазрэньне, што псыхадынамічная ўстаноўка, зь якой выходзіць Ніцшэ, мае прынцыповыя падабенствы з адпаведнай пазыцыяй Сакрата, адно што Ніцшэ ўспрымае пукаты бок таго, што Сакрат праектаваў з угнутага, – тады рэканструкцыя ў псыхадраме паміж двума роднаснымі духамі магла б прывесьці да пераварота элемэнтаў. Тады ў цэнтры сакратаўскай філязофскай практыкі мы знайшлі б ненапісаную працу з загалоўкам «Трагедыя нараджэньня». Ніцшэва «Нараджэньне трагедыі» было б громам, зьніклая маланка якога ўспыхнула ў сакратаўскай сьвядомасьці трагедыі нараджэньня. Цяпер афарызм Ніцшэ, паводле якога ўсялякая вялікая філязофія ёсьць самаспавяданьнем яе аўтара і свайго роду міжвольнымі і незаўважнымі мэмуарамі, можа пачынаць працу над перададзеным матэрыялам. Але, спадарства, хіба Сакрат рабіў выказваньні, якіх нельга падазраваць у тым, што іх перакруціў Плятон, і якія можна прачытваць як незаўважныя мэмуары? На самай справе сярод выказваньняў Сакрата пра самога сябе ёсьць як мінімум два, адно ў «Сымпазіёне», другое ў «Тэайтэту», у якіх, як мне здаецца, ёсьць самахарактарыстыкі

найвышэйшага ўзроўню абавязковасьці. Па-першае, Сакрат у «Сымпазіёне» прызнае, што ўсё, што ён даведаўся пра эрас, было перададзена яму Дыятымай шляхам ініцыяцыі. З гэтага вынікае пікантная выснова, што эўрапейскі архіфілёзаф у вырашальных рэчах верыў не ў аргумэнтацыю, а ў ініцыяцыю. Тут маюць значэньне ня сказы, а «кантакт» паміж суразмоўцамі. Як эратоляг Сакрат не тэарэтык, хутчэй, правакатар: тое, пра што ён гаворыць, мае рэальнасьць толькі ў сілавым полі ягонага спакушэньня. Без адданасьці спакушэньню «няма» ўсіх тых фэномэнаў, пра якія апавядае прамова спакушальніка. Як толькі «кантакт» паміж суразмоўцамі спаўзае ў аргумэнтаваньне, выяўляецца той факт, што воля не аддаваць сябе можа быць мацнейшай за запрашэньне спакусіць сябе. Па-другое, Сакрат у «Тэайтэту» – асновазакладным творы эпістэмалёгіі – падымае пытаньне: «Што такое веда?» (прычым трэба заўважыць, што толькі пытаньне як такое можа быць сакратаўскім пытаньнем, у той час як спроба пазытыўнага адказу сама па сабе ўжо вядзе ў сьвет плятанізму). Аўтэнтычна сакратаўскаму духу, здаецца, належыць перадусім тое, што разьвіваецца ў выніку гэтай пастаноўкі пытаньня. Матэматычна адораны юнак Тэайтэт прызнае, што часта, аднак заўсёды марна ламаў сабе галаву над гэтым. Славуты адказ Сакрата на гэта:

– У цябе болі нараджэньня, мілы Тэайтэт, таму што ты ходзіш не парожні, а цяжарны.

На што Тэайтэт:

– Гэтага я ўжо ня ведаю, але як я пачуваюся, я табе сказаў.

Сакрат:

– Дык ты, сьмешны, хіба ніколі ня чуў, што я сын павітухі, вельмі слыннай і шаноўнай, Файнарэты?

Тэайтэт:

– Гэта я, мусіць, чуў.

Сакрат:

– А ці чуў ты таксама, што я практыкую гэтае ж мастацтва?

Тэайтэт:

– А вось гэтага ані.

Сакрат:

– Тады ведай: гэта так. Але не выдавай мяне іншым, бо ніхто пра мяне ня ведае, сябра, што я валодаю гэтым мастацтвам. Ня ведаючы гэтага, людзі гэтага пра мяне й ня кажуць, але кажуць, што я найдзіўнейшы з усіх людзей і ўсіх прымушаю сумнявацца. Напэўна, ты і гэта чуў.

Тэайтэт:

– Шматкроць.

Сакрат:

– Сказаць табе прычыну гэтага?

Тэайтэт:

– Натуральна.

Сакрат:

– ... ты, напэўна, ведаеш, што ніводная жанчына, пакуль яна яшчэ здольная сама зачынаць і нараджаць, не прымае роды ў другіх; а робяць гэта толькі тыя, хто самі ўжо ня здольныя нараджаць... у маім мастацтве прымаць роды такія ж правілы, як і ў іхным; яно, аднак, адрозьніваецца тым, што я дапамагаю нараджаць мужчынам, а не жанчынам, і што я клапачуся пра іх душы, якія нараджаюць, а не пра целы... я (сам) не нараджаю ніякай мудрасьці, і многія, хто папракаў мяне ў тым, што я хоць і пытаю іншых, але сам нічога ні пра што не адказваю, а менавіта таму, што я ня змог бы адказаць нічога разумнага – у гэтым яны маюць рацыю. Але прычына гэтага такая: чыніць дапамогу пры нараджэньні мяне прымушае Бог, стварaць жа ён

мне забараніў. Таму сам я ні ў якім выпадку ня мудры і не магу паказаць нічога мудрага, што было б спараджэньнем маёй уласнай душы...

(Platon. Sämtliche Werke, II–Berlin. – c. 572.)

Гэтыя выказваньні ў традыцыі мужчынскай філязофіі амаль заўсёды чыталіся як шэраг сакавітых пэдагагічных мэтафараў, у найгоршым выпадку як пэдэрастычная сугестыя, якая павінна была схіліць маладых людзей разьвесьці ногі душы перад гатовым быць павітухай філёзафам. Але абодва прачытаньні, мэтафарычна-дыдактычнае і гомаэратычна-стратэгічнае, няправільныя альбо магчымыя адно як маргінальныя. Я хацеў бы паказаць, што легітымным ёсьць толькі літаральнае і радыкальна-аўтабіяграфічнае прачытаньне гэтага месца. Павітусіна прамова Сакрата прадстаўляе ягоныя самаспавяданьні і дае вузлавыя сказы ягоных мэмуараў, пра якія, праўда, трэба сказаць, што яны засталіся «незаўважнымі», аднак не былі «міжвольнымі». Няправільна іх зразумеў ужо Плятон, і няправільна зразумеў іх таксама Ніцшэ, які меркаваў, што распазнаў у Сакраце павітуху сусьветна-гістарычнага выродка, маральна-тэарэтычнага чалавека, дзеля чаго ён і выклікае фатальнага, як яму здаецца, маеўтыка на двубой. Але і ў неразуменьні Ніцшэва разуменьне Сакрата, дзеля ягонай люстэркавасьці, пераўзыходзіць іншыя філязофскія інтэрпрэтацыі.

На маю думку, Сакрат, у тым ліку і як філёзаф, ні на хвіліну не забывае таго, што ён ведае ад сваёй маці, павітухі, пра прагматычны бок фізычнага прыходу ў сьвет чалавека. Таму ён вельмі ясна бачыць тое, ад чаго іншыя адвярнуліся, перш чым пачалі думаць: не бывае шчасьлівых народзінаў і не бывае спакойных родаў, нават цела прыходзіць на сьвет зь вялікімі намаганьнямі, душа ж амаль заўсёды застаецца ў цемры, і таму выкідышы ў людзей ня вынятак, а правіла – гэта асабліва датычыць меркаваньняў, якімі мы падмацоўвалі нашую ілюзію прыходу ў сьвет. Досыць задаць колькі дадатковых пытаньняў – і высьвятляецца, што ў нас у галаве выродкі, псэўдаўяўленьні, схемы, фікцыі, фальшыўкі, застылыя меркаваньні-монстры і лягічныя неданосткі. Наш мозг – гэта падземны сьвет, які

блытае сябе зь дзённым сьветам, у большасьці ён на працягу ўсяго жыцьця застаецца населеным ценямі ды ідыятызмамі, самаўпэўненымі няслушнасьцямі і ганарыстымі беспадстаўнасьцямі, нікчэмнымі клопатамі і пыхлівымі аўтапартрэтамі. Гледзячы на гэтыя ўнутраныя станы, Сакрат практыкуе прафэсію трагічнай павітухі: якія б «роды душы» яму ні прапаноўвалі, ён заўсёды *можа* фіксаваць толькі мёртванароджаньне. Чым мацнейшыя перакананьні, тым больш зьнішчальныя абвяржэньні. Чым больш самаўпэўненая вера ў абсалютныя падмуркі, тым глыбейшае падзеньне ў сумневы. Яшчэ Плятон ня вытрываў маеўтычнага нэгатывізму свайго настаўніка і ўрэшце пачаў выдаваць на-гара пазытыўную веду, так сказаць, жыванароджаную веду, якая вытрымлівае праверку разбуральнай павітухі. Прыроджаныя ідэі – гэта геніяльнае вынаходніцтва Плятона, пакліканае сарваць сьмяротны экзамэн пад паглядам павітухі Сакрата. Зь нецярпеньня Плятона вынікла тэорыя ідэяў і зьвязаная зь ёй тэорыя ўспаміну, і, зноў жа, абумоўленая ёй нэгатыўная тэорыя нараджэньня, якая сьцьвярджае, што душа забываецца на свае прыроджаныя ідэі, калі прыходзіць на сьвет – адсюль апраўданьне філязофіі як школы ўспаміну душы на сваю перадбыцьцёвую веду. Пра ўсё гэта Сакрат, верагодна, вучыў ад супрацьлеглага, альбо, хутчэй, займаўся інсцэнаваньнем замест вучэньня: душа мае згадваць зусім не ідэі, прыроджаныя альбо набытыя, – яна мусіць успомніць само сваё нараджэньне, каб вярнуцца да часу перад жыцьцём у набытых меркаваньнях, у пачатковую багатую думкамі бяздумнасьць. Каб стаць здольным да гэтага, усе існыя ідэі пра значныя жыцьцёвыя пытаньні, адна за другой, мусяць быць прапрацаваныя і ануляваныя, нават найбольш праўдападобныя і высакародныя думкі павінны быць пераведзеныя ў такі стан, у якім яны лунаюць паміж слушнасьцю і няслушнасьцю, так што яны губляюць усялякую вызначальную сілу. Але гэта не скептычны рэлятывізм, гэта маеўтычны абсалютызм. Сакрат ня мае намеру, як пазьней Плятон, дапамагчы душы набыць сувэрэнітэт над цьмянымі пануючымі меркаваньнямі; зноў жа, Плятонаву ідэю прыроджаных ідэяў яму давялося б прызнаць звыродкам. Што яго пераймае, дык гэта самі душы, якія заўжды нараджаюцца з паталёгіяй, якія набываюць меркаваньні і захрасаюць у закасьнелых уяўленьнях. Але меркаваньні і ўяўленьні паводле

іх узьдзеяньня – гэта ня што іншае, як парушэньні здольнасьці браць удзел у гульні эрасу. Апанаваныя імі душы трэба ўзрушаць, злаваць, сарамаціць, вярэдзіць, абяззбройваць праз нэгатыўную дыялектыку, пакуль яны ў сьмяротнай барацьбе ня вызваляцца ад перадузятай думкі, каб адчуць павеў свабоды духу, які дзьме ў раі бяздумнасьці. Іранічнае ў Сакрату тое, што ён гаворыць без іроніі, запэўніваючы незьлічоную колькасьць разоў, што ён ведае толькі тое, што ён нічога ня ведае. Перад гэтым найвядомейшым з усіх эўрапейскіх філязофскіх афарызмаў камэнтатары ўжо два тысячагодзьдзі стаяць у чарзе, добрага дзядзьку няведаньня хваляць, захоўваючы пераканаьне, што ён ведаў больш – вось жа рэфлексіўны шальмец быў!

Але тое, што Сакрат гаварыў пра гэта без іроніі, хіба што ён сам аддаўся гульні, якая аказалася большай за яго, – гэта было не зусім зразумела ўжо ягонаму беспасярэдняму атачэньню і пагатоў ягоным нашчадкам. І Плятонава іронія дае толькі бляклы водбліск поўнага самавыстаўленьня Сакрата ў няведаньне. Толькі тое, што яго павітусіна прамова была больш чым гульнёй словаў, што яна датычыла цэнтру ягонай экзыстэнцыі – гэта ягоныя сучасьнікі адчувалі ўсё-такі выразна; іначай дзень народзінаў вялікага маеўтыка ў антычнасьці не адзначалі б, як сьведчыць Дыяген Ляэрцкі, у дзень ушанаваньня грэкамі багіні родавай дапамогі Артэміды. Толькі ў гэтым кантэксьце можна зразумець і парадокс, які заключаны ў Сакратавай прыпавесьці пра павітуху. Згодна з грэцкай традыцыяй, павітухі – самі няплодныя жанчыны, таму багіня-дзяўчынка, якая баіцца мужчынаў і палюе ў лесе, можа лічыцца патронкай павітух. Сакрат, з свайго боку, выконвае працу павітухі для мужчынаў, і тут дзіўнае: як ягоная маці. Але хіба ягоная маці была няплодная, калі яна падаравала жыцьцё Сакрату? Хіба ён сам ня ёсьць жывым доказам ейнай плоднасьці? Здаецца, загадка рашаецца, калі прыняць пад увагу той факт, што павітухі – гэта жанчыны, якія, як Файнарэтэ, нараджалі, але ўжо выйшлі зь дзетароднага ўзросту. Мудрымі жанчынамі яны становяцца толькі тады, калі перарастаюць уласную нямудрасьць нараджаць на сьвет уласных дзяцей. Якраз у гэтым падмурак спасылкі Сакрата на сваю мудрую маці. Ягонае нежаданьне спараджаць на сьвет пазытыўныя веды

зьяўляецца выразным рэфлексам на ягоную дзіўную сытуацыю як сына павітухі. Сакрат прамаўляе як мудры сын мудрай жанчыны – ягонае насьледаваньне мацеры заходзіць так далёка, што ён саму мудрасьць зьвязвае з дасягненьнем няплоднасьці. Толькі калі ён сам дасягнуў таго, што ня здольны больш спараджаць на сьвет ніякіх меркаваньняў і тэорыяў, ён можа ўзяцца за задачу прымаць роды ў цяжарных меркаваньнямі і тэорыямі. Але ня толькі гэта. Як сын павітухі, ён удзельнічае ў німбе жанчын, якія дапамагаюць пры родах, а сэнс німбу – ведаць штосьці з найтаямнічага, што могуць уведаць людзі. А калі павітуху, як Сакратаву маці, яшчэ й клічуць Файнарэтэ, то нават фэнамэноляг павінен быў бы падняць на хвілю вочы ад сваіх апісаньняў. Ці гэтая жанчына-фэнамэноляг ня бачыла, як узыходзіць праўда, якую і Гайдэгер спрабаваў падумаць зь вялікімі намаганьнямі? Ніцшэ, ва ўсялякім разе, вычуваў у ісьціне наагул тую недасяжную жаноцкую веду, якая мае падставы не паказваць сваіх падставаў – ён нават меркаваў, што яе клічуць Баўбо, «ці мушу я казаць яшчэ дакладней?», філёзафы сапраўды мусяць, таму што Баўбо – гэта вагіна, гэта жаночы палавы орган у самай бессаромнай ступені, які насьмешліва падстаўляецца мужчынскаму насельніцтву для кароткага марнага азнаямленьня. Баўбо – гэта вульва *a priori*, якая прапануе разумным *a posteriori* філёзафам спачатныя падставы сусьветнай мудрасьці і іх жа хавае.

Але як трэба разумець тое, што Сакрат, сын павітухі, які напэўна ўведаў больш за іншых юнакоў, сам зрабіўся павітухай для мужчынаў і для душаў?

Вось жа, я мяркую, што тайна Сакрата ў тым, што ён ёсьць апошнім матчыным сынам даўнейшага тыпу, які здолеў здабыць сабе славу ў заходняй ідэйнай традыцыі. Пазьнейшыя героі духу – гэта ўсё ўжо бацькавы сыны, уся веда якіх вынікае са здольнасьці да радыкальнага абстрагаваньня ад жаноцкасьці. Пасьлясакратыкі ўжо ня маюць сьвядомасьці баўбо, разважаючы пра ўзьнікненьні наагул. Іхнага бусла клічуць прычыннасьць, цяпер прычыннасьць прыносіць дзяцей і праз гатовае да гэтага матуліна рэчышча кідае іх у быцьцё – каго ж зьдзіўляе, што пацярпелыя ад кінутасьці ў сьвеце, які

цяпер стаў цалкам чужым, ужо ня здольныя ўсьцешыцца з свайго становішча. Але ў выпадку Сакрата гэтага яшчэ не адбываецца. У якасьці павітухі для душаў ён апошні захоўвае балянс паміж мудрай арыентацыяй на мацярынскасьць і тэарэтычнай школьнай работай, якая адбываецца выключна паміж квазібацькамі і квазісынамі. Таму ў камунікацыі з амбітнымі супэрразумнымі сынамі Сакрат мусіць стаць забойчай павітухай, ад дыялектыкі якой паміраюць меркаваньні, ідэі, галаўныя нараджэньні. Каб душа прыйшла на сьвет, а нашае найлепшае знайшло сябе і іншых, нельга, каб у ёй угнязьдзіліся вызначальныя ўяўленьні і пазытыўныя пераканаьні. Каб упільнаваць такія гнёзды, Сакратава маеўтыка пасьлядоўна дзее выкрывальна і разбуральна. Яе мэта – завесьці суразмоўцаў у абсяг усёахопнага сьветлага няведаньня і дапамагчы ім усьвядоміць нетрываласьць і збыткоўнасьць усіх існых цьвёрдых меркаваньняў. Амаль 2500 гадоў перад Попэрам Сакрат вучыў ведзе, што ніхто ня ведае. Для гэтага працэсу гісторыкі ідэяў маюць няўцямны выраз пра веданьне няведаньня, празь які зноў пракрадаецца акцэнт на веданьне, які закаламучвае свабодна ўзважаную яснасьць няведаньня новым падкрэсьліваньнем веданьня – так адбывалася ад Плятона да Гегеля і ва ўсіх праявах фэномэну «веданьне-гэта-сіла» да сёньняшняга дня.

Спадарства, цяпер можна выразіць нявыказаны прынцып дзеяньня Сакратавай маеўтыкі: родадапамога для душы зьдзяйсьняецца праз тое, што душа з дапамогай абвяржэньняў і зьбянтэжаньняў прыводзіцца ў безвыходныя становішчы, празь якія яна вяртаецца ў падвешаны стан няведаньня. Калі думаньнік ня ведае, як быць, ён ужо недалёкі ад мудрасьці. Парадаксальным чынам душа тых, хто думае, зьяўляецца на сьвет чыстай толькі тады, калі яна пераводзіцца ў стан зародкавай нэгатыўнасьці, у якім немагчыма ўтрымліваць меркаваньні з боку сьвету. Такім чынам, маеўтыка – гэта мэтад пераводу ў зародкавы стан. Яе акцэнт на няведаньні такі настойлівы таму, што душа, якая не паступаецца сваёй арыентацыяй на «ісьціннае», неабходным чынам мусіць набыць форму, якая нават ува ўмовах народжанасьці і набытай у сьвеце дасьведчанасьці ў пэўных рэчах успамінае ненароджанае немеркаваньне як сваё зародкавае апрыёры. Гэта цалкам іншы

анамнэзіс, чым анамнэзіс Плятона – яго можна было б назваць эратычным. Ён вяртаецца да тугі, якая перасягае любы прадмет. Эратычны анамнэзіс не выклікае прыроджаных ідэяў, ён асучасьнівае перадродавую беззаганную свабоду ад ідэяў і ўяўленьняў любога кшталту. Адпаведна, рабоце эратычнага ўспаміну спадарожнічае родавы боль. У той час як пазытыўныя аргумэнтацыі ў найлепшым выпадку разгарачаюць галовы, у найгоршым прыводзяць да войнаў, прарыў праз шкарлупіну пазытыўнасьці стварае інтэгральны ўспамін пра схваткі. Бо перш чым зародкавы кантынуўм адновіцца таксама і ў сьветлым як дзень сьвядомым жыцьці, трэба прадумаць і прачуць шлях па-за бар'ер забытасьці нараджэньня. Пра тых вучняў, якія ўсур'ёз заглыбляюцца ў прыгоду эратычнага анамнэзісу, Сакрат як знаўца кажа:

... тыя, хто суполяцца са мной, у гэтым пачуваюцца, як парадзіхі: наймя, яны маюць схваткі і ні ўдзень, ні ўночы ня ведаюць, што з сабой рабіць, нашмат горш за парадзіх. І гэтыя схваткі маё мастацтва можа як узбуджаць, так і сьцішваць. (Тамсама, II. с. 575.)

Тыя, хто суполяцца са мной – тут утрымліваецца ўказаньне на асаблівасьць філязофскага рапорту, у якім псыхагог, як псыхааналітык *ante litteram*, прафілюецца ў якасьці спэцыяліста па немагчымым жаданьні. *Нашмат горш за парадзіх* – гэта дае зразумець, што ў схватках жанчын выяўляецца толькі частка пакутаў, якія могуць пачацца, калі ў патрэбе сьвядомасьці дарослых мужчынаў прыход на сьвет рэпрадукуецца ў цэлым і як знутры. У той час як жанчыны заўжды маглі знайсьці спрат у нараджэньні на сьвет дзяцей, каб адказаць на *difficulté d'être*, мужчынская сьвядомасьць адзначаная неабходнасьцю самому зьявіцца на сьвет.

Здаецца, што Сакрат быў апошнім вялікім эўрапейскім думаньнікам, які ў гэтых трагічных дэкарацыях пачуваўся як рыба ў вадзе. Калі чытаць павітусіну прамову з «Тэайтэта» даслоўна, як у канцавым выніку не іранічнае самаабвяшчэньне Сакрата, то ў ёй раскрываецца від на абыякава трагічную практыку філязофскай псыхагогікі. Таму, хто дыскутуе з

Сакратам, ня трэба быць героем, каб адчуць, як у яго ўласным жыцьці зеўрае прагаліна безвыходнасьці. Сакрат – адзін з апошніх эўрапейцаў, якія прытрымліваюцца архаічнай веды аб тым, што мужчынскія сьвядомасьці без ініцыяцыйнага асучасьніваньня прыходу на сьвет асуджаныя на беспрытульнасьць; таму ягоны бог прымушае яго аказваць маладым сябрам рододапамогу. Філязофія сама ператвараецца ў рытуал пераходу ў пэўны да сёньня ня вызначаны «іншы стан» веданьня, сталеньня і суіснаваньня.

Тое, што гісторыі Эўропы лёсіла трапіць на іншы курс, які вёў да ўсталяваньня фалічных унівэрсаліяў і скрыўджаньня жаноцкасьці, відаць ужо па тым шляху, якім пайшоў таленавіты вучань Сакрата. Ужо Плятон мэтафарызаваў прынцып рододапамогі. Прыпавесьць пра пячору з «Палітэі» ўтрымлівае патаемную праграму эўрапейскай сусьветнай гісторыі – адначасова гэта сьведчаньне перакладу Сакратавай маеўтыкі на мову мэтафізычных алегорыяў. Плятон яшчэ ясна разумее, што ў сакратаўскім перавароце сьвядомасьці ўсё круціцца вакол нараджэньня і родаразьвязаньня, але ягоная канцэпцыя пачатковай пячоры ад самага пачатку збачэнская; сама пячора ператвараецца ў яго ў цацачнае пекла карцінак, беззаганнае памяшканьне зародкавай нэгатыўнасьці паўстае ў падманлівай ілюмінацыі сьвятлаценяў, вар'яцкія суб'ектна-аб'ектныя дачыненьні ў ягоным тэксьце напаўняюць распушчанае ў мацярынскім улоньні быцьцё – і да ўсяго гэтага жыхары пячоры прадстаўляюцца, як прыкутыя ланцугамі рабы, якія гапяцца на скалу з тэатрам ценяў. Немагчыма пазьбегнуць высновы, што ў прыпавесьці пра пячору мы маем дакумэнт радыкальнай утэрафобіі і адначасова сьведчаньне няўдачы ў распрацоўцы зародкавага кантынуўму. Без сумненьня, Плятон зрабіў такую спробу пад уплывам Сакрата, з тым вынікам, што ў абсягу зародкава-мэдытатыўных эўфарыяў ён разьвіўся ў філязофскага экстатыка *kat exochen*. Аднак ягонай высновай з гэтага прадпрыемства былі мэтадычна кіраваныя ўцёкі ад страху ў экстаз, насустрач асьляпляльнаму Аднаму, і анталягічна так важкая прывязка да дактрыны ідэйнага рэалізму. Байка пра сапраўдны сьвет ад самага пачатку ёсьць маскарадным прадстаўленьнем, што хавае страх нараджэньня. Калі Сакрат даў прыклад экстазу праз нараджэньне меркаваньняў, дык

Плятонава экстатыка разгортвае схему разумнай апантанасьці. З гэтага часу філязофія і асьветніцтва – паролі выбару на карысьць апантанасьці рацыянальнымі, а не ірацыянальнымі дэманамі.

Калі вытлумачаць сакратаўскую маеўтыку як тэхніку пераводу ў зародкавы стан, а не як пэдагогіку, то робіцца бачнай таксама прычына таго, чаму амаль усе пазьнейшыя школьныя філязофіі адвярнуліся ад сакратызму: ужо не было нікога, асабліва пасьля акадэмічных посьпехаў Плятона і Арыстотэля, хто мог бы працягнуць «пазыцыю» няведаньня як аўтаномнае сьцьверджаньне – і кінікі, якія скіравалі матыў няведаньня на грубіянскі шлях, ужо ня здолелі аднавіць маеўтычны нэгатывізм у чыстым выглядзе. Пасьля ў Арыстотэля выбар адназначна зроблены на карысьць Эпістэмы і супраць Аматыі. Толькі некаторыя містыкі Сярэднявечча сваім вучэньнем пра ўнутраную беднасьць і рэгрэс станаўленьня трохі наблізіліся да сакратаўскай «пазыцыі», а сярод мадэрністаў Ніцшэ першы выказаў здагадку, што Сакрат даў нам губку, каб сьцерці ўвесь небасяг; але ён яшчэ аніяк не распазнаў у гэтай губцы пазытыўнае Нішто пляцэнтарнай беспэрспэктыўнасьці.

Адным з рэдкіх сучасных інтэрпрэтатараў Сакрата, хто ня даў сябе ўвесьці ў зман Плятонавымі перакручваньнямі і пазытывацыямі, зьяўляецца Міхаэль Ляндман. У сваіх працах па антычнай псыхалёгіі ён падкрэсьліў самастойнасьць Сакратавай нэгатыўнасьці і даказаў непазьбежную паралель паміж антычнай маеўтыкай і сучасным псыхааналізам, нават калі слушным ёсьць тое, што псыхааналітычная маеўтыка апэруе ў больш плыткіх эдыпальных слаях, але затое разьвівае тэрапэўтычную сур'ёзнасьць, у той час як антычная маеўтыка кратае зародкавыя глыбіні, але мае хутчэй псыхагагічныя, чым тэрапэўтычныя амбіцыі. Ляндман прадставіў матыў няведаньня ў правільным сьвятле: «Няведаньне грунтуецца… у Сакрата не на трывалай глебе веданьня, гэта не займаная час ад часу, а татальная пазыцыя. Ён ня проста бачыць рассыпаныя нявытлумачанасьці, а знаходзіцца ў цалкам нявытлумачаным сьвеце». (Elenktik und Maieutik. Studien zur antiken Psychologie. – Bonn, 1950. c. 11.) Тым самым ядро сакратызму ўтварае беспрадметная веда. Таямніца Сакратавай дыялектыкі палягае

ў рэактывацыі свабоднай ад сьвету зародкавай нэгатыўнасьці, якая пазнае сябе ў эўфарыі абсалютнага быцьця ўнутры, ня «маючы» сябе. Пасьля Сакрата эўрапейцы маглі б таксама ведаць, што людзі маюць не зьвязаную з высілкамі магчымасьць цалкам быць на гэтым сьвеце, не ўпадаючы ў грубы пазытывізм: «Я ёсьць, але я ня маю сябе...» – Ляндман разумее, што гэта тэндэнцыя, якую нялёгка ўцямна патлумачыць.

Калі любая веда мае нешта заспакаяльнае, то няведаньне, наадварот, мае нешта вельмі зьнепакойлівае і незадавальняльнае. Можна было б нават сказаць: нешта палохаючае, таму што з чорнай дзіры невядомага, зь якой нас злучае няведаньне, на нас у любы момант можа кінуцца небясьпечнае і схапіць нас. Таму большасьць звычайна не пераносіць выгляду гэтай дзіры. Яны адразу адводзяць ад яе пагляд альбо закрываюць яе хай сабе ўяўным меркаваньнем на грунце веды.

У процілегласьць гэтаму, каб успрымаць дзіру ўсур'ёз і не губляць яе з поля зроку, трэба пэўны інтэлектуальны спакой і сіла, нават мужнасьць.

(Тамсама. с. 9.)

Спадарства, як вы бачыце, калі хочаш па-філязофску гаварыць пра істотнае няведаньне, то мусіш часам выяўляць таксама і *hard-core*-якасьці. (А можа, найлепшая філязофская творчасьць ніколі не выходзіць за абсяг крытычнай баўбалёгіі? І ці не падзяляецца апошняя на баўбалягічную правіцу з Шанкарам, Плятонам, Плоцінам, Гегелем і Блохам ды баўбалягічную лявіцу з Сакратам, Нагар'юнам, Экгартам, Гайдэгерам, Ранкам і Дэрыдом?)

Спадарства, цяпер абставіны вымушаюць мяне зноў паглядзець на гадзіньнік. Напрыканцы я хацеў сказаць колькі словаў пра Сакрата і Крытычную тэорыю. Яшчэ раз нагадаю пра Ніцшэва падазрэньне Сакрата ў біянэгатывізьме і ягоныя перасьцярогі супраць маральна-тэарэтычнага духу. Вось жа, Ніцшэ, як можна было зразумець, сам ёсьць першым вартым згадкі матчыным

сынам найноўшай філязофіі, хоць ён і рабіў усё магчымае, каб зрабіць з самога сябе жахлівага бацькавага сына. Якасьці матчынага сына выдаюць сябе ўва ўсіх дэталях ягонай інтэлектуальнай фізіягномікі, найперш у ягоным антымэтафізычным выбары, у ягонай псыхалягічна-балбатлівай пастаце, у ягоных фантазіях на тэму цяжарнасьці, у ягоным ухваленьні шматзначнасьці і ў ягоным паўторным адкрыцьці генэалягічнага мысьленьня, якое само па сабе ўжо ёсьць лягічным фэмінізмам у найчысьцейшым выглядзе. І вось, як было паказана, постмадэрны матчын сын Ніцшэ з максымальнай рэзкасьцю налятае на пасьляархаічнага матчынага сына Сакрата. Мы чулі, у чым ён яго так злосна папракае: Сакрат нібыта ўжо не разумеў сутнасьці трагедыі. Напраўду ж Сакрат і Ніцшэ зьяўляюцца ўсяго толькі раньнім і позьнім сьведкамі той самай трагічнай структуры. Калі мы прыгледзімся бліжэй, то ўбачым ядро трагічных дзеяньняў у немагчымасьці быць сынам. У высокаразьвітай культуры становішча сыноў, прынамсі, пэрспэктыўна безвыходнае – між іншым, сёньня пачынае праяўляцца і трагедыя іх сясьцёр, калі жанчыны, з свайго боку, пачынаюць прымаць выклік немагчымасьці быць дачкой. Я думаю, што Сакрат распрацаваў такі спосаб абыходжаньня з трагедыйным матэрыялам немагчымага сына, які па глыбіні раўнаварты адказу Ніцшэ, а чалавекалюбствам, здаецца, у пэўным сэнсе перасягае яго. Калі Ніцшэ, матчын сын сьвятара, выкладае вучэньне пра звышчалавека, а насамрэч звышсына, які разьняволіўся ў свабоднае ад сумленьня дзіця сьвету і ад цяпер «мае права» цалкам нявінна адыгрываць у сьвеце жахлівую ролю, дык Сакрат, сын павітухі, выкладае вучэньне пра разважнага, разьвязанага чалавека, які ў сваёй зародкавай нэгатыўнасьці клапоціцца пра тое, каб не пакінуць у сьвеце сьлядоў новай несправядлівасьці і дадатковага гвалту. Звышчалавечае дзіця сьвету паводзіць сябе як радасная самакіраваная ракета, як кола, якое коціцца само па сабе, з гульлівай разбуральнасьцю імчыцца па арэне сьвету. Сакратаў мудрэц, які сыходзіць у сьветлае няведаньне, захоўвае даросла-дзяціннае ўстрыманьне ад спрычыньваньня новых зямных ланцугоў узьдзеяньня. Сэнс ягонай нэгатыўнасьці – ня што іншае як забраць душу з пазытываванага сьвету як арэны вайны паміж ідэнтычнасьцямі. Ягоная мудрасьць – гэта мудрасьць грунтоўнай перасьцярогі ад

сьвету. Аднак гэтая перасьцярога апэлюе не да незямнога сьвету, да трансцэндэнцыі, але да багацьця нэгатыўнасьці, што належыць да прыроджаных правоў кожнага індывіда. Сакратаўская рознасьць ад асьляпляльнай і гвалтоўнай сукупнасьці пазытыўных меркаваньняў здабываецца не адмаўленьнем ад жыцьця, а пазнаньнем таго, што найлепшае для нас знаходзіцца не на лініі веданьня, хаценьня альбо магчымасьці, а ў звароце да ўсёахопнага няведаньня, у якім таксама і магчымасьць ды хаценьне знаходзяць спакой і лунаньне. Таму для Сакрата яшчэ адкрыты толькі шлях нэгатыўнасьці. Гэты шлях вядзе яго проста да маладых людзей у атэнскіх спартовых установах, да бліскучай моладзі Атыкі. Гёльдэрлін заўважыў па Сакрату, што ён там шукаў: «Той, хто падумаў самае глыбокае, любіць самае жывое».

Спадарства, я хацеў бы закончыць сёньняшнюю лекцыю тэзай, што мы маем бачыць у Сакрату заснавальніка Крытычнай тэорыі. Ягоны крытычны прынцып здабываецца не нянавісьцю да жыцьця, не плаксівасьцю і не спадзяваньнем, а біяпазытыўнай, неілюзіяністычнай, але непазнавальнай, бо зародкавай перасьцярогай ад сьвету. Па-філязофску абгрунтаваны і антрапалягічна надзейны прынцып крытыкі, які робіць магчымай Крытычную тэорыю, быў знойдзены ў Атэнах. Калі ласка, мае спадарыні і спадары, ня верце чуткам, нібыта Крытычная тэорыя – спэцыфічна франкфурцкая страва. Франкфурт мае дачыненьне да Крытычнай тэорыі сучаснага тыпу толькі ў той меры, што ён зьяўляецца прадмесьцем Ерусаліму, я маю на ўвазе нябесны Ерусалім, які ёсьць адзіным вядомым месцам, дастаткова аддаленым ад сьвету, каб можна было адтуль апісваць рэчаіснасьць у выразах франкфурцкай Крытычнай тэорыі. Але нябесны Ерусалім – не магу сказаць іначай – гэта ж адно наіўная рэпліка на зародкавыя Атэны Сакрата. Наяўная ўва ўмовах усіх высокаразьвітых культураў немагчымасьць быць сынам некалькі пакаленьняў таму прывяла ў Франкфурце да яшчэ адной вартай увагі спробы рашэньня – спробы, якая жывіцца крыптамэсіянскімі інсьпірацыямі. Франкфурцкае рашэньне атрымалася ані ніцшэанска-пазытыўным, ані сакратаўска-нэгатыўным, яно пайшло сярэднім шляхам нібыта-мэсіянства, які грунтуецца на аксіёме: наяўны сьвет ужо ёсьць поўніцай дрэннага, адзіны

прамень сьвятла, які дасягае яго, запальваецца для нас у бліскучасьці, зь якой мы фармулюем разуменьне таго, што гэты сьвет і ў будучыні ня стане іншым. З чаго вынікае, што дагэтуль у Франкфурце аформілася толькі Крытычная нібыта-тэорыя; зразумела, я кажу пра старэйшую франкфурцкую школу, таму што маладзейшая, якая па сутнасьці імкнецца быць этыкай на сацыялягічнай базе, наўмысна пакідае па-за ўвагай плоскасьць, у якой праблема Крытычнай тэорыі паўстае ў эмфатычным сэнсе. Але гэта значыць: сама ідэя перасьцярогі ад сьвету, якая, каб лічыцца філязофскай, ня мае права быць тэалягічнай, і пасьля працаў франкфурцкіх думаньнікаў вісіць у паветры, як і крытэры дысыдэнцтва і канструктыўнасьці, адмаўленьня і ўдзелу. Спадарства, не зразумейце гэты выраз няправільна, паветра для тэорый усялякага роду – найлепшае месцазнаходжаньне. Але каб раскрыць дзейны «прынцып» адрозьненьня, які б умагчыміў крытычную тэорыю сьвету і грамадзтва, філязофія спачатку мусіць нанова адкрыць сакратаўскі марскі шлях у акіян нэгатыўнага. Толькі ў сьвятле зародкавай нэгатыўнасьці становіцца яснай ідэя Крытычнай тэорыі як такая: зародкавая перасьцярога ад сьвету паказвае нам форму быцьця-не-ад-гэтага-сьвету, якая цалкам ад гэтага сьвету, нетрансцэндэнтная трансцэндэнцыя – альбо, каб выказаць па-філязофску вырашальны матыў: анталягічнае адрозьненьне без мэтафізыкі.

Таму я думаю, што ў зразуметай такім чынам Крытычнай тэорыі з Атэнаў – зь якой не да канца выветрыліся сьляды элеўсінскай і мантынэйскай ініцыяцыі – схаваны дагэтуль яшчэ ня вычарпаны патэнцыял. Цяпер, калі ўтопіі патрыярхальнага веку гэтаксама мёртвыя, як і абяцаньні добрага бацькоўства, насьпеў час распачаць новую размову паміж матчынымі сынамі і матчынымі дочкамі. Іншым разам я мару пра размову паміж матчыным сынам Адорна, ад якога ў пытаньнях нэгатыўнасьці з чульлівасьці маё пакаленьне магло ўведаць найбольш, і сынам павітухі Сакратам, чые нэгатыўныя загадкі і пасьля дзьвюх з паловай тысяч гадоў пазытыўнай тэорыі, здаецца, гэтаксама нявырашаныя, як і ў іхны час. У дыялёгу паміж гэтымі думаньнікамі не прымусіла б сябе чакаць і адраджэньне сусьветнагістарычнага дыялёгу паміж Атэнамі ды Ерусалімам, у якім па-новаму паўстала б пытаньне пра сутнасьць гісторыі,

што ўзьнікла з імпульсаў гэтых гарадоў. Я маю на ўвазе, што такая размова была б прыдатная для таго, каб узарваць няправедны саюз паміж канструктывізмам і цынізмам, які дзее ў цэнтры сёньняшняга духу часу. Тое, што сёньня называецца духам часу, – гэта пацучыныя забегі дэмаралізаваных сыноў, якія, пакінутыя ўсімі добрымі духамі разьвязаньня, адчуваюць сябе асуджанымі на пустую дынаміку. Але вызначальны разьдзел у гісторыі будучай Крытычнай тэорыі будзе адкрыты толькі тады, калі традыцыя заходняга нэгатывізму стане дастаткова ўпэўненай у сабе, каб па-за рамкамі імпарту і экспарту ідэяў падысьці да невымернага кантынэнту старажытнаазіяцкага зародкавага гнозісу. Аднак да гэтага яшчэ далёка, і моўных, псыхалягічных і сацыякультурных прадпасылак для такой сустрэчы дагэтуль няма, хоць іх прадвесьнікі апошнім часам памнажаюцца.

Спадарства, наступным разам я буду гаварыць пра паэтыку родаразьвязаньня. З гэтай нагоды я хачу крыху мадыфікаваць сылягізм пра сьмяротнага Сакрата. Без усялякага сумневу, вы яго ведаеце: усе людзі сьмяротныя. Сакрат – чалавек. Гэта значыць, Сакрат – сьмяротны. Вэрсія, якая будзе агучана наступным разам, мае крыху іншы выгляд: усе людзі нарадзіліся. Сакрат – народжаны акушэр. Гэта значыць, Сакрат – на наступнай лекцыі я скажу, якое тут мусіць быць слова. Але магчыма, вы самі ўжо будзеце ведаць яго, бо гэтым разам у нас часу на роздум даволі: сустракаемся пасьля Сёмухі.

4. ПАЭТЫКА РОДАРАЗЬВЯЗАНЬНЯ

Спадарства, калі б Франкфурт стаяў не на Майне, а на Гангу, то выканаць маю задачу сёньня было б лягчэй. Мне тады ня трэба было б падрабязна тлумачыць філязофскі панятак экзыстэнцыі, мне ня трэба было б клапаціцца пра фэнамэналягічнае апісаньне нашага быцьця-ў-сьвеце, ня трэба было б тлумачыць, як лацінскае слова *экзыстэнцыя* адбіваецца ў грэцкім слове *экстаз*, не было б патрэбы ў шматлікіх заўвагах пра ўгрунтаваньне экстатычнага ў паўсядзённым і паўсядзённага ў экстатычным, і акрамя таго, я ня мусіў бы ўвесь час гаварыць так ненатуральна выразна, каб задаволіць

спадароў гукаапэратараў з індыйскага тэлебачаньня. У Франкфурце-на-Гангу мы сядзелі б цяпер пад мангавымі дрэвамі ў павевах вечаровага брызу, глядзелі б уніз на прыстані, дзе пабожныя вернікі спускаюцца да рытуальных купальняў, каб акунуцца ў сьвятую раку, мы ня бачылі б, як там і сям праплываюць па рацэ загорнутыя ў тканіну прадметы, у якіх угадваюцца формы чалавечых целаў, паветра было б напоўненае шолахамі і пахамі, якія нагадваюць пра памерлае і жывое, сонца стаяла б ужо нізка над ракой, і я пачаў бы прамаўляць да вас, апавядаючы адну гісторыю. Ах, у Франкфурце-на-Гангу не было б прыватнай уласнасьці на гісторыі, і калі б я расказаў вам гісторыю пра боскіх птушак, гэта было б асучасьненьнем традыцыйнай мудрасьці, а не плягіятам. Большасьць з вас яе, зразумела, ведае, бо яе часта расказваў Рамакрышна, Свамі Муктананда яе расказваў, Шры Аўрабінда апавядаў яе, і акрамя іх сотня іншых, кожны па-свойму, і кожны па-свойму правільна, таму што ў плыні вуснай перадачы паміж арыгіналам і копіяй няма розьніцы ў рангу, тут паўтор гэтаксама арыгінальны, як першы расказ, і кожная рэпрадукцыя – гэта прэм'ера. Нягледзячы на гэта, спадарства, вы зноў зь цікаўнасьцю слухалі б гісторыю, бо вы ведаеце з папярэдніх лекцый, што ніколі ня можна быць пэўным, што ты яе зразумеў. Такім чынам, я пачаў бы расказваць легенду пра птушак, якія лятаюць вышэй, чым уздымаюцца вяршыні Гімалаяў. Яны называюцца боскія птушкі, таму што яны несьмяротныя. Калі ўжо яны ўзьляцелі ў паветра, то яны вольныя ад сілаў зямнога прыцягненьня. Ім ня трэба сілкавацца, таму што яны цалкам самадастатковыя. Яны ніколі не прызямляюцца, яны жывуць выключна ў найвышэйшых слаях паветра, сьпяць яны таксама ў вольнай вышыні, яны кахаюцца пад адкрытым небам і над адкрытай зямлёй, здаецца, ім нічога ня трэба, акрамя вышыні і даляў, як быццам яны ў стане харчавацца праз пупавіну ўласнай асалоды. Адзіны момант у жыцьці боскіх птушак, у які гэтае вызваленае быцьцё зьведвае небясьпеку быць парушаным, існуе ў самым пачатку. Таму што як істоты, адвязаныя ад зямлі, яны адкладваюць свае яйкі ў паветры. Пакуль яйка з найвышэйшай вышыні падае на зямлю, сонца выгравае яго. Калі маці ляцела дастаткова высока, тады часу, які праходзіць да выдзёўбваньня птушаняці, якраз дастаткова, каб падаючае яйка яшчэ над зямлёй было

расколатае знутры – маладая боская птушка высьлізвае ў паветра, адчувае ў крылах вецер падзеньня, набывае ў свабодным падзеньні раўнавагу, распасьцірае крылы і зноў пачынае ўздымацца. Так да гатунку рэдкіх і дзівосных птушак дадаецца яшчэ адзін экзэмпляр.

Але далёка ня ўсе птушкі маюць шчасьце вылупіцца па-над зямлёй і авалодаць сытуацыяй. Маці можа адкласьці яйка, не даляцеўшы да неабходнай найвышэйшай вышыні, хмары могуць закрыць сонца і ня даць падаючаму аб'екту патрэбнай для высьпяваньня цеплыні, – ва ўсякім разе, неаднойчы здараецца, што боскаму птушаняці не хапае часу, каб вызваліцца. Прыцягненьне занадта моцнае, падзеньне занадта хуткае, скукожаная постаць птушкі застаецца ў вапнавай турме, у той час як зямля пагрозьліва набліжаецца. Малое адчайна спрабуе вылузнуцца, але ўжо запозна, зямля зь неверагоднай сілай прысмоктвае падаючае яйка, і здараецца тое, чаго ніколі не павінна было б здарыцца і што ўсё ж здараецца занадта часта – яйка разьбіваецца аб зямлю. Як аглушанае сядзіць птушаня ў разьбітай шкарлупіне, яно яшчэ раз здагадваецца, што не пасьпела своечасова вылецець, яно ляжыць на зямлі са спаралізаванымі крыламі, ударанае маланкай, прыбітае да зямлі сьвятлом і цяжарам. Цяпер яно ніколі не навучыцца лятаць. Калі першы шок праходзіць, яно ўзьбіваецца на ногі, пырхае на месцы, потым яно здаецца сіле цяжару і спрабуе хаця б навучыцца самастойна хадзіць. У большасьці выпадкаў гэта ўдаецца – некаторыя з упалых боскіх птушак у сваім далейшым жыцьці ўвесь час гавораць пра тое, як важнае для іх прамахаджэньне. Але колькі б ні хадзілі вэртыкальныя зьвяры па зямлі, яны ніколі ня здолеюць стрэсьці зь сябе адчуваньне, што зь імі нешта не зусім у парадку. У схаваным кутку іхнай памяці яшчэ жыве цьмяная здагадка, што аднойчы ім былі адкрытыя іншыя магчымасьці, але яны былі іх пазбаўленыя.

Мае спадарыні і спадары, я ня буду працягваць гэтую гісторыю, якую я расказаў бы вам у Франкфурце-на-Гангу пад мангавымі дрэвамі. Вы можаце быць пэўнымі, што я расквеціў бы яе, як чароўны філязофскі дыван, у які ўплятаюцца ўсё новыя і новыя ніткі. Я расказаў бы некалькі ўнутраных гісторыяў, прыкладам, пра зямных птушак, якія ўрэшце ўсё ж навучыліся лётаць, і сям-

там уплёў бы аналітычныя і містычныя камэнтары пра Раману Махаршы і майстра Гакуіна, пра Ёгана Готліба Фіхтэ і рабі Дэрыду, пра індыйскіх дзяцей поўначы і каліфарнійскіх high-noon-children. Тым часам стала б цёмна, і па вадзе Гангу дрэйфавалі б ужо маленькія алейныя лямпады, якія нагадваюць пра душы на іхным шляху да мора. Публіка паступова разыходзілася б, слухачы згубіліся б у вуліцах гораду, хутка настаў бы час, калі па пляцах шлёндраюць галодныя белыя буйвалы, шукаючы ў горах сьмецьця спажыву. Напэўна, большасьць слухачоў неўзабаве забылася б на гісторыю, толькі адзін альбо яшчэ хто другі пайшлі б дахаты з пачуцьцём цяжару паміж лапаткамі. Людзі Франкфурту-на-Гангу іншым разам вельмі паддаюцца ўнушэньню, яны могуць успрымаць найдзіўнейшыя ўяўныя фізіялёгіі асабіста, і пасьля гэтай гісторыі некаторыя зь іх, бадай, атрымалі б рэальнае адчуваньне, што ў іх на сьпіне робяцца заўважнымі занядбаныя зародкавыя крылы. Праўда, гэта немагчыма, і тым ня менш гэта адбываецца – пра гэта сьведчаць недвухсэнсоўныя знакі. У адзін зь вечароў накшталт гэтага некаторым было б цяжка заснуць, да трэцяй раніцы яны качаліся б у ложку, апанаваныя бяссоньнем ад няздольнасьці лётаць.

У Франкфурце-на-Майне такое цяжка сабе ўявіць. Ня тое, каб у гэтым Франкфурце не было набожных і задумлівых людзей. Спадары на Майне па-свойму гэтаксама горача зацікаўленыя ў вышэйшых рэчах, як і спадары на Гангу. Толькі тут не акунаюцца ў наяўную ваду Майну, ужо экалягічная сьвядомасьць забараняе такія некрытычныя жэсты, але ў гэты час брахманы вялікіх банкаў заходзяць у свае балянсы для рытуальнага акунаньня, бо ж немагчыма зразумець, чаму грашовыя плыні ня могуць таксама быць сьвятымі рэкамі. Культур-антраполягі нядаўна вызначылі, што дамінуючую ў франкфурцкім сіці і ў акрузе Майн-Таўнус форму жыцьця трэба ўважаць за манэтарна-інфармацыйны пантэізм, што дае права зрабіць выснову, што тут мы маем справу ня проста зь лякальным культам, а з гесэнскай формай сусьветнай рэлігіі. Як і ўсе высокаразьвітыя культуры да гэтага, франкфуртамайнская цывілізацыя таксама арыентуецца на цякучы элемэнт. На Майне ўтварылася культура грашовых і знакавых рэк, якая наступнічае Эгіпту, Мэсапатаміі і Індастану.

Яе выбітныя прыкметы – гэта кніжныя кірмашы, якія адбываюцца раз на год, і кірмашы бухгальтарскіх кніг, якія сьвяткуюцца бесьперапынна. У гэтым прычына таго, што ў Майне цяжка ўявіць сабе сцэны, цалкам магчымыя на Гангу. Культура даліны Майну – гэта эксклюзіўная культура запісаў, тут мастацтва кнігі патрабуе сваіх ахвяраў. Нельга проста так гадзінамі сядзець пад дрэвамі, глядзець на ваду і распавядаць гісторыі. Тут няма месца для арыентальных мараў пра палёты і няма часу для рэчаў, якія прыносіць толькі вецер вуснай традыцыі, няма таксама й сцэнаў для выказваньняў, якія ажыцьцяўляюцца толькі тады, калі хтосьці прыкладзе намаганьні і перакладзе іх з кніжнага існаваньня ў іншую рэчаіснасьць. У культуры запісаў рэчы непасрэдна пераходзяць з адной кнігі ў другую, перазапіс складае ўсё жыцьцё, прамежкі тут малыя, каб не разрасталіся рэчы, якія не ўваходзяць у кнігу. Людзі, якія належаць да майнскай культуры перазапісу, не пакутуюць таксама і ад бяссонных начэй, выкліканых няздольнасьцю да палёту, яны ж вядомыя сваім уменьнем будаваць дадатковыя ўзьлётныя палосы, калі ідзецца пра ўзьлёт у паветра.

Але і тут усё большая колькасьць людзей зазнае бяссоньне. Мэдыкі сьцьвярджаюць, што гэты фэномэн разьвіўся ў апошнія гады ў цэлую эпідэмію, ёю нібыта паражаны кожны чацьвёрты альбо пяты. Для пісьменьнікаў гэта навіна, якая будзіць надзею. Спадарства, я раблю стаўку на наступную спэкуляцыю: калі ёсьць людзі, якія з-за адчуваньня таго, што ня могуць лётаць, ня сьпяць начамі, то мусілі б быць і людзі, якія пры дапамозе бяссоньня прыходзяць да адчуваньня таго, што ня могуць лётаць. Гэта называецца пераваротам выразу. Напрыклад, душэўны клопат звычайна ідзе знутры навонкі, ад афэкту да сьлёз. Але ёсьць і адваротны шлях: трэш сабе даволі радасна цыбулю для Coq au vin, цыбульны сок раздражняе абалонку вока, яна сьлязіцца, добры настрой раптам улятучваецца, і раз ты ўсё адно ўжо плачаш, дык карыстаеш з нагоды адчуць усё няшчасьце гэтага сьвету. Дзякуючы такім зваротным узьдзеяньням бяссоньне таксама ёсьць плённым разьдзелам філязофіі. Асьмелюся сьцьвердзіць, што філязофскае думаньне набывае глыбіню толькі ў бяссонных, бо ноч – гэта маці анталёгіі.

Усё ціха, я адзін, ёсьць толькі маё чуйнаваньне, якое цікае, бы міна замаруджанага дзеяньня, і яго візаві, цёмная, аморфная маса сьвету, якая моўчкі глядзіць на мяне і запрашае расчалавечыцца. У такія моманты становіцца зразумела, што слова быцьцё ёсьць сынонімам да Нішто – пакуль ты гэта не даведаешся, анталягічная праблема цябе не чапае. Адзін з найвялікшых бяссонных у літаратуры нашага стагодзьдзя – румынскі эмігрант Эміль Чоран. Ён адзін з тых, хто мог бы сустрэцца вам у Франкфурце-на-Гангу. Адначасова ён красамоўны сьведка для фэномэну пераваротy выразу. Ягонае бяссоньне зрабіла зь яго аднаго зь нешматлікіх вартых згадкі сучасных аўтараў, у якіх адчуваньне сьвету пацярпелых ад удару аб зямлю боскіх птушак дало філязофскі плён. Чоран выдаў у 1973 годзе маленькую кнігу пад загалоўкам: *De l'inconvénient d'être né*, па-нямецку: *Vom Nachteil geboren zu sein* («Пра невыгоду быць народжаным»), дзіўным чынам, яна выйшла ў Франкфурце-на-Майне. Кніга без усялякага сумневу заслугоўвае на тое, каб быць прынятай у канон чорнага гнозісу. Аўтары з чорнагнастычнымі схільнасьцямі – гэта пакутнікі, якія ідуць на эшафот за сваё нявер'е. Пытаючыся: «Што такое адно-адзінае ўкрыжаваньне ў параўнаньні з штодзённым, якое перажывае той, хто пакутуе на бяссоньне?» (Тамсама. с. 15), Чоран у некалькіх словах дасягае найвышэйшага ўзроўню нязбаўнасьці і абвяшчае аб тым, што ён яе сьведка. У сьвятле яго хранічнага падзеньня ў пекла, укрыжаваны аднойчы выглядае як аўтар афарызмаў, які на крыжы зь цяжкасьцю выціснуў зь сябе сем словаў. Бяссонны прэзэнтуе больш за сем кніжак з афарызмамі тысяч нязбаўных начэй. Чоран піша:

Тры гадзіны раніцы. Я фіксую гэтую сэкунду, потым тую, падводжу балянс кожнай хвіліны. Навошта гэта ўсё? Таму што я нарадзіўся. З прачуйнаваных начэй асаблівага кшталту ўзьнікае пастаноўка пад сумнеў нараджэньня. (Тамсама. с. 5.)

Але з начных роздумаў вылучаецца эўфарычная гіпотэза:

Няспынна належаць да сьвету, у якім яшчэ нічога не апусьцілася для таго, каб успыць, і ў якім ты прадчуваў сьвядомасьць, ня

прагнучы яе, качаўся ў віртуальнасьці, у мізэрнай поўніцы пэўнага «Я» перад «Я»... Ня быць народжаным, ужо сама думка пра гэта – якое шчасьце, якая свабода, якая далечыня! (Тамсама. с. 22.)

У трывозе і зьбянтэжанасьці – раптоўны спакой пры думцы пра зародак, якім ты быў. (Тамсама. с. 20.)

Калі прысутнасьць – гэта зло, то прычыну яго трэба шукаць у скандале нараджэньня, бо нарадзіцца значыць прысутнічаць. Таму вызваленьне мусіла б паклапаціцца пра тое, каб прыбраць сьляды гэтага скандалу, найцяжэйшага і найневыносьнейшага з усіх. (Тамсама. с. 15.)

Па суседзтве з гэтымі сказамі, якіх было б досыць, каб замацаваць за Чоранам месца другога патрыярха эўрабудызму – першым быў Шапэнгаўэр, – аўтар натуе зацем, які, на маю думку, аднойчы проста непазьбежна будзе прызнаны за аксіёму філязофскай псыхалёгіі.

Мы не імчымся насустрач сьмерці, мы ўцякаем ад катастрофы нараджэньня, мы торгаемся ва ўсе бакі – выратаваныя, якія хацелі б забыць. Страх перад сьмерцю – ня што іншае, як праекцыя ў будучыню страху, які падымаецца зь першым нашым імгненьнем. Вядома, разглядаць нараджэньне як біч – гэта насуперак нашай прыродзе: хіба нам ня ўбілі ў галаву, што яно ёсьць найвышэйшым дабром, што найгоршае ляжыць у канцы нашай кар'еры, а не ў яе пачатку? Аднак зло, сапраўднае зло ззаду нас, ня сьпераду. На гэта не зьвярнуў увагі Хрыстос, гэта ведаў Буда: «Калі б у сьвеце не існавалі тры рэчы, о сябры, то Дасканалы не зьявіўся б на сьвет...» І яшчэ перад старасьцю, перад сьмерцю ён разглядае народжанасьць як крыніцу ўсіх пакутаў і ўсіх катастрофаў. (Тамсама. с. 5.)

Але хоць нараджэньне – гэта паваротны пункт нэгатыўнасьці, ягоная адмена ня ёсьць панацэяй. У адзіным месцы Чоран, здаецца, схіляецца да кампрамісу і выяўляе жаданьне

апусьціцца да няшчасьця існаваць.

Я не дарую сабе быць народжаным. Гэта як калі б я, пракраўшыся на сьвет, спрафанаваў містэрыю, парушыў найвышэйшае абавязаньне, зрабіў невымоўна цяжкую памылку. Але бывае, што я рэагую менш рэзка: тады быцьцё народжаным падаецца мне злом, няведаньне якога зрабіла б мяне несуцешным. (Тамсама. с. 15.)

Спадарства, гэтае вялікае самаспавяданьне я хацеў бы зрабіць зыходным пунктам сёньняшніх разваг, прысьвечаных паэтыцы родаразьвязаньня. Гэтая невыгода, а менавіта быць народжаным, хай нават яна абсалютная, адкрывае мінімальную перавагу – магчымасьць усё жыцьцё на яе скардзіцца. Мінімум пазытыўнасьці, зь якім згаджаецца Чоранаў нэгатывізм, адначасова стварае элемэнтарную прадпасылку для паэтыкі родаразьвязаньня. Невыпадкова скарга зьяўляецца першапачатковым спосабам паэзіі і музыкі. Страта выгоды, якая палягае ў магчымасьці пратэставаць супраць невыгодаў нараджэньня, зрабіла б несуцешным нават Чорана ў ягоныя лагоднейшыя хвіліны. Няўхільна скардзячыся супраць прыкутасьці да рэчаіснага, ён рэалізуе найменшы магчымы выйгрыш зь няслаўных наступстваў родаразьвязаньня. Сэрыяй адшліфаваных родавых крыкаў даўжынёй у цэлае жыцьцё Чоран распачынае літаратуру пачатковай траўмы.

Мае спадарыні і спадары, першым элемэнтам у маленькай сусьветнай паэтыцы, якую я хацеў бы разгарнуць далей, ёсьць нешта, што я называю апрыёры родаразьвязаньня. Ня мова і камунікацыя ствараюць для людзей першыя ўмовы магчымасьці прыйсьці ў агульны сьвет, а разьвязаньне кожнага асобнага індывіда з зародкавай камунікацыі з маці. Толькі пасьля гэтага камуніянальнага «хросту» і пасьля ягонага разрыву калі-нікалі можа наступіць і камунікацыя – але не як першая прадпасылка, а як позьні вынік. Нямецкая мова фармальная ў справах родаразьвязаньня: мацярок разьвязваюць, дзеці прыходзяць на сьвет. Што кідаецца ў вочы, дык гэта пасьлядоўна прыватыўны сэнс прыстаўкі «раз» у слове «разьвязаньне». Скасоўваецца нейкае зьвязаньне, а менавіта

зьвязаньне цяжарнай маці з тым, што яе ўсё больш абцяжарвала; яе ўлоньне зноў становіцца лёгкім і вольным, разьвязаньне адбылося. Дзіця само па сабе было ў целе маці свабодным і лёгкім, так сказаць, разьвязаным і вызваленым, і толькі праз роды яно робіцца цяжкім ды прыкоўваецца да сьвету. Такім чынам, апрыёры родаразьвязаньня пачынае дзейнічаць выключна для тых, хто ўжо знаходзіцца ў сьвеце і ўжо адчувае цяжар сьвету. Той, хто нараджае нешта на сьвет, робіць гэта, каб разьвязаць *уласную* цяжарнасьць і аблегчыць *сябе*. Нованароджанай істоце родаразьвязаньне, з гэтага гледзішча, не прыносіць наўпроставай карысьці, бо ж яна абцяжарваецца грузам, які нельга зьняць на працягу ўсяго жыцьця, – грузам існаваньня.

Карысьць з родаразьвязаньня новенькія атрымаюць толькі тады, калі яны, у сваю чаргу, пачнуць скідваць грузы і разьвязваць сувязі. Таму зацяганы выраз пра творы як дзяцей мастакоў – гэта ня толькі саладжавая мэтафара з вуснаў векавух ад культуры.

Тым ня менш, разьвязаньне мацеры ад дзіцяці як прывязаньне дзіцяці да сьвету мае вызвольны аспэкт і для яго. Таму што ў часе блізкай да нараджэньня фазы лунаючая пячора нірванічнага сярэдняга часу ператвараецца ў цеснае пекла пэрынатальнага канцовага часу – гэта тая стадыя, у якой пачынаецца Плятонава прыпавесьць пра пячору, ды і наагул усе перамены сэнсу зь пячоры на пекла[3] належаць да пэрынатальнага сцэнару катастрофы. Значыць, слова «разьвязаньне» набывае пазытыўнае значэньне і ў дачыненьні да таго, што прыходзіць на сьвет, бо для навічка ў сьвеце быць разьвязаным абазначае вызваленьне зь цеснаты і вузкасьці; гэта дае сцэнічны прататып усіх вопытаў вызваленьня. У сьвятле нараджэньня запальваецца першая маланка зьнешняй свабоды, зь ёй сьпераду і зьверху прыходзіць яснасьць, у ёй зеўрае прасьвет анталягічнага моманту родаразьвязаньня як такога, і пад трубы сьвятла адчыняюцца ўсе адкрытасьці для ўсяго, што пазьней атрымае катэгарыяльнае вызначэньне як памер і прастора; *Vita Nova* Дантэ і Блоха мае сваю субстанцыю ў асучасьніваньні гэтага зачыну; ён дае безумоўны сыгнал, які зноў абнадзейвае гінучага ў турме Флярэстана – кажуць, што

Эрнст Блох усё жыцьцё ня мог слухаць гэты ўрывак з опэры Бэтховэна бязь сьлёз.

Мае спадарыні і спадары, разьвязаньне мацеры ад дзіцяці, якая спачатку сфармуляваў, прыносіць з сабой прывязанасьць або прымацаваньне новага жыцьця да сьвету. Цяпер прыйшоў час паправіць няправільную частку гэтай фармулёўкі – ’Bindung’ на ўвазе заўчасна і скажона, кантрабандна ўведзены паняцьце сьвету. Бо для прыбываючага дзіцяці ў момант ягонага выхаду зь цела маці сьвету ўва ўласным значэньні слова, да якога яно магло б быць «прывязанае», проста няма. Таму тэза пра ягоную пачаткавую сувязь зь сьветам правільна павінна гучаць так: адбываецца прымацаваньне дзіцяці да адкрытага, да неагляднага, да невядомага. Перажываючы разьвязаньне, народжанае на сьвет дзіця само па сабе падае ў цяжкасьць свабоды і ў рукі супрацьскіраванай сілы прыцягненьня, якая ў прастамоўі называецца любоўю. Таму Сартр мае рацыю, кажучы, што чалавек асуджаны да свабоды – я толькі думаю, што гэты сказ азначае нешта зусім іншае, чым тое, што хацеў сказаць Сартр, таму што асуджэньне на свабоду выяўляецца не ў прымусе выбіраць самога сябе, а ў трываючым усё жыцьцё нараджальным руху, які прыводзіць да прывязаньня да вусьцішнага, адкрытага. Я забраў назад выраз «сьвет», таму што сьвет уступае ў гульню толькі пазьней – як увасабленьне зьместаў адтуліны, у якую мы разьвязаныя. Праўда, тут становіцца бачна, што людзі, як правіла, прагнуць сьвету, гэта значыць, наркатычна залежныя ад напаўняльнікаў, якія абазначаюць сьвет. Тое, што называюць прывязанасьцю да сьвету, папраўдзе ёсьць прывязанасьцю да таго, што напаўняе першасную адтуліну, то бок прывязанасьць да напаўненьня на тле страху перад адтулінай. Таму нябачнай падставай пазытывізму ёсьць паніка, якая паўстае з прадчуваньня, што сьвет – гэта нешта такое, што можа таксама і ня быць дадзеным і што вісіць на валасках абяцаньняў. Спадарства, на наступным занятку я пакажу, што сапраўднай сьветадайнай інстанцыяй для нас зьяўляецца мова. Яна адкрывае экстатычны ляндшафт, у якім перабываюць людзі, хай нават у бальшыні выпадкаў яна адкрывае яго так, што адначасова скажае ягоную адкрытасьць. Я паспрабую растлумачыць, у чым палягае сутнасьць мовы – у пацьвярджэньні абяцаньня мовы: невыгоду быцьця народжаным

[3] Нямецкае ’Bindung’ можна перакласьці як ’прывязанасьць’ або ’сувязь’, а ’Hülle’ – як ’абалонка’.

ператварыць у перавагу прыходу ў сьвет праз свабодную мову.

Спадарства, вы бачыце, наступная лекцыя, якая будзе апошняй у гэтым цыкле, ужо загадзя кідае свой цень. Не магу адмаўляць, што заканчэньне гэтага мерапрыемства пачынаецца ўжо цяпер, калі цяжкасьці пачынаньня ледзь пасьпелі пачаць паказваць сябе з прымальнага боку. На пачатку маіх разваг пра паэтыку родаразьвязаньня навязваецца думка пра хуткі канец цыклу лекцыяў, і я мушу ашчаджаць пазасталы абмежаваны час. Але гэта й дарэчы, бо ўсё адно я цяпер мушу гаварыць пра пытаньні бюджэту, эканомікі, неабходнасьцяў і пільнасьцяў. Бо ж эканоміка як усьведамленьне неабходнасьцяў, якія вынікаюць з пабудовы дамоў і гаспадарак, у першую чаргу азначае вызначэньне пасьлядоўнасьці, у якой трэба рабіць рэчы ва ўмовах абмежаванага часу. Калі б не было тэрмінаў, то не было б пасьлядоўнасьцяў і ступеняў пільнасьці, таму што ўсё магло б здарацца раней альбо пазьней у які заўгодна час, што, між іншым, адпавядае жыцьцёваму пачуцьцю многіх вольна дрэйфуючых экзыстэнцыяў, якія могуць сабе дазволіць нічога не разумець у эканоміцы. Тады, строга кажучы, не было б ніякіх справаў, таму што панятак «справа» мае на ўвазе паскарэньне, якое ёсьць лішнім, калі ўсё распускаецца ў спантанным дрэйфе рэчаў, якія калі-небудзь зьдзяйсьняюцца самі па сабе – гэта пачуцьцё, якое вы ведаеце па нядзелях жыцьця. Але калі ёсьць тэрміны, то ёсьць і пасьлядоўнасьці ды прыярытэтнасьці, значыць, *first things* мусяць быць зробленыя *first*, тады ёсьць розьніца паміж дрэйфам і яздой, і тады робіцца зразумела, што дзеяньне заўсёды мае характар язды, бо ягоны прынцып палягае ў тым, каб быць больш хуткім за дрэйф у плыні выпадковасьцяў. Карацей, часу застаецца мала, і выглядае на тое, што цяпер трэба коратка сказаць найважнейшае. Напэўна, было легкадумным аб'явіць тэму «Сусьветная паэтыка» пры канцы курсу, бо можна ж было прадбачыць, што матэрыял занадта аб'ёмны. З гэтай нагоды мне прыходзіць на думку клішэ «час падціскае», і кідаецца ў вочы, як лёгка гутарковая мова стае ахвярай вульгарнага, закарэлага паняцьця часу. На маю думку, ёсьць падставы меркаваць, што калі час падціскае, то падціскае зусім ня час. Пры дакладнейшым аналізе выяўляецца, што час як такі ніколі не падціскае, але ціск як такі стварае ў часе пасьлядоўнасьці; на іхных зьвернутых да

нас вяршынях заўсёды знаходзяцца рэчы, якія мы перажываем як непазьбежныя пільнасьці. Пад ціскам пільнага адбываецца чалавечае, занадта чалавечае ператварэньне неабходнасьці ў Першую Самадапамогу. Як бы ні апісвалі базавую напятасьць чалавека, да яснага ўсьведамленьня вытворчасьці сьвету можа прыйсьці толькі той, хто здае сабе справу з патасу і паталёгіі існаваньня ў сілавым полі пільнага.

Цяпер мы можам зрабіць наступны крок на нашым фэнамэналягічным шляху да сьвету: да апрыёры родаразьвязаньня трэба дадаць апрыёры пільнасьці. Як толькі мы прыбываем у адкрытае, мы пачынаем прымацоўвацца да сьвету, прасякаючыся пільнасьцямі. Гэтае прасяканьне адбываецца ў прасторы вагі сьвету – паміж дзіцяча-лёгкім і невыносным. Як вядома, патрэба вучыць ня толькі маліцца, але і быць ад гэтага сьвету. У царстве пільнасьцяў, зь якіх высьпявае сьвет, мы ўплятаемся ў элемэнтарныя выканаўчыя акты сацыяльнай вытворчасьці сьвету, якая папярэднічае ўсялякаму адрозьненьню паэзіі і прозы. Мы вывучаем рамяство жыцьця, калі неадкладна патрэбнае вымантачвае ў нас сьветатворныя адказы; дзякуючы ім мы ператвараемся адначасова ў архіпаэтаў і эрцпразаікаў. Мы ствараем нашы базавыя сусьветныя тэксты пад дыктоўку пільнасьцяў, і наша ўсьведамленьне працэсу элемэнтарнай вытворчасьці сьвету будзе тым глыбейшым, чым бліжэй яно трымаецца яшчэ перадмоўных атожылкаў непазьбежнага.

Спадарства, цяпер я пачну даўно запозьненую спробу паяднаць асноўныя філязофскія ідэі Маркса і Гайдэгера. Я спадзяюся паказаць, што нягледзячы на палітычныя і маральныя несумяшчальнасьці, якія дзеляць абодвух аўтараў, ёсьць нязмушаная і неабвержная канвэргенцыя паміж галоўнымі ідэямі, на жаль, найбольш выніковага думаньніка XIX стагодзьдзя і, на жаль, найбольш значнага думаньніка XX стагодзьдзя. Перадусім, абодва яны адзіныя ў тым, што чалавечае існаваньне мусіць тлумачыцца ў пасьлямэтафізычнай гермэнэўтыцы рэчаіснага. Абодва адкрываюць у сацыяльнай рэчаіснасьці чалавека адны і тыя ж сьляды пільнага, неабмінальнага – сьлед клопату і цяжару. Маркс і Гайдэгер – вялікія фэнамэнолягі жорсткасьці сьвету, у сутыкненьні зь якой

мусіць улятучвацца ап'яненьне свабодай усіх плыткіх ідэалізмаў. Відавочна разгортваючы, кожны па-свойму, быцьцё-ў-сьвеце чалавека з гледзішча апрыёры пільнасьці, яны апісваюць сусьветны лад ужо не сузіральным, а драматычна-актыўным чынам: як увасабленьне канфрантацыі, ператамленьня, намаганьня і барацьбы зь перашкодамі. Ударам пільнасьцяў б'юць у быцьцё жорсткасьць і цяжар сьвету. Там, дзе пільнае ўспрымаецца разуменьнем, перасякаюцца голад і клопат, неабходнасьць працы зьвязаная з самім характарам існаваньня як цяжару. Уяўная супярэчнасьць паміж філязофіяй працы і тэорыяй уласнасьці (*Eigentlichkeit*) зьнікае, калі заўважаеш, што Маркс і Гайдэгер прэзэнтавалі канкурэнтныя спробы тлумачэньня адной і той самай асноўнай праблемы: яны прынцыпова інтэрпрэтуюць чалавека як такую істоту, прыход якой на сьвет мусіць адбывацца празь цясьніну пільнасьцяў. Такім чынам абодва яны спрабуюць тлумачыць чалавечае існаваньне ўва ўжо не мэтафізычна зразуметым вымярэньні «базісу», зыходзячы з *first things*, якія заўсёды трэба рабіць у першую чаргу і якія, аднак, зусім ня ёсьць мэтафізычнымі прынцыпамі. Між іншым, абодва ўсё яшчэ замоўчваюць працу мацярок, як быццам яны хацелі ў думаньні зыходзіць з быцьця-ў-сьвеце, аднак абстрагавацца ад прыходу-ў-сьвет – і гэта ёсьць сьведчаньнем таго, што ў выпадку абодвух думаньнікаў мы, насуперак усім супрацьлеглым запэўніваньням, надалей маем справу з мэтафізыкамі.

Маркс апісвае вымярэньне пільнасьці праз чалавечую працу як вытворчасьць і прыўлашчэньне; Гайдэгер прачытвае пільнасьць як увасабленьне таго, што надае быцьцю клопату. Абодва спрабуюць гаварыць пра тое, што для чульлівай да патрэбаў чалавечай істоты мае быць базісам існаваньня. Паводле гэтых думаньнікаў, мы ня можам больш уяўляць «базіс» проста як масіўную падкладку, на якую нагружаюцца надбудовы; базавай зьяўляецца якасьць дзеяньняў, якімі мы адказваем на жорсткае, цяжкае, выклікальнае, непазьбежнае. Паколькі Маркс і Гайдэгер прэзэнтуюць вельмі адрознае бачаньне гэтага базавага, падаецца, што супярэчнасьці паміж імі маюць фундамэнтальны і непрымірэнчы характар. На самай справе ў іхных асобах сыходзяцца два найбольш моцныя думаньнікі пра неабходнае для чалавека, і абодва маюць лічыцца

натхняльнікамі вызначальных тэорыяў палітычнага, бо яны разумеюць сутнасьць улады як прысутнасьць у месцы рашэньня пра пільнае. Зыходзячы з гэтага разуменьня, яны стварылі паняткава наймагутнейшыя сучасныя гермэнэўтыкі непазьбежнага. Марксу належыць гермэнэўтыка працы як шляху праз царства неабходнасьці ў царства свабоды, Гайдэгеру – гермэнэўтыка рашучасьці да цяжкага як пераходу праз абуласьненьне (*Vereigentlichung*) да спакою. Марксаў чалавек павінен выпрацаваць сябе, зьмяншаючы цяжар сьвету хітрасьцю вытворчасьці, Гайдэгераў чалавек павінен стварыць сабе цяжкасьці, каб у воку ўрагана знайсьці шлях да гераічнага спакою. Аднак вырашальным для фундамэнтальнай канвэргенцыі абодвух думаньнікаў ёсьць наступнае: абодва так прэзэнтуюць апрыёры пільнасьці, што з прасякнутасьці пільным не вынікае тупая адданасьць патрэбе і прымусу. Абодва думаюць тое, што цісьне на нас, таксама і як імпульс да ўздыму з маразму. У адным выпадку ён называецца адчужэньне, у другім асуджанасьць. Але ў першым выпадку, як і ў другім, «чалавек» мусіць нешта зь сябе зрабіць, калі ён ня хоча стаць асуджаным і зьмізарнець, ці хутчэй, калі ён ня хоча паставіць свой подпіс пад тым, што ён «заўсёды ўжо» зьмізарнелы і асуджаны. На дастаткова высокім узроўні параўнаньня Гайдэгер і Маркс у вырашальных месцах думаюць тое самае. Абодва цаляюць у той анталягічна выбуховы пункт, дзе мусіць быць зьдзейсьнены пераход ад пільнасьці да ініцыятывы. Лёсаноснае для новага часу азначэньне гэтага пераходу гучыць як «рэвалюцыя». Шляхі думак Маркса і Гайдэгера сапраўды разыходзяцца там, дзе ідзецца пра пытаньне сэнсу рэвалюцыі: кансэрватыўны рэвалюцыянэр Гайдэгер патрабуе ад мабілізацыйнага рэвалюцыянэра Маркса вярнуцца ў рамкі; ён бачыць у захаваньні сьвету, з улікам даўно распачатага яго зьмяненьня, сапраўдны выклік эпохі. Аднак з аднолькавай яснасьцю абодва думаньнікі мяркуюць, што ў цэнтры нягодаў дзее прымус да іхнага прадухіленьня; яны ясна чуюць, як у адчужаным быцьці стукаецца самапрыўлашчэньне. Але такім чынам працэс вытворчасьці сьвету пераходзіць у новую стадыю. Думаньнікі, якія найглыбей прадумалі пераход зь пільнасьці ў ініцыятыву, вучаць таму, што цяпер у паэтыку прыходу на сьвет трэба ўлучыць трэці момант: апрыёры ініцыятывы.

Спачатку яно значыць ня больш як тое, што людзі, каб прыйсьці на сьвет, мусяць нешта пачаць – няма ўласнага пачатку, няма сьвету. Але гэтае нешта – зусім не адвольнае. Пачынаньне, пра якое ідзецца ў ініцыятывах вытворчасьці сьвету, азначае ў першую чаргу рашучае пачынаньне з самога сябе. Толькі калі мае месца пачынаньне такога кшталту, можна казаць пра тое, што «суб'ект» пайшоў на прыгоду заснаваньня і вытворчасьці сьвету. З пэўнага гледзішча паняткі ініцыятыўнасьць і суб'ектыўнасьць маюць тоесныя аб'ёмы. Пачынаць зь сябе: гэта ня трэба разумець у тым сэнсе, што падчас вялікай маральнай прыборкі найлепш сьпярша заняцца сабой альбо, згодна зь біблейскай парадаю, падмесьці перад уласнымі дзьвярыма. Пачынаць зь сябе ня значыць таксама і лічыць сябе важнейшым за іншых. Пачынаньне зь сябе, пра якое тут ідзецца, абазначае літаральна: пачынаньне сябе. Гэты выраз трэба ўспрымаць так, быццам бы ён азначаў: зарадзіць сябе, як бомбу; зрабіць прэм'еру сябе, як п'есы, якую яшчэ ні разу ня гралі; запусьціць сябе, як прататып наяўнага ў адным экзэмпляры аўтамабіля; зьняць сябе з засьцерагальніка, як зброю; адкрыць сябе, як дзьверы ў тое, чаго яшчэ ніколі не было; узяць сябе, як непад'ёмную дагэтуль вагу, якую раптам такі ўдаецца зафіксаваць у выпрастаных руках.

Куды вядзе такі палітычна-экзыстэнцыйны акт самазапалу, у Маркса выразна відаць: ён заклікаў пралетарыят зразумець, што азначае быць «сапраўдным» клясам вытворцаў; зразумеўшы гэта, пралетарыят мусіў бы паўстаць, каб усур'ёз заняцца істотным прадукаваньнем, гэта значыць, стварэньнем істотнага, што азначае ня што іншае, як самастойную вытворчасьць сацыяльнага сьвету, у якім уласна працоўныя не былі б больш адчужанымі ад саміх сябе бедакамі, а салідарна цешыліся б з багатага жыцьця. Без сумневу, гэта наймаштабнейшы з усіх сфармуляваных дагэтуль праектаў тлумачэньня сэнсу чалавечай ініцыятыўнасьці. Праўда, ад яго зыходзіла таксама й інсьпірацыя да беспрыкладных кампаніяў прадуктывісцкага гвалту. Я зацямляю гэта, каб даць вам уяўленьне пра тое, што заклік людзей да ініцыятыўнасьці і форма гэтага закліку ёсьць спосабам, у які, патэтычна кажучы, у сучасную эпоху да нас прамаўляе лёс. Самазаклік людзей да ініцыятывы – гэта заклік суб'ектаў да саміх сябе стаць больш

суб’ектамі, самастойна ствараючы гісторыю – сваю «ўласную гісторыю».

Што мае азначаць самапачынаньне ў Гайдэгера, растлумачыць цяжэй, бо ягоная канструкцыя ўласнасьці (*Eigentlichkeit*) напачатку падаецца цьмянай і двухсэнсоўнай. У думаньні Гайдэгера спачатнае запальваньне быцьця, якое наважваецца быць самім сабой, адбываецца ня так, што суб’ект, які да гэтага расьсеяна дрэйфаваў у нікуды, зьнянацку вырашае стаць прадпрымальнікам вышэйшага існаваньня ў якасьці энэргічнага Я–Сам. Пераход з дыфузнага, асуджанага няўласнага (*Uneigentliche*) у рашучае ўласнае ў Гайдэгера адбываецца празь дзіўны скіраваны ўнутро выбух, імплёзію, якая на першы пагляд выглядае на змрочную гульню з ідэяй самазьнішчэньня. Сумнавядомыя аналізы сьмерці з «Быцьця і часу» таксама прачытваліся як перадфашысцкі экзэрсіс скачка ў нішто; некаторыя інтэрпрэтатары меркавалі, што ў іх утрымліваецца хітра ўплеценае спакушэньне прынесьці ў ахвяру суб’ект у інтарэсах таталітарнага захопу ўласнага (*eigentlich*) быцьця. Безумоўна, такое прачытаньне ў канцавым выніку няправільнае, але на павярхоўным узроўні ад яго нельга цалкам адмахнуцца, бо думкі Гайдэгера пра быцьцё-да-сьмерці і пра забяганьне ўперад да канца распаўсюдзілі псэўдаапакаліптычны патас уяўна ўласнай (*eigentlich*) сьмяротнай мужнасьці, які спрыяе непаразуменьням. На самай справе Гайдэгерава аналітыка сьмерці мае, хутчэй, сухі мэтадычны сэнс, які, аднак, з пункту гледжаньня філязофіі адкрывае найвялікшыя пэрспэктывы: ідзецца пра новае фармуляваньне апрыёры ініцыятывы, якое мае вырашальнае значэньне для ўсяго сучаснага думаньня; Гайдэгер робіць спробу так зразумець магчымасьць пераняць сябе, каб Я больш не патрабавала мэтафізычных перадумоваў, ні ў тэалягічнай, ні ў трансцэндэнтальна-філязофскай форме. Тут Гайдэгер у канцавым выніку думае больш рэвалюцыйна за афіцыйных рэвалюцыянэраў. Самапачынаньне, якое ён мае на ўвазе, ужо ня можа, як у раньніх працах Фіхтэ, думацца як абсалютнае самаўсталяваньне; па-першае, таму што Фіхтэва Я ёсьць трывалым толькі ў самазапальваньні бязь сьвету, у той час як Гайдэгер амбітна зыходзіць з самога быцьця-ў-сьвеце; па-другое, таму што Фіхтэва сьвядомасьць можа жыць толькі ў

абсягу чутнасьці свайго безумоўнага самазакліку, аднак ня можа адказаць, адкуль яна ўзяла мову, на якой яна сама сябе чуе; яна застаецца ў палоне самазапатрабаваньня, якое чуе толькі само сябе і ў якім сьвет патрэбны выключна як акустычная прастора для дынамічнага аўтызму, у той час як Гайдэгер робіць, прынамсі, першыя крокі да таго, каб падумаць голас самазапатрабаваньня як покліч іншага.

Наступны рэвалюцыйны адказ на праблему самапачынаньня, адказ Маркса, падаецца фактычна і рытарычна рэалістычнейшым, але надалей застаецца ў абсягу Фіхтэвай лёгікі, бо і «пралетарыят» мае рысы Фіхтэвага суб'екта дабрабыту (*Heilssubjekt*). Маркс тлумачыць самапачынаньне як акт калектыўнага выраблeньня сябе для сябе. Пачатковы імпульс да гэтай гістарыятворчай ініцыятывы, на ягоную думку, забясьпечвае рэалістычная тэорыя чалавека як думаючай інстынктыўнай істоты. З дапамогай квазідыялектычнай тэрмадынамікі бяды ён спадзяецца зрабіць кантраляваным пераход ад адчужэньня да прыўлашчэньня і ад нястачы да рэвалюцыі. Само сабой зразумела, у Марксавым паглядзе на рэальныя нягоды людзей ёсьць антрапалягічны прагрэс, які заслугоўвае таго, каб яго захаваць. Як вядома, Сартр пазьней скамбінаваў адказы Фіхтэ і Маркса на пытаньне, што такое самапачынаньне, і з гэтай камбінацыі зрабіў саманакід і самавыбар. Гэтыя патасныя філязофскія формулы ўплывалі на цэлае пакаленьне інтэлектуалаў аж да шасьцідзясятых гадоў – потым пашырылася ўражаньне, што выбар быў памылковы. Ці выпадкова, што менавіта ў той час камунікацыйнае грамадзтва перайшло да ўсеагульнай аўтаматычнай тэлефоннай сувязі?*

Мабыць, мадэрнізаваныя эгаісты тады ўжо ня мелі патрэбы ў старамодным экзыстэнцыялізьме. Варта таксама згадаць, што на паўдарозе паміж Марксам і Сартрам ёсьць яшчэ аўтарыстычны адказ Бакуніна, які інтэрпрэтуе самапачынаньне сябе як самаабурэньне – для яго абурэньне ёсьць сьвятым органам па-свабоды.

Але застаецца яшчэ праверыць адказ Гайдэгера. Ён інтэрпрэтуе апрыёры ініцыятывы як рашучасьць да пераняцьця сябе з

* Гульня слоў: Аўтарыстычная тэлефонная сувязь па-нямецку – *Selbstwählverkehr* = «сама-выбар-

асуджанасьці – ня скажаш, што гэтая формула аблягчае «тыпоўнае публіцы жыцьцё. Але і доўгая расшыфроўка цьмяных думак акупляецца, калі ідзецца пра думаньніка, які няяўным чынам думаў больш рэвалюцыйна, чым папярэднія віртуозы ідэі ініцыятывы і свабоды. Гайдэгерава гермэнэўтыка пачынаньня яшчэ раз разгортвае ўвесь працэс «гісторыі быцьця» як бы ад пачатку, каб распаліць дабела пытаньне пра пачатак. Як бы абсурдна гэта ні гучала: Гайдэгерава пачынаньне сябе вядзе да магчымасьці зваротнадзейнай рэвалюцыі ў мінуўшчыне. Для Фіхтэ, Маркса і Сартра мінуўшчына – гэта ня што іншае, як адчужанае царства мёртвых, якое хочацца як мага хутчэй пакінуць за сабой: пачаць сябе для іх значыць адштурхнуцца ад панаваньня былога. Гайдэгерава інтэрпрэтацыя апрыёры ініцыятывы, насупраць, і мінуўшчыну абуджае да рэвалюцыйнага жыцьця. У яго яна ператвараецца ва ўлоньне, зь якога мы можам выйсьці яшчэ раз, прычым іначай, чым мы выйшлі зь яго раней. Наш выхад зь мінулага дагэтуль быў адно асуджаным і «запамяталым пра быцьцё» здарэньнем, часткова сьляпым дрэйфам у фармальнасьці, часткова запамяталым пра быцьцё самаінсцэнаваньнем уладарна-бунтарскай суб’ектыўнасьці. У Гайдэгера мінуўшчына ператвараецца ў свайго роду анталягічную мацярынскую інстанцыю, зь якой нам яшчэ давядзецца сустрэцца, і сустрэча гэтая будзе іншага роду, чым тая, якую мы рэалізавалі ў папярэднім модусе нашай прышласьці-на-сьвет. Як дзеці новага часу ў вачах Гайдэгера мы ня што іншае, як агенты ня маючай маці мацеразабойчай суб’ектыўнасьці, якая кінулася ў прадпрыемства «тыпова сучаснага» самаразбуральнага самаажыцьцяўленьня. Але для Гайдэгера само быцьцё ёсьць свайго роду маці, якая паслала нас *ад сябе* на сіроцкі шлях – кон быцьця, адпаведна, азначае гэтую высылку ў адарваньне ад «быцьця» і самастварэньне суб’ектыўнасьці. Гайдэгераў утэрацэнтрызм заходзіць так далёка, што ён яшчэ інтэрпрэтуе забыцьцё маці як лёс маці; і забыцьцё быцьця таксама «наканаванае» быцьцём. З гэтага відавочна, што сутнасьць формаў ініцыятыўнасьці, празь якія адлучаюць і пачынаюць сябе сучасныя суб’екты, можа быць зразуметая як найчысьцейшая асуджанасьць і як забыцьцё ў дзеяньні. Каб расставіць акцэнты ў быцьцегістарыйна генэралізаванай драме маці й дзіцяці з уласьцівай яму радыкальнасьцю, Гайдэгер скарачае да карыкатуры разуменьне

суб’ектыўнасьці ўвогуле: паводле яго, сутнасьць суб’ектыўнасьці заключаецца ва ўсталяваньні машынэрыі панаваньня, асуджанай на аб’ектывуючае згвалтаваньне «рэчаў». Ён упарта настойвае, пэўна, не без падставаў у рэчаіснасьці, на абвінавачвальнай «дэструкцыі» гэтай усёпажыральнай, як я хацеў бы яе назваць, другаснай суб’ектыўнасьці, каб стварыць прастору для звароту да сардэчнай, добрасуседзкай, сьціплай і распушчальнай у сьвеце формы ўдзячнасьці быцьцю; яе таксама можна было б проста назваць першаснай суб’ектыўнасьцю, калі толькі парупіцца высьветліць непаразуменьні, якія непазьбежна пагражаюць умяшацца ў гульню пры ўжываньні найбольш выбуховага базавага слова сучаснага думаньня, а менавіта «суб’ектыўнасьць». Аднак першарадную арыгінальнасьць Гайдэгеравай інтэрпрэтацыі сэнсу пачынаньня сябе надае тое, што ён у самім пачатку адкрывае сьлед «іншага пачатку». Адгэтуль апрыёры ініцыятывы, так сказаць, адкрытае назад. Пачаць сябе цяпер можа значыць: зноў адкрыць сябе, празь неабмежаванае ўспрыняцьце фактычнай сталасьці, для галасоў і сьлядоў іншага пачатку. У той час як іншыя сучасныя самапачынальнікі безвыняткова глядзяць наперад, каб прыйсьці «да сябе», Гайдэгер, прынамсі як думаньнік, патэтычна глядзіць назад. Таму амэрыканскі філёзаф Алан Мэгіл не без прычыны ахарактарызаваў гэтую пазыцыю як «ідэалізм настальгіі». Гайдэгер – гэта думаньнік прарочай тугі па мэдыяльнай шчырасьці ў быцьці, які, тым ня менш, разумее, што яна мусіла згінуць у сусьветнай вайне аб’ектывуючых суб’ектыўнасьцяў. Ягонае анталягічнае праракаваньне адбываецца выключна як выкліканьне (*Evokation*) магчымасьці зьмяніць нашае стаўленьне да сьвету, зыходзячы зь іншага пачатку. Тое, што нам належыць перажыць, кажа ён, можа быць нечым, што даганяе нас ад пачаткаў нашага быцьця, якія сталі нябачнымі. Я схіляюся да таго, каб прачытваць гэтыя цьмяныя ўказаньні Гайдэгера так, як калі б ён гаварыў пра аднаўленьне пэўных дзіцячых ісьцінаў насуперак праўдам дарослых.

Спадарства, як бы ні абражалі і ні адпалохвалі паўсядзённы розум гэтыя заблытаныя ў саміх сабе думкі, але ў пэўным сэнсе яны здаюцца не зусім абсурднымі. А менавіта, калі «сучасны сьвет», як сёньня пачынае разумець кожны, праз нашыя

вызваленыя ініцыятывы рушыць рызыкоўным, калі не фатальным курсам, то не ў апошнюю чаргу таму, што пасярод мітусьні пачаткаў і ініцыятываў мы ў прынцыпе ўсё яшчэ толкам ня ведаем, якім чынам пачынаць нас і нашы рэчы так, каб яны хутка не выліваліся ў самаажыцьцяўляльнае самаразбурэньне.

Спадарства, магчыма, гэтыя думкі пра вытворчасьць сьвету і ініцыятыўнасьць гучаць сумбурна альбо блытана. Іх разьвіцьцю паспрыяе згадка сучасьніка Гайдэгера, якога я ўважаю за Гайдэгеравага сапраўднага контарагента і суразмоўцу – я маю на ўвазе Зыгмунда Фройда. Ён таксама інтэрпрэтаваў апрыёры ініцыятывы своеасаблівым і паказальным чынам. Да яго прыходзіла нямала людзей, якія, як той казаў, ня ведалі, што рабіць з самімі сабой. Ягонай тэрапэўтычнай задачай было дапамагчы ім знайсьці лепшы пачатак, чым той, які прывёў іх у гэты іхны мізэрны стан. Адказ Фройда на пытаньне, што такое пачаць сябе, ляпідарны і рэвалюцыйны: пачаць сябе значыць успомніць сябе. Каб выблытацца з трагічных вузлоў у сямейных раманах, трэба спачатку ўявіць сабе, што адбывалася ўва ўласнай гісторыі. Прадпасылкай шчасьлівейшага працягу раману ёсьць разуменьне таго, якія неспрыяльныя пачатковыя абставіны яго абумоўлівалі. Успомніць сябе для Фройда значыць ня проста пагартаць унутраны сямейны альбом, гэта значыць ня менш як узарваць нэўратычную шкарлупіну, якая склалася вакол жыцьця, якое прыходзіць у сьвет. Калі пакутлівы канфлікт уяўляецца дастаткова жыва, то заблукалыя жыцьцёвыя сілы зноў вырываюцца, яны каналізуюцца нанова, адбываецца рэвізія інстынктыўнага лёсу і ўзьнікае новае стаўленьне суб'екта да самога сябе. Гэты паварот на самай справе можна ахарактарызаваць як свайго роду рэвалюцыю ў мінуўшчыне. Ідэалізуючы, можна сказаць, што дрэнна пачатае быцьцё цяпер пачынаецца нанова на лепшых шляхах. Калі парадаксальны выраз пра «кансэрватыўную рэвалюцыю» мае сэнс, які пакідае па-за сабой сумнеўныя канструкцыі, што цыркулявалі пад гэтым назовам у Нямеччыне дваццатых гадоў і які мы з гэтай прычыны можам ухваліць, то гэты сэнс такі: трэба радыкальна настойваць на асучасьніваньні мінулага, каб умагчыміць рэвалюцыю ў мінулым, якім мы падсьвядома ўсё яшчэ ёсьць, у якасьці іншага пачатку. Кірунак гэтай рэвалюцыі

відавочны: у выпадку ўдачы яна вядзе ад сусьветнай вайны другаснай суб'ектыўнасьці, закутай у браню імёнаў, да ананімнай шчырасьці распушчальных у сьвеце сьвядомасьцяў.

Спадарства, вы бачыце – гаворачы пра прыход на сьвет у Франкфурце-на-Майне, заблытваешся ў барочныя цяжкасьці. Зусім інакш было б у Франкфурце-на-Гангу. Там дыскусія пра наступствы апрыёры родаразьвязаньня, апрыёры пільнасьці, апрыёры ініцыятывы і г. д. ляжала б на больш нізкім узроўні – шчыра кажучы, яе і не вядуць – але гэта не азначае, што там няма адказу на пытаньне, што такое пачынаньне сябе. Апавядальнік пад дрэвам ля ракі пагладзіў бы сабе бараду – апавядальнік без барады быў бы там гэтаксама неўяўляльны, як спаборнік доктарскай ступені без уменьня гаварыць. Ён паглядзеў бы на неба, потым на публіку, потым яшчэ раз на неба і яшчэ раз на слухачоў, а потым сур'ёзным голасам заявіў бы: «Пачынаць сябе, о сябры, азначае злавіць сябе».

Пасьлядоўнасьць майго спавешчаньня, спадарства, крыху зьбілася праз гэты позірк у суседні ўсходні сьвет. Найважнейшыя разьдзелы ў разьвіцьці нашай невялікай паэтыкі сьвету і родаразьвязаньня яшчэ нават не адкрытыя. Але гэтае найважнейшае – дзіўная рэч, – бо найважнейшымі ёсьць заўсёды тыя рэчы, якія альбо зусім ня могуць чакаць, і таму мы ўжо разгледзелі іх у разьдзеле пра пільнасьці, альбо якія – менавіта таму, што яны яшчэ больш цяжкія, чым важкія – мусяць адкладацца на пасьля. З гэтага для нашай маленькай паэтыкі сьвету можна здабыць чацьвёрты элемэнт: апрыёры адкладаньня. Дзякуючы адкладаньню ўзьнікаюць подступы да галоўных рэчаў, і ў такіх подступах можна жыць, бытаваць і гаспадарыць. Можна сьцьвярджаць, што мастацтва жыцьця на вялікіх адрэзках датычыць мастацтва другарадных рэчаў, і гэтаксама ёсьць падставы для меркаваньня, што ладная частка рэальнага жыцьця адбываецца не на полі гульні, а за бакавой лініяй, не падчас галоўнай праграмы, а ў перапынку. На подступах пануе лёгкі тон, героямі ёсьць другарадныя пэрсанажы. Як бачыць кожны, сёньня стае звыклым культурны штурм подступаў, для сапраўдных жыхароў мэтраполіі жыцьцё ператвараецца ў дзесяцібор'е паводле лёгкасьці ўспрыманьня ўсіх дысцыплінаў, хуткасьць становіцца паэзіяй, сувэрэннасьць

– цукеркай для душы ў любым узросьце, у васямнаццаць ты ўжо маеш пасьведчаньне кіроўцы і здольнасьць ухіляцца, і з таго часу, як ёсьць курсы, дзе вучаць лепш абыходзіцца з усім, на самай справе ўсё можна лепш абысьці. Няхай жывуць подступы – увесь постмадэрн сьпявае хвалу прынцыпу подступу, ён жыве з павышэньня вартасьці і колькасьці пабочных сцэнаў, ён навучыў зрабіць канец галоўным справам і справам дзяржаўнай важнасьці. Мы здаем назад сцэнары, у якіх было напісана, што мы павінны высільвацца і стаць героямі.

Апрыёры адкладаньня, відавочна, знаходзіць сваіх апалягетаў толькі пад знакам постмадэрну. Мы ўсур'ёз прасякаемся несур'ёзнасьцю і ўзводзім адтэрміноўку ў ранг прынцыпу, новы скепсіс ухваляе маленькія адрозьненьні, маленькія пісьменьнікі па-вялікаму расьпісваюць адрозьненьні подступаў, даўнейшыя ж панэгірысты сярэдняга цяпер ёсьць простымі пэнсіянэрамі – мы тым часам сталі апакаліптыкамі пасрэднасьці. Ад часу абсалютызацыі подступу любыя другасныя рэчы ператварыліся ў *hen kai panta*, і паколькі адзінае, што тут засталося – гэта іншае, чым усё астатняе, маё маленькае адрозьненьне ператвараецца ў вось сьвету. Цяпер зноў можна класьці ўсе свае сілы на нішто, мы разумеем, што хуткім маладым людзям, якія ў свой час апынуліся ў СС, усяго толькі гістарычна не пашэнціла, сёньня яны былі б найлепшымі *in research of excellence*, бо яны ўжо тады цудоўна ўхапілі чыстае Наперад, розьніца толькі ў тым, што цяпер мы робім гэта і бяз трупаў. Лёгкае найвышэйшае дасягненьне – вось мінімальная стаўка. Дух часу клапоціцца пра тэмп. Запасныя гульцы становяцца стармэйкерамі, нулі ўзводзяць братоў-нулёў у адзінкі, настала лічбавая дэмакратыя. Паколькі адкладаньне функцыянуе, сьвет зноў набыў ружовы выгляд, і калі мы прыйшлі ў такі сьвет, які выглядае, як вядомы нам, разьняволена катастрафічны і апакаліптычна ўтульны – чалавецтва хістаецца на краі бездані, але прыбіральшчыца прыходзіць два разы на тыдзень, – то адказнасьць за гэта ў ліку іншага нясуць таксама моц адтэрміноўкі і сьветатворны жэст адкладаньня важнейшага. Адтэрміноўцы мы заўдзячваем тое, што ў тысячагадовым райху мілых людзей запанавалі інтанацыі прыдатнасьці для жыцьця. Гэта яе работа, калі паэтыка бестурботнасьці з максымальным посьпехам даводзіць сваю перавагу над сцэнарамі не-на-

жыццё-а-на-сьмерць. Эпічны тэатар скінуты з народных сцэнаў і з асартымэнту «Зуркампа»[4], Ліндэнштрасэ цяпер паўсюдна, дэфаталізацыя ахапіла шырокія колы, трагічныя зьместы прыбраныя з сталоў, бо выбар паміж зьмястоўнасьцю й гвалтоўнасьцю зроблены, як мае быць, на карысьць негвалтоўнасьці, адсюль безьзьмястоўнасьць вынікае сама сабой. Лёгкай рэальнасьці цалкам падабаецца быць пасрэдным празаічным творам, у якім унутраныя прасторы сталі залішнімі, а геройствы камічнымі. Калі хтосьці скажа мне, што я знайду сябе ўнутры сябе, я адкажу, што яму трэба знайсьці сабе сяброўку.

Спадарства, магчыма, вы зьдзіўляецеся супярэчнасьці паміж тым, што я анансаваў, і тым, што я апавёў. Павінна быць, у гэтага вы пачулі фэльетон пра культуру *take-it-easy* і пра рухавае жыццё ў сучаснай сярэдзіне. Як гэта можна растлумачыць? Я не губляю часу на сьцьверджаньне, што нічога важнейшага за працу дзеля аблягчэньня жыцьця ня думаю, хоць і, па-мойму, ведаю, дзе сацыял-лібэральная філязофія шчасьця дарэчная. Аднак я мяркую, што аблягчэньне жыцьця ў пэўнай меры ёсьць перадумовай наступнага фэномэну, пра які я насамрэч сьцьвярджаю, што ён прадстаўляе сабой вырашальную сьветатворную функцыю ў шэрагу названых да гэтага. Калі апрыёры адкладаньня адыграла сваю ролю, за справу бярэцца пяты элемэнт у нашай паэтыцы сьвету. Я называю яго апрыёры сцэны – альбо іначай: апрыёры майдану ці апрыёры арэны. Што такое сцэны, мы ведаем з прататыпаў грэцкага і рымскага тэатру. Фэномэн майдану вядомы праз народныя сходы, вялікія натоўпы, кірмашы, месцы няшчасных здарэньняў, палі бітваў і месцы пакараньняў сьмерцю. А пра арэны, месцы ахвярапрынашэньня зь пяску і крыві, нам даюць уяўленьне месцы бою быкоў, Калізэі, культавыя пляцоўкі і спартовыя стадыёны (трэба разважыць, ці не належаць да гэтага шэрагу радзільныя залі[5] ў радзільных дамох).

На сцэнах, майданах і арэнах выконваюцца сымбалічныя акты, адкрыцьця сьвету, якія ствараюць у людзей уражаньне, што ўніх на самай справе пра штосьці ідзецца. На гэтых сцэнах і арэнаапрыёрных палёх сьвету ўспрымаюцца рэчы, якія

[4] Кінь ён ...

[5] ... на майдане ...

выступаюць на пярэдні плян як галоўныя і якія нясуць рызыку пластычнага існаваньня ў прасторы адкрытай выразнасьці. У сьвеце арэнаў робіцца значнай розьніца паміж схаванасьцю і несхаванасьцю. Таму высокаразьвітыя культуры – гэта цывілізацыі, якія паўтараюць драму нараджэньня і вытворчасьці сьвету ў сымбалічным выхадзе наперад надзвычай выразных вобразаў. Такім чынам, культуры – гэта ня толькі сацыяльныя «сыстэмы», у якіх адбываецца родаразьвязаньне, дзе апрацоўваюцца пільнасьці, бяруцца ініцыятывы і будуюцца подступы для нязмушанага занятку другараднымі рэчамі. Яны ёсьць перадусім сцэнабудавальнымі сыстэмамі. У якасьці арэнатворчых працэсаў яны ёсьць утварэньнямі, якія драматызуюць самі сябе, жыцьцёвая нэрва якіх палягае ў іх здольнасьці зноў і зноў у драматычных відовішчах паўтараць сваё ўласнае разьвіцьцё ў сусьветным часе, каб падняцца на вяршыню сваёй уласнай актуальнасьці. Калі ў пэўнай культуры адмірае адчуваньне гэтай функцыі, пачынаецца яе канцавы пэрыяд, у якім прыватныя асобы больш не пакідаюць свае пячоры. Бо вытворчасьць сьветаў, у якіх людзі могуць знаходзіцца з праўдападобнымі матывамі, сама ёсьць функцыяй жэстаў, якімі адкрываюцца і насяляюцца сцэны, майданы і арэны. Калі зьмяншаецца прастора, у якую можна ўвайсьці, каб сказаць альбо паказаць, як з пункту гледжаньня пратаганіста ідуць справы ў сьвеце, тады хутка ня будзе й сьвету, у які варта выходзіць. Прыход на сьвет людзей з самага пачатку паказвае на сцэнічныя і арэнныя якасьці сьвету як такога. Калі сцэны і арэны зачыняюцца, таму што альбо акторы пачынаюць кідаць свой занятак, альбо ўладары ўладкоўваюць сьвет як уласную гаспадарку і дазваляюць толькі ўласнае бездухоўнае шоў, тады эра прыходу на сьвет наагул завяршаецца. Менавіта гэта ёсьць сыгнатурай нашай эры – гэта час рэзыгнацыі і шоў, час афіцыйнага прыватызму і інтымнай апакаліптыкі. Той, хто сёньня яшчэ мае вялікія амбіцыі, шукае спэктакль ува ўжо не адкрытым – пакуль пячора не загудзе.

Спадарства, сёньня няма, як у рознай танальнасьці казалі Юрген Габэрмас, Ніл Постмэн, Рычард Сэнэт і іншыя, крызісу публічнага – насамрэч ёсьць крызіс прыходу на сьвет, крызіс арэннай сьвядомасьці і веры ў тое, што людзі ёсьць істотамі, якія могуць цалкам прыйсьці на сьвет, каб быць цалкам ад

гэтага сьвету. Пабудова сцэнаў і адкрыцьцё арэнаў былі элемэнтарнымі жэстамі культураў, якія пацьвярджаюць іх талент трымацца ў кантынуўме самаразгортваньня. Прыход на сьвет і выхад на сцэны дзеля добрых і неабходных п'есаў гэтага сьвету – гэта дзьве рэчы, якія немагчыма аддзяліць адну ад другой. Спадарства, раней я сказаў, што апрыёры родаразьвязаньня прыводзіць да прывязаньня прыбышоў на сьвет да адкрытасьці і непрадказальнасьці быцьця. Але для дарослых, калі такія сёньня ёсьць, гэтая адданасьць адкрытаму можа настаць толькі ў тым выпадку, калі яны ў пазытыўным перайманьні, працягненьні і аналягізацыі нараджэньня будуць удзельнічаць у стварэньнях сьветаў і адкрыцьцях жыцьцяў, якія разыгрываюцца ў падзеях на сацыяльных сцэнах, майданах і арэнах. Мы прыходзім на сьвет толькі тады, калі нам нічога ня можа перашкодзіць застацца ва ўсходзе сьвету, які пачаўся ў маланцы нараджэньня.

Мае спадарыні і спадары, сярод пяці вышэй названых жэстаў альбо функцыяў *a priori* гэтага накіду маленькай паэтыкі сьвету цотныя гэтаксама складаюць адно цэлае, як і няцотныя. Другі і чацьвёрты ўладкоўваюць сьвет як другасную пячору для народжаных істотаў, яны будуюць другасную матку, якая складае сутнасьць цывілізацыі; клапоцячыся пра пільнае і абараняючы ад франтальных напружаньняў, яны засноўваюць унутраны сьвет, у якім можна жыць з абавязкамі і цяжарамі. Яны забясьпечваюць начны сон і прыносяць раўнамернасьць у хаду дзён. Яны ствараюць скобы, якія надаюць трываласьць сацыяльнаму будынку, і ахінаюць сьвядомасьці ўлоньневым пачуцьцём прыналежнасьці і ідэнтычнасьці; абяцаньнем бесьперапыннасьці і пэўнасьці чаканьняў яны ахоўваюць індывідаў ад панікі, якая звычайна ўспыхвае пры рэзкім надыходзе нечаканага.

Зусім іншая справа зь няцотнымі апрыёры. Што да ўсьведамленьня «суб'ектам» свайго знаходжаньня ў родаразьвязаньні, то толькі псыхозападобныя станы даюць бездань інфармацыі пра ягоны рэальны зьмест. Пры асучасьніваньні пэрынатальнага досьведу размова стала ідзе пра надзвычайныя станы псыхікі, хоць і няма неабходнасьці загадзя характарызаваць гэтыя станы ў псыхіятрычных

тэрмінах. У паведамленьнях пра заблякаваных і выратаваных амаль рэгулярна ўсплывае натальна-мімэтычны элемэнт, які мае месца таксама і ў большасьці архаічных рытуалаў ініцыяцыі – як вядома, некаторыя з гэтых працэдураў не лякаюцца нават пераводзіць ініцыянтаў у стан, блізкі да сьмерці, зь якога зварот у чуйнае быцьцё відавочна ўспрымаецца як паўторнае нараджэньне. Апошняе ў даўнейшых культурах уважалася за ўмову жывой дарослasьці, якая можа быць дасягнутая толькі праз разлучэньне з часам дзіцячых мараў – гэта значыць, праз выхад з забыцьця нараджэньня і сьмерці, якое ў сучаснасьці ўяўляе сабой нармальны стан і ў дарослых. Але той, хто, ня будучы баронам Мюнхгаўзэнам, зноў перажывае рэальныя элемэнты свайго нараджэньня, той урэшце і сёньня прыйдзе на сьвет, але ня зможа падзяліцца сваімі ўражаньнямі, бо яму зойме слых, зрок і мову.

Процілеглае гэтаму слушнае для трэцяга апрыёры, апрыёры ініцыятывы. Бо як толькі людзям удаецца дасягнуць самапачатку, дзе яны ўсталёўваюць, праектуюць, пераймаюць сябе, яны знаходзяцца ў сілавым пункце дзеяньня і выяўленьня. Праз ініцыятыўнасьць у суб'екта адкрываюцца экспрэсіўныя шлюзы, і тады ён ня проста «выяўляе» сябе, як мяркуюць наіўная псыхалёгія і яшчэ больш наіўная сэміётыка, але становіцца жывым знакам свайго самазапальваньня, ён жыве тады ва ўзгараньні да актыўнасьці, якая *ёсьць* рухам і выяўленьнем. Адсюль нам трапляюць на вочы загадкі сучаснасьці зь іх цяпер ужо відавочнымі парадоксамі: цывілізацыя з грандыёзнымі ініцыятыўнымі жарсьцямі мусіць разьвіць такую моцную дынаміку рушаньня, што гэтая дынаміка ўжо ня можа апрацоўвацца ўласнымі стабілізацыйнымі сіламі. Сучасная пабудова пячораў ужо не пасьпявае за ўзрываньнем пячораў. Так разьвіваецца парадаксальны прымус да ініцыятывы якраз сярод кансэрватыўных слаёў. Сілы захоўваньня становяцца рэвалюцыйнымі, носьбіты зацікаўленасьці ў тым, каб у цэлым нічога не мянялася, усё перакульваюць дагары нагамі; кансэрватызм кідаецца ў чыстае Наперад і шукае абсурдны сынтэз захаваньня вартасьцяў і татальнай мабілізацыі наяўнага. Няма сумневу ў тым, што тут схаваная кінэтычная таямніца новага часу – таямніца мабілізацыі ўнутры пячоры,

каб ня трэба было яе пакідаць. З кансэрватыўных матываў і нерухомых страхаў наймагутнейшыя агенты так званага існуючага пусьціліся наўцёкі наперад і ператварылі выпетралыя зьместы сьвету ў нешта, што пэрманэнтна трэскаецца і распадаецца – ажыцьцяўленьне нэакансэрватыўных вартасьцяў і засьмечваньне плянэты – гэта дзьве праявы адной і той жа сытуацыі.

Спадарства, нарэшце, пятая функцыя, апрыёры сцэны з усіх вышэй названых у працэсе стварэньня сьвету ёсьць найважнейшай і найбольш патрабавальнай. Каб ахарактарызаваць яе, у якасьці вынятку можна ўжыць рылькеўскі супэрлятыў ад дзеепрыметніка таксама ў прозе: калі родаразьвязаньне проста адкрывальнае, а ініцыятыва адкрывальнейшая, то выстаўленьне сябе ў тое, што праз гэта становіцца сцэнай, ёсьць найадкрывальнейшым.

Для пісьменьнікаў і прамоўцаў з арэннымі якасьцямі гэта азначае: яны выражаюць нешта, што зьвяртае ўвагу на сьвет як інтэгральную падзею. Калі яны яўляюць словы, пачынае рабіцца адчувальным наяўнасьць сьвету наагул. Яны робяць наглядным абмен, які абгрунтоўвае эканоміку жыцьця: ува ўсіх на вачах яны абменьваюць невыгоду быць народжаным на выгоду гаварыць. Яны прыходзяць на сьвет у мове, яны прыходзяць у мову як наведнікі з плянэты ненароджаных, яны прыводзяць у вібрацыю белае вакол надрукаваных літараў, і пад іхным пяром абсалютная невыгода ператвараецца ў найбольш эўфарычную з усіх выгодаў. Яны скаргай здабываюць сабе цэлы сьвет, які гамоніць людзьмі. Тое, што называюць камунікацыяй, для іх, паэтаў, пісьменьнікаў, узьнікае толькі праз тое, што яны ставяць на кон непадзельную невыгоду быць народжаным і дзеляць яе зь іншымі. Таму ў словах паэтаў гучыць бадхісатвіянская якасьць. Той, хто гаворыць у адкрытай прасторы, дзеліць незваротную народжанасьць іншых, і як над магічным тэатрам Германа Гесэ ў «Стэпавым воўку» вісела аб'ява «Толькі для вар'ятаў», так у сказах паэтаў заўсёды ёсьць непрыкметнае: «Толькі для народжаных». Той, хто меў досыць вар'яцтва, каб прыйсьці на сьвет, калісьці зразумее, што ён сасьпеў для родаразьвязаньня праз паэзію. Паэзія – гэта сусьветная рэлігія без забабонаў. Пакуль людзі не ўсьвядомяць

сваёй паэтычнай сусьветнай дамовы, пакуль яны не дасягнуць паэтычнага падзяленьня непадзельнага, датуль марнымі будуць спробы зьвязаць іх фармальна-праўнымі грамадзкімі дамовамі. Індывідуальны шал нараджэньня, прыватныя роспачы і выратавальныя фантазіі, калектыўныя ўцёкі ў выхваляньне групавымі і нацыянальнымі ідэнтычнасьцямі заўсёды будуць мацнейшымі за заклік да самаабмежаваньня праз дыскурсіўны розум. Неразьвязаныя будуць стала чапляцца за свае ўяўленьні, якія азначаюць сьвет. Самасьцьверджаньні неразьвязаных будуць ухваляць бюджэты якога-любя суб'ектыўнага і аб'ектыўнага ўзбраеньня ў першым, другім, трэцім чытаньні аж да самаробнага суднага дня. Неразьвязаныя ж не чытаюць тэкстаў акушэраў – дый навошта, калі ёсьць аўтары, якія абслугоўваюць патрэбу неразьвязаных у зьвязаньні і лашчаць індывідуалісцкія фікцыі неіндывідуалізаваных. Тое, што Адорна і Горкгаймэр калісьці назвалі індустрыяй культуры, цяпер можна вызначыць таксама і як індустрыю зьвязаньня і – паколькі мы жывём у эпоху рэфлексіўных функцыяў – як індустрыю самазьвязаньня.

Спадарства, я набліжаюся да канца. Але я не магу скончыць, не вярнуўшыся да сылягізму пра Сакрата, пракамэнтаваць які сёньня я абяцаў мінулым разам. Усе людзі сьмяротныя. Сакрат – чалавек. Гэта значыць, Сакрат сьмяротны. Школьны прыклад модусу «барбара» ўсё яшчэ сьмяротны, як у антычных падручніках лёгікі. Затым я пачаў выкладаць гэтую найпрасьцейшую лягічную фігуру высновы ў нязначна зьмененай форме, у якой было наяўнае ўсё, апроч апошняга слова, прэдыкату заключэньня. Усе людзі народжаныя, Сакрат – народжаны акушэр, такім чынам, Сакрат… – і на гэтым месцы нас перапынілі сёмушныя вакацыі. Спадарства, часам можа быць карысным пачакаць на адно слова чатырнаццаць дзён, перадусім, калі ідзецца пра незвычайны выраз, які яшчэ ня мае месца ў слоўніку паўсядзённасьці і ў філязофскай тэрміналёгіі. Грунтоўныя развагі заўсёды дарэчы, калі трэба знайсьці слова, якое мусіць трываць доўга. Усё ж такі шуканае слова прэтэндуе замяніць выраз у сылягізьме, у якім людзі ўжо тысячагодзьдзі сьмяротныя. Спадарства, трэба ўявіць сабе, што значыць тое, што слоўцу «сьмяротны» спатрэбілася тры тысячы гадоў, каб вырасьці да свайго поўнага значэньня, якое цяпер лунае над

усім родам людзкім. Ня так даўно Гюнтэр Андэрс, гнеўны стары палітычнай антрапалёгіі, паказаў нам, як род сьмяротных на сыходзе эўрапейскай эры выявіўся сьмяротным родам. Чалавецтва сёньня ёсьць элемэнтам, здольным да галацыду, яно раз і назаўсёды даказала свой талент да вымірaньня і здольнасьць да ўсеагульнага самагубства. Гэтая думка мае ў сабе нешта непазбыўнае, трэба было б параіць тым, хто сёньня нібыта думае пра становішча чалавецтва, вытатуяваць на лбе матыля – мёртвую галаву.

Дык хто ж такі Сакрат, калі ён ня проста сьмяротны, які граў ролю акушэра? Ну, Сакрат нараджальны. У вялікай пасылцы я сказаў, што ўсе людзі народжаныя. Калі б у нашым сылягізьме выконваўся толькі перанос прэдыкату зь вялікай пасылкі ў выснову, у якой зьяўляецца імя ўласнае Сакрат, то мы здабылі б ня болей, чым тэзіс, што і Сакрат народжаны. Тады мы, як гэта звычайна здараецца ў лёгіцы, абстрагаваліся б ад асаблівага ў носьбіце імя ўласнага, мы залічылі б Сакрата да мноства ўсіх народжаных сьмяротных людзей і страцілі б маланку адрозьненьня, якая рабіла Сакрата тым, кім ён быў. Таму ў малой пасылцы ўжо абачліва значылася: Сакрат – народжаны акушэр. Так Сакрат праз сваё малое вялікае адрозьненьне стаў асаблівым мноствам у мноства народжаных сьмяротных – ён ператварыўся зь сьмяротнага ў несьмяротнага акушэра эўрапейскай утопіі, грэцкай ідэі нэгатыўнасьці, ён выкшталціўся ў павітуху няведаньня, якая разьвязвае веду ад яе залежнасьці ад сусьветных пазыцыяў. І тым самым у сылягізм прыўносіцца нечаканы рух. З малой пасылкі ў вялікую выпраменьваецца сьвятло, у самога слова «народжаны» вырастае пуза, як быццам яно цяжарнае нейкім ніколі дагэтуль не раскрываным значэньнем. На самай справе, мы цяпер разьвязваем мацярынскае слова ад слова-дзіцяці, на якое ўскладаюцца надзвычайныя спадзяваньні. Мацярынскае слова ўздыхае пасьля тысячагадовай цяжарнасьці, яно нарэшце аддзялілася і адрозьнілася ад значэньня, якое яно да гэтага нябачна цягала з сабой, каб стварaць бясконцыя непаразуменьні; вы толькі падумайце пра непрыемнасьці, якія для кожнага інтэлектуала зьвязаныя з паняцьцем «прырода». Новае нараджальнае, з свайго боку, можа пачаць самастойнае жыцьцё поруч з старым народжаным, хоць і ўсьведамляючы

роднасьць, але ўжо не хаванае мацярынскім словам. Толькі калі слова «нараджальнасьць» перастае быць схаваным, робіцца ўвогуле зразумела, што азначае несхаванасьць як такая: само паняцьце ісьціны пасьля дзьвюх з паловай тысяч гадоў эўрапейскай філязофіі ў водбліску слова «нараджальнасьць» наблізілася да свайго тлумачэньня. З таго моманту, калі людзі разумеюць, што яны ня толькі народжаныя, але й нараджальныя, яны могуць спасьцігнуць, што ісьціна ёсьць функцыяй іхнага прыходу на сьвет і што з мэтафізычнай фіксацыяй пагляду на сьмяротнасьці на сьвет прыйшла першая няпраўда.

Мае спадарыні і спадары, слова «нараджальны» яшчэ хістка стаіць на нагах, яно гучыць штучна і несамастойна, пра яго трэба будзе добра паклапаціцца. Аўтарства гэтага слова, наколькі я ведаю, належыць швэйцарскаму філёзафу Гансу Занэру: яно ўпершыню зьяўляецца ў маленькай важнай кніжцы «Нараджэньне і фантазія. Пра натуральнае дысыдэнцтва дзіцяці» – там слова «нараджальнасьць» тлумачыцца на ўзроўні асноўных паняткаў. Між іншым, кніжка зьявілася ў сямідзясятыя гады, яна дагэтуль яшчэ не рэцэнзаваная, бо ў пячоры філёзафаў з таго часу на парадку дня другое, яны гавораць пра абгрунтаваньне нормаў, пра плюралітэты, кідаюцца на тэорыю знакаў, праўда, за выняткам знакаў часу, і завісаюць на лінгвістычным турніку. Але гэта ня важна, бо *poetic turn* філязофіі ўжо непрыкметна адбыўся з усёй грунтоўнасьцю. Ганс Занэр даў жыцьцё катэгорыі нараджальнасьці і тым самым адкрыў новы разьдзел філязофскага думаньня, які будзе стаяць пад знакам дзіцяці, прыходу ў сьвет і паэтычнага духу. Маленькае слова-леў да гэтага знайшло няшмат прыхільнікаў. Але, спадарства, я думаю, што мы зробім добра, калі спусьцімся да гэтага лява ў яму, пакуль ён яшчэ малады, таму што ёсьць пэрспэктыва, што ў яго вырастуць кіпці – тады «нараджальнасьць» ні ў якім сэнсе не саступіць «сьмяротнасьці» ў значнасьці.

Цяпер я ня маю дадаць нічога, апроч прабачэньня за тое, што сёньняшняя лекцыя атрымалася занадта доўгай. Пра што будзе гаворка ў наступнай і апошняй лекцыі, я, спадарства, ужо намякнуў. Пераход ад сёньняшняй паэтыкі родаразьвязаньня

да тэмы «Сусьветная літаратура» не такі раптоўны. У выразе «сусьветная літаратура» заключаны, як можна будзе паказаць, яшчэ і іншы сэнс, чым той, які зьвязваў з сваім славатворам Гётэ. Гаварыць пра сусьветную літаратуру цяпер можа таксама значыць: разьвіваць пачаткі крытычнай тэорыі сьвету як паэзіі і абяцаньня.

5. СУСЬВЕТНАЕ АБЯЦАНЬНЕ І СУСЬВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА

Спадарства, за гадзіну да сканчэньня цыклу лекцыяў няўтульна мець пачуцьцё, што істотнае так яшчэ й не было пачатае. Усё, што гучала дагэтуль, было ня больш за падрыхтоўку да чагосьці больш важнага, пра што я нават яшчэ не пачаў гаварыць. Я адно вельмі марудна набліжаюся да таго, што трэба цяпер сказаць. Цяжка пазбыцца ўражаньня, што тое, што нам цяпер належыць пачуць, пагражае стаць гаварэньнем навыперадкі са сплываючым часам. Але нават калі прамоўца пад ціскам, дагэтуль не сказанае не паддаецца хуткаму выказваньню. Я прабавіў чатыры гадзіны, прадстаўляючы некаторыя перадумовы, каб прабіцца ў прыёмны пакой вырашальнай рэчы. Але найважнейшае, Яе шэрая Вялікасьвятарнасьць, якая нават імя ня мае, відавочна яшчэ не зрабіла ласкі запрасіць. І вось мы сядзім перад уваходам у аўдыенц-залю істотнага, якое трэба сказаць, і чакаем.

Спадарства, каб чымсьці заняцца ў часе чаканьня, я прапаную вярнуцца туды, дзе мы спыніліся пры канцы апошняй лекцыі. Я абяцаў вам выкласьці сёньня пачаткі крытычнай тэорыі сьвету як паэзіі і абяцаньня. Апошняя лекцыя закончылася, калі я не памыляюся, на крыху лірычнай ноце. Слова «сьвет» атрымала мяккія палі, хацелася нарэшце ўжыць яго не як лаянку і вымавіць яго ня тонам «храновае надвор'е». Абвяшчэньне тэорыі сьвету як паэзіі і абяцаньня гучала так, як быццам я хацеў наліць крыху гліколю ў кіслае віно анталёгіі, каб можна было прадаваць яго ў Франкфурце як якасны паўднёванямецкі тавар. Сьвет як паэзія, сьвет як абяцаньне – гэта гучыць так, як быццам цяпер усё яшчэ стане цалкам пазытыўным. Зараджаецца падазрэньне, што папярэднія размовы пра няведаньне і родаразьвязаньне служылі залагоджваньню

непрымірэнчага духу нэгатыўнасьці, а цяпер прыйшоў час, калі аўтар выпусьціць зь мяха пазытыўную котку. Я ня буду пярэчыць такому падазрэньню, але папрашу прасачыць за наступнымі думкамі.

Спадарства, калі на апошняй лекцыі я пачаў выкладаць курс невялікай сусьветнай паэтыкі з падставовых жэстаў, у намаганьні прыходу на сьвет выйшла гульня з пазытыўных і нэгатыўных рысаў. Мы ахарактарызавалі тры, так сказаць, крывыя, адкрывальныя, ударныя, дэстабілізацыйныя рысы і дзьве прамыя, асвойвальныя, уладкавальныя, стабілізацыйныя. Калі вы памятаеце: праз жэсты разьвязаньня, жэсты ініцыятывы і сцэнатворныя жэсты мы трапляем у адкрытае, паварочваемся да новага, нас ахоплівае драматычная, падзейная якасьць існаваньня. Насупраць, жэсты клопату пра найпільнейшае і жэсты палягчэньня, якімі адкладаецца занадта цяжкае, маюць сьветаўладкавальны, сьветаўмацавальны сэнс, дзякуючы ім спаміж народжанымі зьяўляецца крыху пячорнай утульнасьці, а таксама ілюзія свабоды; страту першаснай маткі людзі кампэнсуюць пабудовай сацыяльных, сымбалічных і тэхнічных другасных мацярынскіх улоньняў, людзі не скараюцца перад архаічна халодным выкіданьнем, але прывязваюцца да новых каморак цеплыні.

Няцотныя апрыёрныя жэсты распачынаюць адкрыванье сьвету як агульнай прыгоды, празь іх быццё стае сыходам і *experimentum mundi*, калі згадаць прыгожы лёзунг Эрнста Блоха; цотныя жэсты апрыёры, насупраць, робяць свой унёсак у вытворчасьць сьвету як месца пражываньня і працы, яны ствараюць інстытуцыйныя мацаваньні і ў якасьці жэстаў адвечнага кансэрватызму клапоцяцца пра забесьпячэньне паселішча Зямля праз захады для аховы жыхароў і пра далейшае захаваньне працоўнага месца Сьвет. Гэтае апошняе назіраньне не пазбаўленае пікантнасьці, бо як марксізм, так і лібэральныя інжынэрныя філязофіі ўбілі нам у галаву, што праца – гэта авантурная катэгорыя зь якасьцямі сыходу – але слушным ёсьць адваротнае, бо праца заўсёды ёсьць стабілізацыйнай працай, гэта значыць унутранай архітэктурай у сусьветнай прасторы, якая была адкрытая іншымі жэстамі. Таму якраз адкрыцьця альбо зьмяненьня дагэтулешняга

дызайну сьвету праз працу дасягнуць немагчыма, яна стварае хіба што татальны бум унутры пячоры, накшталт таго, што мы сёньня зазнаем у сусьветным маштабе пад знакам нэакансэрватыўных мабілізацыяў. Бо ж сусьветная формула дынамічнага нэакансэрватызму гучыць так: неўсьвядомленасьць плюс максымальная хуткасьць, альбо: нерухомасьць – насустрач выбуху.

Спадарства, цяпер настаў момант спытаць, ці вышэйназваных жэстаў, сьветаадкрывальных і сьветазахавальных, дастаткова, каб прывесьці нас дакладна ў той сьвет, у які мы прыйшлі фактычна. Давайце азірнемся: як некалькі соцень людзей здолелі сабрацца ў гэтай аўдыторыі – альбо перад гэтым экранам, што стаіць перад вамі? Як ім удалося дамовіцца пра тое, на якой мове будуць чытацца лекцыі па паэтыцы? Якія перадумовы мусілі быць створаныя, каб прамову накшталт гэтай можна было прачытаць і запісаць? Зусім відавочна, што названыя дагэтуль чыньнікі ўмагчымленьня даюць на гэта толькі частковы адказ. Натуральна, ніводны чалавек не сядзеў бы тут, калі б ён альбо яна ў рамках апрыёры разьвязаньня не адкрылі б магчымасьць сядзець тут на чатырох, пяці альбо сямі літарах (заднечасткавы слоўнік нямецкай мовы прапануе так многа магчымасьцяў); і прамоўца сёлета ня быў бы чарговым балбатуном ад паэтыкі, калі б не папярэдняя праца бусла. Відавочна, гэтыя развагі даюць прыклад таго, што называюць неабходнымі, але не дастатковымі ўмовамі. Апрыёры разьвязаньня – так, але толькі празь яго не прыходзіш у адну з франкфурцкіх аўдыторыяў пахмурным чэрвеньскім вечарам 1988 году пасьля нараджэньня Хрыстова. На шчасьце, наш запас умоваў яшчэ ня вычарпаны: мусілі быць выкананыя таксама пэўныя перадумовы пільнасьці, перш чым мы атрымалі магчымасьць перажываць наша быцьцё-ў-сьвеце тут і цяпер як быцьцё-да-сьмерці-ў-аўдыторыі-VI; што да мяне, то Зыгфрыд Унзэльд сказаў мне, што я досыць пільна павінен зрабіць гэта цяпер; і вы, мае спадарыні і спадары, напэўна, маеце жахлівую карму, інакш ніякая сіла ў сьвеце не прымусіла б вас быць менавіта тут і нідзе болей; апроч таго, мусілі быць праяўленыя ініцыятывы, і кожны прысутны павінен быў праз свабоднае пераняцьце сябе перад абліччам Нішто наважыцца выбраць матыў, які прывёў яго да ягонага сядзячага альбо стаячага

месца. Далей у рамках апрыёры адкладаньня мусіла быць выкананая ўмова, што гэтае мерапрыемства – ня справа жыцьця альбо сьмерці, не занадта цяжкая задача, ня прыклад першых альбо апошніх рэчаў, але абяцае быць другаснай справай у рамках дзейнасьці на подступах, бяз жорсткага прымусу да выніку, з адкрытымі выхадамі з залі і з праязной карткай альбо ключом запальваньня ў кішэні для вяртаньня дахаты. Нарэшце, што датычыць апрыёры арэны, то арганізатары ласкава пабудавалі сцэну і ўсталявалі мікрафон (з тэхнічным шармам пяцідзясятых гадоў), так што прамоўцу заставалася толькі выйсьці сюды і паклапаціцца пра размову. Да гэтага месца ланцужок умоваў для ўмагчымленьня *a priori* быцьця-ў-залі ня мае прагалаў. Але само сабой зразумела, што ў гэтым ланцужку ўсё яшчэ бракуе вырашальнага моманту, безь якога астатнія ўмагчымленьні застаюцца пустымі, а менавіта, бракуе таго, што я цяпер, зноў з ваганьнем, называю мовай. Я маруджу з гэтым словам таму, што пасьля стагодзьдзя філязофіі мовы і лінгвістыкі сутнасьць мовы скажоная да непазнавальнага; я баюся вымавіць яго таксама таму, што мне бракуе мужнасьці сказаць тое, што трэба сказаць пра сучасны стан мовы ў сёньняшніх носьбітаў нямецкай.

Спадарства, цяпер выглядае, што мы павінныя былі б перайсьці да таго, што папярэдне было названае істотным. Замоўчванай дагэтуль умовай нашага прыходу ў сьвет відавочна ёсьць мова – пакуль называючы гэты фэномэн у фальшывым абагульненьні. Значыць, мы павінныя былі б далучыць да нашай малой паэтыкі сьвету яшчэ адну функцыю і ўвесьці ў якасьці шостага элемэнту апрыёры мовы ці маўленьня.

Адсюль магло б падацца, што кола абсалютных умоваў для прамовы, якая адбываецца цяпер, у гэтым месцы сьвету замкнёнае. Магло б падацца, што ўсе перадумовы вытворчасьці сьвету выкананыя і вялікі рух жыцьця да рэальнай і наяўнай сцэны, які быў адкрыты праз родаразьвязаньні, разам з прыбыцьцём да слова, са зьяўленьнем мовы знайшоў сваё завяршэньне. Але, мае спадарыні і спадары, адразу стане бачна, што так увесьці мову ў паэтыку сьвету нельга. Так танна істотнага – я паўтараю гэты падазроны выраз – не фарсіраваць. Далей я раскрыю прычыны таго, чаму апрыёры мовы ў

згаданым сэнсе не існуе і чаму агульнапрынятае гаварэньне пра апрыёры камунікацыйнай супольнасьці ўводзіць у зман і ня мае падставаў.

Для гэтага я мушу зрабіць крок назад і нагадаць пра тое, чаго нам яшчэ не хапала ва ўзаемадзеяньні жэстаў вытворчасьці сьвету. Я спрабаваў паказаць, што фармальна пры дапамозе сцэнаадкрывальнага апрыёры можна прасунуцца ўшчытную да пункту, калі актор гадзіны наважваецца выйсьці на подыюм. У гэтым месцы ланцужок умоваў кінуў нас на волю лёсу, мы бязмоўна стаялі, маючы за сьпінай трохі разьвязаньня, матываваныя пільнасьцямі, акрыленыя пэўнай доляй волі да ініцыятывы, аблегчаныя адкладаньнем больш важных рэчаў і зьлёгку ўзрушаныя пабудовай сцэны для лекцыяў – і бязрадна пераступалі з нагі на нагу, бо стала зразумелым, што толькі гэтага яшчэ не дастаткова, каб узяцца за істотную справу, а менавіта, каб сказаць тое, для чаго тут стаіць гэтая сцэна – калі меркаваць, што быцьцё на сцэне абавязвае. Дык што ж далей? Паводле афіцыйных камунікацыйных філёзафаў, цяпер адбылося б наступнае. Я думаю, спадарства, што вы бязь цяжкасьці можаце ўявіць сабе актора, які б выйшаў на сцэну і абвесьціў публіцы наступнае: «Шаноўныя прысутныя, аўтар просіць паведаміць, што вы павінны, пакуль ня будзе іншых указаньняў, гаварыць адно з адным самі, бо мова, як вядома, будуе масты паміж людзьмі. Далей, аўтар паведамляе вам, што яму зь ягонага боку больш няма чаго сказаць, бо трэба сьпярша дачакацца вынікаў камунікацыйных дасьледаваньняў. Наш спэктакль закончаны, мы просім высокашаноўную публіку падняцца зь месцаў, бяз шуму пакінуць залю і пасьля выхаду з будынку пачынаць моўныя акты вольнага выбару, прычым, наколькі гэта дазваляюць абставіны, да лепшых часоў рэкамэндуецца захоўваць сымэтрыю магчымасьцяў партнэраў узяць слова. Вялікі дзякуй і да пабачэньня!» Спадарства, б'юся аб заклад, што ў гэтым тэатры публіку больш не пабачылі б. І гэтаксама, як не спадабаецца публіцы актор, які агучыць такое паведамленьне, не задаволіць нас і камунікацыйная тэорыя, якая прапануе нам задаволіцца высновай, што трэба пад моўна-філязофскім наглядам гаварыць адно з адным, каб прыйсьці ў супольна дамоўлены сьвет. Каб унікнуць непаразуменьняў: гаварыць адно з адным насамрэч трэба, і на самай справе пад

супольным небам цяпер мусілі б здарацца цуды моўнага звароту да іншых і адначасова цуды выслухоўваньня таго, што іншыя маюць сказаць, калі чалавецтва ня хоча закончыць сваё існаваньне ў самазабойчай няздольнасьці гаварыць. Але дзе магла б адбывацца гэтая сьветатворная і сьветазьберагальная размова? На якіх сходах на Сёмуху павінна сысьці на нас агульная мова? У якіх школах, на якіх сэмінарах вывучаецца мостабудаўнічая мова, якая разьвяжа нас ад невымоўнага Ўласнага і вызваліць да падзяляльнага і публічнага?

Спадарства, гэта рытарычныя пытаньні, бо я ведаю, што істотны моўны працэс і так ужо рушыць наперад іншымі шляхамі, не праз школы і сэмінары. Я ўсьведамляю, што гаварэньню навучаюцца іначай: па-першае, у клімаце дотыку і канфрантацыі, таму што сказы, у якіх пра штосьці ідзецца, прамаўляюцца ў дуэлі і ў сяброўстве; па-другое, пад ударам сытуацыяў, якія па-новаму выклікаюць тое, што трэба сказаць, і па-трэцяе, у пэўным сэнсе аўтадыдактычна, у быцьці сам-насам з клясыкамі, зь вялікімі жывымі і рухавымі, якія зрабілі адкрыцьці сьвету да нас. Мову можна параўнаць з драўняным вугалем, таму што ён гарыць толькі таму, што ўжо аднойчы гарэў, але каб быць чымсьці іншым, чым халодны вугаль, яго трэба распальваць кожны раз наноў.

Карацей, спадарства, я думаю, што мы ня можам абмінуць задачы новага вызначэньня становішча мовы ў паэтыцы сьвету. На пачатку я абяцаў зрабіць сёньня некалькі ўводных заўваг да крытычнай тэорыі сьвету як паэзіі і абяцаньня і прасіў слухачоў часова адкласьці падазрэньне ў падсалоджваньні, што значыць таксама і падазрэньне ў рамантыцы, якое заўсёды зьяўляецца, калі словы неапраўданым чынам становяцца прыгажэйшымі за тое, пра што яны гавораць. На самай справе, падазрона прыгожа гучыць цьверджаньне, што сьвет анталягічна мае структуру аб'ёмнага вершу – прычым трэба ўзяць пад увагу, што, само сабой зразумела, ёсьць і дрэнныя вершы. Да таго ж нельга не пачуць рамантычных і рэлігійных нотак, калі выказваецца сьцьверджаньне, што сьвет дадзены нам дакладна ў такі спосаб, у які дадзеныя абяцаньні – як назоў спадзяваньняў, выкананьне якіх ляжыць у няпэўнай будучыні. Цяпер мы мусім паспрабаваць, пакідаючы па-за ўвагай

падазрона прыгожае гучаньне гэтых фармулёвак, вызначыць літаральны зьмест гаворкі пра сьвет як паэзію і абяцаньне.

Каб прасунуцца наперад у зьдзяйсьненьні гэтага намеру, я хацеў бы зьвязаць прыход да мовы, якога ўсё яшчэ бракуе ў нашых сьветапаэтычных развагах, з фэномэнам родаразьвязаньня, зь якога пачынаецца шэраг сьветатворных жэстаў. Маці, як мы чулі, разьвязваюцца, дзеці прыходзяць на сьвет. Калі прыход на сьвет для нас заўсёды азначае таксама і прыход да мовы, то гэта выражае, што мы як прыбышы на сьвет спачатку безальтэрнатыўна прывязваемся да моўнага сьвету, у якім вага сьвету цісьне на кожнага новага носьбіта мовы. Той, хто выходзіць на сцэну, каб сказаць сваё, у сваёй прамове закранае масу клопатаў канкрэтнага жыцьця. Паміж тым, хто гаворыць, і тым, хто слухае, пастаянна высьвятляюцца і зрушваюцца дачыненьні ў вазе сьвету. Каб гаварыць пра тое істотнае, што я называю мовай, мы, такім чынам, мусім увесьці яшчэ адну сьветаадкрывальную функцыю, якой мы зьвязаныя адно з адным як удзельнікі адной супольнасьці носьбітаў сусьветнай вагі: я назаву яе апрыёры перадачы. Але калі мы без ілюзіяў паглыбляемся ў гэтую функцыю мовы, робіцца бачным апошні сьветаадкрывальны жэст, які прыводзіць нас аж да дыханьня ў гэты момант – назаву яго апрыёры апраўданьня альбо абяцаньня. Той факт, што тут і сёньня можна гаварыць так, як гэта цяпер адбываецца, мы заўдзячваем, з аднаго боку, шостаму элемэнту нашай паэтыкі сьвету, які тлумачыць працэс маўленьня з апрыёры перадачы, з другога боку, сёмай сьветапаэтычнай функцыі, якую я называю апрыёры абяцаньня і ў якой дух разьвязаньня зьмешваецца з подыхам апраўданьня. Калі ўдасца сказаць, што значыць мова як апраўданьне, мы мусім трапіць у сьцінаючы дыханьне абсяг, дзе маланка нараджэньня ўдарае ва ўжо ня цёмным, цяперашнім імгненьні.

Спадарства, тут я дадам заўвагу, што гэтыя сем сьветатворных жэстаў: родаразьвязаньне, апрацоўка пільнасьці, ініцыятыва, адкладаньне, адкрыцьцё сцэны, моўная перадача і апраўданьне – зьмяшчаюць у сабе мінімум комплекснасьці, які неабходны, каб увогуле сфармуляваць празрыстае дачыненьне паміж сьвядомасьцямі і сьветамі. Нават у найцішэйшым шэпце разваг пра людзкое становішча ў цэлым гучаць і гэтыя сем

падставовых тонаў сьвядомага жыцьця.

Мае спадарыні і спадары, дазвольце мне спачатку пракамэнтаваць апрыёры перадачы. Празь яго адразу робіцца зразумелым, чаму большасьць вядомых моўных тэорыяў, як правіла, ахопліваюць толькі павярхоўнасьці. Мова, якая ўвайшла ў нас шляхам беспасярэдняй перадачы, заўсёды ёсьць мовай нашай роднай палітычнай супольнасьці. Нездарма ў нас кажуць, што ў грамадзтва «ўраджаюцца». У сьвятле апрыёры перадачы чалавечая нараджальнасьць мусіць амаль непазьбежна прыводзіць да фіксацыі ў пэўнай нацыянальнасьці. Нацыі волкі-няволкі атрымалі свой назоў таму, што яны ўяўляюць сабой упарадкаваньні дачыненьняў натальнасьці. У гэтым сэнсе ўсе палітычныя злучнасьці, будзь яны палітычнага альбо непалітычнага кшталту, якія грунтуюцца на прынцыпе ўроджанасьці, мусяць уважацца за «нацыі» – такім чынам, таксама і племянныя культуры ўжо ёсьць протанацыянальнымі ўтварэньнямі, і нават сусьветная дзяржава, прыналежнасьць да якой чалавек набывае праз ураджэньне, усё яшчэ будзе *natio*. Ёсьць хвалюючая шчырасьць у тым факце, што ў заходніх мовах набыцьцё грамадзянства нявроднай краіны называюць натуралізацыяй. Нішто не магло б выразіць больш празрыста, што госьць нацыі спачатку павінен набыць нацыянальную натуру, перш чым ён можа быць прызнаны грамадзянінам нацыі. Гэта сьведчыць аб тым, што нацыі, у гэтым падставовым сэнсе, функцыянуюць як сыстэмы для адчужэньня народжаных ад адкрытасьці іхнай нараджальнасьці. Яны ёсьць у пэўным сэнсе моўнымі калгасамі, якія мы ўрабляем і якія прысвойваюць наш даданы прадукт. Нацыя ў моўнапалітычным сэнсе працуе з уроджанасьцю як натуральнапалітычнай функцыяй. Тады натуралізацыі – гэта нішто іншае, як штучныя наталізацыі ў прасторы пэўнай нацыянальнасьці. Гэтая дэталь прымушае нас зьвярнуць увагу на тое, што натуральныя мовы, на якіх гавораць грамадзтвы, ёсьць натуральнымі формамі палітычнай натальнасьці. Аднак так званыя камунікацыйныя супольнасьці, якія карыстаюцца адной супольнай мовай, паранейшаму наскрозь і пераважна характарызуюцца прынцыпам уроджанасьці – натуралізацыя прадугледжаная адно як выняткоўы выпадак. Але ўроджанасьць – гэта толькі найбольш яркая маніфэстацыя татальнай, калі не таталітарнай

аддадзенасьці людзей на волю сілаў перадачы. Калі жыцьцё і мова перадаюцца перадусім у групах уроджаных – цяжка ўявіць, як увогуле магло б быць інакш, – тады ад людзей, якія ўрасьлі ў нацыянальныя мовы, напачатку нельга чакаць нічога іншага, як здольнасьці гаварыць на сваіх нацыянальных мовах ува ўсіх сэнсах – у сэнсе нацыянальных пільнасьцяў, у сэнсе нацыянальнай ініцыятыўнасьці, у сэнсе нацыянальных дывэртысмэнтаў і ў сэнсе нацыянальнай сцэнічнай практыкі. Значыць, нацыянальная мова – гэта ідыёма, у якой упершыню гучаць сьветатворныя жэсты сукупнасьці народжаных разам. Таму, натуральным чынам, першым клопатам кожнай нацыі ёсьць прывязаньне ўроджаных да так званых родных моваў. Таму родаразьвязаньне маці як прывязаньне дзяцей да гравітацыйнага поля нацыянальнай рэчаіснасьці мае наступствам фундамэнтальную арабізацыю, бразыліянізацыю, брытанізацыю, японізацыю, русіфікацыю, суданізацыю і г. д. нованароджаных.

У кожным выпадку дзеці ёсьць дзяржаўнымі палоннымі сваіх нацыяў і моўных супольнасьцяў, таму што яны слушна ўважаюцца за будучыню народаў, а нацыянальныя мовы – гэта вядзьмарскія кухні, у якіх з адносна індыфэрэнтных у моўным пляне прыбышоў на сьвет выраблюцца будучыя стаўпы грамадзтва. Зь лінгвістычнага гледзішча, апрыёры родаразьвязаньня прыводзіць да татуяваньня кожнага новага жыцьця ўзорамі нацыянальнай мовы, яно робіць зь людзей наркаманаў, залежных ад сваіх родных моваў, і ў дагэтулешняй гісторыі чалавецтва толькі нямногім удавалася зьлезьці з айчыннага наркотыку матчынай мовы. Празь лінгвістычнае татуяваньне новых пакаленьняў адбываецца працэс перадачы, які зьвязвае ўзроставыя групы грамадзтва ў нацыянальна гістарычны кантынуўм. Спадарства, я б не гаварыў тут па-нямецку для нямецкіх вушэй, калі б гэты магутны сьветатворны працэс ня меў бы сілы і для нас. Не прайшло яшчэ і пяцідзесяці гадоў ад часу, калі ў пэўных цалкам уяўляльных абставінах магла б адбыцца генэральная рэнатуралізацыя немцаў на карысьць усходняга альбо заходняга грамадзянства. Тады, магчыма, мы б не гаварылі на амэрыканскай мове як на другой, а гаварылі б на расейскай як на роднай. Але праз вызначальныя абставіны энэргія перадачы нямецкай мовы

засталася дзейнай. Спадарства, я б таксама не гаварыў так, як я гэта раблю, калі б Гайнэ і Гётэ, Ніцшэ і Брэхт не стварылі прыдатных для перадачы нямецкіх тэкстаў, якія натхнілі мяне, і наша сустрэча, спадарства, магла б проста не адбыцца, калі б нямецкая нацыянальная мова, нягледзячы на найвялікшую грамадзкую катастрофу ў гісторыі, не засталася здольнай да перадачы. Для гэтага, без сумневу, спатрэбілася шмат выпадкаў і велічыняў, якія нямецкую мову падтрымалі, і ў гэты момант мы балянсуем на вяршыні выпадку. Што да мяне, то я прамаўляю зь вельмі аддаленага кутка гэтага выпадкова перададзенага нам моўнага сьвету. Вывучэньне нямецкай мовы, якое давялося прайсьці бальшыні нашых суграмадзянаў, завяло іх у зусім іншыя рэгіёны нацыянальнага моўнага жыцьця. Апрыёры перадачы падзейнічала на іх так, што ім даводзіцца гаварыць на гаспадарчай нямецкай мове пільнасьцяў. Яны агучваюць ініцыятыўную нямецкую мову вольных прадпрымальнікаў, якія клапоцяцца пра вядучае месца нацыі ў плянэтарнай мабілізацыйнай гонцы, яны гавораць на амбітнай нямецкай стваральнікаў будучыні і спаборнікаў ганаровых ступеняў, на нямецкай мове захаваньня маёмасьці групаў інтарэсаў, на праектна-групавой нямецкай мове тых, хто глядзіць наперад, на тэрапэўтычнай і калюмнісцкай нямецкай мове добразычлівых і на бонскай нямецкай мёртвых душаў, якія турбуюцца пра нацыянальную цэласьць. Плынь нацыянальнай перадачы клопатаў, бядотаў і гвалту гоніць наперад нямецкую мову навінаў і нямецкую духу часу, чыноўніцкую нямецкую і мэдыйную нямецкую, пэдантычную аб'ектыўнасьць і цынічную пену. Спадарства, перад гэтым я пару імгненьняў гуляў з думкай сказаць замест перадачы праліфэрацыя; гэта мела б наступствам тое, што я мусіў бы гаварыць пра апрыёры праліфэрацыі што падштурхнула мяне адмовіцца ад гэтага слова. Але гэта дало б тую перавагу, што можна было б згадаць дамову аб нераспаўсюджваньні[6] ядзернай зброі, якая вядомая немцам таксама і як *Non-Proliferation-Treatise*. Адсюль было б лёгка перайсьці да пытаньня, як выглядае справа зь неперадачай паталягічных жыцьцёвых дачыненьняў паміж гаворачымі істотамі. Бо таму, што спачатку людзі асуджаныя пачынаць у татальнай залежнасьці ад умоваў перадачы, якія сфармаваліся ў жыцьці да іх, да перадавальнікаў мовы можна выставіць патрабаваньне

разважыць палітыку непраліфэрацыі і ў стасунку да іхнага зьвязанага з мовай гвалту ды іхнай бядоты, што стала словам. Але ўсе нацыянальныя мовы ў любым часе ёсьць ідыёмамі, у якіх перадача бядоты і гвалту адбываецца бескантрольна і свабодна – і тым больш свабодна, чым больш гэтыя факты могуць быць схаваныя маралямі і тэорыямі.

Чым ёсьць перадача гвалту праз мову і да чаго яна вядзе, стане цалкам відавочным, калі мы разгледзім палітычнае ідэю Nichtweitergabe перадачы мовы. Нацыянальныя мовы паводле іхнага літаральна фактычнага ўзьдзеяньня ёсьць таксама сродкамі сусьветнай «несупрацы». вайны. На нацыянальных мовах перадаецца міжнацыянальная нянавісьць, на так званых матчыных мовах абмяркоўваюцца братазабойствы; у сфэры ўплыву нацыяналізаваных рэлігіяў прапаведавалася сьвяшчэнная вайна супраць іншамоўных. У гэтых фактах выяўляецца аблічча рэальна існых камунікацыйных супольнасьцяў, якія па сёньня апаноўваюць гісторыю. На нацыянальных мовах крычалі найжахлівейшыя лёзунгі разбурэньня, якія бывалі на людзкіх вуснах, а наймагутнейшымі з гледзішча перадачы былі тыя камунікацыйныя супольнасьці, якія пераказвалі сваю моўную рэальнасьць па-над трупамі пераможаных і галовамі асымільваных. І што якраз немцы мусяць ведаць: на нацыянальных мовах людзі зьбіваліся ў агрэсіўныя супольнасьці на грунце панікі і ў якасьці камунікацыйных расістаў і заалінгвістаў спрабавалі ўстанавіць сусьветнае панаваньне адной мовы. Такім чынам, моўная прывязанасьць вялікай часткі людзкой камунікацыі ёсьць умовай прывязаньня людзей да прыходу ў сьвет у моўных супольнасьцях, якія пераказваюць нянавісьць да тых, хто гаворыць інакш. Таму толькі вызваленьне ***з*** моўнай супольнасьці, якой яна ёсьць, можа прывесьці да перадачы менш фатальных узораў жыцьця. Толькі пры гэтай перадумове гаворачая нацыянальнасьць была б разьвязаная ад свайго патэнцыялу гвалту – але дзе гэта адбываецца? Хіба сваім маўленьнем гаворачыя істоты ня *ўцягваюць* адна адну ва ўсё новыя супольнасьці страху і нянавісьці супраць старых і новых ворагаў? Цяга да інтэрнацыяналізацыі духу, якая характарызуе новы час, можа разьвязацца з путаў нянавісьці паміж рэальнымі камунікацыйнымі злучнасьцямі, калі інтэрнацыянальнасьць

прывядзе да інтэрнатальнасьці, гэта значыць да супольнага веданьня пра прыход у сьвет іншых у іх уласных умовах. Толькі тады шматмоўнасьць будзе сродкам разьвязаньня ад нацыянальна-моўнага гвалту.

Спадарства, мова, калі яе разглядаць у аспэкце перадачы, дасканала дапасоўваецца да двух папярэдніх цотных жэстаў вытворчасьці сьвету. Як і клопат пра пільнае і разгрузка цяпершчыны праз адкладаньне занадта цяжкіх задачаў, жэсты перадачы, што адбываюцца як мова, належаць да першасных кансэрватыўных актаў, шляхам якіх ад пачатку культураў будуецца сусьветная пячора. Калі мовы перадаюцца іх новым носьбітам, то заўсёды перадаецца і сымбалічны матэрыял, які ўмагчымляе нашчадкам уваход у пячору сьвету сваіх папярэднікаў. З матэрыялу нацыянальных моваў – да якіх паводле сэнсу племянныя мовы належаць так сама, як і так званыя сусьветныя мовы – зробленыя ідэі фікс, пры дапамозе якіх сьвядомасьці прысвойваюць сабе самапачуцьці і ідэнтычнасьці. З матчыных моваў і бацькоўскіх аўтарытэтаў вырастаюць калектыўныя самаформы, у якіх суб'екты жывуць як у нацыянальных опіюмных пячорах. Якія б рысы нацыянальнае ідэнтычнасьці ці пазытыўнасьці ні перадаваліся, гэта заўсёды пазытывы, пазначаныя пячаткай мовы, якая зьвязвае, фіксуе, ідэнтыфікуе. Так, як прозьвішчы прывязваюць мяне да пячорнай сыстэмы сваяцтва, так нацыянальная мова, племянная дыялектыка, субкультурнае арго і прафэсійны жаргон улучаюць мяне ў пячорную сыстэму, у якую я ўроджаны і інтэграваны выхаваньнем.

Спадарства, здаецца, што я гавару тут пра штосьці, пра што з антрапалягічнага гледзішча проста немагчыма падумаць іначай. Як жа людзям прыходзіць на сьвет і дзе яшчэ, калі не ўнутры вялікіх вершаў, сымбалічных жылых пячораў і шэдэўраў знакавага сьвету, якія мы называем мовамі? Здаецца, усё прымушае нас ад дыскусіі пра апрыёры перадачы наўпрост перайсьці да пазытыўнай тэорыі моўнай традыцыі ў тым выглядзе, напрыклад, як яе перад намі акрэсьліў Ганс-Геарг Гадамэр. З пазытыўнай тэорыі мовы як традыцыі далей вынікала б, падабаецца нам гэта ці не, гэтаксама пазытыўная тэорыя нацыянальнасьці, у якой лёс уроджанасьці ў пэўны

народ альбо пэўную нацыянальную культуру фіксуецца як антрапалягічная ўнівэрсалія. Тады перададзеныя мовы ў тым выглядзе, як яны ёсьць, былі б неабмінальнымі ўмовамі любога прыбыцьця на сьвет. Яны былі б літаральнымі анталягічнымі агульнымі творамі мастацтва, у якіх людзі мелі б жыць як у сацыяльным будынку, які адначасова служыць нацыянальным лягерам для інтэрнаваных. Гэта цёмны бок слова «сусьветная літаратура». Здаецца, штосьці падобнае аднойчы адчуў Ралян Барт, калі ў парыве незадаволенасьці абазваў мову ўвогуле фашысцкай, менавіта ён, хто напісаў найпрыгажэйшыя эсэ свайго пакаленьня. Сілай апрыёры перадачы мы ўсе нібыта завараныя ў нашу рэальную моўную супольнасьць, як абароненае ад падробак пасьведчаньне асобы, пра якое ўжо была размова напачатку. Зусім без мэтафараў нашыя матчыны мовы тады былі б вялікімі вершамі, якія мы прымушаныя дэклямаваць штодня – глябальныя артэфакты і слоўныя творы мастацтва зь невычарпальнай магчымасьцю інтэрпрэтацыі, але мы былі б асуджаныя да жыцьця ў літаральным агульным творы мастацтва, каб адначасова быць і яго ахоўнікамі, і ягонымі вязьнямі. Як носьбіт нацыянальнай мовы кожны чалавек вырачаны на таталітарны фальклёр.

Спадарства, не выпадае сумнявацца, што гістарычная, паўсядзённая, палітычная рэчаіснасьць моваў у вялікай частцы адпавядае таму, што было сказана пра прыход на сьвет у нацыянальных мовах. І ўсё-такі гэта ахоплівае толькі палову сутнасьці фэномэну. Каб ахарактарызаваць другую палову, цяпер я зьвяртаюся да апошняй з функцыяў, якія падлягаюць абмеркаваньню ў нашай паэтыцы сьвету – да апрыёры апраўданьня альбо абяцаньня.

Каб распачаць тлумачэньне, я вярнуся да пытаньня, якое я ўскосна задаў сам сабе на пачатку. Мае спадарыні і спадары, сьвет як паэзія і абяцаньне, вы згадваеце, – здавалася, што гэта спаўзае ў занадта пазытыўнае, і паўстала пытаньне: мой сябра, а як ты ставішся да пазытыўнасьці? Цяпер адказ на гэта відавочны: ня я стаўлюся да пазытыўнасьці, а пазытыўнасьць з самага майго нараджэньня ставіцца да мяне. І нават калі я часам разам з Чоранам мару пра ўнівэрсум, у якім яшчэ нішто не апусьцілася да таго, каб быць, пра маё абуджэньне з гэтага

сну паклапаціліся ад самага пачатку. Беззаганная віртуальнасьць лунаньня ў нязьдзейсьненым ужо страчаная, выпадак сьвету ўжо здарыўся, і зь бяздоннага дна пазытыўнасьць, якая была да мяне, дазволіла сабе капрыз даць мне стартавы сыгнал. Я прасоўваюся наперад разам зь ёю, як каменьчык на сьпіне глетчара. Зрэшты, я думаю, што малады Гайдэгер, калі яму адкрыўся панятак «фактычнасьць» (*Faktizität*), ведаў гэтае пачуцьцё каменьчыка, гэтую прасякнутую сусьветным страхам, дрыготкую відавочнасьць быць каменем, які непрыкметна і няспынна выштурхоўваецца наперад з улоньня часу, рухаючыся разам з глетчарам гісторыі. Таму: «Сьвет існуе»/(*«Es weltet»*). Праз простую рэчаіснасьць свайго быцьця кожнае жыцьцё мае ў заплеччы цэлы ланцуг сілаў перадачы і ўлучанае ў пазытыўнасьць традыцыяў і праліфэрацыяў. Толькі пасьля таго, як гэты падставовы вобраз нашай сытуацыі «ў сьвеце» прасякнуў нас, можна ўсур'ёз паставіць пытаньне, што такое крытыка і што прыводзіць дух адмоўнасьці да схватак.

Іншыя шляхі дасягнуць так званай крытычнай сьвядомасьці самі па сабе ўжо пазытыўныя. Той, хто ўступае на іх, як правіла, думае, што крытыка – як сьцізорык, які заўсёды трэба мець з сабой, альбо як вартавы сабака, які падхопліваецца, калі нехта занадта набліжаецца да маёй годнасьці альбо да майго надзелу. Гэтыя пазытыўныя крытыкі між тым сталі агульнапрынятымі, яны належаць да сучаснай дзеяздольнасьці, іх проста трэба мець, як увесь час патрэбныя падатковыя трукі, пачуцьцё годнасьці і структура сказаў, яны крытычна вядуць нас паўз год. Але гаворачы тут пра крытыку і выклікаючы дух нэгатыўнасьці, я маю на ўвазе нешта іншае. Я думаю пра іншае ў пазытыўным, пра тое, што не зьвязана сіламі перадачы. Але дзе можна было б знайсьці гэтае непазытыўнае, калі мы з усіх бакоў абложаныя пазытыўнымі ўмовамі быцьця? Паўсюдна выстраіліся словы, яны бяруць нас у «кацёл» фіксаванымі значэньнямі, яны высока трымаюць шчыты і нікога не выпускаюць з кола. Хіба мы не ваеннапалонныя рэальнасьці, моўнай і матэрыяльнай? Папярэдне зьняволеныя, супраць якіх вядзецца пажыцьцёвае сьледзтва ў крымінальнай справе існаваньня? І хіба нас нядаўна не паінфармавалі, што да далейшых распараджэньняў мы павінны тырчаць у

постмадэрнавых дэканцэнтрацыйных лягерах, як асуджаныя да пакараньня забавай? Дзе можна было б у такіх умовах знайсьці іншае – альбо хаця б сьлед іншага, які вядзе на волю?

Спадарства, сьлед, які вядзе на волю, праходзіць проста цераз саму мову. У той момант, калі мы гаворым, як гэта адбываецца, у гульню ўступае яшчэ адна неабмінальная ўмова для нашай вытворчасьці сьвету. Гэтую ўмову я назваў апрыёры абяцаньня альбо апраўданьня. Зь ім наша паэталягічная семідзённая праца дасягае сваёй мэты, гэта значыць, дыханьня ў гэтае вокамгненьне. Спадарства, сутнасьць мовы – гэта ж ня толькі перадача нацыянальных прывязак і забабонаў, якія абазначаюць сьвет. Да мовы, у якой артыкулююцца воклічы тых, хто прыйшоў на сьвет, належыць таксама дыханьне апраўданьня. Яно разьвязвае нас ад натуральнай нацыянальнасьці і ад прыступнасьці да набытага гвалту. Яно вяртае першыя моманты быцьця-ў-сьвеце, у якіх спазнаньне паветра папярэднічае кожнаму вонкаваму кантакту з мацярынскім элемэнтам. Дыханьне як першая інстанцыя натальнасьці з самага пачатку выходзіць з прыродай па-за межы прыроды. Задоўга да таго, як нам можа быць прылучаная мова, ужо адкрыўся сьвет дыханьня – на жаль, псыхааналітыкі ўсё яшчэ блытаюць яго з царствам аральнасьці. Але той, хто вучыцца гаварыць паэтычна, з самага пачатку прыўносіць свабоду дыханьня і ў мову, якую мы вывучаем па меры нашага праходжаньня ў гістарычнае маўленьне перадачаў гвалту. Таму апрыёры апраўданьня заключаецца ў тым спосабе прамаўляць ісьціну, які паводле паходжаньня роднасны праву на паветра і далячынь. Мова, якая пераказвае нам права на дыханьне, фармуе плынь абяцаньня, якая, здаецца, ахоплівае тысячагодзьдзі і часта падземнымі шляхамі зьвязвае найстарэйшыя вядомыя вопыты свабоды чалавека з найноўшымі парывамі прагі свабоды. У той час як пазытыўная перадача мовы звужае кацёл сьвету, праз функцыю абяцаньня зьдзяйсьняецца супрацьскіраваны рух. Дзякуючы яму зьдзяйсьняецца неверагоднае, парадаксальнае – традыцыя таго неперадавальнага праз традыцыю, што абяцае свабоду дыханьня. Праз гэтыя абяцаньні пераказваюцца апраўданьні, безь якіх мы засталіся б увязьненыя ў катле фактаў. І калі сама мова мусіць перадавацца, хай нават пазытыўна, хай як

нацыянальная мова, хай поўная здушальных сілаў папярэдняй гісторыі, дык гэта таму, што дагэтуль толькі ў гэтых пазытыўных мовах маглі пераказвацца абяцаньні, якія разьвязваюць ад гвалту пазытыўнай гісторыі. Сакрат гаварыў па-грэцку, каб вызваліць грэкаў ад душных абавязкаў грэцкасьці, і на грэцкай мове ён знайшоў шлях у няведаньне, якое перасягае зьвязаныя з мовай сілы. Пісьма ён цураўся, бо абяцаньні, якія ён меў даць, вымагалі вуснага пераказу, асабістай прысутнасьці. Ягоная рашуча адрынутая Плятонам нэгатыўнасьць не хацела пакідаць ува ўстойлівым стане ні адну з устойлівых тэзаў, ягоная дыялектыка была дастаткова вострай, каб прыводзіць да абяззбройвальнай дэканструкцыі пазыцыяў. Ён якраз ня быў тым, што Плятон хацеў яму прыпісаць: незгаворлівым акушэрам выключных правільных ідэяў, і калі мы наагул маем магчымасьць адрозьніць гістарычнага Сакрата ад гістэрычных праекцыяў Плятона (які да сьмерці паважаў свайго майстра, каб атрымаць свабоду дзеяньняў у сваёй уласнай майстэрскай справе), то мы мусім шукаць ягонае вучэньне ў такім жа велікадушным, як і дарэмным стараньні адкрыць абсалютнае нараджальнае абяцаньне жыцьця. З таго часу маеўтычная ўтопія чакае цьвярозага фармуляваньня. Бо калі б крыніцу высокакультурных абяцаньняў свабоды і разьвязаньня можна было назваць, то яна была б у абсягу дыхаючага зародкавага маўчаньня, якое сваёй уважлівасьцю дэпазытывуе, дэбруталізуе і абяззбройвае сьвет. Сакратаўскі імпульс выявіўся ў грэцкай мове, але ўва ўказаньні на быцьцёвы спосаб няведаньня на сьвет ужо было народжанае больш-чым-грэцкае. Ад яго магло выпраменьвацца запрашэньне да разьвязаньня ад нацыянальнага гвалту. Дыяген з Сынопу, які ўспадкаваў палову сакратаўскага пабуджэньня, знайшоў прытулак у пантамімічным касмапалітызьме, каб працягнуць акушэрскую працу свайго настаўніка; на гэтым шляху ён стаў першым плябейскім дысыдэнтам. Плятон жа, які паспрабаваў ахапіць другую палову сакратаўскай ісьціны, зьдзейсьніў важкі крок да вучэньня аб унівэрсаліях. Вылучыўшы рэальнасьць ідэяў і ідэалаў, ён заснаваў лягічны касмапалітызм, які павінен быў разьвязаць думаньнікаў для сузіраньня ўсеагульнага, коштам цёмнай пазытыўнасьці, якая ўгрызаецца ў непасрэднае і натуральнае.

У абедзьвюх гэтых стратэгіях разьвязаньня па сёньня захаваўся сьлед духу эўрапейскай утопіі, нават па-над распачатай Эўропай сусьветнай вайной і насуперак усім спэцыфічна эўрапейскім зьверствам. Нешта з найлепшай старажытнаэўрапейскай спадчыны ўступае ў гульню, калі Юрген Габэрмас яшчэ сёньня абараняе ўнівэрсалізм разумнай размовы, але клясычна эўрапейская палітыка ісьціны была ў справе таксама й тады, калі памёрлы французкі клоўн Калюш, абсалютна голы і з трыкалёрам са стравусавых пёраў у задніцы, выстаўляў сваю кандыдатуру на пасаду французскага прэзыдэнта. Тым ня менш, трэба заўважыць, што ад абедзьвюх гэтых незамяняльных практыкаў разьвязаньня патыхае мэлянхоліяй, бо бязь цяжкасьці заўважна, што мэханізмы пазытыўнай перадачы гвалту маюць, здаецца, ненаганяльную перавагу ў параўнаньні з такімі абяцаньнямі разьвязаньня. Але не нашмат лепш выглядае лёс рэлігійных абяцаньняў нашай традыцыі. Як вядома, сучасны сьвет застаецца незразумелым, пакуль не бярэцца пад увагу пранікненьне ў эўрапейскую прастору пэрсідзкіх і габрэйскіх матываў. Але калі цяпершчыну з поўным правам назвалі часам паміраньня ўтопіяў, то прычыны гэтага ў ліку іншага можна праілюстраваць цяперашнімі іранскімі і ізраільскімі трагедыямі – Пэрсія, радзіма дуалізму і дэцызіянізму, спарадыявала сваю гістарыятворную ўтопію рашэньня на карысьць сьвятла, кінуўшыся ў пастку параноі; і сёньняшняя ісламская Пэрсія абяцала сьвятло, але, тым ня менш, ня здолела зьдзейсьніць нічога лепшага, як загнаць сваіх сыноў у абсурдную сьмерць на найцямнейшым заходнім фронце. Краіна, якая экспартавала мэтафізыку сьвятла сусьветна-гістарычнага маштабу аж да Эўропы часоў Асьветніцтва, сёньня дае нам адзін з наймагутнейшых доказаў адмираньня ўтопіі. Не выпадае шмат казаць пра тое, што стала з габрэйскай утопіяй; дастаткова пабачыць узброеных да зубоў ізраільскіх салдатаў, якія на сьвята Пэйсах 1988 году патрулююць Ерусалім і ўвесь так званы сьвяты край. Успамінаецца, што мэсіянскае абяцаньне абвяшчала абсалютную будучыннасьць разьвязаньня і што згадка (*Evokation*) гэтага абяцаньня павінна была дзейнічаць у сэнсе ўсё больш актуальнага прыгатаваньня. Нацыянальна-ізраільскаму рэалізму спатрэбілася толькі адно, два пакаленьні, каб даведацца, як мэханізмы прывязаньня да мовы

і зямлі функцыянуюць у якасьці прымусу да перадачы гвалту. Так запрашэньне да разьвязаньня гвалтоўна-сучаснага ад самога сябе праз простую адкрытасьць у будучыню зазнала жахлівае абвяржэньне на ўласным полі. Шматабяцальны бог разьвязаньня, які прамаўляў з палымнеючага цярноўніка, зноў ператварыўся ў тэрытарыяльнага Ваала, які выдае пашпарты і фармуе армейскія корпусы.

Відавочна існуе ўнутраная ўзаемасувязь паміж сучасным памяранем утопіяў і рэальнапалітычнымі мэтамарфозамі калісьці страсна нерэалістычных абяцаньняў. Выглядае, што сёньня рвецца *catena aurea*, той ланцужок, які на працягу тысячагодзьдзяў пераказваў веду пра вызваленьне, насуперак гвалту рэалістычнага прывязаньня да нацыяў. Актуальная склератызацыя крытычнага духу, здаецца, пацьвярджае наяўнасьць гэтага разрыву. Але, спадарства, я пэўны, што гэта толькі падманлівая бачнасьць. Яна колькі заўгодна можа навязвацца нам з пэўнай настойлівасьцю, але схіліць нас да скасаваньня абяцаньняў яна ня можа. Цяпер трэба зразумець нешта іншае: дух апраўданьня ніколі яшчэ не ўдавалася інстытуцыяналізаваць, не зрабіўшы яго карумпаваным. Тое, што адбываецца ў сёньняшнім застоі ўтопіяў, ёсьць адно непазьбежным наступствам спробаў пазытывацыі моваў разьвязаньня ў выглядзе мэтанацыянальных моваў. Тое, што такія спробы асуджаныя на правал, проста немагчыма ўявіць сабе дастаткова выразна. Традыцыя шматабяцальных апраўданьняў утрымлівае ў сабе парадаксальную структуру перадачы пазытыўна неперадавальнага. У той час як пазытыўныя традыцыі зьвязваюць пакаленьні адно з адным жалезнымі ланцугамі, а гісторыю трымаюць у руху як праліфэрацыю нябачных парушэньняў, *catena aurea* ёсьць паветраным ланцужком з адкрытымі зьвёнамі, яна ўтварае нэгатыўную традыцыю, повязь разьвязаньня, ланцуг вызваленьня ад ланцуга. Той, хто ўваходзіць у яго, ня можа прывязацца да яго ўва ўласным сэнсе слова. Бо калі ён сам сябе прывяжа да традыцыі гэтага ланцуга, то ня будзе разьвязаным, а калі ланцуг сапраўды разьвязаў яго, то ён ня можа быць да яго пазытыўна прывязаным. Ягоная перадавальная ісьціна грунтуецца на той парадаксальнай акалічнасьці, што ён не прывязаў да сябе наступных. Ланцуг абяцаньня перадае сябе

празь перадачу не-прывязанасьці – але спробу разрыву ён зазнае тады, калі яму даводзіцца, пераадольваючы сябе, хацець не-перадачы традыцыяў не-прывязаньня. Пакуль ён застаецца ланцугом, трэба стрэсьці і залаты ланцуг сьвету як апраўданьня. Гэта прычына таго, чаму найпрыгажэйшыя прамовы павінныя праходзіць праз найцынічнейшае ачышчэньне: тое, што мы можам абяцаць, мы вучым толькі ў школе роспачы.

Актуальнае банкруцтва ўтопіяў трэба пракамэнтаваць таксама ў сьвятле гэтых дачыненьняў. Пазытываваныя ўтопіі скампрамэтавалі сябе і ўтварылі фатальныя адваротныя бакі. Калі Ніцшэ, першы вучань клясы з Шульпфорты, атакаваў Сакрата, ён ужо бачыў наступствы пазытываванага сакратызму. На самай справе, Сакрат пакінуў праблему: як магчымае сьвядомае няведаньне без задаваньня сваёй дабрачыннасьцю, альбо як магчымая *Paideia* без гуманістычнага школьнага тэрору. Плятон, са свайго боку, пакінуў у спадчыну акадэмікам да сёньня актуальнае пытаньне: як магчымыя ідэалізм без экзальтаванасьці і ўнівэрсалізм без таталітарных пажадаў? Да змрочнай спадчыны Дыягена належыць, як слушна заўважылі, пытаньне, як можна жыць кінізмам без занядбанасьці – не выпадкова сучасным словам «цынізм» азначаюць жарт, які паходзіць з разьняволенасьці. Па вялікім разьвязальніку душаў Гаўтаму Буду засталася праблема, як зладзіць мэдытатыўнае жыцьцё без дэпрэсіўнасьці, якая змушае бегчы ад сьвету, і без самазабойчых ачмурэньняў. А што да вызвольных вучэньняў монатэізму і мэтафізыкі сьвятла, то яны адкінулі паранаідальны цень, які сёньня ляжыць на Зямлі, як ніколі цёмны. Абяцаньне марксізму вызваліць нас з улоньня перадгісторыі хірургічна, шляхам рэвалюцыйнага кесарава сячэньня, таксама дало штуршок найжахлівейшай перадачы гвалту. І калі вяліканямецкі правадыр сэкты Адольф Гітлер хацеў разьвязаць мёртвых Першай сусьветнай вайны разам з жывымі крызісу 1918–1933 у свой гіпэрпазытыўны тысячагадовы райх, ён разьвязаў падзеі з таго самага матэрыялу, зь якога зроблены пэрынатальныя пякельныя кашмары. У Нямеччыне 1933 году альбо ў Пэрсіі 1988, у гулагаўскай Расеі альбо ў жэнэўскай Боскай дзяржаве: тое, што заўсёды дае сілам перадачы перамогу над духам апраўданьня,

– гэта пазытывацыя абяцаньняў і нацыяналізацыя ўнівэрсаліяў. Менавіта гэта ёсьць прынцыпам магічных нацыяў, якія адкрыў і якім даў імя Освальд Шпэнглер – і якія можна было б назваць нацыямі хрышчэньня альбо рэлігійнымі нацыямі.

Карацей, з пазытыўнага падхапленьня ўласнасьці вызвольных моваў, якімі немагчыма валодаць, ува ўсіх высокаразьвітых культурах нарадзілася зашмат ліха. Зусім магчыма, што пазытываваныя ідэі збаўленьня і абяцаньні вызваленьня выклікалі ў сьвеце больш пакутаў, чым іх было перад зьяўленьнем гэтых ідэяў. Значыць, глыбокі антыўтапізм сёньняшніх пакаленьняў ёсьць прыкметай гістарычнага інтэлекту. Ёсьць добрыя падставы сказаць «даволі» вучэньням царкоўных архітэктараў. Пэўныя формы разьвязальнага ашуканства цяпер ужо ня маюць масавага прытоку публікі – хіба што на грунце ўраджэньня, пры дапамозе якога таксама і хрысьціянскія цэрквы, як і ўсе рэлігійныя нацыі, стварылі сабе «змушальную» базу папаўненьня. Але якраз эклезіяльная ідэалёгія, якая накідвае нам прыналежнасьць да пэўнай замкнёнай інстытуцыі разьвязаньня, стала для больш прасунутых розумаў невыноснай. Таму цяпер трэба сказаць, што ўтапічныя запаветы мінуўшчыны разарваныя і спаленыя. Калі і сёньня абяцаньне сьвету яшчэ павінна пераказвацца, то не таму, што за сьпінай стаіць ланцуг настаўнікаў і апосталаў. Той, хто нешта абяцае цяпер, абяцае сам. Хто сёньня, на сыходзе эпохі гістарыятворных утопіяў, хоча ўзнавіць абяцаньне сьвету, той павінен арыентавацца ў бяздонным, як нованароджаны. Скрозь пазытыўныя мовы сьвету трэба зноў адкрыць дыханьне, якое належыць нашай натальнасьці, нашай нараджальнасьці перад усякай нацыянальнасьцю.

Спадарства, гэтае дыханьне ёсьць элемэнтам літаратуры і паэзіі. Няма ніводнага значнага тэксту традыцыі, які ня быў бы тэкстам дыханьня, запісам дыханьня. Радкі – гэта ўдыхі пісьменьнікаў, строфы – гэта пераклады дыханьня паэтаў. Пісьмовае дыханьне для людзей пісьменьніцкага рамяства ёсьць іх апошнім утапічным крытэрам. Ад яго павеву ці ягонай адсутнасьці залежыць, ці нашыя тэксты вядуць на волю, ці стануць шпалерамі, якімі неразьвязаныя абклеяць сьцены сваіх пячораў. Дыханьне дае нам абяцаньне, пра якое ня трэба

баяцца, што яно будзе парушанае фальшывым стрыманьнем. Абяцаньне дыханьня не напаткае лёс пазытываваных зарокаў – застыць у хлусьню пра вызваленьне. Бо як бы доўга чалавек ні затрымліваў дыханьне, неўзабаве ён зноў выдыхае тое, што ўдыхнуў. Так свабодны дух мусіў бы дыханьнем прайсьці скрозь усе пазытыўныя сыстэмы. Там, дзе зьяўляецца свабода дыханьня, узьнікае тыповая легкадумнасьць. Свабоднае дыханьне з удыхам займае пазыцыі, якія яно зноў пакідае з выдыхам. Таму літаратура дыханьня ня толькі натхнёная, – яна заўсёды ёсьць літаратурай выдыху, паэзіяй здольнасьці да разьвітаньня. І праклёны могуць быць сусьветнай літаратурай, і адрачэньні – абяцаньнем сьвету. Выдых аддае ўсё, што ён перад гэтым узяў. Таму сьвет як абяцаньне ня мусіць штучна ўмацоўвацца і гвалтоўна ўтрымлівацца, бо шматабяцальнае дыханьне ня стрымлівае таго, што яно абяцае, і ня можа больш абяцаць таго, што яно стрымлівае. Літаратура, якая мае паветра, адушаўлёная адвечнай легкадумнасьцю. Бадай, Гайнрых Гайнэ сказаў найбольш трапныя словы пра гарэзьлівасьць паэтаў. Ён ведаў, што абяцаньні, якія даюць паэты, сапраўдныя толькі як сьведчаньні ўтопіі легкадумнасьці. Ён ня меў рацыі толькі ў тым, што думаў, што зь ягоных уздыхаў перадусім паўстануць хоры салаўёў. Там, дзе дыхалі паэты, паўстаюць прасторы дыханьня для народаў, а дзякуючы перакладам – і для іншых, ня толькі для іх уласных. У дыханьні як пачатку надзеі, якая ня ёсьць прынцыпам, абяцаньне сьвету аднаўляецца гэтак сама незаўважна, як адчувальна.

Калі ж пісьменьніка запыталі б, якія думкі выклікаюць у яго найглыбейшы подзіў, то ён толькі мог бы, перафразуючы Іммануэля Канта, адказаць: зорнае неба па-нада мною і легкадумнасьць абяцаць нам сьвет ува мне.

Мае спадарыні і спадары, вершы і іншыя свабодныя словы ёсьць караблікамі дыханьня, якія выстаўляюць сябе ў адкрытае. Таму свабодныя словы важнейшыя за вялікія. Але бывае, што свабодныя словы выяўляюцца вялікімі. Верш Паўля Цэляна гаворыць пра зьяўленьне безумоўна ўласнага слова:

ВЫТРУЧАНАЕ

ветрам промняў тваёй мовы
стракатае рознагалосьсе на-
пера-жытага – сто-
языкі Мой-
верш, няверш.

Вы-
віхураны,
вольны
шлях празь людзкіх
абрысаў узоры, мяцелі,
пакаяцца вось захацелі і рушылі да
гасьцінных
пакояў у ледавіках і сталоў.

Глыбока
ў расьселіне часу
ў прыпайным ільдзе спракаветным
чакае, дыханьня крышталь,
тваё неадпрэчнае «сьведчу».

З нямецкай мовы пераклаў Яўген Бяласін
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (36) - 2005**

[image]

[image]

[image]

рэцэнзіі
25[image]-[image]2005
"да Зьместу"
паэмыка • эналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура •
рэцэнзіі

[image] [image] [image]

КАСТУСЬ ЛАШКЕВІЧ
нар. у 1983 г. у Менску. Выпускнік журфаку ВДУ.

Кастусь Лашкевіч Мікробы гісторыі

Пятро Васючэнка. *Адлюстраванні Першатвора. Літаратура ў філалагемах і пятрогліфах*. – Менск: Логвінаў, 2004.

Ці сустракалі вы Пятра Васючэнку, гэтага невысокага інтэлігентнага чалавека зь нясьпешнай паходкай, таўставатымі акулярамі і па-дзіцячаму дапытлівым позіркам? Калі так, дык, пэўна, вас не абмінула думка: вось ён, легендарны беларус – па-шляхецку талерантны, па-сялянску памяркоўны. Гэта толькі частка праўды, так бы мовіць, авэрс мэдаля. Рэвэрс – апалягетыка беларушчыны і бязьлітасная барацьба з «тутэйшым» сьветаўспрыманьнем, якое так трапна сфармуляваў Купала: «А беларусы ж нічога ня маюць».

Аўтар п’есы пра паноў Кубліцкага ды Заблоцкага (у суаўтарстве з с. Кавалёвым), за празаічную перапрацоўку якой роўна праз 10 гадоў ён атрымае свайго «Глінянага Вялеса», уварваўся ў беларускую літаратуру з дыплёмам журфаку і асьпірантурай Інстытуту літаратуры імя Я. Купалы за плячыма, каб урэшце стаць непадобным ні на каго крытыкам і адным з носьбітаў «полацкага мэнталітэту» ў прозе.

Новая кніжка Васючэнкі «Адлюстраваньні Першатвору» ёсьць унікальным зьявішчам для айчыннае літаратуры. Хаця б таму,

што на 140 старонках крытычнага тэксту згадваюцца прозьвішчы 166 усясьветных аўтараў (ад Сафокла да Юрася Барысевіча), назовы 120 твораў (Ад «Бібліі» да «Толькі не гавары маёй маме...»), імёны 142 літаратурных і гістарычных герояў (ад Мэдэі і Ўсяслава Чарадзея да Лабановіча й Пётры I)! Тым больш уражвае той факт, што толькі адзіны Ўладзімер Арлоў, адказваючы на пытаньні «нашаніўскай» анкеты, уключыў «Адлюстраваньні» ў лік найлепшых кніжак за 2004 год. Куды глядзелі астатнія – незразумела...

Глябальнае мысьленьне Васючэнкі, здольнасьць ахапіць несупынны літаратурны працэс, скрозь прызму якога й робіцца аналіз беларускае культурна-гістарычнае прасторы і, як вынік, неймаверны адукацыйны патэнцыял выданьня (тут цалкам спрацоўвае прынцып чытацкага прызначэньня «ад акадэміка да цесьляра») – толькі адна зь ягоных вартасьцяў. Базісная, але ня самая галоўная. Куды больш важкі жанр кнігі. Пятрогліфы й філялягемы – вынаходніцтва аўтара, больш за тое – яго асабісты ўнёсак у літаратурны архіў. Ці многія літаратары могуць гэтым пахваліцца?

Першае, з чым асацыюецца аўтарскае найменьне «філялягема», – гэта «міталягема», у якой зафіксаваныя каноны апісаньня існуючага парадку рэчаў і самі апісаньні таго, што існуе і мае права на існаваньне, ці прасьцей – нейкі міт, які згортваецца да аднаго слова і выкарыстоўваецца ў якасьці замены любых тлумачэньняў. Ёсьць яшчэ ідэалягемы, але яны цалкам фрагмэнтарныя, фіксуюць ацэнку палітычнай сілай гістарычнага мінулага і апісваюць пажаданую ёй будучыню. Васючэнка зірнуў глыбей і падоўжыў гэтую лінію ў блізкім сабе літаратурным кірунку:

Напачатку было Слова. Слова праказанае, напісанае або вымаўленае ёсьць ужо літаратураю. Першае слова ўяўляецца як Першаслова, Першатвор, Першалітаратура. Архетыповая нашая памяць апэлюе да Першакнігі, у якой занатаваны мы... Рукапіс, манускрыпт, скрутак, кніга – найстаражытнейшы з архетыпаў... Сьвятло ад Першатвору прайшло праз чорны калодзеж міталёгіі, адбілася ў шматлікіх люстэрках літаратурнага часу – міталягемах. Філялягемы як адбіткі

сьвятла ад Першатвору ствараюцца дагэтуль… Жыцьцё счытваецца з матрыцаў літаратуры… Мы асуджаныя ня толькі думаць, але й жыць філялягемамі: будаваць сябе «паводле Багдановіча», «паводле Караткевіча», «паводле Абдзіраловіча» альбо паводле іншых схемаў, якіх безьліч у сфэры літаратурна-жыцьцёвага і якія ад пачатку зашыфраваныя былі ў Першатворы.

У адрозьненьне ад філялягемы, пятрогліф ня мае крэўных братоў-папярэднікаў ані ў гісторыі літаратуры, ані ў гісторыі філязофіі. Гэта ўласна аўтарская вынаходка, якая паклала пачатак новаму літаратурна-крытычнаму жанру й найлепшым чынам укладаецца ў формулу чатырох «З»: «звышляканічнасьць, звыш'ёмістасьць, звышэканомія, звышглыбіня». Крэда пятрогліфу («Быць каменем пад касой няўмольнае хады часу, што не шкадуе ні жыцьця, ні літаратуры») – гэта, хутчэй, спроба ейнага стваральніка пакінуць свой прыкметны сьлед на зломе літаратураў двух стагодзьдзяў. Менавіта таму «Адлюстраваньні Першатвору» ёсьць перадусім Храмам Слова, зь якога ўсё пачыналася і якім, відаць, усё і скончыцца. Вяртаньне да вытокаў і першапрычынаў чалавецтва – вось той унівэрсальны ключ-адмычка, што дазваляе расчытаць любы жыцьцёвы фэномэн, любую літаратурную зьяву, якой бы яна ні была: пэрманэнтнай ці спарадычнай.

Кніжка складаецца з двух разьдзелаў – «Філялягемы» і «Пятрогліфы». Пераважная бальшыня філялягемаў ужо друкавалася ў часопісах «ARCHE», «Фрагмэнты» і «Дзеяслоў», яны ўяўляюць сабой невялічкія тэматычныя аповеды, падзеленыя на сем частак: уласна «Філялягемы», «Крыўскі слоўнік паводле Яна Баршчэўскага», «Полацкі лябірынт», філязофскія «Філялягемы разувасабленьня» і «Наша здрада», а таксама літаратурна-псыхалягічныя партрэты «Назіральнае дзіця (Пяць філялягемаў пра Адама Глёбуса)» і «Валянцін Акудовіч – чалавек, якога няма (Творца зь ягоных словаў)».

Пятрогліф значна саступае старэйшай сястры філялягеме сваімі памерамі, але далёка наперадзе трапнасьцю і ляканічнасьцю. Дый зьместавая клясыфікацыя ў першага куды

больш простая і зразумелая: «Тэорыя», «Сусьветная літаратура», «Беларуская літаратура», «Літаратура і жыццё».

Разглядаючы пад слоўным мікраскопам літаратурнае цела, Пятро Васючэнка вылучае безьліч тэорыяў. Гэтак *«марная справа шукаць у шыхце клясыкаў таго першага, хто ўпісаў у літаратуру тып Бэдзі, або воіна-хвалька, або героя-трыкстэра. Пагодзімся, што нас цікавіць ня пошук «прататыпу», а пошук аўтара, які апярэдзіў нас, але ў тым і рэч, што папярэднік пакутаваў тым самым пошукам»*. Тутэйшасьць крытык расшыфроўвае як «сындром эмацыянальнага імунадэфіцыту», альтэрнатывай афрыканізацыі беларускае літаратуры бачыць ейную аўстралізацыю, фэномэн «Бумбамліту» вытлумачвае праходжаньнем чальцоў суполкі праз стадыю вучнёўства, а загану апошняга беларускага Адраджэньня бачыць у тым, што, «абуджаючы жывых, хацелі абудзіць і трупы, а трупы не хацелі, каб іх абуджалі».

Некаторыя сьцьверджаньні накіраваныя ў самую глыбіню чытацкага ўспрыманьня, а таму абавязкова правакуюць ягоны супраціў. Цяжка пагадзіцца зь безапэляцыйнай пазыцыяй што да прапарцыйнага памнажэньня колькасьці сьвятла, адбітага ад Першатвору, з павелічэньнем колькасьці філялягемаў (а як жа быць з народжанымі ад літаратуры «Майн Кампф», «Пратаколамі сіёнскіх мудрацоў», пісаньнямі Абэцэдарскага і Трашчанка, «Вайной па законах подласьці» ды іншае брыдой? Яны таксама сьвятло?). Ці з патураньнем агульнавядомаму міту, што пераконвае ў вынішчэньні ўсіх прыгожых жанчын у сярэднявечнай Эўропе, «дзеля чаго яны засталіся толькі ў Беларусі і ўва Ўкраіне». Мне, да прыкладу, падабаюцца французкія прыгажуні, аднаму майму знаёмаму – расейкі, а другому – швэдкі...

«Адлюстраваньні Першатвору» кідаюць сьвятло на процьму самых розных літаратурных таямніцаў. Якім бачыў Купалу 14-гадовы падшпарак Пятрашка? З чаго крывічы выраблялі жыватворчую палёнку? Колькі з 90 раманаў Агаты Крысьці ёсьць сапраўднымі? Як стваральнік Шэрлака Холмса праславіўся на ўвесь сьвет? Чаму Фрэдзі Кругер стаў беларускім нацыяналістым? Як Колас паклаў спаць Лабановіча

разам зь сябрам Максімам? Дык хто ж сьмяецца апошнім?

Як апалягетык беларушчыны Васючэнка як дзьве кроплі падобны да Сержука Сокалава-Воюша, які прапагандуе беларускага Дракулу і лічыць, што для кожнага чужога слова ў беларускай мове павінен быць свой самабытны адпаведнік. Ён выцягвае зь небыцьця гісторыі легенду пра возера Нешчарда, у якім калісьці жылі цмокі – айчынныя Нэсі, – знаходзіць у гісторыі беларускіх звышчалавекаў, трыкстэраў, дантэсаў, янусаў і ўэлсаў. Ён не баіцца адкрыта абвесьціць, што «шчасьця на Русі, відаць па ўсім, не было, няма і ня будзе», а клясычны расейскі тыпаж – гэта Ямеля на печы, лайдак і гультай, які «заўжды робіцца царскім зяцем, багатыром».

«Адлюстраваньні Першатвору» выглядалі б цалкам канцэптуальным выданьнем, калі б не славутая лыжка дзёгцю. І значную долю адказнасьці за гэта мусіць узяць на сябе сам Пятро Васючэнка, у аўтарскай рэдакцыі якога кніга і выходзіла. Як слушна адзначае на форуме інтэрнэт-парталу Litara.net Адам Глёбус, «Скаталагічная філалагема» са старонкі 46 пераскочыла на старонку 68. Няўжо, пераназваўшы «Скаталагічную філалагему» ў «Глёбус і скаталёгія», яе варта было друкаваць пад адной вокладкай? Чаму памянёная філялягема падаецца рознымі правапісамі? Падобная ж гісторыя з цэлым шэрагам фрагмэнтаў і вобразаў, у выніку чаго прыпадае па некалькі разоў чытаць адно і тое ж пра «першага беларускага культуртрэгера на Масковіі Сімяона Полацкага» і «надзвычай прыгожую, разумную і добрую ў свае 12 гадоў Эўфрасіньню Полацкую». Цэласнасьці кнігі не пасуюць і два скарыстаныя правапісы – афіцыйны і клясычны. Хаця, зь іншага боку, беручы пад увагу аўтарскае памкненьне сабраць пад адной вокладкай усё створанае ў жанры пятрогліфаў і філялягемаў за розныя гады, памянёныя вышэй хібы ёсьць ня чым іншым, як «збыткамі вытворчасьці». А вось чаго сапраўды, не стае ў кнізе, дык гэта альфабэтнага паказьніка. Адзін толькі пералік герояў твораў і іхных аўтараў выглядаў бы больш чым салідна і значна б спрасьціў чытацкую навігацыю ў аўтарскім сьвеце.

Першая зацемка, зьмешчаная ў зборніку, зьявілася на сьвет у

перабудовачным 1989-м. Апошняя – праз доўгія чатырнаццаць гадоў. То бок на працягу пэрыяду, калі аўтар канчаткова вызначыўся з жыццёвай пуцявінай і спраўдзіўся як літаратар-прафэсіянал. Воляй лёсу гэтыя чатырнаццаць гадоў сталіся для Беларусі вырашальнымі. Пятро Васючэнка – прыхільнік тэорыі натуральнае эўрапейскасьці Беларусі – мяркуе, што нацыя павінна некалі спраўдзіцца празь літаратуру:

«Калі?» Я не вывучаў прыроды мікробаў гісторыі, але памятаю хроніку беларускіх адраджэньняў і з упэўненасьцю адказваю: «2011 год або блізу таго». Прамежак паміж беларускімі пасіянарнымі ўсплёскамі – у дваццаць гадоў. Зьмена пакаленьняў, салярных цыкляў або, праўдзівей, пэрыяд дзейнасьці мікробаў гісторыі. У 2011-м варта чакаць новага прыліву беларусізацыі.

А пакуль на беларускую зямлю спусьцілася шарая гадзіна. Балазе, засталося якіх пяць гадкоў.

Рыхтуймася да 2011-га!
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]

Мінулае (1’2000)

[image]
ARCHE Пачатак № 2 (36) - 2005
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image]-[image]2005
Навіна • Артыкул • Гісторыя • Археалогія • Этналогія • Археаграфія • Археаграфія • Археаграф

Прадметам даследавання Адама Фалоўскага стаў «рускі» пераклад езуіта Пятра Канізіуса лацінскага Катэхізіса *«Parvus catechismus catholicorum»*, які пабачыў свет у 1585 г. і набыў неверагодную папулярнасць, пра што сведчаць 400 яго перавыданняў на працягу 150 гадоў. Поўная назва «рускага» перакладу гучыць наступным чынам: *«Катехизьмъ или наоука всемъ православнымъ хрстіяномъ к повченію вельми полезно з латинского языка на рускій языкъ ново преложоно. Друковань оу Вильни року Бо(ж) Наро(ж) 1585 з дозволеньемъ старъшихъ».*

Дагэтулешняя малавядомасць дадзенага «рускага» тэксту ў славістыцы выклікана яго пэўнай недасягальнасцю. Было толькі адзінае выданне, з якога на сённяшні дзень захавалася два асобнікі ва універсітэцкай бібліятэцы г. Упсала (Швецыя) «Carolina Rediviva». Другі з іх стаў падставай аналізу праф. А. Фалоўскага і надрукаванай у яго кнізе фатакопіі. Рэдкая і вельмі абмежаваная інфармацыя пра Катэхізіс 1585 г. (прычым толькі пра 11 старонак, якія захоўваюцца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбурзе) была змешчана на старонках расійскіх і польскіх бібліяграфічных каталогаў XIX – пач. XX стст. Паводле мікрафільма з Ватыканскай бібліятэкі прадстаўлена апісанне Катэхізіса 1585 г. у зводным каталогу «Кніга Беларусі 1517–1917». Інфармацыю гістарычна-культурнага характару знаходзім на старонках кнігі Андрэя Катлярчука *«Шведы ў гісторыі й культуры беларусаў»* (Менск, 2002. с. 157–159).

Яшчэ горшыя былі справы з навуковым мовазнаўчым і культуралагічным аналізам Катэхізіса 1585 г. Толькі аднойчы 11 старонак 5 раздзела з Санкт-Пецярбурга былі даследаваны ў мовазнаўчым аспекце акад. Яўхімам Карскім – у 1893 г. у артыкуле «Два памятника старого западнорусского наречия: лютеранский катехизис 1562 г. и католический катехизис 1585 г.». Амаль праз сто гадоў, у 1996-м, віленскі Катэхізіс у якасці параўнальнага матэрыялу выкарыстаў у сваіх даследаваннях шведскі славіст А. Нігольм (A. Nyholm) «Tva «svenska» lutherska katekeser pa ryska» (Uppsala, 1996).

З'яўленне «рускага» перакладу каталіцкага Катэхізіса было адным з вынікаў дзейнасці езуіцкага ордэна на землях Вялікага

Княства Літоўскага. Вядома, што ў створанай езуітамі ў 1570–1579 гг. Віленскай Акадэміі выкладалася руская мова: кожны дзень зранку і папоўдні вучылі чытаць і пісаць, а потым перакладаліся і вучыліся на памяць тэксты з Біблііі і Катэхізіса. Пра гэта яскрава сведчыць расклад заняткаў у Акадэміі за 1583 г.: «Index lectionum et exercitationum, quae in singulis gymnasiis catholicae Academiae Vilnensis cal. Octobris anni 1583». З названай вышэй крыніцы даведваемся імя аднаго з выкладчыкаў «рускай» / беларускай мовы – Лаўрын Маніцовіюс з Коўна (Wawrzyniec Monicovius).

Сапраўдным ініцыятарам «рускага» перакладу Катэхізіса і яго выдання на тэрыторыі ВКЛ быў папскі легат у тагачаснай Рэчы Паспалітай, вучоны тэолаг, знакаміты арганізатар і дыпламат, выбітны езуіт Антоні Пасевіна (1533–1611). Менавіта ён у 1581 г. быў пасланы ў Масковію з мэтай схілення цара Івана IV Жахлівага на падпісанне міру са Сцяпанам Батурам, што і адбылося ў 1582 г. у Яме Запольскім. І пры гэтым Антоні Пасевіна выконваў яшчэ місію Ватыкана ў справах магчымай царкоўнай уніі паміж Маскоўскім патрыярхатам і Рымам. Ён быў рамантыкам і не ведаў маскоўскай палітыкі і традыцый, таму рэлігійныя пытанні былі не вырашаныя (дарэчы, дачыненні паміж Маскоўскім патрыярхатам і Ватыканам застаюцца нявырашанымі да сёння). Сваё падарожжа на Усход Антоні Пасевіна апісаў у кніжцы «Moscovia» (Вільня, 1586). Пэўныя няўдачы ў рэлігійнай місіі схілілі яго да думкі арганізаваць прапагандысцкі ўплыў каталіцызму на праваслаўнае насельніцтва ВКЛ і Маскоўскага царства пры дапамозе асветы і кнігадрукавання. Ужо ў сваёй справаздачы ў Рым ад 29 верасня 1581 г. (па выніках маскоўскага падарожжа) ён прадставіў грунтоўны план перакладаў і выданняў тэалагічна-палемічных твораў, літургічных кніг і дыдактычных матэрыялаў. Сярод шматлікіх пазіцый на трэцім месцы размясціўся Катэхізіс Пятра Канізіуса.

Праф. А. Фалоўскі мяркуе, што аўтарам перакладу мог быць беларускі шляхціц Васіль Замаскі, што паходзіў з беларускай вёскі Замошша (Вялікае і Малое Замошша на захад ад Полацка), якая ў 1582 г. была перададзена Сцяпанам Батурам езуіцкаму калегіуму ў Полацку. Вядома, што Васіль Замаскі (як

Basilius Amaski Ruthenus) быў вельмі блізкай да Антонія Пасевіна асобай. Ён выконваў функцыі другога перакладчыка пры ягоным пасольстве ў Маскву і функцыі асабістага сакратара ў кантактах з царом ды «палітычнай элітай» Масковіі.

Надрукаваны быў «рускі» пераклад Катэхізіса 1585 г. хутчэй за ўсё ў друкарні Дома Мамонічаў (дзейнічала ў 1575–1622 гг.), адзінай на той час у Вільні «фірме», якая валодала кірылічным шрыфтам і выдавала кнігі на беларускай і царкоўнаславянскай мовах.

Другі раздзел даследавання праф. Фалоўскага прысвечаны мове Катэхізіса 1585 г. Першае, што адзначае кракаўскі даследчык, гэта адлюстраванне ў правапісе Катэхізіса з'яваў, якія належаць да жывой беларускай мовы і якія ў XVI ст. паспяхова прабіваліся праз нягнуткія афіцыйныя нормы царкоўнаславянскай арфаграфіі. Напрыклад: уніфікацыя галоснага [е]; дыспалаталізацыя [р], аканне, пераход [у] у [ў].

Глыбокі фанетычна-граматычны і лексічны аналіз мовы перакладу Катэхізіса 1585 г. дазволіў праф. Фалоўскаму даказаць, што на графічна-фанетычным і флексійным узроўнях яна роднасная мове перакладаў рэлігійных кніг Францыска Скарыны. Несумненным фактам, на думку кракаўскага прафесара, з'яўляецца залежнасць мовы Катэхізіса 1585 г. ад мовы тэкстаў Ф. Скарыны і на лексічным узроўні. На 1380 адзінак, якія ўтрымлівае Катэхізіс, больш за 910 складаюць словы і выразы, формай і зместам падобныя да словаў і выразаў з тэкстаў беларускага гуманіста. І толькі 470 адзінак не маюць поўнага фармальна-сэнсавага эквівалента ў мове Ф. Скарыны. Праўда, ільвіная частка гэтых лексем, ужываных езуітамі ў мове Катэхізіса, знаходзіцца ў слоўніку Ф. Скарыны ў форме роднаснай, напрыклад: *творец (К) – творитель (С); добрость (К) – доброта, добротливость (С); идолохвальство (К) – идолохваление (С); видимый (К) – видети (С); дозволение (К) – дозволити (С)* і іншыя. Застаецца зусім малая група лексем (134 адзінкі), якія дазваляюць гаварыць пра асаблівасць мовы Катэхізіса. У першую чаргу гэта новыя неабходныя тэрміны / паняцці, якія не існавалі ў свеце Старога Запавету – крыніцы

перакладаў Ф. Скарыны, а з'явіліся ў хрысціянскай навуцы, абапертай на вучэнне Хрыста і Усеагульнага касцёла. У дадзенай сітуацыі перакладчыкі Катэхізіса апынуліся перад сітуацыяй стварэння новых лексем, якія адсутнічалі ў тэкстах Ф. Скарыны. Праф. Фалоўскі лічыць, што перакладчыкі новыя словы чэрпалі перадусім з царкоўнаславянскай і польскай моваў. Шмат якія неалагізмы з таго часу зрабіліся лексічнымі нормамі сучаснай беларускай мовы. Гэта словы неславянскага паходжання: *катэхизм, друковати, ересь, схизматик; паланізмы: тртвати, надта, мордование, заизрость, повага, зычливасть, штодень* і іншыя.

Асновай для параўнання слоўніка Катэхізіса з моваю твораў Ф. Скарыны для А. Фалоўскага быў двухтомны «Слоўнік мовы Францыска Скарыны» (складальнік У. В. Анічэнка, Менск, 1977–1984), у якім, на жаль, ёсць вялікая колькасць памылак, асабліва семантычнага характару, што штурхае даследчыкаў да крытычнасці і асцярожнасці пры выкарыстанні гэтага даведніка, а гэта, у сваю чаргу, збядняе і аслабляе высновы.

Падсумоўваючы свае аналізы, праф. Фалоўскі піша: *«Вынікі моўнага аналізу, які ляжыць у аснове 2-га раздзела, паказалі на відавочнае падабенства мовы Катэхізіса да мовы кніг Ф. Скарыны. Такім чынам, пытанне пра характар мовы даследаванага помніка па сутнасці ёсць пытаннем пра характар мовы, створанай доктарам з Полацка»*. І праф. Фалоўскі сам жа адказвае на гэтае пытанне цытатай, актуальнай да сённяшняга дня ў мовазнаўчай Скарыніяне, з артыкула Аркадзя Жураўскага «Мова друкаваных выданняў Ф. Скарыны», змешчанага ў даследаванні «450 год беларускага кнігадрукавання» (Менск, 1968. с. 277–304), што

царкоўнаславянізмы з'яўляюцца пануючымі ў галіне лексікі і словаўтварэння, тады як у граматычным ладзе беларусізмы аказваюцца прадстаўлены больш шырока», і далей: *«захаваўшы царкоўнаславянскую аснову ў сваіх перакладах, ён* (Францыск Скарына – **Аўт.**) *насыціў іх беларускімі моўнымі сродкамі ў такой меры, што яго мова заняла самае крайняе становішча ў беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы і фактычна аказалася прамежкавым звяном у працэсе пераходу ад*

царкоўнаславянскай мовы да беларускай у сферы рэлігійнага ўжытку.

Даказаўшы агульнасць мовы перакладаў біблійных тэкстаў, выдадзеных Францыскам Скарынам, і перакладу Катэхізіса 1585 г., А. Фалоўскі адзначае яшчэ адну важную рысу тагачаснай сітуацыі ў рэлігійным жыцці Вялікага Княства Літоўскага. Выданні Скарыны і праз 60 гадоў пасля іх з'яўлення на свет (1517–1519, 1522–1515) надалей ужываліся ў грамадстве, а іх мова, паводле пераканання езуітаў, была найлепшай прыладай для ўкаранення каталіцкай веры сярод праваслаўнага люду – беларусаў і ўкраінцаў.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/8/14
[image]